ARCHE Зьмест № 6’05

1. Зьмест / Уводзіны
2. Нерыюс Прэкявічус. Перадвыбарныя памылкі апазіцыі.
3. Эндру Ўілсан. Шанцы «адзінага» на выбарах-2006.
4. Віталь Зайка. Колькі нацыянальнага ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі?
5. Андрэй Ягораў. Матэматыка контррэвалюцыі.
6. Андэрс Ослунд. Акцыі Пуціна падаюць. Чым адкажа Амэрыка?
7. Віталь Сіліцкі. Карані і метады постсавецкай віртуальнасці.
8. Пётра Рудкоўскі ОП. Эротыка біблійнага слова.
9. Уладзімер Мацкевіч. Базіс і сьвядомасьць. Дыялектыка Шаўцова.
10. Юры Чавусаў. Як выжыць падчас рэвалюцыі.
11. Джон Грэй. Зямля – круглая.
12. Даніла Жукоўскі. Прымус захапляцца.
13. Рыгор Мінянкоў. Засталося пачуць адзін аднаго...
14. Пётра Рудкоўскі. Ad vocem.
15. Вольга Шпарага. Ад супольнасьці беларускай мовы да супольнасьцяў беларускамоўнага ўзаемадзеяньня.
16. Уладзімер Мацкевіч. Тры бакі "моўнае спрэчкі": не сьпяшайцеся хаваць тое, што заўтра расквітнее.
17. Юры Дракахруст. Сэанс чорнай магіі і яе выкрыцьцё.
18. Мікола Кацук. «...Калі ж ён злачынца, дык насамперш трэба крычаць: «Ратуйце!»
19. Фрагмэнты абмеркаваньня аналізу Міколы Кацука
20. Вярнуцца з вайны
21. Крытычныя інтэлектуалы: сымбалічная барацьба і структурнае процістаяньне.
22. Псіхалогія здрады: беларускі нацыянальны рух вачыма канфідэнта II аддзела польскага Генеральнага штаба.
23. Зьміцер Серабракоў. Дванаццаты год Лукашэнкіяны. З мазаічна-псыхапатычнага пано складваецца цэльная карціна.
24. Юрась Пацюпа. Элегіі.

25. Наша літаратура ўсё яшчэ застаецца сфэраю апалягетыкі. Гутарка зь пісьменьнікам Францам Сіўком.
26. Вальжына Морт
27. Андрэй Катлярчук. Вікінгі, Русь і загадкавая адсутнасьць Полацку.
28. Зінаіда Гімпелевіч. Дзвесце гадоў імперскай фанабэрыі.
29. Уладзіслаў Белавусаў. Старыя і новыя польскія песьні.
30. Павал Абрамовіч. Колер падарожжа.

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

6[image]-[image]**2005**

аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

[image]

З ь м е с т

C o n t e n t s

АНАЛІТЫКА

НЭРЫЮС ПРЭКЯВІЧУС Перадвыбарныя памылкі апазыцыі
ЭНДРУ ЎІЛСАН Шанцы «адзінага» на выбарах-2006
ВІТАЛЬ ЗАЙКА Колькі нацыянальнага ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі?
АНДРЭЙ ЯГОРАЎ Матэматыка контаррэвалюцыі
АНДЭРС ОСЛУНД Акцыі Пуціна падаюць.Чым адкажа Амэрыка?

КРЫТЫКА

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ Карані і мэтады постсавецкай віртуальнасьці
АНДРЭЙ КАЗАКЕВІЧ «Арыенталізм», альбо некалькі заўваг пра «казус Беларусь»
ПЁТРА РУДКОЎСКІ Эротыка біблійнага слова
УЛАДЗІМЕР МАЦКЕВІЧ Базіс і сьвядомасьць. Дыялектыка Шаўцова
ЮРЫ ЧАВУСАЎ Як выжыць падчас рэвалюцыі
ДЖОН ГРЭЙ Зямля – круглая

ПАЛЕМІКА

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ Прымус захапляцца
РЫГОР МІНЯНКОЎ Засталося пачуць адзін аднаго...
ПЁТРА РУДКОЎСКІ Ad vocem
ВОЛЬГА ШПАРАГА Ад супольнасьці беларускай мовы да

супольнасьцяў беларускамоўнага ўзаемадзеяньня
УЛАДЗІМЕР МАЦКЕВІЧ Тры бакі «моўнае спрэчкі»: не сьпяшайцеся хаваць тое, што заўтра расквітнее
ЮРЫ ДРАКАХРУСТ Сэанс чорнай магіі і яе выкрыцьцё
МІКОЛА КАЦУК «...Калі ж ён злачынца, дык насамперш трэба крычаць: «Ратуйце!»
Фрагмэнты абмеркаваньня аналізу Міколы Кацука «Міты беларускай сацыялёгіі»
ВОЛЬФ РУБІНЧЫК Вярнуцца з вайны

ГІСТОРЫЯ

Крытычныя інтэлектуалы: сымбалічная барацьба і структурнае процістаяньне
АНДРЭЙ ЧАРНЯКЕВІЧ, АЛЕСЬ ПАШКЕВІЧ Псыхалёгія здрады: беларускі нацыянальны рух вачыма канфідэнта II аддзелу польскага Генэральнага штабу
ЗЬМІЦЕР СЕРАБРАКОЎ Дванаццаты год Лукашэнкіяны

ЛІТАРАТУРА

ЮРАСЬ ПАЦЮПА Элегіі
Наша літаратура ўсё яшчэ застаецца сфэраю апалягетыкі. Гутарка зь пісьменьнікам **ФРАНЦАМ СІЎКОМ**
ВАЛЬЖЫНА МОРТ Лірыка

РЭЦЭНЗІІ

АНДРЭЙ КАТЛЯРЧУК Вікінгі, Русь і загадкавая адсутнасьць Полацку
ЗІНАІДА ГІМПЕЛЕВІЧ Дзьвесьце гадоў імпэрскай фанабэрыі
УЛАДЗІСЛАЎ БЕЛАВУСАЎ Старыя і новыя польскія песьні
ПАВАЛ АБРАМОВІЧ Колер падарожжа

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу

Ліст у рэдакцыю, Майстраваньне **[mk]**, Абнаўленьне **[czyk]**
Copyright © 1998-2005 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2005/12/12
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]2005

Зміцніць • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Нерыюс Прэкявічус Перадвыбарныя памылкі апазіцыі

НЕРЫЮС ПРЭКЯВІЧУС палітоляг, супрацоўнік Стакгольмскага ўнівэрсытэту Södertörn. Яго апошні аналіз у «ARCHE» называўся «Дыскурс прапаганды газэты «Советская Белоруссия» (4/2005).

Беларуская апазіцыя на выбарах 2006 г. спадзяецца перамагчы цяперашняга прэзідэнта. Кангрэс дэмакратычных сілаў адзначыў пачатак кампаніі апазіцыі: на ім вылучаны кандыдат, якога падтрымліваюць некалькі апазіцыйных рухаў. Праведзеная 16 кастрычніка акцыя Дзень Салідарнасці сталася першым мерапрыемствам у выбарчай кампаніі аб’яднаных сілаў апазіцыі.

Ніжэй разглядаюцца тры ўзроўні апазіцыйнай кампаніі: перадвыбарныя абяцанні, падрыхтоўка да выбараў і арганізаваныя дзеянні. Каб даць сабе рады з крыніцамі, я засяроджу ўвагу на асобных матэрыялах, якія даюць уяўленне пра названыя ўзроўні.

ПАРТЫЙНАЯ ПРАГРАМА АБО ПАРТЫЙНАЯ МРОЯ?

Праграмныя погляды буйной апазіцыйнай сілы – Аб’яднанай грамадзянскай партыі – выкладзеныя ў нядаўнім артыкуле «Куды ты прыйдзеш, Беларусь». Артыкул падпісаны старшынём партыі Анатолем Лябедзькам, хаця падобна, што аўтарства было калектыўнае. Час з’яўлення артыкула і яго змест

сведчаць, што ён выступае перадвыбарнай праграмай партыі*.

У зваротках да чытачоў ужываецца і даваральнае «ты», і калектыўнае «мы», каб чытачу было прасцей атаясаміць сябе з партыяй. Артыкул разлічаны на розныя сегменты аўдыторыі (як, зрэшты, і амаль кожная партыйная праграма). Можна парознаму тлумачыць, чаму падаецца толькі расійскамоўны варыянт артыкула, але, верагодна, за гэтым не хаваецца ніякага пакрыёмага сэнсу. (На дзвюхмоўных або шматмоўных беларускіх сайтах рэдка прапануюцца адныя й тыя ж тэксты на ўсіх мовах. Сітуацыя, калі беларускамоўнае і расійскамоўнае напаўненне супадае толькі часткова, – хутчэй правіла, чым выключэнне.) Расійска- і беларускамоўныя чытачы вольныя інтэрпрэтаваць праграму як заўгодна, бо незразумела, ці то беларуская культура запануе дзякуючы будучай дзяржаўнай падтрымцы, ці то з прычыны свайго адвечнага вяршэнства («*белорусское – это качественное и профессиональное, гармоничное и мелодичное*»). Іншымі словамі, застаецца адкрытым пытанне, ці то вяршэнства беларускай культуры – факт, на які нельга не зважаць, ці то праект, які будзе навязвацца дыскурсіўнымі і прававымі сродкамі. Гэтаксама застаецца незразумелым, ці то праграмныя заявы ўключаюць прыняцце небеларускай культуры, ці проста абавязанне ўстрымацца ад яе пераследу («*не существует запретов и ограничений на искусство и культурное наследие других стран*»). Калі дзяржава займае нейтральную пазіцыю ў дачыненні да культуры, які сэнс падкрэсліваць, што не будзе забаронаў? Адмаўленне адмаўлення – тыпова абарончая тактыка.

Тэкст пабудаваны на дыхатаміях, прычым яны часцякам змяшчаюцца ў адзіным сказе, напрыклад: «*Используем лучшее на планете, а не дешевые суррогаты*». Гэты прыём дазваляе выразна супрацьпаставіць мінулае і сучаснасць. Але ён мае і адмоўны пабочны эфект – адштурхае чытачоў, якія не так драматычна ўспрымаюць цяперашнюю сітуацыю. У выніку яны могуць не прыняць і прапанаванага бачання будучыні.

Акрэсліваючы перспектывы на будучыню, аўтар(ы) ўжывае(-юць) цяперашні час – магчыма, дзеля таго, каб паказаць іх дасяжнасць. Аднак гэта стварае шмат блытаніны – Дзеля справядлівасці трэба заўважыць, што на сайце Аб яднанай грамадзянскай партыі няма нават ускосных указанняў на тое, што артыкул пастаянна «Куды ты прыйдзеш,

як у выпадку з культурнымі прэферэнцыямі – і, верагодна, зніжае сілу аргументацыі. Калі і сучасны стан, і будучыня апісваюцца ў цяперашнім часе, не прачытваецца іх супрацьпастаўленне: навошта прасоўваць беларускую культуру, калі яна і так някепска развіваецца? Знікае ўвесь сэнс прапагандысцкага пафасу, бо цяжка выйграць выбары, не выступаючы найлепшым вырашальнікам сучасных праблем.

З гледзішча звычайнага грамадзяніна, у розных частках чытэльнасць артыкула адрозніваецца. Адна з заган любога палітычнага дыскурсу – ужыванне малавядомых або абстрактных тэрмінаў, якія цяжка спалучыць з эмацыйнымі вобразамі. У палітычных дэбатах гэтыя тэрміны малаэфектыўныя. Напрыклад, у ЗША слова «манаполія» мае выразна адмоўнае значэнне, бо супраціў эканамічным манаполіям, якія падрываюць прынцып свабоднай канкурэнцыі, бярэ пачатак ад XIX ст. У Расіі ж «манаполія» суадносіцца галоўным чынам з рэсурсаздабывальнымі карпарацыямі, гэта амаль сінонім «буйной кампаніі». Таму ў расійскіх палітычных дэбатах панятак «манаполія» не спрацоўвае.

«*Нанотехнологии*», «*инновационная*», «*капитализация*», «*ипотечные кредиты*» – усе гэтыя тэрміны, мабыць, застануцца загадкай для звычайнага чытача. Апагеем неэфектыўнага дыскурсу трэба прызнаць фразу «*Банки имеют общепризнанные инвестиционные рейтинги*». Мне цяжка рабіць абагульненні наконт узроўню беларускай аўдыторыі, але я ўпэўнены, што гэты сказ зразумеюць менш як 5 % літоўцаў. І нават тыя, хто зразумее, палічаць яго не дужа інфармацыйным[1].

Магчыма, з цягам часу дзякуючы ўплыву СМІ шырокая аўдыторыя засвоіць некаторыя спецыяльныя тэрміны, і яны будуць ствараць належны эфект. Аднак у любым выпадку трэба ўлічваць кантэкст, у якім яны ўжываюцца. Напрыклад, тэрмін «алігарх» на Захадзе збольшага асацыюецца з дэфектамі дэмакратычным працэсе, а ў расійскім (і, шырэй, ва ўсходнееўрапейскім) кантэксце «алігархаў» звязваюць з несправядлівай сацыяльнай няроўнасцю і карупцыяй.

У Беларусі слова «алігарх» нярэдка выкарыстоўвае сам прэзідэнт, крытыкуючы расійскую палітычную сістэму. А. Бядуля, будучы служыць ураганам, на выбарах. На гэтым жа сайце (www.ucpb.org) апублікаваны іншы дакумент, які называецца «Праграма АПІ». – *Заўв. перакл.*

[1] Аўтар(ы) верагодна, мае(ць) на ўвазе, напрыклад, крэдытныя рэйтынгі. Як ацэнкі, так і крэдытныя рэйтынгі

Лукашэнка часта падкрэслівае, што не дапусціць з’яўленняўладаюцца алігархіі ў сваёй краіне. Такім чынам, ужываючы паняткавымі «алігархі», аўтар(ы) артыкула не прапануе(-юць) сапраўднымі альтэрнатывы цяперашняй сістэме ўлады, бо за гэтым словам не стаіць рэальнай з’явы. (А калі ўлічваць досвед Усходняй Еўропы, змена ўлады ў Беларусі магла б нават паспрыяць з’яўленню г. зв. алігархаў.) Але ж змагацца з прывідамі алігархамі, намаляванымі А. Лукашэнкам, лепш за аб Лукашэнку не можа ніхто.

Іншы недахоп тэксту – у навязванні клішэ, напрыклад: «*Милиционер – помощник и партнер гражданина. Он тесно работает с местным сообществом*»[2]. Да іх можна ставіцца дваіста. З аднаго боку, яны ўлагоджваюць аўдыторыю і дапамагаюць прасоўваць не такія адназначныя тэзісы. Людзі схільныя прымаць ідэі «пакетамі» – лягчэй дасягнуць згоды, калі аўдыторыя ўжо згадзілася з нейкім выказваннем. Таму клішэ – найважнейшы сродак, каб паразумецца з нядобразычліва настроенай аўдыторыяй. З другога боку, само па сабе клішэ нікога не падштурхне змяніць погляды. Ад залішніх клішэ тэкст робіцца задоўгім, прападае цікаўнасць публікі, у іх «патанаюць» змястоўныя сказы. Клішэ можна метафарычна параўнаць з алкаголем: ад невялікіх доз падвышаецца тонус, ад вялікіх хіліць у сон.

Артыкул перапоўнены абяцаннямі лепшага жыцця – яны сустракаюцца нават часцей, чым у прамовах прэзідэнта. Аднак

ўладаюцца вонкавымі праўдзівымі. Першы тып сходнасцей змяшчае інфармацыю аб прыбытках ад укладання грошай у канкрэтную кампанію. Другі паказвае здольнасць суб’екта (кампаніі або ўрада) сплачваць пазыкі. Лепшы крэдытны рэйтынг паляпшае ўмовы запазычання і заахвочвае інвестыцыі. Адсутнасць крэдытных рэйтынгаў павялічвае рызыку інвестара або крэдытора.

[2] Прасцей за ўсё. Аднак

А. Лукашэнка спалучае свае абяцанкі з мінулымі і сучаснымі падзеямі. Напрыклад, яго абяцанні павысіць заробкі, звязаныя з ростам заробкаў у мінулым. У артыкуле «Ураджай аўтара(ў) падвісаюць у паветры – амаль няма практычных захадаў, якія б ператваралі мрою ў рэальнасць. Большасць намаганняў намаляваць усёабдымную карціну магчымага дабрабыту выяўляецца шэраг супярэчнасцяў.

Возьмем заявы: «*У 70 % белорусских семей есть личные автомобили*», «*40 % белорусов привычно ужинают в белорусских ресторанах*», «*за границей ежегодно отдыхают 30 % белорусских семей*». Яны наўрад ці стасуюцца з тэзісам «*рост цен – не более 2 % в год*», бо нерэальна разлічваць на павелічэнне аб'ёмаў спажывання пры захаванні стабільных цэнаў. Таксама няпроста спалучыць павелічэнне пенсій і развіццё сацыяльных праграм са зніжэннем падаткаў.

У артыкуле трапляецца нямала проста фантастычных заяў, напрыклад, наконт ураджаю збожжа: «*Урожай зерновых не 25 центнеров с гектара, а 100 ц/га*». За апошнія 10 гадоў такой прадукцыйнасці не дасягала ніводная краіна ЕЗ. Толькі Бельгія і Ірландыя зрэдку збіралі ўраджаі, вышэйшыя за 90 ц/га (Бельгія аднойчы, Ірландыя – тройчы). Бадай, у 2004 г. Ірландыі ўдалося дасягнуць найвышэйшай ураджайнасці за ўсю гісторыю Еўропы – 98,596 ц/га.

Не менш сумневаў выклікае і заява аб надоях малака («*коровы дают не 2 тысячи литров, а 8–9 тысяч литров молока*»). Статыстыка Еўразвяза сведчыць, што ў 2000–2003 гг. з усіх краін-удзельніц ЕЗ максімальных надояў дасягнула Швецыя – 8072 кг на карову ў 2003 г. Зважаючы на шчыльнасць цэльнага малака, атрымліваецца прыкладна 7837 л на карову. Вядома, методыкі падліку могуць розніцца – шведскія статыстычныя крыніцы адзначаюць (без уліку якасці малака), што ў 2004 г. сярэдні надой аказаўся рэкордным – 8994 кг на карову. Такім чынам, можна сказаць, што заяўленых лічбаў дзе-нідзе ў свеце і дасягаюць.

Дапусцім, аўтар(ы) жадаў(-лі) паказаць канчатковыя мэты, і ўсе выкладзеныя ў артыкуле перспектывы – доўгатэрміновыя. Тады варта запытацца, на які час разлічаная іх рэалізацыя. Цяжка

сучасныя фрукты, стварочы выказванні з супярэчлівым сэнсам. Калі адваротнае сцвярджанне гучыць зусім абсурдна, то, хутчэй за ўсё, першапачатковае выказванне было ўслішаваным. Хто ж возьмецца сцвярджаць, што міліцыя мусіць варагаваць з народам?

пераканаць грамадзянаў аддаць свае галасы за партыю, што абяцае дабрабыт «у наступным жыцці». Датычна прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі афіцыйная беларуская статыстыка[3] адзначае, што ў 2004 г. сярэдняя ўраджайнасць зерневых на апрацаваны гектар складала 29,60 ц, а надой малака на карову – 3211 кг. Ірландская сельская гаспадарка магла пахваліцца цяперашняй беларускай ураджайнасцю зерневых прыкладна ў 1960 г., тады як шведская сельская гаспадарка дасягнула беларускіх паказчыкаў надою блізу 1925 г.

Перспектывы росту прадукцыйнасці ў сельскай гаспадарцы лепш ацэняць навукоўцы, якія непасрэдна вывучаюць гэтую праблему, аднак, у кожным разе, наўрад ці Беларусь яго тэмпамі пераўзыдзе Ірландыю. То бок, каб дасягнуць прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі, як у Ірландыі, спратрэбіцца мінімум 45 гадоў. (А партыя падае гэтай з рэалістычную мэту.) Апроч таго, нават павярхоўнае знаёмства са статыстыкай дазваляе сцвярджаць, што важную ролю ў прадукцыйнасці сельскай гаспадаркі па-ранейшаму адыгрываюць геаграфічныя фактары. Праз іх Беларусь ніколі не дасягнуць ураджайнасці зерневых, супастаўнай з ірландскай, бельгійскай, нідэрландскай або брытанскай.

Да таго ж узнікае пытанне, а ці сапраўды істотныя ўсе гэтыя лічбы? Іншымі словамі, каму цікава, 2 т малака дае ў Беларусі сярэдняя карова ці 3,2 т? Аднак прыклад з малаком – дробязь. Тэкст поўны сцверджанняў, не падмацаваных лічбамі, напрыклад: «*Мы путешествуем по миру без виз и приглашений*». Такія заявы цяжэй праверыць, аднак іх усё ж можна суаднесці з эмпірычнай рэчаіснасцю. Напрыклад, згодна са звесткамі міністэрстваў замежных справаў Літвы і Беларусі, на дадзены момант літоўцы не маюць патрэбы ў візах для кароткачасовых падарожжаў у 70 краін, беларусы – у 12 краін. Але перавагі Літвы – збольшага вынік супрацоўніцтва з ЕЗ і ўваходжання краіны ў яго склад, і шлях да іх не быў кароткі. Тут мы падыходзім да асноўнай праблемы: усялякая мроя мае сэнс у той ступені, у якой яна абапіраецца на рэчаіснасць. Так, казаць пра перспектывы эканамічнага развіцця без спасылкі на гістарычныя тэндэнцыі і досвед іншых краін – занятак

[3] Можна пастаўць яе з сумнеў, але няма альтэрнатыўных ёй звестак у знаёмства краіны. Усе лічбы, якія не можа супадаць з пададзенымі дзяржаўнымі статыстычнымі органамі, або атрымліваюцца шляхам экстраналяцыі вынікаў асобных сельскіх гаспадарак на ўсю краіну, або не заснаваны на фактах. Некаторыя

бессэнсоўны. Дапамагае ператварыць мрою ў рэальнасць толькі зварот да практыкі.

Калі разарваная сувязь паміж рэальнасцю і мрояй, цяжка прадказаць, што здарыцца па прыходзе партыі да ўлады. Можна па-рознаму тлумачыць, чаму з'яўляюцца неабгрунтаваныя мроі і фактычныя недакладнасці. Прычынай можа быць жаданне павялічыць палітычную актыўнасць выбарцаў, распаліўшы ў іх пачуццё нацыянальнай годнасці, імкненне набыць падтрымку праз супрацьпастаўленне мінуўшчыны і будучыні, адарванасць ад практыкі, неінфармаванасць, некампетэнтнасць. Якое тлумачэнне слушнае, можа(-гуць) адказаць толькі аўтар(ы).

стацыстычныя паказчыкі, такія як інфляцыя, могуць быць вылічаны без выкарыстання афіцыйных звестак, аднак іншыя не.

У найлепшым выпадку аўтар(ы) маніпулюе(-юць) чытачамі дзеля, здавалася б, добрай мэты. Тады паўстае ключавое пытанне: як уплываюць гэткія мроі на прывабнасць партыі для выбарцаў? Адказ залежыць ад таго, на якую мэтавую аўдыторыю скіраваны артыкул. Суцэльны тэкст напісаны даволі манатонна, ён не дойдзе да шырокай публікі, калі яго не разбіць на асобныя тэзісы. Тыя, хто захоча і зможа прачытаць тэкст цалкам у ягонай зыходнай форме, – ужо, верагодна, перакананыя прыхільнікі АГП. Магчыма, мяркуецца, што яны з дапамогай артыкула пераканаюць іншых. Аднак зварот да эмоцый аўдыторыі траціць эфектыўнасць, бо не прапануюцца канкрэтныя рашэнні.

У горшым выпадку партыя проста не гатовая кіраваць дзяржавай. Таму, мабыць, ёй складана будзе прыйсці да ўлады, або, нават калі гэта і здарыцца, краіну апануе палітычная і сацыяльная нестабільнасць. Гісторыю антыкамуністычных дысідэнцкіх рухаў ва Усходняй Еўропе можна сцісла апісаць як падзенне ідэалістаў, якія страцілі або ўладу, або свае ідэалы.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ВЫБАРАЎ

Аналізуючы стан беларускай апазіцыі, не варта абмяжоўвацца агульнымі перспектывамі – важна разгледзець і практычныя рашэнні ў арсенале апазіцыі. У гэтым плане, бадай, адна з найлепшых даступных крыніц інфармацыі – інтэрнет-форум з

Аляксандрам Мілінкевічам (8 кастрычніка).

Падрыхтоўка да выбараў мусіць залежаць перадусім ад чаканых вынікаў. Вось чаго чакае кандыдат ад «аб'яднанай апазіцыі»: «*Реального подсчета голосов не будет… белорусский Центризбирком обнародует цифры, по которым окажется, что выиграл Лукашенко, причем в первом туре*». Гэтая заява ўзнімае шматлікія пытанні. Па-першае, як апазіцыя даведаецца, што вынікі сфальсіфікаваныя пры мінімальным удзеле ў іх арганізацыі? Кандыдат на гэтае пытанне не адказвае, не ўдалося мне знайсці адказу і ў іншых беларускіх крыніцах.

Ці магчыма папярэдзіць фальсіфікацыі? Прапанаваныя метады нельга назваць удалымі: «*Сябры камісіяў… атрымаюць папярэджаньні аб тым, што фальсыфікацыя – гэта парушэньне канстытуцыі, за якое давядзецца несьці крымінальную адказнасьць*». Пагрозы, не падмацаваныя рэсурсамі, – пусты гук. Гэта, напэўна, ведае і сам кандыдат. А зрабіць іх рэальнымі можа толькі народная падтрымка, прынамсі, не меншая за тую, што маюць улады.

Акцэнт на фальсіфікацыях стварае ўражанне, што апазіцыя можа любыя афіцыйныя вынікі абвясціць несапраўднымі і перайсці да масавых акцый: «*Мы выведзем людзей на плошчу, каб мірным шляхам адстаяць свае правы*». Іншымі словамі, мэта апазіцыі – не заваяваць галасы, а мабілізаваць актывістаў: «*Имеем шанс прийти к людям и сказать им правду, укрепить их дух и уменьшить страх*». Аднак гэтыя мэты, дарма што ўзаемазвязаныя, усё ж істотна адрозніваюцца. Упэўненасць у фальсіфікацыі вынікаў і зварот да публічных акцый пратэсту могуць двойчы пашкодзіць апазіцыі: адахвочваюцца галасаваць апаненты ўлады, а выбарцы, якія вагаюцца, убачаць у апазіцыянерах парушальнікаў парадку.

Калі апазіцыя хоча перамагчы, яна мусіць пераканаць грамадзянаў, што будзе кіраваць лепей за цяперашні рэжым. Іншымі словамі, трэба, каб апазіцыя ўспрымалася як альтэрнатыўны ўрад. Беларускае грамадства, як і большасць іншых, аддае перавагу эвалюцыйным зменам, а не рэвалюцыям. Сваімі развагамі пра палітычныя пераваротыапазіцыйныя лідэры палохаюць тых, хто яшчэ не зрабіў свайго выбару – між

тым акурат іх пазіцыя адыгрывае ключавую ролю ў палітычных зменах. З досведу мінулых кампаній відавочна, што на вуліцы можна вывесці даволі абмежаваную колькасць актывістаў, а таму разгон апазіцыйных мітынгаў будзе адносна простай задачай.

Кандыдат мяркуе, што будзе мець вельмі абмежаваныя магчымасці для агітацыі: «*Абыход кватэраў, пераконваючы людзей «вочы ў вочы»*. Хаця гэткая тактыка не патрабуе значнага доступу да СМІ, вялікай праблемай застаецца фінансаванне, бо вымагае вялікай колькасці актывістаў і пакрыцця іх выдаткаў. Таму выклікаюць сумнеў заявы пра фінансавую незалежнасць: «*нет и не было финансирования политических партий из-за рубежа*». Незразумела, напрыклад, якой падтрымкі чакае кандыдат ад беларускай дыяспары – «*будзем удзячныя за дапамогу беларускай эміграцыі*». Апроч таго, весці такую кампанію можна толькі дэцэнтралізавана. Гэта прызнае і сам кандыдат: «*сохранение разнопартийной команды для меня важнее всего*». Аднак калі кампанія будзе кепска скаардынаваная, можа толькі ўзмацніцца ўражанне, што апазіцыя няздольная дасягнуць кансенсусу. Горш за тое, апазіцыі прыйдзецца моцна падумаць, як данесці да выбарцаў свае ідэі, не парушыўшы іх правоў на прыватнае жыццё (напрошваецца паралель са «Сведкамі Еговы»).

Насоўваецца выснова, што апазіцыя ў Беларусі апынулася ў заганным коле: каб перамагчы ў выбарах, ёй неабходная народная падтрымка – каб атрымаць народную падтрымку, неабходна перамагчы ў выбарах. Калі б апазіцыйных кандыдатаў было больш, лягчэй было б і весці кампанію: зменшыліся б выдаткі на каардынацыю дзеянняў, павялічыўся б ахоп грамадзянаў, выявілася б папулярнасць кандыдатаў у народзе. Але ў такім выпадку расцярушваюцца галасы выбарцаў, што можа скончыцца паразай. Удзел у выбарах дае легальныя каналы зносін з электаратам, аднак легітымуе перамогу А. Лукашэнкі.

КАМПАНІЯ НА ПРАКТЫЦЫ: ДЗЕНЬ САЛІДАРНАСЦІ

Можна разглядаць Дзень Салідарнасці 16 кастрычніка як першую значную палітычную акцыю апазіцыі пасля Кангрэса дэмакратычных сілаў. Яна мела на мэце прыцягнуць увагу да праблемы «зніклых» і палітычных зняволеных. Паводле задумы, прыхільнікі апазіцыі мусілі адначасова патушыць святло і запаліць свечкі ў сваіх дамах.

Гэтак званыя «знікненні» дзеячаў апазіцыі ўзбударажылі міжнародную супольнасць у 70–80-я гг. XX ст., перадусім у сувязі з ваеннымі дыктатурамі ў Лацінскай Амерыцы. «Зніклага» таемна арыштоўвалі і забівалі, не пакідаючы ніякіх дакументальных сведчанняў. Такім чынам выканаўцы вызваляліся ад самой неабходнасці трымацца закона, а сярод знаёмых «зніклага» сеяўся страх. Аднак падобныя захады не дапамаглі пазбегнуць адказнасці выканаўцам і заказчыкам «знікненняў» і захаваць паноўныя рэжымы. Большасць з іх абрынулася, калі спынілася падтрымка звонку або выявілася іх няздольнасць вырашаць сацыяльныя і эканамічныя праблемы. Эфектыўнасць кіравання ваенных хунтаў, якія шырока выкарыстоўвалі «знікненні», была не большай, чым у іншых.

Прыклад «мацярок з Пласа-дэль-Маё» ў Аргентыне яскрава засведчыў нядзейснасць «знікненняў» як сродку рэпрэсій і выявіў метады супраціву гэтай практыцы. З 1977 і да падзення ваеннай дыктатуры ў Аргентыне ў 1983 г. маці «зніклых» левых актывістаў раз на тыдзень збіраліся насупраць прэзідэнцкага палаца і патрабавалі звестак пра сваіх дзяцей. Некаторыя з мацярок таксама «зніклі», але ўрад быў вымушаны абмежаваць рэпрэсіі. Па-першае, калі няма прысуду, няма віны, таму мацярок немагчыма было выдаваць за ворагаў або сваякоў ворагаў. Па-другое, культурная традыцыя не прымала пераследу мацярок – ён прыносіў рэжыму кепскую славу. Па-трэцяе, матывы руху мелі афарбоўку гуманістычную, а не палітычную, таму жанчынам спачувала грамадства. І нарэшце, паколькі акцыі адбываліся рэгулярна і ў цэнтры сталіцы, на мацярок звярнулі ўвагу замежныя СМІ. З аднаго боку, гэта зніжала рызыку рэпрэсій, з іншага, закранала грамадскую думку на ўсім свеце.

У чым розніца паміж беларускім і аргентынскім выпадкамі? У

Беларусі колькасць «зніклых» параўнальна невялікая – іх можна назваць пайменна, між тым як у Аргентыне людзі «знікалі» дзясяткамі тысяч. Розніца ў маштабе рэпрэсій уплывае на грамадскі давер да заяў пра «знікненні» – людзі знікаюць нават у краінах сталай дэмакратыі, але там знікненні рэдка звязаныя з дысідэнцкай дзейнасцю. Скарачаюцца і магчымасці пратэсту – хоць маці з Пласа-дэль-Маё было адносна няшмат, яны абапіраліся на патэнцыйна вялізныя чалавечыя рэсурсы. Да таго ж беларускіх дысідэнтаў часта затрымліваюць пасля публічных акцый, але большасць з іх урэшце выходзіць на волю (узнікае пытанне, чаму ўлады так дыферэнцыявана падыходзяць да арыштаваных?). У Аргентыне ў 1976–1983 гг. усё было іначай. Больш за тое, калі аргентынскія «зніклыя» паходзілі з ніжэйшага сярэдняга класа або выказвалі яго інтарэсы, беларускія «зніклыя» належалі да невялікай групы палітычнай і інтэлектуальнай эліты, таму шырокая грамадскасць у значна меншай ступені схільная атаясамліваць сябе з імі. Урэшце, інфармацыі пра «зніклых» у Аргентыне патрабавалі амаль выключна іх блізкія сваякі, чаго нельга сказаць пра Беларусь. Датычна палітзняволеных у Беларусі і Аргентыне выяўляюцца прыкладна тыя самыя адрозненні.

Варта спыніцца і на форме правядзення Дня Салідарнасці. Сапраўды, каб выключыць святло і запаліць свечку, не трэба вялікіх фізічных высілкаў. Аднак гэтае дзеянне звязанае з візуальнай ідэнтыфікацыяй прыхільнікаў апазіцыі ў вачах урадоўцаў і іх прыхільнікаў. Такім чынам, удзельнікам акцыі яна можа дорага абысціся – тым даражэй, чым больш прыхільнікаў цяперашняй улады ў той ці іншай мясцовасці.

Калі цвёрдыя прыхільнікі апазіцыі або ўладаў паводзяць сябе згодна са сваімі перакананнямі, тыя, хто настроены нейтральна або вагаюцца (ад іх пераважна і залежыць зыход выбараў), звычайна схіляюцца да тэндэнцый, што пераважаюць у іхным асяродку. Такім чынам, у жылых раёнах, дзе большасць складаюць прыхільнікі апазіцыі, «нерашучыя» могуць падтрымаць акцыю, а ў праўрадавых раёнах атрымаецца супрацьлеглы эфект. У Беларусі актыўных апазіцыянераў – меншасць, таму дзейснасць акцыі рэзка зніжаецца.

Трэба адзначыць, што варыянты паводзін датычна акцыі выразна асіметрычныя (удзел – бяздзеянне), а значыць, улады апынуцца ў прывілеяваным стане: кожнае акно, дзе не гараць свечкі, можна расцэньваць як знак падтрымкі ўрада. Чыста візуальна акцыя пройдзе менш заўважна ў сельскіх раёнах, дзе жыве больш прыхільнікаў улады, чым у раёнах шчыльнай гарадской забудовы. Такім чынам, акцыя дэманструе, хутчэй, наяўнасць расколу, чым кансалідацыю вакол апазіцыі.

Дзень Салідарнасці меў абмежаваную інфармацыйную вартасць – з вышэйназваных прычын акцыя не выявіла рэальных дадаць, што, суадносін сілаў паміж апазіцыяй і ўладай. У стратэгічным плане дапушчаная памылка, бо ініцыятары не ўлічылі ці паведамлення агульнага ўплыву апазіцыі, ні яе слабасці ў рэгіёнах. Акцыя нагадвае рассеяную атаку малымі сіламі, замест таго, каб сканцэнтраваць іх там, дзе можна было б дасягнуць лакальнай перамогі. (Напрыклад, у 1933 г., калі падтрымка нацыстаў на парламенцкіх выбарах упала, тыя засяродзілі ўвесь свой прапагандысцкі рэсурс на мясцовых выбарах у маленькай правінцыі Ліпе-Дэтмольд і скарысталі іх вынікі як сведчанне росту свайго аўтарытэту.) Дзень Салідарнасці можа прынесці вынікаў, супрацьлеглых чаканым, – дэманстрацыя слабасці, выкліча эфект «прычапнога вагона»: людзі схільныя падтрымліваць той бок, які відавочна перамагае.

Пераклаў з англійскай Уладзімір Паўловіч паводле аўтарскага рукапісу: Nerijus Prekevičius. Belarusian opposition in preparation for the presidential elections of 2006: discourse and actions.

* Варта дадаць, што, пачаўшы паведамлення Акцыя «Свабода» ад 16 кастрычніка 2005 г., «большасьць ведчаных мерчыкоў да слабых,* што нічога не ведалі пра такую акцыю [Дзень Салідарнасці]. Пры паралізаваным незалежным друку арганізатары спрабавалі шырыць інфармацыю праз улёткі, Інтэрнэт і мабільную сувязь.

Аднак, напрыклад, мабільны аператар Velcom заблакаваў адзін з нумароў пасьля таго, як яго ўладальніца разаслала некалькі паведамленняў пра акцыю». – *Заўв. перакл.*

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/15
[image]

[image] [image] [image]

Эндру Ўілсан Шанцы «адзінага» на выбарах-2006

ЭНДРУ ЎІЛСАН
(нар. у 1961) – брытанскі палітолаг, выкладчык украіназнаўства ў Школе славянскіх і ўсходнееўрапейскіх даследаванняў Лёнданскага універсытэту. Вялікі сябар Беларусі. Ягоная апошняя кніжка «Virtual Politics. Faking Democracy in the Post-Soviet World» разглядаецца ў гэтым жа нумары «ARCHE».

У аб’яднанай апазыцыі цяпер ёсьць адзіны кандыдат. Сапраўды ёсьць? Як выглядаюць ягоныя пэрспэктывы на 2006 г.? Па-першае, трэба адкрыта прызнаць пэўныя істотныя слабасьці. Беларуская апазыцыя знаходзіцца пад уплывам эфэкту дэманстрацыі*, створанага Памаранчавай рэвалюцыяй ува Ўкраіне, але яе зыходныя пэрспэктывы выглядаюць значна горш. Аляксандар Мілінкевіч – гэта вам не папулярны экс-прэм’ер, як Віктар Юшчанка. Поруч зь ім няма і свайго адпаведніка Цімашэнкі. «Нацыянальна-дэмакратычная» апазыцыя, што падтрымлівае Мілінкевіча ў Беларусі, не прайшла таго доўгага працэсу перабудовы, які так пасьпяхова ўдалося правесьці Юшчанку ў 2001–2004 гг. (настолькі пасьпяхова, што ён пакінуў сваіх паплечнікаў ззаду). Найбольш нечаканым посьпехам Юшчанкі стала трансфармацыя рэгіянальнай прыроды ўкраінскае палітыкі праз стварэньне альянсу паміж заходняй і цэнтральнай Украінай. Дадайце сюды прыцягненьне значнай колькасьці выбарнікаў з разьвітым пачуцьцём грамадзянскага абавязку на ўсходзе і поўдні – тых, хто галасаваў супраць карупцыі старога рэжыму. У Беларусі такой перабудовы не было – апазыцыя па-ранейшаму хіліцца на адзін бок, абапіраючыся збольшага на «ўдарныя групы» менскіх

Удзельнай вагой у дадзеным выпадку валодаюць сацыяльныя ўзаемадзеянні, якія ствараюць сеткавыя структуры. Менавіта ў 2006 г. ён прыняў форму «Нашай Украіны», якую ўзначаліў Віктар Ющанка. У 2004 г. ён ператварыўся ў «Нашу Украіну» (Ющанка, Віктар Андрыйавіч).

Ёсць яшчэ адно ключавое адрозненне ўла Украіне ў 2004 г. і ўлада пачатку 2000-х гг. і заключаецца ў Ющанкам, калі ўлада пачала ўцісканне інтарэсаў пасля таго, як яны ў 2002 г. упершыню падтрымалі Ющанку. У Беларусі няма сваіх Лавыда Жванія, Яўгена Чэрванёнкі і Пятра Парашэнкі. Не было і нічога падобнага да ўраду Ющанкі, які ў 1999–2001 гг. стварыў гэтых людзей (Жванія), альбо да «справы Гангадзэ», што падштурхнула іншых зь іх да ўцёкаў з Кучмавага карабля (Парашэнка). Варта нагадаць, што вырашальным чыннікам у першай перамозе Лукашэнкі ў 1994 г. была значная падтрымка з боку бізнэсоўцаў (Міхаіл Чыгір і «Белаграпрамбанк», Аляксандар Саманкоў дый нават Аляксандар Пупейка і «Пушэ» * усіх іх напаткаў сумны лёс).

Беларусь не сутыкалася і з унутраным эфэктам дэманстрацыі, адпаведным посьпеху «Нашай Украіны» на выбарах у Вярхоўную раду ў 2002 г., і кампаніі «Украіна бяз Кучмы» ў 2001 г. Цяперашні стан Беларусі хутчэй нагадвае сытуацыю ўва Ўкраіне ўзімку 2000–2001 гг. Тады апазыцыя была здэмаралізаваная неафіцыйным абяцаньнем Кучмы ўсталяваць пасьля свайго пераабраньня ў 1999 г. «максымальна жорсткі парадак» і ня здолела мабілізаваць сваіх сілаў, калі выбухнуў скандал зь зьнікненьнем Гангадзэ. «Адміністрацыйныя» ж умовы ў Беларусі цяпер відавочна больш жорсткія, чым падчас апошніх прэзыдэнцкіх выбараў у 2001 г. У 2004 г. парлямэнцкія выбары праз драконаўскія захады яшчэ на этапе рэгістрацыі кандыдатаў скончыліся, не пасьпеўшы пачацца. Нават калі прэзыдэнцкія выбары 2006 г. будуць праходзіць паводле крыху вальнейшых правілаў, усё роўна яны застануцца далёка не супастаўнымі з украінскімі ў 2004 г., калі ключавым чыннікам адноснае свабоды была звышпэўненасьць уладаў у перамозе. Магчыма, Лукашэнка ўжо вырашыў, зь якой перавагай ён выйграе ў 2006 г., і, хутчэй за ўсё, ён даб'ецца свайго – адрозна ад Януковіча, які ў 2004 г. не забясьпечыў сабе падтрымкі мясцовых уладаў.

Змешчаны тэкст быў напісаны адмыслова на замову «ARCHE».

* Эфэкт дэманстрацыі – зьмены ў паводзінах людзей, спрычыненыя назіраньнем за дзеяньнямі іншых. У паліталёгіі гэтым тэрмінам пазначаецца каталітычны уплыў падзеяў у адным месцы на разьвіцьцё сытуацыі ў іншым. – *Заўв. перакл.*

Агулам кажучы, няясна нават, ці сапраўды апазыцыя можа з упэўненасьцю разьлічваць на тое, што стартуе з тымі 15,4 % галасоў, якія заваяваў Уладзімер Ганчарык у 2001 г. Амэрыка можа паспрабаваць узяць пад сваю апеку слабы бок, адыграўшы ў Беларусі ў 2006 г. тую ролю, якую ў 2004 г. ёй памылкова прыпісвалі ўва Ўкраіне многія крытыкі на Захадзе. У красавіку 2005 г. Кандаліза Райс заявіла, што Беларусь «застаецца апошняй сапраўднай дыктатурай у сэрцы Эўропы», і заклікала да «дэмакратычнага разьвіцьця… Там ёсьць арганізацыі і групы грамадзянскае супольнасьці, што просяць астатні сьвет прызнаць іх і даць ім месца, каб збудаваць свой дом». З гэтых сьцьверджаньняў вынікае, што Амэрыка наперад упэўненая ў выніках галасаваньня і хоча, каб Лукашэнка сышоў, незалежна ад таго, пераможа ён на выбарах ці не. Але Лукашэнка не дапусьціць падтрымкі мясцовых НДА з Захаду, і таму Вашынгтон ня зможа сьцьвярджаць, як у 2004 г. ува Ўкраіне, што, маўляў, яго галоўная мэта – каб усё было ў рамках закону. Таму памеры прыхаванага фінансаваньня апазыцыі, відаць, перавысяць сродкі, выдаткаваныя ўва Ўкраіне. Магчыма, Вашынгтон, каб ператварыць адносную большасьць галасоў у пераважную бальшыню, таксама пойдзе на падтрымку пратэстаў супраць выкарыстаньня Лукашэнкам адміністрацыйнага рэсурсу. Гэта сапраўды махлярства, але яго выкрыцьцё ня будзе мець тае маральнае сілы, як магчымасьць абвясьціць, што твой кандыдат сапраўды *перамог*. Акурат відавочная перамога Юшчанкі ў лістападзе 2004 г. дый відавочнасьць нахабных, у апошні момант учыненых падтасовак вывелі на вуліцы натоўпы людзей і ператварылі дэманстрацыі з паасобных акцыяў пратэсту ў сапраўдную народную рэвалюцыю. Да таго ж нішто не змушае Лукашэнку прымаць місію новых Квасьнеўскіх і Адамкусаў. У Беларусі інтэнсіўнае ўмяшаньне пад кіраўніцтвам ЗША можа лёгка і нечакана прывесьці да адваротных вынікаў, бо падкіне ў рукі Лукашэнкі яшчэ адну казырную карту дый дасьць яшчэ адну падставу пляжыць апазыцыю.

Асаблівасьць Беларусі і ў тым, што тут рэальная палітыка ў значнай ступені чыніцца ў іншых месцах. Лукашэнка гуляе паводле прынцыпу «падзяляй і ўладар» ня столькі зь мясцовай апазыцыяй, як зь мясцовай намэнклятурай. Бюракратам тут

ніколі не дазваляецца замацавацца пры ўтульных сынэкурах. Ягор Рыбакоў, былы кіраўнік Беларускага тэлебачаньня, у лютым асуджаны за крадзеж у асабліва буйных памерах на адзінаццаць гадоў; Галіна Жураўкова, былая кіраўнічка Ўпраўленьня справамі Адміністрацыі прэзыдэнта, атрымала ў 2004 г. чатыры гады. Нацкоўваюцца адна на адну і ўстановы: Міністэрства ўнутраных справаў супраць КДБ, КДБ супраць уласнай службы бясьпекі Лукашэнкі. Кімітака Мацузата па-майстэрску прадэманстраваў, як Лукашэнка тасуе рэгіянальных кіраўнікоў, каб прадухіліць стварэньне мясцовых камандаў, падобных украінскім. Гэта, у сваю чаргу, не дае паўтарыць яшчэ аднаго дасягненьня Юшчанкі-апазыцыянэра – той здолеў навесьці масты з пэўнымі элемэнтамі Кучмавага рэжыму. Іх хапіла, каб забясьпечыць выкананьне прынятага 8 сьнежня 2004 г. у выніку перамоваў рашэньня, хаця, як бачым, Юшчанка мусіў пайсьці на зашмат кампрамісаў з старой гвардыяй. Урэшце, акурат праз увесьчасныя ператасоўкі, сыстэма, збудаваная Лукашэнкам, можа аказацца больш крохкай: здольнай утрымліваць уладу, але няздольнай эвалюцыянаваць. Праўда, гэта ўжо іншае пытаньне.

Пакуль што мы бачылі няшмат прыкметаў унутранага расколу беларускага рэжыму. Аднак хутка могуць зьявіцца расколы ў апазыцыйным лягеры, рэальныя альбо штучныя. Беларускі рэжым, відаць, можа зьвярнуцца да адміністрацыйных тэхналёгіяў, каб забясьпечыць патрэбныя вынікі выбараў 2006 г., і да традыцыйных аўтарытарных мэтадаў, каб загадзя запужаць насельніцтва. Аднак звычайная выбарчая арытмэтыка адкрывае зручную магчымасьць для іншых мэтадаў з галіны паліттэхналёгіяў. Лукашэнка зазвычай зьбірае ад 40 да 50 % галасоў, традыцыйная ж апазыцыя – ня больш за 15 %, а значыць, застаецца яшчэ вялікі абсяг для «трэцяй сілы». Як правіла, «трэція сілы» робяцца аб'ектамі маніпуляцыяў з боку паліттэхнолягаў па адной зь дзьвюх прычынаў. Паводле першага сцэнара (як то ў Расеі ў 1996 г. ці ўва Ўкраіне ў 1999-м), кандыдат ад улады не карыстаецца папулярнасьцю, і ягоныя тэхнолягі імкнуцца да канфрантацыі зь яшчэ больш непапулярным апанэнтам (у абодвух выпадках гэта быў камуністычны лідэр). Каб забясьпечыць штучную палярызацыю выбараў, трэба было аслабіць патэнцыйную «трэцюю сілу»

(Яўлінскі–Фёдараў у 1996 г., Аляксандар Мароз у 1999 г.).

У Беларусі ў 2001 г. улада кіравалася цалкам адваротнай стратэгіяй. Лукашэнка быў сапраўдным абраньнікам адноснае, калі не пераважнае, большасьці выбарцаў. Ён хацеў пазьбегнуць палярызацыі, якая падштурхнула б усіх патэнцыйных выбарцаў-антылукашэнкаўцаў аб'яднацца вакол адзінага полюсу. Таму, каб ня даць Ганчарыку набраць больш за 15,4 % галасоў, падтрымлівалася штучная «трэцяя сіла» – Гайдукевіч.

У 2006 г. папулярнасьць Лукашэнкі будзе ўжо ніжэйшая, як у 2001 г. Аднак ён па-ранейшаму далёка апярэджвае апазыцыю. Паводле зьвестак НІСЭПД, папулярнасьць Лукашэнкі ў чэрвені 2005 г. зьнізілася да 41,7 %, а рэйтынг Мілінкевіча быў на ўзроўні ўсяго 0,8 %. Таму, відаць, любы праект «трэцяй сілы» ў 2006 г. будзе больш нагадваць ня першы, а другі сцэнар.

Цяпер гэтую ролю выконвае Аляксандар Казулін, колішні рэктар Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту, які вельмі нагадвае чыйсьці «праект». Казулін засяроджвае агонь сваёй крытыкі ў асноўным на іншых прадстаўнікох апазыцыі, таму падобна, што ён у адной зьвязцы з Лукашэнкам; а ягонае падкрэсьленае русафільства наводзіць на думку пра крамлёўскую падтрымку. Сяргей Гайдукевіч знаходзіцца ў рэзэрве, каб адыграць ролю Жырыноўскага – палітычнага блазна і зьнішчальніка супольных супернікаў. Магчыма, перайменаваньнем праспэкту Машэрава Лукашэнка хацеў папярэдзіць, што гэтаксама хутка з далягляду можа зьнікнуць і ягоная дачка. Але нельга ўжо зусім выключаць магчымасьці, што яе зноў прымусяць паслужыць, хаця ізноў гэтым, верагодна, зоймецца Расея. Прынамсі, няцяжка дапусьціць, што кампаніяй будуць займацца расейскія паліттэхнолягі, для якіх няма занадта цынічных праектаў.

Аднак перашкодай для Расеі можа стаць абмежаванасьць яе ўплыву, бо ў Беларусі «незалежным» паліттэхнолягам, бадай, няма дзе разгарнуцца. Расеі патрэбныя правільныя праваднікі ейных інтарэсаў – пра гэта сьведчыць няўдача атакі з двух флянгаў на камуністаў Уладзімера Вароніна (46 %) падчас выбараў у Малдове ў лютым сёлета. Пакуль ня факт, што нават Казулін будзе тым самым правільным інструмэнтам.

Магчыма, улады паспрабуюць дабіцца, каб выбары не ператварыліся ў небясьпечна палярызаваны рэфэрэндум аб даверы Лукашэнку і пры дапамозе маніпуляцыяў з *«драматургіяй»* выбараў. Адзін з урокаў украінскай кампаніі 2004 г. у тым, што паліттэхнолягі Януковіча не патрапілі эфэктна разыграць карту «пудзіла». Не было створана вобразу відавочнага ўнутранага ці вонкавага «ворага», які б падштурхнуў выбарцаў галасаваць за Януковіча як за «меншае ліха». (Вобраз-пудзіла «ўкраінскіх нацыяналістаў» выглядаў занадта ненатуральна.) Сапраўды, Сяргей Маркаў адкрыта шкадаваў, што перад другім турам Януковіч не пусьціў у ход «польскай карты»: «Я казаў ім [камандзе Януковіча] выкарыстаць антыпольскую рыторыку»[1]. Лукашэнка ўзяўся даць рады з гэтай задачай. Здаецца, што насамрэч у сваіх нядаўніх антыпольскіх захадах улады кіраваліся разьлікам на тое, што галоўным апазыцыйным кандыдатам стане Мілінкевіч. Мілінкевіч паходзіць ня проста з заходняй Беларусі, а з самое Горадні – там месьціцца штаб-кватэра Саюзу палякаў, які сутыкнуўся зь перасьледам з боку ўладаў. Тое, што ён належыць да традыцыйна праваслаўнай сям'і, верагодна, ня спыніць спробаў Лукашэнкавага лягеру выставіць яго марыянэткай Польшчы і Ватыкану.

Зь іншага боку, у апазыцыі ёсьць і некаторыя падставы для аптымізму. Памаранчавая іскра яшчэ можа распаліць вялікае полымя. Зьмяніўся міжнародны кантэкст. Здаецца, Расея асуджаная падтрымліваць Лукашэнку, пакуль ня зьявіцца відавочная альтэрнатыва – а Лукашэнка не пашкадаваў намаганьняў, каб прадухіліць яе зьяўленьне. Але расейская падтрымка будзе адносна млявай. Лукашэнку ўжо не гарантаванае нават крытычнае (ужо ня кажучы пра некрытычнае, як у 2001 г.) асьвятленьне ягонай кампаніі ў расейскіх СМІ. Зьмяшчэньне і стаўленьне Захаду да беларускіх выбараў. У 2001 г. намаганьнямі аб'яднаць апазыцыйныя сілы кіравала АТВ, але гэта была недарэчная спроба ўзнавіць умовы, пры якіх у 2000 г. удалося скінуць Слабадана Мілошавіча. У 2006 г. могуць зноў пераацаніць сілу апазыцыі, але гэтым разам да іх далучыцца Эўразьвяз, перадусім яго новыя чальцы, якім большым прагматызмам вызначаюць рэалістычныя мэты.

1 Выказванне датавана 30 лістапада 2005 г. Мэтай Франчэска. Spin Doctors Blame Yanukovych Defeat // The Moscow Times. 2004. 30 November.

Ня выключана, што апазыцыя мае больш магчымасьцяў, чым ёй здаецца. Аб'яднаная апазыцыя – гэта добра. Але зусім не абавязкова адзіны кандыдат – гэтак жа добра. Адзіны апазыцыйны кандыдат рызыкуе быць загнаным у традыцыйнае гета перакананых прыхільнікаў апазыцыі, тады як другі кандыдат у тандэме мог бы паспрабаваць выйсьці на шырэйшыя колы электарату. Мабыць, апазыцыі варта было б узяць на ўзбраеньне адзін з хітрыкаў расейскіх паліттэхнолягаў дый завесьці сабе «дублёра», які пазьней перадасьць сваю долю электарату Мілінкевічу – ці наадварот.

І нават калі апазыцыя ня можа разьлічваць на перамогу, яна можа спадзявацца зьмяніць сам агульны настрой. Калі палітыка – гэта «мастацтва магчымага», дык выбарчая кампанія, якая падвысіць узровень грамадзянскай актыўнасьці, перавызначыць практычныя рамкі, у якіх дзейнічае Лукашэнка. Ён, не вагаючыся, пры неабходнасьці зьвяртаецца да «традыцыйных» аўтарытарных мэтадаў: запалохвае насельніцтва, зьнявольвае апанэнтаў і мадэлюе вынікі выбараў. Але Беларусь – не Ўзбэкістан. Лукашэнка мо й хутчэй ідзе на рызыку, чым Кучма, але ён аддасьць перавагу перамозе, здабытай (калі гэта магчыма) недарагой цаной. Апазыцыя можа таксама паспрыяць паступоваму ператварэньню Лукашэнкі ў своеасаблівага эклектычнага «беларускага савецкага» нацыяналіста, і нават прагматычнага палітыка, што ўсьведамляе асаблівасьці становішча Беларусі пасьля 2004 г. як краіны, што мяжуе з «Новай Эўропай» – пашыраным Эўразьвязам. Таму на выбарах 2006 г. шмат што будзе пастаўлена на карту.

Пераклаў з ангельскай Сяргей Богдан

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/15

[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]2005

• крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Віталь Зайка Колькі нацыянальнага ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі?

ВІТАЛЬ ЗАЙКА нарадзіўся ў 1961 г. у Лагойску. Скончыў фізфак БДУ. Супрацоўнік нью-ёрскага «Цэнтру габрэйскай гісторыі». Дасьледуе беларуска-габрэйскія дачыненьні. Апошняя падрыхтаваная сваёй публікацыя – артыкул «Беларуская літаратура» ў «Энцыкляпэдыі ўсходнеэўрапейскага габрэйства» (выйдзе ў 2006).

Цяжка дакладна сказаць, што рухала прэзыдэнтам Лукашэнкам, калі ў 2002 г. ён падпісаў Указ № 153 «О строительстве нового здания государственного учреждения «Национальная библиотека Беларуси». У кожным разе гэта былі ня «мэты больш поўнага задавальненьня інфармацыйных запытаў грамадзтва», як запісана ўва ўказе, – варта толькі разгледзець стан гэтых «інфармацыйных запытаў» больш дэталёва. Да таго ж Лукашэнка ня лічыць Беларусь сваёй краінай (на 60-й Генасамблеі ААН ён на ўвесь сьвет заявіў, што ягоная краіна – СССР), таму кожную праяву клопату аб беларускай культуры трэба ўспрымаць як калі ня цуд, дык прынамсі як дабрадзейства.

Якім жа клопатам ахінуў прэзыдэнт бібліятэкі краіны? У гэтай галіне назіраецца сталы заняпад. На сайце Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусі, на старонцы «Ў люстры статыстыкі» можна прачытаць, што за 2000–2004 гг. (эпоха «сьпелага» лукашызму) колькасьць публічных бібліятэк у Беларусі зьменшылася на 490 (чатырыста дзевяноста!), дзіцячых бібліятэк – на шэсьць. Штогадовая агульная

колькасьць выдачы кніг зьменшылася за гэты ж час на 2 мільёны 915 тысяч асобнікаў. Колькасьць дарослых чытачоў зьменшылася на 172 тысячы чалавек, дзіцячых чытачоў – на 97 тысяч чалавек. Ці не гаворыць гэта пра зьмяншэньне «інфармацыйных запытаў»? З афіцыйнай статыстыкі руху бібліятэчных фондаў відаць, што кожны год фонды зьмяншаюцца больш чым на мільён асобнікаў. Колькасьць бібліятэчных работнікаў за вышэйназваны пэрыяд скарацілася на 289 чалавек. Тут можна запярэчыць, што ў век Інтэрнэту патрэба ў бібліятэках зьмяншаецца. Але досьвед і статыстыка разьвітых краінаў паказваюць, што кампутарызацыя й інтэрнэтызацыя толькі падвышаюць доступ да кніг, а самі бібліятэкі робяцца асяродкамі кампутарызацыі й бясплатнага карыстаньня сецівам, гэта значыць, становяцца больш запатрабаваныя. Да таго ж зьмяншэньне колькасьці бібліятэк і чытачоў у Беларусі не суправаджаецца адпаведным павышэньнем колькасьці кампутараў, электронных кніг і г. д. Наўрад ці пабудова шклобэтоннага «дыямэнта» для «дзяржаўнай установы» на ўскрайку сталіцы можа вырашыць сур'ёзныя праблемы зь бібліятэчнай справай у краіне. Дарэчы, зьнікаюць ня толькі бібліятэкі, але й музэі, «установы клюбнага тыпу» і г. д. Сфэра культуры відавочна ня ёсьць прыярытэтам для цяперашняга прэзыдэнта, а сфэры культуры нацыянальна беларускай не існуе для яго наагул.

Выглядае, што за траскучымі фразамі аб «фармаваньні ўнівэрсальных інфармацыйных рэсурсаў», «забесьпячэньні доступу да аналітычна-сынтэтычных зьвестак» хаваюцца рэчы больш празаічныя. Рэч першая: бібліятэка ў новым будынку – трыюмф «палітыкі прэзыдэнта ў галіне нацыянальнай культуры», кляп у рот усім крытыкам і цудоўны кавалак прапаганды для надыходзячай прэзыдэнцкай кампаніі. Рэч другая: вызваленыя будынкі й тэрыторыя выкарыстоўваюцца дзеля пашырэньня комплексу «Палац прэзыдэнта РБ» і ўзмацненьня бясьпекі «першай асобы». Чаму б ёй адкрыта не сказаць людзям, што ёй патрэбныя пераканаўчыя аргумэнты на трэці прэзыдэнцкі тэрмін ці што павялічылася пагроза прэзыдэнцкаму жыцьцю? «Электарат» зразумеў бы. Сытуацыя зь перасяленьнем Нацыянальнай бібліятэкі нагадвае сытуацыю з сумнавядомым высяленьнем дыпляматаў з пасёлку Дразды

ўлетку 1998 г. Тады таксама т. зв. патрэба «паляпшэньня ўмоваў» для дыпляматаў (што абярнулася высяленьнем) узьнікла празь цікавасьць да апэтытнага кавалку нерухомасьці і ўмацаваньня бясьпекі прэзыдэнта ад заморскіх супастатаў.

Але вернемся да бібліятэкі. Да Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Як вядома, Нацыянальная бібліятэка кожнай краіны ёсьць атрыбутам яе сувэрэнітэту і незалежнасьці, гэтаксама як сьцяг, гімн, войска, валюта і г. д. Фонд Нацыянальнай бібліятэкі – гэткае ж, калі ня большае, багацьце кожнай краіны, як дзяржаўны скарб ці залаты запас. Гэта гарантыя й неабходная ўмова культурнага і навуковага разьвіцьця, прагрэсу канкрэтнай нацыі. Які ж сёньня стан гэтага нацыянальнага атрыбуту ў сувэрэннай Рэспубліцы Беларусі? Пачнём з назвы: Государственное учреждение «Национальная библиотека Беларуси». Ці існуе афіцыйная назва па-беларуску – невядома, бо на сайце яе не відаць.

Цяпер паглядзім на сэрца кожнай бібліятэкі – яе каталёг. У бібліятэцы ж Нацыянальнай ён мусіць быць сэрцам усёй бібліятэчнай сыстэмы, больш за тое – усёй сыстэмы інфармацыйных рэсурсаў краіны. Асабіста я лічу, што каталёг і сыстэма каталягізацыі – спосаб прывязаньня сваёй культуры, сваёй цывілізацыі да прасторы сусьвету. Гэта разьмяшчэньне ўласных ведаў і здабыткаў нацыі ў сыстэме ведаў усяго чалавецтва. Таксама гэта – праява нацыянальнага сьветагляду. І тут з сумам трэба канстатаваць, што справа і з каталёгам, і з Нацыянальнай бібліятэкай наагул дакладна адлюстроўвае незайздросны стан нацыянальнай культуры, і ганебны стан нацыянальнай псыхалёгіі сёньняшніх беларусаў. Лукашэнка – палітык інстынктыўны. Ён займаецца сэрфінгам на хвалях народных. І тое, што пакуль ён добра трымаецца на паверхні, паказвае, што вышыня ды напор хваляў добра адчутыя і пралічаныя. І прадказальныя. Ня дзіва, што з стаўленьнем Лукашэнкі да Нацыянальнай бібліятэкі досыць блізка карэлюецца стаўленьне насельніцтва (абыякавасьць).

Каталёг НББ, як і паўсюль у сучасных бібліятэках, карткавы й электронны. Карткавы каталёг – спадчына часу, ягоная сыстэма – савецкая, прынцыпы й мэтодыка складаньня – з Масквы. На

свой час гэта ўспрымалася натуральна, так як і надпіс «НА БЕЛОРУССКОМ ЯЗЫКЕ» па-расейску ззаду ў кожнай беларускамоўнай кнізе. А што ж сёньня, у незалежнай Беларусі? Электронны каталёг Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі складаўся ўжо пасьля 1991 г., але ён вядзецца па-расейску і капіюе прынцыпы адпаведных каталёгаў Расейскай Фэдэрацыі. Тое ж і зь бібліяграфічнай службай – Расея-матухна вытыркаецца адусюль. Выходзіць, што і тут беларусы ня выйшлі (або: ім не даюць выйсьці) з фазы раньняга маленства, «працягваюць мяць цыцку замест каб пачаць есьці лыжкай», як трапна, хоць і зь іншай нагоды, адзначыў адзін з аўтараў «ARCHE». Яскравым прыкладам «мяцьця цыцкі» ёсьць сайт Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі ў Інтэрнэце. Мовы сайту – толькі расейская і ангельская. Па-беларуску – толькі караценькія паведамленьні на расейскамоўнай старонцы, якія трэба шукаць праз увесь сайт. Опцыя пошуку ў он-лайнавым каталёгу й тлумачэньні – толькі па-расейску. Ствараецца ўражаньне, што памылкова трапіў на сайт нейкай абласной бібліятэкі Расеі. Тут нават ёсьць нейкая тэлепатычная сувязь з постсавецкім скаротам афіцыйнай назвы нашай краіны. Паставіўшы ў пошукавіку «Нацбібліятэка» і «РБ», можна знайсьці й Нацыянальныя бібліятэкі Рэспублікі Башкартастану («імя Ахмэд-Закі Валіды») або Рэспублікі Бураціі – галоўныя бібліятэкі адпаведных правінцыяў («рэспублік») на тэрыторыі Расейскай Фэдэрацыі. Ці ня ў гэтым сэнсе прапісаў прэзыдэнт пра падвышэньне ролі НББ як «галоўнай бібліятэкі рэспублікі» ў сваім указе?

Вынясеньне Нацыянальнай бібліятэкі на мяжу сталіцы краіны – акт сымбалічны. Гэта выцісканьне на маргінэс набыткаў нацыянальнай культуры. З канца сёлетняга жніўня пачаўся пераезд НББ у новы будынак на ўскраіне Менску, будоўлю якога асабіста курыраваў Лукашэнка. Каля васьмі мільёнаў кніг павінны зьмяніць дысьлякацыю, і на найвышэйшы загад гэта мусіць адбыцца за некалькі месяцаў. Раней гэтыя кнігі ў такой колькасьці мянялі адрас толькі аднойчы: у 1944 г., калі нацысты вывезьлі фонды бібліятэкі, што называлася тады Дзяржбібліятэкай імя Леніна, у Ратыбор у Сілезіі. Цяперашні пераезд адлюстроўвае працэс трансфармацыі бібліятэкі, якая ад пачатку, з 1922 г., існавала як галоўная бібліятэка Беларусі.

У будынку на вуліцы Чырвонаармейскай, помніку канструктывізму (архітэктар г. Лаўроў) бібліятэка месьціцца з 1932 г. Тагачасная Бібліятэка Леніна дэ-факта была Нацыянальнай бібліятэкай нават да Незалежнасьці. Прынамсі, так разглядаў кожны неабыякавы беларус бібліятэку, дзе захоўваліся набыткі культуры ягонага народу, куды былі перададзеныя прыватныя зборы Карскага, Сапунова, Пічэты, Янчука, дзе зьберагаліся кнігі Бібліі Скарыны і першыя творы Дуніна-Марцінкевіча, Сыракомлі, Чачота, Багушэвіча, Купалы, Коласа, Багдановіча. Лёсу, аднак, было заўгодна, каб нацыянальны характар бібліятэкі быў заўсёды пад уціскам. Так было падчас зьнішчэньня беларусізацыі ў 1930-я, так ёсьць сёньня.

Зь пераездам ліквідуецца адмысловы беларускі аддзел, своеасаблівы «рэзэрват» і асяродак беларускасьці, які існаваў, дарэчы, ад пачаткаў бібліятэкі. Можна спрачацца пра тое, ці ў тэорыі сапраўднай Нацыянальнай бібліятэцы патрэбны аддзел тытульнай нацыі. У гэтым канкрэтным выпадку Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, на гэтым канкрэтным этапе 12-га году кіраваньня Лукашэнкі адказ можа быць адзін: так, жыцьцёва неабходны.

Афіцыйная беларуская культура – невялічкі дэкаратыўны апэндыкс рэжыму. Маштаб ейны ня зьменіць ані вялізны шклобэтонны шарападобны шматграньнік, збудаваны пад сядзібу Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, ані адрамантаваны Тэатар опэры й балету, высяленьне актораў зь якога, дарэчы, таксама нагадвала Дразды-1998. Афіцыйная культура поўніцца мярцьвячынай і кар'ерызмам. Усё, што ёсьць жывога і шчырага ў ёй – падобна да малога дзіцяці, якога гвалціць і зьбівае вялікі дарослы сваяк, змушаючы час ад часу танчыць і расказваць вершыкі гасьцям, каб паказаць, што «ўсё нармальна», «усё як у людзей».

Беларуская культура пакутуе на ненармальнасьць. Вось, здавалася б, і помнік Скарыну зьявіўся нарэшце ў Менску. Ля бібліятэкі, каля кніг… Але – на былым балоце, на ўскрайку. Напэўна, каб да помніка не пайшлі дэманстраваць нацыяналісты. Не бяда, што першадрукар з твару падобны да

першага прэзыдэнта РБ. Бяда, што ў хуткім часе з такой культурнай палітыкай, якую вядзе Лукашэнка, з адвольнымі перайменаваньнямі й перапісваньнем гісторыі, няшмат людзей змогуць сказаць, хто такі Скарына. А бяз надпісу на помніку нават могуць успрыняць скульптуру як помнік самому прэзыдэнту ў мантыі Адраджэньня.

Адзін мой добры знаёмы, пачуўшы пра пераезд Бібліятэкі, махнуў рукой: «Якая нацыя, такая й бібліятэка… А Беларуская бібліятэка – яна яшчэ не напісаная… Яна круціцца недзе ў нябёсах, у адной з дванаццаці сэфіротаў, і сыдзе на зямлю, уліецца ў літары, увасобіцца ў тэксты, калі сасьпеюць для яе чытачы».

Чытачы ўсё яшчэ сьпеюць. Але сьпеюць і гронкі гневу. За штодзённыя прыніжэньні, за растаптаную культуру, за апляваныя сьвятыні. І за шарападобны шматграньнік.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/15
[image]

АНДРЭЙ ЯГОРАЎ
палітолаг, супрацоўнік Агенцтва гуманітарных тэхналогіяў.

Андрэй Ягораў
Матэматыка контррэвалюцыі

Ягоная апошняя публікацыя ў «ARCHE» – рэцэнзія на кнігу Паўла Севярынца ў № 5/2005.

Складаныя паведамленні, што адрасант накіроўвае адрасату, маюць як мінімум тры складнікі: ідэя, рыторыка, дзеянне. Якасны аналітычны тэкст, як, напрыклад, тэксты Андрэя Суздальцава, утрымлівае ўсе тры элементы. Але калі з першым (ідэяй) і другім (рыторыкай) у тэкстах Андрэя Суздальцава ўсё больш-менш зразумела, то з апошнім узнікаюць некаторыя цяжкасці.

Аналітыка Суздальцава якасная і тонкая. Але па які бок барыкады[1] знаходзіцца А. Суздальцаў і ягоная аналітыка?

АНАЛІТЫЧНАЕ МАДЭЛЯВАННЕ

Нераздзеленая палітычная рэчаіснасць набывае сэнс для даследчыка, калі падводзіцца пад нейкія раней выпрацаваныя тлумачальныя мадэлі ці тэорыі. Зыходзячы з папярэдняй веды, аналітык тлумачыць нейкія падзеі (што можа і не даваць новай веды) альбо праектуе і ажыццяўляе даследчыцкія дзеянні, праз якія можа набываць новую веду, для пабудовы мадэляў, тэорый ці іх карэктавання.

Палітычнае поле Беларусі (sit 1)

Кожнаму гульцу палітычнага поля можна надаць умоўныя вагавыя каэфіцыенты, паводле правіла (1.1): чым большы

вагавы каэфіцыент прысвоены актору, тым большы ягоны шанец атрымаць перамогу ў канфлікце з акторам, які мае меншы вагавы каэфіцыент. Ці, калі прасцей, у канфлікце перамагае той актор, чый вагавы каэфіцыент большы. Будзем лічыць, што пры роўных вагавых каэфіцыентах большы шанец на перамогу мае той, хто выйграў у канфлікце мінулы раз (правіла 1.2). Аналізуючы тэксты Суздальцава, каэфіцыенты можна размеркаваць наступным чынам:
– ці, напрыклад, расійскія інтарэсы, якім А. Суздальцаў надае найбольшую ўвагу:

Сцэнуючы палітычны працэс у Беларусі, А. Суздальцаў выдзяляе наступных актораў:

Актор (асноўны)	Дэталізацыя
1. Расія	1.1. Масква (Крэмль, Пуцін)
	1.2. Расійскае прарэжымнае лобі
	1.3. Расійскае праапазіцыйнае лобі
2. Беларускі рэжым	2.1. Лукашэнка
	2.2. Бліжэйшае атачэнне Лукашэнкі
	2.3. Наменклатура
	2.4. Генералітэт
3. Беларуская апазіцыя	3.1. Партыйная апазіцыя
	3.2. Неасацыяваная апазіцыя
4. Беларускае грамадства	4.1. Грамадзянская супольнасць
5. Захад	5.1. Захад

	Актор	Вага	Моц
1.1	Расія (Масква, Крэмль, Пуцін)	8	8
1.2	Расійскае прарэжымнае лобі	-2	

[1] «Барыкада» у мяжа, якая падзяляе сацыяльныя дубінкі на два бакі такім чынам, што ахоўвае ад татальнага зніштажэння кожны з бакоў. У дачыненні да Беларусі гэткая «барыкада» аддзяляе грамадзянскую супольнасць ад варожага ёй рэжыму.

1.3	Расійскае праапазіцыйнае лобі	-1	
2.1	Лукашэнка	3	6
2.2	Бліжэйшае атачэнне Лукашэнкі	1	
2.3	Наменклатура	1	
2.4	Генералітэт	1	
3.1	Партыйная апазіцыя	2	3
3.2	Неасацыяваная апазіцыя	1	
4.1	Беларускае грамадства	3	3
5.1	Захад	8	8

Вось такая фармалізаваная аналітычная мадэль паводле Суздальцава. У гэты момант у гэтай мадэлі мы маем нешта накшталт раўнавагі (пры ўмове кансалідацыі грамадзянскай супольнасці з апазіцыяй). Сітуацыю змяняе альбо пераход наменклатуры ці генералітэту на другі бок, альбо ўмяшальніцтва вонкавых актораў, альбо з'яўленне іншых гульцоў на полі.

Кожны з актораў мае інтарэсы ў адносінах адзін да аднаго і сітуацыі ў цэлым, што можна падаць як пары ўзаемных адносін. Напрыклад, інтарэсы рэжыму Лукашэнкі:

Актор 1	Актор 2	Інтарэс (А1 у адносінах да А2)
Рэжым	Захад	Захаванне статус-кво
Рэжым	Расія	Падтрымка і нейтралізацыя ціску Захада
Рэжым	Апазіцыя	Зніштажэнне альбо палітыка «падзяляй і ўладар»

Рэжым	**Грамадзянская супольнасць**	**Зніштажэнне альбо маргіналізацыя**
Рэжым	**Бел. сітуацыя**	**Стабільнасць, падкантрольнасць**

Актор 1	**Актор 2**	**Інтарэс (А1 у адносінах да А2)**
Расія	**Захад**	**Захаванне пазітыўных адносін**
Расія	**Рэжым**	**Забеспячэнне палітычных і эканамічных інтарэсаў Расіі ў Беларусі**
Расія	**Апазіцыя**	**Кволасць і несамакіраванасць або нешта іншае**
Расія	**Грамадзянская супольнасць**	**Кволасць і несамакіраванасць або нешта іншае**
Расія	**Бел. сітуацыя**	**Стабільнасць, падкантрольнасць**

Няцяжка падлічыць, што такіх парных інтарэсаў агулам будзе налічвацца 25 для асноўных актораў без уліку іх дэталізацыі. Не мае сэнсу пералічваць інтарэсы кожнага, будзем узгадваць аб гэтым па меры неабходнасці. Заўважым, што, паводле Суздальцава, інтарэсы актораў збольшага перадвызначаныя іх эканамічным і геапалітычным становішчам. І Захад, і Расія зацікаўленыя ў стабільнасці Беларусі менавіта як транзітнай тэрыторыі: «У рэальнасці ні для ЕЗ, ні для Расіі дэстабілізацыя палітычнага і сацыяльна-эканамічнага становішча ў РБ не проста непатрэбная, але крытычна небяспечная»[2]. Таму аўтар задае даволі важнае пытанне аб тым, хто можа ўзяць на сябе выдаткі за захаванне стабільнасці падчас і пасля рэвалюцыі. І празрыста намякае на тое, што такія рызыкі можа ўзяць на сябе толькі Расія, для якой эканамічныя выдаткі па падтрымцы рэжыму ўжо пачынаюць

перавышаць наяўныя выгады ад супрацоўніцтва з ім. Захад жа, на думку аўтара, збольшага задаволены існым становішчам, што дазваляе абмяжоўвацца дэкларатыўнай падтрымкай.

Гатовую мадэль можна прыкладаць да аналізу розных палітычных сітуацый. Напрыклад, аўтар аналізуе магчымае развіццё беларускай палітычнай сітуацыі. Аўтар выдзяляе некалькі сцэнароў, разгледжаных ніжэй.

КАЛЯРОВАЯ РЭВАЛЮЦЫЯ

Магчымы сцэнар так званай «каляровай рэвалюцыі» ў Беларусі. А. Суздальцаў абазначае яе як «рэвалюцыю гуркоў». Поспех гэтае рэвалюцыі, у раскладцы А. Суздальцава, малаімаверны, бо сума вагавых каэфіцыентаў канфліктных бакоў роўная:«ІНТЭГРАЦЫЙНАЯ ПАСТКА»

Гэта, хутчэй, не сцэнар, але апісанне бягучай сітуацыі Лукашэнкі, калі Расія гандлюе сваёй падтрымкай, ведаючы яе важнасць для рэжыму і стабільнасці беларускай сітуацыі, таму прапаноўвае Лукашэнку прыняць «канстытуцыйны акт» (фактычна, здаць суверэнітэт Беларусі і ўвайсці ў склад іншай дзяржавы) у абмен на гарантыі асабістай бяспекі Лукашэнку. Калі Лукашэнка адмаўляецца, то ўзрастае верагоднасць страціць уладу ў 2006 г. у выніку нейтралітэту ці гульні Расіі на другім баку. Калі пагодзіцца на прапанову Расіі, то ўзрастае магчымасць здрады наменклатуры і генералітэту, не зацікаўленых у рэальнай інтэграцыі, і, як вынік, страты ўлады, прычым, магчыма, яшчэ да ліпеньскіх выбараў (гл. (2).«ЛУКАШЭНКА – ЕЎРАПЕЙСКІ ФІДЭЛЬ КАСТРА»

Гэты сцэнар апісвае сітуацыю пасля магчымай каляровай рэвалюцыі ў Беларусі. Дадамо наступнае правіла (2.1), паводле якога змяняюцца вагавыя каэфіцыенты (моц) палітычных актораў пасля канфлікту: вагавы каэфіцыент кожнага актора, уцягнутага ў канфлікт, змяншаецца на 1 пры ўмове паразы, і павялічваецца на 1 пры ўмове выйгрышу. Такім чынам, пры ўмове паразы каляровай рэвалюцыі (1), сітуацыя зменіцца наступным чынам: Палітычнае поле Беларусі (sit 2) Пасля чаго ўнутраная сітуацыя ў Беларусі становіцца абсалютна бяспечнай для рэжыму, моц якога будзе ўжо значна перавышаць сукупную

2. Суздальцев А. Минск – Москва (I) // Сайт «Наше мнение».

моц апазіцыі і беларускага грамадства:

(1)

Расія (8) + Рэжым (6) = Беларуская апазіцыя (3) + Грамадзянская супольнасць (3) + Захад (8)

$8+6=3+3+8$

$14=14$

Змены (поспех рэвалюцыі) магчымыя толькі ў выпадку «канструктыўнае супрацы апазіцыі з наменклатурнымі вярхамі, кіраўнікамі сілавых ведамстваў, дырэктаратам прадпрыемстваў і рэктаратам ВНУ, банкаўскімі коламі, дыпламатамі і г. д.», што выглядае:

(2)

Расія + Рэжым - (Наменклатура + Генералітэт) < Беларуская апазіцыя + Грамадзянская супольнасць + Захад

$12<14$

Удзел грамадзянскай супольнасці ў «рэвалюцыі» няпэўны («менскі Майдан яшчэ сабраць трэба!»), што фактычна азначае гульню грамадзянскай супольнасці на баку рэжыму і зводзіць шанцы на перамогу да велічыняў, блізкіх да нуля:

(3)

Расія + Рэжым + пасіўная Грамадзянская супольнасць > Беларуская апазіцыя + Захад

$17 > 11$

Калі ж Масква захавае нейтралітэт, дык расколатая і

нетэхналагічная беларуская апазіцыя мае невялікія шанцы на перамогу над рэжымам, толькі ў тым разе, калі неасацыяваная апазіцыя хоць часткова згуляе на баку рэжыму, а грамадзянская супольнасць застанецца кволаю. У той жа час у гэтым выпадку пагроза рэжыму існуе:

(4)

Рэжым + пасіўная Грамадзянская супольнасць = Захад + Партыйная апазіцыя - Неасацыяваная апазіцыя

9=9

Адзіны фактар, што робіць поспех рэвалюцыі магчымым – гэта ўдзел Расіі ў гульні супраць рэжыму Лукашэнкі. У гэтым выпадку перамога магчымая нават ва ўмовах маўчання грамадзянскай супольнасці і адсутнасці падтрымкі з боку Захаду:

(5)

Рэжым + пасіўная Грамадзянская супольнасць < Беларуская апазіцыя + Расія

9<11

З такіх (ці падобных) падлікаў А. Суздальцаў робіць выснову: толькі пашырэнне кантактаў апазіцыі з Масквой, толькі падтрымка Расіі дасць магчымасць змяніць аўтарытарны рэжым. І паколькі апазіцыя не змагла сфармаваць адэкватнай «усходняй» стратэгіі, то ўжо загадзя прайграла выбары. Між тым для падтрымкі «рэвалюцыі» Расіяй неабходна гарантаваць «усяго толькі»: забеспячэнне яе палітычных і вайскова-стратэгічных інтарэсаў, паставіць пад пытанне суверэнітэт Беларусі (хоць гэта і не абавязкова), адмяніць пратэкцыянісцкія меры ў эканоміцы, скіраваныя супраць Расіі, забяспечыць расійцам усе гарантаваныя правы як нацменшасці, не дапускаць праяў русафобіі. Пакінем убаку спрэчнасць

некаторых патрабаванняў і неабходныя гарантыі натуральнага забеспячэння інтарэсаў самой Беларусі, спытаемся толькі пра тое, хто, які палітычны суб'ект можа даваць такія гарантыі? Зразумела, толькі той, які валодае дзяржаўнай уладай, г. зн. сёння – толькі рэжым Лукашэнкі. Ён і будзе гарантаваць, прынамсі на словах. Сякі-такі гандаль магчымы для суб'ектаў, што маюць рэальныя шанцы прыйсці да ўлады пасля «рэвалюцыі». Але, па-першае, такія суб'екты цяпер не відавочныя, а па-другое, такія гарантыі дастаткова ўмоўныя і як бы не зусім сапраўдныя.

Адсюль, Расія з'яўляецца галоўным стратэгічным партнёрам рэжыму Лукашэнкі, а з іншага боку ўяўляе і найбольшую пагрозу для яго існавання.

Актор (асноўны)	**Вага/моц**
1. Расія	9 (8 + 1)
2. Беларускі рэжым	7 (6 + 1)
3. Беларуская апазіцыя	2 (3-1)
4. Грамадзянская супольнасць	2 (3-1)
5. Захад	7 (8-1)

(6)

Рэжым > Беларуская апазіцыя + Грамадзянская супольнасць

7 > 4

Пры ўмове пасіўнасці грамадзянскай супольнасці (фактычна яе гульні на баку рэжыму), рэжым процістаіць любым апазіцыйным і заходнім дзеянням па змене сітуацыі:

(7)

Рэжым + Грамадзянская супольнасць = Беларуская апазіцыя

+ Захад

9 = 9

(выйгрыш тут за рэжымам, згодна з правілам 1.2)

А пры мінімальнай падтрымцы з боку Расіі (напрыклад, толькі з боку свайго расійскага лобі), рэжым устойлівы і без падтрымкі грамадскасці:

(8)

Рэжым + Прарэжымнае лобі = Беларуская апазіцыя + Захад

9 = 9

Такім чынам, «калі беларускі прэзідэнт выбера сам сябе трэці раз, дык у Еўропе з'явіцца ўласны Фідэль Кастра»[3], што супадае з вывадамі Уладзіміра Мацкевіча[4].

Заўважым, што гульня Расіі на баку Лукашэнкі павышае кошт яе ўплыў на беларускую сітуацыю пасля ўмоўнай парады каляровай рэвалюцыі (пры адначасовым зніжэнні ўплыву Захаду). Прычым даволі значна, калі раней рэжым Лукашэнкі пры падтрымцы з боку грамадства адназначна выйграваў процістаянні з Расіяй (9 > 8), то ў новых умовах выйгрыш больш чым сумнеўны:

(9)

Рэжым + Грамадзянская супольнасць = Расія

9 = 9

Усе іншыя варыянты (нейтралітэт, гульня на баку апазіцыі) змяншаюць велічыню выйгрышу Расіі (яе параўнальны ўплыў будзе меншы), праўда, здымаюць і рызыку прайграць. Але, як піша А. Суздальцаў: «Няўжо нехта наіўна разлічвае, што

[3] Суздальцев А. Интеграционный Запад // Сайт «Наше мнение».

[4] Даклад У. Мацкевіча на круглым стале 27.07.2005.

Масква зойме «нейтральную пазіцыю» ў суседняй дзяржаве, проста каля парога сваёй хаты, у дзяржаве, што мае немалое вайскова-стратэгічнае ды транзітнае значэнне і куды ўкладзеныя дзесяткі мільярдаў долараў дапамогі?»[5].

РЫТОРЫКА І ДЗЕЯННІ

Трэба прызнаць бліскучы палемічны стыль аналітыкі Суздальцава і віртуознае валоданне мовай, калі аўтару ўдаецца шляхам аналогій і супрацьпастаўленняў ствараць неабходныя акцэнты. У прыватнасці, праз рытарычныя фігуры падкрэсліваецца значнасць падзей, звязаных з Расіяй (і самой Расіі), пры адначасовым прыніжэнні значнасці падзей беларускіх (і Беларусі): «Рэвалюцыя гуркоў» на фоне «Расійскага гуманітарнага Давосу»[6], «на палітычным подыуме расійскай сталіцы сфармавалася сапраўднае беларускае «мадэльнае агенцтва»[7], «беларускае кіраўніцтва стварыла на базе савецкай уласную нацыянальную, але паразітычную гаспадарку»[8], «Крэмль – найважнейшы вонкавы гулец на беларускім палітычным полі»[9] ды інш.

Такая рыторыка разам з даволі правакацыйна прадстаўленымі расійскімі інтарэсамі, абвінавачваннямі ў «русафобіі» і тэндэнцыйнасці незалежнай беларускай аналітыкі выклікае адпаведную рэакцыю нашай запісной «экспертнай» супольнасці. Хто-ніхто (Я. Палескі, Я. Абзаваты) адразу кідаецца ў спрэчку, абвяргаючы вывады Суздальцава (часамі-такі за жывое). Шчыльнасць камунікацыі ад гэтага рэзка, і гэта добра (раней увогуле адзін аднаго не чыталі). Але разумення сітуацыі не дадаецца. Бо тут важна не толькі сама камунікацыя, само абмеркаванне, але і прадмет абмеркавання. Як сэнс у «глыбокіх» развагах «адзіны кандыдат – гэта толькі заходні праект ці не», «Крэмль арганізуе падставу «адзінаму» ці не арганізуе»? Навошта займацца гаданнем на кававай гушчы і нагрувашчваць тоны славеснага шалупіння? Памнажаць сутнасці без неабходнасці? Фактычна адбываецца пустое раздзіманне значнасці тэмы Расіі, Масквы, Крамля ў тутэйшых справах.

Але ж яна, гэтая тэма, сапраўды сур'ёзная, і разбірацца з ёй варта сур'ёзна. А тады трэба ставіцца да сказанага раней больш

[5] Суздальцев А. Ватерлоо // Сайт «Наше мнение».

[6] Суздальцев А. Революция огурцов» на фоне «Русского гуще, и этого Давосы // Сайт «Наше мнение».

[7] Суздальцев А. Минск – Москва (I) // Тамсама.

[8] Суздальцев А. Минск – Москва (II) // Тамсама.

[9] Суздальцев А. Интеграционный капкан // Тамсама.

уважліва. Нагадаем: «Асноўная мэта расійскага цэнтру – рэабілітавацца за паразу ва Украіне падчас Памаранчавай рэвалюцыі. Уся расійская актыўнасць, усе расійскія дзеянні накіраваныя толькі на адно – не дапусціць Памаранчавай рэвалюцыі... у Беларусі ў бліжэйшыя гады»[10]. Таму сапраўды «абсалютна безадказныя і нічым не абгрунтаваныя заявы пэўных беларускіх апазіцыйных «паліттэхнолагаў» пра распрацоўку г. Паўлоўскім і с. Караганавым двух альтэрнатыўных планаў дэстабілізацыі рэжыму А. Лукашэнкі (маецца на ўвазе, ім больш рабіць няма чаго, як займацца А. Лукашэнкам)»[11] будуць нічым не падмацаваныя, бо гэтыя людзі працуюць на рэалізацыю процілеглых мэтаў. Заўважым, што актывізацыя расійскай паліттэхналагічнай супольнасці ў Беларусі відавочная: кансультаванне некаторых палітычных сілаў, укараненне ў палітычнае і каляпалітычнае асяроддзе, правядзенне супольных форумаў і г. д.

Падаецца, што дзейнасць А. Суздальцава (які, відавочна, ужо ў беспасярэднія сувязі з расійскімі паліттэхнолагамі) і яго дзейнасць ў гэтыя ж рамкі. Яна скіраваная на дэзарыентацыю інтэлектуальнай супольнасці і агульны рост няпэўнасці ў сітуацыі 2006 г. у Беларусі, праз:

– гіпербалізацыю ролі расійскага фактару (стварэнне фальшывых аб'ектаў);

– перанясенне ўвагі з канкрэтных мэтаў і стратэгіі дзеянняў Расіі ў 2006 г. у Беларусі на тэмы абстрактных «інтарэсаў Масквы», геапалітычных і геаэканамічных псеўдааналітычных разважанняў (сцягванне камунікацыі на малазначныя тэмы);

– канстатацыю немагчымасці зменаў без адэкватнага аналізу ўмоваў наступлення ці ненаступлення такіх зменаў (збіццё чаканняў пазітыўных зменаў і значэння рэвалюцыі-2006).

У гэтую стратэгію лагічна будзе ўбудаваны раскол інтэлектуалаў у пытаннях мовы, «нацыяналізму», «русафобіі – славянафільства» – застарэлых хваробах беларускіх інтэлектуалаў. Тут важна, што Суздальцаў пазіцыянуе сябе як «свайго» ў расійскамоўнай незалежнай інтэлектуальнай супольнасці Беларусі. Тое, што ім пішацца, збольшага будзе

[10] Манкевіч Ул. Падрайца Перамога нас рэжымам альбо смерць нацыі: дылема будучых прэзідэнцкіх выбараў // ARCHE. 2005. № 4.

[11] Суздальцев А. Шестой заход на Кремль // Сайт «Наше мнение».

(амаль рэфлекторна) негатыўна ўспрымацца нацыяналістычна арыентаванымі беларускамоўнымі інтэлектуаламі, і гэты негатыў можа пераносіцца на частку інтэлектуалаў, што пішуць па-расійску. У выніку можна будзе назіраць эскалацыю рознага кшталту палкіх, але дурных спрэчак. Хаця магчымы і іншы расклад – супольнае процідзеянне маніпулятыўным уплывам расійскіх паліттэхнолагаў з боку ўсіх беларускіх інтэлектуалаў, згуртаваных усведамленнем супольных інтарэсаў. Да гэтага, відаць, яшчэ далёка, але пазітыўныя зрухі ўжо ёсць: што да непрымальнасці гандлю суверэнітэтам краіны – назіраецца поўная згода.

Цікава, што Суздальцаў упісаў у структуру сваёй аналітыкі спосаб утылізацыі крытычных захадаў праз звядзенне ўсяго да: «фобій» («русафобіі», у прыватнасці) або «святарных кадраў» (Захад, дэмакратыя)[12]. Напрыклад гэты тэкст у такой вотчыне можна аднесці да «русафобскіх». Хаця насамрэч штука сутнае ў «русафобіі», а ў цалкам розных схематызмах, каштоўнасных рамках і дзейнасных падыходах, праверкай якім будзе эфектыўнасць ці неэфектыўнасць канкурэнтных палітычных практык.

[12] Гэты, напрыклад: Суздальцаў А. Вотчыноо /// Сайт «Наше мнение».

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/15
[image]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к

№ 6 (40) - 2005

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]

[image]2005

аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Андэрс Ослунд Акцыі Пуціна падаюць. Чым адкажа Амэрыка?

АНДЭРС ОСЛУНД

дырэктар Расейскай і Эўразійскай праграмы Фонду Карнэгі (Вашынгтон). Сусьветна прызнаны спэцыяліст па эканоміцы посткамуністычных краінаў, асабліва Расеі і Украіны. Прафэсар-ад’юнкт Джорджтаўнскага ўнівэрсытэту, Ослунд працаваў эканамічным дарадцам пры ўрадах Расеі, Украіны і

Нядаўна я пазнаёміўся з адным вельмі багатым расійцам. На маё пытанне, што чуваць у Расіі, ён са смехам адказаў: «Сітуацыя цалкам прадказальная. Усё ідзе за найгоршым сцэнаром». І пачаў апавядаць пра свае інвестыцыі ва ўкраінскую эканоміку – цяпер багатыя расійцы літаральна носяцца з гэтай ідэяй.

У гэтым нявер’і ў Расію нават сярод заможных і ўплывовых людзей выяўляецца яскравы кантраст паміж першым і другім прэзідэнцкімі тэрмінамі Уладзіміра Пуціна. Сітуацыя пагоршылася не ў выніку няўдалага збегу абставін. Цягам першага тэрміну Пуцін дамогся поспеху, бо, умацоўваючы сваю ўладу, імкнуўся адпавядаць чаканням шырокіх колаў грамадства, балансаваў уплыў розных уладных груповак. Але на другі тэрмін Пуцін паставіў сабе за мэту зліквідаваць усе ўладныя групоўкі, апроч уласнай. І цяпер пуцінскі рэжым дэманструе поўную недзеяздольнасць, бо праз звышцэнтралізацыю ўлады і татальную сакрэтнасць рашэнні прымае завузкае кола дрэнна інфармаваных чыноўнікаў. Пытанне цяпер ужо не ў тым, ці застанецца прэзідэнт Пуцін ля

стырна ўлады па заканчэнні свайго другога тэрміну ў 2008 г., а ў тым, ці не страціць ён сваёй пасады яшчэ раней.

Сумежная праблема – у тым, што ў час праўлення Пуціна, згодна з класіфікацыяй аўтарытэтнай арганізацыі «Freedom House», Расія ператварылася з часткова свабоднай краіны ў несвабодную. Фактычна гэта адзіная краіна свету, што скацілася да аўтарытарызму за часы прэзідэнцтва Джорджа У. Буша. Між тым, як адзначыў Буш у сваёй ключавой прамове аб дэмакратыі (Рыга, 7 траўня), «пашырэнне свабоды – найвялікшая падзея нашай эпохі». Калі Злучаныя Штаты сур'ёзна ставяцца да пабудовы дэмакратыі, ім нельга не зважаць на тое, што адбываецца ў Расіі і ва ўсім былым Савецкім Саюзе. Заможнасцю гэтыя краіны прыкладна роўныя Лацінскай Амерыцы, а тэмпы эканамічнага росту ў іх значна вышэйшыя. Але калі Лацінская Амерыка – рэгіён пераважна дэмакратычны, Расія і іншыя новыя дзяржавы Еўразіі збольшага схільныя да аўтарытарызму. Адсутнасць дэмакратыі – асабліва ў адносна заможнай, шматнацыянальнай і дынамічнай Расіі – анамалія, якая, відаць, доўга не пратрывае.

Адмова ад дэмакратыі ў самой Расіі непазбежна паўплывала на яе замежную палітыку. У Рызе прэзідэнт Буш прамовіў: «Мы пераканаліся, што ўрад, падкантрольны сваім грамадзянам, выяўляе міралюбнасць, а дыктатуры, каб схаваць уласныя паразы, спараджаюць злобу і нянавісць». Сапраўды, у той самы час прэзідэнт Пуцін бліскуча праілюстраваў думку Буша, ухваліўшы адыёзны Пакт Молатава–Рыбентропа 1939 г., які вырак балтыйскія дзяржавы на савецкую акупацыю – факт, якога Крэмль не прызнае. У лістападзе 2004 г. Пуцін выступіў з адкрыта антыамерыканскімі заявамі ў сувязі з дэмакратычнымі пераменамі ва Украіне.

Час зразумець, што сістэма ўлады ў Расіі за прэзідэнтам Пуціным карэнным чынам змянілася. Калі Злучаныя Штаты сур'ёзна ставяцца да дэмакратызацыі, ім трэба засяродзіць больш энергіі і рэсурсаў на тым, каб падтрымаць дэмакратычны патэнцыял у дзяржавах былога Савецкага Саюза. Урэшце, мірныя рэвалюцыі ў Грузіі, Украіне і Кыргызстане, паказалі: людзі прагнуць дэмакратыі. Нас не могуць не

Ў 2008 г., а выкладаў у Стакгольмскай Вышэйшай эканамічнай школе і быў на дыпляматычнай службе ў Кувэйце, Жэнэве, Маскве. Доктарскую дысэртацыю абараніў у Оксфардзкім унівэрсытэце. Яго апошняя кніга «Building Capitalism: The Transformation of the Former Soviet Bloc» (Cambridge University Press, 2002). Шмат друкуецца ў пэрыядычных выданьнях, у т. л. «Foreign Affairs», «New York Times», «Washington Post», «Financial Times».

абыходзіць пытанні дэмакратыі, і таму Расія аўтарытарная не павінна быць настолькі ж блізкім партнёрам Злучаных Штатаў, як нядаўна – Расія дэмакратычная. Тым не менш, яна застаецца ўплывовай дзяржавай, а значыць, падштурхоўваючы яе да змены палітычнага курсу, ЗША мусяць пры гэтым рабіць усё магчымае, каб супрацоўнічаць з Расіяй у асобных найважнейшых сферах супольных інтарэсаў.

ПОСПЕХІ ПЕРШАГА ТЭРМІНУ

Пуцін з'явіўся на палітычнай сцэне з ніадкуль і цягам першага прэзідэнцкага тэрміну дасягнуў вялікіх поспехаў, паступова засяродзіўшы дзяржаўную ўладу ў сваіх руках. Ён паставіў задачу за дзесяцігоддзе падвоіць расійскі ВУП – што азначала штогадовы рост эканомікі на 7–8 % – і распачаў шырокамаштабныя рынкавыя эканамічныя рэформы. Юрыст паводле адукацыі, ён адстойваў вяршэнства закону і энергічна праводзіў усебаковую рэформу судовай сістэмы. Дзякуючы ягонай рэалістычнай замежнай палітыцы адразу ўзрос аўтарытэт Расіі на міжнароднай арэне.

Расійская Дзярждума ўхваліла значныя эканамічныя і заканадаўчыя рэформы. У прыватнасці, у новым Падатковым кодэксе ўводзілася адзіная стаўка падаходнага падатку – 13 %, а новы Зямельны кодэкс узаконіў прыватную уласнасць на зямлю. Краіна жыла ў палітычнай і эканамічнай стабільнасці, а тэмпы росту расійскай эканомікі трывала складалі 6,5 % за год. Уважліва вывучаючы вынікі сацыялагічных апытанняў, Пуцін нейкім аднаму яму вядомым спосабам імкнуўся «быць усім для ўсіх» сваіх выбарнікаў.

Дзякуючы шматлікім палітычным поспехам Пуцін набыў сапраўдную папулярнасць, што дазволіла яму ўмацаваць асабістую ўладу. На парламенцкіх выбарах у снежні 2003 г. яго партыя «Адзіная Расія» атрымала дзве траціны месцаў у Думе. У сакавіку 2004 г. ён выйграў прэзідэнцкую гонку, набраўшы 71 % галасоў на выбарах. АБСЕ прызнала іх свабоднымі, але несправядлівымі.

Тым не менш, без чорных плямаў у першы тэрмін не абышлося.

Пуцін прыйшоў да ўлады на хвалі бязлітаснай вайны ў Чачні, якая справакавала яшчэ больш жорсткія тэракты. Урад Пуціна ня мог даць ім рады. Іншай адмоўнай тэндэнцыяй сталася павольнае, але няўхільнае абмежаванне грамадзянскіх свабод. Людзі Пуціна дзе зацуглялі незалежныя СМІ, а дзе захапілі іх у сваю ўласнасць. Вынікі рэгіянальных выбараў усё часцей фальсіфікаваліся, адбывалася ўсё большая цэнтралізацыя дзяржаўнай улады.

Асноўная мэта прэзідэнта Пуціна – засяродзіць усе механізмы палітычнага кантролю ў сваіх руках – супярэчыла іншым ягоным задачам. Але канцэнтрацыя ўлады праходзіла гэтак паступова, што здавалася, нібы паміж несумяшчальнымі мэтамі існуе разумны баланс. У 2000–2003 гг. алігархі ельцынскай эпохі супрацьстаялі ўзнесеным да вяршыняў улады сябрам Пуціна па ленінградскім КГБ. У выніку надзвычай істотным уплывам карысталася невялічкая група рэфарматараў-лібералаў – асабліва міністр эканомікі Герман Грэф і міністр фінансаў Аляксей Кудрын, хоць яны і не абапіраліся на ніякую самастойную ўладную сілу. Пуцін выступаў у ролі кіраўніка-дабрадзея, дасланага Расіі шчаслівым лёсам.

ПРАВАЛ ЗА ПРАВАЛАМ

На жаль, з таго часу, як прэзідэнт Пуцін засяродзіў у сваіх руках усю паўнату ўлады, яму ўдалося зрабіць мала чаго добрага. У яго няўдачах няма выпадковасьці: яны адлюстроўваюць неадпаведнасць збудаванай ім сістэмы. З агульнага шэрагу асабліва вылучаюцца чатыры правалы: справа «Юкаса», Беслан, выбары ва Украіне і рэформа сістэмы сацыяльных ільгот.

25 кастрычніка 2003 г. арыштаваны Міхаіл Хадаркоўскі, найбагацейшы у Расіі чалавек і кіраўнік нафтавай кампаніі «Юкас». Адмаўляючы сваё дачыненне да арышту, Пуцін, аднак, патлумачыў яго неабходнасць: маўляў, Хадаркоўскі аказваў фінансавы ўплыў на расійскую палітыку. У арышце найбольш палітычна актыўнага алігарха Пуцін перадусім кіраваўся жаданнем узмацніць свой кантроль над палітычным жыццём, а некаторыя яго памочнікі папросту хацелі завалодаць актывамі

«Юкаса».

Арышт Ходаркоўскага змяніў расклад сілаў у расійскай палітычнай сістэме. Іншыя алігархі прыслухаліся да папярэджання і адышлі ад палітыкі. Такім чынам, парушыўся баланс паміж буйным бізнэсам і КГБ, Пуцін больш не можа сцвярджаць, што рэпрэзентуе большасць насельніцтва: апірышча ягонай улады звузілася да купкі піцерскіх афіцэраў КГБ. У справе «Юкаса» праваахоўныя органы Расіі няспынна парушалі ўсе юрыдычныя нормы, кідаючы выклік усёабсяжнай судовай рэформе, распачатай Пуціным. Выглядае, што «Юкас» удала скарыстоўваў пралазы ў правілах падаткаабкладання, але, падобна, не выходзіў за межы закону. Але небесстароннія падатковыя службы і суды ўсё роўна наклалі на кампанію дадатковых падаткаў і штрафаў на неверагодную суму – 28 мільярдаў долараў, што прывяло яе да банкруцтва. У выніку некалі шматабяцальная падатковая рэформа ператварылася ў фарс. Нягледзячы на публічна паўтараныя абяцанні, Пуцін праз адвольнае прызначэнне падаткаў і з дапамогай кішэннага правасуддзя дазволіў сканфіскаваць «Юкас». З характэрнай для яго ўпартасцю ён не пайшоў ні на якія саступкі.

Наступнай вялікай паразай Пуціна сталася бесланская трагедыя. 1 верасня 2004 г. група тэрарыстаў захапіла школу ў Паўночнай Асеціі. Праз некалькі гадзін туды накіравалі найлепшыя сілы расійскіх спецслужбаў, але яны не мелі ні плану аперацыі, ні аператыўнага камандавання, ні боепрыпасаў, ні бронекамізэлек. Школу нават належным чынам не ачапілі. Старшыня Федэральнай службы бяспекі Мікалай Патрушаў і міністр унутраных справаў Рашыд Нургаліеў – абодва набліжаныя да Пуціна афіцэры КГБ – прыбылі ў Беслан неўзабаве пасля пачатку блакады. Аднак яны проста хаваліся, унікаючы ўсялякіх публічных захадаў. Кіраўнікі Паўночнай Асеціі і суседняй Інгушэціі, абодва незадоўга да таго прызначаныя Пуціным, хаця фармальна выбраныя народам, адмовіліся нават прыехаць у Беслан. Федэральны ўрад папросту праігнараваў крызіс – адно рэзка абмежаваў яго асвятленне ў навінах. На трэці дзень адважныя асецінцы вынялі аўтаматы Калашнікава і самі пайшлі на штурм школы, незнарок застрэліўшы пры гэтым некалькі салдат спецвойскаў,

якія бяздзейнічалі. Загінула не менш як 330 закладнікаў.

Расійцы прызвычаіліся да празмернай жорсткасці праваахоўнікаў. Так, у час маскоўскай трагедыі ўвосень 2002 г. у музычным тэатры ад атрутнага газу, пушчанага расійскімі спецслужбамі, загінула 129 закладнікаў. Але ў Беслане расійская дзяржава папросту дэзертавала. Урад не меў патрэбнай інфармацыі. Афіцэры міліцыі за хабар прапускалі тэрарыстаў, праваахоўныя органы не ўмешваліся, а Пуцін не прызнаў адказнасці за катастрофу. Замест таго, каб зняць з пасад хоць каго з вінаватых, ён звольніў галоўнага рэдактара прыватнай газеты *«Известия»*, усё «злачынства» якога зводзілася да паведамлення праўдзівай інфармацыі пра падзеі.

Трэцяй нядаўняй палітычнай памылкай Пуціна было непрыхаванае ўмяшанне Расіі ў прэзідэнцкія выбары ва Украіне. Гэтаму пытанню надавалася такая значнасць, што займаліся ім у Крамлі, а кіраваў працэсам не хто іншы, як сам прэзідэнт Пуцін і галава ягонай адміністрацыі. У канцы ліпеня 2004 г. яны ўдвох вырашылі падтрымаць прэм'ер-міністра Віктара Януковіча, пагадзіўшыся з выбарам прэзідэнта Леаніда Кучмы і галавы ягонай адміністрацыі. Як паведамляў штаб дэмакратычнага кандыдата Віктара Юшчанкі, Пуцін паабяцаў, што расійскі бізнес укладзе ў кампанію Януковіча не менш як 300 мільёнаў долараў. Расійскае тэлебачанне, якое глядзяць многія грамадзяне Украіны, усхваляла Януковіча і ўсяляк ганіла Юшчанку. Каб забяспечыць перамогу Януковіча, ва Украіну прыбылі дзесяткі расійскіх паліттэхнолагаў, аплачаных Крамлём. У апошні месяц перад выбарамі Пуцін сам двойчы наведаў Украіну і агітаваў за Януковіча. Выбар Пуціна засведчыў ягоную дрэнную інфармаванасць і недэмакратычнасць. Выявілася, што Пуцін – неэфектыўны палітык, настроены супраць Захаду. Адным гэтым ходам ён здолеў аб'яднаць супраць сябе Злучаныя Штаты і Еўрапейскі Саюз, паставіў крыж на шмат якіх сваіх дасягненнях у замежнай палітыцы. Дарма што пуцінскі рэжым выявіў ва Украіне свае благія намеры – палітыка Пуціна занадта неадэкватная, каб несці ў сабе рэальную пагрозу неаімперыялізму.

Чацвёртай буйной палітычнай паразай Пуціна сталася нядаўняя рэформа сістэмы сацыяльных ільгот. У Расіі захавалася плойма старых ільгот, асабліва для прывілеяваных. Шмат якія льготы існавалі толькі на паперы – насамрэч імі ніхто ніколі не карыстаўся. Трэба было ўпарадкаваць сістэму, каб ільготы атрымлівалі сапраўды сацыяльна неабароненыя. Аднак праводзілася рэформа зусім не прадумана. Яна падавалася як манетызацыя некаторых натуральных ільгот, а ў рэчаіснасці многія з іх папросту скасавалі. За льготы абяцалі поўную кампенсацыю, але напачатку скампенсавалі толькі каля траціны ад агульнага кошту. Належных разлікаў не зрабілі, а федэральныя і рэгіянальныя ўлады не маглі дамовіцца, хто за што меўся плаціць. Рэформа сістэмы сацыяльных ільгот закранала каля 40 мільёнаў чалавек, аднак людзям не растлумачылі яе зместу. Ды яшчэ, нібы на здзек, у пяць разоў паднялі заробак 35 тысячам вышэйшых службовых асоб, у т. л. і прэзідэнту, хаця іхных велізарных ільгот ніхто не адымаў.

Выглядала, што рэформа сістэмы сацыяльных ільгот скіроўвалася супраць бедных. Праводзілася яна ў разгар расійскага нафтавага буму, калі прырост бюджэту сягаў 5 % ВУП. Як ні дзіўна, супраць рэформы пракаціласа хваля масавых акцый пратэсту, і ўпершыню пад градам крытыкі апынуўся сам Пуцін. Каб спыніць пратэсты, урад мусіў адмяніць шмат якія свае захады і значна падвысіць пенсіі.

СУТНАСЦЬ НОВАГА ПУЦІНСКАГА РЭЖЫМУ

Гэтыя чатыры палітычныя правалы – не выпадковасць, а заканамернасць. Яны выявілі, як рэальна працуе новая сістэма кіравання ў Расіі. Прэзідэнт змяніў не толькі стратэгічны кірунак, але і палітычны рэжым у Расіі, і ягоная недзеяздольнасць можа прывесці да таго, што Пуцін страціць уладу.

Па-першае, Пуцін неабачліва сканцэнтраваў у сваіх руках значна больш улады, чым яму па сілах. Усім наўздзіў, ён прызначыў прэм’ер-міністрам Міхаіла Фрадкова, вядомага тым, што ён ніколі не прымае ніякіх рашэнняў. У выніку ўрад нібыта скамянеў. Замест таго каб стварыць моцную вертыкаль улады,

Пуцін сваім імкненнем кіраваць кожнай дробяззю паралізаваў уласны ўрад. Ён сам ператварыў сябе з палітстратэга ў пажарніка, які марна спрабуе адзін тушыць лясныя пажары.

Прэзідэнт удушае незалежныя СМІ – і ўсё больш дазваляе дэзінфармаваць сябе чыноўнікам з уласнага апарату. Сапраўдны спецслужбовец, Пуцін надае вялікую ўвагу сакрэтнасці і тэорыям змовы: здаецца, ён больш давярае меркаванню супрацоўнікаў КГБ з уласнага старога кола, чым рэальным фактам. Калі французскі журналіст задаў яму востае пытанне пра арышт Ходаркоўскага, Пуцін намякнуў, што гэта Ходаркоўскі падкупіў журналіста: «Мы ведаем, куды трацяцца грошы [алігархаў], на якіх адвакатаў, на якія піяр-кампаніі, на якіх палітыкаў. Ведаем, што аплачваюцца і такія пытанні, як вашае».

Сістэма стрымак і процівагаў у цяперашняй Расіі амаль не працуе. Пазбавіўшы парламент, кабінет міністраў і губернатараў у рэгіёнах ільвінай долі іхных паўнамоцтваў, Пуцін тым самым пазбавіў гэтыя афіцыйныя інстытуты рэальнага зместу. Паралельна ён стварае неафіцыйныя дарадчыя інстытуты, такія, як Дзяржаўны савет і Грамадская палата, – іх рашэнні зусім ці амаль зусім ні да чаго не абавязваюць. Таму, калі ўлада Пуціна пахіснецца, ніводны інстытут не зможа надаць ёй легітымнасці. Адзіная крыніца легітымнасці Пуціна – ягоная асабістая папулярнасць, а яе ўзровень імкліва падае. Паводле апытанняў расійскага фонду «Грамадская думка», у траўні 2004 г. 68 % выбарнікаў прагаласавалі б на прэзідэнцкіх выбарах за Пуціна. Годам пазней гэтая доля скарацілася да 42 %, г. зн. больш чым на траціну. Яшчэ адзін крызіс – і яго рэйтынг можа апынуцца ў свабодным падзенні.

Змяняецца рэжым – змяняюцца і ягоныя інтарэсы. Сябры Пуціна па КГБ ужо ўзначальваюць дзяржаўную адміністрацыю і буйныя дзяржпрадпрыемствы, што мусілі б стаць аб'ектам рэфармавання. Аднак рэформы насуперак інтарэсам кіроўнай эліты праводзіцца ніколі не будуць. Нават на працягу першага прэзідэнцкага тэрміну Пуціна фінансаванне дзяржапарату, праваахоўных органаў і войска расло коштам скарачэння долі

сацыяльных выдаткаў.

Моцны бок пуцінскага рэжыму – ва ўменні маніпуляваць элітай, сродкамі масавай інфармацыі і грамадзянскай супольнасцю. Аднак калі яго прапагандысцкая машына адарвецца задалёка ад рэчаіснасці, рана ці позна ўлада страціць давер і аўтарытэт у масах. Магчыма, гэты парог ужо і пяройдзены. Рэжым Пуціна занадта нягнуткі і цэнтралізаваны – ён не можа даваць рады непазбежным крызісам. Таму яго наўрад ці можна лічыць стабільным. Аналітыкі і палітыкі, што займаюцца Расіяй, мусяць звярнуць увагу на тое, як гэты рэжым можа абваліцца.

Парадаксальна, але расійская эканоміка развіваецца вельмі добра: у 2004 г. прырост ВУП склаў 7 %. Узровень жыцця расце яшчэ хутчэй. Гэты рост стымулюецца не толькі высокімі цэнамі на паліва, але і шырокамаштабнымі рынкавымі рэформамі, праведзенымі за першы тэрмін Пуціна. Вядома, ніякіх новых рэформаў не прадбачыцца, і справа «Юкаса» істотна падарвала рэформу падатковай і судовай сістэм. Але, паколькі ўладныя структуры ахапіў паралюш, яны, прынамсі, не адменяць раней прынятых рашэнняў. Тым не менш, суседняя Украіна толькі што перажыла народную рэвалюцыю, дарма што яе эканамічны рост у 2004 г. склаў 12 %, а рэальныя заробкі раслі яшчэ ўдвая хутчэй. Адсюль вынікае, што рост жыццёвага ўзроўню не гарантуе стабільнасці.

ЯКІ ФІНАЛ ЧАКАЕ ПУЦІНСКІ РЭЖЫМ?

Да нядаўняга часу ў Маскве актыўна абмяркоўвалася пытанне, ці то сапраўды любімы народам Пуцін сыдзе, калі ў 2008 г. скончыцца яго другі тэрмін, ці то ён зменіць Канстытуцыю або перадасць больш паўнамоцтваў прэм'ер-міністру, каб потым заняць гэтую пасаду. Аднак палітычная сістэма Расіі цяпер настолькі недзеяздольная, што Пуціну вельмі пашанцуе, калі ён утрымае ўладу да 2008 г. Ранейшы пазітыўны *status quo*, хутчэй за ўсё, не вярнуць. Пуцін атрымаў тое, чаго хацеў, і даказаў, што ён занадта ўпарты, каб вучыцца на сваіх памылках – прынамсі, пакуль. Да таго ж у цяперашняй расійскай палітычнай сітуацыі Пуцін не зможа выставіць

непапулярных алігархаў магутнай сілай, супраць якой можна было б павесці шырокую кампанію. У той жа час, для пуцінскага рэжыму няма ніякай відочнай палітычнай пагрозы, і вялікае пытанне, адкуль яна магла б з'явіцца.

Цяпер расійская эканоміка ідзе ўгору дзякуючы даходам ад продажу нафты. Краіна забяспечыла сабе значнае станоўчае сальда ў знешнім гандлі і назапасіла вялізныя валютныя рэзервы. Пры тым, што кошт нафты перавышае 27 долараў за барэль, 90 % даходаў паступаюць у дзяржаўную скарбонку. Пакуль будуць трымацца высокія цэны на паліва, рэжым зможа кідаць грошы на рашэнне разнастайных праблем. Аднак прыбыткі ад продажу нафты таксама жывяць карупцыю. Паспрыялі яны і прыпыненню рэформаў.

Алігархаў Пуціну няма чаго баяцца. Яны валодаюць большымі, чым калі раней, капіталамі, але пры гэтым разумеюць сваю безабароннасць. Алігархі спадзяюцца, што і надалей змогуць нарошчваць сваё багацце, калі будуць трымацца ўбаку ад палітыкі і плаціць уладам па іх запатрабаванні.

Ліберальная апазіцыя занадта здэмаралізаваная і дэзарганізаваная, каб самастойна ўзняцца на ногі. Наколькі пуцінскаму рэжыму не ўдаецца палітычная стратэгія, настолькі ўдаюцца палітычныя хітрыкі. Ён кіруе інтэлігенцыяй, сярэднім класам, НДА і медыямі праз складаныя механізмы палітычнага кантролю. Эліта і афіцыйныя арганізацыі або ўлучаныя ў сістэму ўлады, або запалоханыя, або ператвораныя ў марыянетак. Многія выданні служаць проста для таго, каб незадаволеным было дзе выпусціць пару. Пільнае вока ФСБ сочыць за ўсім і ўсімі. Таму вельмі малаверагодна, каб у цяперашняй Расіі якому-кольвек сістэмнаму, планамернаму апазіцыйнаму руху спрыяў поспех.

Назіральнікі-песімісты ў Расіі і найлепшы сябар Пуціна на Захадзе канцлер ФРГ Герхард Шродэр папярэджваюць аб пагрозе Пуціну з боку нацыянал-патрыётаў. Аднак Пуціну выгадна ўнушаць міжнароднай супольнасці гэтую думку. Зрэшты, усе крамлёўскія правадыры, пачынаючы з Іосіфа Сталіна, пужалі размовамі пра прыхільнікаў яшчэ больш «жорсткай лініі».

Усё ж падобна, што галоўная небяспека ўладзе Пуціна будзе зыходзіць або з самых «вярхоў», або з самых «нізоў» грамадства, г. зн. ад ягоных лепшых сяброў-кагэбістаў або ад «простага народу». Што прэзідэнцтва Пуціна ператвараецца ў суцэльнае няшчасце, мабыць, пачынаюць заўважаць і некаторыя выхадцы з КГБ. Адзін былы высокапастаўлены расійскі чыноўнік нядаўна мне сказаў, што самі кагэбісты не лічаць Пуціна за лідэра. Урэшце, у КГБ яго адсунулі на другасныя ролі, і ў званні ён не ўзняўся вышэй за падпалкоўніка. Значныя фігуры з пуцінскага атачэння могуць арганізаваць супраць яго путч. Адразу згадваецца антыгарбачоўскі путч у жніўні 1991 г. Аднак яго сумныя наступствы для змоўнікаў – прыхільнікаў «цвёрдай рукі» – хутчэй, могуць паслужыць папярэджаннем, чым даць узор для пераймання.

Іншы варыянт развіцця падзей – перарастанне стыхійных акцый пратэсту ў народнае паўстанне. Пуцінскі стыль кіравання міжволі нагадвае пра тое, што адбылося ў Польшчы ў 70-я гг. XX ст., калі камуністычнаму лідэру Эдварду Герэку напачатку спрыяў поспех, але завершылася ягонае праўленне стыхійнымі страйкамі ў буйных індустрыяльных гарадах на перыферыі і стварэннем прафсаюза «Салідарнасць». Са студзеня, калі прайшлі масавыя выступленні пенсіянераў супраць непрадуманай рэформы сацыяльных ільгот, па ўсёй краіне – ад Башкартастану на Урале да Інгушэціі на паўночным Каўказе – адбываюцца дэманстрацыі супраць мясцовых уладаў, няздольных вырашыць канкрэтныя праблемы сваіх рэгіёнаў. Відавочна, што абурэнне расійскага грамадства дасягнула незвычайнага накалу. Да таго ж людзей натхняе поспех нядаўніх рэвалюцый ва Украіне і ў Кыргызстане. Перспектыва шырокага народнага пратэсту раптам набыла рэальныя абрысы.

Калі ўздымецца даволі моцная хваля пратэстаў, магчыма, наважацца дзейнічаць і іншыя сілы. Патэнцыйна сфармаваць касцяк пратэстнага руху маглі б расчараваныя губернатары. Да іх далучыўся б і шмат хто з буйных бізнесоўцаў. У Расіі жыве багата заможных маладых людзей, якія дасягнулі ўсяго самі і хацелі б парваць повязь карупцыі паміж Крамлём і алігархамі. Гэтаксама адным з рухавікоў украінскай памаранчавай рэвалюцыі стала апазіцыя мультымільянераў да ўлады

мільярдэраў. У Расіі няма відавочнага лідэра такой апазіцыі, але, зрэшты, гэта не галоўнае. Пакуль з тых імёнаў, што на слыху, найбольшую палітычную вагу мае былы прэм'ер-міністр Міхаіл Касьянаў.

Ва ўсім посткамуністычным свеце народ больш за ўсё наракае на карупцыю, а ўсе дасьведчаныя людзі ў Расіі ў адзін голас гавораць, што сённяшні Крэмль наскрозь скарумпаваны, як ніколі раней. Амаль усе вышэйшыя пасады прадаюцца прэзідэнцкай адміністрацыяй. Напрыклад, за крэсла губернатара называюцца велізарныя сумы – 10 мільёнаў долараў і шматкроць больш. Аднак што канкрэтна магло б выклікаць пратэсты, здольныя зрынуць рэжым – прадбачыць цяжка. Адная з найвастрэйшых канфліктных сітуацый палягае ў тым, што міністэрства абароны хоча скасаваць адтэрміноўку студэнтам (як правіла, дзецям з сем'яў сярэдняга класу) і прымусіць іх два гады служыць у войску.

Нядаўнія дэмакратычныя рэвалюцыі ў Грузіі, Украіне і Кіргізіі паказалі, што выбары – ключавы фактар змены рэжыму. Але ў Расіі выбары наўрад ці можна лічыць неабходнай умовай перамен, бо, каб справакаваць путч ці рух пратэсту, выбары неабавязковыя. Большасць нядаўніх грамадскіх выступленняў не былі звязаныя з выбарамі.

У расійскай сітуацыі няма нічога унікальнага. Наадварот, яна тыповая для «недаспелых» дзяржаў з сярэднім узроўнем дабрабыту. Напрошваюцца паралелі паміж Уладзімірам Пуціным і Альберта Фухіморы ў Перу, Карласам Менэмам у Аргентыне. Здаецца, што, як і яны, Пуцін хутчэй напаткае сваю палітычную смерць, чым знойдзе выхад з тупіка, у які сам сябе завёў. Праблема Расіі – у недастаткова адладжанай і моцнай сістэме стрымак і процівараў, якая не дала б Пуціну нашкодзіць самому сабе. Крах пуцінскага рэжыму азначаў бы балючы ўдар па веры ў піначэтаўскую мадэль аўтарытарных рэформаў.

ШТО МУСЯЦЬ ЗРАЗУМЕЦЬ ЗЛУЧАНЫЯ ШТАТЫ

[image]З рэзкіх збояў у функцыянаванні расійскага дзяржаўнага механізму ЗША павінны зрабіць сур'ёзныя

высновы. Нельга надалей цешыцца ілюзіяй, нібыта Злучаныя Штаты і Расія падзяляюць супольныя дэмакратычныя каштоўнасці. Няспынныя няўдачы Пуціна сведчаць, што праз аўтарытарныя тэндэнцыі яго рэжым траціць эфектыўнасць. На далёкую паліцу пакладзеныя ключавыя рэформы, напрыклад, вайсковая. Гэта таксама азначае, што Расія для Злучаных Штатаў робіцца менш дзейсным партнёрам.

Галоўнай задачай ЗША ў Расіі і новых незалежных дзяржавах Еўразіі мусіць стаць падтрымка дэмакратызацыі. Як зазначыў прэзідэнт Буш у Рызе: «Ад пашырэння дэмакратыі выйграюць і ўсе сумежныя з Расіяй дзяржавы, і сама Расія. Стабільныя, квітнеючыя дэмакратыі – добрыя суседзі: яны вядуць свабодны гандаль і нікому не пагражаюць». Гэтыя словы мусяць стаць стрыжнем амерыканскай палітыкі ў дачыненні да Расіі, і ЗША ў дапамозе Расіі павінны засяродзіцца на прасоўванні дэмакратыі. Злучаныя Штаты выдаткоўваюць значныя сродкі на пабудову дэмакратыі, назіранне за выбарамі, падтрымку незалежных СМІ і грамадзянскай супольнасці ў іншых еўразійскіх дзяржавах, але не ў Расіі. Вось шэраг канкрэтных палітычных рэкамендацый:

– улічваючы, што нядаўнія дэмакратычныя прарывы ў Расіі былі звязаныя з выбарамі, галоўным звяном амерыканскай дапамогі мусіць быць назіранне за выбарамі, а найлепшымі назіральнікамі выявіліся няўрадавыя арганізацыі. Сур'ёзную заклапочанасць выклікае тое, што з боку Крамля няма скаргаў на захады ЗША ў гэтым кірунку: гэта азначае, што нічога істотнага не робіцца. Між тым у Расіі ўвесь час адбываюцца выбары самых розных узроўняў, і за іх ходам трэба назіраць;

– новы расійскі Закон аб выбарах не дазваляе незалежнага назірання, што супярэчыць нормам АБСЕ. А Расія, ратыфікаваўшы канвенцыі АБСЕ, абавязаная іх выконваць. Натуральна, Злучаным Штатам варта выкарыстаць трыбуну АБСЕ, каб выказаць пратэст супраць такой заганнай практыкі ў галіне заканадаўства;

– Злучаным Штатам трэба таксама настойваць на арганізацыі дзейснага міжнароднага назірання;

– Злучаныя Штаты могуць дапамагчы ў арганізацыі незалежных экзіт-полаў падчас галасавання;

– найбольш эфектыўныя акцыі пратэсту ў рэгіёне ладзілі студэнцкія і моладзевыя арганізацыі: «Отпор» у Сербіі, «Кхмара» ў Грузіі, «Зубр» у Беларусі і «Пора» ва Украіне. Іх метады працы добра вядомыя; іх можна і трэба распаўсюдзіць у Расіі.

Паводзіны прэзідэнта Пуціна ва Украіне яскрава засведчылі, што ён аддае перавагу наяўным аўтарытарным лідэрам перад дэмакратычнымі прынцыпамі. Расійская палітыка ў дзяржавах былога СССР, здаецца, звялася да рэфлекторнай рэакцыі на любыя дэмакратычныя тэндэнцыі і любыя дзеянні Захаду. Злучаным Штатам нельга спакойна з гэтым згаджацца. Калі народы гэтых краін паўстаюць супраць дыктатараў, Злучаныя Штаты павінны цвёрда выступіць на баку дэмакратыі супраць Пуціна. Аднак, хоць Расія і кіруецца благімі намерамі, наўрад ці ёсць падставы баяцца расійскага неаімперыялізму, беручы пад увагу, наколькі бездапаможнай стала палітыка Расіі ў міжнародных адносінах і вайсковай сферы.

Сярод многіх супольных інтарэсаў Злучаных Штатаў і Расіі, якімі нельга ахвяраваць, найвялікшы і самы важны – нераспаўсюд зброі масавага знішчэння як на сусветным узроўні, так і ў крызісных краінах (Іран, Паўночная Карэя). У гэтай галіне глыбінныя інтарэсы Расіі і Злучаных Штатаў супадаюць, і расійская падтрымка можа быць жыццёва важнай для ЗША – асабліва ў дачыненнях з Іранам.

Незалежна ад ходу палітычных падзей у Расіі, Злучаныя Штаты трывала зацікаўленыя ў спрыянні яе эканамічнай інтэграцыі ў сусветную эканоміку і, такім чынам, у міжнародную сістэму. ЗША справядліва прызналі Расію краінай з рынкавай эканомікай, што істотна ў плане антыдэмпінгавых захадаў. Амерыцы варта таксама падтрымаць уступленне Расіі ў Сусветную гандлёвую арганізацыю: тады Расія павінна будзе выконваць шматлікія міжнародныя нормы, што дапаможа ёй прывесці сваё гандлёвае заканадаўства ў адпаведнасць з заходнім. Да Расіі неўзабаве пяройдзе старшынства ў «васьмёрцы», і гэта азначае, што Захад, верагодна, прад'явіць

да яе большыя патрабаванні, і, адпаведна, у Пуціна будуць грунтоўныя падставы з імі пагадзіцца.

Захаду гэтаксама варта заахвочваць Расію да супрацоўніцтва ў галіне энергетыкі. Большасць вялікіх заходніх энергетычных кампаній уклалі ў Расію немалыя інвестыцыі, але падобна, што магчымасці для супрацоўніцтва ўсё звужаюцца, бо сябры Пуціна па КГБ перанялі кантроль над расійскімі дзяржаўнымі энергетычнымі кампаніямі і спрабуюць карыстацца іх актывамі без умяшання звонку. Узмацненне дзяржаўнай манаполіі на транспартаванне нафты замінае будаўніцтву прыватных нафтаправодаў. Аднак неўзабаве прастора для міжнароднага супрацоўніцтва можа зноў пашырыцца. Расійскія прыватныя нафтаздабывальныя кампаніі з году ў год значна нарошчвалі вытворчасць, але цяпер праз умяшанне дзяржавы тэмпы росту запавольваюцца, і хутка ўзровень здабычы можа пачаць падаць. Тады Расіі, без сумневу, спатрэбіцца супрацоўніцтва з замежнымі краінамі, што можна толькі вітаць, улічваючы павелічэнне дэфіцыту нафты ў сусветным маштабе.

Пераклаў з амерыканскай У. Паўловіч паводле: Eslund Anders. Putin's Decline and America's Response //Carnegie Policy Brief. 2005. August.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/24
[image]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к

№ 6 (40) - 2005

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

крытыка [image]2005

да Зьмітру

крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Віталь Сіліцкі Карані і метады постсавецкай віртуальнасці

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ

палітоляг, сталы аўтар «ARCHE». Сёлета ініцыяваў шырокую грамадзкую дыскусію з нагоды расейскамоўнага вяшчаньня на Беларусь нямецкай радыестанцыі «Deutsche Welle».

Што рабіць, калі губляць уладу не хочацца, але трэба, каб была дэмакратыя? Усё проста: здымі кіно пра выбары са сваёй перамогай у канцы, запрасі народ у масоўку, каб ён патусаваўся, пакажы па тэлебачанні і праводзь чарговую інаўгурацыю. Эндру Уілсан напісаў кнігу пра тое, што за фасадам нібыта канкурэнтнай электаральнай палітыкі, нейкіх выбараў, кааліцый, скандалаў, парламенцкіх дэбатаў і г. д. працуе велізарная індустрыя падману. Па вялікім рахунку, постсавецкая палітыка, якую мы назіраем – гэта ўсяго толькі віртуальная рэчаіснасць, якая існуе на блакітных экранах і, магчыма, на старонках газет ды ў Інтэрнэце – але не ў жыцці.

Віртуальная палітыка – гэта нават не фальсіфікацыя выбарцаў, а фальсіфікацыя гульцоў на выбарах. Гэта рэаліі, у якіх, напрыклад, Зюганаў з Глазьевым альбо Сіманенка з Вітрэнкай – гэта лялькі, спадары Паўлоўскі альбо Гельман – лялькаводы, а спадары Суркоў, Беразоўскі ці Медвядчук – лялькаводы тых лялькаводаў. Гэта працэс, які шчыльна рэгулюецца адміністрацыйным рэсурсам. Гэта барацьба, якая зводзіцца да серыі дызайнерскіх праектаў і не мае нічога супольнага з рэальнай канкурэнцыяй ці адказнасцю. Гэта драматургія, у

якой гульцы і сюжэт выдумваюцца пад канкрэтнага кліента. Гэта «рэчаіснасць», якая ствараецца пад замову і за вялікія грошы, але якую грамадства ў сваёй большасці і ў большасці выпадкаў атаясамлівае ці мусіць атаясамліваць з сапраўднасцю. Віртуальная палітыка толькі прыкрывае сапраўдныя працэсы размеркавання і рэалізацыі ўлады, якія ажыццяўляюцца ва ўсяго некалькіх калідорах і офісах. Ці была перамога партыі Уладзіміра Жырыноўскага на парламенцкіх выбарах 1993 г. нашэсцем карычневай чумы? Ці сапраўдным было змаганне расійскіх камуністаў за ўладу ў 1996 г. (альбо ўкраінскіх у 1999 г.)? У чым сутнасць канфлікту на думскіх выбарах у 1999 г. альбо 2003 г.? Чаму самыя ідэалагічна незамірэнчыя ворагі капіталізму так шчыльна зрасліся з гэтым самым капіталізмам? Чаму грамадству паведамілі пра такое зрастанне толькі ў пэўны момант? Чым былі насамрэч кандыдатуры генерала Лебедзя ў Расіі і Наталлі Вітрэнкі ва Украіне, чым былі партыі кшталту «Родины» ды ўкраінскага «Яблука», прагрэсіўных сацыялістаў альбо незлічоных партый пенсіянераў, жанчын, бясконцых камуністычных і нацыяналістычных рухаў?

Сёння мы ведаем адказы на ўсе гэтыя пытанні. Аднак калі звесці ўсе факты ў сістэму, можна прыйсці, як Уілсан, да простай высновы. Нават там, дзе калісьці існаваў фасад дэмакратыі (перш за ўсё ў Расеі), ніколі не было нармальнага дэмакратычнага палітычнага працэсу. Ён быў падменены піярам, і піяршчыкі, якія ствараюць ілюзію барацьбы, а не партыі ці кандыдаты, якія быццам бы мусілі весці барацьбу, сталі галоўнымі акторамі на так званых выбарах. І ўвесь гэты піяр, уся быццам бы барацьба кіравалася і накіроўвалася тымі, хто трымаў ключы ад сапраўднай улады – палітычнай, адміністрацыйнай, фінансавай.

Піяр і віртуальная палітыка – гэта, канечне, не чыста постсавецкі феномен. Скажам, як нейкая дзесьці Партыя Жыцця і Адраджэння чагосьці, галоўныя амерыканскія партыі, рэспубліканцы і дэмакраты, не маюць сяброўскіх білетаў і нават офісаў, акрамя, можа, галаўнога. Тоны лабістаў і піяршчыкаў на Кей-стрыт у Вашынгтоне спецыялізуюцца на стварэнні «народных» рухаў за нешта, якія насамрэч

падтрымліваюцца буйнымі карпарацыямі. У ЗША менеджэры перадвыбарных кампаній – таксама наёмнікі, а не партыйныя актывісты. Якая-небудзь Нікола М вельмі добра чулася б на Кей-стрыт.

Але ж постсавецкая віртуальная палітыка розніцца ад амерыканскай адным аспектам – роляй дзяржавы. У канкурэнтнай дэмакратыі піяр і тэхналогіі, падстаўкі і правакацыі, фальшывыя партыі і кандыдаты-лялькі – гэта ўсё ж прыватны бізнес. У Расеі (і да нядаўняга часу ва Украіне), напрыклад, гэты бізнес ужо цалкам нацыяналізаваны. Крэмль цалкам кантралюе тэлебачанне – галоўны інструмент віртуальнай палітыкі. Піяршчыкі наўпрост перайшлі на службу ў Крэмль, а тыя, хто не перайшоў, папросту зніклі з бізнесу – асабліва пасля таго, як губернатараў сталі прызначаць, а думскія выбары сталі занадта прадказальнымі.

Уілсан дасціпна дакументуе і апавядае ў дэталях пра аўтараў і выканаўцаў постсавецкай віртуальнасці, пра іх метады і тэхналогіі. Аднак, акрамя гэтага, ён імкнецца і аналізаваць прыроду з'явы.

КАРАНІ ВІРТУАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ

Віртуальная палітыка мае некалькі ўдзельнікаў і назіральнікаў. Па-першае, гэта эліты, якія перакананыя ў тым, што ўся палітыка можа рабіцца толькі «на вярхах», а народам можна маніпуляваць як заўгодна. Па-другое, гэта сродкі масавай інфармацыі, якія знаходзяцца пад поўным кантролем гэтых эліт. Па-трэцяе – гэта цэлая кагорта цынікаў, якія гатовыя дапамагаць элітам у маніпуляцыі грамадскай думкай і свядомасцю сродкамі мас-медыяў, так званыя паліттэхнолагі ці, у ангельскамоўнай інтэрпрэтацыі, *spin doctors* (майстры падману). І, нарэшце, па-чацвёртае, гэта сам народ: апатычны, пазбаўлены веры ў тое, што палітыка можа неяк паўплываць, тым больш станоўча, на іх жыццё, закормлены ідэалогіяй і такім чынам расчараваны ў ідэалах, і гэткім чынам звыклы глядзець на палітыку і нават у шырэйшым сэнсе на навіны і любую інфармацыю проста як на шоў, штосьці сярэдняе паміж фільмамі жахаў і мыльнымі операмі. Феномен віртуальнай

палітыкі ўзнікае тады, калі ўсе вышэйпералічаныя гульцы існуюць у адзін час і на адным палітычным і інфармацыйным полі. Тады палітыка знікае як такая, і ёй на змену прыходзяць тэхналогіі, якія падмяняюць сабой і палітыку, і навіны, і інфармацыю, і нават саму рэчаіснасць.

Віртуальная палітыка найперш мае глыбокія карані ў расійскай палітычнай культуры, якая за часы існавання Расійскай ды савецкай імперый транслявалася і на іншыя народы былога СССР. Асноўныя яе рысы – гэта патрыярхальнасць, адсутнасць традыцый грамадзянскай супольнасці і ўдзелу, падпарадкаванасць чалавека ўладзе і як вынік – адсутнасць у вялікай часткі насельніцтва нават жадання фармуляваць уласную думку аб палітычных падзеях. Дадайце да гэтага схільнасць да ірацыянальнасці і веру ў «Іванаў-дурняў», традыцыйны скептыцызм у дачыненні да ўлады, усведамленне вечнага падзелу на «паноў» ды «мужыкоў» і як вынік – цынічнае стаўленне да палітыкі, што перадаецца з пакалення ў пакаленне. Цынізм, патрыярхальнасць і схільнасць да ірацыянальнасці ствараюць спрыяльную глебу для сенсацыйных выкрыццяў, войнаў кампрамату, чорнага піяру і віртуальных герояў-выратавальнікаў. Акрамя гэтага, Уілсан падкрэслівае і такую гістарычную перадумову для віртуальнай палітыкі, як імперская традыцыя, а значыць – і несфармаванасць нацыянальнай самасвядомасці ў Расеі, дзе існыя формы самаідэнтыфікацыі завязаныя на ўладу і паноўны рэжым, а не на супольнасць суродзічаў і грамадзянаў. Пра гэта, дарэчы, наўпрост заявіў прынц сучаснай віртуальнай палітыкі Глеб Паўлоўскі, чыю цытату прыводзіць Уілсан:

Расійская ўлада ніколі не была і не будзе нацыянальнай, гэта значыць, чымсьці, што ажыццяўляецца людзьмі. Мы, расійцы, прымітыўныя (mediocre) славяне і скіфы. Нашу ідэнтычнасць вызначае наша камунікацыя, а наша камунікацыя – гэта ўлада, унутры ўлады, пра ўладу, – тайную і помслівую.

Паўлоўскі таксама цытуе філосафа Міхаіла Гефлера: «Гэта (Расія) не проста грамадства ўлады. Мы таксама этас улады». Як вынік несфармаванасці нацыянальнай і грамадзянскай

супольнасці – атамізацыя грамадства, адсутнасць гарызантальных каналаў камунікацыі і ўсведамлення супольнага дабра, што цягне за сабой немагчымасць палітыкі ў традыцыйным сэнсе, якая амаль па азначэнні падмяняецца віртуальнымі, элітнымі праектамі.

Цынізм эліт і ўсведамленне іх усёўладнасці таксама мае на постсавецкай прасторы даволі доўгую традыцыю. Уілсан прасочвае яе карані аж да імперскіх часоў і ў нейкім сэнсе бачыць вытокі віртуальнай палітыкі яшчэ ў дапятроўскай Русі (пачынаючы аж з цара Ілжэдзмітрыя). У больш блізкім гістарычным часе прыкладамі віртуалізацыі палітыкі былі аперацыі царскай ахранкі па стварэнні ілжэрэвалюцыйных арганізацый дзеля расколу і разбурэння рэальных (нагадаем такіх гістарычных персанажаў, як Азэф і поп Гапон); арганізацыя інтэлектуальных правакацый для стварэння выгаднага ўладам ідэалагічнага фону і сацыяльнага клімату (найбольш вядомы прыклад – стварэнне і распаўсюджванне сумнавядомых «Пратаколаў сіёнскіх мудрацоў») альбо прамоцыя ультрарадыкальных элементаў дзеля стварэння іміджу рэжыму як найменшага зла (напрыклад, актыўнае спрыянне Саюзу Архангела Міхаіла Уладзіміра Пурышкевіча).

За савецкім часам, з канструяваннем таталітарнай улады і надыходам эры «электронных медыяў» (спачатку толькі радыё), віртуальная палітыка набыла новыя, оруэлаўскія рысы і памеры. Якраз-такі оруэлаўская віртуальнасць (вайна – гэта мір, няведанне – сіла і г. д.) і сталася візітоўкай савецкай прапагандысцкай машыны, якая, паводле словаў аднаго даследчыка, «стварыла глыбокія скажэнні якога-кольвек адчування часу, прычын ці наступстваў». За сталінскім часам віртуалізацыя жыцця з паказальнымі працэсамі, канвеернай распрацоўкай змоваў і іх выкрыццё дасягнулі свайго піку.

Прапагандысцкі канвеер, які яе абслугоўвае, фактычна працягвае рэпрадукавацца ў сучасных палітычных тэхналогіях. Яшчэ адна інстытуцыя, якая захавала і перадала традыцыі савецкай віртуалізацыі ў постсавецкі час – гэта КГБ з яго традыцыямі правакацый, кампрамату, шантажу, ідэалагічных войнаў, вонкавай прапаганды, прамоцыі міфічных

«нацыянальна-вызваленчых рухаў», расколу дысідэнцкіх рухаў і нацыяналістычнага андэграўнду (мяркую, што нагадваць пра ролю КГБ і яго нашчадкаў, як на арганізацыйным, так і асабістым узроўні, у постсавецкай палітыцы не варта). Традыцыі віртуальнасці і інфармацыйнай драматургіі працягнуліся і за часам перабудовы. Уілсан нагадвае пра спробы стрымлівання сілаў і працэсаў, якія яны разгарнулі, праз шматлікія праекты, што нараджаліся Крамлём і КГБ. У асноўным гэта былі праекты, якія мусілі альбо падмяніць, альбо аслабіць тыя сілы, што перабудова падштурхнула да жыцця і якія паноўная наменклатура не магла стрымаць, як гаворыцца, чыстымі рукамі. Такімі праектамі былі ЛДП Жырыноўскага, шматлікія сурагаты сапраўдных апазіцыйных партый і народных франтоў, гэтаксама як ультранацыяналістычныя і радыкальныя камуністычныя арганізацыі, што быццам бы ствараліся, каб прадставіць паноўную наменклатуру і асабіста генсека Гарбачова альбо гарантам стабільнасці, альбо меншым злом. Уілсан адносіць да такіх віртуальных праектаў, напрыклад, і вядомую ў свой час змагарку за справу Сталіна Ніну Андрэеву (чый антыгарбачоўскі артыкул 1988 г. «Не магу адступацца ад прынцыпаў» нібыта насамрэч быў арганізаваны гарбачоўцамі дзеля кампраметацыі непажаданых канкурэнтаў у Палітбюро як «ястрабаў»), і нават жнівеньскі путч 1991 г., які нібыта пачаўся як спроба Гарбачова зарганізаваць цудоўнае выратаванне краіны ад дыктатуры пад сваім мудрым кіраўніцтвам (дадамо, што чуткі пра датычнасць Гарбачова да путчу ў свой час сапраўды хадзілі, але яны ніколі не пацвердзіліся).

ВІРТУАЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА Ў ПОСТСАВЕЦКІ ЧАС

Чаму ў выніку палітычных зменаў на постсавецкай прасторы ў такіх краінах, як Расія ці Украіна, замацавалася віртуальная, а не рэальная палітыка? Тут з кнігі Уілсана можна вывесці тры адказы на пытанне. Па-першае, у гэтых краінах вельмі рана сфармаваўся «стары новы» паноўны клас, легітымнасць улады і капіталаў якога была вельмі сумнеўнай, і таму рэальнай палітычнай канкурэнцыі ён сабе проста не мог дазволіць. Па-другое, з шэрагу прычын гэтаму паноўнаму класу быў патрэбны

імідж дэмакратыі (хутчэй для вонкавага, а не ўнутранага карыстання). Дарэчы, пры адсутнасці гэтых двух чыннікаў (як гэта было ў Беларусі) асаблівай патрэбы ў віртуалізацыі палітыкі проста няма – як і самой палітыкі. Ну і, па-трэцяе, адыграла ролю тое, што дзевяностыя гады ў сацыяльным аспекце ў чымсьці былі працягам гадоў сямідзесятых-васьмідзесятых, калі савецкі яшчэ народ шчыльна назіраў за цынічнымі паводзінамі (сумессю прапагандысцкай ахінеі і амаль не хаванага паказнога спажывання) з боку старога паноўнага класа. Таму злоўжыванні, крадзеж і карупцыя постсавецкіх гадоў толькі пацвердзілі папулярны стэрэатып пра тое, што «ўсе яны такія». Для простага чалавека палітыка страціла актуальнасць. Да таго ж тэлевізар застаўся асноўнай крыніцай інфармацыі, якую гэты просты чалавек мог сабе дазволіць. Усе чыннікі для віртуальнай палітыкі склаліся.

Асноўная частка кнігі Уілсана прысвечана каралям чорнага піяру і палітычных падставак ды іх метадам. Першы, больш цывільны метад – даволі простае па тэхніцы іміджмейкерства («зрабіце мне прыгожа»). Другі, больш складаны і варты аналізу метад – гэта маскаванне кліента пад цэлую віртуальную драму, якая спецыяльна ствараецца дзеля забеспячэння пэўнага палітычнага ці электаральнага выніку, гэтак званая «інфармацыйная драматургія». Яе сэнс – у штучным стварэнні зусім новых, канечне віртуальных, кантэкстаў, канфліктаў і пагроз, якія прымушаюць грамадства згадзіцца з выбарам (кандыдата ці, скажам, кірунку руху), ужо зробленым за яго элітамі і пра які яшчэ некалькі месяцаў ці тыдняў таму ніхто ў цвярозым розуме і падумаць не мог.

Найбольш распаўсюджанымі прыёмамі інфармацыйнай драматургіі ёсць, напрыклад, «перавод стрэлак» (пошук новых ворагаў, вінаватых у тым ці іншым няшчасці, альбо пошук новага няшчасця, дзеля таго, каб адцягнуць увагу ад існуючых праблем, за якія відавочна нясуць адказнасць цяперашнія ўлады). Класічны прыклад пераводу стрэлак – гэта стварэнне віртуальных пагроз, напрыклад фашысцкіх, камуністычных ці алігархічных, напярэдадні выбараў (скажам, у 1995 г. у Беларусі праз сумнавядомую прадукцыю «Нянавісць. Дзеці ілжы»; правакацыя расійскага паліттэхнолага Станіслава

Бялкоўскага пра змову алігархаў у 2003 г., якая забяспечыла прыкрыццё канчатковай цэнтралізацыі ўлады Пуціным; альбо, меней удалы прыклад, у 2004 г. ва Украіне праз раздзіманне міфа аб нашэсці бандэраўскага нацыяналізму. Можна сказаць, што першы сапраўды паспяховы віртуальны праект на постсавецкай прасторы – гэта «змаганне з карупцыяй» дэпутата Вярхоўнага савета РБ 12-га склікання Аляксандра Лукашэнкі). Іншы метад, так званая «зялёная брама», наўмысная і штучная палярызацыя выбару (тут класічныя прыклады – драматургія прэзідэнцкіх выбараў 1996 г. у Расіі і 1999 г. ва Украіне). Альтэрнатыўна выбар можа быць наўмысна размыты стварэннем ледзь не дзесяткаў дробных і дробненькіх партый ці кандыдатаў, якія затушоўваюць сутнасць «галоўнага» супрацьстаяння (так званая тактыка «шматслойнага пірага», якая да апошняга часу заўжды ўжывалася на парламенцкіх выбарах у Расіі і ва Украіне: уладныя эліты, калі яны былі няздольныя стварыць адзіную і моцную партыю ўлады, былі вымушаныя намагацца, каб існавала як мага больш дробных партый). Нарэшце, больш дарагі прыклад інфармацыйнай драматургіі – гэта «віртуальная вайна» (згадваецца ўшэсце на расійскі пасад прэзідэнта Уладзіміра Пуціна ў 1999 г.).

Адзін аспект даследавання Уілсана сам сабою дае даволі добрае ўяўленне пра характар віртуальнай палітыкі на постсавецкай прасторы, перш за ўсё ў Расіі і ва Украіне. Амаль палова кнігі прысвечана тэорыі і практыцы стварэння падкантрольнай апазіцыі. У гэтым ёсць свой сэнс. «Мяккая» аўтарытарная ўлада, у якой найвышэйшая патрэба ў віртуалізацыі і ў тым, каб «усё выглядала прыгожа», сама сабою не вельмі спрытная для стварэння прывабнага і – галоўнае – вартага даверу дэмакратычнага фасаду, які б схаваў сапраўдныя механізмы і адносіны ўлады (бюракратычныя і алігархічныя кланы і г. д.). Таму неабходным чыннікам выжывання для такіх рэжымаў было стварэнне цалкам кантраляванай, прадказальнай і бяспечнай апазіцыі.

Першы этап канструявання кантраляванай апазіцыі – разбурэнне сапраўдных груповак, якія ўсур'ёз намагаліся змагацца за ўладу, перш за ўсё дэмакратычных рухаў і па-за Расіяй, Народных франтоў, што паўсталі яшчэ напрыканцы

савецкай эпохі. Калі не хапала простых адміністрацыйных мераў (разгрому альбо забароны) ці інфармацыйнага кілерства а-ля Азаронак, у ход ішлі складанейшыя прыёмы, такія, як стварэнне «мух» (партый ці індывідаў, што спецыялізаваліся на атаках і дэфармацыі) альбо «двайнікоў» (якія, наадварот, былі дублёрамі і выклікалі непаразуменні). Наступны крок – гэта стварэнне цалкам кантраляванай апазіцыі: віртуальных камуністаў – радыкалаў, лібералаў, «зялёных» (чыста эколагаў, якіх з сапраўднымі лучыць толькі колер амерыканскага долара). Тут, бадай, некалькіх старонак не хопіць, каб пералічыць усе магчымыя і немагчымыя віртуальныя апазіцыйныя праекты нават у Расіі і ва Украіне – пачынаючы з «ліберал-дэмакратаў» Жырыноўскага і «прагрэсіўных сацыялістаў» Вітрэнкі ва Украіне (праект стрымлівання камуністаў і сапраўдных некантраляваных сацыялістаў Мароза), фальшывых лібералаў (украінская «Каманда Азімага Пакалення»), безлічы нацыяналістычных і ультранацыяналістычных праектаў у Расіі (ад «Святой Русі» праз «Партыю Сапраўдных Патрыётаў» да «За Русь Святую») і ва Украіне (прамоцыя УНА-УНСО для дыскрэдытацыі цывільных правых сілаў), а таксама міфічных «функцыянальных» праектаў (партыі жанчын, пенсіянераў і г. д.). Стварэнне кантраляванай апазіцыі мае ўжо новую мэту – гэта прэзентацыя ілюзіі інтрыгі, спаборніцтва, непрадказальнасці. Нарэшце, апошні крок у працэсе апанавання апазіцыяй – гэта прыватызацыя альбо разбурэнне апошніх рэальна існуючых палітычных суб'ектаў, як правіла – камуністаў, якія выявіліся найбольш здольнымі да самастойнага палітычнага існавання ў постсавецкую эпоху.

Прыручэнне камуністаў ажыццяўляецца ў некалькі этапаў. Першы – гэта іх ператварэнне ў частку новага класа, так сказаць, «абуржуазніванне». Пасля таго, як яны перасядаюць на дарагія «мерседэсы» і пераязджаюць у асабнякі, абзаводзяцца бізнесамі і спонсарамі, настае перыяд дыскрэдытацыі («ату, камуністы здрадзілі і пабраталіся з буржуямі!»). На трэцім этапе здыскрэдытаваныя і аслабленыя камуністы робяцца паслухмянымі ўдзельнікамі віртуальных праектаў – дзеля выжывання ды захавання «буржуазных прывілеяў».

На гэтым апошнім этапе віртуальная палітыка амаль вычэрпвае

сябе, як яна вычарпала сябе ў Расіі пасля парламенцкіх выбараў 2003 г. Пасля таго, як усё апынаецца пад кантролем, ужо немагчымая драматургія ўнутранага палітычнага канфлікту, стварэнне ілюзіі непрадказальнасці і спаборніцтва. Застаецца толькі драматургія вайны, пастаяннае раздзіманне міфа пра варожае атачэнне і вонкавыя пагрозы. Настае эра Суркова. Альбо, альтэрнатыўна, віртуальная рэчаіснасць бурыцца і саступае месца сапраўднай палітычнай барацьбе, як гэта адбылося ва Украіне. Дык чаму дзве краіны, дзе існавалі гэтак падобныя палітычныя і эканамічныя рэаліі, так разышліся ў сваіх шляхах?

ДЗЕ МЕЖЫ ВІРТУАЛЬНАСЦІ?

Уілсан не дае дакладнага адказу – кніга пайшла ў друк перад падзеямі ў Кіеве ў лістападзе 2004 г., але ў ягоным аналізе можна знайсці некалькі намёкаў. Перад гэтым, аднак, засяродзім увагу на абмежаванасцях і недарэчнасцях яго аргументацыі.

Аўтар яўна «зарапартаваўся» ва ўжыванні аналітычнай схемы, якую ён выпрацаваў на прыкладах Расіі і Украіны, да ўсёй постсавецкай прасторы. Ён забыўся, што імкненне да таго, каб усё выглядала прыгожа, перш за ўсё ўласціва слабым аўтарытарным рэжымам, якія не могуць сабе дазволіць больш жорсткіх актыўных мераў, што зводзяцца да інфармацыйнага, арганізацыйнага і нават фізічнага знішчэння апазіцыі задоўга да ўсялякіх выбараў. У гэтам сэнсе ягоныя намаганні знайсці, напрыклад, доказы маніпулявання апазіцыйным асяроддзем з боку лукашэнкаўскай улады ў Беларусі выглядаюць проста камічна. А дзе нават выгляд палітычнай канкурэнцыі, дзеля якой патрэбна такая маніпуляцыя? Як вынік, аўтарам проста выдуманыя падзеі, якіх не было. Ну, напрыклад, ён сцвярджае, што «фракцыя Вячоркі і Хадыкі» ў БНФ прасоўвалася ўладамі дзеля нейтралізацыі Пазняка. І дзеля доказу – проста хлуслівае сцвярджэнне пра тое, што «фракцыя Вячоркі–Хадыкі» ўдзельнічала ў выбарах у лукашэнкаўскі парламент у 2000 г. Магчыма, гэтую інфармацыю хтосьці падкінуў аўтару для падстаўкі. Як чалавек, які трошкі дапамагаў аўтару ў зборы інфармацыі, афіцыйна заяўляю – гэта быў не я. Таксама

недарэчныя сцвярджэнні аўтара пра тое, што нібыта на прэзідэнцкіх выбарах 2001 г. Лукашэнку было патрэбна як мага больш кандыдатаў (тыповы стэрэатып пад уплывам Расіі і Украіны 1990-х гг.: Лукашэнка настолькі апанаваў уладу, што яму былі патрэбныя выбары ў адзін тур, а гэта значыць – як мага меней канкурэнтаў). Альбо залічэнне Мікалая Статкевіча і Міхаіла Марыніча ў шэраг віртуальных праектаў расколу апазіцыі – заўважым, што кніга пісалася да таго, як абодва апынуліся за кратамі, але аўтар рэцэнзіі персанальна папярэджваў спадара Уілсана не рабіць такіх высноў.

Таксама час ад часу выклікаюць пытанне крыніцы, якімі карыстаецца аўтар. Прывяду прыклад: у разважаннях пра расійскі ўплыў часу прэзідэнцкай кампаніі 1994 г. у Беларусі аўтар прыводзіць дзве крыніцы: «Нашэсце» Уладзіміра Мацкевіча і… прыватную гутарку з Віталём Сіліцкім. Ну, я сапраўды казаў спадару Уілсану, што лічу, што пэўныя колы ў Маскве дапамагалі Лукашэнку. Але як, даруйце, на час той кампаніі студэнт апошняга курсу БДУ мог быць аўтарытэтным экспертам у такіх пытаннях?

Час ад часу аўтар выдае даволі гіпатэтычныя сцвярджэнні за стопрацэнтныя факты, прыводзячы ў якасці крыніц думкі некалькіх паліттэхнолагаў. Напрыклад, ён падае як дадзенае тое, што прэзідэнцкія выбары 1996 г. у Расіі выйграў насамрэч Зюганаў, а не Ельцын. Так, гэта магчыма; тое, што тыя выбары былі ў значнай ступені сфальсіфікаваныя – відавочна, але тое, што іх насамрэч выйграў іншы – далёка не факт, і жалезных доказаў такой тэорыі Уілсан не прывёў. Але ён на аснове гэтага сцвярджэння робіць далёкасяжныя высновы пра расійскую палітыку. Пры гэтым Уілсан значна больш асцярожны ў абыходжанні з іншымі гіпотэзамі, у пацверджанні якіх можна знайсці нашмат болей доказаў: напрыклад, пра тое, што другая чачэнская вайна была насамрэч часткай праекту замены Ельцына Пуціным. Тут, кажа Уілсан, «высвятленне таго, ці праўда гэта, можа каштаваць задорага». Дык што, проста ляжачага біць можна?

Нарэшце, у сваёй аргументацыі, што ўсё ў постсавецкай палітыцы, так сказаць, «схоплена», Уілсан час ад часу

абапіраецца на зусім не ключавыя падзеі і з'явы. Напрыклад, апісваючы кіроўную ролю КПСС і КГБ у стварэнні палітычнай апазіцыі за гарбачоўскім часам, Уілсан засяроджвае ўвагу на персонах Жырыноўскага ці Льва Убожкі (тагачасны гарадскі вар'ят, чыя роля прыкладна адпавядала прозвішчу) і ігнаруе такія з'явы, як, скажам, «Дэмакратычная Расія» ці прыбалтыйскія і закаўказскія Народныя франты. У шырэйшым сэнсе, Уілсан не імкнецца правесці мяжу паміж тым, што задумвалася, і тым, што атрымалася. Так, уся перабудова была віртуальным праектам, але ці быў распад СССР планаванай падзеяй???

Вяртаемся да межаў віртуальнасці. Уілсан прызнае, што не ўся постсавецкая палітыка віртуальная, і не ўся віртуальнасць можа быць схаваная ад вачэй. Часам гэта адбываецца, калі рэчаіснасць усё ж такі немагчыма схаваць за іміджам на тэлебачанні. Вядомы выпадак (пра яго апавядаюць былыя карэспандэнты «Washington Post» Пітэр Бейкер і Сюзан Глэйсіер у сваёй кнізе «Узмацненне Крамля» («Kremlin Rising. Vladimir Putin's Russia and The End of Revolution»), калі прэзідэнт Пуцін выклікаў «на дыван» сумнавядомага медыя-кілера Сяргея Дарэнку, тады яшчэ гаворачую галаву ОРТ, і ўжо апальнага алігарха Барыса Беразоўскага пасля таго, як у праграме ОРТ, лямантуючы, жанчыны казалі ўсё, што думалі пра Пуціна і дзяржаву ўвогуле. «Дзе ты знайшоў гэтых шлюх?!» – крычаў на Дарэнку Пуцін. «Гэта ж жонкі падводнікаў», – толькі і адказаў той. Паводле ягонага трапнага вызначэння, «для Пуціна не існуе рэчаіснасці – для яго існуюць толькі інфармацыйныя тэхналогіі». Безумоўна, калі рэчаіснасць нельга звесці да тэлекарцінкі, тэхналогіі пачынаюць сыпацца. У Расіі гэта ў нейкай ступені адбылося пасля падзей у Беслане і пратэстаў з нагоды змяншэння льготаў, якія нанеслі балючы ўдар па іміджы моцнай і стабільнай пуцінскай улады. У нейкім сэнсе тое, што такая фігура, як Глеб Паўлоўскі, сама мусіла ператварыцца ў гаворачую галаву і такім чынам перавесці працэс прапаганды ў рэжым ручнога кіравання, кажа пра нейкі стан роспачы, які быў толькі пабольшаны поўным крахам расійскіх майстроў падману ва Украіне. Аднак відавочна, што з віртуальнай рэчаіснасці, як з той Матрыцы, расійскае грамадства, нават пасля пэўнага псіхалагічнага запалохвання,

не вырвалася. Бадай, таму што базавыя адносіны да сябе, дзяржавы і палітыкі не змяніліся.

А што тады здарылася ва Украіне? Чаму там пракалоўся ўвесь адміністрацыйны рэсурс і афіцыйная прапаганда? На жаль, кніга была ўжо амаль у друку, калі адбывалася Памаранчавая рэвалюцыя. У сваім кароткім аналізе Уілсан знаходзіць прычыны паразы партыі ўлады перш за ўсё ў нізкай тэхналагічнасці кампаніі Януковіча (напрыклад, ён верыць у тое, што выкарыстанне некаторых стандартных тэхналогій, напрыклад раскрутка «трэцяй сілы» паводле метаду генерала Лебедзя, дапамагла б перамагчы ўладам больш чыста). Аднак можна знайсці і больш глыбокія прычыны. Уілсан прыводзіць сведчанні некаторых расійскіх паліттэхнолагаў яшчэ з кампаніі 2002 г. З чым яны тады сутыкнуліся ва Украіне, гэта тое, што для багатай часткі насельніцтва нават слова «паліттэхнолаг» стала чымсьці накшталт лаянкі. Яно выклікала асацыяцыі з такімі тэрмінамі, як улада, карупцыя, хлусня, а таксама Расія. Іншымі словамі – сама з'ява палітычных тэхналогій стала ўспрымацца як ашуканства, а таксама нешта чужынскае, неўласцівае мясцовай культуры.

Тут згадаем фундаментальную тэзу Уілсана пра тое, што падставай для віртуальнай палітыкі ёсць грамадства, пазбаўленнае каштоўнасцяў і самасвядомасці. Дык ці не ў гэтым корань правалу віртуальнай палітыкі ва Украіне? Відавочна, што Памаранчавая рэвалюцыя, як і іншыя дэмакратычныя рэвалюцыі, была найперш нацыянальным паўстаннем. Толькі пачуццё адказнасці перад краінай і народам, адчуванне супольнага лёсу магло прымусіць людзей сядзець тыднямі ў снезе. Толькі яны маглі стварыць устойлівае непрыманне пачварнага падману і падставак у медыях. Толькі пры існаванні незалежнай ад скрыні з блакітным экранам сістэмы каштоўнасцяў магло прыйсці пачуццё персанальнай адказнасці за супольную справу.

Уілсан (дарэчы, вядомы даследчык украінскага нацыяналізму) даў дастаткова матэрыялу для развагі аб прычынах краху віртуальнай палітыкі ва Украіне, але, можа, з прычыны недахопу часу сам гэты аргумент, як кажуць, «не раскруціў». У

выніку яго даследаванне ўжо стала прадметам маніпуляцый з боку лявацкіх плыняў на Захадзе, якія ўспрынялі яго аналіз (напрыклад «Times Literary Supplement») як пацверджанне тэзы пра тое, што Памаранчавая рэвалюцыя – гэта частка сусветнай неаканцэрватыўнай змовы. Для рэцэнзенткі Кейт Браўн «Times Literary Supplement» аналіз Уілсана абяліў крытыкаў Памаранчавай рэвалюцыі з брытанскай газеты «Guardian» і амерыканскага часопісу «Nation», якія дагэтуль адкрыта смуткуюць па паразе Расіі ў халоднай вайне. Абсурдныя і часцяком камічныя заявы аўтараў гэтых выданняў ужо сталі здабыткам гісторыі: напрыклад, вядомы гісторык Стывен Коэн абвінаваціў заходнія медыі ў развязванні новай халоднай вайны з Расіяй проста за тое, што яны крытыкавалі паводзіны Крамля і яго падтрымку фальшавання выбараў. А Джонатан Стыл, аўтар абодвух выданняў, выклаў тэорыю, што рэвалюцыя ва Украіне здзейснілася дзякуючы ўмяшальніцтву ЗША, якое пераўзышло ўсё, што рабіла Расія. Паколькі фактамі падобныя высновы ніяк нельга пацвердзіць (асабліва калі высветлілася, што Расія на Януковіча выдаткавала больш, чым уся карпаратыўная Амерыка на Буша падчас амерыканскіх прэзідэнцкіх выбараў 2004 г.), прыйшлося вычварацца і прыдумляць дзіўныя тлумачэнні. Напрыклад, паводле версіі Стыла, сапраўдны ўплыў ЗША ва Украіне быў не ў фінансавай, а ў інтэлектуальнай сферы. Іншымі словамі, украінскія рэвалюцыянеры з падачы заакіянскіх спонсараў скарысталі больш эфектыўныя лозунгі і дзякуючы імпартаваным тэхналогіям (у тым ліку тэхналогіі здзяйснення рэвалюцыі) перамаглі менавіта ў віртуальнай барацьбе. Абсурднасць падобнага аргумента можна прадэманстраваць адным пытаннем: чаму амерыканцы выявіліся больш эфектыўнымі тэхнолагамі, чым расійцы? Як магло адбыцца, што яны лепш за Паўлоўскага ці Гельмана зразумелі «ўкраінскі менталітэт»? Калі наследаваць логіцы амерыканскіх і брытанскіх левакоў, гэта магло адбыцца толькі таму, што ўкраінцы былі загадзя «прамытыя» заходняй прапагандай, так што расійцы аказаліся бездапаможныя. Тут, аднак, узнікае больш глыбокае пытанне: чаму расійскія тэхналогіі не спрацавалі? Магчыма, адказ крыецца ў аналізе падстаў для віртуальнай палітыкі, што прыведзены вышэй. Нагадаем, адна з іх – гэта слабасць нацыянальнай ідэнтыфікацыі і нявера ў саму ідэю

калектыўнага дабра. Ці не тут пракалоліся і Паўлоўскі з Пуціным, і «Nation»? Ці не мацаванне ўкраінскай самасвядомасці прывяло да таго, што большасць грамадства не толькі перастала ўспрымаць расійскія культурныя стэрэатыпы, што транслявaліся тэхналогіямі, але і ўзнялася супраць саміх тэхналогій, саміх спробаў маніпуляцыі, успрыняўшы іх як нешта абразлівае і чужынскае?

Дарэчы, тут мы закранаем і шэраг пытанняў, звязаных і з беларускімі рэаліямі. Для пэўнай часткі альтэрнатыўнай беларускай інтэлектуальнай эліты пытанне выбару паміж нацыянальнай свядомасцю і «тэхналогіямі» ў барацьбе за дэмакратыю канчаткова вырашана на карысць апошніх. Наагул, паводле трапнай заўвагі Андрэя Казакевіча ў яго аналізе «Беларуская сістэма: марфалогія, фізіялогія, генеалогія» («ARCHE», 4/2004), амаль усе развагі пра супрацьстаянне Лукашэнку зводзяцца да пошуку «тэхналогій». Тыя, хто не зацыклены на піяры, расцэньваюцца як ідэалісты фармацыі канца 1980-х – пачатку 1990-х гг., якія пазбаўленыя прагматызму і не разумеюць беларускай рэчаіснасці. Аднак першае і не апошняе (чытайце «ARCHE»!) пытанне да прагматыкаў: палітычныя тэхналогіі па азначэнні – гэта інструмент улады, а не апазіцыі. Гэта інструмент дэмабілізацыі, тое, што прыкоўвае абывацеля да тэлевізара і прымушае яго згадзіцца з выбарам, які за яго ўжо зрабілі эліты. Дык ці можа нават самая прыгожая віртуальная рэчаіснасць, нават калі вы яе створыце, матываваць чалавека на тое, каб рызыкаваць здароўем, становішчам, і нават жыццём?
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/24
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]

[image]2005

ад Зьмітук

ад Зьмітук • **крытыка** • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Пётра Рудкоўскі ОП Эротыка біблійнага слова

ПЁТРА РУДКОЎСКІ ОП

філёзаф, тэоляг. Нарадзіўся ў 1978 годзе ў Канвэлішках (Воранаўскі раён). Магістрант Ягелёнскага унівэрсытэту. У сфэру ягоных зацікаўленьняў уваходзіць мэтадалёгія сацыяльных навук. Апошнія ягоныя публікацыі ў «ARCHE» – агляд «Стратэгіі барацьбы за рэальнасьць» (3/2005) і артыкулы

Біблія. Кнігі Сьвятога пісаньня Старога і Новага запавету кананічныя ў беларускім перакладзе / Пер. Васіля Сёмухі. – World Wide Printing Duncanville, 2002.

Сьвятая Бібля. Кнігі Сьвятога Пісьма старога й Новага закону з мовы габрэйскае а грэцкае на вялікалітоўскую (беларускую) нанова перакладзеныя. – У Ню Ёрку, 1973.

Новы запавет / Пер. айца Ўладзіслава Чарняўскага. – Менск, 1999.

Сініла, Галіна. *Біблія як феномен культуры і літаратуры. Частка I. Духоўны і мастацкі свет Торы. Кніга Быцця.* – Мінск: Беларуская навука, 2003.

Сініла, Галіна. *Біблія як феномен культуры і літаратуры. Частка II. Духоўны і мастацкі свет Торы. Кніга Зыходу.* – Мінск: Беларуская навука, 2004.

Перад тым, як Адкрыцьцё стане рэлігійным Дабравесьцем, яно фармуецца на той ці іншай нацыянальнай мове ў канкрэтным культурным кантэксьце.

Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі Філарэт

На пачатку было Слова – кажуць філёзафы й багасловы. Не, на пачатку быў Эрас – пярэчаць паэты й песьняры. А мы б'яднаем філёзафаў і паэтаў, багасловаў і песьняроў: *На пачатку была эротыка Слова*, была Божая жарсьць, агонь Божай любові. Гэтая жарсьць давяла Бога да *ўцелаўленьня*, а ўцелаўленьне давяло Яго да беларускай мовы. Бог захацеў гаварыць па-беларуску...

* * *

Пераклад Васіля Сёмухі выйшаў пад рэдакцыяй Юркі Рапецкага з благаслаўленьнем Мітрапаліта Мікалая, Першагерарха Беларускай аўтакефальнай праваслаўнай царквы ў 2002 годзе. Цягам трох гадоў існаваньня гэтага перакладу ў беларускай культурнай прасторы можна было пачуць і станоўчыя, і адмоўныя водгукі.

«Перакладзеная ім Біблія чытаецца з пожадам, без прыгнечанасьці і натугі, натуральна, як Богам яўленае (абеларушанае) гістарычна-міталягічнае жыцьцё зямнога чалавецтва...» – кажа Леанід Галубовіч. «Перакладзена не з арыгінальных моваў, сам пераклад занадта літаратурны, ёсьць моўныя памылкі», – адзначаюць іншыя, магчыма, больш суровыя крытыкі.

Як «суровасьць», так і «лагоднасьць» у ацэнцы Сёмухавага перакладу зазвычай абумоўлены ці то канфэсійнай, ці то моўна-культурнаю прыналежнасьцю. Для адных заганай можа быць *пурызм* Сёмухавай мовы (напр. «дабраславіць», а не

«Сцэнары лукашэнкаўскай улады» (4/2005), «Нацыянальны дыскурс і лібэральны мардабой. Пасьляслоўе да дыскусіі пра мову «Нямецкай квасі'я» (5/2005). Лібэрэ. Гэтая перадавяло часопіску «ARCHE» «За сумленнае слова» за 2005 год.

«благаславіць», «Дабравесьце», а не «Эвангельле»), для другіх – «усходняя» моўная опцыя (напр. «Гасподзь», а ня «Пан», «Царква», а не «Касьцёл», «Ісус», а ня «Езус»), а для трэціх вялікім мінусам могуць стацца славутыя «мяккія знакі», г. зн. выбар клясычнае вэрсіі беларускай мовы.

Ня менш кантравэрсіяў, несумнеўна, узьнікае і ў сувязі зь перакладамі каталікоў Янкі Станкевіча і Ўладзіслава Чарняўскага. Дый што тут казаць: нават польская «Biblia Tysiąclecia», якая была плёнам сумеснай працы блізу ажно 50 выбітных біблістаў і філёлягаў, сталася аб'ектам даволі суровае крытыкі. Адзін бібліёляг нават сказаў: «Біблія Тысячагодзьдзя» – Біблія тысячы памылак».

Нашым заданьнем будзе ня толькі пераправерыць і ацаніць сучасныя пераклады, але таксама паспрабаваць *падагульніць* працэс станаўленьня беларускай Бібліі. Нас будзе цікавіць *патэнцыял беларускае мовы*: наколькі яна здольная перадаць духоўна-рэлігійны вопыт, сканцэнтраваны ў сьвятых юдэа-хрысьціянскіх кнігах. Будзе цікавіць таксама, наколькі Сёмуха, Чарняўскі і Станкевіч выкарысталі гэты патэнцыял.

PRELIMINARIA: НЕДАСТУПНАЯ РЭЧАІСНАСЬЦЬ

«Чаму лацінская мова такая бедная і недаразьвітая?» – гэтак, паводле паданьня, выгукнуў сьвяты Геранім (IV–V стст.) падчас перакладаньня Старога запавету з габрэйскае мовы на лаціну. Вось як: мова зь вялізным лексычным і марфалягічным патэнцыялам, які ў шмат разоў пераўзыходзіць патэнцыял біблійнай габрэйскай мовы, аказваецца *беднай і недаразьвітай*! Усклік Гераніма тут надзвычай павучальны, варта, каб яго пачулі прыхільнікі тэорыі наконт беднасьці і недаразьвітасьці беларускай мовы ў багаслоўска-біблійным пляне.

Справа ня ў беднасьці, а ў тым, што *кожная мова неперакладальная*. Тэкст *T*, пісаны на мове *X*, можна ператварыць у *T-1* на мове *Y* толькі *шляхам інтэрпрэтацыі*. Пераклад – калі пад перакладам разумець літаральнае адлюстраваньне *T* у *T-1* – зьяўляецца ўтопіяй. Найчасьцей, перакладаючы біблійны тэкст, мы сутыкаемся з гэткім

стасункам паміж мовай Бібліі (абазначым яе «B») і мовай, на якую Біблія перакладаецца («L»):

[image]

Якая-кольвечы мова, якой бы ні была яна багатай, няздольная даць такі тэкст, які быў бы *цалкам* ізамарфічны з арыгінальным тэкстам Бібліі. Нават калі патэнцыял мовы *L*, узятай у цэлым, і вельмі вялікі, заўсёды застанецца нетрансьляваная сфэра *x*. *B* і *L* толькі *часткова ізамарфічныя*. Падчас аналізаваньня беларускіх перакладаў (ад гэтага моманту будзем выкарыстоўваць слова «пераклад» ува ўмоўным, нелітаральным значэньні) будзем асаблівую ўвагу зьвяртаць на гэтую «сфэру *x*».

Чарговая рэч, якую трэба тут адзначыць, гэта праблема *арыгіналу*. У папярэднім абзацы я ўжыў выраз «арыгінальны тэкст», а цяпер давядзецца паставіць пытаньне: а ці існуе нешта такое, як *арыгінал*? Адказ будзе, бадай, адмоўны. Адзін зь бібліёлягаў, Алёйзіюс Фіцджэральд FSC, аднойчы запытаў: цікава, ці зразумеў бы што-кольвечы прарок Ісая, калі б паслухаў сваю кнігу (Кнігу Ісаі) у нашым выкананьні? Справа ў тым, што тая «арыгінальная габрэйская мова», зь якой мы можам мець дачыненьне, – гэта тыбэрыядзка-масарэцкі дыялект, якім карысталася група габрэяў у першым тысячагодзьдзі нашае эры. Наколькі тая ж «арыгінальная» Кніга Ісаі была паддадзена трансфармацыі, застаецца загадкай. *Біблійныя тэксты паўставалі* цягам добрых паўтары тысячы гадоў (прыкладна ад XV ст. да н. э. да I ст. н. э.). Калі хтось адважыцца стварыць мэтадалёгію, якая дазволіла б лякалізаваць у прасторы і часе жаданы «арыгінал», то можа паспрабаваць, але шанцы, мабыць, роўны нулю.

Амаль дзьве тысячы гадоў Біблія існуе ў «завершанай», кананічнай форме, але *яна існуе без арыгіналу*. Мы маем адно толькі *прывілеяваныя копіі*, а менавіта габрэйскія, арамэйскія ды грэцкія старажытныя рукапісы (зазвычай у некалькіх ці некалькіх дзясятках рэдакцыяў), якія і ўтвараюць галоўны пункт аднясеньня для магчымых перавыданьняў і перакладаў Бібліі. Часьцяком іх называюць «арыгіналамі», але яны

насамрэч – псэўдаарыгіналы. На *гэтым* сьвеце няма арыгіналу Бібліі. Біблія – гэта ў пэўным сэнсе *недаступная* рэчаіснасьць.

1. Стары запавет

У Бібліях Станкевіча і Сёмухі Стары запавет (далей – СЗ) явіцца ў праваслаўна-пратэстанцкай вэрсіі, якая матэрыяльна не адрозьніваецца ад юдэйскае Бібліі. Розьняцца яны (праваслаўна-пратэстанцкі СЗ і юдэйская Біблія) толькі парадкам і структураю. Корпус павучальных кніг і корпус праροцтваў перастаўлены месцамі: павучальныя кнігі ўтвараюць другую частку праваслаўнага і пратэстанцкага СЗ, а ў юдэйскай Бібліі – трэцюю. Кнігі Самуіла, Царстваў, Летапісаў і прарока Ераміі разьбіты ў праваслаўным і пратэстанцкім СЗ на дзьве часткі (Першая і Другая кніга Самуіла, Першая і Другая царстваў, Першая і Другая летапісаў, Кніга Ераміі і Галашэньне Ераміі). Такім чынам, юдэйскі біблійны канон налічвае 35, а праваслаўны і пратэстанцкі СЗ – 39 кніг.

Інакш справа выглядае з каталіцкім канонам Старога запавету. Каталіцкі СЗ складаецца ажно з 45 кніг, а гэта таму, што тут прыняліся таксама г. зв. «дэўтэранамічныя кнігі», кнігі, кананічнасьць якіх цягам гісторыі нярэдка ставілася пад сумнеў. Такім чынам, да юдэйска-праваслаўна-пратэстанцкага канону дадаюцца сем іншых кніг: кнігі Товія, Юдыты, Першая і Другая Махавеяў, Мудрасьці, Сыраха і Варуха. Усе гэтыя кнігі вядомыя нам у грэцкай вэрсіі, прычым некаторыя зь іх (Другая кніга Махавеяў, Мудрасьці і Сыраха) былі адпачатна напісаныя па-грэцку, а іншыя напісаны былі па-габрэйску або па-арамэйску, але захаваліся толькі ў перакладзе на грэцкую.

1.1. БЫЦЬЦЁ, ЗАКОН І ГІСТОРЫЯ

«Быцьцё» – гэта першае слова, якое вучацца вымаўляць філёзафы. І не дарма: «быцьцё» – гэта таксама першае слова, якое вымавіў Бог. Яно было вымаўлена ў дзеяслоўнай вэрсіі ў трэцяй асобе адзіночнага ліку незакончанага трыванньня: *ЙЕХІ*, што можна перакласьці: *хай будзе, хай станецца, хай будзе існаваць*. Гэтае слова было вымаўлена ў спэцыфічным

кантэксьце: калі былі створаны неба і зямля, а над вадою лунаў Божы Дух, Бог сказаў (а можа, радасна ўсклікнуў): *йехі ор!* Хай будзе сьвятло! Дадамо, што корань габрэйскага слова *х-й-х* (быць-ставацца) прысутнічае ў Найсьвяцейшым Божым Імені, якое старажытныя габрэі нават не адважваліся вымаўляць: *Й-Х-В-Х*. Таму асаблівую ўвагу прысьвецім Кнізе Быцьця.

1.1.1. «БЫЦЬЦЁ» – КАНКРЭТНАЯ АБСТРАКЦЫЯ

Так сталася, што ў старацаркоўнаславянскай і, усьлед за ёй, ува ўсходнеславянскіх перакладах Сьвятога пісаньня замацаваўся за першаю кнігай Бібліі назоў «Быцьцё» (рас. «Книга Бытия», укр. «Книга Буття»). Старажытныя пераклады – Сэптуагінта (грэцкі пераклад з III ст. да н. э.) і Вульгата (лацінскі пераклад з IV ст. н. э.) – даюць назву «Genesis» (літаральна: «паўставаньне» або «працэс раджэньня»), гэтая ж назва фігуруе і ў большасьці перакладаў на заходнеэўрапейскія мовы (анг. і ням. «Genesis», франц. «Genèse», іт. «Genesi»), а ў польскай мове ў перакладзенай вэрсіі: «Księga Rodzaju». Пэўнае выключэньне тут утварае літоўская Біблія, дзе замацаваўся цікавы назоў: «Pradžios Knyga» – «Кніга пачатку». Аказваецца, гэта дакладнае адлюстраваньне габрэйскае назвы: «Бэрэшіт»[1] (літар. «у-пачатку»), ад першага слова гэтае кнігі.

Наша абстрактнае «быцьцё» было б, хутчэй за ўсё, падазрона ўспрынята старажытным габрэем. Яно адштурхнула б сваім мэтафізычным холадам і адарванасьцю ад нармальнай чалавечай экзыстэнцыі. Як жа далёкае яно ад жыцьця! Але тут і блізкага слова *х-й-х*, якое значыць заадно і *быць*, і *ставацца*, і *жыць*, і *радзіцца-паўставаць*. Што супольнага мае ў сабе слова «быць» са словам «жыць»? У старагабрэйскай мове гэтыя два канцэпты маюць літаральна *ўсё супольнае*: яны нароўні з ад таго ж самага этымалягічнага кораня *х-й-х*, які – адна з назваў – прысутнічае і ў Імені Бога-Стваральніка: «Яхвэ», і імёнамі ўсіх людзей: «Эва» (габр. *Хава = Жыцьцё*).

[1] Гэта ж самая назва габрэйскіх кнігаў тут і *сьвятой кнігі*, дзе давайцы ўжо ўпершыню

Вось першы прыклад неперакладальнасьці біблійных словаў.

1.1.2. ЦІ МОЖНА ЎБАЧЫЦЬ ХАОС?

Ужо па першых радках можна заўважыць спэцыфіку абодвух –

Станкевічавага і Сёмухавага – перакладаў. Ад самага пачатку (і да канца) бачны пэўны «маньерызм» Станкевіча: «*зямля… бяз хормы а пустая*», «*станься сьвятліня*», «*і ўчыніў Бог сьветлы вялікія*», «*і ўхармаваў СПАДАР Бог чалавека…*». Гэта, праўда, яшчэ нішто ў параўнаньні зь іншымі, часьцяком камічнымі варыянтамі, напр.: «*Цешча, цешча народ мой, кажа Бог*» (пачатак кнігі «Другога Ісаі» – Ісая 40:1). Хтосьці, ня ведаючы ўсяго кантэксту выказваньня, мог бы зрабіць крайне пэсымістычную выснову, што адносіны між Богам і Яго народам сталі аж такія благія, што Бог вырашыў народ свой назваць *цешчай*. А ў гэтым выпадку якраз наадварот: Бог заклікае *суцешыць* Ягоны народ (*цешча = суцяшайце*), бо вось надышоў канец бабілёнскай няволі! Станкевіч – гэта майстар у прадукаваньні розных амаформаў.

Сёмухава мова ў сваю чаргу ўражвае сваёй стылістычнай вытанчанасьцю і памяркоўным эстэтызмам. Можна пагадзіцца зь Леанідам Галубовічам, што Сёмухава Біблія чытаецца «без прыгнечанасьці» і «натуральна». Тым ня менш, нярэдка[1] можна сустрэць розныя *сэмантычныя* хібы. Ужо другі[2] верш Кнігі Быцьця выклікае падазрэньне: «*А зямля была пустая*», лацінскі[3] нябачная». У Станкевіча: «*бяз хормы а пустая*», лацінск. «*vacua*» (пустая і парожняя), польск. «*bezładem i pustkowiem*», габр. «*тоху ва-боху*» (бязладзьдзе і пустэча). Чаму «нябачная»? Сёмуха адлюстраваў – ці непасрэдна, ці праз пасярэдніцтва іншых перакладаў – менавіта пераклад Сэптуагінты: «*aoratos kai akataskeuastos*», дзе першае слова сапраўды літаральна значыць «нябачная». Гэта даволі цікавая інтэрпрэтацыя, і можна здагадацца, адкуль яна бярэцца: зь неадрозьніваньня таго, што суб'ектыўнае, ад таго, што аб'ектыўнае. Хаос, бязладзьдзе, аморфія – гэта неідэнтыфікавальныя станы, станы, у якіх нельга нічога толкам *убачыць*. Таму грэкі (дакл. гэленізаваныя габрэі) і вырашылі надаць гэтаму стану суб'ектыўную характарыстыку: *нябачная*, г. зн. аморфная, неакрэсьленая. Пэўна, прыгадвалі пры гэтым Анаксымандраў *апэйрон*. Яшчэ больш цікавую інтэрпрэтацыю прапануе грэцкі пераклад з II ст. пасьля Хрыста, званы перакладам Авілы: «*kenōta kai ouden*» (парожняя і нішто). Як бы там ні было, наўрад ці Сёмухаў пераклад пасуе ў кантэксьце беларускага сьветаразуменьня; беларусы ўсё ж больш яскрава адчуваць розьніцу паміж *нябачным* і *аморфным*. Лепей было б не дубляваць тут

[1] *Вэрсам* [2] *Вэрсэ* [3] *Вэрсіі*

сэптуагінтаўскі пераклад.

1.1.3. АДАМ І АДАМА

Прыгледзьмася цяпер да некаторых іншых перакладніцкіх асаблівасьцяў Сёмухі і Станкевіча ў Кнізе Быцьця:

	Сёмуха	**Станкевіч**
1:3	Хай будзе сьвятло.	Станься сьвятліня.
1:6	Хай будзе цьвердзь.	Станься прасьцяг сярод водаў.
1:26	Створым чалавека паводле вобразу Нашага, паводле падабенства Нашага.	Учыніма чалавека на абраз наш, подле падобнасьці нашай.

Несумнеўна, у кожным з гэтым выпадкаў выйграе пераклад Сёмухі як у стылістычным, гэтак і ў сэмантычным пляне, дарма, што ён перакладаў не з «арыгінальных», а Станкевіч з «арыгінальных» моваў. «Сьвятло», «цьвердзь», «вобраз і падабенства» намнога больш натуральна ўспрымаюцца, чымся «сьвятліня», «прасьцяг», «абраз і падобнасьць», а адначасна цалкам задавальняюча адлюстроўваюць сэнсы габрэйскіх адпаведнікаў.

Трэці прыведзены тут фрагмэнт (1:26) тоіць у сабе немалаважную асаблівасьць, якую немагчыма адлюстраваць ні ў якім перакладзе: «*створым чалавека…*», там, дзе бачым слова «чалавек», у габрэйскім тэксьце стаіць: *АДАМ*. *Адам* – гэта ня столькі імя першага мужчыны, кажучы брыдка, першага чалавечага самца, а відавы панятак, які абымае мужчыну і жанчыну. Пры гэтым абазначае мужчыну і жанчыну не як адасобленыя істоты, а як *адно цэлае*. Мужчына + жанчына = *АДАМ*; адно без другога застаецца *палавіністым* адамам, паўчалавекам. Тое, што назва *адам* была прыватызавана мужчынскай паловай чалавецтва, паказвае, наколькі маскулінізавана культура ў глябальным маштабе. «*Але на пачатку было ня так*» – хочацца паўтарыць словы Хрыста. На пачатку была андрагінная цэльнасьць, якую пасьля разьбіў грэх першародны.

Абмяркоўваныя намі вэрсы 1:26 належаць да гэтак званай *сьвятарскай традыцыі*, традыцыі, якая сфармавалася падчас і непасрэдна пасьля падзеньня Юдэйскага царства ў пач. VI ст. да н. э. Калі хтось чытаў Кнігу Быцьця, то заўважыў, што наяўныя там два апісаньні стварэньня чалавека. Другое апісаньне распачынае другая частка чацьвёртага вэрсу 2-га разьдзелу і паходзіць зь іншага гістарычна-культурнага кантэксту, а менавіта зь *яхвісцкай традыцыі*, якая сфармавалася ўжо ў часы Давыда і Салямона ў X ст. да н. э. Гляньма, як выглядае яхвісцкая вэрсія стварэньня чалавека ў беларускіх перакладах:

	Сёмуха	**Станкевіч**
2:7	І стварыў Гасподзь Бог чалавека з пылу зямнога і ўдыхнуў у твар ягоны дыханьне жыцьця, і зрабіўся чалавек душою жывою.	І ўхармаваў СПАДАР Бог чалавека з пылу зямлі, і ўдыхнуў у ноздры ягоныя дых жыцьця і стаў чалавек душою жывою.

Што тычыцца слова «стварыў/ухармаваў», то тут, бадай, трэба прызнаць слушнасьць Станкевіча: габрэйскае *й-ц-р* значыць «фармаваць», «ляпіць». «Стварыць» мае ў біблійным багаслоўі адмысловую сэмантыку: *запачаткаваць нешта ex nihilo*, што ў габр. зазвычай аддаецца словам *б-р-'*, «стварыць» у наймацнейшым сэнсе гэтага слова. Тое, што чалавек быў створаны ня *ex nihilo*, а з матэрыі *ўжо існай*, мае немалаважныя багаслоўскія імплікацыі, дазваляе, напр. паяднаць Кнігу Быцьця з тэорыяй эвалюцыі.

Але найбольшую цікавасьць у цытаваным вэрсе выклікае наступнае: *што гэта за матэрыя*, зь якой Бог «зьляпіў» чалавека? І Станкевіч, і Сёмуха тут згодныя: «*з пылу зямлі*». Тое ж самае знаходзім у польск.: «*z prochu ziemi*», у Сэптуагінце папросту «*зь зямлі*» («*apo tēs gēs*»), а ў Вульгаце: «*зь вільготнай зямлі*» («*de limo terrae*»). Габрэйскі тэкст ізноў падкідвае нам неспадзеўку: *Бог зьляпіў чалавека з… АДАМЫ*! Увесь зварот гучыць гэтак:

ВАЙЙІЦЭР ЙХВХ ЭЛЁГІМ ЭТ ХА-АДАМ *АПАР МІН* ХА-АДАМА

Хоць звароты «з пылу зямлі» або «зь зямной вільгаці» цалкам прымальныя эквіваленты габрэйскага «*мін ха-адама*», то ўсё ж няма шанцаў перадаць істотную тут гульню словаў: назоўнік мужчынскага роду *ха-адам* (чалавек) перагукваецца з аднакарэнным назоўнікам жаночага роду *ха-адама* (глеба, вільготная зямля).

Варта дадаць, што і само слова *ха-адама* неадназначна ўспрымалася многімі інтэрпрэтатарамі. Напрыклад, сьв. Ілярыён з Пуат'е з III ст. перакладае яго зусім нечакана: gē pyrra – вогненная зямля. Як бы там ні было, габрэйскі тэкст указвае на нейкі жаночы першапачатак. Выходзіць загадкавая ўзаемасувязь: Яна – Ён – Яна: Адама – Адам – Эва. Эва створана «з рабра» Адама, а Адам у сваю чаргу створаны з Адамы, бліжэй не акрэсьленага жаночага элемэнту.

І, нарэшце, чарговы нечаканы момант у рытуале стварэньня:

	Сёмуха	**Станкевіч**
2:23	І сказаў чалавек: вось, гэта костка ад касьцей маіх і плоць ад плоці маёй, яна будзе называцца жонкаю, бо ўзятая ад мужа *свайго*.	І сказаў чалавек: «Во, гэтым разам косьць із косьцяў маіх і цела зь цела майго. Затым будзе яна звацца жонкаю, бо з мужа ўзята гэту».

Пэдантызм Станкевіча («*з мужа ўзята гэту*» – літаральны пераклад «*мэ-іш люкха-зот*») ані не спрычыняецца да выдзяленьня якогась важнага тут сэмантычна слова, ані тым больш не спрыяе лепшаму разуменьню тэксту. Тое, што тут важна, гэта чарговая гульня аднакарэннымі словамі: *іш* (муж) – *ішша* (жанчына, жонка). Значнасьць сваяцтва гэтых словаў настолькі вялікая, што некаторыя перакладчыкі спрабавалі перакласьці яго шляхам увядзеньня штучных наватвораў: сьв.

Геранім: *vir – virago*, Якуб Вуек (XVI ст.): *mąż – mężyna*, але наўрад ці гэта памысныя вынаходкі. Адзінай, бадай, індаэўрапейскай мовай, якая мае шанцы перадаць гэту гульню словаў *натуральным чынам*, ёсьць літоўская: *žmogus* (чалавек, мужчына) і *žmona* (жонка) маюць той сам корань. Аднолькавы корань наяўны і ў ангельскіх *man – wo-man*, але ён недастаткова кідкі.

Чарговая немалаважная гульня словаў, неперадавальная ў перакладах, гэта пара: *арум* (разумны, спрытны, мудры) і *аром* (голы). Калі запісаць іх без дыякрытычных знакаў (а да VIII ст. менавіта ў такой вэрсіі існаваў габрэйскі тэкст СЗ), то гэтыя два словы будуць выглядаць цалкам ідэнтычна:

ערום = *мудры* ערום = *голы*

Пад словам «найхітрэйшы» ў сказах: «*Зьмей быў найхітрэйшы…*» (Сёмуха), «*Гад быў найхітрэйшы…*» (Станкевіч) – хаваецца менавіта гэты тэтраграм: *’-р-в-м*. Той самы тэтраграм зьявіцца яшчэ раз, калі будзем чытаць, што Адам і Эва *пазналі, што яны – «голыя»* (зноў жа: *’-р-в-м*). Нельга не заўважыць тут горкай іроніі: Адам і Эва, паслухаўшы зьмея (сатану), хацелі стацца *арум* (мудрымі), а насамрэч сталіся *аром* (голымі). Выйшла дакладна, як у літоўскай прыказцы: *Aukštai skrido – žemai tupo* – высока ўзьняўся – нізка ўпаў.

Як бачым, нават павярхоўны агляд першых трох разьдзелаў Кнігі Быцьця дазваляе зразумець, што «сфэра *х*» даволі шырокая. А прыкмецьма, што пакуль што маем дачыненьне ўсяго толькі з прозай. А што казаць пра паэтычныя тэксты, што ўтвараюць павучальны і праройцкі корпусы Старога запавету, дзе гульня словаў і розныя рытарычныя фігуры іграюць яшчэ большую ролю ў сэнсаўтварэньні.

1.1.4. БОГ І БАГІ, СПАДАР, ГОСПАД І ПАН

Прыгледзьмася цяпер некаторым тэрміналягічным прапановам Сёмухі і Станкевіча:

Сёмуха	**Станкевіч**
Бог	Бог
Гасподзь	СПАДАР
неба	нябёсы
душа жывая	дыхаючая іста
запавет	змова
дабраславеньне	дабраславенства

Бог.
Здавалася б, якія тут могуць быць праблемы з «Богам»? Аказваецца, найбольш фундамэнтальны для біблійнага багаслоўя тэрмін – найбольш праблематычны! Калі заглянем у габрэйскі тэкст, то чытаем не: «*На пачатку БОГ стварыў…*», а: «*На пачатку БАГІ стварыў…*» Слова *ЭЛЁХІМ*, якое заўсёды перакладаецца як «Бог», у габрэйскім тэксьце зьяўляецца назоўнікам мужчынскага роду множнага ліку! Інтрыгуе, аднак, тое, што залежны ад яго дзеяслоў (*бара* – стварыў) стаіць ужо ў адзіночным ліку. І так заўсёды: колькі разоў стракаем у СЗ слова «Бог», яно ў габрэйскім тэксьце явіцца ў множным ліку.

Шмат было спробаў растлумачыць гэту загадку. Некаторыя казалі, што множны лік – гэта намёк на Сьвятую Тройцу, якая напоўніцу будзе аб'яўлена толькі ў Новым запавеце. Іншыя – што гэта рытарычная фігура *pluralis maiestatis* (так лічыць, між іншым, Галіна Сініла) або *pluralis compositionis*, множны лік, пакліканы падкрэсьліць наяўнасьць усіх магчымых дасканаласьцяў Бога.

На маю думку, тут мы маем дачыненьне не з намёкам і не з плюралісам, а з *эліптычным выразам*. *Элёхім* зьяўляецца скарочанай вэрсіяй звароту *Эль-элёхім*, г. зн. «Бог багоў», «Бог над багамі». Калі так, то гэта мае важныя біблійна-багаслоўскія наступствы: *багі*, над якімі ўзносіцца і якімі кіруе Бог, могуць быць або сынонімам нябесных стварэньняў (анёлаў), або нас, людзей (параўн. «*Кажу вам: багамі зьяўляецеся…*» – Ян 10:34–35). Такім чынам, габрэйскае *Элёхім* ніяк не ізамарфічнае са славянскім «Бог», гэтае першае слова больш «інфармацыйнае». Немалаважна і тое, што «Бог» і «Элёхім» маюць розную

этымалёгію: *богъ* мае інда-іранскае паходжаньне і, паводле некаторых навукоўцаў, значыць «доля», «дзяльба», «частка», «надзел», у той час як сэміцкая лексэма *эль* абазначае «сілу, моц».

Важным інтэрпрэтантам слова *Элёхім* зьяўляецца тэтраграм *й-х-в-х*, які зьяўляецца скарочанай вэрсіяй звароту *эх'е-ашэр-эх'е* («Я ёсьць, каторы ёсьць»). Гэтае слова дазваляе да канца зразумець сэнс слова *Элёхім*: «Бог багоў» – гэта той Бог, *які па-сапраўднаму існуе*. Анёлы, людзі – гэта таксама багі, але ў тым толькі сэнсе, што ўтвараюць *вобраз* і *падабенства* Бога, але толькі да слова *Элёхім* можна прыставіць тэтраграм *Й-Х-В-Х* і пазначыць тым самым, што Ён і толькі Ён ёсьць Богам у найпаўнейшым сэнсе гэтага слова.

СПАДАР.

Але бяда ў тым, што слова *й-х-в-х* таксама неперакладальнае. У Сёмухавай Бібліі стракаем тут слова «Гасподзь», а ў Станкевічавай – «СПАДАР», пісанае паўсюль маюскулай.

Станкевічава прапанова была адкінута, бадай, усімі беларускімі Цэрквамі, і слушна. Некаторыя пасьлядоўныя абаронцы гэтае вэрсіі выходзяць з наіўнаю тэзай, што, маўляў, зварот да Бога павінен быць тоесны ветліваму звароту да іншага чалавека. А да іншага чалавека мы па-беларуску зьвяртаемся «спадар». Яны прыкмячаюць, што такую ж тоеснасьць назіраем як у многіх сучасных мовах – польскае «pan», нямецкае «Herr» ці італьянскае «signore» стасуем і да людзей, і да Бога – так і ў старажытных: грэцкае «kyrios» ці лацінскае «dominus» (звароты, стасаваныя і да Бога, і да чалавека).

Гэта праўда, што ў многіх мовах гэтыя звароты тоесныя, але праўда і тое, што ў многіх (напр. расейскай, украінскай, літоўскай) нятоесныя. Па-другое, «спадар» у беларускай мове мае іншую гісторыю і функцыянуе інакш, чым *pan, Herr, signore, kyrios, dominus* у адпаведных мовах. Гэтыя апошнія словы зьяўляюцца ў нейкім сэнсе *гістарызмамі*, іхная «тоеснасьць» сфармавалася ў зусім іншыя эпохі (рабаўладальніцкай,

фэадальнай). Гэта – рэлятывы, іх можна зразумець толькі цераз суаднясеньне з адпаведнымі карэлятамі: *pan – chłop, kyrios – doulos, dominus – servus* і. г. д. «Калі б не існаваў *doulos*, не было б і *kyrios*'а», – піша Арыстотэль у сваёй «Палітыцы». «Спадар» у беларускай мове ня мае такой гісторыі і, такім чынам, пазбаўлены важнага тут *рэляцыйнага характару*. У лягічна-катэгарыяльным пляне *«спадар» – гэта субстантывізаваны выклічнік*, слова, пазбаўленае самастойнага значэньня.

А «Яхвэ» *павінен* мець самастойнае значэньне!

У рымска-каталіцкай літургічнай мове замацавалася слова «пан», і гэта ня менш няшчасная вэрсія, чым «спадар». Слова «пан» няблага функцыянуе ў польскім моўна-культурным кантэксьце. Але ў беларускім моўна-культурным кантэксьце «пан» мае калі і ня цалкам адмоўную, то прынамсі вельмі амбівалентную сэмантыку. «Пан» – гэта ня толькі сымбаль фэадальнай эпохі, але таксама «прыгнятальнік-чужынец», які ніколі так і ня стаў сябрам ці паплечнікам беларуса. Вымаўляючы словазлучэньне «Пан Бог» альбо «Панская Вячэра» (сынонім сьвятой імшы), беларус мусіць прыкласьці вялікае намаганьне, каб абстрагаваць пры гэтым ад немалой адмоўнай нагрузкі гэтых выразаў. І навошта каталіцкая літургічная камісія згатавала беларускім каталікам непатрэбныя псыхічныя выпрабаваньні? «Цяпер паўсюль паны, – жартоўна кажа адзін мой знаёмы. – Палякі называюць сябе панамі, літоўцы – панамі, украінцы – панамі, а мала было таго, дык яшчэ і там. – паказваючы пальцам угору, – паны».

Аптымальным адпаведнікам (лепш: замяняльнікам) слова *й-х-в-х* зьяўляецца, бяспрэчна, слова «Госпад/Гасподзь». Думаю, гэтае слова можа беспраблемна існаваць у двух раўнаважных сэмантычна варыянтах (Госпад – Гасподзь). Па-першае, гэты тэрмін не нясе ніякай устойлівай адмоўнай нагрузкі, па-другое, падкрэсьлівае адначасова і вялікасьць, і блізкасьць Бога. «Госпад/Гасподзь» – гэта Стваральнік і Валадар. Адначасна ж этымалягічная повязь (дарэчы, лёгка адчувальная) са словам «га » указвае на тое, што Бог – гэта Гаспадар нашага дому, нехта свой, блізкі, *тутэйшы*. Госпад-Га у Асобе Ісуса Хрыста стаўся слугой і жыве *разам* з намі, *так як мы* (параўн. Ян 1:14).

Неба і нябёсы.

Старажытныя мовы аддавалі перавагу множнаму ліку: грэцк. *hoi ouranoi*, лац. *coeli*, а ў габрэйскай мове «неба» выступае заўсёды ў форме *dualis* (г. зн. наагул ня мае адзіночнага ліку): *ха-шамайім*. Справа ў тым, што «верхні сьвет» – «месцазнаходжаньне» Бога і анёлаў – быў разнастайнай і герархічнай рэчаіснасьцю. Не было «неба», а былі «нябёсы» – *шэраг* нябесных сфэраў і прасторaў, як, дарэчы, і ў этнічнай беларускай касмалёгіі. Нягледзячы на тое, што сёньня маем іншы сьветавобраз, множны лік «нябёсы» мае надалей сваё значэньне: намякае на паліфанію, якой характарызуецца «той сьвет». Таму Станкевічу пераклад «нябёсы» тут больш апраўданы.

Душа жывая і дыхаючая іста.

Ізноў добра відаць залежнасьць Сёмухі ад Сэптуагінты (*psychē dzōsa*) і роспачнае імкненьне Станкевіча быць як мага больш блізкім да «арыгіналу». «Роспачнае», бо чарговы раз ён імкнецца перакладаць тое, што немагчыма перакласьці. *Нэфэш* – гэта сапраўды нешта, зьвязанае з дыханьнем і паветрам. *Нэфэш* – гэта таямнічы подых, наяўны ў *кожным* стварэньні, тое, за кошт чаго істота (Станкевічава «іста») *жыве*. Замест «дыхаючая іста» лепш, пэўна, ужыць слова «душа», хоць і прыходзіцца за гэта плаціць пэўную цану: «душа» ў навачаснай, посткартэзіянскай эпосе мае іншую канатацыю, чымся *нэфэш* у старажытных габрэяў ці *psychē* ў грэкаў або *anima* ў рымлянаў. «Душа» ў старажытнасьці была вольная ад дуалістычнай антрапалёгіі (супрацьпастаўленьня душы і цела) і абазначала папросту істоту, здольную жыць (дыхаць).

Ужыўшы аналітычны зварот «дыхаючая іста», Станкевіч ужо не захацеў прыстаўляць прыметнік «жывая», хоць ён і наяўны ў «арыгінале», бо канструкцыя «дыхаючая іста жывая» была б ужо задзіўная. Тут можна паставіць пытаньне: а навошта ў самім габрэйскім тэксьце стаіць гэты прыметнік, няўжо *нэфэш* («душа») можа быць «нежывая»? *Нэфэш хаййа* – гэта плеаназм, але ён, відавочна, выконвае тут сваю функцыю. Калі прачытаем усю фразу па-габрэйску:

ВА-ЙЕХІ ХА-АДАМ ЛЕ-НЭФЭШ ХАЙЙА

– то зноў напаткаем знаёмае слова *х-й-х*, толькі цяпер у дзеепрыметнікавай форме (*хаййа* – якая жыве, жывучая), якое перагукваецца зь першым Богавым словам (*йехі*), Ягоным таямнічым Імем (*Й-Х-В-Х*) і імем Вялікай Маткі, Эвы (*Хавва*). Плеаназм тут цалкам апраўданы. Кніга Быцьця мэтадычна і пасьлядоўна вучыць нас, філёзафаў і нефілёзафаў, вымаўляць слова «быцьцё». Яна вучыць вымаўляць яго так старанна і ўважліва, так далікатна і чула, каб яно магло абазначаць *сьвятло* і *жыцьцё*, *паўставаньне* і *раджэньне* (фюзіс), *душу* і *дыханьне*, *архетып Бога-Айца* і *Эвы-Маткі*. Цікава, як выглядала б анталёгія Гайдэгера, калі б ідэю «прыгадваньня старажытнагрэцкага «быцьця» ён дапоўніў ідэяй «прыгадваньня старажытнагабрэйскага «быцьця»...

Запавет і... змова.

Гэта чарговы панятак, вельмі важны для біблістыкі і багаслоўя. Ідэя «пагадненьня», якогась «паразуменьня» між Богам і чалавекам мае фундамэнтальнае значэньне як для юдаізму, так і для хрысьціянства. Гэтае пагадненьне-пайднаньне ўтварае процівагу для трагічнага разрыву, які адбыўся пасьля таго, як чалавек заключыў пакт з сатаной і збунтаваўся супраць Бога. Таму нічога дзіўнага, што ідэя аднаўленьня першапачатковай еднасьці між чалавекам і ягоным Стваральнікам зьяўляецца цэнтральнай арганізоўнай ідэяй як Старога, так і Новага запавету.

Усё гэта значыць, што выбар адпаведнага тэрміну, які б аптымальна адлюстроўваў тэалягему божа-чалавечага паяднаньня, ёсьць сур'ёзнаю справай. Сёмуха прапануе нам «запавет», Станкевіч «змову», а Галіна Сініла ўжывае спалучэньне «запавет-саюз».

Інтэнцыю Станкевіча зразумець няцяжка: ён хоча адлюстраваць першапачатковы сэнс габрэйскага *бэріт*, якое Вульгата перакладае або як *foedus* – «хаўрус» (ад якога пайшло вядомае

нам «фэдэрацыя»), або як *pactum* – «мірная дамова». У іншых мовах *бэрiт* перакладаецца як: іт. *patto*, рас. *союз*, польск. *przymierze*, анг. *covenant*, ням. *Bund*, літ. *sandora*. *Бэрiт* абазначае: пагадненьне, паразуменьне, пакт, дамова, і таму Станкевіч прымае рашэньне ўжыць слова «змова», відавочна, каб перадаць аспэкт партнэрскасьці. Але гэтае слова выклікае эфэкт, аналягічны да «цешчы»: адразу ж уяўляецца «змова» як нейкі кансьпірацыйны плян хаўрусьнікаў.

Што тычыцца Сёмухавага слова (*запавет*), дык яно зноў сьведчыць аб залежнасьці ад Сэптуагінты. Грэцкія перакладчыкі пераклалі *бэрiт* як *diathēkē*, і, здаецца, не зусім памысна. Гэтае слова губляе аспэкт «гарызантальнай», партнэрскай рэляцыі, наяўны ў габрэйскім слове, а набывае значэньне «вэртыкальнай» рэляцыі: Бог – заканадаўца, а чалавек – законавыканаўца; Бог – актыўны бок у стварэньні «дамовы», а чалавек – пасіўны. Больш-менш такую ж сэмантыку пераймае і беларускае слова «запавет».

Патрэбен нейкі трэці тэрмін. Які? Трэба пашукаць.

Дабраславеньне і дабраславенства.

Так парадаксальна склалася, што «благаслаўленьне» сталася нейкім пракляцьцем для беларусаў. Можна стрэць добрых паўтузіна тэрмінаў на азначэньне таго ж самага канцэпту: у тэкстах БАПЦ часам зьяўляецца вэрсія «хвалаваньне», у Чарняўскага – «багаслаўленьне», Сёмухі – «дабраславеньне», Станкевіча – «дабраславенства», а яшчэ: «дабразычэньне», «дабрашчасьценьне» і «бла(га)слаўленьне».

Усе тэрміны, апрача апошняга, зьяўляюцца штучнымі наватворамі і, мабыць, не найлепшай якасьці. Наўрад ці беларусы здолеюць звыкнуцца зь якім-кольвек з гэтых тэрмінаў. А ў слове «бла(га)слаўленьне» многія выкрываюць, здавалася б, найгоршую «крамолу»: складовая частка гэтага слова «блага» мае ў сучаснай беларускай мове выразна нэгатыўнае значэньне: «дрэнна», «нядобра». Выходзіць, што «благаславіць» азначае «*дрэнна*славіць»!

А я буду бараніць «благаслаўленьне». Па-першае, «блага» – гэта амонім. Ён сапраўды ў большасьці выпадкаў мае значэньне «дрэнна», «кепска». Але існуюць у нашай мове формы, у якіх «схавана» слова «блага» з дадатным значэньнем, напр. у падпарадкавальным злучніку *балазе* («добра што») і словах *паблажлівасьць, паблажлівы* («па-благу»). Нікому, здаецца, не прыйшло ў галаву перайначваць згаданыя словы на *падобрлівасьць*, *падобрлівы*. «Благаслаўленьне» ёсьць тым словам, унутры якога «блага-» захавала сваё першапачатковае, станоўчае значэньне: «добра», «шчасна».

Канстатацыя аманімічнасьці гэтага слова, здавалася б, павінна быць аргумэнтам супраць уключэньня яго ў склад важнага тэалягічнага тэрміну. І тут трэба зрабіць невялічкую зацемку з абшару лінгвістычнай філязофіі. «Там, дзе рознасьць значэньняў, так бы мовіць, татальная, дык маем папросту справу з такой аманімічнасьцю, якая ў прынцыпе не стварае ніякіх сур'ёзных клопатаў, паколькі «на сэмантычным узроўні», у канкрэтным кантэксьце за кожным разам выразна відаць, у якім значэньні гэтае слова ўжыта», – піша праф. Ганна Разьнярова. Такім чынам, ня ўсякая полісэмія ёсьць шкоднай. Калі полісэмізм мае дзьве канатацыі *С-1* і *С-2*, рознасьць якіх *дастаткова вострая*, то такі полісэмізм «бяскрыўдны». У такіх выпадках кантэкст беспраблемна «адсейвае» непатрэбную канатацыю. Цяжка прыдумаць больш вострую канатацыйную рознасьць, чымся ў выпадку беларускага «блага». Ці яно значыць «кепска» (*С-1*), ці «добра, шчасна» (*С-2*) – на 100 % акрэсьлівае кантэкст. Так што праблема зь «неадпаведным разуменьнем» часткі «блага-» ў складзе «благаслаўлёны» створана штучна. Насамрэч мы *добра разумеем* гэтае слова.

Па-другое, «блага» значыць нешта больш, чым «добра». Гэтае першае слова этымалягічна павязана з польскім «błogi», «błogość»і расейскім «блаженный», «блаженство»; да таго ж у расейскай мове яно ўваходзіць у склад іншага важнага багаслоўскага тэрміну: «благодать» (бел. ласка, мілата). Гэтая лексэма тоіць у сабе шэраг важных сэмантычных адценьняў, як: «шчасьце, задавальненьне, патоля, супакаеньне». Нічога дзіўнага, што літоўцы на азначэньне «благаславіць» вынайшлі слова «laiminti», якое ўтворана ад «laim?» – шчасьце. Нямецкі

філёзаф Ёзэф Піпэр у трактаце «Любоў» згадвае пра адно сваё фэнамэнальнае адкрыццё: «Я даведаўся, – піша, – што ў расейскай мове існуе слова *благость* са значэньнем «любоў Бога да чалавека».

Ну, і *the last but not the least*, «блага» мае старажытнае, праіндаэўрапейскае паходжаньне. Яно выступае, напрыклад, у назьве старой пачцівай кнігі «*Бхага*ват гіта» («Благаслаўлёная песьня»). Дык няхай нашае слова «благаслаўленьне» нясе ў сабе добрую памяць пра гэтае добрае слова.

1.1.5. БОГААБ'ЯЎЛЕНЬНЕ І ДЗЕСЯЦІСЛОЎЕ

Богааб'яўленьне і Дзесяціслоўе – гэта два «макраканцэпты», паняткі, якія аб'ядноўваюць іншыя паняткі і ўтвараюць арганізоўную ідэю, галоўны матыў у дыскурсе Старога і Новага запаветаў.

Калі б мы хацелі пачаць расказваць гісторыю Ізраілю, то маглі зрабіць гэта так: *На пачатку быў Агонь*. Майсей, дысыдэнт-выгнаньнік, непадалёку ад Мадыямскай зямлі, на гары Харыва, меў нетыповы відзеж: палаў куст, не згараючы. Агонь, як вядома, –сымбаль *тэафаніі*. Прыгледзьмася векапомным Богавым словам, сказаным тады Майсею, у беларускім перакладзе (Кніга Выхаду):

	Сёмуха	**Станкевіч**
3:14	Я – Сутны. І сказаў: так скажы сынам Ізраілевым: Сутны паслаў мяне да вас.	Я Ё, Каторы Ё. І сказаў: Гэтак скажы сынам Ізраелявым: «Я Ё паслаў мяне да вас».

Сёмуха, перакладаючы *Я – Сутны*, найвідавочней, залежны ад праваслаўнага сынадальнага перакладу, дзе фігуруе: *Я есмь Сущий*. Габрэйскае словазлучэньне *эх'е ашэр эх'е* больш літаральна перакладае Сэптуагінта: *egō eimi hos eimi*, Вульгата: *ego sum qui sum*, польск. *Jestem, który Jestem*, а таксама Станкевіч:

Я Ё, Каторы Ё. «Сутны» – гэта цікавая вынаходка, вартая ўвагі, хоць Галіна Сініла аддала б тут перавагу слову *Існы*.

Але ані «Сутны», ані «Існы» ня здольныя перадаць аспэкт *жыцьця-паўставаньня-раджэньня*, наяўны ў габрэйскіх вытворных ад слова *х-й-х*. Калі Ян Багаслоў у апошняй кнізе Бібліі (Апакаліпсіс) будзе раз-пораз стасаваць да Хрыста грэцкі дзеепрыметнік *Dzōn* «Які Жыве» (у Чарняўскага – «Жывучы»), дык будзе тым самым сыгналізаваць, што гэта *тое сама*, што і габрэйскае *Яхвэ* (скарот ад *эх'е ашэр эх'е*). Грэцкае *Dzōn* перагукваецца са словам *Dzōē* (а гэта сэптуагінтаўскі пераклад імя «Эва»), гэтаксама, як і габрэйскае *Яхвэ* са словам *Хавва*, аб чым была ўжо гаворка. Было б добра Сёмухава «Сутны» дапоўніць фармантамі «Жытны» і «Родны», калі б яны ня несьлі ў сабе непатрэбнай дадатковай сэмантычнай нагрузкі.

Пяройдзем жа цяпер да дваццатага радзьдзелу Кнігі Выхаду (4–17):

	Сёмуха	**Станкевіч**
20:4—6	Не рабі сабе *куміра* і ніякай выявы таго, што на небе ўгары, і што на зямлі ўнізе, і што ў вадзе ніжэй зямлі; не пакланяйся ім і не служы ім, бо Я Гасподзь, Бог твой, Бог руплівец, Які карае дзяцей за віну бацькоў да трэцяга і чацьвёртага роду, што ненавідзяць Мяне, і, Які чыніць мілату тысячам родаў, што любяць Мяне і шануюць запаведзі Мае.	Не рабі сабе *выразанага балвана* і ніякага абраза таго, што на нябёсах угары, і што на зямлі далавах, і што ў вадзе ніжэй зямлі. Ня кланяйся ім і ня служы ім, бо Я СПАДАР, Бог твой, Бог *завіднік*, што давядаецца зь бяспраўям бацькоў да дзяцей да трэйцяга і аж да чацьвертага пакаленьня тых, што ненавідзяць Мяне, і чынячы міласэрдзе тысячам любячым

		Мяне і дзяржачых расказаньні Мае.
20:7	Не вымаўляй імя Госпада, Бога твайго, марна, бо Гасподзь не пакіне без пакараньня таго, хто вымаўляе імя Яго марна.	Не мяняй імені СПАДАРА, Бога Свайго, здарма; бо СПАДАР ня будзе мець за нявіннага таго, хто мяняе імя яго здарма.
20:8	Але памятай пра дзень суботні, каб сьвяціць Яго (...).	Памятуй дзень сыботні, каб сьвяціць яго (...).
20:12	Шануй бацьку твайго і маці тваю, каб падоўжыліся дні твае на зямлі, якую Гасподзь, Бог твой, дае табе.	Сьці айца твайго а маці сваю, каб працягнуліся дні твае на зямлі, каторую СПАДАР, Бог Твой, даець табе.
20:13	Не забівай.	Не забівай!
20:14	Не чыні пералюбу.	Не чужалож!
20:15	Ня крадзь.	Не крадзі!
20:16	Не кажы ілжывага сьведчаньня на блізкага твайго.	Ня сьветч на бліжняга свайго сьветчаньням хвальшывым!
20:17	Ня прагні дому блізкага твайго; ня прагні жонкі блізкага твайго, ні раба ягонага, ні рабыні ягонай, ні вала ягонага, ні асла ягонага, нічога, што ў блізкага твайго.	Не жадай дому бліжняга свайго; не жадай жонкі бліжняга свайго, ані слугі ягонага, ані служэбкі ягонае, ані вала ягонага, ані асла ягонага, ані нічога, што ў бліжняга твайго!

Што тычыцца слоўных асаблівасьцяў, дык я выдзеліў (*курсівам*) пару «кумір» – «выразаны балван», і «Бог рупліўца» – «Бог завіднік». Першая пара цікавая стылістычнай афарбоўкай: Сёмуха ўжывае тут пачцівае, ледзь ня кніжнае слова «кумір», а

Станкевіч – узятае з прастамоўя «балван», без патрэбы дадаўшы прыметнік «выразаны». Большую ўвагу варта зьвярнуць на чарговы тэалягічны канцэпт, выражаны Сёмухам пры дапамозе словазлучэньня «Бог рупліўца», а Станкевічам – «Бог завіднік». Станкевіч, як заўжды, бліжэйшы да «арыгіналу», бо *эль-канна* сапраўды значыць «Бог-зайздросны», таму ў польскай Бібліі чытаем «Bóg Zazdrosny», а ў расейскай «Бог ревнивый». Але Сэптуагінта перакладае: *theos zēlotēs*, і гэтаксама, пры дапамозе грэцызму, Вульгата: *Deus zelotes*, дзе размываецца крыху першапачатковае значэньне *эль-канна*, бо *zēlotēs* можа значыць ня толькі «зайздросьнік», але таксама «руплівец, заўзяты».

Катэгорыя «зайздрасьці», што праўда, амбівалентная, але таксама і вобраз Бога ў СЗ быў амбівалентны. Калі ж глянем на канцэпт «Бог-зайздросны» цераз прызму новазапаветнага Дабравесьця: *Бог ёсьць любоў, Бог збаўляе* (значэньне слова «Ісус»), дык зразумеем, у чым палягае Божая зайздрасьць: нязгода на сьмерць чалавека. Бог ніколі не пагодзіцца з тым, каб чалавек апынуўся ў валадарстве сатаны, таму што Ён, Бог, ёсьць *Богам зайздросным. Эль-канна*, Бог-Зайздросны – гэта вельмі важны тэонім, і ня варта яго выпраўляць на «рупліўца».

Цяпер пяройдзем да «граматычнай» праблемы. Яна датычыць спосабу перакладаньня дзесяці словаў (дзеясловаў), зь якіх пачынаецца кожная з запаведзяў. Як бачым, і Станкевіч, і Сёмуха пасьлядоўна стасуюць тут *загадны лад* («не рабі...», «не вымаўляй...» і. г. д.). У габрэйскім тэксьце не зусім так. Толькі два дзеясловы – *закар* (памятай) і *каббэд* (шануй) – можна перакласьці пры дапамозе загаднага ладу. Астатнія восем дзеясловаў стаяць у *другой асобе мужчынскага роду адзіночнага ліку* і належаць да так званай формы *qal imperfect*, а дзеясловы з такой формай маюць значэньне ня толькі загаднага ладу, але і *абвеснага ладу будучага часу*. Варта ўвагі, што Сэптуагінта і Вульгата, як і сучасныя ангельскі і французскі пераклады, скрупулёзна перадаюць гэтае сэмантычнае адценьне, таму дзесяць дзеясловаў выглядаюць наступным чынам:

Ня будзеш рабіць куміра...
Ня будзеш вымаўляць імя...
Памятай...

Шануй…
Ня будзеш забіваць.
Ня будзеш чыніць пералюбу.
Ня будзеш красьці.
Ня будзеш казаць ілжывага…
Ня будзеш прагнуць…

Адлюстраваньне гэтых нюансаў мае пэўныя інтэрпрэтацыйныя наступствы: тое, што мы называем «запаведзямі» або «загадамі», можна ўспрымаць як *абяцаньні*. Бог нібы бярэ на сябе абавязак ліквідаваць дэструкцыйныя наступствы першароднага грэху, прадугледжвае плян такога аздараўленьня чалавечай душы, у выніку якога чалавек ня будзе забіваць, красьці, сеяць нязгоду. Гэта якраз тое, на што паклаў асаблівы націск вялікі рэфарматар хрысьціянства, Марцін Лютэр: *чалавек будзе ўратаваны не на падставе ягоных учынкаў, а дзякуючы Божай Ласцы*. Ад чалавека патрабуецца адно толькі, каб адкрыўся на аздараўленчы ўплыў гэтай Ласкі.

1.2. ПЕСЬНЯ, РЫТМ І ТАНЕЦ

Кнігі Ёва, Псальмаў і Выслоўяў Салямона былі амаль цалкам напісаны ў вершаванай форме. Большасьць тэкстаў СЗ – як цьвердзяць дасьледнікі – маюць рэгулярныя прасадыйныя націскі. Гэта значыць, што ў Бібліі часьцей маем справу з паэзіяй, чымсьці са звычайнай нарацыяй.

Паэзія – гэта выклік. Для таго, каб уявіць, у чым заключаецца гэты выклік, зробім невялікае практыкаваньне. Гляньма на выслоўе з Кнігі Выслоўяў (15:32):

порэа’ мусар мо’эш напсо
вэшомэа’ токахат конэх лэб

– якое ў беларускіх перакладах так выглядае:

Сёмуха	**Станкевіч**

Хто не прымае настаўленьня, ня дбае пра душу сваю; А хто слухае засьцярогу, той набывае розум.

Хто адкідае навуку, грэбуе сваёю душою; Але хто слухае ўпікаў, дастаець розум.

Ужо сам факт, што Сёмуха мусіў ужыць удвая больш словаў (16), чым у габрэйскім тэксьце (8), паказвае, наколькі няпроста было перадаць гэтае двухрадкоўе.

З пункту гледжаньня сэмантыкі вялікіх праблемаў няма: галоўная думка выслоўя захавана, лёгка можам распазнаць рытарычную фігуру: *антытэтычны паралелізм* (утварэньне кантрасту паміж сэнсам першага і сэнсам другога радка). У гэтым пляне арыгінал і пераклад, можна сказаць, адносна ізамарфічныя. Але сэмантыка гэта яшчэ ня ўсё. Філёлягі ўказваюць на наяўнасьць у габрэйскай вэрсіі *мэтрычнага паралелізму*: двухрадкоўе ўтворана паводле прынцыпу 4 + 4, і ў першым, і другім радку па чатыры словы; наяўнасьць *сынтактычнага паралелізму*: кожны радок-сказ пабудаваны паводле прынцыпу: субстантывізаваны дзеепрыметнік + дапаўненьне + дзеепрыметнік у функцыі прэдыкату + дапаўненьне; наяўнасьць *марфалягічнага паралелізму*: субстантывізаваныя дзеепрыметнікі (*порэа'* і *вэшомэа'*) у абодвух выпадках пабудаваны гэтаксама; наяўнасьць *фанэтычнага паралелізму*, што выяўляецца ў рэгулярным паўтарэньні /o/: тры разы ў першым і тры ў другім радку.

Ці ўсе гэтыя «несэмантычныя» асаблівасьці істотныя для разуменьня тэксту? Можна паставіць тут іншае пытаньне: ці ёсьць розьніца паміж слуханьнем гімну «Магутны Божа» ў выкананьні беларускага музычнага хору і слуханьнем гэтага ж гімну ў форме рэчытатыву на ангельскай мове? Розьніца, мабыць, ёсьць. Гімн, паэзія, музыка – нешта большае, чым сэмантыка. Таму на пастаўленае вышэй пытаньне трэба адказаць хутчэй за ўсё станоўча: так, «несэмантычныя» асаблівасьці істотныя для разуменьня тэксту, але яны, на жаль, неперакладальныя.

Паэзія – гэта танец. Танец словаў і гукаў. Калі хтосьці прыбыў у чужую краіну і ня ўмее выканаць танец туземцаў, яму застаецца затанчыць па-свойму. Дакладна так прыходзіцца

паводзіць сябе і перакладчыку: ён *мусіць* стварыць уласны танец, які, хай сабе і непадобны да танцу абарыгенаў, паводле ўзроўню экспрэсіі, паводле аналёгіі рытму і гармоніі неяк перадасьць сэнс арыгінальнага танцу. Таму прыгледзьмася, як гэта рабілі Станкевіч і Сёмуха.

Найперш прапаную ўрывак з найстаражытнейшай у Бібліі песьні, называнай «Песьняй Дэворы і Варака», якая паўстала дзесьці пры канцы II тыс. да н. э.

	Сёмуха	**Станкевіч**
Судзьдзяў 5:3—8	Слухайце, цары, уважайце, вяльможы: я Госпаду сьпяваю, я граю Богу Ізраілеваму. (...)	Слухайце, каралёве, настаўце вуха, князі, я СПАДАРУ, я буду сьпяваць а выхваляць СПАДАРА, Бога Ізраелявага. (...)
	Выбралі новых багоў, таму і вайна каля брамы. Ці відны былі шчыт і дзіда ў сарака тысяч Ізраіля?	Абралі новыя багі, тады бывала вайна ў брамах. Ці відзён быў шчыт а дзіда ў сараку тысячаў Ізраеля?

Хоць немагчыма дашукацца ў абодвух выпадках рэгулярнага рытму, то ўсё ж Сёмухавы «Слухайце, цары, / уважайце, вяльможы», «Выбралі новых багоў, / таму і вайна каля брамы» характарызуюцца нейкай дынамікай. І Станкевіч, і Сёмуха паважаюць прынцып паралелізму: дзеяслову *слухайце* ў першым адпавядае *ўважайце/настаўце вуха* ў другім радку. Другая частка трэцяга вэрсу мае ў Сёмухі будову *хіязму: Госпаду сьпяваю – граю Богу*, у той час як Станкевіч пабудаваў гэту частку трохі нязграбна.

А вось урывак зь іншае прыгожае і старажытнае песьні, песьні, якую – паводле Кнігі Выхаду – засьпявалі ізраільцяне пасьля пераходу цераз Чырвонае мора.

	Сёмуха	**Станкевіч**
15:5–6	Багны пакрылі іх: яны пайшлі ў глыбіню як камень. Правіца Твая, Госпадзе, праславілася сілаю; правіца Твая, Госпадзе, пабіла ворага.	Глыбіні пакрылі іх; яны пайшлі ў глыбіні, як камень. Правіца Твая, СПАДАРУУ, уславілася сілаю; правіца Твая, СПАДАРУ, разьмяжджуліла непрыяцеля.

Першы вэрс Сёмуха будуе згодна з даволі тыповай для габрэйскай паэзіі канструкцыяй: *тэза – разьвіцьцё* (або *разьвязка*) *тэзы*. Дакладна такая ж канструкцыя прысутнічае і ў папярэдне цытаваным двухрадкоўі: «Выбралі новых багоў, (*тэза*) / таму і вайна каля брамы (*разьвязка тэзы*)». Але эстэтычны посьпех такой канструкцыі залежыць ня толькі ад супастаўленьня сказаў з адпаведным сэнсам, але таксама ад максымальнай кароткасьці. Сёмухавы вэрс у гэтым сэнсе досыць добра і цэльна сфармуляваны, але нават і тут можна падумаць над магчымым скарачэньнем, напр. *Багны пакрылі іх / і патанулі як камень*. Другі радок-сказ становіцца бяз шкоды для сэнсу *эліптычным*: прапушчаны дзейнік «яны», бо ён разумеецца на падставе сэнсу першага радка. Тымчасам «патанулі» раўнаважна з «пайшлі ў глыбіню». Канструкцыю надалей псуе какафанічнае «пакрылі іх» у першым радку, але з гэтым, бадай, нічога ня зробіш.

Ніяк нельга проста так абмінуць увагай Найвышэйшую песьню Салямонаву, эратычна-рамантычны твор, які стаўся ўлюбёнай кнігай для містыкаў і багасловаў, якія шукалі шляхоў, каб як найбольш адэкватна распавесьці пра любоў Бога да Царквы і душы чалавека. Старажытны хрысьціянскі пісьменьнік, Арыген, застаючыся пад відавочным уплывам Найвышэйшае песьні, адважваецца нават Хрыста назваць *erōs* у плятонаўскім сэнсе слова. Сьвяты Рыгор з Нысы, які залічваецца да Айцоў Царквы, сьцьвярджае, што эратычная жарсьць (*erōtikon pathos*) ёсьць найлепшым сымбалем Божай любові ў адносінах да нас. Сярэднявечная схалястыка навучыла нас успрымаць Бога як

Absolutus, асноўныя прыметы якога – *нерухомасьць* і *нязьменнасьць*, і Бог стаўся ў выніку далёкай і халоднай Абстракцыяй, зь якой немагчыма завязаць эмацыйныя стасункі. Містыкі наўпрост ці ўскосна пратэставалі супраць схалястычнага «багазнаўства»; пратэставала таксама Сьвятое пісаньне...

	Сёмуха	**Станкевіч**
1:2—4	Няхай вусны яго мяне пацалуюць! Бо лепшыя за віно твае ласкі. Ад водару мазяў тваіх імя тваё — як разьлітае міра; таму і дзяўчаты цябе кахаюць. Надзь мяне! Мы пабяжым за табою; — цар мяне ўвёў у харомы свае! Радавацца і весяліцца будзем з табою; — больш за віно будзем славіць пяшчоты; цябе годнасна любяць!	О, калі б ён цалаваў мяне цалаваньнем вуснаў сваіх! бо любосьць твая лепшая за віно; масьці твае прыемныя нюхаць, імя тваё — вылітая масьць. Цягні мяне за сабою, пабяжым; павёў мяне кароль да пакояў сваіх; мы радавацца а цешыцца зь цябе будзем; успамінаем любосьць тваю болей, як віно; пасьцівыя любяць цябе.

Сёмухаў пераклад гэтай кнігі зроблены сапраўды па-майстэрску, магчыма, тут, як нідзе, паэт адчуў, што можа быць напоўніцу самім сабой, што ня мусіць стрымліваць свой паэтычны імпэт, бо сама Кніга ня хоча ведаць ніякіх канонаў і абмежаваньняў. Бо яна ня проста песьня, а *шір-ха-шірім*, песьня песьняў, каралева гармоніі і сугучча. Гэтая кніга патрабуе ад перакладчыка, каб тварыў і сьпяваў, *каб вызваліў эротыку слова*. Сёмуха так і робіць. «Надзь мяне! Мы пабяжым за табою», – словы і гукі сапраўды падабраны, як кажуць, «з добрым слыхам». Адзіная хіба ў цытаваных вэрсах зроблена, здаецца, у наступным сказе: «Ад водару мазяў тваіх імя тваё...»

– дзе бракуе сэнсавай зьвязкі паміж часткай *ад водару мазяў тваіх* і *імя тваё*.

Ян Станкевіч таксама сьвядомы важнага выкліку і таксама імкнецца надаць паэтычную форму свайму перакладу Найвышэйшае песьні, аднак робіць гэта няўдала. Ненатуральна выглядае фігура «цалаваць цалаваньнем», хоць у лацінскай і грэцкай, дзеля іншай спэцыфікі гэтых моваў, такая ж фігура (*figura etimologica*), наадварот, дадае каларыту: *osculetur osculo* і *philēsatō philēmatōn*. Там, дзе ў Сёмухі знаходзім далікатнае «Надзь...», у Станкевіча брутальнае «Цягні...», але найбольшы крызіс Станкевічавай эстэтыкі выяўляецца ў наступных месцах: «О, ты пазорная, прыяцелька мая, о, ты пазорная!» (Сёмуха: «Якая прыгожая ты, каханая! якая прыгожая ты!»), а таксама: «Я рожа шаронская, ліля далінаў!» (Сёмуха: «Я – раўнінны нарцыс Саронскі, я – лілея з даліны!»).

Мяне асабіста вельмі зьдзівіла, што Сёмуха адважыўся літаральна перакласьці вэрс 1:9. Многія сучасныя перакладчыкі наўмысна перайначваюць гэты вэрс, дзе закаханы юнак параўноўвае сваю любую да... кабылы. У старажытным блізкаўсходнім сьвеце гэта быў сапраўдны камплімэнт, але ў нашай гістарычна-культурнай прасторы можа ўспрымацца як абраза. Тым ня менш, у Сёмухавым перакладзе («З кабыліцаю з фараонавай калясьніцы параўнаў я цябе, каханая») «кабыліца» гучыць цалкам прыстойна нават для сучаснага вуха. Гэты зварот можа, праўда, зьдзівіць, але ня нішчыць атмасфэры любоўнага сузіраньня і захапленьня.

Уражваюць у Сёмухі цудоўныя вынаходкі, кшталту «найпрыгажэйшая краска-дзяўчына», або «як лілея сярод бадзякоў», «пупышкі покнуліся». Абеларушаная Сёмухам Найвышэйшая песьня ў многім пераўзыходзіць польскія або расейскія аналягі.

Варта таксама зьвярнуць увагу на намэнклятуру «любові»: гэты канцэпт у Сёмухі абслугоўваюць розныя словы: «каханьне», «ласкі», «пяшчоты», у той час як Станкевіч пасьлядоўна ўжывае слова «любосьць». Сэптуагінта чамусьці ўпадабала мэтафорыку «грудзей» на азначэньне любові: там, дзе ў габрэйскім тэксьце зьяўляюцца вытворныя ад *д-в-д* (любоў), у грэцкім стракаем

часам *agapē* (любоў, каханьне), а часам *mastoi* (грудзі), як напр. у гэтым выпадку (7:12–13):

Прыйдзі, любасны, выйдзем у поле, пабудзем у вёсках;
Выйдзем раніцай у вінаграднікі,
Падзівімся, як лаза зелянее, як пупышкі покнуліся,
Як зацьвілі гранаты;
Там я цябе прыгалублю.

У габрэйскім тэксьце апошні радок гучыць: *там табе дам каханьне* (*эт-додай*) *сваё*, а ў грэцкім: *там табе дам грудзі свае*. Усьлед за Сэптуагінтай тое ж самае робіць Вульгата: *ibi dabo tibi ubera mea*.

1.3. НАЗВЫ, ІМЁНЫ, АСОБЫ

Перад тым, як завяршыць агляд Старога запавету, зьвернем увагу на адну, бадай, з найцяжэйшых перакладніцкіх праблемаў: праблему перакладаньня імёнаў і назваў.

Кнігі *Пяцікніжжа* Сёмуха і Станкевіч мянюць вельмі падобна: *Быцьцё – Быцьцё, Выхад – Выхад, Лявіт – Левіт, Лікі – Лікі, Другі закон – Другапраўе*, з той толькі розьніцай, што Станкевіч перад кожнай з назваў пазначае: *Першая кніга Масеева, Другая…* і. г. д., адлюстроўваючы тым самым паданьне аб тым, што Пяцікніжжа напісаў сам Майсей. (Найбольш парадаксальны аспэкт гэтага паданьня ў тым, што Майсей павінен быў апісаць, у такім разе, таксама ўласную сьмерць і пахаваньне ў «Пятай кнізе Майсея».) Наступныя кнігі: *Кніга Ісуса, сына Нава – Кніга Ігошуі Нунянка, Кніга Судзьдзяў – Кніга Судзьдзяў Ізраелевых*, аднолькава ў абодвух гучыць *Кніга Рут*. Чарговыя чатыры гістарычныя кнігі разыходзяцца ў назвах: чатыры *Кнігі царстваў* у Сёмухі падзелены на *Першую і Другую Самуйлаву* і *Першую і Другую Гаспадарстваў* у Станкевіча. Такім чынам, Сёмуха адлюстроўвае ўсходнюю бібліянімічную традыцыю, якую запачаткоўвае Сэптуагінта, а Станкевіч заходнюю, запачаткаваную Вульгатаю. У габрэйскай жа Бібліі, як ужо згадвалася вышэй, няма падзелу на чатыры кнігі, ёсьць адна суцэльная кніга пад назовам *Мэлёхім*.

І Сёмуха, і Станкевіч назвалі габрэйскія хронікі *Кнігамі летапісаў*, кнігу прыказак і выслоўяў перакладчыкі назвалі адпаведна *Кнігай выслоўяў Салямонавых* і *Кнігай Прыказяў Салямонавых*, Эклезіяста – *Кніга Прапаведніка* і *Казаньнік*, а «Шір ха-шірім» – *Найвышэйшая песьня Салямонава* і *Кніга Песьні над Песьнямі Салямонавае*.

У выпадку абеларушваньня назваў і імёнаў у Станкевіча зноў жа назіраем імкненьне да як мага большай, тым разам фанэтычнай, блізкасьці да арыгіналу (параўн. выбар формы *Ігошуа*, Сёмуха: *Ісус*), а таксама ўплыў заходняй фанэтычнай традыцыі. Як вядома, лаціньнікі аддаюць перавагу змычнаму спосабу вымаўленьня губных зычных (п, б), а спадкаемцы грэка-рускай традыцыі – шчыліннаму (ф, в). Такім чынам, у Сёмухі знаходзім *Вавілон*, а ў Станкевіча – *Бабілён*, адпаведна: *Арфаксад* і *Арпаксад*. Станкевіч таксама імкнецца любой цаной адлюстраваць яўрэйскі заднепаднябенны зычны, які на пісьме пазначаецца літарай *айін*, а ў вымаўленьні блізкі да нашага «г»: *Гагар, Гагей*, што стварае чарговыя нязручнасьці як для беларускага чытача, так і слухача. Сёмуха ж пачуваецца вольным ад абавязку адлюстроўваць гэтыя нюансы: *Агар, Агей*. І слушна.

* * *

Стары запавет – гэта выпрабаваньне ня толькі для перакладчыка. Гэта выпрабаваньне для кожнага чытача і чытачкі, як для г. зв. «простага верніка», так і для загартаванага багаслова. Стары запавет шакуе нас прэзэнтаваным вобразам Бога і вобразам чалавека, шакуе апісаньнямі зла і сваволі, шакуе таксама сваёй супярэчлівасьцю... Чаму так? Хтосьці зацеміў, што Стары запавет – гэта *постмадэрнісцкі* твор. Сказана ня дужа арыгінальна, тым ня менш, часам варта глянуць на Біблію як на *прастору рознасьці* і *множнасьці*, дзе нават Адзіны Бог захацеў выступіць, як было адзначана раней, у *множным ліку*.

Стары запавет – гэта твор, створаны паводле прынцыпу *мімэсіс*, імкненьня як мага больш дакладна адлюстраваць драму, якая

разыгралася пасьля Грэхападзеньня. Адным з момантаў гэтае драмы было паўстаньне фальшывага вобразу Бога: сатана падбаў, каб чалавек пачаў успрымаць Бога паводле падабенства да самога сатаны: як крывавага дэспата і помсьлівага валадара. Таму нічога дзіўнага, што абраны народ атрымаў забарону ўяўляць Бога і вымаўляць Ягонае імя. Стары запавет распавядае нам гісторыю *ідэнтыфікацыі Бога-Яхвэ*, гісторыю адкрываньня сапраўднага Бога.

Галоўнай умовай плённага падарожжа па Бібліі ёсьць *духоўная і інтэлектуальная мабільнасьць*. Менавіта таму мы выконвалі складаныя манэўры: раз рухаліся ад старажытнага слова да сучасна-беларускага, а раз – наадварот. Такія манэўры дазваляюць нам прыгадаць

cel słowa, jak słowo się czyta
w sobie samem

як кажа Норвід.

2. Новы запавет

«Novum [testamentum] in Vetere latet, Vetus in Novo patet»: «Новы запавет *хаваецца* ў Старым, а Стары *адкрываецца* ў Новым», – гэтак акрэсьліў узаемасувязь двух Запаветаў сьвяты Аўгустын.

Гэтая дыялектыка *latet-patet* (*хаваецца-адкрываецца*) ёсьць рэгулятарнай ідэяй для ўсякіх багаслоўскіх пошукаў. Гэтую ідэю можна таксама перанесьці і на філялягічна-філязафічны ўзровень і запытацца: *якім чынам адбываецца «адтойваньне» біблійнага сэнсу беларускаю мовай?* Адважмася сканкрэтызаваць Аўгустынаву сэнтэнцыю наступным чынам: *Vetus* – гэта будзе старажытнагрэцкі тэкст, а *Novum* – сучаснабеларускі.

Ойча.

Гэтаксама як Стары запавет вучыў нас правільна вымаўляць слова «быцьцё», Новы вучыць вымаўляць слова «Айцец». Таму найперш прыгледземся да г. зв. Малітвы Гасподняй (Мацьвей

6:9–13):

Сёмуха	**Чарняўскі**	**Станкевіч**
Войча наш, Які ёсьць на нябёсах! Хай сьвеціцца імя Тваё; Хай прыйдзе Царства Тваё; Хай будзе воля Твая як на небе, так і на зямлі. Хлеб наш надзённы дай нам сёньня і даруй нам правіны нашыя, як і мы даруем вінаватым нашым, і не дапусьці нас да спакусы, але ратуй нас ад ліхога; *бо Тваё ёсьць Царства і сіла і слава навекі. Амін.*	Ойча наш, каторы ёсьць у небе, сьвятым будзь імя Тваё, прыйдзі валадарства Тваё, будзь воля Твая як у небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сёньня і адпусьці нам грахі нашыя, як і мы адпушчаем вінаватым нашым, і ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад ліхога.	Войча наш,Каторы ёсьць у нябёсах, сьвяціся імя Тваё, прыйдзі гаспадарства Тваё, будзь воля Твая, як на небе, так і на зямлі. Хлеба нашага штодзённага дай нам сядні. І даруй нам віны нашыя, як і мы даруем даўжнікам нашым. І ня ўводзь нас у спакусу, але збаў нас ад злога, *бо Тваё ё гаспадарства а моц а хвала на векі. Амін.*

Першае, што кідаецца ў вочы, дык гэта адсутнасьць г. зв. *даксалёгіі* ў Чарняўскага, якую знаходзім у Сёмухі і Станкевіча (частка, выдзеленая *курсівам*). Гэта якраз тое месца, калі мы сутыкаемся з праблемай адсутнасьці арыгіналу. Так, ёсьць, можна сказаць, *некалькі арыгіналаў*: у адным «арыгінале» ёсьць даксалёгія, у іншым няма.

Сёмуха і Станкевіч інакш, чымся Чарняўскі, ужываюць форму «Войча». Прыстаўны гук [в], здавалася б, зусім не ўплывае на сэнс слова, уплывае хіба што на манеру вымаўленьня. Падаецца, што за выбарам такое формы стаіць пэўная інтуіцыя: надаць слову «Ойча» адценьне фамільярнасьці, пэўнай асаблівай блізіні, той блізіні, якая выразна адчуваецца ў сэміцкім (арамэйска-габрэйскім) *Абба*. Прыстаўны гук *мадыфікуе* сэнс слова.

Вяртаньне. Насычэньне. Шчасьце.

Стары запавет быў запаветам нормаў і загадаў, а Новы – як даводзіць сьв. Павал – ёсьць запаветам веры і ласкі. Таму пасьля «(В)Ойча» на першы плян выходзяць тры тэалягемы, якія ў грэцкай мове абслугоўваюцца тэрмінамі: *metanoia, plēroun, makariotēs*. Беларускія перакладчыкі па-рознаму перакладаюць гэтыя словы і іх вытворныя.

Сёмуха	**Чарняўскі**	**Станкевіч**
1. *Пакайцеся*, бо наблізілася Царства Нябеснае.	*Навяртайцеся*, бо наблізілася Каралеўства Нябеснае.	*Кайцеся*, бо дабліжылася гаспадарства нябёснае!
2. Не парушыць (...) прыйшоў Я, але *зьдзейсьніць*.	Я прыйшоў не скасаваць закон або прарокаў, але *споўніць*.	Я не прыйшоў узрушыць (...), а *споўніць*.
3. *Дабрашчасныя* ўбогія духам...	*Шчасьлівыя* ўбогія духам...	*Шчасьлівыя* ўбогія духам...

Першая тэалягема *metanoia* і яе аднакарэнная дзеяслоўная форма *metanoeite* зь цяжкасьцю перакладаюцца на якую-кольвечы мову, нават на лацінскую. *Мэтанойа* літаральна значыць «зьмена мысьленьня», а тэалягічным антонімам гэтага слова можа быць *sklerokardia*, літаральна, «склероз сэрца», духоўная зацьвярдзеласьць, «косный консерватизм», як скажа Сяргей Булгакаў.

Перакладчыкі вымушаны тут паказаць, як яны разумеюць гэтую «зьмену мысьленьня». Лацінская Вульгата запачаткавала інтэрпрэтацыю *мэтанойі* як «пакаяньня»: *Poenitemini...* – значыць: пакутуйце! кайцеся! За гэтай інтэрпрэтацыяй пайшлі, як бачым, Станкевіч і Сёмуха. Чарняўскі ж рэпрэзэнтуе іншую інтэрпрэтацыйную традыцыю: *мэтанойа* – гэта «на-вяртаньне», вяртаньне да Бога-Айца паводле аналёгіі да вяртаньня блуднага сына да свайго бацькі або вяртаньня чужаложніцы/чужаложніка да свайго мужа/жонкі. Цягам часу біблійная мэтафорыка навяртаньня «набрыняла» дадатковым, філязафічным сэнсам: навяртаньне – гэта зварот да Сонца, Сьвятла, Ісьціны, *Алетхэйі*. Гэты дадатковы сэнс наклаўся – як пераканаўча паказвае Вэрнэр Егер – пад уплывам плятонаўскай

катэгорыі *epistrophē*, што абазначае *зварот, скіраваньне пагляду* (да Сонца, да Сусьвету Ідэяў). Таму расейская Біблія перакладае *мэтанойю* як «обращение».

Тэалягему *plēroun* перакладчыкі аддаюць словамі «зьдзейсьніць» або «споўніць». Гэтае «зьдзяйсьненьне-спаўненьне» абазначае стасунак Ісуса Хрыста да старазапаветнага аб'яўленьня, а разуменьне гэтага стасунку ўплывае на кшталт хрысьціянскага багаслоўя. Некаторыя спрабуюць гэта «зьдзяйсьненьне» інтэрпрэтаваць як праяву ляяльнасьці Хрыста ў стасунку да законаў і этыкі СЗ, і такое разуменьне, здавалася б, пацьвярджае *блізкі кантэкст*: «Я не прыйшоў скасаваць...» Але *далейшы кантэкст* ужо стварае неверагодныя цяжкасьці: Хрыстос выступае з вострай крытыкай фарысэяў і кніжнікаў (ахоўнікаў старазапаветнай артадоксіі) і ўводзіць рэвалюцыйны для тагачаснага юдэйскага асяродзьдзя прынцып: «Не чалавек для суботы, а субота для чалавека!»

Plēroun мае значэньне ня толькі «зьдзейсьніць, споўніць, выканаць», але таксама «спатоліць (смагу), насыціць», а можа выступаць таксама са значэньнем «апладніць, зрабіць цяжарнай». Амаль безь ніякіх стратаў для сэмантыкі Вульгата перакладае *implere*, але іншыя мовы знаходзяцца ў больш нязручным становішчы.

Што тычыцца «шчасьця» ў эвангелічным разуменьні, дык справа, як здаецца, намнога больш простая. «Шчасьлівыя ўбогія духам...», «Шчасьлівыя плачучыя...» і г. д. цалкам добра адлюстроўваюць грэцкае *Makarioi*... ці лацінскае *Beati*. Расейскі ж варыянт *Блаженные*... падаецца ўсё больш «шчасьлівейшым», а гэта дзеля спэцыфікі слова «благо», пра якую мы згадвалі вышэй. Сёмухава ж вынаходка «дабрашчасныя» тут цалкам дарэчы, даданьне «дабра-» ня толькі эмфатызуе, суўзмацняе слова, але і сыгналізуе, што тут гаворка ідзе пра «шчасьце» асаблівага тыпу.

Прыгледзьмася цяпер некаторым іншым тэрміналягічным прапановам:

Сёмуха	**Чарняўскі**	**Станкевіч**	**грэцкі тэкст**
Ісус	Езус	Ісус	Iēsous
Дабравесьце	Эвангельле	Евангеля	Euaggelion
Царква	Царква	Царква	Ekklesia
Ягня	Ягня	Баранчык	Ho amnos / to arnion

«Ісус/Езус» – гэта спрошчаная вэрсія слова «Егошуа», якое значыць «Яхвэ збаўляе». Як бачым, гэтае Імя захавала ў сабе групу значэньняў, зьвязаных са словам *х-й-х* (быць-жыць-радзіць-паўставаць), да якой дадалася група значэньняў, зьвязаных са словам «збаўляць».

У беларускіх тэкстах можна стрэць прынамсі тры вэрсіі Гасподняга імені: Іісус, Ісус, Езус. Падаецца, што найбольш натуральным і найбольш філялягічна апраўданым варыянтам ёсьць «Ісус» (вэрсія Станкевіча–Сёмухі). Натуральны, бо больш зручны ў вымаўленьні, чымся «Езус» або «Іісус», а апраўданы прынцыпамі ператварэньня грэцкіх імёнаў і назваў: грэцкая «эта» (доўгае «э») у большасьці выпадкаў пераходзіць у і (ы) у беларускай мове: Eir**ē**nē – «Ір**ы**на» (з на канцы слова не ўваходзіць у рахубу, бо яно першапачаткова было доўгім а), ‘**Ē**rod – «**І**рад». Такім чынам, I**ē**sous павінна ператварыцца ў «І**і**сус», а потым, водле прынцыпу спрашчэньня, у «Ісус».

Сярод трох перакладчыкаў толькі Сёмуха рашаецца адмовіцца ад грэцызму «Эвангельле/Евангеля» і прапануе «Дабравесьце». Гэта, мабыць, той выпадак, калі пурызм ані не дэфармуе сэнсу, ані ня ўводзіць нязручнасьцяў у вымаўленьні. Наадварот, «Дабравесьце» гучыць прыгажэй і лепей. Адзіным мінусам гэтай опцыі ёсьць замазваньне назоўнікавага сэнсу слова ў вытворных: *дабравесны, дабравешчаньне*. Прыходзіцца альбо пагаджацца з гэтай «невыразнасьцю», або ўводзіць грэцызмы: «эвангелічны», «эвангелізацыя».

Усе тры перакладчыкі аддалі перавагу «Царкве» перад магчымым канкурэнцыйным «Касьцёл». Цалкам слушна, бо, па-першае, царкоўнаславянская моўная традыцыя ў Беларусі і старэйшая, і дамінуючая. Па-другое, жаночы род «Царквы» мае амаль багаслоўскае значэньне: адносіны паміж Хрыстом і Царквой заўсёды ўспрымаліся багасловамі як адносіны паміж

Жаніхом і Нявестай. Гэтую оптыку запачаткаваў сам Ян Багаслоў, і яна ўласьціва, бадай, усім багаслоўскім традыцыям, усходнім і заходнім. Па-трэцяе, этымалёгія «Царквы» мае больш тэалягічны характар, чым «Касьцёлу»: *царква* ад *kyrikē* = Гасподняя. «Касьцёл» этымалягічна павязаны з італьянскім *castello* і анг. *castle* і абазначае замак, цьвярдыню, замкнёную прастору.

У літургічнай мове беларускай Каталіцкай царквы перамог, на жаль, партыкулярызм. Нягледзячы нават на тое, што два каталіцкія аўтарытэты – Станкевіч і Чарняўскі – выказаліся за «Царкву», у афіцыйную мову БКЦ уведзена слова «Касьцёл».

«Ягня» (рас. *Агнец*) – гэта «хрыстонім» (адно з імёнаў Хрыста), спосаб перакладаньня якога выклікаў і выклікае шматлікія спрэчкі. Найбольш натуральным, здавалася б, ёсьць слова «Ягня», але – пярэчаць «знаўцы» – яно адпадае, бо... ніякага роду. «Ягня» мусіць быць толькі мужчынскага роду! Вось і пачаліся спаборніцтвы па стварэньні запатрабаванага «мужчынскага ягняці». Высоўваліся прапановы: *Агнец, Ягнец, Баранчык, Баранак*... Рымска-каталіцкія літургісты спыніліся на апошнім, хай сабе і не найшчасьлівейшым, але «мужчынскім» баранку. Цікава толькі, чаму яны не перайначылі іншага ня менш важнага хрыстоніму: *Слова*, якое таксама ніякага роду! Трэба, мабыць, чакаць, што незадоўга будзем чытаць пачатак Пралёгу не: *На пачатку было Слова*, а: *На пачатку быў Славец*. Але найбольш цікава ў гэтым тое, што літургісты, застаючыся пад магіяй мужчынскага роду лацінскага *Agnus*, не заўважылі, што ў грэцкай, «арыгінальнай» Бібліі ёсьць два словы на абазначэньне Хрыста-Ягняці: *ho amnos* і *to arnion*, а гэтае другое якраз ніякага роду!

* * *

Мова ўтойвае быцьцё, выяўляючы яго – так цьвердзіў Марцін Гайдэгер, і так можам сьцьвердзіць мы пасьля доўгага і няпростага агляду Сьвятога пісаньня. Вы-маўленьне чагосьці азначае ня толькі яго вы-яўленьне, але таксама і «прыхаваньне»: мова так ці інакш «фальшуе» праўду быцьця.

Заўсёды, аднак, патрэбна духоўная мабільнасьць і мэтаноя, пра што гаварылася вышэй. Толькі гэткім чынам можна *адкрыць боскае ў беларускім і беларускае ў боскім*.

3. «Біблія як фэномэн культуры і літаратуры»

«Мы ёсьць часткай вялізнага, глыбокага культурнага мацерыка. Старажытныя тэксты – гэта пласт, да якога беларусы ўвогуле не далучаныя», – сказала аднойчы са смуткам беларуская біблістка, др. Ірына Дубянецкая.

Можа, ёсьць у гэтым выказваньні пэўны перагіб («увогуле не далучаныя»), але праўда, што беларусы пакуль што толькі павярхоўна і слаба зьвязаны з гэтымі «старажытнымі напластаваньнямі». А ці патрэбна, ці ўвогуле неабходна «зьвязвацца» зь якой-кольвечы старажытнасьцю? Кожны, бадай, скажа, што так, але паўстане потым пытаньне: *як зьвязвацца?* Інакш кажучы, нярэдка мы апынаемся ў сытуацыі таго этыёпскага вяльможы, які, трымаючы ў руках кнігу прарока Ісаі, прызнаўся апосталу Піліпу: «Як я магу зразумець, калі ніхто не растлумачыць мне?» Патрэбен «экскурсавод».

Такім экскурсаводам сталася для беларусаў Галіна Сініла, аўтарка нядаўна выдадзеных дзьвюх кніг пад назвай «Біблія як фэномэн культуры і літаратуры». Гэтая кніга пазначана як «навуковае выданьне», і цалкам слушна. Аўтарка, прэзэнтуючы духоўна-культурнае багацьце дзьвюх першых кніг Бібліі, ня толькі абапіраецца на старажытныя габрэйскія тэксты, але знаёміць чытача з гісторыяй інтэрпрэтацыі таго ці іншага тэксту Пісаньня, пачынаючы ад старажытных юдэйскіх мудрацоў і заканчваючы найбольш выбітнымі сучаснымі біблістамі-экзэгетамі. Але гэта яшчэ ня ўсё, што можна знайсьці ў кнігах спн. Сінілы; аўтарка старанна адсочвае таксама ўзаемадзеяньне Бібліі і эўрапейскай культуры, паказвае, напрыклад, якое значэньне мела Дзесяціслоўе для канцэпцыі натуральнага права Тамаса Аквінскага альбо Дрэва Жыцьця для аналітычнай псыхалёгіі Карла г. Юнга. Ня менш захапляе ўмелая падборка мастацкіх твораў, у якіх выкарыстаны біблійныя матывы. Раз-пораз на старонках кніг

зьяўляецца ці то Вольфганг Гётэ, ці то Томас Ман, у творчым слове якіх ажывае Біблія. Асаблівую ўвагу аўтарка зьвяртае на філязафічнае рэха Божага Слова, паказвае, як яно адгукалася ў думцы Салаўёва, Аверынцава або Меня. Тым ня менш, бірка «навуковае выданьне» ў гэтым выпадку зусім не абазначае, што маем дачыненьне з сухім, акадэмічным дыскурсам. Кнігі цікава і займальна напісаны, уражвае як прыгожы стыль, лягічная структура, так і якасная беларуская мова.

Некаторых зьдзівіла маё ў маім папярэднім артыкуле эпізадычнае сьцьверджаньне пра міталягічны характар пэўных біблійных апавяданьняў. У свой час у Польшчы завязалася спрэчка паміж ксяндзом праф. Гэнрыкам Вітчыкам і езуітам Яцкам Прусакам наконт стасавальнасьці катэгорыі «міт» да біблійных аповедаў. Спадарыня Сініла ў сваім уступе вельмі добра праясьняе справу:

Міт становіцца канцэнтрацыяй духоўнага вопыту таго ці іншага народу, сыстэмай дазволаў і забаронаў, што выпрацавала тая ці іншая культура. Міт – заўсёды пэўная мадэль Сусьвету, ён нясе ў сабе вялікую рэальнасьць духу, рэальнасьць сьвядомасьці, за якой стаіць і рэальнасьць быцьця.

Зрабіўшы гэтую ўступную заўвагу, аўтарка пераходзіць да разьмежаваньня біблійнага міту ад усякіх небіблійных. «Сьвет, – прыкмячае Сініла, – упершыню паўстае як адкрытая дынамічная сыстэма, і фундамэнтам такой мадэлі сьветабудовы зьяўляецца сама ідэя Адзінабожжа».

Біблія – гэта сусьвет сымбаляў. Вельмі добра гэта разумее Галіна Сініла, таму спэцыяльным чынам спыняецца на кожным напатканым *містэрыёне*, г. зн. таямнічай зьяве – зьяве, якая апрача эмпірычна даступнага боку хавае духоўны, глыбейшы зьмест. Цяжка зразумець старажытныя тэксты, калі ня возьмем пад увагу гістрычны кантэкст і *Sitz im Leben*, жыцьцёвае асяродзьдзе носьбітаў вуснай біблійнай традыцыі і аўтараў-пісьменьнікаў, якія і зафіксавалі на пісьме гэныя традыцыі. Зноў жа, аўтарка робіць гэта ўмела і «пэдагагічна», малюючы перад намі гістарычна-культурны фон падзеяў, апісваных у

Бібліі, як бы выхоўвае ў нас «гістарычную эмпатыю», дазваляе ня толькі здабыць інфармацыю пра тагачасных людзей, але і *адчуць* іх сьветапогляд.

Шмат увагі надаецца таксама біблійнай філялёгіі. Напрыклад, аналізу аднаго толькі слова «Яхвэ» (сьвятога чатырохлітар'я *й-х-в-х*) прысьвечана амаль дзесяць старонак. Няма, бадай, ніводнага значнага слова, якое не было б разгледжана і растлумачана аўтаркай.

Можна, канечне ж, добра пашукаўшы, знайсьці невялічкія хібы або недакладнасьці. Прыкладам, згадваючы пра «Пасланьне да габрэяў», аўтарка прэзэнтуе яго як пасланьне сьв. Паўла, тымчасам яго аўтарства тут вельмі сумнеўнае. Сярод біблістаў пануе кансэнсус наконт таго, што гэтае пасланьне трэба трактаваць як ананімнае. Іншая заўвага будзе датычыць занадта ўпрошчанай візіі «рэлігійнай сьвядомасьці». Аўтарка піша: «Для рэлігійнай сьвядомасьці няма сумневу, што Кніга Быцьця запісаная прарокам Майсеем пасля Зыходу яўрэяў з Эгіпту ў XIV ці XIII ст. да н. э.». Тут заўважаецца рэха пэўнага наканаваньня: *непазьбежнасьць канфлікту розуму і веры*. Тым часам рэлігійная сьвядомасьць ня можа быць глухой у стасунку да навуковых зьвестак. Як казаў яшчэ ў сярэднявеччы сьвяты Тамас: *якая-кольвечы праўда, кім-кольвечы сказаная, ёсьць ад Духа Сьвятога*. Адвечнае і першапачатковае пакліканьне навукі – «абслугоўваць праўду». Калі нават і не выяўляць яе, то, прынамсі, набліжаць да яе. Такім чынам, прынцыповы бунт супраць навукі ёсьць тым самым бунтам супраць праўды і, апасродкавана, супраць Духа Сьвятога. Калі Майсеева аўтарства Кнігі Быцьця – рэч спрэчная з навуковага гледзішча, то рэлігійная сьвядомасьць *мусіць* гэта нейк ушанаваць. Хіба што гаворка ідзе пра *фанатычную* сьвядомасьць, але гэта ўжо зусім іншая рэч.

* * *

Калі яшчэ пяць гадоў таму я чытаў бібліялягічныя працы Джузэпэ Рычыёці і Альфрэда Лепла, ня мог нават і падазраваць, што работы *такога* фармату могуць паўстаць у Беларусі.

Відавочна, могуць, і ўжо паўстаюць. Кнігі (і шматлікія артыкулы) Галіны Сінілы маюць крыху іншы характар, чымся працы згаданых Рычыёці ды Лепла, але з пукту гледжаньня мэрыторыкі і эрудыцыі нічым не ўступаюць заходнім або расейскім аналягам. Таму можна спадзявацца, што гэтыя працы стануцца навуковымі падручнікамі ў беларускіх духоўных сэмінарыях і іншых багаслоўскіх інстытутах: праваслаўных, каталіцкіх, пратэстанцкіх, юдэйскіх.

* * *

Пасьля выхаду ў сьвет перакладаў Чарняўскага, Сёмухі, а таксама працаў г. Сінілы можна сьмела канстатаваць, што акт падключэньня Беларусі да магутнага духоўнага акумулятара адбыўся. Кожны беларус мае магчымасьць *дыхаць* Бібліяй. А Бог мае магчымасьць гаварыць па-беларуску.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/15
[image]

[image]

A R C H E П а ч а т а к № 6 (40) - 2005

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]

[image]2005

ад Зьмітук

ад Зьмітук • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Уладзімер Мацкевіч Базіс і сьвядомасьць. Дыялектыка Шаўцова

УЛАДЗІМЕР МАЦКЕВІЧ

палітоляг, мэтадоляг, аўтар кніг «Белорусская демократия: вопреки очевидности» (1996), «Вопиющее молчание» (2001). Уладальнік пэрсанальнай вэб-старонкі worvik.com. Ягоны апошні артыкул у «ARCHE» (супольна з Андрэем Ягоравым) выйшаў пад назвай «Перамога над рэжымам або сьмерць

Чытаю кнігу Юр’я Шаўцова і спрабую зразумець, ці трэба яе чытаць. Што новага я магу знайсьці ў гэтай кнізе? Пра што гэтая кніга? Каму яна прызначаная? Але разуменьне – разуменьнем, чытаньне кнігі суправаджаецца яшчэ й нейкім цьмяным адчуваньнем нечага вельмі знаёмага, што толькі ўгадваецца ў кожнай главе, на кожнай старонцы, але пра што ні слова не гаворыцца. Не адразу я разабраўся з гэтым адчуваньнем, але ўжо калі разабраўся, усё стала больш зразумелае, простае, банальнае. Так, усё стала проста банальнае. І гэта мяне расчаравала, бо сам Юры Шаўцоў не ўяўляецца мне банальным, наадварот, я лічу яго даволі арыгінальным чалавекам. Таму гэтая рэцэнзія будзе і пра кнігу, і пра аўтара.

Але сьпярша пра адчуваньне, якое да сярэдзіны прачытанай кнігі ператварылася ў разуменьне. Я зразумеў, што чырвонай ніткай праз усю кнігу ідзе адна думка – «быцьцё вызначае сьвядомасьць»! Гэтая фундамэнтальная ідэя дыялектычнага марксізму дапаўняецца ня менш фундамэнтальным прынцыпам гістарычнага матэрыялізму – «базіс вызначае надбудову». Уласна пра гэта ўся кніга. Без прыдумак.

Чаму Беларусь праводзіць такую палітыку? – Бо такая эканамічная сытуацыя.

Чаму беларусы галасуюць так, а не іначай? – Бо чарнобыльская аварыя.

Чаму беларусы такія рэлігійныя? – Бо такая прырода і геаграфічнае становішча Палесься.

Чаму ў беларускага прэзыдэнта сварлівы характар? – Бо такая эканамічная сытуацыя.

А чаму такая эканамічная сытуацыя? – Ну, так склалася гістарычна. Пасьля таго ідзе кароткая гістарычная даведка, як гэта ўсё склалася.

Гэта можа падацца ўтрыраваньнем. Ані. Як вам такое пытаньне ў загалоўку аднаго з параграфаў кнігі: «Прэзыдэнт – спараджэньне аварыі?» (с. 172)? Альбо сьцьверджаньне: «Сёньняшняя духоўная самаізаляцыя Беларусі ад усёй Эўропы ў значнай ступені тлумачыцца чарнобыльскім фактарам» (с. 178).

Наагул, Чарнобыль для Шаўцова – гэткая палачка-выручалачка, гэткі «deus ex machina», калі штосьці немагчыма патлумачыць эканамічнымі заканамернасьцямі – выкарыстоўваецца фактар Чарнобылю. Але давайце ад пачатку.

Такім чынам, гісторыя Беларусі, якая разглядаецца Шаўцовым у першай главе кнігі, патрэбна дзеля абгрунтаваньня адной простай ідэі, якая нават стала назвай параграфу: «Беларусы – ёсьць» (с. 35). У самім параграфе пра тое, што «беларусы – ёсьць», распавядаецца пра вынікі перапісу 1999 г., у іх няма нічога асаблівага. Усё важнае сказана крыху раней як вынік гістарычнага экскурсу – беларусы не расейцы. Ёсьць некалькі важных адрозьненьняў беларусаў ад расейцаў, адно зь якіх падкрэсьліваецца асабліва – схільнасьць беларусаў да уніяў, хаўрусаў, аб'яднаньняў. Такая асаблівасьць *беларускай* сьвядомасьці, канечне ж, павінна мець тлумачэньне ў беларускім *быцьці*. Для гэтага і распавядаецца гісторыя ад асыміляцыі балтаў славянамі тысячу гадоў таму да зьмены

цыі: дылема будучых прэзыдэнцкіх выбараў» (4/2005).

генэрацыяў чынавенства ў паваеннай БССР. Сама гісторыя распавядаецца з падкрэсьліваньнем геаграфічнага дэтэрмінізму. Паколькі геаграфія апісвае больш фундамэнтальнае быцьцё, чым гісторыя, то выбудоўваецца выразны прычынна-выніковы ланцужок: сучасны стан рэчаў тлумачыцца гістарычнымі працэсамі і падзеямі, гістарычныя ж працэсы і падзеі тлумачацца геаграфічным становішчам. Таму сучаснае становішча справаў ЗАКАНАМЕРНА, яно такое, якое ёсьць, і ніякім іншым быць ня можа.

Ну сапраўды, хто ж будзе з гэтым спрачацца? Гісторыя ня ведае ўмоўнага ладу.

Таксама варта заўважыць, што для беларуса ў першым падразьдзеле няма нічога новага. Увесь ён відавочна разьлічаны на замежнага спажыўца, на расейскага найперш. Нават разьдзел «Канфэсійныя тэндэнцыі», які, пэўна, адзіны з усёй кнігі нясе нешта новае для беларускага чытача. Да слова, Юры Шаўцоў быў першым зь беларускіх аналітыкаў, які зьвярнуў увагу на своеасаблівасьць канфэсійных тэндэнцыяў і на тыя магчымыя наступствы, якія зь іх вынікаюць. Але пра гэта крыху пазьней.

Такім чынам, цікавая пабудова першай главы «Культура і ідэнтычнасьць», якая ўлучае чатыры разьдзелы: «Тэрыторыя і насельніцтва», «Нацыянальныя асаблівасьці», «Канфэсійныя тэндэнцыі», «Фэномэн «беларускасьці».

Першыя два разьдзелы малаінфармацыйныя.

Зьмест трэцяга разьдзелу зьяўляецца ўнёскам Шаўцова ў сучаснае беларусазнаўства. Важна зацеміць, што Шаўцоў рэзка супрацьпастаўляецца афіцыйнаму погляду на канфэсійную сытуацыю. Афіцыёз увесь час падкрэсьлівае праваслаўны характар беларусаў, як у гісторыі, так і цяпер. Гэта робіцца ўсімі даступнымі сродкамі, праз слоўнікі і даведнікі, дзе гаворыцца пра 80 % праваслаўных, і праз архітэктуру – на ўсіх бачных месцах, гарадзкіх пустках і пры скрыжаваньнях галоўных дарог ставяцца псэўдарасейскія храмы, амаль заўсёды пустыя, дзеля адзінай функцыі – меціць тэрыторыю. Шаўцоў жа падкрэсьлівае шматканфэсійны характар Беларусі,

немаскоўскія асаблівасьці праваслаўя і рост пратэстантызму, прагназуе ў будучыні карэнныя зьмены канфэсійнай структуры беларускага грамадзтва.

Больш за тое, канфэсійныя зьмены разглядаюцца як адзін з складнікаў фэномэну «беларускасьці» ў чацьвертым разьдзеле першай главы. Цікавыя іншыя складнікі: «унійнасьць» і «эўрапейскасьць». Першы складнік, пазначаны нэалягізмам «унійнасьць», адносіцца да палітычнай культуры беларусаў, а «эўрапейскасьць» характарызуе сталы сацыяльна-культурны фон. Наагул жа фэномэн «беларускасьці» задаецца таўталягічна – як тутэйшасьць. («У гэтым сэнсе беларус – гэта «тутэйшы», беларусам можна быць, наагул, толькі ў рэгіёне Беларусі» (с. 72)). Гэта традыцыйна, зразумела, нават банальна. Але вось трактоўка беларускасьці як **ТЭХНАЛЁГІІ** жыцьця і выжываньня магла б прыцягнуць увагу і зацікавіць сваёй арыгінальнасьцю. Аднак усе развагі зьвялі ТЭХНАЛЁГІЮ да адаптацыі, што зусім сумна, як з дасьледніцкага, так і зь філязофскага пункту гледжаньня.

Праўда, філязофія не цікавіць Шаўцова. Іначай яго самога пачало б адварочваць ад уласнага дыямату і дэтэрмінізму. З усёй філязофіі яму блізкая толькі лёгіка, прычым самая простая і прагматычная: прычына – вынік. Быцьцё – заўсёды прычына, заўсёды базіс. Базіс – гэта геаграфія, прырода і эканоміка. А палітыка, мэнталітэт, рэлігія, нацыянальныя асаблівасьці – вынік з прычынаў. Нават калі гэта зусім ня так. Напрыклад, Шаўцову вядомыя фэномэны, якія не выводзяцца з геаграфіі і эканомікі. Іх яму падкідвае філязофская інтуіцыя. Вось адзін з такіх прыкладаў: «Сапраўды, расейскім чалавекам у Беларусі быць нельга. Звычайныя, самыя нявінныя філязофскія развагі ў расейскім духу ставяць чалавека ў Беларусі перад пагрозай поўнай неадэкватнасьці» (с. 70). Філязофскімі развагамі ў «расейскім духу» ён называе ідэакратычнасьць і імпэрскасьць, вечнасьць і ўсёадзінства.

Цікава, як гэтая тэза стасуецца з існаваньнем расейскай імпэрскай адміністрацыі ў Беларусі канца XVIII ст.? Ці значыць гэта, што ўсе прысланыя імпэрскія чыноўнікі ўлучна з сумнавядомымі Мураўёвым, Замяталіным ды Латыпавым

рабіліся тут беларусамі? Гэта нязручны момант для Шаўцова, таму ён прыдумляе канцэпцыю зьмены кіраўнічых генэрацыяў у паваеннай БССР. Ён сьцьвярджае, што падчас вайны загінула ўся кіраўнічая кляса ў Беларусі. Маюцца на ўвазе лідэры, сярод якіх амаль немагчыма было сустрэць тутэйшых беларусаў, палякаў ці габрэяў, усе прысланыя (Кнорын, Мясьнікян, Пятроўскі, Цанава, Гай і г. д.). І пасьля вайны да ўлады ў БССР прыйшлі былыя партызаны і падпольшчыкі, якія толькі ў 1980–1990-я гг. зьмяніліся больш маладымі гаспадарнікамі. Сапраўды, і Мазураў, і Машэраў былі з таго ваеннага пакаленьня і былі беларусы. Але такая была «ўстаноўка», што першымі сакратарамі ў саюзных рэспубліках былі мясцовыя кадры, а вось расейцы ці проста прысланыя зь іншых правінцыяў кадры займалі ўсе ключавыя месцы ад другога сакратара рэспубліканскай кампартыі да КГБ. Спроба вытлумачыць «мэнталітэт і сьвядомасьць» кіраўнічай эліты БССР мясцовымі «быцьцём і базісам» відавочна неадэкватная. Таму і патрэбная тэза пра неадэкватнасьць «філязофскіх разваг у расейскім духу». Цікава, а ўзарваная Фара Вітаўта ў Горадні – гэта ў чыім духу? Расейскім ці беларускім? А машэраўская русіфікацыя? Хаця культура ў яго – гэта толькі надбудова над эканамічным базісам, таму ў Шаўцова самастойнага значэньня ня мае.

Ну ды хай сабе. Але вось што цікава, апошні параграф у першай главе і ў разьдзеле «Фэномэн «беларускасьці» называецца «Стан рэчаў». Прычым у самім параграфе гаворка ідзе пра канфэсійныя пытаньні, якія павінны былі б быць абмеркаваныя ў папярэднім разьдзеле. У гэтым палягае амаль фрайдысцкі фэномэн. Бо ўсе развагі пра насельніцтва, рэлігію, культуру і гісторыю патрэбныя Шаўцову толькі для характарыстыкі СТАНУ РЭЧАЎ. І гэтае становішча рэчаў заканамернае. Заканамернае двойчы. Першы раз яно тлумачыцца гісторыяй і геаграфіяй – той самай асновай **быцьця**, якая ня ставіцца пад сумнеў у дыямаце. Другі раз усё гэта тлумачыцца ў другой главе, якая называецца «Эканоміка. Звышындустрыялізацыя». У зьмесьце кнігі ў другім падразьдзеле толькі адзін разьдзел пазначаны – «Структура эканомікі».

Я б наагул ня стаў разглядаць гэтага падразьдзелу, паколькі ўсё яго прызначэньне – патлумачыць яшчэ раз той самы «стан рэчаў», які ўжо патлумачаны ў першым падразьдзеле. Я б абмежаваўся толькі некалькімі заўвагамі. У выкладаньні Шаўцова эканоміка не зусім эканоміка, гэта, хутчэй, эканамічная геаграфія. І структура эканомікі зусім не эканамічная, а менавіта эканомгеаграфічная.

Разглядаючы структуру эканомікі, Шаўцоў практычна нічога ня кажа пра банкі і фінансы, пра цэнавую канкурэнцыю, рэнтабэльнасьць, выдаткі. Структура эканомікі для Шаўцова – гэта галіны і раянаваньне. Але ня ўласнасьць, не эканамічныя праграмы і палітыка, кіраваньне і разьвіцьцё. Гэта нават не палітэканомія. У эканамічных развагах Шаўцоў адыходзіць ад савецкай мэтадалёгіі дасьледаваньняў, для якой палітэканамічныя пытаньні ўласнасьці зьяўляюцца першаснымі. Калі б я чытаў толькі гэтую кнігу Шаўцова, то гэтыя абставіны маглі б выклікаць непаразуменьне. Але ведаючы пра ягоныя мінулыя захапленьні Гантынгтанам і геапалітыкай, гэта лёгка зразумець.

Такім чынам, геапалітыка і эканомгеаграфія – той самы базіс, тое самае быцьцё, якое вызначае сучасную беларускую палітыку, дзяржаўны лад, аўтарытарызм першага прэзыдэнта, цэнтралізаваную вэртыкаль. А таксама бясконцую ў часе інтэграцыю з Расеяй і канфлікт з Эўропай і ЗША.

«Няўжо ж сапраўды тлумачыць?» – спытаецца чытач «ARCHE». Няўжо ж усё так заканамерна і ажыцьцяўляецца з жалезнай заканамернасьцю? Хіба няма ва ўсім гэтым яшчэ і суб'ектыўных фактараў? Няўжо ніхто не вінаваты ў нашых праблемах, палітычных злачынствах, дыпляматычных няўдачах? Няўжо ж усё так блага? І мы аніяк ня здолеем на гэта паўплываць, напрыклад, праз выбары?

Кніга Шаўцова адказвае на гэтыя пытаньні. Адказвае так, каб у чытачоў «ARCHE» не заставалася ніякіх спадзяваньняў і ілюзіяў. Першая частка адказу ёсьць у трэцім падразьдзеле, а другая частка – у чацьвертым.

Трэці называецца «Чарнобыльская катастрофа. Чарнобыльскі

соцыюм». А першая частка адказу можа быць сфармулявана так: канечне, сучасны стан справаў у Беларусі мае і суб'ектыўныя прычыны. Але ня думайце, што гэтыя прычыны можна апісаць як нястачу адукацыі ў людзей, якія кіруюць нашай краінай. І тым больш ня думайце, што гэтыя прычыны можна патлумачыць злой воляй нейкіх людзей. Не, суб'ектыўныя прычыны хаваюцца ў мэнталітэце чарнобыльскага соцыюму.

«Галоўным наступствам катастрофы, што адбылася амаль 20 гадоў таму, можна лічыць, відавочна, зьяўленьне жывой чарнобыльскай культуры і цэлага соцыюму чарнобыльцаў. Гэты соцыюм валодае ўласным патэнцыялам уплыву на эўрапейскую і глябальную культуры і ўласнай **суб'ектнасьцю**. У некаторым сэнсе ўсе беларусы зрабіліся чарнобыльцамі. Можна казаць пра трансфармацыю ўсёй постсавецкай культуры ў чарнобыльскую і нават пра распусканьне беларускай культуры ў чарнобыльскай культуры» (с. 138).

Адцемлю адразу, што Юры Шаўцоў, сам закрануты чарнобыльскай катастрофай, зьяўляецца адным з самых глыбокіх аналітыкаў наступстваў чарнобыльскай катастрофы. Ён вельмі добра валодае матэрыялам, разглядае сытуацыю з розных бакоў, улічвае гаспадарчыя, арганізацыйныя, мэдычныя, псыхалягічныя, сацыяльныя і філязофскія аспэкты чарнобыльскага фэномэну. Ён мог бы стаць самым аўтарытэтным (хаця ён такі і ёсьць) экспэртам у гэтай праблеме, калі б не некаторая тэндэнцыйнасьць у выкарыстаньні чарнобыльскіх наступстваў для апалягетыкі сучаснага стану рэчаў.

Шаўцоў ня проста цьвердзіць пра існаваньне асобнага чарнобыльскага соцыюму і чарнобыльскай суб'ектнасьці. Ён сьцьвярджае, што «чарнобыльскі соцыюм у любой форме ёсьць крыніцай нестабільнасьці на тэрыторыі Беларусі» (с. 173). І пастулюе «негатовасьць сьвету да чарнобыльскай суб'ектнасьці» (с. 176).

То бок Чарнобыль прыцягваецца як тлумачэньне ўсіх асаблівасьцяў і дзівосаў беларускай палітыкі, дзяржаўнага ладу, эканамічнай структурнай архаікі, якія ня могуць быць

вытлумачаныя праз спрошчаную схему базісу і надбудовы. Усе народы і нацыі асаблівыя. Але беларусы асаблівыя асабліва. Чаго гэта раптам? Тут і самому Шаўцову зразумела, што няма ніякіх эканамічных падставаў для нелягічных паводзінаў беларускіх уладаў і кіраўніка дзяржавы найперш. Вось тут і прыгадваецца Чарнобыль, чарнобыльскі соцыюм і чарнобыльская суб'ектнасьць. Ёсьць у тэксьце вельмі характэрная фраза: «Палітычныя паводзіны пэўнай асобнай культурнай групы зусім неабавязкова адэкватныя яе рэальным патрэбам. У гісторыі гэта ня рэдкасьць» (с. 145). Вось так. Калі штосьці нелягічна ці абсурдна, то гэта таму, што дзяржава дзейнічае ва ўмовах неадэкватнага соцыюму.

Дзіўная штука. Калі факты не адпавядаюць тэорыі, то тым горш для фактаў. Шаўцоў шмат кажа пра грамадзкую самаарганізацыю чарнобыльцаў, пра шматлікія фонды і грамадзкія арганізацыі, створаныя альбо самімі чарнобыльцамі, альбо для абароны іх інтарэсаў. Але забывае распавесьці пра тое, як улада сьвядома душыла іх дзейнасьць, вымушала іх да карупцыі і да таго, каб губляць час на самавыжываньне і самаабарону замест выкананьня асноўных функцыяў – аздараўленьня і абароны інтарэсаў і правоў чарнобыльцаў.

Калі чарнобыльцы часта галасуюць супраць сваіх жа інтарэсаў (гэта Шаўцоў прызнае), што парушае прынцып «быцьцё вызначае сьвядомасьць», то Шаўцову прасьцей прызнаць іх паводзіны неадэкватнымі, чым тое, што такія паводзіны вызначаюцца іншай сьвядомасьцю, чужой і варожай воляй. Шаўцоў кажа: «Аднак у любым разе чарнобыльцы – гэта нечы электарат, і заваяваць ягоную падтрымку можна толькі тады, калі падыходзіць да іх як да асобнай групы насельніцтва са спэцыфічнымі праблемамі, якія дапаўняюць агульныя, уласьцівыя для ўсяго грамадзтва» (с. 145).

У канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. чарнобыльцы былі электаратам БНФ (але чаму тады не было ніводнага дэпутата ад БНФ з чарнобыльскіх раёнаў?), а цяпер галасуюць за Лукашэнку, піша Шаўцоў. Гэта Шаўцоў ведае. Ён ведае таксама і тое, што эканамічная палітыка лукашызму знаходзіла

дадатковыя інвэстыцыйныя сродкі за кошт згортваньня чарнобыльскіх праграмаў. Альбо папросту чыноўнікі рабавалі чарнобыльскія фонды, пускалі ў камэрцыйнае абарачэньне чарнобыльскія грошы, у продаж – гуманітарную дапамогу.

Што замінае Шаўцову іначай паглядзець на чарнобыльскія наступствы? Я ведаю, што многія з тых, хто чытаў кнігі і артыкулы Шаўцова, тлумачаць гэта апалягетычнай устаноўкай аўтара. Я ня схільны адмаўляць у яго наяўнасьць такой устаноўкі. Але я бачу яе вытокі ў іншым, ня ў тым, што Шаўцоў абслугоўвае рэжым, а ў тым, што ён нерэфлексіўны адносна свайго пазнавальнага мэтаду. Дарэчы, гэта зыходная бяда ўсяго дыямату з часу ўзьнікненьня гэтай філязофіі. Дыямат быў прыдуманы для таго, каб адмовіцца ад адзінаццатай тэзы пра Фаербаха самога Маркса, якая гаворыць, што задача філязофіі палягае ня ў тым, каб тлумачыць сьвет, а ў тым, каб яго перарабляць. Маркс так і кажа, што памылка ўсіх папярэдніх філёзафаў у тым, што яны толькі тлумачылі сьвет. Але ж Шаўцоў толькі гэтым і займаецца. Значыць, паводле Маркса, ён памыляецца. І я тут згодны з Марксам, а не з дыялектычным макрсістам Шаўцовым.

Дарэчы, прыгадваецца, што першы ў сьвеце падручнік па дыялектычным матэрыялізьме быў напісаны Вольфсанам менавіта ў Менску. Якім быцьцём патлумачыць такі выкрут беларускай сьвядомасьці? Можа быць, не заўсёды быцьцё вызначае сьвядомасьць, а бывае часам і наадварот: сьвядомасьць вызначае быцьцё. І дасягненьні сьвядомасьці, і заганы яе.

Так глупствы беларускага палітычнага жыцьця вызначаюць канфлікты Беларусі з Эўропай і Амэрыкай. Абмежаванасьць кіраўніка дзяржавы і ягонага бліжэйшага атачэньня, а зусім не геаграфічнае становішча.

І ня звышындустрыялізацыя замінае праводзіць структурныя рэформы ў эканоміцы, а толькі недальнабачнасьць, неадукаванасьць і бязвольнасьць ураду. То бок гэта ўсё тлумачыцца не аб'ектыўнымі прычынамі, а выключна суб'ектыўнымі. І гэтая суб'ектыўнасьць, гэтая **сьвядомасьць** вызначае нашае супольнае **быцьцё**.

Шаўцоў надае вялікую ўвагу эканамічным посьпехам сучаснай Беларусі. Пра гэта ўвесь чацьверты падразьдзел. Пра агульныя посьпехі і асобныя праблемы. Праблемы таксама ў базісе, напрыклад, у дэмаграфіі. Дэмаграфія – гэта базіс, а вось напрамкі міграцыйных плыняў – ужо зьява надбудовы. У цэлым схема застаецца той самай. І так можна працягваць да бясконцасьці. Уласна ў сваім заключэньні, дакладней, у разьдзеле «Замест заключэньня», аўтар і накідвае такую бясконцую гісторыю, прадказваючы каляпс беларускай эканомікі пад узьдзеяньнем аб'екыўных прычынаў гадоў праз 10, але, адначасова, прадбачачы ўзьнікненьне ў Беларусі нэапратэстанцкага соцыюму, які, канечне ж, дасьць рады ўсім праблемам.

Дыялектыка, аднак.

Вось такую кнігу напісаў Юры Шаўцоў, ён жа актыўны інтэрнэт-аўтар Юры Гуралюк. Асоба, безумоўна, цікавая. Чалавек, які мае ўзнагароду Літоўскай Рэспублікі за ўдзел у абароне будынку Вярхоўнай Рады ў 1991 г. Чалавек, які рызыкаваў жыцьцём за ідэалы дэмакратыі, тым самым спрыяў развалу СССР і які сёньня зьяўляецца адным з самых таленавітых апалягетаў цяперашняга стану рэчаў і які лічыць усіх нязгодных з гэтым «суіцыдальнай апазыцыяй». Супрацоўнік закрытага рэжымам і выгнанага з краіны ЭГУ, які даў інтэрвію галоўнаму прапагандысту гэтага рэжыму Зімоўскаму. Аўтар патрыятычнай кнігі, па-свойму нацыяналістычнай, якая па-свойму падкрэсьлівае ў некалькіх парамэтрах перавагі Беларусі над Расеяй, які выдаў яе з прымітыўна-фанабэрыстай расейскацэнтрычнай прадмовай г. Паўлоўскага.

Дыялектыка! Вельмі супярэчлівая асоба – гэты Юры Шаўцоў.

Ён і сам добра ўсьведамляе гэтую сваю супярэчлівасьць, але не надае ёй значэньня. Ён у большай ступені ўсьведамляе сваё інтэлектуальнае першынство.

Як вы мяркуеце, чытачы «ARCHE», што думае пра сябе аўтар, які выдаў кнігу без адзінай спасылкі на іншых аўтараў, нават бязь сьпісу літаратуры? Адкуль аўтар бярэ свае ідэі –

зразумела: ён самадастатковы. Але вось адкуль ён бярэ матэрыял, статыстыку, інфармацыю? Ці можна верыць усёй гэтай інфармацыі, на якой грунтуюцца высновы і меркаваньні Юр'я Шаўцова, калі іх немагчыма праверыць? Адзінае ўказаньне на крыніцу інфармацыі – гэта ўказаньне інтэрнэт-адрасу афіцыйнага сайту прэзыдэнта пад некаторымі табліцамі.

Мяне раней вельмі займала пытаньне аб праўдзівасьці беларускай статыстыкі. Зь некаторага часу перастала займаць. Яна неправяральная – значыць, непраўдзівая. Пэўныя эканамічныя вынікі я магу бачыць у рэальным спажывецкім кошыку, але лічбы 15–20 % эканамічнага росту я не магу лічыць рэальнымі, пакуль бачу спажывецкія кошыкі ня толькі ў Менску, але і ў Вільні, Варшаве, Рызе. Гэта суб'ектыўна, скажаце вы мне! Вядома! Але ня больш, чым уся кніга Шаўцова. Ці яе варта прызнаць усяго толькі публіцыстычным нарысам для даверлівых расейцаў, ці яна не вытрымлівае крытыкі проста праз сваё аснашчэньне, праз адсутнасьць спасылак, сьпісу крыніцаў, навуковага апарату ў выглядзе вызначэньня аўтарам апэрацыйных паняткаў і катэгорыяў. Мне падабаюцца многія меркаваньні Шаўцова, але гэта не дазваляе мне давяраць ім. Кніга Шаўцова аўтычная – ён і Беларусь. Дык можа, гэтая Беларусь існуе толькі ў сьвядомасьці самога Шаўцова? І ўсялякае супадзеньне Беларусі ягонай сьвядомасьці з рэальнай Беларусьсю – чыстая выпадковасьць?

І апошняе, пра наіўных расейцаў, якім прызначаная гэтая кніга. Я не магу аднесьці да наіўных свайго даўняга знаёмца Вячаслава Леанідавіча Глазычава, які напісаў пасьлямову да кнігі Шаўцова і зьяўляецца ініцыятарам усёй сэрыі, у якой яна выдадзена. Ведаю і люблю кнігі самога Глазычава па архітэктуры, горадабудаўніцтве, пра бізантыйскае мастацтва і іншыя. Шырыня інтарэсаў Глазычава спалучаецца з навуковай сумленнасьцю і карэктнасьцю, што да выкарыстоўванага матэрыялу. Ягоныя кнігі заўсёды маюць неабходны апарат, я магу ўсё лёгка праверыць, у маёй кніжнай шафе стаіць некалькі ягоных кніг. Вось чытаў вельмі станоўчы водгук і думаю, ці той гэта Глазычаў, якога я ведаю. На жаль, той. Гэта найяскравейшы прыклад таго, як расейскі інтэлігент

забываецца на прынцыпы дзеля расейскага архетыпу. Кніга Шаўцова ня проста прызначаная для расейцаў. Яна трапляе ў «дзясятку» расейскіх чаканьняў адносна Беларусі. Расейскія інтэлігенты ўжо даўно расчараваныя тым, куды і як рухаецца Расея, іх увагу ўсё больш і больш прыцягвае Лукашэнка і Беларусь. Не рэальная, а як нейкая ідэальная карцінка. Кніга Шаўцова цалкам адпавядае іх чаканьням, так што можна заплюшчыць вочы на яе асобныя хібы. Якія хібы могуць быць у ідэалу?

І гэта слушна. Не быццё вызначае сьвядомасьць, а ідэалы і каштоўнасьці вызначаюць нашае жыцьцё і тое, што мы пра гэтае жыцьцё думаем. У мяне і ў Юр'я Шаўцова розныя каштоўнасьці. Таму і стан рэчаў у нашай супольнай Беларусі мы ацэньваем па-рознаму.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/24
[image]

ЮРЫ ЧАВУСАЎ
палітоляг, юрыст. Нарадзіўся ў 1978 г. у Менску. Сябра рэдакцыйнай рады часопісу «Палітычная сфера». Ягоныя апошнія публікацыі ў «ARCHE» – агляды «Вайна для народу» (2/2005) і «Рэвалюцыя і антырэвалюцыя: бэкграўнд антырэвалюцыйнага дзеяньня» (5/2005).

Юры Чавусаў Як выжыць падчас рэвалюцыі

Колесников, Андрей. *Первый украинский. Записки с передовой.* – Киев: Вагриус, Национальный Книжный Проект, 2005. – 416 с.

«Оранжевая революция»: версии, хроника, документы / Сост. М. Погребинский. – Киев: Оптима, 2005. – 416 с.

Оранжевая революция. Украинская версия: Сборник статей. – Москва: Европа, 2005. – 463 с.

На самай справе ў гэтым нарысе аглядаюцца ня тры, а два выданьні. Кніга расейскага журналіста Андрэя Калесьнікава «Першы Ўкраінскі. Запіскі зь перадавой» была выдадзеная на расейскай мове ў Расеі і Ўкраіне пад адной назвай адным і тым жа выдавецтвам, зьмест гэтых двух варыянтаў супадае, як і назва. А вось расейскамоўны зборнік аналітычных артыкулаў, выпушчаны таксама ў дзьвюх краінах адначасова, мае шыльду двух розных выдаўцоў, а таксама адрозьніваецца прадмовамі, вокладкамі і назвай. Таму хоць фармальна аб’ектам гэтай рэцэнзіі зьяўляюцца тры выдавецкія адзінкі, надалей мы будзем, за рэдкім выняткам, весьці размову пра дзьве кнігі.

Гэтыя дзьве кніжкі маюць шмат супольнага. Прысьвечаныя падзеям, якія атрымалі агульнапрынятую назву «Памаранчавая рэвалюцыя», яны ў пэўнай ступені эксплюатуюць неспатоленую цікавасьць да гэтай тэматыкі ў шырокага чытача. Абедзьве прэтэндуюць на інфармаваньне чытача пра тое, што адбывалася ва Ўкраіне падчас мінулых прэзыдэнцкіх выбараў і ўсяго, што іх суправаджала. Два выданьні зьявіліся па гарачых сьлядох – успаміны пра рэвалюцыю былі яшчэ сьвежыя, уражаньні і эмоцыі былі яркія, а асэнсаваньне фэномэну адбывалася на падставе тых пазыцыяў, якія суб'екты займалі падчас саміх рэвалюцыйных працэсаў. І гэтае падабенства толькі робіць больш выразным разыходжаньне ва ўзроўнях інтэрпрэтацыі прадмету.

Спадар Калесьнікаў піша ў жанры разгорнутага рэпартажу, піша як эмацыйны назіральнік, набліжаны да цэнтраў прыняцьця рашэньняў, піша з аб'ектыўнай пазыцыі журналіста, які не хавае ўласных перакананьняў і не адмаўляецца ад сваіх сымпатыяў, але пры гэтым не дазваляе ім засьціць фактаў, не дазваляе сабе ўмешвацца ў рэальнасьць, падрабляць яе дзеля спэкуляцыйнага пацьвярджэньня ўласнай пазыцыі. Дзякуючы такому стылю апісаньне робіцца максымальна «ўключаным» у падзеі, аднак пры гэтым не губляе каштоўнай аб'ектыўнасьці. Тэкст Калесьнікава – гэта тэкст чалавека, які *перажыў* рэвалюцыю, бачыў яе на ўласныя вочы, удзельнічаў у ёй і ўспрыняў яе сэрцам. Гэта найвышэйшы пілятаж журналісцкага майстэрства – матэрыял падаецца ва ўспрыняцьці асобы аўтара з максымальным акцэнтаваньнем асабістых уражаньняў удзельнікаў падзеяў. І дзякуючы гэтаму акцэнту на асабістым факты робяцца больш відавочныя і падаюцца максымальна непрадузята. Гэта як альбом толькі надрукаваных фатаздымкаў з Майдану, які аўтар гартае і пры гэтым згадвае, камэнтуе, спрабуючы аднавіць у памяці свае пачуцьці, сьмяецца са сваіх першапачатковых уражаньняў. У такім аповедзе рэвалюцыя паўстае перад намі як падзея агромністага асабістага значэньня – такой яна была для многіх яе ўдзельнікаў, менавіта як такая яна запомніцца ім. Для многіх Майдан стаў пунктам у асабістай біяграфіі – для ўсіх рэвалюцыя стала эмацыйным узрушэньнем, выпрабаваньнем сілы прынцыпаў і трываласьці каштоўнасьцяў.

Зборнік жа артыкулаў вядомых украінскіх, расейскіх і заходнеэўрапейскіх палітолягаў мае іншую мадэль інтэрпрэтацыі прадмету, таксама каштоўную, але іншым. Інтэлектуалы дасьледуюць прадмет пры дапамозе іншай мэтадалёгіі – яны імкнуцца па ўсіх традыцыях акадэмічнай навукі растлумачыць, *што ж адбылося на самай справе*. У адрозьненьне ад журналісцкай інтэрпрэтацыйнай мадэлі («адбылося тое і тое, я ў той час рабіў гэта і размаўляў з тым, а мае суразмоўцы тады адчувалі і думалі наступным чынам...»), тут мы знаходзім максымум тлумачэньняў, гіпотэзаў і сьмелых меркаваньняў («дзеяньні палітыка N былі выкліканыя тым, што...», «народ адрэагаваў на гэтыя дзеяньні...», «рэакцыя замежных актараў прымусіла...», «сапраўднай прычынай было...»). У прынцыпе, любая палітычная аналітыка рызыкуе патрапіць у бездань кансьпіралёгіі – спробы выбудовы рацыянальных інтэрпрэтацыяў падзеяў, шырэйшых за магчымасьці чалавечага ўспрыняцьця, заўжды рызыкуюць прывесьці да таго, што інтэлектуальныя канструкцыі зробяцца субстытутам багацьцю жыцьця, а сухія плады рэфлексіі заменяць сабой сакавіты яблык непрадказальнай рэчаіснасьці. Усіх інтэлектуалаў-разумнікаў папярэджвае Жыль Дэлёз: «І невядома, ці толькі сон розуму спараджае пачвараў. Робіць гэта і ягоная нядрэмнасьць, бяссоньне мысьлі» («Différence et Repetition», 1969). Ніхто з думаньнікаў-аўтараў зборніка не знайшоў у сабе сьмеласьці расьпісацца ва ўласнай прафэсійнай паразе перад абліччам невытлумачальнага паўстаньня нацыі там, дзе яго ніхто не чакаў – і некалькі мудрагелістых «пачвараў» бяссоньня мысьлі сапраўды знайшлі сабе месца на старонках інфармацыйна-аналітычнага выданьня. Спрыяла гэтаму таксама і тое, што сярод аўтараў зборніка, як адзначала Юлія Цімашэнка ў прадмове да ягонай украінскай вэрсіі, былі і рашучыя прыхільнікі паўстанцкага Майдану, і ягоныя пераканаыя праціўнікі. Радасьць першых спалучаецца на старонках кніжкі з страхам другіх – страхам перад народам, які запатрабаваў рэалізацыі сваіх правоў, страхам, пакуль не прыпраўленым зласьлівымі кпінамі з нагоды няўдачаў пасьлярэвалюцыйнага рэжыму. Апошняя група матэрыялаў ёсьць ня чым іншым, як праявай *esprit de l'escalier** амаль у літаральным сэнсе – намаганьнямі некаторых даказаць уласную абазнанасьць і розум тады, калі дзьверы за імі ўжо

зачыніліся. Разам фармуецца дастаткова стракатая нізка інтэрпрэтацыяў, аб’яднаных толькі імкненьнем патлумачыць прадмет розумам, патлумачыць яго рацыянальна, вывесьці ягоную генэалёгію, законы разьвіцьця і магчымыя наступствы.

Такім чынам, два гэтыя выданьні даюць прыклады дзвюх магчымых мадэляў успрыняцьця і інтэрпрэтацыі рэвалюцыі – той, якая была, але таксама і той, якая будзе альбо можа быць. Для адных рэвалюцыя ёсьць экзыстэнцыйнай падзеяй, якую трэба перажыць, прапусьціць праз сэрца, якая адбываецца ў сфэры ідэальнага і эмацыйнага, у нематэрыяльнай сфэры. Сродкам інтэрпрэтацыі ў гэтым выпадку робяцца пачуцьці, асабісты досьвед, які суадносіцца з каштоўнасьцямі і індывідуальным сьветаадчуваньнем – і выпрабоўваюцца праз іронію і гумар. Для іншых рэвалюцыя ёсьць рацыянальнай зьявай, якую трэба зразумець, вытлумачыць і зьвесьці да рацыянальнага кораня – зь невыносна сур’ёзным выразам твару. Для гэтых сродкам інтэрпрэтацыі зьяўляецца розум, норма і, урэшце, аб’ектыўны закон грамадзкага разьвіцьця.

Дзьве прапанаваныя мадэлі могуць быць скарыстаныя ня толькі для тых маштабных грамадзкіх пераўтварэньняў, што ўжо адбыліся, але і для будучых падзеяў. У тым ліку інтэрпрэтацыя праз пачуцьці ды каштоўнасьці разам з інтэрпрэтацыямі праз розум і навуку могуць быць сродкамі прадказаньня, плянаваньня і вытлумачэньня той рэвалюцыі, якая можа ў будучым годзе адбыцца ў нас, у Беларусі.

РЭВАЛЮЦЫЯ ЯК ГУЛЬНЯ: ДЗЯКУЙ БОГУ, НЕ МАНАГРАФІЯ

Кожнаму журналісту хочацца стаць пісьменьнікам. Для паважаных зуброў савецкай журналістыкі выслоўе «Кіну ўсё і засяду пісаць раман» было правераным сродкам шантажаваньня калегаў, узьняцьця ўласнай самаацэнкі і сродкам выбіцьця лепшых ганарараў – але таксама гэта было праявай патаемнай мары пра ляўры сапраўднага прыгожага пісьменства. Час зьмяніўся – і вось ужо стандарты заходняй журналістыкі прыйшлі на нашу частку сушы. Цяпер ужо той альбо іншы журналіст паміж зацемкамі, рэпартажамі і фэльетонамі возьме дый ціскане том уласнага «выбранага»,

зноў жа фэльетоннага альбо апісальнага характару. Журналісты пішуць кнігі, зацьмяваючы публічных палітолягаў, і робяцца «ўладарамі думак», фаварытамі выдаўцоў у Расеі. Аднак кніжка Калесьнікава незвычайная ў гэтым шэрагу.

Андрэй Калесьнікаў – выбітная постаць на расейскім журналісцкім пэйзажы. Палітычны аглядальнік выдавецкага дому «Камэрсант», ляўрэат узнагародаў «Прэс-эліта» і «Залатое пяро Расеі», намінант прэміі імя Андрэя Сахарава за цыкль артыкулаў пра захоп закладнікаў у школе ў Бэслане, Калесьнікаў уваходзіць у гэтак званы «крамлёўскі пул», а гэта значыць, мае вышэйшы дазвол на асьвятленьне жыцьця пуцінскага «двара». Дзякуючы гэтай акалічнасьці ён атрымаў магчымасьць напісаць дылёгію «Я Пуціна бачыў» і «Мяне Пуцін бачыў», якая прынесла яму шырокую вядомасьць. Надалей спрытны журналіст новай фармацыі разьвіў камэрцыйны посьпех, хуценька выдаўшы працяг гэтак званых «крамлёўскіх хронік» – кнігі «Ўладзімер Пуцін: паміж Эўропай і Азіяй», «Уладзімер Пуцін: скутыя адным ланцугом», «Уладзімер Пуцін: элітнае падразьдзяленьне» і «Роўнааддаленьне алігархаў». На сёньня апошнім томам сэрыялу бэстсэлераў зьяўляецца тоўсты зборнік-омнібус дакумэнтальных нарысаў «Пабачыць Пуціна і памерці». У нізку крамлёўскіх хронік чытач уключаецца, як у мыльны сэрыял на тэлебачаньні, захапляючыся тонкімі назіраньнямі і іранічным поглядам аўтара.

За гратэскным капіяваньнем назваў папулярных кніжных сэрыялаў гэты цыкль заклаў асновы сучаснага аналітычнага дыскурсу ў Расеі. Менавіта Калесьнікаў разам з шэрагам іншых журналістаў сфармаваў канон расейскай палітычнай журналістыкі пачатку XXI ст., у якой псяюга па мянушцы Коні мае ўплыў ня меншы за прэм'ераў, дзе Лукашэнка ўспрымаецца ў катэгорыях падкрэсьлена асабістых і мянуецца амаль выключна як «бацька», дзе зьмена інтэр'еру ў кабінэце кіраўніка дзяржавы ёсьць падзеяй больш значнай, чым абуральная адмена сацыяльных ільготаў для чвэрці насельніцтва краіны і «газавая вайна» зь Беларусьсю. Парадаксальна, але частка беларускіх аглядальнікаў з задавальненьнем капіюе гэты стыль апісаньня палітычнай рэчаіснасьці, калі гаворка вядзецца пра беларуска-расейскія

адносіны. Нястача інфармацыі па праблеме прымушае зьвяртацца да расейскіх крыніцаў, і гэта нармальна, аднак капіяваньне пры гэтым зусім недарэчнай мэтадалёгіі ня робіць гонару нашым аналітыкам.

Падчас Памаранчавай рэвалюцыі Калесьнікаў паехаў у Кіеў, некалькі тыдняў працаваў там, быў у гушчы падзеяў, сустракаўся з удзельнікамі і правадырамі Майдану. Да рэвалюцыі, дзякуючы набліжанасьці да Крамля, ён быў відавочцам разьвіцьця ўкраінскага сцэнара падчас сустрэчаў лідэраў СНД. Пасьля рэвалюцыі журналіст зрабіў шэраг працяглых інтэрвію з асноўнымі пэрсанажамі ўкраінскай палітычнай сцэны, уключна з прэзыдэнтам Юшчанкам. Шматлікія ягоныя артыкулы друкавала «Українська правда». Такім чынам, пасьля расповедаў пра тое, як Калесьнікаў з Пуціным бачылі адзін аднаго, Калесьнікаў нарадзіў шэдэўр іншага жанру – як Калесьнікаў бачыў рэвалюцыю. Замест хронікі нэаімпэрскага жыцьця расейскае палітычнае клясы выйшаў шэдэўр разгорнутага рэпартажу, вельмі асабістага, аднак, адначасова, вельмі маштабнага. Падзея была настолькі велічная, што самы сьціслы выклад уражаньняў відавочцы, а тым больш далучанага да палітычных «кухонных кабінэтаў» журналіста, дазваляе запоўніць старонкі надзвычай цікавымі нататкамі.

«Першы Ўкраінскі. Нататкі зь перадавой» прэзэнтаваліся ў Расеі і Ўкраіне як першая кніга пра Памаранчавую рэвалюцыю. Дзеля бібліяграфічнай справядлівасьці заўважым, што першым кніжным выданьнем пра рэвалюцыю была ўсё ж кніга Міхала Слабашпіцкага «Пэйзаж для Памаранчавай рэвалюцыі» . Кніжка ўкраінскага пісьменьніка таксама блізкая да жанру разгорнутага рэпартажу, аднак літаратурнай падзеяй альбо бэстсэлерам яна не зрабілася нават у межах Украіны. А вось твор Калесьнікава зь ягонымі інтэрвію з усімі выбітнымі асобамі тагачаснай палітычнай сцэны, а таксама назіраньнямі за павадкамі прэзыдэнтаў краінаў СНД аказаўся прывабным і для аматараў «смажанага», і для знаўца палітычнай мэмуарыстыкі, і для прыхільніка «рабіць высновы па першакрыніцах».

Асноўнай задачай аўтара было «паказаць, што я бачыў». Ён не будуе гіпотэзаў і працуе ў жанры рэпартажу, які не прадугледжвае «глыбокай аналітыкі», а хутчэй працягвае тыя тысячы інфармацыйных паведамленьняў і артыкулаў, якія зьяўляліся ў газэтах усяго сьвету падчас Памаранчавай рэвалюцыі.

Кніжку Калесьнікава вылучае найперш стыль. Гэта іронія маленькага чалавека, які апынуўся ў віхуры гістарычных падзеяў – Калесьнікаў, зразумела, зусім не «маленькі чалавек», але таленавіта грае гэтую ролю, нават пры расповедзе аб сустрэчах і сутыкненьнях з кіраўнікамі дзяржаваў. Зрэшты, любы чалавек на тле гістарычных падзеяў робіцца маленькім – а калі ня робіцца, калі яго перапаўняе адчуваньне велічы моманту, адчуваньне творцы гісторыі, то ягоную постаць можа лёгка зьніштожыць зьедлівая іронія. Так, на старонках «Першага Ўкраінскага» зьнішчаюцца ня толькі ўпалы Кучма і «двойчы несудзімы» Януковіч разам са старшынямі выбарчых камісіяў на ўсходзе Ўкраіны, што занадта старанна фальсыфікавалі вынікі выбараў. У іранічным ключы запісаныя і размовы з жыхарамі намётавага мястэчка на Майдане, з правадырамі рэвалюцыі, з асноўным суразмоўцам аўтара Пятром Парашэнкам, з «багіняй рэвалюцыі» Юліяй Цімашэнкай (заўвагі пра касу – *sine qua non* для кавалку тэксту, што быў апублікаваны раней у часопісе «ELLE»), і нават з самім прэзыдэнтам Віктарам Юшчанкам. У абодвух выпадках гэтая іронія нязлая, поўная трапных назіраньняў. Гэта – стратэгія ўспрыняцьця таго, што адбываецца падчас рэвалюцыі, успрыняцьця праз гумар.

Гаворачы пра «нязлобную» іронію ў кніжцы Калесьнікава, мы сьцьвярджаем, што ў тэксьце дамінуе не «рытарычная іронія», пакліканая пераканаць чытача. Тут мы маем справу зь іншым відам іранічнага тэксту – іроніяй гульнёвай, праектальнай. У гэтым матэрыяле іронія грае ролю ня сродку пераканаьня, а сродку дэманстрацыі агульнай хаатычнасьці і неўпарадкаванасьці падзеяў, сродкам захаваньня зьвязнасьці сюжэту пры адсутнасьці трывалай сюжэтнай лініі ў віхуры драматычных палітычных пераўтварэньняў. Сюжэт рэвалюцыі, такі зьвязны ў навукова-гістарычнай афіцыйна санкцыянаванай

інтэрпрэтацыі, на індывідуальным, нізавым узроўні непазьбежна набывае рысы абсурду і можа быць адэкватна апісаны толькі пры дапамозе іранічных мэтадаў. У гэтым сэнсе кніжка Калесьнікава дае больш поўную, хоць і неадназначную і выключна індывідуальную веду пра рэвалюцыю з рознаўзроўневасьцю яе падзеяў, чым усёабдымныя канцэпцыі з навуковага зборніка.

Іронія – гэта тое, чаго так не стае беларускаму палітычнаму дыскурсу. Ён цяпер занадта сур'ёзны, на дзіва сур'ёзны, калі ўлічваць рэальнае стаўленьне беларусаў да ўлады і апазыцыі. Злой рытарычнай іроніяй прасякнутыя выступы Лукашэнкі – носьбіты палітычнай альтэрнатывы адказваюць яму тым самым.

У «Першым украінскім» перад намі разгортваецца як бы нізка карцінак, падобная да гераічнага коміксу. Хтосьці перамагае, хтосьці апынуўся зьнізу, але зьбірае сілы і зноў паўстае да змаганьня. Карцінкі зьмяняюць адна адну. Вось, здаецца, Юшчанка пераламіў неспрыяльную для яго сытуацыю падчас перадвыбарнай гонкі. Вось Лукашэнка першы сярод эсэнгоўскіх прэзыдэнтаў, як Піфія, прадракае Ўкраіне рэвалюцыю (Калесьнікаў сьцьвярджае, што менавіта беларускі правіцель першым вымавіў гэтае слова публічна!). Вось Лукашэнку выстаўляюць са сьвяткаваньня гадавіны вызваленьня Ўкраіны ў Кіеве, бо там ён перашкаджае ўсім. Вось Юлія Цімашэнка робіць дзёрзкую вылазку ў сэрца «апанэнта», у Данбас. Вось камэдыя перадвыбарнай кампаніі «прыбраць» Януковіча. Вось Януковіч падае, «забіты» кінутым у яго яйкам – ён думаў, што гэта той самы сплянаваны «замах на жыцьцё» кандыдата, які мусіў узьняць ягоны рэйтынг. Сьцяг Перамогі вязуць ва Ўкраіну для выкарыстаньня ў мэтах агітацыі – і здаюць яго ў багажнае аддзяленьне. Пуцін на прапанову наведаць Украіну другі раз паміж першым і другім турамі чухае патыліцу: «Нахабства, вядома. Але давайце паспрабуем». Вось салдацікі ходзяць грэцца ў будынак, захоплены пратэстоўцамі. Іншыя коміксавыя будні Майдану. Вясёлае жыцьцё журналістаў у перадвыбарным прэс-клюбе, прыгоды ў пошуках навінаў, калі навінаў няма (было падчас доўгага стаяньня на Майдане і такое!). Вось аўтар

выпадкова трапляе на «тайную вячэру» ў лягеры Віктара Януковіча – там яго прымаюць ці то за дробнага партбоса Партыі Рэгіёнаў, ці то за расейскага паліттэхноляга, ці то за «мэнэджара па каве». Кантрасныя назіраньні за бытам двух штабоў і ўражаньні ад вуліцаў рэвалюцыйнага Кіева. Сустрэчы з шараговымі ўдзельнікамі рэвалюцыі перамяжаюцца інтэрвію зь яе правадырамі і важнымі палітычнымі суб'ектамі.

Але труцяць Юшчанку – і чытачу робіцца папросту страшна, нягледзячы на перадачу падзеяў словамі з паведамленьняў прэсы. І сярод цытатаў з навінавай стужкі – словы самога Юшчанкі:

Такога болю не было ніколі. Я ня мог спаць. ...Але нельга было нічога адмяняць. Адзін чалавек звоніць: «Заўтра зьбіраем агромны мітынг у Кіеве...» На мяне ціснулі – ты мусіш быць там. Яны ня ведалі майго стану. Тэлефануе Парашэнка: «Ты што, жартуеш? Выбарчая кампанія ж ідзе! Колькі ты яшчэ там будзеш ляжаць?» Трэ было вяртацца.

Чалавек пад ціскам абставінаў, пад ціскам палітычнага абавязку – таксама «малы чалавек». І ўражаньні відавочцаў:

Ірына Герашчанка, прэс-сакратарка прэзыдэнта Ўкраіны:

– Я вас пабачыла, калі вы вярталіся зь Вены, раней за іншых. Іду, сьлёзы цякуць па твары. Падыходжу да нашых на мітынгу. Яны кажуць: «Ну чаго ты плачаш?» «Бо Віктара Андрэевіча пабачыла...» – «Ды кінься, усё будзе добра!» А пасьля, калі вы сышлі са сцэны пасьля мітынгу, бачу – у іх ва ўсіх сьлёзы на шчаках.

Гэта падобна на тое, як Умбэрта Эка апісвае гістарычныя падзеі часоў крыжовых паходаў. У прынцыпе, відавочцы часта пішуць у гэткім ключы. Веліч моманту яны памятаюць, ды вось асабістыя адчуваньні яе засьцяць – і ў гэтым каштоўнасьць гэткіх замалёвак. Праца памяці – гэта ня толькі працэс сэлекцыі падзеяў і дэталяў, але і іх пэўнае канструяваньне, сюжэтнае

альбо ацэначнае. Падчас гэтага працэсу адбываецца схаваная падробка падзеяў, іх падгонка пад створаную схему і інтэрпрэтацыя. Гэта справядліва для любога гістарычнага аповеду. Аднак успаміны відавочцаў па гарачых сьлядох застаюцца ў гэтым сэнсе найбольш шчырай мадэльлю інтэрпрэтацыі гістарычнага, але пакуль яшчэ не аддаленага ў часе мінулага. Агульнапрынятыя, калектыўныя, грамадзкія ўяўленьні пра рэвалюцыю непазьбежна ёсьць вынікам кагнітыўнага кампрамісу, у той час як прыватныя ўспаміны пра яе як асабіста перажытае ёсьць больш цэльным і зручным для індывідуальнага спажыванья сродкам здабыцьця веды. У гэтым палягае прычына посьпеху гістарычнай мэмуарыстыкі – у гэтым каштоўнасьць і кніжкі Калесьнікава. На жаль, яна непазьбежна сыдзе ў нябыт пад націскам інтэрпрэтацыяў-узгадненьняў, інтэрпрэтацыяў-тлумачэньняў, навуковападобных і палітычна карэктных канструяваньняў гісторыі. Лёс бэстсэлеру відавочны – яго забудуць, як забываецца ўсё сэнсацыйнае і злабадзённае пісьменства. А недзе празь пяцьдзясят гадоў – зноў адкрыюць, перавыдадуць разам з навуковым камэнтаром і прэзэнтуюць як незаангажаваны і індывідуальны расповед пра тое, што адбывалася, як сьведчаньне відавочцы.

Выданьне карыснае для ўсіх беларусаў – і прыхільнікаў і праціўнікаў будучай беларускай рэвалюцыі. Яно дае прыклад таго, як з найменшымі маральнымі выдаткамі сустрэць той дзень, калі сьвет побач з табой рушыцца і на волю выходзіць нешта такое, пра што ніхто ня думаў і што ня мроілася ані наймітам-паліттэхнолягам, ані актывістам міжнароднага рэвалюцыйнага руху. Расслабцеся – рэвалюцыйныя дэманы прыйдуць нечакана і ня будуць падобныя да сваёй папярэдняй выявы. Беларусь – не Ўкраіна. І не Кыргызстан, на шчасьце.

Кніжка Калесьнікава стала бэстсэлерам, выдатна прадавалася ў Расеі і Ўкраіне. У Беларусі – калі-нікалі траплялася на кніжных развалах, зрэдку была ў непадкантрольных Міхаілу Арду прыватных распаўсюднікаў і зусім не патрапіла ў гандаль нацыянальнага маштабу. Пра магчымасьць беларускага выданьня казаць залішне. Нічога – праз колькі месяцаў спрытны Калесьнікаў, напэўна, без асаблівых цяжкасьцяў

напіша «Другі Беларускі – імпэрыя наносіць удар у адказ». Ад нас залежыць, які будзе сюжэт у будучай кніжкі пра беларускую рэвалюцыю 2006 г. – першыя падразьдзелы гэтай дакумэнтальнай аповесьці ўжо напісаныя, працяг будзе.

Скручаны ў рольку гіганцкі плякат з выявай аднаго з кандыдатаў, ад якога пратаганіст «Першага Ўкраінскага» імкнецца пазбавіцца, – сымбалічны вобраз. Ён годны таго, каб быць візуалізаваным ня толькі як сымбаль абсурду любой рэвалюцыі, але і як сымбаль невядомасьці, якую для нас рыхтуе будучая рэвалюцыя. Мы так і не даведваемся, які зь Віктараў намаляваны на скручаным плякаце.

АД ДАКУМЭНТАЎ ДА ВЭРСІЯЎ, ПРАЗ СТРАХ І ЗАХАПЛЕНЬНЕ

«Аранжавая рэвалюцыя: вэрсіі, хроніка, дакумэнты» была першай спробай грунтоўнага аналізу, першай сур'ёзнай кнігай пра той самы прадмет. Зборнік укладзены вядомым палітолягам, дырэктарам кіеўскага Інстытуту палітычных дасьледаваньняў і канфлікталёгіі Міхайлам Пагрібінскім, які шмат часу працаваў палітычным кансультантам шэрагу дзяржаўных інстытуцыяў падчас праўленьня Кучмы.

Калесьнікаў, як спрытны журналіст, апярэдзіў сур'ёзных знаўцаў палітычных раскладаў і гадальнікаў на кававай гушчы роўна на месяц. Але й аналітыкі рванулі як на стомэтроўку – падрыхтаваны за тры месяцы аналітычны кампэндыюм сьведчыць ня толькі пра нечуваную значнасьць і злабадзённасьць тэмы, але і пра імкненьне аналітыкаў да самаапраўданьня. Як заўжды, палітыкааналітыкі аказаліся няздольныя прадказаць тое, што па сваіх памерах перавышае ўсё, з чым яны сутыкаліся раней. Як крэмлязнаўцы ня здолелі прадбачыць перабудову (хоць і разглядалі ў мікраскоп перамяшчэньні набліжаных да чарговага генсека партайгеносэ на трыбуне Маўзалею), так і знаўцы постсавецкай палітычнай прыбіральні не прагназавалі падзеі, што ўскалыхнула ўсю постсавецкую прастору. Як ранейшыя экстрапаляцыі грузінскай Рэвалюцыі ружаў зусім не прадвызначылі эвэнтуальную «каштанавую рэвалюцыю» (хто ўжо памятае цяпер гэты выраз?), так і спробы перанесьці памаранчавы досьвед ня будуць

пасьпяховыя. Хатняе заданьне для палітолягаў: не прадказваць, куды перанясецца ветрам «памаранчавы вірус», а вынайсьці законы, паводле якіх гэтая зьява паўстае ў той альбо іншай краіне. У гэтым зборніку выкладзеныя супярэчлівыя вэрсіі па гэтай праблеме.

Але хопіць кпінаў на адрас палітаналітыкаў і тэхнолягаў. Яны памыляюцца не часьцей за мэдыкаў – аднак, на шчасьце, іх памылкі ня цягнуць за сабою такіх цяжкіх наступстваў.

Накладам тысяча асобнікаў ва Ўкраіне і тры тысячы ў Расеі, аздоблены прадмовай Глеба Паўлоўскага з самаапраўданьнем і крыўдамі на неразумных украінскіх замоўцаў, выйшаў гэты зборнік тлумачэньняў і апалёгіяў уласных няспраўджаных прагнозаў. Кніга сталася першай спробай спакойна разабрацца, чым жа была рэвалюцыя, як яе асэнсаваць і ўбудаваць у тэорыі разьвіцьця пераходнага грамадзтва. Яна сталася знакам уваскрашэньня транзыталёгіі – тэорыі, пахаваньне якой было ўрачыста зьдзейсьненае напачатку гэтага стагодзьдзя. Кніга каштоўная як зборнік вэрсіяў – менавіта слова «вэрсіі» зьяўляецца ключавым у назьве ўкраінскага выданьня. Гэтае слова падкрэсьлівае неадназначнасьць, кантравэрсійнасьць меркаваньняў палітолягаў і ўкраінскага грамадзтва па праблеме. У расейскім жа варыянце кніжка кажа толькі пра адну «вэрсію», украінскую, у той час як на самай справе на яе старонках пераважаюць менавіта расейскія аўтары. Мяркуючы па зьмесьце прадмовы да расейскага выданьня, прыдворныя расейскія палітолягі рыхтавалі гэты том як нешта ў кшталце зборніку «Крытыка буржуазных тэорыяў палітычнай эканоміі», зборніка аблудаў ва ўмовах, калі афіцыйная пазыцыя зьяўляецца адзіна магчымай і адзіна правільнай. Таму дыскусіі расейскіх палітолягаў-публіцыстаў і іхная какетлівая цікаўнасьць да носьбітаў палітычнай альтэрнатывы (у тым ліку ў Беларусі) не схаваюць ад нас відавочнага – ні пра якую карэкцыю мэтаў расейскай эліты не вядзецца нават гаворкі. Зьмена тактыкі, мэтадаў магчымая – аднак мэта павелічэньня расейскага ўплыву і адбудовы імпэрыі застаецца нязьменнай. Для расейцаў дасьледаваньне і пільная ўвага да рэвалюцыйных працэсаў – спроба не дапусьціць паўтарэньня іх на падкантрольнай тэрыторыі, паводле прынцыпу «вучымся на

чужых памылках».

Як мы казалі, зборнік быў выдадзены адначасова ў Расеі (выдавецтва «Эўропа») і Ўкраіне (выдавецтва «Оптыма»). Маскоўскі выдавец, блізкі да Фонду эфэктыўнай палітыкі, стала выказвае цікавасьць да «рэвалюцыйнай» літаратуры, выдае кніжкі кшталту «Рэвалюцыя.com: Асновы пратэстнай інжынэрыі». Аднак «Аранжавая рэвалюцыя: вэрсіі, хроніка, дакумэнты» была зьмешчаная ў межах серыі «Эўраўсход» адразу пасьля зборніка артыкулаў «Расея і «санітарны кардон». А наступнае выданьне ў гэтай сэрыі – кніга нашага суайчыньніка Юр'я Шаўцова «Аб'яднаная нацыя: Фэномэн Беларусі» з аналізам «зусім не рэвалюцыйнай Беларусі». Цікавая пасьлядоўнасьць рэдактараў сэрыі з двухсэнсоўным назовам «Эўраўсход» застаўляе прызадумацца – ці то развагі Шаўцова ляжаць у адным рэчышчы з памылкамі маскоўскіх экспэртаў, ці то Масква проста нарэшце зацікавілася, што там адбываецца ў белай пляме паміж Масквой і Бэрлінам. А раптам акурат там, у палескіх балотах, вынайшлі лекі ад памаранчавай заразы. Прадмовы Паўлоўскага да абедзьвюх кніг ствараюць уражаньне, што той цяпер ужо прааналізаваў памылкі ўкраінскай кампаніі і... разьлічвае цяпер не дапусьціць іх больш нідзе на постсавецкай прасторы. У тым ліку празь перайманьне лукашэнкаўскай мэтодыкі.

Усім удзельнікам зборніка было прапанавана адказаць на наступныя пытаньні: прычыны палітычнага крызісу ва Ўкраіне і падставы для масавых выступаў; пабуджальныя матывы ўдзельнікаў масавых акцыяў; мэты і мэтады арганізатараў Памаранчавай рэвалюцыі; легітымнасьць дзеяньняў бакоў у канфлікце; уплыў вонкавых фактараў на ўкраінскія падзеі; ці зьяўляецца Памаранчавая рэвалюцыя палітычнай рэвалюцыяй у клясычным разуменьні гэтага слова; у чым падабенства яе з аксамітнымі рэвалюцыямі 1980–1990-х і ў чым адрозьненьне; папярэднія вынікі рэвалюцыі і магчымыя наступствы для краінаў былога Савецкага Саюзу.

Няма сэнсу пераказваць адказы паважаных аўтараў. Яны збольшага трымаюцца «залатой сярэдзіны», будуючы тэорыі наконт прычынаў мінуўшчыны і асьцярожна выказваючыся

наконт будучыні. Так, расейскія аўтары (А. Мігранян, А. Мошэс, с. Маркаў ды іншыя) ставяцца да рэвалюцыі хутчэй скептычна. Занадта яны ў яе ўвязаліся, каб забыцца на паразу так хутка. «Рэвалюцыі своечасова не далі ў морду», – з абурэньнем цытуе кіеўская «Критика» словы Глеба Паўлоўскага. Але гэта экстрэмальная пазыцыя – большасьць расейскіх аўтараў дэманструе пазыцыю «над схваткай», скептычна назіраючы за рэвалюцыяй і ляніва адзначаючы непрадказальнасьць ейных наступстваў. Прэзыдэнт фонду «Палітыка» Вячаслаў Ніканаў:

Ці сапраўдная гэта рэвалюцыя, мы даведаемся ўжо хутка, па тым, ці пачне яна, як кожная сапраўдная рэвалюцыя, паглынаць уласных дзяцей. Напрыклад, ці ня стане Юлія Цімашэнка чымсьці нагадваць таварыша Троцкага?

Іхныя ўкраінскія апанэнты (М. Пагрэбінскі, А. Літвіненка, В. Малінковіч, А. Папоў, М. Стрыха) таксама не дэманструюць аптымізму наконт пэрспэктываў рэвалюцыйнага дзяржаўнага будаўніцтва. Гэта тлумачыцца тым, што да працы над зборнікам з украінскага боку былі запрошаныя пераважна тыя, хто не спрычыніўся да Майдану. Аднак і гэтыя назіральнікі, незалежна ад іхных палітычных перакананьняў, ня могуць не прызнаць вызначальнага характару тых падзеяў для фармаваньня ўкраінскай нацыі. Для іх відавочна выключна важнае значэньне рэвалюцыі для сьвядомасьці ўкраінскага народу нават без увагі на яе палітычныя наступствы. Яны таксама менш схільныя абсалютызаваць ролю палітычных тэхналёгіяў у рэвалюцыі і выступаюць супраць перабольшваньня значэньня замежных фактараў. Максім Стрыха, адзін зь лідэраў Украінскай рэспубліканскай партыі «Сабор», піша:

Мае спадзяваньні зьвязаны, перш за ўсё, з тым, што «Памаранчавая рэвалюцыя» паказала: украінскі народ зьяўляецца больш мудрым, больш ахвярным і адважным, чым усе мы маглі меркаваць яшчэ тры месяцы таму. А паколькі прэса, урэшце, стала свабаднейшая, суды – справядлівейшыя, а палітыкі –

чалавечнейшыя, гэты народ абавязкова будзе мець лепшую будучыню.

Вось так: папросту эліта памылялася ў сваім народзе, звычайная гісторыя. А народ выправіў гэтую памылку – частка эліты была гэтым пакрыўджаная, аднак не прызнаць магутнага мабілізацыйнага фактару народнага пратэсту і яго ўплыву на станаўленьне нацыі ня ў стане нават гэтая частка эліты. Чамусьці мне гэтая вэрсія (сапраўды «ўкраінская вэрсія») падабаецца болей, чым змрочныя кансьпіралягічныя выкрыцьці, тэорыі пра бойку мільянэраў супраць мільярдэраў альбо двубой перадвыбарных бюджэтаў і паліттэхнолягаў.

Недарэчна было б крытыкаваць тэорыі, выкладзеныя ў зборніку. Яны збольшага грунтоўна сфармуляваныя, унутрана несупярэчлівыя, аднак тлумачаць толькі праявы рэвалюцыі, не даючы адэкватнага тлумачэньня самой яе сутнасьці. Тым, хто цікавіцца сутнасьцю, лепш зьвярнуцца да кніжкі Калесьнікава, дзе абсурд і веліч моманту адлюстраваныя найлепшым чынам. А ў паліталягічным зборніку найбольш каштоўны матэрыял – падрабязная храналёгія падзеяў, вынікі трох тураў галасаваньня з разьбіўкай па абласьцях, эканамічная статыстыка, матэрыялы Цэнтральнай выбарчай камісіі, Вярхоўнага суду, Вярхоўнай рады, дэкрэты Камітэту нацыянальнага паратунку, дамоўленасьці круглых сталоў і перамоваў з удзелам замежных пасярэднікаў, пастановы органаў мясцовага самакіраваньня, заявы партыяў, штабоў і прэтэндэнтаў на прэзыдэнцкую пасаду, мэмарандумы назіральнікаў за выбарамі. У гэтых тэкстах можна знайсьці шмат цікавага – і таксама актуальнага для тых, хто задумаў правярнуць нешта падобнае ў Беларусі. Для гэтых людзей гэтыя фактычныя матэрыялы будуць карысьнейшыя, чым артыкулы, разьмешчаныя ў зборніку.

НАПЕРАД, ДА ПЕРШАГА БЕЛАРУСКАГА?

І адна, і другая кніга сталі бэстсэлерамі – кожная ў сваім жанры. І абодва гэтыя пасьпяховыя выдавецкія праекты

недаступныя шырокаму беларускаму чытачу. Аднак яны цікавыя для беларусаў – ня ў меншай ступені, чым для расейцаў. Досыць сказаць, што на рэвалюцыйным Майдане было больш беларусаў і больш беларускіх сьцягоў, чым нават на значных акцыях у беларускай сталіцы. Спэцыфіка Беларусі ў кантэксьце хвалі каляровых рэвалюцыяў прымушае нас цікавіцца працэсамі ў межах гэтай хвалі, параўноўваць Беларусь з суседзямі і… разумець уласнае непадабенства да іх.

Тое, што для ўкраінцаў ужо адбылося і патрабуе вытлумачэньня з мэтай пераадоленьня пераносу з падзеяў парадку дня ў шуфляду «найноўшай гісторыі» – тое для беларусаў уяўляецца бліжэйшай будучыняй, якая, магчыма, пойдзе, а магчыма, і ня пойдзе па «памаранчавым сцэнары». Капіяваньне і сымуляцыя падзеяў у суседніх краінах і шырэй, пастаноўка беларускага ў залежнасьць ад вонкавых фактараў – магчыма, адна з галоўных хібаў нашага палітычнага жыцьця. Гэтая хіба – звычайная для новых малых нацыяў «хвароба росту». Аднак толькі ў пераадоленьні гэтай хваробы, у асэнсаваньні і ўсьведамленьні ўласнай суб'ектнасьці палягае і здабыцьцё гэтай самай суб'ектнасьці ў гістарычным маштабе. Кепска, што непадабенства і вызначэньне ўласна беларускага шляху цяпер, хутчэй, ёсьць уласьцівасьцю дзейнай беларускай улады, а не дэмакратычнай альтэрнатывы. У гэтым можа быць прычына анталягічнай непрымальнасьці будучай спробы каляровай рэвалюцыі для беларускага народу. Альбо наадварот, вызначэньне беларускай суб'ектнасьці і будзе беларускай рэвалюцыяй.

Для расейцаў таксама будучая рэвалюцыя ўяўляецца рэальнасьцю. Аднак перад імі не стаіць пытаньне таго, як ставіцца да гэтай пэрспэктывы. Гісторыя Расеі ведае шмат рэвалюцыяў пасьпяховых і правальных. Расейцам не прывыкаць да бунтаў і паўстаньняў – пагатоў, нацыянальныя ўскраіны імпэрыі заўжды дымяцца пратэстам, які звыкла разгортваецца па гвалтоўным сцэнары. Сярод расейскіх рэвалюцыянэраў і антырэвалюцыянэраў няма адзінства ні па адным з пытаньняў стаўленьня да будучага рэвалюцыйнага крызісу. Але і першыя, і другія, у прынцыпе, усьведамляюць, што расейская рэвалюцыя – гэта заўжды кроў і распад імпэрыі на дымныя аскепкі. Таму

для расейцаў і неактуальныя рэфлексіі па пытаньні будучага стаўленьня да рэвалюцыйнай спробы – усе яны разумеюць, што расейская негвалтоўная рэвалюцыя стане пралёгам да будучай грамадзянскай вайны, так ужо збудаваны расейскі сьвет. Беларусь жа да сёньня ня ведала ўласнай, нацыянальнай рэвалюцыі – і менавіта яна цяпер грукаецца ў дзьверы.

Беларусы бачаць рэвалюцыйную пэрспэктыву, чуюць пра яе з тэлевізара, ад кіраўніка дзяржавы, ад спадарожнікаў у грамадзкім транспарце і калегаў на працы, чытаюць на старонках афіцыйнай і апазыцыйнай прэсы. Але стаўленьня да гэтага выпрацаваць ня могуць: яны, у прынцыпе, незадаволеныя тым, якая атмасфэра пануе ў грамадзтве... але выходзіць супраць улады на плошчу ня хочуць. Яны, у прынцыпе, і ня супраць зьмены ўлады... але задаюць пытаньне «А хто замест яго?». Яны, у прынцыпе, нэгатыўна ставяцца да рэвалюцыі... але ня супраць, калі нехта скіне Лукашэнку. У адным няма сумневаў – нашая рэвалюцыя ня будзе «Другім Украінскім» – гэта будзе беларускі шлях. І неабавязкова гэты шлях будзе сфармуляваны ў межах таго рэвалюцыйнага праекту, што разгортваецца цяпер у межах электаральнай кампаніі.

Існуюць два аспэкты рэвалюцыйнасьці – замкнуўшыся ў межах рацыянальнай мадэлі, заплюшчыўшы вочы на пытаньні пачуцьцяў, эмоцыяў і каштоўнасьцяў, рэвалюцыянэры могуць патрапіць у пастку першага працоўнага году пасьля студэнцкага навучаньня: здаецца, усё робіш, як напісана ў падручніку, згодна з рэцэптамі – але плёну гэта не дае. Індывідуальныя фактары і пытаньні рэвалюцыйнага духу не бываюць на апошнім месцы ў пасьпяховых рэвалюцыйных стратэгіях і плянах. Пытаньні лягістыкі («колькі тонаў улётак варта даставіць у аддалены райцэнтар Y») важныя, але ж ня менш важныя і праблемы стварэньня эмацыйнай рэвалюцыйнай сытуацыі, фармуляваньня рэвалюцыйных каштоўнасьцяў.

Цяпер відавочна, што падзеі ва Ўкраіне аказалі значны ўплыў на Беларусь – і збольшага гэты ўплыў ня быў пазытыўным. Мы далёкія ад думкі, што працэс закручваньня гаек у Беларусі абумоўлены толькі Памаранчавай рэвалюцыяй. Аднак яна надала гэтаму працэсу новую ступень легітымнасьці як унутры

краіны, так і звонку. Ніхто не апраўдвае палітычных рэпрэсіяў у Беларусі – аднак іх ужо звыкла тлумачаць: «Ну, Лукашэнка ж змагаецца супраць рэвалюцыйнай пагрозы, ратуе сябе, ганяе рэвалюцыянэраў...» І гэтая інтэрпрэтацыя разьвязвае рукі для ўсё больш жорсткіх рэпрэсіўных захадаў і забясьпечвае падтрымку з Усходу для любых выбрыкаў.

Іншага кшталту нэгатыўны ўплыў рэвалюцыя аказала на беларускую палітычную апазыцыю. Канстатуючы немагчымасьць зьмены ўлады праз выбары, беларуская апазыцыя ўчапілася за варыянт разгортваньня падзеяў па ўкраінскім сцэнары як за мадэль для перайманьня. Аднак пераймаючы сам падыход, ня варта забывацца, што ў Беларусі вырашаецца задача зьмяненьня зусім іншага рэжыму. Таму мэта дасягнуць падобнага да папярэдніх рэвалюцыяў эфэкту вымагае зусім іншых сродкаў яе дасягненьня. І гаворка ня толькі пра тэхналёгіі і крыніцы фінансаваньня намётавых гарадкоў – гаворка пра саму рэвалюцыйную ідэю і пра магчымасьці актывізацыі грамадзтва. Дасягненьне рэвалюцыйнага духу і фармаваньне ідэалягічнага падмурку рэвалюцыі – вось складаныя задачы для сёньняшніх рэвалюцыянэраў. А ўжо ў рэвалюцыйных тэхналёгіях і дэфіцыту няма.

Мы мусім самі вырашаць лёс сваёй краіны, і беларуская рэвалюцыя будзе эндагенным працэсам, няхай сабе і абумоўленым агульным разьвіцьцём палітычнай сытуацыі ў рэгіёне. Украінскі ўрок мусіць быць засвоены крытычна – не як прыклад да перайманьня альбо капіяваньня, а як прыклад таго, што можа быць зроблена народам. І тады праз год маскоўскія палітолягі будуць тлумачыць неабходнасьць рэвізіі ўласнай антырэвалюцыйнай стратэгіі праз паразу ў «братняй Беларусі», а нехта з расейскіх журналістаў прадасьць выдаўцам некалькі соцень старонак пра тое, як ён езьдзіў «на рэвалюцыю» ў Менск, каб падыхаць вольным паветрам беларускай свабоды.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/01/15
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

крытыка [image]2005
ад Зтыкату
ана**лі**тыка • **крытыка** • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Джон Грэй
Зямля – круглая

ДЖОН ГРЭЙ
прафэсар лёнданскай Школы эканомікі і паліталёгіі. У сфэру яго навуковых зацікаўленьняў уваходзіць брытанская і эўрапейская палітыка, інтэлектуальная гісторыя, дарожныя філязофія і мысьленьне. Яго апошняя кніга «Al Qaeda and What It Means to Be Modern» выйшла сёлета ў жніўні.

Friedman Thomas L. *The World Is Flat: A Brief History of the Twenty-first Century*. – Farrar, Straus and Giroux, 2005. – 488 p.

1

У ідэі, што мы сталіся сьведкамі глябалізацыі, якая карэнным чынам зьмяняе жыцьцё чалавецтва, няма нічога новага. У 1848 г. яе выказалі Маркс і Энгельс у сапраўды знакамітым пасажы з «Камуністычнага маніфэсту»:

Усе трывалыя, закасьцянелыя адносіны разам са спадарожнымі ім старавечнымі ўяўленьнямі і паглядамі занепадаюць, усё наваствoранае старэе, не пасьпяваючы застыгнуць. Усё станавае і сталае шчэзла, усё сьвятое ўгнюшана, і людзі нарэшце вымушаны кінуць цьвярозы позірк на сваё жыцьцёвае становішча, на свае ўзаемадачыненьні.

Патрэба ва ўсё большых рынках збыту гоніць буржуазію па ўсёй зямлі. Усюды яна павінна ўкараніцца, усюды атайбавацца, усюды ўсталяваць сувязі.

Эксплюатуючы сусьветны рынак, буржуазія касмапалітызавала вытворчасьць і спажываньне ва ўсіх краінах. Яна навязвае ўсім народам пад пагрозай гібелі буржуазны спосаб вытворчасьці,

навязвае ім так званую цывілізацыю, г. зн. навязвае буржуазны лад. Карацей, яна стварае сьвет паводле ўласнага вобразу і падабенства.

Маркс і Энгельс не сумняваліся, што ў іх на вачох паўставаў сусьветны рынак – глябальная сыстэма вытворчасьці і спажываньня, якая не зважае на нацыянальныя й культурныя межы. Яны віталі гэтую тэндэнцыю, і ня толькі таму, што яна спрыяе прырошчваньню багацьця, але і таму, што, на іх думку, гэта дазволіла б чалавецтву пераадолець яго ранейшую разьяднанасьць. Маўляў, ува ўмовах сусьветнага рынку нацыяналізму ды рэлігіі наканавана заняпасьці. Перш чым цьвёрда ўсталюецца камуністычны лад, сьвет зьведае шмат узрушэньняў – войнаў, рэвалюцыяў і контрарэвалюцыяў. Але калі глябальны капіталізм зробіць сваю справу, у гісторыі чалавецтва распачнецца новая эра.

Амаль паўсюдна развалілася сыстэма цэнтралізаванай плянавай эканомікі, збудаваная на ўзор камуністычных ідэяў Маркса. Зьніклі і масавыя палітычныя рухі, што некалі спарадзіў і натхняў марксізм. Аднак па-ранейшаму жыве марксісцкі погляд на глябалізацыю – жыве і як ніколі квітнее ў працах Томаса Фрыдмана. Усьлед за Марксам Фрыдман пераканаы, што да глябалізацыі ўрэшце стасуецца толькі адна эканамічная сыстэма. Усьлед за Марксам ён верыць, што тая дазволіць чалавецтву выбавіцца ад войнаў, тыраніі і галечы. Да гонару Фрыдмана трэба сказаць, што ён прызнае паралелі паміж ягонымі поглядамі і Марксавымі. Ён згадвае вельмі плённую і карысную дыскусію ў Гарвардзе, калі палітоляг Майкл Сэндэл, які займаецца праблемамі супольнасьцяў, зьвярнуў увагу, што Маркс першы зразумеў: Зямля робіцца «пляскатай», як піша ў сваёй новай кнізе Фрыдман. Ён прыводзіць ёмістыя цытаты з «Камуністычнага маніфэсту» – у тым ліку і вышэйзгаданы абзац – і высока ацэньвае Марксаву здольнасьць прадбачыць будучыню. Добра, што аўтар прызнае паралелі паміж сваім разуменьнем глябалізацыі і Марксавай тэорыяй гісторыі.

Фрыдман выявіў сябе адным з найбольш уплывовых сучасных прапагандыстаў нэалібэральнае ідэі. Нэалібэралам уласьцівы

шырокі спэктар поглядаў на сацыяльна-палітычныя праблемы – ад надзвычайнага кансэрватызму Фрыдрыха Гаека да хутчэй пасьлядоўна лібэртарыянскай пазыцыі Мілтана Фрыдмана. Але ўсе яны аднадушныя ў пераканаьні, што вольны рынак – першакрыніца чалавечае свабоды. Дарма што ў некаторых сваіх працах Томас Фрыдман выказвае занепакоенасьць заганамі нерэгуляванага рынку – усё роўна ён застаецца палкім місіянэрам, які ў сваіх кнігах і калёнках у «New York Times» нястомна абвяшчае нэалібэральную веру. У ягоным разуменьні вольны рынак нясе з сабой ці ня ўсё неабходнае для існаваньня вольнага грамадзтва, дзе чалавек здольны цалкам раскрыць свой патэнцыял.

Фрыдман – фігура надзвычай уплывовая: яго погляды фармавалі мысьленьне прэзыдэнтаў, па цэлым шэрагу пытаньняў прасьвятлялі амэрыканскую палітычную эліту. Таму было б карысна выявіць, у чым ён усьлед за Марксам «блукае ў цемры». Часьцяком мяркуюць, што нэалібэралізм і марксізм – цалкам супрацьлеглыя сыстэмы ідэяў, бо за часам халоднае вайны яны знаходзіліся па розныя бакі фронту. Насамрэч яны належаць да аднаго і таго ж стылю мысьленьня і маюць багата супольных заганаў. І марксісты, і нэалібэралы пераканаьныя, што эканамічнае разьвіцьцё сілкуецца тэхналягічным прагрэсам, а грамадзтва вызначаюць эканамічныя сілы. Палітыка і культура – зьявы другасныя, часам яны запавольваюць разьвіцьцё чалавецтва, але ўрэшце ня змогуць выстаяць перад наступам новых тэхналёгіяў і ростам прадукцыйнасьці вытворчасьці.

Фрыдман адназначна падтрымлівае гэткую спрошчаную філязофію. Ён піша, што ў яго часьцяком пытаюцца, а ці ён не тэхналягічны дэтэрмініст. І з наіўнай апантанасьцю, што так прываблівае ў ягоным стылі, Фрыдман на ўвесь голас заяўляе: «Пытаньне цалкам слушнае, таму адкажу проста: *я – тэхналягічны дэтэрмініст! Прызнаю сваю віну!*» (вылучана Фрыдманам).

У тэхналягічным дэтэрмінізьме мо’ і ёсьць зерне ісьціны, але ён вядзе да небясьпечна спрошчанага бачаньня гісторыі. Яно добра відаць хоць бы з таго, як Фрыдман аналізуе распад

Савецкага Саюзу. Ён прызнае, што «адзінай прычыны не было» і працягвае:

У пэўнай меры падмурак Савецкага Саюзу, і так аслабленага ўнутранымі супярэчнасьцямі і неэфэктыўнасьцю самой сыстэмы, паеў шашаль. У пэўнай меры нарошчваньне вайсковай прысутнасьці ў Эўропе адміністрацыяй Рэйгана давяло Крэмль да банкруцтва, бо ён ня вытрымаў росту выдаткаў на ракеты. У пэўнай меры да канца камунізму спрычыніліся марныя высілкі Міхаіла Гарбачова рэфармаваць тое, што не падлягала рэфармаваньню. Але калі б мяне папрасілі назваць першы сярод роўных чыньнік, гэта, вядома, інфармацыйная рэвалюцыя, што разгарнулася ў пачатку-сярэдзіне 80-х гг. XX ст. Існаваньне таталітарных сыстэмаў залежыць ад манаполіі на інфармацыю і сілу, а праз жалезную заслону дзякуючы факсам, тэлефонам і іншым сучасным сродкам камунікацыі стала праточвацца зашмат інфармацыі.

Найбольш зьдзіўляе ў гэтым звычайным ува ўсім астатнім пераліку тое, што прапушчана. Няма ані згадкі пра ролю «Салідарнасьці» і Каталіцкае царквы ў тым, што Польшча сталася першай посткамуністычнай краінай. Ані слова не сказана пра магутныя незалежніцкія рухі, што ўзьняліся ў 80-я гг. XX ст. у балтыйскіх рэспубліках. І – што самае дзіўнае – няма згадкі пра вайну ў Аўганістане. Агульнавядома, што стратэгічная параза, нанесеная СССР узброенымі Захадам ісламістамі гэтай краіны (некаторыя зь іх уваходзілі ў арганізацыю, зь якой потым узьнікла «Аль-Каіда»), адыграла вырашальную ролю ў аслабленьні савецкай улады. Відаць, Фрыдман абмінае ўвагай гэтыя падзеі, бо яны сьведчаць пра нязьменны ўплыў рэлігіі і нацыяналізму – сілаў, якія, паводле ягонага простага, дэтэрмінісцкага сьветапогляду, павінны ўжо зьмізарнець і шчэзнуць.

Іронія гісторыі ў тым, што некаторыя найвялікшыя заганы «скрыўленага» сьветаўспрыманьня пасьля крушэньня камунізму ўспадкавалі самі пераможцы ў халоднай вайне. Нэалібэралы тыпу Фрыдмана перанялі самыя слабыя месцы ў тэорыі Маркса: пасьлядоўную недаацэнку нацыянальных і

рэлігійных рухаў ды прасталінейны погляд на гісторыю. Але яны не засвоілі, што Маркс угледзеў у капіталізьме анархічную, самаразбуральную стыхію. Ён уважаў нічым не абмежаваны рынак за рэвалюцыйную сілу, разумеў, што яго распаўсюд па сьвеце неаддзельны ад разбурэньня і гвалту. Капіталізм пераварочвае дагары нагамі грамадзтва, нішчыць цэлыя галіны прамысловасьці, лад жыцьця ды палітычную ўладу. Цяжка разьлічваць, каб гэты працэс быў мірны, і сапраўды, ён заўсёдна суправаджаецца вялікімі канфліктамі ды сацыяльнымі ўзрушэньнямі. Экспансія эўрапейскага капіталізму ў XIX ст. спрычынілася да «опійных войнаў», генацыду ў бэльгійскім Конга, «вялікай гульні» ў Сярэдняй Азіі і шматлікіх іншых імпэрскіх праяваў заваёўніцтва і суперніцтва. Трыюмф (а ці трыюмф?) глябальнага капіталізму напрыканцы XX ст. стаўся вынікам дзьвюх сусьветных войнаў, халоднай вайны і жорсткіх нэакаляніяльных канфліктаў.

Цягам апошніх двухсот гадоў распаўсюджаньне капіталізму і індустрылізацыя былі неадрыўныя ад войнаў і рэвалюцыяў. Маркса гэта не зьдзівіла б. Дык чаму Фрыдман ды іншыя нэалібэралы мяркуюць, што ў XXI ст. усё будзе іначай? Адказ часткова крыецца ў неадназначнасьці ідэі глябалізацыі. Цяпер, гаворачы пра глябалізацыю, зазвычай аб'ядноўваюць два адрозныя паняткі: па-першае, што мы жывём у час імклівага і няспыннага тэхналягічнага прагрэсу, і ў выніку ўсё ў сьвеце зьвязваецца, пераплятаецца між сабой яшчэ хутчэй і шчыльней; і па-другое, што гэты працэс вядзе да стварэньня адзінай эканамічнай сыстэмы. Першае – абсалютна праўдзівае эмпірычнае цьверджаньне, другое ж – беспадстаўная ідэалягічная заява. Як і Маркс, Фрыдман абыходзіць маўчаньнем гэтае раздваеньне панятку.

2

У кнізе «Зямля – пляскатая» Фрыдман даводзіць, што глябалізацыя адбываецца за тры этапы. Першы – з 1492 да прыблізна 1800 г., калі краіны і ўлады Эўропы распачалі гандаль з Новым Сьветам. Першы этап рухалі вайсковая экспансія ды конскія сілы й энэргія ветру. Другі этап – з 1800 да 2000 г., калі глябальную інтэграцыю пасоўвалі наперад

транснацыянальныя кампаніі і паравы рухавік з чыгункай. Трэці этап – ад 2000 г., калі рухальнай сілай глябалізацыі выступае асоба, а аснаватворнай тэхналёгіяй – усясьветная оптавалокнавае сеціва. Фрыдман кажа, што на кожным з гэтых этапаў галоўную ролю адыгрывала тэхналёгія: глябалізацыя – дадатковы прадукт разьвіцьця тэхналёгіяў. Тут Фрыдман адхіляецца ад стандартнага погляду сучасных эканамістаў на глябалізацыю як на перадусім вынік адмовы ад рэгуляваньня рынку. У гэтым ён набліжаецца да Маркса – і да гістарычнай рэальнасьці.

У шырэйшай пэрспэктыве сёньня мы назіраем усяго толькі найноўшую стадыю ўсясьветнай індустрыялізацыі. У XIX ст. сьвет сьціснуўся дзякуючы зьяўленьню тэлеграфу; сёньня ён зноў сьціскаецца ў выніку разьвіцьця Інтэрнэту. Аднак, што б ні казаў Фрыдман, павелічэньне магчымасьцяў камунікацыі яшчэ не азначае якасных зьменаў у ладзе жыцьця. Выкарыстаньне нафты і электрычнасьці зьмяніла чалавечае жыцьцё глыбей, чым усе новыя інфармацыйныя тэхналёгіі. Але і гэта не паклала канца войнам і тыраніі і не запачаткавала новай эры міру і дабрабыту. Як і іншыя тэхналягічныя навінкі, яны выкарыстоўваліся дзеля самых розных мэтаў і спрычыніліся да звычайных у чалавечай гісторыі канфліктаў.

Неабходна выразна адрозьніваць глябалізацыю – няспынны працэс усясьветнае індустрыялізацыі – і розныя эканамічныя сыстэмы, у якіх гэты працэс адбываецца. Глябалізацыя не спынілася, калі да ўлады ў Расеі прыйшоў Ленін. Яна працягвалася – і актыўна прысьпешвалася сталінскай палітыкай калектывізацыі сельскай гаспадаркі. Ніяк не запаволілі глябалізацыі дырыжысцкія рэжымы ў Азіі – сьпярша ў Японіі, у эпоху Мэйдзі, і пазьней у мілітарысцкі пэрыяд, а пасьля Другой сусьветнай вайны ў Карэі і на Тайвані. Глябалізацыя выкарыстоўвала іх, каб працягваць свой рух наперад. Усясьветная індустрыялізацыя не спынілася, калі пасьля Першай сусьветнай вайны распаўся лібэральны міжнародны эканамічны парадак, і яна ня спыніцца, калі ў сваю чаргу разваліцца і той сусьветны эканамічны рэжым, што паўстаў пасьля падзеньня камунізму.

Паміж глябалізацыяй і вольным рынкам няма сыстэмнае сувязі. Лібэральны капіталізм спрыяе ёй, па сутнасьці, ня больш, чым цэнтралізаваная плянавая эканоміка ці ўсходнеазіяцкі дырыжызм. Глябалізацыю рухаюць наперад тэхналягічныя зьмены, што адбываюцца пры шмат якіх рэжымах. Таму яна магутнейшая за любы зь іх. Фрыдман, як шчыры тэхналягічны дэтэрмініст, мусіў бы ахвотна пагадзіцца з гэтай ісьцінай. І калі ён так ня робіць, дык таму, што адсюль відаць, наколькі беспадстаўныя ўтапічныя спадзяваньні, якія ён зьвязвае з багатым на канфлікты ды супярэчнасьці працэсам. Глябалізацыя зрабіла сьвет меншым. Яна можа зрабіць яго – альбо пэўныя ягоныя часткі – заможнейшымі. Але глябалізацыя ня зробіць сьвету больш мірным альбо лібэральным. І тым больш яна ня робіць Зямлю пляскатай.

Славутае Фрыдманава адкрыцьцё, што Зямля – пляскатая, адбылося падчас размовы з Нанданам Нілекані, выканаўчым дырэктарам адной зь вядучых індыйскіх кампаніяў у галіне высокіх тэхналёгіяў «Infosys Technologies», у ягонай штаб-кватэры ў Бангалоры. Індыйскі прадпрымальнік патлумачыў Фрыдману: «Том, поле гульні цяпер выроўніваецца». Гэтае банальнае назіраньне сталася для Фрыдмана сапраўдным Адкрыцьцём: «Нандан кажа, разважаў я, што поле гульні выроўніваецца, робіцца пляскатым... Пляскатым? Роўным? Божа, ён кажа мне, што Зямля – пляскатая!» Пяцьсот гадоў таму Калюмб «прыплыў назад, каб канчаткова давесьці, што Зямля – круглая». Дарэчы, гэта заслуга не Калюмба, а партугальскага мараплыўца Фэрдынанда Магеляна: ягоны карабель за тры гады – з 1519 па 1522 г. – абплыў вакол сьвету. Але гэта неістотна – Фрыдман бачыць сябе Калюмбам нашых дзён, які адкрыў, што Зямля ўжо ня круглая: «Я накрэмзаў у нататніку два словы: Зямля – роўная».

Мэтафара «пляскатае зямлі» бязьлітасна эксплюатуецца ад пачатку і да канца таўшчэзнай кнігі, але найбольш дратуе не яе няспыннае паўтарэньне. Дратуе, што Фрыдман не прызнае: у шмат якіх праявах – некаторыя зь іх зусім навідавоку – сьвет стаецца выразна менш пляскатым. Прызнаючы існаваньне «няроўнага» сьвету, дзе людзям недасяжныя выгоды новых тэхналёгіяў, ён ніколі ня зьвязвае росту гэтага «цёмнага

царства» галечы з посьпехамі глябалізацыі. Часам гэтая сьлепата даходзіць да сьмешнага. Згадваючы візыт у «Infosys», Фрыдман піша:

Да гарадка «Infosys» трэба ехаць па выбітай дарозе, дзе паміж нашых машынаў соўгаюцца сьвятарныя каровы, вазы, запрэжаныя коньмі, ды рыкшы на матацыклетках. Але ўвайшоўшы ў браму «Infosys», вы імгненна апынецеся ў іншым сьвеце. Вось велізарны плавальны басэйн, як на курорце, сярод валуноў і філігранна падстрыжаных газонаў, побач зь велізарнай пляцоўкай для гульні ў гольф, мноства рэстаранаў і проста казачны спортклюб.

Фрыдман мімаходзь згадвае, што гарадок «Infosys» сілкуецца электраэнэргіяй ад уласнае падстанцыі. Ён не пераймаецца пытаньнем, чаму ўзьнікла такая неабходнасьць, і не заўважае, што гэта сьведчыць пра паглыбленьне разрыву ўва ўзроўні жыцьця ў рэгіёне. «Infosys» здольны эфэктыўна канкураваць на сусьветным рынку, толькі адарваўшыся ад мясцовага атачэньня. Прыклад «Infosys» паказвае, што глябалізацыя сапраўды скасоўвае пэўныя няроўнасьці на сусьветным рынку, аднак сваім посьпехам кампанія абавязаная доступу да паслуг і інфраструктуры, якімі ня можа карыстацца грамадзтва навокал.

Скасоўваючы адныя праявы няроўнасьці, глябалізацыя паглыбляе іншыя. Фрыдман кажа, што ён за так званую «пляскатасьць са спачуваньнем» – відаць, маецца на ўвазе шэраг захадаў цэнтрысцкага альбо сацыял-дэмакратычнага характару, каб павялічыць мабільнасьць працоўнай сілы пры захаваньні некаторых сацыяльных гарантыяў, напрыклад, асабістых пэнсіяў. Для Амэрыкі гэта, мабыць, карысныя прапановы, толькі дзіўна, што датычна краінаў, якія на сабе адчуваюць найбольш разбуральныя наступствы глябалізацыі, Фрыдман схільны падтрымліваць самы махровы нэалібэралізм. Падзеньне Бэрлінскае сьцяны ён уважае за «падзею, што зрабіла Зямлю больш пляскатай», і як прыклад краіны, што найбольш выйграла ад зьяўленьня «пляскатага новага сьвету», згадвае Расею.

Бясспрэчна, падзеньне Саветаў азначала пашырэньне свабоды. Аднак з тае пары ў Расеі вырасьлі паказьнікі абсалютнае беднасьці ды значна паглыбілася маёмасная няроўнасьць. Відавочна, што спрычынілася да гэтых працэсаў эканамічная «шокавая тэрапія», праведзеная па распадзе камуністычнае сыстэмы паводле рэкамэндацыяў з Захаду. Праз скасаваньне кантролю над цэнамі пайшлі дымам невялікія сямейныя ашчаджэньні, а паколькі доступ да прыватызацыі дзяржаўнай прамысловасьці атрымала толькі невялікая купка «сваіх», адбылася рэзкая канцэнтрацыя капіталу. У выніку значная частка расейскага насельніцтва засталася адрэзанай ад выгодаў сусьветнага рынку. Магчыма, іншая палітыка дазволіла б пазьбегнуць гэтых цяжкасьцяў ці прынамсі іх зьмякчыць[1].

Калі браць пад увагу, якая спадчына засталася Расеі з савецкіх часоў, варта было разьлічваць, што працэс пераходу да рынку будзе працяглым і складаным. Спробы ажыцьцявіць яго за некалькі гадоў удавалі на скрайнюю безразважлівасьць. Шокавая тэрапія прывяла да зьбядненьня мільёнаў людзей. Апроч таго, яна падкінула дроваў у агонь антызаходніцкіх настрояў. Сацыяльна-эканамічныя зьмены такога маштабу ў посткамуністычнай Расеі заканамерна вялі да палітычнага шоку, і ў зьяўленьні Ўладзімера Пуціна бачыцца міжволі вынік пераходу да свабоднага рынку з падачы Захаду. У галінах вольны рынак захоўваецца і надалей, але Пуцін узяў пад жорсткі палітычны кантроль эканоміку ў цэлым, ператварыўшы палітычную дзейнасьць алігархаў і прадэманстраваўшы ўладную незалежнасьць ад Захаду. У выніку яго квазіаўтарытарны рэжым, гледзячы па ўсім, мае народную падтрымку, якой бракавала Ельцыну, затое цяпер у Расеі няма ані знаку «дэмакратычнага капіталізму» на заходні капыл.

Нельга сьцьвярджаць, нібы глябалізацыя паводле сваёй сутнасьці спрыяе разьвіцьцю вольнага рынку і лібэральнай дэмакратыі. Не абвяшчае яна і канца нацыяналізму ці суперніцтва паміж вялікімі дзяржавамі. Апісваючы ройгую гутарку з выканаўчым дырэктарам невялікай індыйскай кампаніі па вытворчасьці гульняў у Бангалоры, Фрыдман распавядае, як той на астачу сказаў: «Індыя стане звышдзяржавай, і мы будзем валадарыць». «Валадарыць над

[1] Асаблівасьці посткамуністычнай трансфармацыі ў Расеі, а таксама ў постсавецкіх краінах разглядаюцца ў: Reddaway Peter and Glinski Dmitri. The Tragedy of Russia's Reforms: Market Bolshevism Against

кім?» – запытаўся Фрыдман. Ён меў на ўвазе, што на цяперашнім этапе глябалізацыя робіць неістотным дыстанс сілаў паміж дзяржавамі. Але насамрэч глябалізацыя вядзе зьяўленьня новых вялікіх дзяржаваў. Кітай і Індыя прыняліглябалізацыю не ў апошнюю чаргу і з гэтай прычыны.

Democracy. Clinton's Strategy for Prosperity and Peace Press, 2001.

На думку нэалібэралаў, рухальная сіла глябалізацыі – імкненьне да большае прадукцыйнасьці вытворчасьці. Яны бачаць у нацыяналізьме праяву культурнай адсталасьці, што толькі замаруджвае працэс. Але эканамічны ўздым і ў Ангельшчыне, і ў ЗША адбыўся на фоне ўсплёску нацыянальных пачуцьцяў, а ў Японіі эпохі Мэйдзі нацыяналістычны супраціў уладзе Захаду стаўся магутным стымулам эканамічнага разьвіцьця.

У XIX – пачатку XX стст. імклівы рост капіталізму сілкаваўся нацыяналізмам. Цяпер тое ж самае назіраецца ў Кітаі ды Індыі. У абедзьвюх краінах глябалізацыю прымаюць ня толькі таму, што яна стварае магчымасьці для росту дабрабыту, але і таму, што яна дае шанец кінуць выклік гегемоніі Захаду. Як толькі Кітай ды Індыя стануць вялікімі дзяржавамі, яны запатрабуюць прызнаньня сваіх адметных культураў ды каштоўнасьцяў. Давядзецца перабудаваць міжнародныя інстытуцыі, каб яны адлюстроўвалі шматварыянтнасьць эканамічных і палітычных мадэляў. У гэты момант прэтэнзіі Злучаных Штатаў і іншых заходніх дзяржаваў на сусьветнае лідэрства натыкнуцца на рашучы супраціў, а глябальны балянс сілаў зрушыцца.

3

У кнізе «Лексус і аліўкавае дрэва»* (*The Lexus and the Olive Tree*, 1999) Фрыдман засяроджвае ўвагу на супрацьстаянні «Лексусам» (сіламі глябальнай эканамічнай інтэграцыі) і «аліўкавым дрэвам» (культурнай адметнасьцю). «Зямля пляскатая» распавядае, як пасьля 11 верасьня Фрыдман вандраваў па арабскім і ісламскім сьвеце, дый зьбіў «Пасьпорту глябалізацыі. Але насамрэч ён страціў з поля зроку «Мотарз» для глябалізацыю, а сілы нацыянальнай, культурнай і саматоеснасьці, што яе стваралі. Фрыдман піша, што нацыянальная дзяржава – «найвялікшая крыніца

Lexus and the Olive Tree, Farrar, Straus and Giroux, 2000.

бізнэсмэна, якога ён сустрэў у самалёце, «Пасьпорту» і «Мотарз» для розных катэгорыяў пасажыраў. Гэта кароткая гісторыя пра тое, як Фрыдман страціў свой аўтамабіляў.

напружанасьці» на сусьветным рынку. Аднак на самай справе нацыяналізм супраціўляецца глябалізацыі значна больш у прасунутых краінах, як Францыя, Галяндыя і ЗША, чым у новаразьвіваных эканоміках. І самога Фрыдмана хвалюе прыцягненьне замежнікаў адаб'ецца на стане амэрыканскага рынку працы. А адміністрацыя Буша ў гандлёвай палітыцы пасьлядоўна схіляецца ў бок усё большага пратэкцыянізму. Магчыма, гэта амэрыканскі нацыяналізм тармозіць глябалізацыю. А ў краінах Азіі, дзе цяпер адбываецца імклівая індустрыялізацыя, нацыяналізм выступае рухальнай сілай глябалізацыі.

Адным з мярыла такіх краін, што імкнуцца адысьці ад скарачэння выразу «luxury experts to the US». — *Заўв. перакл.*

Уздым нацыяналізму неад'емны ад глябалізацыі, ройна як і абвастрэньне геапалітычнага суперніцтва. Як і падчас «вялікай гульні», што вялася некалькі дзесяцігодзьдзяў перад Першай сусьветнай вайной, сёньняшняя індустрыялізацыя спарадкае барацьбу за прыродныя рэсурсы. ЗША, Расея, Кітай, Індыя, Японія і Эўразьвяз – усе імкнуцца гарантаваць сабе энэргетычную бясьпеку, і таму змагаюцца за ўплыў на абсягу ад Цэнтральнай Азіі праз Пэрсыдзкую затоку да Афрыкі і часткова Лацінскай Амэрыкі. Магчыма, наступнае стагодзьдзе пройдзе пад знакам пэрыядычных войнаў за кантроль над рэсурсамі, бо вялікія дзяржавы схопяцца паміж сабой за крыніцы вуглевадароднага паліва.

Больш за тое, усясьветная індустрыялізацыя, відаць, паступова сутыкаецца з сур'ёзнымі экалягічнымі перашкодамі. Усё больш дасьведчаных экспэртаў мяркуе, што сусьветныя запасы нафты заканчваюцца, а мэтэаролягі аднадушна сьцьвярджаюць, што ўсясьветны пераход да энэргаінтэнсіўнага індустрыяльнага ладу жыцьця спрычыніўся да глябальнага пацяпленьня. Калі гэтыя страхі небеспадстаўныя, дык на наступным этапе глябалізацыі мы можам стаць сьведкамі ўзрушэньняў ня меншых, чым зазнала XX ст.

Ня варта думаць, што Фрыдман не зважае на гэтыя небясьпекі. У адным зь цікавых адступленьняў ён піша:

Іслама-ленінізм паўстаў у вялікай ступені на той жа самай гістарычнай глебе, што і эўрапейскія радыкальныя ідэалёгіі XIX і

XX ст. Фашызм і марксізм-ленінізм узрасьлі на фоне імклівай індустрыялізацыі ды мадэрнізацыі ў Нямеччыне і Цэнтральнай Эўропе, калі раптоўна былі зьнішчаныя традыцыйныя супольнасьці, што жылі згуртаванымі вёскамі або вялікімі сямейнымі кланамі.

Зноў жа, Фрыдман прызнае, што шмат якія навацыі цяперашняга этапу глябалізацыі ўзяла на ўзброеньне «Аль-Каіда». За апошнія два дзесяцігодзьдзі некаторыя найбольш прасунутыя сусьветныя карпарацыі ператварыліся з залішне забюракратызаваных структураў у скаардынаваныя сеткі прадпрымальнікаў і капіталістаў. «Аль-Каіда» пераняла гэтя зьмены і дзейнічае як сетка самастойных ячэек, а не як ранейшыя зацэнтралізаваныя рэвалюцыйныя партыі. Мабыць, самае цікавае ў тым, што Фрыдман прызнае: залежнасьць Амэрыкі ад імпарту нафты ставіць яе пад пагрозу, і заклікае забясьпечыць энэргетычную незалежнасьць ЗША:

Калі б прэзыдэнт Буш зрабіў сваёй найвышэйшай мэтай, сваім «палётам на Месяц» дасягненьне энэргетычнай незалежнасьці, ён адным ударам перакрыў бы тэрарыстам крыніцу даходаў і прымусіў бы Іран, Расею, Вэнэсуэлу і Саудаўскую Арабію пайсьці шляхам рэформаў (а пры цане нафты 50 даляраў за барэль гэтага ніколі ня будзе), умацаваў бы даляр і палепшыў бы ўласны імідж у Эўропе, зрабіўшы нешта значнае, каб абмежаваць глябальнае пацяпленьне.

Тое, што Фрыдман адстойвае ідэю энэргетычнае незалежнасьці, сьведчыць пра памылковасьць прасталінейнага бачаньня гісторыі. Так, у палітыцы самазабесьпячэньня энэргарэсурсамі ёсьць рацыя, але гэта азначае адыход ад глябалізацыі. «Лексус і аліўкавае дрэва» абвяшчаў прыйсьце гарманічна інтэграванага сьвету. З тае пары ЗША перажылі тэракты 11 верасьня і загразьлі ў Іраку, ня ў змозе адолець тамтэйшы рух супраціву. На гэтым фоне вельмі прывабна пачынае выглядаць ідэя парваць адзін з ключавых ланцугоў залежнасьці, што прывязвае ЗША да астатняга сьвету праз пастаўку энэрганосьбітаў. Як і ў папярэдняй кнізе, Фрыдман выказаў настроі, што ўсё мацней

ахопліваюць грамадзтва, і з гэтага пункту гледжаньня кніга «Зямля – пляскатая» можа перадвызначыць амэрыканскую палітыку ў будучыні.

Так, сапраўды павелічэньне энэргетычнай незалежнасьці адпавядае нацыянальным інтарэсам ЗША. Але думаць, што гэта прымусіць краіны-«неслухі» пайсьці шляхам нэалібэральных рэформаў – значыць прымаць жаданае за рэчаіснае. Значнае падзеньне кошту нафты, бясспрэчна, дэстабілізуе залежныя ад яе эканомікі – ад Пэрсыдзкай затокі і Сярэдняй Азіі да Саудаўскай Арабіі і Туркмэністану, а ў некаторых краінах можа сапраўды прывесьці да дэмакратыі. Аднак у шэрагу выпадкаў ад гэтага выйграюць перадусім фундамэнталісты. Няўжо Фрыдман сапраўды верыць, што дэмакратыя ў Саудаўскай Арабіі абернецца стварэньнем лібэральнага празаходняга рэжыму? У гэтай і іншых краінах энэргетычная незалежнасьць ЗША можа лёгка падштурхнуць да ўздыму радыкальнага ісламізму.

Як і раней, глябалізацыя сёньня ставіць перад намі невырашальныя праблемы. Але адсюль не вынікае, што ім немагчыма больш-менш разумна даваць рады. Аднак дзеля гэтага трэба нешта супрацьлеглае ўтапічным летуценьням. Зрабіўшы дзіўны віраж, утапізм перавандраваў зь левага на правы флянг і зь цішы навуковых кабінэтаў у кнігарні аэрапортаў. Што новыя тэхналёгіі збудуюць новы сьвет, у XIX ст. запэўнівалі палітычныя змагары і радыкальныя тэарэтыкі, кшталту Маркса. Сёньня падобную ідэю сьцьвярджаюць некаторыя бізнэс-гуру. Ёсьць ужо нямала кніжак, што абвяшчаюць глябальныя эканамічныя трансфармацыі і кажуць, што сыстэму ўлады можна рэарганізаваць так, каб яна дастасоўвалася да гэтае трансфармацыі на ўзор прыватных бізнэс-карпарацыяў. Кніга «Зямля – пляскатая» – выдатны прыклад гэтага жанру.

На жаль, праблемы глябалізацыі вырашыць цяжэй, чым праблемы арганізацыі бізнэсу. Дзяржавы немагчыма ліквідаваць, як фірмы-банкруты, а пераразьмеркаваньне эканамічнае і палітычнае магутнасьці ў сьвеце зазвычай суправаджаецца жорсткім супрацівам. Глябалізацыя нясе ў сабе

рэвалюцыйныя зьмены, але яна не скасоўвае мінулых канфліктаў. У некаторых важных аспэктах яна сапраўды выроўнівае поле гульні, як слушна адзначыў індыйскі суразмоўца Фрыдмана, і ў гэтым пляне яна спрыяе прагрэсу чалавецтва. Але разам з тым яна распальвае нацыяналістычныя і рэлігійныя жарсьці, абвастрае барацьбу за прыродныя рэсурсы. Фрыдман зь ягоным спрымітывізавана-марксісцкім нэалібэральным сьветапоглядам бачыць у гэтых канфліктах толькі прыкрыя перашкоды – такія сабе палкі ў колах машыны, якую ўсё адно нічым не спыніць. Аднак насамрэч яны неад'емная частка глябалізацыі, і немагчыма ведаць наперад, як яна пойдзе далей. Лепей прыняць гэты факт і зрабіць усё магчымае, каб даць яму рады.

Пераклаў з амэрыканскай Сяргей Богдан
паводле The New York Review of Books.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/24
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

палеміка [image]2005

аналітыка • крытыка • **палеміка** • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Даніла Жукоўскі Прымус захапляцца

ДАНІЛА ЖУКОЎСКІ

крытык літаратуры. Апошняя публікацыя ў «ARCHE» – аналіз «Пісьменьнік і пустэча» (4/2005). На думку Леаніда Дранька-Майсюка і Рыгора Сітніцы, выказаную ў палеміцы «Пісьменьнік і перамога» («Народная Воля», 2005. 20 кастрычніка), Даніла Жукоўскі – «эстэтычна глухі: пачатковец

Хай злуюцца на мяне, але пачну з таго ж самага: з уласнае ініцыятывы не стаў бы адказваць на злосны ліст Сітніцы і Дранька-Майсюка ў «Народнай Волі», бо не лічу сваю ацэнку кнігі сп. Б. Пятровіча «Шчасце быць» адзіна правільнай і універсальнай. З вялікім задавальненнем прачытаў бы станоўчую рэцэнзію на гэтую кнігу, і было б не так крыўдна за выдаткаваныя на яе вывучэнне гадзіны.

Але гняўлівыя аўтары ліста пра кнігу не гавораць амаль нічога. Яны прыгадваюць пра абавязак любіць беларускую літаратуру і шанаваць беларускіх літаратараў.

Здаецца, што якраз-ткі з шанаваннем сп. Пятровіча ў маім допісе ўсё добра. Згаданыя і ягоны патрыятызм, і колішняя цудоўная калонка ў «ЛіМе», і высокая пасада ў Саюзе пісьменнікаў, і паспяховы часопіс «Дзеяслоў». Шмат месца прысвечана стылёвай разнастайнасці і дасканаласці прозы сп. Пятровіча. Так што дарма прыпісваць тое, чаго няма: ніхто не лучыць з вышэйпамянёным пісьменнікам нейкае паразы. Ён напісаў дакладна тое, што хацеў напісаць. Ён выдаў сваё творы ў перыёдыках, а цяпер – і асобнаю кнігаю. Чаго яшчэ жадаць аўтару, калі кніга ў дадатак атрымала станоўчыя водгукі?

Адзін з іх паслужыў мне адпраўным пунктам. У змешчаным у «ARCHE» допісе я выказаў нязгоду са сп. Івашчанкам, самаго скруху, што тэхнічна прасунутыя тэксты сп. Пятровіча вызначаюцца нагэтулькі ж высокім узроўнем змястоўнасці, перакананне, што рэцэнзент хапіў лішку, надаючы творчасці рэдактара «Дзеяслова» нейкія месіянскія функцыі, а ягоныя падыходы панацэяю для беларускай літаратуры.

адкрытым
ён
нічога
ў
ягоным
ягоныя
ягоныя
ягоныя

Я лічу, што сп. Пятровіч заслужыў, каб ягоным творам давалі шчырыя ацэнкі. Хай мае закіды падаюцца жорсткімі, але прыхаваная нязгода і асцярожныя намёкі неадпаведныя месцу гэтага пісьменніка ў беларускай літаратуры. Расейцы кажуць: *кому много дано, с того много и спросится*.

Замест патрабавальнасці ў «Народнай Волі» нагадваюць пра абавязак любіць. Чарговы раз кажу: абавязак любіць літаратуру калі і існуе, не мае нічога супольнага з замоўчваннем нязгоды з канкрэтным аўтарам. І, калі вярнуцца да сп. Пятровіча, не на ягоных творах аўтары ліста вучыліся майстэрству ліслівай маўклівасці і тэндэнцыйнай недакладнасці. Перачытайце, паважаныя, шчэ раз – вам жа яны падабаюцца.

Трэба нарэшце зразумець, што адмоўнае стаўленне да нейкіх твораў можа грунтавацца менавіта на гэтых творах, а не на іхнай прыналежнасці да беларускае літаратуры. Пісанне па-беларуску сёння сапраўды нясе ў сабе пэўную грамадскую пазіцыю, але патрэбы чытача не вычэрпваюцца толькі задавальненнем тугі па беларускім слове – у адваротным выпадку дастаткова было б мець адну кнігу на ўсіх і ўсё адно якое літаратурнае якасці.

Той, хто беларускую літаратуру не любіць, даўно ад яе адвярнуўся. Чытанне беларускае літаратуры, рэагаванне на яе таксама нешта важыць. Але раз за разам шчырыя спробы звярнуць увагу літаратараў на асобныя занядбанні, залішнюю замкнёнасць і самазадаволенасць абрываюцца камандным воклічам: «Любі! Ты абавязаны». Няварта прыніжаць чытача прымусам захапляцца.

[image]
[image]

Пачатак Цалкам

№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/24
[image]

Цалкам

анатыкатура • **палеміка** • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

РЫГОР МІНЯНКОЎ (нарадзіўся ў 1951 г. і вырас у Гомельскай вобл.) скончыў філязофскі факультэт МДУ ім. М. В. Ламаносава, кандыдат філязофскіх навук, прафэсар, з 1978 г. працуе ў розных ВНУ Беларусі. З 1998 г. – дэкан факультэту філязофіі і дасьледаваньняў культуры ЭГУ. Навуковыя інтарэсы:

Рыгор Мінянкоў Засталося пачуць адзін аднаго...

«Пасьляслоўе» П. Рудкоўскага выклікае вельмі супярэчлівае ўражаньне. Цалкам відавочны намер аўтара знайсьці пункты збліжэньня бакоў, што вядуць палеміку, і гэта добра, бо усе мы фактычна зацікаўлены ў адным – у станаўленьні і разьвіцьці дэмакратычнай Беларусі. Аўтар мае рацыю, што нам патрэбны большы ўзаемны давер і салідарнасьць. Зь іншага боку, Рудкоўскі так і ня можа пакінуць падзелу на партыі «беларусафілаў» і «русафілаў», хоць і падкрэсьлівае яго амбівалентнасьць. У сваім артыкуле «Заметки о языке, знании пути и прочем» я ўжо пісаў пра тупіковасьць такога «партыйнага» падыходу, а таксама пра тое, што я асабіста ні да якой партыі сябе не адношу і вяду гаворку зусім пра іншае. А паколькі прынцып партыйнасьці, хай і ў больш мяккай форме, утрымліваецца, то гэта цягне за сабой усю былую аргумэнтацыю, спасылкі на рознага роду састарэлыя падыходы і г. д.; а ў выніку... «на колу мочало, начинай сначала»... Я б сказаў так: мы ўжо слухаем адзін аднаго, засталося толькі пачуць. Але для гэтага, на маю думку, павінен быць зьменены сам рэгістар размовы. Вось, скажам, Рудкоўскі з цалкам зразумелым патасам гаворыць пра значэньне мовы ў разьвіцьці культуры, пра неперакладальнасьць словаў і г. д. Але ж хто гэтага ня ведае? І ці будзе пярэчыць гэтаму хоць бы адзін

адукаваны і культурна сьвядомы чалавек? Мяркую, не, але, як вядома, воз і сёньня там. Аўтар прапануе некаторыя спосабы разьвязаньня праблемы, але пра гэта пазьней. А я хачу паставіць пытаньне: можа, мы не пра тое вядзем гаворку і ня так?

Рудкоўскі ў асноўным засяродзіўся на тэксьце Янава Палескага, які ў шэрагу момантаў, як мне здаецца, прэзэнтаваў крыху карыкатурна, відаць, таму, што занадта літаральна ўспрыняў развагі Палескага пра паталёгію і гульню і не ўлічыў ролі мэтафараў у сучаснай гуманітарнай ведзе. Спадзяюся, што Янаў Палескі сам адкажа на крытыку, і я ня буду гэтага рабіць за яго. Што да маёй аргумэнтацыі, то Рудкоўскі практычна цалкам яе абышоў. Магчыма, таму, што яна ўва ўсіх сваіх асноўных пунктах супярэчыць пабудаванай ім канструкцыі нацыянальнай ідэнтычнасьці і практыкам яе ўсталяваньня ў Беларусі. Рудкоўскі пры гэтым дастаткова дакладна зафіксаваў *цэнтральны момант* майго тэксту – канцэпт *грамадзянскай ідэнтычнасьці*, адзначыўшы, праўда, што гэтага маладля разьвязаньня праблемаў Беларусі. Ня ведаю, якім маштабам карыстаўся мой крытык. Што да мяне, то я думаю, што *ўсталяваньне грамадзянскай ідэнтычнасьці ёсьць той неабходнай і дастатковай умовай*, якая і дазволіць нам вырашаць сапраўды сур'ёзныя праблемы, пастаўленыя ў артыкуле Рудкоўскага. Я ня буду паўтараць ужо выкладзеную мной аргумэнтацыю, з улікам таго, што яна ня выклікала якой-кольвек крытычнай ацэнкі, а толькі выкажу некаторыя ўдакладненьні ў кантэксьце праблемы канструяваньня грамадзянскай ідэнтычнасьці. Пры гэтым адзначу, што я высока ацэньваю шчырасьць пазыцыі Рудкоўскага, разумею яе падставы і стаўлюся да яе, як і заклікаў аўтар, з даверам. Але я буду казаць пра яе лёгіку і наступствы, якія, як добра вядома, могуць зусім ня ўлічваць высакародных суб'ектыўных намераў аўтара і дзейнічаць па-за яго воляй і нават насуперак ёй. І малое значэньне маюць нашыя post factum пярэчаньні: я ня тое меў на ўвазе, я гэтага не хацеў і г. д.

Рудкоўскі шмат гаворыць пра нацыяналізм, пра значэньне нацыянальных пачаткаў, пра іх падтрымку, пра суадносіны нацыяналізму і лібэралізму і да т. п. На ўзроўні ідэальных

пісьменнік, але, як я спасабы філязофскай ворку і ня сацыялягічнай думкі, сучасная сацыяльная тэорыя, тэорыя і практыка вышэйшай адукацыі. Аўтар больш за 150 публікацыяў, сярод якіх кнігі «Введение в историю русской социологии» (2000), «Проблема религиозно-культурной идентичности в русской мысли XIX–XX вв.: современное прочтение» (2002), «Трансформация университета и учебный процесс» (2004). Цяпер распрацоўвае

тыпаў тут і запярэчыць няма чаго. Гэта ўсё гэтак самы пры гожа і гарманічна, як і плятонаўская дзяржава. І настолькі ж ідэнтычнасьць небясьпечна, бо ў рэчаіснасьці мы маем не ідэальныя трыбуны, а рэчаіснасьць, у якой і схаваны чорт. Пры рэальным сучаснай канструяваньні ідэнтычнасьці, у тым ліку – і асабліва – нацыянальнай нацыянальнай, важна ня столькі тое, *што* гаворыцца, як і тое, *хто* гаворыць, а асабліва дзейнічае. Рудкоўскі піша: «Усякі нацыяналізм зьяўляецца пэўнай *праграмай аб'яднаньня* практыкі; Нацыяналізм прадугледжвае кананізацыю пэўнае сувязі ў інтэрсытэт каштоўнасьцяў, у якой першым і апошнім словам ёсьць для XXI *нацыянальная супольнасьць*. У нацыяналістычным дыскурсе ксаторсьдзя. можа шмат весьціся гаворкі і пра асобу (а нават Асобу), і пра свабоду (а нават Свабоду), рынкавая эканоміка і палітычны плюралізм могуць абвяшчацца ў ім «прыярытэтамі» і г. д., але Нацыя, быццам юнгаўская Вялікая Матка, будзе ўвесь час спаглядаць на кожны твой крок і кантраляваць усякі твой выбар». І далей: «У нацыяналізьме маем справу пераважна з *кантраляваным* плюралізмам. Могуць існаваць розныя погляды, розныя рэлігіі і нават розныя мовы (хоць з гэтым апошнім нацыяналізм пагаджаецца найцяжэй), але нішто ня можа парушыць сьвятой і запаветнай Еднасьці, нацыянальнага Адзінства».

Такім чынам, што мне (менавіта мне, Асобе!) прапануюць? Першаснай ёсьць нацыянальная супольнасьць, дзе, канечне, да пэўных межаў, прызнаецца мой выбар, але пры гэтым кожны мой крок і любы мой выбар будзе кантраляваць Вялікі брат (Вялікая Матка альбо, напрыклад, Вялікі Бацька, што бліжэй да рэчаіснасьці, ці ня так?) у рамках кантраляванага (кім?) плюралізму (спадзяюся, усе чулі пра кіраваную дэмакратыю і пра тое, *хто* ў ёй усё кантралюе?) дзеля сьвятой і запаветнай Еднасьці. Як гаворыцца, прыехалі: народ і партыя адзіныя. Прапаную зрабіць разумовы экспэрымэнт. Зьмяніце ў выкарыстаных цытатах слова «нацыяналізм» выразам «ідэалёгія беларускай дзяржавы», а словы «нацыянальны», «нацыя» словамі «беларускі народ». Атрымаюцца да болю знаёмыя тэксты, ці ня так? Здаецца, прагноз пра магчымую хуткую «нацыяналізацыю» беларускай улады, які я выказаў у прааналізаваным Рудкоўскім артыкуле, не такі ўжо фантасмагарычны. Цікава толькі, каго ж аб'явяць крэоламі, якіх

вынайшаў Рудкоўскі ў Беларусі? Можа, таму беларуская ўлада выказвае вялікую сімпатыю да некаторых лацінскаамэрыканскіх рэжымаў?

Рудкоўскі выкрывае ў мяне крывадушнасьць у сувязі з маім сьцьвярджэньнем, што я ня ведаю, куды ісьці. Што ж, выпраўляюся, цяпер я гэта ведаю. *Я буду ісьці супраць любой Маткі, Бацькі, братоў-сясьцёр і іншых, хто наважыцца кантраляваць кожны мой крок і любы мой выбар*, нават калі пры гэтым мне давядзецца выступіць супраць «сьвятой ідэі» беларускага адзінства і самога беларускага народу (між іншым, і расейскага таксама, калі ўжо мяне запісваюць у «русафілы»). Бо я ведаю, што нацыя ўтвараецца не з рабоў ці падданых пад прыглядам Вялікага брата; яна ўтвараецца з грамадзянаў, у якіх ёсьць маральная годнасьць і якія робяць свабодны і тым самым адказны выбар. Дарэчы, толькі на такім падмурку будзе карэктнае, скажам, параўнаньне Беларусі з Ірляндыяй. Сп. Рудкоўскі, мабыць, скажа, што ён меў на ўвазе зусім іншае. Згодны, больш за тое, я цалкам упэўнены ў высакароднасьці яго намераў. Але яшчэ раз нагадаю: выказаныя намі ідэі пачынаюць жыць самі, і мы ўжо ня можам кантраляваць іх жыцьцё і тое, як яны будуць інтэрпрэтаваныя. Як кажуць, добрымі намерамі... Нагадаю да таго ж, што камуністычныя ці нацысцкія тэксты таксама пісаліся высакароднымі і адукаванымі інтэлектуаламі, якія дбалі пра лёсы ці то гаротных працоўных усяго сьвету, ці то сваёй зганьбаванай нацыі і ў думках не трымалі таго, да чаго іх ідэі прывядуць у XX ст. Ці камусьці ўсё ж такі здаецца, што вось у тых, былых, высакародна і прыгожа не атрымалася, а ў нас атрымаецца? Не атрымаецца, панове. Як толькі мы пачнём усталёўваць «сьвятыя ідэі», тут жа аднекуль зьявіцца занадта багата трэсак. Гісторыя ўжо ўсё гэта праходзіла. Пачытайце выдадзены ў 1909 г. расейскімі філёзафамі зборнік «Вехи». Гісторыя XX ст., а мяркуючы па ўсім (прынамсі ў выпадку Беларусі), і XXI-га таксама, там апісана яшчэ да яе зьдзяйсьненьня.

Відавочна і тэарэтычная, і палітычная абмежаванасьць такога падыходу пры тым, што Рудкоўскі цалкам справядліва адзначае ролю і значэньне нацыянальных пачуцьцяў, нацыянальнай культуры, нацыянальнай мовы. Тэарэтычна – гэта крайні

эсэнцыялізм ды яшчэ злучаны з цалкам састарэлым арганіцызмам, нават калі мы і бласлаўляем яго аўтарытэтам Юнга. Пра абмежаванасьць такога падыходу я ўжо пісаў у сваім артыкуле, а таму ня буду паўтарацца. Дапасую толькі цытату з В. Акудовіча («Разбурыць Парыж»), якая, мне здаецца, будзе вельмі тут да месца: «Бо, здаецца, праблема палягае зусім у іншым, а менавіта ў тым, што і цяпер мы ўсё яшчэ глядзім на сьвет празь бельмы ўнівэрсалісцкіх сымулякраў і таму ня бачым Беларусь як дыскурс шматлікіх і разнастайных сусьветаў, якія без калецтва кожнага зь іх ня могуць быць паяднаныя ў нейкую агульнасьць нічым яшчэ, акрамя як *дыскурсам* Беларусі, між іншым, дараваным нам самім панам Богам». Лепш ня скажаш.

Так, канечне, мы ў нашых практыках часта кіруемся рознага роду мітамі, у чым я цалкам згодны з Рудкоўскім, за выключэньнем яго даволі рызыкоўнай, па-мойму, заявы пра «хрысьціянскія міты». У спрэчку я тут уступаць ня буду, паколькі тое, што ёсьць, а што не мітам у хрысьціянстве – справа асабовага выбару й веры. Выкажуся пра іншае, сёньня ўжо, як мне здаецца, агульнавядомае. Міты, як і традыцыі, якімі мы кіруемся сёньня, сёньня ж і канструююцца. Рудкоўскі, уласна, пра гэта таксама кажа, калі зьвяртаецца да інтэрпрэтацыяў баларускай гісторыі і заклікае нас да мітаў ставіцца крытычна. І гэта слушна, бо *міт і робіцца мітам, а традыцыя – традыцыяй, калі да іх пачынаюць ставіцца крытычна*. Да гэтага яна проста лад жыцьця. То бок менавіта сёньня тыя ці іншыя людзі пачынаюць (часьцей за ўсё з палітычных прычынаў) нешта называць мітам, аб'яўляючы гэтае нешта старажытным, першапачатковым і да т. п., і кіруюцца ім. Міт – сапраўды прадмет веры, а ня доказу. Але ўспомнім дапасаваныя вышэй цытаты з прааналізаванага тэксту з улікам таго, што міт для Рудкоўскага і ёсьць увасабленьнем нацыянальнага. Што ж гэта выходзіць? «Кантралёры плюралізму», паводле лёгікі, будуць прыпыняць усе мае ўхілы ад міту, да якога я павінен ставіцца крытычна, і гэта пры тым, што межы такой крытыкі, як можна зразумець, будуць вызначацца цалкам суб'ектыўна. То бок вернасьць «сьвятой ідэі», нацыянальныя пачуцьці відавочна прымаюць шызафрэнічны характар (магчыма, зусім не выпадкова ў

тэксьце Рудкоўскага зьяўляецца Юнг). Ці не пра тое спрабаваў весьці гаворку Янаў Палескі? І вы называеце гэта тэорыяй і ідэяй, за якімі я павінен ісьці пад «кантролем»? Дзякуй вялікі, але я прынцыпова пайду «налева».

Уласна, я ўжо павёў гаворку пра палітычнае вымярэньне праблемы, зрэшты, неадрыўнае ад тэарэтычнага. У гэтай сувязі я б хацеў удакладніць, што я маю на ўвазе, калі кажу пра грамадзянскую ідэнтычнасьць. Але спачатку пра адно надзвычай складанае і тэарэтычна, і палітычна пытаньне, пры сутыкненьні зь якім многія тэарэтыкі і практыкі нацыянальнай палітыкі набіваюць сабе гузакі, а то й скручваюць каркі. Гэтым у значнай ступені тлумачыцца, чаму цалкам шчырыя пераканаьні і сьцьвярджэньні таго ж сп. Рудкоўскага заканамерна прыводзяць да сфармуляваных мной практычных наступстваў.

Я маю на ўвазе вельмі складаную для сучаснай тэорыі і сацыяльнай практыкі праблему суадносінаў паміж *унівэрсалізмам* і *партыкулярызмам*, у аналізе якой я буду абапірацца на ідэі вядомага сацыяльнага тэарэтыка, аўтара тэорыі «радыкальнай дэмакратыі» Э. Лакло. Лакло вылучае некалькі мадэляў разьвязаньня гэтай праблемы. Антычнасьць выразна падзяляе сфэры ўнівэрсальнага і партыкулярнага як сфэры ісьціннага і ілжывага, рацыянальнага і ірацыянальнага. Навочна гэта ўвасабляецца ў вядомым плятонаўскім міце аб пячоры. Лёгас і эйдасы спасьцігаюцца розумам, чым партыкулярнае выключаецца як такое. Дапамагчы ў гэтым неразумным грамадзянам і павінна была плятонаўская дзяржава. Згодна з хрысьціянствам, унівэрсальнае існуе, але гэта пункт гледжаньня Бога, прынцыпова не спасьцігальны для чалавека. Унівэрсальнае ёсьць здарэньнем выключна ў рамах эсхаталягічнай пасьлядоўнасьці і даступным нам толькі ў акце ўратаваньня. У сэкулярызаваным варыянце такая пазыцыя ўвасобілася ў мадэрнай эўрапейскай інтэлектуальнай традыцыі (у тым самым Асьветніцтве-Aufkldrung, якое абараняе Рудкоўскі), што выявілася ў лёгіцы прывілеяванага агента Гісторыі («унівэрсальнай клясы», эўрацэнтрызму і да т. п.), агента, партыкулярнае цела якога нібыта ёсьць увасабленьнем унівэрсальнасьці. Праўда, замест Бога функцыю ўнівэрсальнага

гаранта ў гэтым выпадку пачаў выконваць Розум. Супраціў жа іншых культураў разглядаўся не як барацьба паміж асобнымі партыкулярнымі ідэнтычнасьцямі і культурамі, а як частка ўсёахопнай і эпахальнай барацьбы паміж унівэрсальнасьцю і рознымі формамі партыкулярнасьці – панятак народаў без гісторыі якраз і выяўляў іхную няздольнасьць рэпрэзэнтаваць унівэрсальнае.

У выніку, адзначае Лакло, мы вымушаны зрабіць выснову аб *непераадольнасьці* бездані паміж унівэрсальным і партыкулярным, у чым нас асабліва пераконваюць сацыяльныя і палітычныя практыкі 1990-х гг., зьвязаныя з пашырэньнем партыкулярызму, у той час як пункт гледжаньня ўнівэрсальнасьці ўсё больш адмаўляўся як старамодная таталітарная мара. Аднак, справядліва сьцьвярджае Лакло, чысты партыкулярызм – таксама ня выйсьце і асуджаны на правал, бо ён прыводзіць нас да *неразьвязальнага парадоксу*. Скажам, я магу абараняць правы расавых і нацыянальных меншасьцяў у імя партыкулярызму; але калі партыкулярызм ёсьць толькі прынцыпам абгрунтаваньня, то я павінен дапускаць правы на самавызначэньне і ўсялякага роду рэакцыйных групаў. Іншымі словамі, узьнікае праблема асноваў рэгуляваньня адносінаў паміж рознымі калектыўнымі ідэнтычнасьцямі. Гэтая праблема дастаткова ясна пастаўлена ў артыкуле Рудкоўскага, калі ён, напрыклад, вядзе гаворку пра «дэмакратычнае дзьвюхмоўе». Але вось прапанаванае ім рашэньне, пра што я ўжо казаў вышэй, уяўляецца мне неадэкватным.

Лакло прыходзіць да высновы пра магчымасьць іншай мадэлі інтэрпрэтацыі суадносінаў паміж унівэрсальным і партыкулярным, якая зыходзіла б з прынцыповай неразьвязальнасьці гэтай праблемы і адначасова зь яе бясконцай, кожны раз канкрэтнай разьвязальнасьці. Сапраўды, мы ня можам жыць безь некаторых унівэрсальных прапазыцыяў у якасьці крытэрыяў нашых партыкулярнасьцяў, што, скажам, робіць цалкам дапушчальным і зразумелым патас разважаньняў Рудкоўскага. Унівэрсальнае ёсьць часткай маёй ідэнтычнасьці, і менавіта ў той ступені, у якой мая адмысловая ідэнтычнасьць перажывае няўдачу ў сваім канстытуяваньні.

Парадокс пры гэтым застаецца. Універсальнае, адзначае Лакло, «ня мае ўласнага канкрэтнага зьместу (які б быў заключаны ў самім сабе), але заўсёды ўяўляе сабой разумовы гарызонт, які ахоплівае нявызначаны ланцуг раўназначных патрабаваньняў», то бок «універсальнасьць несумяшчальная зь якой-кольвек партыкулярнасьцю і, тым ня менш, ня можа існаваць па-за партыкулярным». Як магчымыя такія адносіны? Адказ Лакло палягае ў тым, што «гэты парадокс неразьвязальны, але такая неразьвязальнасьць ёсьць перадумовай самой дэмакратыі. Разьвязаньне парадоксу мела б на ўвазе, што можа быць знойдзена такое партыкулярнае цела, якое стала б *сапраўдным* целам універсальнага. Але ў гэтым разе ўніверсальнае знайшло б сваё неабходнае месцазнаходжаньне, і дэмакратыя зрабілася б немагчымай. Калі дэмакратыя *магчымая*, дык толькі таму, што ўва ўніверсальнага няма ніякага неабходнага цела і ніякага неабходнага зьместу; насупраць, розныя групы спаборнічаюць за тэмпаральнасьць, якая надзяліла б іхны партыкулярызм функцыяй універсальнай рэпрэзэнтацыі».

Усе названыя мадэлі суадносінаў паміж універсалізмам і партыкулярызмам, на мой погляд, праявіліся ў «дыскусіі аб мове». Ня маючы магчымасьці засяродзіцца на гэтым падрабязна, пакідаю гэтую працу чытачу. Мяркую, што яна ня будзе складанай. Я ж хачу сказаць пра іншае: першаснасьць грамадзянскай ідэнтычнасьці, так лёгка адрынутай Рудкоўскім, адносна ўсіх іншых ідэнтычнасьцяў якраз і зыходзіць зь бясконцых спробаў вырашыць невырашальнае, скажам, тыя ж праблемы нацыянальнага і нацыяналізму.

Рудкоўскі даў занадта спрошчаную характарыстыку грамадзянскай ідэнтычнасьці. Калі трымацца яе, дык такімі грамадзянамі перапоўнена Беларусь: усе, вядома, галасуюць, выступаюць на сходах і г. д., і тут мы нічым не адрозьніваемся ад самых прасунутых дэмакратыяў. Акрамя таго, сёньня нашыя грамадзяне вельмі часта карыстаюцца выразамі кшталту «грамадзянін сьледчы», «грамадзянін судзьдзя» і як там яшчэ. Дзіва толькі, што пры гэтым мы ўвесь час чуем пра адсутнасьць у нас грамадзянскай супольнасьці. Я ўжо не кажу пра тое, што аўтар трымаецца зусім састарэлай ідэі абавязковай прывязкі грамадзянства да нацыянальнай дзяржавы, што, зрэшты, не

зьдзіўляе пры яго такой уражлівай адданасьці канцэпцыі нацыябудаўніцтва XIX ст. і антыглябалісцкай рыторыцы. Відаць, у сытуацыі Беларусі пра эўрапейскае грамадзянства і эўрапейскую грамадзянскую ідэнтычнасьць нам яшчэ гаварыць зарана.

Канечне, праблема суадносінаў грамадзянства і ідэнтычнасьці надзвычай складаная. Рэч у тым, што ўсялякая ідэнтычнасьць, а нацыянальная асабліва, якой бы лаяльнай датычна да іншых ідэнтычнасьцяў яна ні была, ёсьць прынцыпам падзелу, супрацьпастаўленьня, выключэньня. Але, відавочна, успомнім Лакло, неабходным ёсьць нейкі гарызонт, які б ува ўмовах дэмакратыі спрыяў разьвязаньню яе парадоксаў без дапамогі Вялікага брата. Такім гарызонтам якраз і можа выступіць грамадзянская ідэнтычнасьць, якая пры ўсёй яе справядліва падкрэсьленай Рудкоўскім абстрактнасьці ўсё ж такі не лунае ў беспаветранай прасторы. Менавіта тут і схаваная асноўная праблема, якая падзяляе камунітарызм і лібэралізм. Адкідваючы маральны індывідуалізм, а менавіта лібэральную ідэю пра тое, што індывід ёсьць адзіным носьбітам правоў, камунітарызм імкнецца замацаваць палітычную супольнасьць у першаснай культурнай супольнасьці, у якой і павінна быць знойдзена ідэнтычнасьць. Іншымі словамі, у лібэралізму і камунітарызму рознае разуменьне індывіда. Лібэралізм сьцьвярджае мадэль самакіраванага індывіда, які прасоўвае ўласныя інтарэсы; камунітарызм – знаходжаньне індывіда ў сытуацыі і асяродзьдзі, што не дазваляе яму быць ізаляваным і незалежным, быць па-за кантролем. Прадметам дыскусіі для камунітарызму ёсьць ступень залежнасьці індывіда ад супольнасьці.

Але тут мы і сутыкаемся зь небясьпекай ці пасткай камунітарызму, хай і самага лібэральнага, напрыклад, у таго ж Ч. Тэйлара, бо адразу ж заканамерна паўстае пытаньне: пра чые вартасьці і ўяўленьні канкрэтна ідзе гаворка? Сапраўды, аб'яднаньне індывідаў у калектывы нярэдка зьдзяйсьняецца «звонку», часам рытарычна і дэмагагічна, патэнцыйна без эмпірычных падмуркаў. Адпаведна адвольна ўсталёўваюцца ўнутраныя і вонкавыя межы; прынцыпы ўключэньня і выключэньня; уяўленьні пра сябе і іншых («мы» і «яны»)

выяўляюцца крайне стэрэатыпнымі. Гэта асабліва відавочна ў выпадках, калі калектывы вялікія і неаглядныя, напрыклад, ананімныя групы тыпу «гендэраў», «клясаў» ці «нацыяў». Пры такім падыходзе да калектыўнай ідэнтычнасьці мае месца практыка *гіпастазаваньня* калектыўнага суб'екта, ідэалягічнай *гамагенізацыі* аб'ядноўваных звонку ў калектыў індывідаў. Такі нарматыўны дыскурс калектыўнай ідэнтычнасьці фальсыфікуе адзінства, якое можа быць цалкам адарвана ад рэальнай камунікацыі паміж асобамі, якія складаюць пэўную супольнасьць. Калектыўная ідэнтычнасьць выступае ў гэтым разе, хутчэй, як нарматыўнае прадпісаньне і ўстанаўленьне, якое імкнецца да тых ці іншых вынікаў, не абапіраючыся на згоду, што дасягаецца шляхам камунікацыі. Менавіта гэта, на мой погляд, складае сутнасьць канцэпцыі Рудкоўскага, асабліва ў той яе частцы, дзе ён выцягвае на сьвет Божы архаічную канцэпцыю нацыябудаўніцтва ды яшчэ ў спалучэньні з рамантычнай канцэпцыяй «народу» (што не пайшла далей за Гердэра і Русо; з дапасаваньнем аўтарытэта Лорэнца?!), які ніколі і нідзе не існаваў і, дзякуй Богу, і сёньня не існуе, хіба толькі ўва ўяўленьні беларускіх уладаў ды яшчэ й закаркаваны, як сярэднявечны гамункулюс, у «крышталёвай пасудзіне».

Аднак быць грамадзянінам сёньня зусім ня значыць абавязкова быць зьвязаным выключна з нацыяй-дзяржавай і нацыянальнасьцю як «галоўнай ідэнтычнасьцю». *Хутчэй ідэнтычнасьць постмадэрнага грамадзяніна ёсьць сукупнасьцю розных формаў грамадзянства, зразуметых як кампэтэнтная прыналежнасьць да розных вартасных сфэраў ці палёў*. Не выпадкова так багата сёньня вядзецца размоваў пра наднацыянальную і постнацыянальную супольнасьць. Апошняе, канечне, пакуль яшчэ досыць экзатычная рэч для Беларусі. Але нават калі абмежавацца толькі рамкамі дзяржавы, то мы павінны памятаць, што нацыя ўсталёўваецца менавіта грамадзянамі (а ня лорэнцаўскімі гусямі, невядома дзеля чаго прыцягнутымі Рудкоўскім), якія таму і грамадзяне, што знаходзяцца на гэтай тэрыторыі, у гэтай соцыякультурнай прасторы, што справы іхнай краіны, іхнай культуры і г. д. ёсьць іхнымі асабістымі справамі, а не «кантралёраў», якія за імі прыглядаюць. Дарэчы, лібэральны нацыяналізм, так высока і справядліва ацэньваны Рудкоўскім, магчымы толькі пры

наяўнасьці грамадзянаў з высокім узроўнем грамадзянскай ідэнтычнасьці, а не наадварот. Яшчэ раз: не дзяржава ўсталёўвае нацыю, бо апошняе – занадта тонкая справа, каб давяраць яе дзяржаве, якая часьцяком паводзіць сябе ў такіх пытаньнях, як слон у посуднай краме. Дзяржава і нацыя грамадзянаў на пэўным гістарычным этапе заключаюць паміж сабой узаемавыгадны саюз, які сёньня чым далей, тым менш неабходны. Праўда, дзяржава гэтаму супраціўляецца, імкнучыся даказаць сваю незаменнасьць, і там, дзе сапраўды мае быць нізкая грамадзянская сьвядомасць, дзяржава дасягае посьпеху, ператвараючыся ў панаптыкон Бэнтама–Фуко. І што ж, будзем яе падтрымліваць у гэтым дзеля «сьвятой ідэі»? Да таго ж апроч нацыянальнай ідэнтычнасьці існуе і мноства іншых ідэнтычнасьцяў, скажам, гендэрная ці ідэнтычнасьці рознага кшталту меншасьцяў. Але я штосьці не сустракаў сярод нашых строга «нацыянальна арыентаваных» аўтараў сур'ёзнага абмеркаваньня дадзеных праблемаў. Мабыць, аб'екты іх аналізу, апроч нацыянальных, ня маюць ні гендэрных, ні клясавых, ні прафэсійных, ні ўзроставых, ні сэксуальных і г. д. асаблівасьцяў. Зрэшты, для патрыярхальнага, па сутнасьці, дыскурсу нацыябудаўніцтва пад прыглядам ці то маткі, ці то бацькі такія праблемы проста не існуюць. Дарэчы, не існуюць яны (хіба толькі акрамя праблемы «жэншчын») і для беларускага ўладнага дыскурсу, і з тых самых прычынаў.

Такім чынам, кажучы пра сучаснае разуменьне грамадзянскай ідэнтычнасьці, мы вядзём гаворку пра тое, што Лакло і блізкая да яго ў поглядах Ш. Муф называюць *радыкальнай дэмакратыяй*, якая зыходзіць з сацыяльнай анталёгіі недахопу – радыкальнай адсутнасьці падставаў – як умовы сваёй магчымасьці. Дадзеная канцэпцыя супрацьпастаўляецца і камунітарызму, і лібэралізму. Супольнасьць, паводле розных вэрсіяў тэорыі радыкальнай дэмакратыі, павінна лякалізавацца не ў дзяржаве і не ў дэмакратычным грамадзянскім грамадзтве, а ў *калектыўным дзеяньні*. Аўтаномія ёсьць праектам, а не першапачаткова дадзенай умовай, як у лібэралаў і камунітарыстаў. Розныя падыходы да радыкальнай дэмакратычнай супольнасьці ўказваюць на трохбаковую мадэль грамадзтва, якая ўключае *палітыку другога, адметнасьці* і *справядлівасьці*. Акурат таму ў разгляданай тэорыі цэнтральнае

месца займае праблематыка грамадзянскай ідэнтычнасьці. Унівэрсалісцкія перадумовы лібэралізму павінны быць рэлятывізаваны на аснове прыняцьця да ўвагі адметнасьці. Акрамя таго, грамадзянства ўключае адданасьць справядлівасьці – не як фармальнай роўнасьці магчымасьцяў, а як субстантыўнай мэце. Мадэль справядлівасьці працуе толькі тады, калі яна моцная на лякальных узроўнях і выяўлена ў спосабе ўдзелу і пры гэтым можа падтрымлівацца тымі групамі, якія сутыкаюцца з найбольшым узьдзеяньнем з боку ўладаў. Чым больш групаў уцягнута ў прыняцьце рашэньняў, тым больш гетэрагенным робіцца грамадзтва, тым больш рознагалосьсяў у грамадзянскай супольнасьці. Таму нельга лічыць само сабой зразумелым, што грамадзтва можа прыйсьці да згоды, якая ляжыць у яго падмурку, напрыклад, да агульнага разуменьня дабра, як у лібэралізьме, ці супольнасьці, як у камунітарных тэорыях. Але пры гэтым вельмі важнае папярэджаньне Ю. Габэрмаса:

Падобна таму, як у дачыненьні да рэгрэсіўных утопіяў закрытасьці рэкамэндуецца стрыманасьць, яна рэкамэндуецца і ў дачыненьні да праекцыяў адкрытасьці, што называюць сябе прагрэсіўнымі. Хутчэй неабходна адчувальнасць да своеасаблівага балянсу паміж адкрытасьцю і закрытасьцю, які характарызаваў найбольш удалыя вехі ў гісторыі эўрапейскай мадэрнізацыі. Мы зможам адказваць на выклікі з боку глябалізацыі толькі разумным спосабам, калі ў постнацыянальнай сытуацыі здолеем распрацаваць новыя спосабы дэмакратычнага самакіраваньня грамадзтва.

І на канец некалькі словаў пра касмапалітызм і касмапалітычную ідэнтычнасьць. Рудкоўскі ў гэтым выпадку фактычна ўзнаўляе аргумэнты пэрыяду вядомай барацьбы зь «бязродным касмапалітызмам». На жаль, аўтар безнадзейна адстаў. І дарма ён запісвае ў свае саюзьнікі У. Салаўёва. Так, знакаміты расейскі мысьляр доўга заставаўся адданым канструктам усёчалавецтва і «расейскай ідэі», спрабуючы злучыць іх з гуманізмам, лічачы пры гэтым, што гэта можна зрабіць пры разуменьні чалавека як «кропкі на лініі». Аднак Салаўёў увесь час эвалюцыянаваў, перш за ўсё пад уплывам

сацыяльнай практыкі. Дастаткова хоць бы ўспомніць яго вострую барацьбу з «нацыянальнымі праектамі» (дарэчы, вельмі падобнымі да разгледжаных у артыкуле Рудкоўскага) позьніх славянафілаў. У сваім жа перадсьмяротным творы «Тры размовы» ён фактычна адмаўляецца ад гэтых ідэяў і прадказвае тыя жудасныя катастрофы XX ст., якія заварваліся пад «коўдрамі нацыянальных культураў». На пярэдні плян у Салаўёва выходзяць менавіта асоба і грамадзянін.

Сёньня існуе вельмі багатая літаратура, прысьвечаная сучасным інтэрпрэтацыям касмапалітызму, што далёка адышоў ад ідэі «грамадзянаў сьвету». Аднак размова пра гэта вымагае спэцыяльнага артыкулу. Тут жа толькі некалькі заўваг. Касмапалітызм зусім ня сьведчыць пра адмову ад свайго і знаходжаньне, так бы мовіць, у акультурным вакуўме. Ён адлюстроўвае іншае – фактычную *глябалізацыю біяграфіі* кожнага жыхара нашай плянэты, нават калі ён ці яна ўсё жыцьцё прасядзелі, напрыклад, у палескай вёсцы. Кожны сёньня павінен вучыцца сапраўды быць грамадзянінам сьвету, застаючыся чальцом сваёй супольнасьці. Але пры гэтым здольнасць паважаць іншых патрабуе пэўнага, багата ў чым іранічнага (чаго так часта не хапае «нацыянальным» аўтарам) дыстанцыяваньня ад уласнай культуры. Касмапалітызм ня сьведчыць, што ў чалавека няма радзімы ці айчыны; хутчэй гэта іншы ўзровень патрыятызму, які вядомы нэакаляніяльны тэарэтык К. Апія называе «касмапалітычным патрыятызмам». Здольнасьць усюды быць дома ня сьведчыць пра бяздомнасьць. А вось калі нацыю пачынаюць ізаляваць ад сьвету ў «нашым доме», то яна непазьбежна робіцца бяздомнай. Думаю, што калі б сёньняшнія беларусы былі сапраўды «дома», то бок у шырокім сьвеце, то няўжо б мы мелі тое, што маем? Касмапалітызм тым самым вымагае высокага ўзроўню самарэфлексіўнасьці разам з павагай як да ўласнага культурнага кантэксту, так і да іншых культурных вартасьцяў, што ня ёсьць тоесным культурнаму рэлятывізму. Інакш кажучы, ён немагчымы без грамадзянскай ідэнтычнасьці. *Калі мы чуем іншых, мы чуем і сябе*. Ня трэба любіць ні чалавецтва, ні народ. Усё гэта мы ўжо праходзілі, і сумныя вынікі такой любові добра вядомыя. З часоў Нагорнай Казані вядома: палюбіць трэба спачатку самога сябе, потым бліжняга свайго як самога сябе і,

нарэшце, Бога больш за самога сябе. Астатняе прыкладзецца. Скажам, досыць рэальнай зробіцца тая этычна арыентаваная нацыянальная праграма, якую П. Рудкоўскі прапанаваў у канцы свайго артыкулу. Дылема ж «Беларусь ці Космас» цалкам надуманая.

ЛІТАРАТУРА

Миненков г. Идея человечества В. Соловьева в контексте глобализации // Россия и Вселенская церковь. – Москва: ББИ, 2003.

Миненков г. Концепт идентичности: перспективы определения.

Лаклау Э. Невозможность общества // Логос. 2003. № 4–5.

Муфф Ш. К агонистической модели демократии // Логос. 2004. № 2.

Муфф Ш. Карл Шмитт и парадокс либеральной демократии // Логос. 2004. № 6.

Хабермас Ю. Европейское национальное государство: его достижения и пределы. О прошлом и будущем суверенитета и гражданства // Андерсон Б. (ред.). Нации и национализм. – Москва: Праксис, 2002.

Appiah K. A. Cosmopolitan Patriots // Cheah P. and Robbins B. (eds.). Cosmopolitics: Thinking and Feeling Beyond the Nation. – Minneapolis: University of Minnesota Press, 1998.

Laclau E. Universalism, Particularism and the Question of Identity // Rajchman J. (ed.). The Identity in Question. – New York: Routledge, 1995.

Mouffe C. Democratic Politics and the Question of Identity // Rajchman J. (ed.). The Identity in Question. – New York: Routledge, 1995.

[image]
[image]

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/24
[image]

[image]
A R C H E П а ч а т а к № 6 (40) - 2005
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
[image]
[image]
[image]2005
ад Зыкатук
ацалітыка • крытыка • **палеміка** • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі
[image] [image] [image]
Пётра
Рудкоўскі
Ad vocem

Як кіраўніку дыскусійнай групы «Вера і Культура» мне даводзіцца нярэдка быць сьведкам сытуацыі, калі асоба *X* пачынае вострую крытыку чыйгосьці выказваньня, але ў працэсе выясьняецца, што гэта асоба на 75 % усяго толькі паўтарае іншымі словамі сказанае папярэднікам. І тады прыходзіцца тлумачыць, што гэтыя два выказваньні насамрэч не ўзаемавыключальныя, а папросту *камплемэнтарныя*, і што ня трэба ўскладняць дыскусію выразамі тыпу: «Я цалкам нязгодны...», «Сказанае толькі што – лухта» і г. д. Магчыма, спадар Рыгор Мінянкоў, паколькі мае непасрэднае дачыненьне да дыдактыкі, таксама стракаўся з такімі сытуацыямі. Але вось прыходзіцца, на жаль, закінуць яму гэту заганную «стратэгію ўзаемавыключэньня».

1. Спадар Мінянкоў не бяз рацыі скрытыкаваў супрацьпастаўленьне «беларусафілы» – «русафілы». У першапачатковым варыянце артыкулу паўсюль фігуравала «беларускамоўныя» – «расейскамоўныя», супрацьпастаўленьне, запазычанае ад Янава Палескага. Андрэй Дынько потым слушна зьвярнуў увагу, што гэта тэрміналёгія можа ўводзіць у зман: існуюць усё ж расейскамоўныя (напр. Сіліцкі), якія схільны выступаць у абарону беларускае мовы. У выніку мы вырашылі ідэнтыфікаваць два бакі культурна-моўнай дыскусіі як «беларуса-» і «русафілаў», прычым пасьлядоўна беручы абодва тэрміны ў двукосьсе, што інфармуе пра ўмоўнасьць

гэтых тэрмінаў. Тым ня менш, гэтыя два тэрміны, нават узятыя ў двукосьсе, непамысныя: расейскамоўны беларус можа быць без праблемаў «беларусафілам», а беларускамоўны ў сваю чаргу – «русафілам».

Сп. Мінянкоў забараніў мне, на жаль, стасаваць звароты, тыпу: «Я ня тое меў на ўвазе», што робіць немагчымым рэінтэрпрэтацыю ўласных поглядаў, а права да рэінтэрпрэтацыі (магчымых удакладненьняў, выясьненьняў) – гэта ўмова свабоднай дыскусіі. Сам Мінянкоў напоўніцу карыстаецца гэтым правам, калі, напрыклад, *удакладняе* сваё разуменьне грамадзянскае тоеснасьці, а мне рабіць падобнае забараняе. Прыкра.

2. «*Рудкоўскі так і ня можа пакінуць падзяленьня на партыі…*» Па-першае, мэтафорыка «партыі» ўведзена Палескім. Я яе «ўзяў», але ахвотна пакіну, калі сп. Мінянкоў запрапануе якуюсь лепшую мэтафорыку («бок»? «асяродзьдзе»? «культурная опцыя»?). Па-другое, не разумею, чаму слова «партыя» Мінянкоў вырашыў тут успрыняць літаральна (параўн. «*…прынцып партыйнасьці (…) цягне за сабой (…) спасылкі на рознага роду састарэлыя падыходы*»), тым больш што хвіліну пазьней закідае, што «*Рудкоўскі (…) не ўлічыў ролі мэтафараў у сучаснай гуманітарнай ведзе*». Ізноў горкая несправядлівасьць: чаму Мінянкоў патрабуе ад мяне «ўлічваньня ролі мэтафараў», а сам ня хоча ўлічваць гэтае ролі?

3. Яшчэ раз адносна мэтафараў. Я прызнаю непазьбежнасьць такога тыпу зваротаў (а некаторыя лічаць, што нават матэматычна-фізычныя навукі ня могуць абысьціся бяз словаў зь пераносным значэньнем), але вось ужо чвэрць стагодзьдзя бытуе ў тэорыі пазнаньня тэрмін *літаралізацыя*. Ён абазначае *прынцып выясьненьня* мэтафарычнага або празьмерна агульнага тэрміну ці то шляхам лягічнага аналізу, ці то шляхам канкрэтызацыі, ці то шляхам паказваньня сувязі з навуковымі дадзенымі. Усьведамляючы мэтафарычнасьць Палескавага звароту «паталёгія нацыянальнага пачуцьця», я ўжыў мэтад *канкрэтызацыі*: у частцы пад загалоўкам «Гульня супраць паталёгіі» старанна разглядаю розныя магчымыя ўжываньні

мэтафары «паталёгія».

4. Вельмі цешуся, што Мінянкоў заўважыў маю характарыстыку нацыяналізму і нават раз-пораз карыстаўся гэтымі характарыстыкамі. Толькі вось уцяміць не магу, што значыць такі ўсклік: «*Такім чынам, што мне (менавіта мне, Асобе!) прапануюць*». Спадару Мінянкоў, *хто* прапануе і *што* прапануе? Няўжо гэта я прапаную Вам заакцэптаваць «праграму аб'яднаньня», якая прадугледжвае «кантраляваны плюралізм» і «запаветную Еднасьць»?

Што ж, гэтым разам мая рэпліка ніяк ня будзе падпадаць пад катэгорыю «post factum», бо цяпер маем справу зь неверагоднай дэзынтэрпрэтацыяй таго, што *насамрэч* было сказана ў маім артыкуле. Дазвольце, нагадаю ход маіх разважаньняў.

Суіснаваньне лібэралізму і нацыяналізму – праблематычнае (гэта было выразна мною адзначана). Чаму? А менавіта: ёсьць пагроза для Асобы, Свабоды і г. д.

Гісторыя нацыяналізму, як ідэі, усё ж такі даволі багатая: *былі* (і ёсьць) спробы паяднаць нацыяналізм і лібэралізм. Я палічыў патрэбным згадаць пра такія спробы, бо іх усьведамленьне мае немалое значэньне для нашай дыскусіі. Зусім не разумею такой заявы: «*...лібэральны нацыяналізм, так высока, і справядліва, ацэньваны Рудкоўскім...*». У маім артыкуле дамінантай ёсьць *апісальная* характарыстыка лібэральнага нацыяналізму, а не *ацэнкавая*. Ацэнка таксама ёсьць, але яна (гляньце ў тэкст) памяркоўна скептычная, а напэўна не «высокая».

Я запрапанаваў лібэралізм, які *выключае* нацыяналізм, але *ўключае* нацыянальнае пачуцьцё. Лёгіка тут такая: існуюць асобы, для якіх прыналежнасьць да нацыянальнай супольнасьці мае вялікае значэньне. Лібэралізм, калі хоча быць пасьлядоўным абаронцам Асобы, павінен узяць пад увагу *фактычныя* патрэбы гэтай Асобы. Хіба што маем дачыненьне зь лібэралізмам асаблівага тыпу, г. зн. такім, каторы *загадзя ведае*, што патрэбна, а што непатрэбна чалавеку. Інакш кажучы: няважна, што ты адчуваеш, а чаго не адчуваеш. Ты павінен увайсьці або не ўвайсьці ў «постнацыянальную» эпоху. Калі ты не ўвайшоў – твае праблемы. Гэта быў бы замаскаваны

таталітарызм, а не лібэралізм.

Зраблю яшчэ пару заўваг, каб завяршыць праблему нацыянальнага пачуцця і нацыяналізму і ўжо не вяртацца да яе. Мінянкоў кажа: «*...я штосьці не сустракаў сярод нашых строга «нацыянальна арыентаваных» аўтараў сур'ёзнага абмеркаваньня дадзеных праблемаў. Аб'екты іх аналізу, апроч нацыянальных, ня маюць ні гендэрных, ні клясавых, ні прафэсійных, ні ўзроставых, ні сэксуальных і г. д. асаблівасьцяў*». Гэта, як трэба меркаваць, паказвае абмежаванасьць «нацыянальна арыентаваных». *Па-першае*, закід зьмяшчае ў сабе г. зв. «аргумэнт адсутнасьці» («*я не сустракаў*»). Строгія лёгікі заўважылі б, што такі аргумэнт ня можа ўспрымацца сур'ёзна. Ну, але я не належу да «строгіх лёгікаў», таму аднясуся да гэтага сур'ёзна і запытаю: ці сапраўды няма такіх аналізаў? Але тут чарговая складанасьць: не да канца вядома (гэта *па-другое*), каго трэба мець на ўвазе пад назвай «строга «нацыянальна арыентаваныя». Закід сфармуляваны ў нефальсыфікавальнай вэрсіі, бо пры кожнай спробе сфальсыфікаваць тэзіс аўтар можа заявіць: але я ня іх меў на ўвазе! Прыйдзецца ўзяць на сябе рызыку і правесьці канкрэтызацыю тэрміну (хоць гэта павінен быў зрабіць сам Аўтар). Калі пад гэты тэрмін падпадаюць прадстаўнікі асяродзьдзя «ARCHE», то гляньма на назвы некаторых нумароў часопісу: «Кабеты» (там – праблемы гендэрнай тоеснасьці), «Габрэйскі нумар», «Расейскае пытаньне», а ў адным з артыкулаў аналізавалася праблема гомасэксуальнай тоеснасьці.

Калі ўжо гаворка пра нацыяналізм і «ARCHE», дык ніхто іншы, а рэдактар часопісу, Валер Булгакаў, выступіў у свой час з вострай крытыкай некаторых вэрсіяў беларускага нацыяналізму (гл.: Пра клясычныя і неклясычныя нацыяналізмы // ARCHE. 2002. № 3), што немалаважна для нашай дыскусіі, паколькі Булгакаў паказаў, наколькі неадназначным ёсьць само паняцьце нацыяналізму. Мінянкоў, аднак, трактуе нацыяналізм у духу эсэнцыялізму: як гамагенную зьяву зь нераходнай сутнасьцю. Пра эсэнцыялізм – у наступным пункце.

5. Мінянкоў закідае эсэнцыялізм якраз мне. Пасьля энэргічнай крытыкі панятку «сьвятой ідэі» і намёкаў на камунізм і нацызм піша: «*Відавочна і тэарэтычная, і палітычная абмежаванасьць такога падыходу пры тым, што Рудкоўскі цалкам справядліва адзначае ролю і значэньне нацыянальных пачуцьцяў, нацыянальнай культуры і нацыянальнай мовы*». І адразу ж: «*Тэарэтычна – гэта крайні эсэнцыялізм ды яшчэ злучаны з цалкам застарэлым арганіцызмам, нават калі мы і бласлаўляем яго аўтарытэтам Юнга*». Да чаго адносіцца аказіянальны тэрмін «гэта»? Да «сьвятой ідэі»? Але ж я ня маю зь ёй нічога супольнага: у сваім артыкуле я недвухзначна выступіў супраць абсалютызацыі нацыянальнага пачуцьця. Яно для мяне *несьвятое*. Адносіцца да падкрэсьліваньня значэньня нацыянальных пачуцьцяў? Дык жа сам Мінянкоў прызнаў, што гэта «справядліва». Не магу ўцяміць, *што* насамрэч у мяне ёсьць «крайнім эсэнцыялізмам», ды яшчэ «спалучаным з цалкам састарэлым арганіцызмам».

Я ў сваю чаргу хацеў бы ўказаць на наяўнасьць мэтадалягічнага эсэнцыялізму ў разважаньнях Мінянкова. Ня буду называць яго «крайнім» ці «цалкам састарэлым», бо такога тыпу катэгорыі пазбаўлены яснага значэньня.

Па-першае, зьвярну ўвагу на такую фразу: «*…у тым самым Асьветніцтве-Aufklärung, якое абараняе Рудкоўскі*». *Якім* «Асьветніцтве»? І католік Віко, і атэіст-бунтаўнік Вальтэр, эмпірык Юм, гуманіст Дыдро, натураліст Русо і крытык Кант – усё гэта (і ня толькі гэта!) – Асьветніцтва. Мінянкоў жа ня робіць ніякіх удакладненьняў, калі кажа, што «Рудкоўскі абараняе». Асьветніцтва ўспрынята маім крытыкам як гамагенная зьява, з раз і назаўсёды дадзенай сутнасьцю. Дастаткова, маўляў, сказаць «Асьветніцтва» – і ўсім вядома, пра што гаворка. Я некалькі разоў у сваім артыкуле стасаваў гэты тэрмін, але ўдакладняючы, *якія канкрэтныя тэндэнцыі* бяруцца пад увагу. Ну, і раз паставіўся да яго станоўча (кажучы пра *эмансыпацыйную* тэндэнцыю), а раз – крытычна (калі казаў пра стаўленьне да мітаў).

Па-другое: «…для патрыярхальнага, па сутнасьці, дыскурсу нацыябудаўніцтва пад прыглядам ці то бацькі, ці то маткі такія

праблемы проста не існуюць». Я тут ня буду браць пад увагу ўстаўку «па сутнасьці», яе наяўнасьць ня мусіць абазначаць наяўнасьць эсэнцыялізму. Зьвярну ўвагу на само прыпісаньне «дыскурсу нацыябудаўніцтва» патрыярхальнага характару. Адкуль такая наканаванасьць? Не іначай таму, што спадар Мінянкоў пазнаў *сутнасьць* такога дыскурсу і ведае, што ён па азначэньні патрыярхальны.

Па-трэцяе: «Рудкоўскі (…) узнаўляе аргумэнты пэрыяду вядомай барацьбы зь «бязродным касмапалітызмам. На жаль, аўтар безнадзейна адстаў». Хвіліначку. Навошта я прадставіў у артыкуле *два* магчымыя разуменьні касмапалітызму – «стаіцкае» і «глябалістычнае»? Касмапалітызм у другім разуменьні я скрытыкаваў, а тое «стаіцкае» нават пальцам не крануў. Дарэчы, мая характарыстыка першага тыпу касмапалітызму дэ-факта супадае з тым, што кажа Мінянкоў: «*Касмапалітызм зусім ня сьведчыць аб адмове ад свайго…*», а таксама: «*узьлюбіць трэба спачатку самога сябе, потым бліжняга свайго як самога сябе, і, нарэшце, Бога больш за самога сябе*». У мяне: «*Супольначалавечае рэалізуецца ў поліфаніі нацыянальных культураў*» і «*цераз гэтыя колы [кола сям'і, мясьціны, краіны, элінскай культуры і ўсяго сьвету] праходзіць наша любоў і добразычлівасьць: мы абавязаны добразычліва ставіцца да ўсіх людзей, але пачынаючы ад найбліжэйшых*». Вось як: спадар Мінянкоў спачатку назваў мяне «безнадзейна адсталым», а потым сам пацьвердзіў мною сказанае! Выходзіць тады, што мы абодва «безнадзейна адсталыя»…

Але справа ў іншым. Сп. Мінянкоў папросту не прызнае *дыфэрэнцыяванага падыходу* да касмапалітызму. «Касмапалітызм» (гэтаксама як і «глябалізм», «універсалізм» ці зноў жа «нацыяналізм») належыць да катэгорыі *vague terms*, так званых «тэрмінаў-вандроўнікаў», якія могуць стасавацца да розных зьяваў і выступаць у розных кантэкстах. Маючы гэта на ўвазе, я ў духу мэтадалягічнага наміналізму вылучыў два магчымыя разуменьні (або: магчымыя кантэксты ўжытку) гэтага тэрміну. Мінянкоў жа, застаючыся верным *эсэнцыялісцкай* мэтадалёгіі, успрымае касмапалітызм як аднародную зьяву, якая на гэтым этапе гісторыі набыла такую і такую форму, а хто не прызнае адзінасьці гэтай формы і

ўскладняе справу, расказваючы пра іншыя магчымыя формы, «безнадзейна адстаў».

Мінянкоў часам стасуе стратэгію высьмейваньня (параўн. «лёрэнцаўскія гусі»), а часам «нэўтралізуе» мяне пры дапамозе абвінавачаньня ў адсталасьці. Мне заўсёды здавалася, што мысьленьне ў катэгорыях «адсталае» – «прагрэсіўнае» даўно згубіла значэньне. Гэтыя дзьве катэгорыі належаць да эмацыйна-экспрэсіўнае мовы, а не да апісальна-выясьняльнай. Ажно ўзьнікае спакуса дадаць, што само стасаваньне катэгорыі «адсталасьці» ёсьць праявай адсталасьці (!), але гэта было б перагібам і вяло б адно толькі да зачараванага кола.

Крыўдна, аднак, тое, што спадар Мінянкоў, прапануючы *пачуць* адзін аднаго (а ня толькі *слухаць*), сам насамрэч нават ня слухае ўважліва. Адчуваецца нейкі патэрналісцкі падыход з боку апанэнта, устаноўка не на «гарызантальную» дыскусію, а на «вэртыкальную»: як сапраўднага «прагрэсіста» з «трохі адсталым».

Яшчэ адно ўражаньне, якое паўстала пасьля прачытаньня тэксту Мінянкова, што ён, у адрозьненьне ад мяне, насамрэч *лепш ведае, куды ісьці*, аб гэтым сьведчаць ці то наўпроставыя «павіннасьці»: «*Кожны сёньня* павінен *вучыцца быць сапраўды грамадзянінам сьвету…*», ці то ўскосныя: «*Постнацыянальнае грамадзянства, канечне, пакуль яшчэ досыць экзатычная рэч для Беларусі*» (маецца на ўвазе: а павінна ж быць іначай, будзь яна, гэта Беларусь, нармальнаю!). Я ў сваю чаргу *ня ведаю*, ці мы *павінны*, ці *не павінны* мець «нацыянальную прыпіску» (і ня трэба мне прыпісваць этыку абавязваньня ці, барані Бог, прымусу), я ведаю толькі тое, што ёсьць багата людзей, для якіх гэта прыпіска мае экзыстэнцыяльнае значэньне, і ня маю такіх амбіцыяў, каб казаць ім: вы дурныя, бо самі ня ведаеце, чаго хочаце. Мая канцэпцыя нацыябудаўніцтва сфармулявана ў імя *павагі да фактаў*.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/24
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]

[image]

*[image]*2005

ад Зьнікаў

ад Зьнікаў • крытыка • **палеміка** • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Вольга Шпарага Ад супольнасьці беларускай мовы да супольнасьцяў беларускамоўнага ўзаемадзеяньня

ВОЛЬГА ШПАРАГА (нар. у 1974 у Менску) – дацэнт дэпартамэнту філязофіі і культурных дасьледаваньняў ЭГУ, сурэдактар сайту «інтэлектуальнай супольнасьці Беларусі» і філязофска-культуралягічнага часопісу «Голос». Выпускніца філязофска-эканамічнага факультэту БДУ і спэцфакультэту «француская мова» МДЛУ. Стажавалася ў Рурскім

Тэкст Пётры Рудкоўскага здаецца мне значным крокам наперад у дыскусіі, за якой я вельмі пільна сачыла, але ў якой аніяк не магла знайсьці сабе месца. Цьмянасьць для мяне маей уласнай пазыцыі абумоўлена, на маю думку, тым, што я расейскамоўны інтэлектуал, для якога *культурная рэальнасьць беларускай мовы* адыгрывае вельмі важную ролю. І ўсё-ткі гэтая рэальнасьць увесьчасна ад мяне зьнікае. Выказаць свае меркаваньні на гэтую тэму мне і хацелася б у сувязі з тэкстам Рудкоўскага.

Пры ўважлівым чытаньні тэксту Рудкоўскага я спрабавала знайсьці ў шматстайнасьці прадстаўленых у ім дыскурсаў сугучнасьць з маімі сёньняшнімі развагамі. Мая ўвага запынілася на двух момантах. 1. На пытаньні аб грамадзянскай ідэнтычнасьці альбо bios politikos, якой, паводле Рудкоўскага ў ягонай палеміцы зь Мінянковым, недастаткова для быцьця ў канкрэтнай гісторыі і культуры; 2. На пытаньні пра мову як інструмэнт і sacrum – як бы дзьве мадэлі разуменьня мовы, якія па-сапраўднаму ўплываюць на канстытуяваньне «Беларусі». Як

мне падаецца, абмеркаваньне гэтых пытаньняў адкрывае нам два вялікія вымярэньні самаасэнсаваньня Тут і Цяпер.

Такім чынам, Рудкоўскі, аналізуючы развагі Рыгора Мінянкова пра мову, прапануе пэўную вэрсію «грамадзянскай ідэнтычнасьці», якая, на ягоную думку, адасоблена ад «культурнай ідэнтычнасьці». Такая вэрсія «грамадзянскай ідэнтычнасьці» існуе ў *сучасных сацыяльных тэорыях* і, безумоўна, мае права на існаваньне. Аднак яна зьяўляецца не толькі не адзінай, але і, на маю думку, не цалкам прадуктыўнай. У такім разе, прадуктыўнай, на маю думку, зьяўляецца супрацьлеглая ёй вэрсія, запрапанаваная ў *палітычнай тэорыі* і, у прыватнасьці, Ганнай Арэнт.

Як вядома, Арэнт распрацоўвала канцэпцыю bios politikos, супрацьлеглую Марксавай канцэпцыі сацыяльнага быцьця чалавека, якая шмат у чым вызначыла лёс сучасных *сацыяльных ідэяў*. На яе думку, чалавек найперш ня частка чалавечага роду, а ўнікальная адзінкавасьць, якая існуе разам зь іншай адзінкавасьцю, альбо словамі Нансі, што падзяляе пазыцыю Арэнт, «навідавоку» іншай адзінкавасьці. «Разам» альбо «навідавоку» азначае тут, што чалавек здольны рэалізаваць самога сябе толькі перад іншым чалавекам, выяўляючы сябе перад ім «голасна і адкрыта». Тым самым, паводле Арэнт, фармуецца публічнасьць – аснова грамадзкага жыцьця, кіраваная каштоўнасьцю самарэалізацыі адных перад іншымі. Іншымі словамі, не грамадзтва дазваляе індывіду стаць сабой, а адна асоба, што адкрыта рэалізуе сябе перад іншай асобай, утварае аснову справядлівага грамадзкага жыцьця. Спосаб такой рэалізацыі, паводле Арэнт, – чалавечае дзеяньне, зразумелае як *знаходжаньне патрэбнага слова ў патрэбны момант*, то бок мова і дыялёг.

Аднак мы пакуль ня будзем гаварыць пра маўленьне і мову, паколькі яны – прадмет роздуму наконт пытаньня 2. Пытаньне, якое цікавіць нас цяпер: ці адарваны дадзены bios politikos ад гісторыі і культуры, накшталт bios politikos сацыяльных тэорыяў? Не. Паколькі bios politikos у вэрсіі Арэнт «магчымы» не ў пэрспэктыве вечнасьці і надсусьветнага сузіраньня ўнівэрсальных законаў справядлівага жыцьця грамадзтва ці

университете г. Брюхуму. У сфэру яе навуковых інтарэсаў уваходзяць крытычная фэнамэналёгія, лацінамоўная філязофія, сучасная французская філязофія. Рыхтуе да публікацыі кнігу «Феноменология видимого мира (и ее эстетические и политические импликации)».

чалавечага роду, а ў пэрспэктыве трансцэндаваньня сваёй канцовасьці ў гісторыі, а таксама сучаснасьці; паводле Арэнт, – у пэрспэктыве ня вечнасьці, а несьмяротнасьці, не тэорыі, а дзеяньня. У гэтым сэнсе Арэнт супрацьстаўляе паняткі бесьсьмяротнасьці і вечнасьці: калі першы мае на ўвазе клопат аб трансьляваньні чалавечых словаў і справаў, то бок робіць магчымым гісторыю, то другі выступае прыстанкам ад недаўгавечных (часовых) чалавечых целаў, чым адмаўляе задачу падаўжаць сваё жыцьцё ў гісторыі. Гістарычнасьць азначае, што рэалізаваць сябе чалавек можа толькі думаючы пра *наступствы* сваіх справаў для наступных пакаленьняў і для культуры, у якіх кадыфікуюцца ягоныя каштоўнасьці разам з каштоўнасьцямі ягоных папярэднікаў і нашчадкаў.

Хіба такой мадэлі bios politikos палягае ў тым, што яна накладае пэўныя рамкі на тэарэтычныя пабудовы самой Арэнт. Сваю мадэль bios politikos яна стварае з апорай на «палітыку» антычных гарадоў-дзяржаваў, у якіх узор дзейнага героя, які імкнецца да несьмяротнасьці, і адкрытай публічнай спрэчкі сам стаў магчымы з прычыны ўласьцівага ім культурнага этасу (узьнікненьне якога, як вядома, называюць «грэцкім цудам»). У гэтым сэнсе зразумелая заява сучасных прадстаўнікоў палітычнай тэорыі Дж. Л. Коэна і Э. Арато, што мару Арэнт аб адраджэньні рэспубліканства варта прызнаць нязьдзейсьненай канчаткова і незваротна. У той жа час тыя самыя аўтары мяркуюць, што акурат сучасная тэорыя грамадзянскай супольнасьці з апорай, у тым ліку, на пабудовы Арэнт, дазволіць разьвязаць тыя супярэчнасьці заходняй дэмакратыі, пра якія прынята казаць сёньня.

Аднак вернемся да нашых зыходных пытаньняў. Пазыцыя Арэнт ня толькі дазваляе зьвязаць «грамадзянскую ідэнтычнасьць» з кантэкстам гісторыі і культуры, але, як мне здаецца, дазваляе прапанаваць альтэрнатыву пазыцыі «лібэралізму нэўтральнасьці» ў разглядзе Палескага. Нарматыўная палітычная тэорыя Арэнт дазваляе нам убачыць, што любая *адзінка* рэалізуе сябе і з прычыны сваёй унікальнасьці, і з прычыны свайго *су-існаваньня* з унікальнасьцямі іншых, і яе задача палягае ў тым, каб *рэалізаваць сябе акурат у полі су-існаваньня*, а не насуперак яму. Для гэтага, паводле Арэнт,

чалавеку трэба падпарадкавацца правілам і нормам, якія дзейнічаюць у полі публічнасьці і здольныя весьці да доўгатрываласьці і, магчыма, неўміручасьці, але не да вечнасьці. Тут гаворка наўрад ці павінна ісьці пра нэўтралітэт, а, хутчэй, пра *ўзаемадзеяньне на карысьць гісторыі і культуры*, у якім працягваў бы трансьлявацца досьвед самаажыцьцяўленьня адных перад іншымі. Зразумела, што ў кожную новую эпоху гэты досьвед будзе набываць новыя канфігурацыі і рысы, як і будзе мець небясьпеку зьнікненьня – як гэта здараецца ў сытуацыі таталітарызму – на час ці нават назаўсёды.

2. Як можна было б вывесьці з прыведзеных вышэй роздумаў пра тэорыю Арэнт, *мова* ў яе разуменьні – гэта ня сродак і ня сакрум (хаця сакрум, як мне здаецца, можна разгледзець як складнік яе канцэпцыі мовы). Пры гэтым варта ўлічваць, што Арэнт была вучаніцай і пасьлядоўніцай Гайдэгера, зь якім, тым ня менш, з прычыны гістарычнай канстэляцыі, у яе былі вельмі няпростыя адносіны.

Мова ў канцэпцыі Арэнт – гэта маўленьне, найшчыльнейшым чынам пераплеценае зь дзеяньнем. У гэтым сэнсе Арэнт адзначае, што калі б мова была ўсяго толькі сродкам для ажыцьцяўленьня чалавечага дзеяньня, то яна б была замененая нейкай знакавай сыстэмай, якая б больш адпавядала сваім задачам. Гэтага не адбываецца, таму што абстрактная знакавая сыстэма (напрыклад, матэматычная) здольная выявіць «што» пэўнага становішча рэчаў, але ня здольная паказаць нам «хто» ўчынку і дзеяньня. Пры гэтым адзін размоўца адкрыты і дасяжны іншаму ў большай меры, чым самому сабе, альбо нават застаецца назаўсёды ўтоеным ад сябе самога. Аднак такое выяўленьне «хто» ў жывой гаворцы магчымае, паводле Арэнт, толькі там, «дзе людзі гавораць і дзейнічаюць адзін з адным, а не адзін замест аднаго і не адзін супраць аднаго».

Такім чынам, калі вярнуцца да першага пункту роздумаў пра гістарычную і культурную рэалізацыю публічнасьці і быцьця ў ёй, то мова становіцца неабходным складнікам такой рэалізацыі. Прычым мова не як сродак, а як дзеяньне, якое выяўляе мноства ўзаемадзейных і су-часных адзін аднаму «хто».

Аднак як зьвязаць гэтыя роздумы з канкрэтным выбарам беларускай ці расейскай мовы? Для адказу на гэтае пытаньне рэзюмую сваю пазыцыю.

Сьледам за Мінянковым я мяркую, што пытаньне пра *грамадзянскую ідэнтычнасьць*, якая, праўда, канкрэтызуецца як удзел у канструяваньні публічнай сфэры, ёсьць адным з цэнтральных для сучаснай Беларусі, паколькі яна ўсё яшчэ пакутуе ад сваёй савецкай спадчыны, і канструяваньне грамадзянскай ідэнтычнасьці – адзін з шляхоў пераадоленьня гэтага. Аднак, на мой погляд, такая ідэнтычнасьць ня ёсьць і ня можа быць нэўтральным канструктам, то бок яна павінна разглядацца ў аспэкце рэалізацыі аднаго чалавека перад другім, што мае канкрэтную культурна-гістарычную форму. І з прычыны таго, што спосабам рэалізацыі такой ідэнтычнасьці зьяўляецца дзеяньне-мова, то пытаньне пра мову ня ёсьць нечым другасным і лішнім. Пры гэтым аказваецца, пытаньне сапраўды ня ў мове як такой, а ў разуменьні зьвязанага зь ёй комплексу культурнага і гістарычнага жыцьця: калі мова – гэта заўсёды актыўны складнік культурна-гістарычнай *грамадзянскай ідэнтычнасьці*, то пачаць неабходна з пытаньня, як мы разумеем і інтэрпрэтуем *беларускую гісторыю і культуру*.

Думаю, што пры ўсёй складанасьці такога разуменьня (якое прыводзіць, у вэрсіі Акудовіча, да «архіпэлягу»), беларуская мова ня выключаная зь яго. Скажам іначай: калі б выключылі беларускую мову, мы б зьдзейсьнілі непапраўную памылку, таму што гэтая мова, нягледзячы на ўсе пэрыпэтыі неляяльнай да яе гісторыі, выстаяла, і *ёй ёсьць што апавесьці нам пра нашую гісторыю і культуру, што дазволіць тым самым стварыць сучасную форму нашага публічнага, і ня толькі, быцьця ў іх*!

Аднак як у такой сытуацыі быць расейскамоўным беларускім інтэлектуалам, нават тым, хто, як я, пасіўна валодае мовай? Як здаецца, яны яшчэ не існуюць як супольнасьць беларускай мовы, утвораная паводле мадэлі – *ад мовы да супольнасьці*? Але ці ня ёсьць гэтая фармулёўка супольнасьці толькі адной з фармулёвак, якая можа быць дапоўненая іншай – *ад супольнасьці да мовы*? Тым самым я не жадаю вярнуцца да пазыцыі, якую сама паставіла пад пытаньне: сьпярша

нэўтральная грамадзянская ідэнтычнасьць, потым – ідэнтычнасьць культурная. Ідзецца пра іншае. Ідзецца пра неабходнасьць пашырэньня супольнасьці беларускай мовы, якая б абапіралася на прынцып узаемадзеяньня яе ўдзельнікаў з удзельнікамі расейскамоўных супольнасьцяў, з абавязковым улучэньнем у кантэксьце іншых складнікаў складніка моўнага. Іншымі словамі, ідзецца пра вынаход новых спосабаў беларускамоўнай культурнай палітыкі, значна больш *лякальных* і *спэцыяльных (спэцыялізаваных)*, чым тыя, якія прапануе Рудкоўскі. Прычым, як мне здаецца, рух ад *супольнасьці беларускай мовы да супольнасьці беларускамоўнага ўзаемадзеяньня* павінен быць двухбаковы: я практычна перакананая, што ў выпадку любога расейскамоўнага беларускага інтэлектуала знойдзецца галіна, у сувязі зь якой ён хацеў бы засвоіць беларускую мову (такая мадэль, як мне здаецца, можа быць дзейсная ня толькі ў выпадку інтэлектуалаў). Яшчэ іначай: рухацца трэба ад *сумеснага* разьвязаньня канкрэтных прафэсійных і іншых задачаў, у якіх можа быць задзейнічаная беларуская мова. Асабіста для мяне, напрыклад, было б цікава пачаць складаньне слоўніку філязофскіх тэрмінаў на беларускай мове, у сваёй расейскамоўнай супольнасьці я знайду тых, хто мяне падтрымае, цяпер неабходна аб'яднаць намаганьні зь беларускамоўным бокам.

Калі ж вярнуцца да маіх, прыведзеных вышэй, тэарэтычных пабудоваў, то ядром пашырэньня беларускамоўнай супольнасьці павінна быць *адкрытая самарэалізацыя адных перад другімі, то бок, як мне падаецца, сумленнасьць і адкрытасьць перад самім сабой і іншымі, найперш у сваёй любові да беларускай мовы, беларускай культуры і беларускай гісторыі*. Іншымі словамі, трэба ствараць сумесную прастору (альбо сумесныя прасторы) самарэалізацыі на беларускай мове, якая і дазволіць перайсьці *ад супольнасьці беларускай мовы да супольнасьці(яў) беларускамоўнага ўзаемадзеньня*.

І апошняе: у пэўным сэнсе я – толькі прыклад «моўнай сытуацыі» ў Беларусі, «з дапамогай якога» можна шукаць новыя спосабы аналізу і пераўтварэньня гэтай сытуацыі.

З расейскай
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/24
[image]

Мінулыя (1’2000)

[image]
ARCHE Пачатак № 6 (40) - 2005
[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]
[image] [image]2005
[image]
[image]
[image]

гэтым трэба нешта рабіць!» – падумаў я і нават напісаў ліст з гэтымі думкамі самаму знакамітаму з тагачасных гарадзенцаў Васілю Быкаву. Я ня быў зь ім асабіста знаёмы, таму ня ведаў, што ў яго самога ў той час былі вялікія праблемы з уладамі з нагоды тых самых думак. Адказу на свой ліст я не дачакаў.

У 1970-я гады ў Беларусі па-беларуску ня толькі не гаварылі, а нават і думаць па-беларуску было небясьпечна. Быкава, Карпюка і іх сяброў патроху зацісkалі за тое, што яны больш думалі і дбалі пра беларускае, а не пра «новую историческую общность людей – советский народ».

Шмат хто ўжо забыўся пра тыя часы, калі беларуская мова была амаль мёртвая. Калі і сама Беларусь амаль зьнікла, здавалася нейкай уяўнай мінуўшчынай, прыкладна такой, як скіфы, сарматы, яцьвягі ці крывічы.

Каб зразумець сучасны стан Беларусі, неабходна памятаць пра Беларусь эпохі Машэрава ці часоў «разьвітага сацыялізму». Тое, што мы бачым сёньня, у параўнаньні з тымі часамі – гэта цуд, гэта паўстаньне зь мёртвых. Пасьля словаў «Жыве Беларусь» больш ня трэба ставіць «?», а сьмела можна ставіць «!». Больш за тое, можна проста ставіць кропку, бо яна, Беларусь, сапраўды жыве і не зьбіраецца паміраць. Толькі барані нас Божа забыцца пра тое, што яшчэ 25–30 гадоў таму Беларусь была ў стане клінічнай сьмерці.

Мне, напэўна, гэта відаць лепш, чым іншым. Я добра памятаю 1970-я гады, памятаю свой сум і жаль з нагоды поўнага заняпаду беларушчыны. А потым я дваццаць гадоў жыў за межамі Беларусі. Я ня бачыў пачатку Адраджэньня ў 1980-я гады, нават ня ведаў і не здагадваўся пра гэта. Тое, што даходзіла да мяне ў Ленінградзе зь беларускай культуры, ня сьведчыла пра наяўнасьць Адраджэньня. Збольшага гэта былі п'есы Аляксея Дударава «Парог» і «Радавыя» ў БДТ, фільм «Белыя росы» з расейскімі акторамі ў галоўных ролях, кнігі Сьвятланы Алексіевіч ды Алеся Адамовіча ў суаўтарстве з Данііламі Граніным, лубочныя «Песьняры». Не мянялі гэтага ўражаньня ні «Дзікае паляваньне караля Стаха» на шырокім усесаюзным экране, ні цікавасьць выдатных рэжысэраў Ларысы Шапіцькі ды Элема Клімава да якаснага беларускага

літаратурнага матэрыялу ў фільмах «Сотнікаў» і «Ідзі і глядзі». Былі, праўда, і невялікія радасьці, напрыклад, калі прыдбаў альбом Арлена Кашкурэвіча або калі хтосьці прывозіў зь Беларусі новую кніжку Конана ці Падокшына. Нават напрыканцы перабудовы агіднае ўражаньне ад чарнасоценнай пісаніны Бегуна і Боўша не пераважвалася захапленьнем ад лідэрскіх дзеяньняў Алеся Адамовіча.

Так, мне не пашанцавала ўдзельнічаць у пачатку Адраджэньня. Але ж лёс літасьцівы: праз гэта я чыстым, незаангажаваным зрокам убачыў вынікі Адраджэньня, калі вярнуўся на радзіму ў 1994 годзе. Можа, таму я бачу ўсё гэта лепш, чым тыя, хто браў непасрэдны ўдзел у Адраджэньні, ці тыя, на чыіх вачах Адраджэньне разгортвалася і рабіла маленькія посьпехі, якія, можа, і не заўважныя як такія, але ж уражваюць, калі бачыш іх у падсумаваным выглядзе.

Трэба, напэўна, згадаць некаторыя найяскравейшыя ўражаньні. Напрыклад, навуковая канфэрэнцыя ў сьнежні 1993 году, дзе я быў яшчэ «маскоўскім госьцем», на якой амаль палова выступаў была на беларускай мове. Уражаньне, праўда, трохі змазалася тым, што прафэсар Самсонаў аблаяў мяне «маскалём» – я не пакрыўдаваў, палічыўшы гэты выпадак простай недарэчнасьцю і патлумачыўшы яго асабістымі рысамі характару прафэсара. Другі прыклад – 1994-ты, Гомель. Я быў запрошаны выступіць на абласной жнівеньскай пэднарадзе. Усе гомельскія выступоўцы, пачынаючы ад мэра Сьвятланы Гальдадэ, гаварылі па-беларуску. Лета 1994 году было пікам беларусізацыі, ужо з восені пачаўся адваротны працэс. Але ж тое грунтоўнае, што было зроблена да таго часу, ужо ня зьнікне. Праўда, ня ўсё, што было зроблена, было грунтоўнае, таксама было шмат тлуму і сьмецьця.

Як бы мы ні ставіліся да стану беларускай культуры сёньня, яе сучасны стан не ідзе ні ў якое параўнаньне з тым, што было 25–30 гадоў таму.

Прыйдзе час, і на тым грунтоўным, што было створана на першым этапе Адраджэньня, як на падмурку, можна будзе працягваць будаваць Беларусь. А што рабіць з тым тлумам? З тымі глупствамі, якія таксама засталіся з тых часоў?

Цяпер Адраджэньне перапынена на 12 гадоў. Але ж я не магу лічыць гэтыя 12 гадоў толькі заняпадам. Грунтоўная праца працягвалася і працягваецца. Пішуцца кнігі, распрацоўваецца навуковая лексыка, складаюцца вершы. Па-беларуску часам гавораць на навуковых канфэрэнцыях, усё часьцей на набажэнствах у розных цэрквах, на дыпляматычным узроўні. Чаго варты той факт, што цяперашні амэрыканскі амбасадар навучыўся гаварыць па-беларуску і зьвяртаецца да грамадзянаў Беларусі на нашай роднай мове. Дый я сам пачаў гаварыць і пісаць па-беларуску акурат у гэты час. Натуральна, мой асабісты досьвед і прыклад не пераканаўчы для ўсіх. Тады падлічыце частку беларускамоўнай рэклямы ў параўнаньні з той, што была раней. Не, гэты этап у беларускім Адраджэньні нельга лічыць цалкам страчаным. Проста ён не папулісцкі, беларусізацыя павольна цячэ на глыбіні, што не заўжды відаць звонку.

У 1980-я – 1990-я гады беларускамоўная частка агульнабеларускай культуры гадавалася, а цяпер яна ўжо канкуруе ў шмат якіх галінах з расейскамоўнай. Да пачатку Адраджэньня толькі беларускамоўная мастацкая літаратура і тэатар былі тым сэгмэнтам, дзе культурная лідэрства безумоўна належала беларускай мове. Сёньня гэта можна назіраць у частцы гуманітарных навук, у моладзевай музыцы. У філязофіі беларускамоўныя часопісы і выкладаньне канкуруе з расейскамоўным.

І яшчэ адзін момант мне падаецца істотным, хоць, можа, і праблемным. Гэта тычыцца трасянкі. Зьявай якой моўнай рэчаіснасьці трэба разглядаць трасянку? Відавочна, што трасянка – гэта не дыялект, не арго, ня слэнг. Гэта варыяцыі маўленьня. Але гэта маўленьне носьбітаў якой мовы? Доўгі час лічылася, што трасянкай гавораць носьбіты беларускай мовы ў расейскамоўным асяродзьдзі і пры зьмене моўнага субстрату. Здаецца, апошнім часам трасянкаю загаварылі расейскамоўныя жыхары нашай краіны. Расейская мова ў Беларусі пачала зьмяняцца пад уплывам беларускай, і гэты ўплыў увесь час мацнее. Інтуіцыйнае адчуваньне гэтага працэсу сустракаецца шмат у каго, а Ігар Бабкоў сфармуляваў гэтае адчуваньне ў прапанове называць расейскую мову, распаўсюджаную ў

Беларусі, «руским языком», менавіта так: «руским языком» з адной літарай «с», у адрозьненьне ад «русского языка», якім карыстаюцца ў Расеі. Здольнасьць моваў уплываць на іншыя сьведчыць, напэўна, пра жыцьцяздольнасьць гэтых моваў. Хоць у гэтым пытаньні варта было б дачакацца спэцыяльных лінгвістычных дасьледаваньняў, дый, можа быць, патрэбная была б разгорнутая тэарэтычная дыскусія ў беларускім мовазнаўстве і славістыцы.

Калісьці мне давялося сфармуляваць тэзу пра адасобленае існаваньне моваў і людзей (Особенности национальных отношений на фоне культурных катастроф // Белорусский климат. 1997. № 4;)*. Мовы разьвіваюцца і эвалюцыянуюць у сваёй рэчаіснасьці, а людзі дзейнічаюць у сваёй. Хоць гэтых сваіх паралельных рэчаіснасьцяў яны істотна ўплываюць адно на аднаго. Але ж мовы ня гінуць зь меркаваньняў і пажаданьняў людзей, а людзі часам дзейнічаюць насупярэк тэндэнцыям разьвіцьця мовы. Гэта як з падворам: яно не залежыць ад таго, як мы яго асьвяркоўваем, не залежыць ад шаманскіх заклёнаў. Можа, парэнаныя мовы з падворам надаюцца параўнаньням, але гэтае парэнаныя адлюстроўвае адзіны прынцып. Гэтым прынцыпам я круюся ў дачыненьні да моўнага пытаньня ўжо шмат гадоў. (Беларусь: вопреки очевидности // Культурная политика. 1994. № 0;)

Адна часова я разумею, што адасобленае жыцьцё моваў і людзей наводле прынцыпу можна канстатаваць у творы ды філязофіі, а калі на практыцы існуе моўная палітыка, то палітыка — гэта ўжо справа людзей. Людзі робяць палітыку, у тым ліку і моўную. Але і тут трэба адрозьніваць палітыку як такую і культурную палітыку, часткай якой трэба разглядаць моўную палітыку. Менавіта гэтаму і быў прысьвечаны згаданы вышэй тэкст у часопісе «Культурная политика».

Стало банальным утверждать, что каждое меньшинство вносит свой вклад в богатство страны. Культурное и этническое разнообразие есть благо для народа и неоценимое достояние. Культура жива только в трансляции и реализации себя. Для трансляции нужны преемственность традиции, фольклора; ремесел, образа жизни, нужны семейные связи и длинные цепи семейных поколений, необходимо знание языков. Люди в Беларуси жили отдельно от традиции, от преемственности семей, от языков.

За два века в Беларуси несколько раз сменялась доминирующая конфессия: исчезли автохтонные протестанты, зато стали распространяться харизматические течения, завезенные из Америки, сократилась численность католиков, уничтожено уцелевшее, прекратилась традиция иудейства с хасидизмом после исхода евреев.

Через каждые несколько поколений жители Беларуси начинали говорить на другом языке. Поэтому они с недоверием относятся к свидетельствам прошлого, как чуждым. Да и

Раздельная жизнь людей и языков

Корабель спатыкаецца аб камень, ён ідзе ў абыход, ці ён ідзе ў абыход, таму што ён ня можа ісьці наўпрасткі? Ён ідзе ў абыход, таму што ён ня можа ісьці наўпрасткі. Ён ня можа ісьці наўпрасткі, таму што ён ідзе ў абыход.

супольнасьці, супрацьстаўляць іх адну адной – так мы трапляем у звычайную палітыку. А калі мы робім гэта ня вельмі ўдала і карэктна, дык ня проста трапляем у звычайную палітыку, а займаемся бруднай палітыкай.

Магу спаслацца на два яскравыя ўзоры таго і другога. Досыць тыповым прыкладам культурна-палітычнае зьявы я прапанаваў бы лічыць завочную камунікацыю, якую арганізавала рэдакцыя «ARCHE» (2004, № 5), а досыць характэрным прыкладам пераходу з моўнай палітыкі да палітыкі звычайнай я лічыў бы апошнюю дыскусію летам 2005 году (яна разгарнулася на старонках розных выданьняў, але сайт «Наше мнение» надаваў ёй, здаецца, найвялікшую ўвагу). Менавіта параўнаньне выказваньняў інтэлектуалаў у першым выпадку і ў другім яскрава сьведчыць пра тое, які розны падыход да моўнага пытаньня ў рамках культурнай палітыкі, з аднаго боку, і звычайнай палітыкі, зь іншага боку. Ня буду (можа, пакуль) выносіць канчатковага вэрдыкту аб выніках гэтых дыскусіяў, зьвярну ўвагу на некалькі акалічнасьцяў.

Я б адзначыў розьніцу ў дыскурсе і танальнасьці выказваньняў тых, прозьвішчы каго можна бачыць сярод удзельнікаў абедзьвюх вышэйпазначаных дыскусіяў. Так, Сяргей Панькоўскі ў першай дыскусіі піша:

Таму на пытаньне пра дзьве дзяржаўныя мовы пакуль я б адказаў хутчэй «так». Іншая рэч, трэба думаць аб захадах, якія б забясьпечылі рэальнае раўнапраўе дзьвюх моваў, з паступовым ростам прэваляваньня беларускай. Гэта значыць, на мой погляд, натуральна, у ідэале галоўнай мовай павінна быць беларуская. Але ігнараваць расейскую, мне здаецца, цяпер проста культурна і палітычна немэтазгодна. І ня трэба сьпяшацца. Рэвалюцыі заўсёды рэч небясьпечная.

А вось так заканчваецца артыкул на сайце «Наше мнение», палітыку якога Сяргей Панькоўскі вызначае:

Важно понять, что белорусское общество обречено быть

двуязычным, обречено на стигмату культурной трещины. Исходить нужно именно из этого. Возможен ли здесь какой-нибудь удачный симбиоз? Один такой «удачный креольский симбиоз» нами уже получен. С его «формообразующей» фашизоидной трасянкой. Не думаю, что повторный эксперимент будет более удачным. Посему нам необходимо не столько молиться на перспективы «единства», сколько пытаться договориться о минимальных правилах мордобоя. Пусть они будут написаны на двух языках.

У першым выпадку гаворыцца пра «паступовы рост прэваляваньня беларускай», а ў другім – пра тое, «что белорусское общество обречено быть двуязычным, обречено на стигмату культурной трещины».

Адразу ж падкрэсьлю, што лічу Сяргея Панькоўскага адным з найбольш разважлівых, грунтоўных, адукаваных мысьляроў сярод тых, хто часта зьяўляецца ў мэдыях. Цалкам пагаджаюся з такімі яго словамі з адказаў на пытаньні «ARCHE»:

Пытаньне пра нацыянальную мову павінна стаць прадметам шырокай грамадзкай дыскусіі, удумлівай, далікатнай, сьвядома арыентаванай не на разьмежаваньне, а на гатоўнасьць і жаданьне знайсьці ў грамадзтве згоду, больш ці менш кампраміснае рашэньне, на разуменьне таго, што мы – адзін народ, адрозны ад іншых, і сярод нас, «сваіх», павінны імкнуцца з павагаю і дэмакратычна ставіцца адно да аднаго. Адзінства не азначае выключэньня адрозьненьняў. На жаль, *цяпер пануючы палітычны стыль накіраваны на здушэньне альтэрнатываў, распальваньне недаверу і супярэчнасьцяў унутры грамадзтва, трактоўку адрозьненьня як варожасьці.*

Сапраўды: на жаль! Таму што «пануючаму палітычнаму стылю» аддаюць перавагу ў камандзе, якая пануе на сайце «Наше мнение». Ня ведаю, ці належыць да гэтае каманды Сяргей Панькоўскі, але вось як пра гэта гаворыць Янаў Палескі, сапраўднае прозьвішча якога выпадкова таксама Панькоўскі: «*Я отношу себя к команде «кантианцев» по той преимущественно*

причине, что с ними меня объединяет игра против патологии национального чувства, столь чуждого либерально-демократическому этосу» і «полагаю, что я не погрешу против командной стратегии». Тое, што гэтая «каманда» называецца «кантыянскай», лібэральна-дэмакратычнай, касмапалітычнай і гэтак далей, ня робіць яе чымсьці іншым, чым адным з бакоў у супрацьстаяньні, якое адбываецца ў атмасфэры «*пануючага палітычнага стылю*», які «*накіраваны на здушэньне альтэрнатываў, распальваньне недаверу і супярэчнасьцяў унутры грамадзтва, трактоўку адрозьненьня як варожасьці*».

Спрошчаныя філязофіі гісторыі сьцьвярджаюць, што супрацьстаяньне палітычных партыяў можна патлумачыць нейкім адным прынцыпам, напрыклад, «стаўленьнем да сродкаў вытворчасьці» ці больш агульнымі эканамічнымі ды ідэалягічнымі катэгорыямі. Практыка ж паказвае, што палітычнае супрацьстаяньне і распальваньне варожасьці паміж рознымі групамі ў грамадзтве можа ўзьнікнуць на любой, нават выпадковай падставе, як парадыйныя сўіфтаўскія «тупаканечнікі і востраканечнікі». Разьмежаваньне з пабудовай адпаведнай барыкады можа ўзьнікнуць паміж супраціўнікамі ці прыхільнікамі абортаў з такім самым посьпехам, як і паміж каталікамі і пратэстантамі, паміж лібэралістамі і кейнсіянцамі. Асабліва тады, калі гэтаму спрыяе стан палітычнай культуры, тым больш, калі гэтае супрацьстаяньне стымулюецца тымі, каму яно на карысьць.

У чым карысьць канфліктаў паміж беларуска- і расейскамоўнымі ў Беларусі? Хто можа быць зацікаўлены ў эскаляцыі гэтых канфліктаў? Можа, тыя, хто занепакоены сучасным становішчам беларускай мовы ў самой Беларусі? Мяркую, што не. Занепакоеныя сучасным становішчам мовы і яе разьвіцьцём зацікаўлены ў тым, пра што Панькоўскі піша ў «ARCHE», што «*пытаньне пра нацыянальную мову павінна стаць прадметам шырокай грамадзкай дыскусіі…*» і што «*адзінства не азначае выключэньня адрозьненьняў*». Можа быць, у варожасьці зацікаўленыя прыхільнікі русіфікаціі? Гэта ўжо хутчэй, але ж не яны ўдзельнічалі ў дыскусіі, пра якую вядзецца гаворка. Ніводны з удзельнікаў не пазначыў сябе такім чынам.

Існуе звычайная практыка, амаль ад старажытнарымскіх часоў («падзяляй і валадар»), што ў палітычных канфліктах, асабліва безвыніковых, у эскаляцыі варожасьці зацікаўлены трэці бок, які праз гэта імкнецца замаскаваць, схаваць сапраўдныя супярэчнасьці.

Мне падаецца, што абвастрэньне моўнае дыскусіі летам 2005 году – гэта тыповы «перавод стрэлак», як гэта гучыць на чыгуначным жаргоне, каб накіраваць цягнік у нейкім іншым кірунку. Я пісаў пра гэта ў адным з аспэктаў, хоць існуюць і іншыя.

Мне падаецца, што перад інтэлектуаламі ў Беларусі, і беларускамоўнымі, і расейскамоўнымі, паўстала катэгарычнае пытаньне: ці мы, абодва бакі адзінай супольнасьці, зацікаўленыя ў вэрбалістыцы і схалястыцы або, усё ж такі, мы зацікаўленыя ў практычным вырашэньні культурна-палітычных праблемаў, у тым ліку і моўнай? Калі першае, то мы можам працягваць сварыцца паміж сабой, захоўваючы сёньняшні «пануючы палітычны стыль» і дыктатуру. Калі другое, то нам патрэбны дыялёг і, галоўнае, супрацоўніцтва і адзінства ў пераадоленьні перашкодаў на шляху вырашэньня культурна-палітычных праблемаў, і моўнай праблемы ў тым ліку. Другое – цяжэйшае. Вэрбалістыка – прасьцейшая. Што выбіраюць інтэлектуалы? І чым кіруюцца інтэлектуалы ў сваім выбары? Здаецца, што ў моўным пытаньні беларускія інтэлектуалы нічым не адрозьніваюцца ад перапалоханых «обывателей».

Пры абмеркаваньні будучыні немагчыма кіравацца здаровым сэнсам, статыстыкай ці наіўным рэалізмам. Нагадаю, што калі б нехта ў 1970-х прагназаваў лёс беларускай мовы на падставе статыстыкі яе ўжываньня, то, напэўна, вымушаны быў бы лічыць, што ёй засталося існаваць гадоў 10–20. Ні здаровы сэнс, ні статыстыка не маглі прадказаць культурнай рэвалюцыі другой паловы 1980-х, калі беларуская мова адрадзілася.

Нэакантыянец Конрад Лётцэ казаў: «Тое, што мае быць, зьяўляецца падставай таго, што ёсьць». Акурат гэтым прынцыпам вызначаецца стаўленьне інтэлектуала да сучаснасьці, менавіта кіруючыся гэтым прынцыпам мы здольныя ўбачыць парасткі будучыні ў сучаснасьці. Наша

будучыня зьвязаная зь беларускай мовай, таму і сёньня мы павінны ставіцца да моўнага пытаньня з пункту гледжаньня будучыні. Наш догляд, наш клопат, нашая ўвага найперш патрэбныя таму, што павінна квітнець у будучыні. Зь дзьвюх моваў, распаўсюджаных сёньня ў Беларусі, наш клопат, догляд і ўвага належаць беларускай мове. Толькі ня трэба блытаць клопат і догляд зь мітусьнёй і енчаньнем. Енчыць трэба пры пахаваньні. Не сьпяшайцеся хаваць тое, што заўтра расквітнее.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/24
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

палеміка [image]2005

"да Зьвяту"

ана**літыка** • крытыка • **палеміка** • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

ЮРЫ ДРАКАХРУСТ (нар. 20 чэрвеня 1960 году ў Хабараўску) – публіцыст, палітычны аналітык, супрацоўнік беларускай службы радыё «Свабода». У «ARCHE» выступае з палемікай.

Юры Дракахруст Сэанс чорнай магіі і яе выкрыцьцё

А подлы Фагот, ён жа Кароўеў, пракрычаў:
– Вось, паважаныя грамадзяне, адзін з выпадкаў выкрыцьця, якога гэтак назольна дамагаўся Аркадзь Апалонавіч!

М. Булгакаў. «Майстар і Маргарыта»

Як памятаюць чытачы булгакаўскага раману, менавіта старшыня акустычнай камісіі маскоўскіх тэатраў Аркадзь Семпляяраў падчас маскоўскай імпрэзы мэсіра Воланда гучней за ўсіх патрабаваў выкрыцьця. Тое, чаго ён гэтак дамагаўся, і насамрэч адбылося, але зусім ня так, як уяўлялася Аркадзю Апалонавічу.

У артыкуле «Міты беларускай сацыялёгіі», надрукаваным у мінулым нумары «ARCHE», ягоны аўтар Мікола Кацук абвінаваціў калегаў-сацыёлягаў у некампэтэнтнасьці. Адным з прыкладаў такой некампэтэнтнасьці ён назваў сувязь, выяўленую ў шэрагу дасьледаваньняў паміж полам і стаўленьнем да кіраўніка дзяржавы – жанчыны больш схільныя давяраць Аляксандру Лукашэнку, галасаваць за яго і г. д. Варта

сказаць, што асэнсаваньнем гэтай карэляцыі, вывадам зь яе пэўных высноваў (памылковых ці не) займаліся ў асноўным адмыслоўцы іншых галінаў гуманітарнай веды, а не сацыёлягі.

Але тут прыйшоў Кацук. Прыйшоў і абвясьціў, што з пункту гледжаньня навукі думка, паводле якой жанчыны галасуюць за Лукашэнку, – гэта міт. Каб абвергнуць міт, наш паважаны апанэнт збудаваў мадэль дыскрымінантнага аналізу, у якой у якасьці залежнай пераменнай, якая падлягае тлумачэньню, выступаў давер/недавер да прэзыдэнта, а ў якасьці незалежных – рэгіён, узрост, адукацыя і інтэнсіўнасьць спажываньня розных крыніцаў інфармацыі. Пол у мадэлі Кацука выявіўся статыстычна нязначным. «Сувязі полу са стаўленьнем да прэзыдэнта ня варта надаваць значэньня», – зрабіў ён выснову. Прыйсьці да яе можна, «калі ўмець» – такімі словамі скончыў сацыёляг свой артыкул.

Сапраўды, калі ўмець, можна шмат чаго дасягнуць, але чаго менавіта дасягнуць, залежыць ад таго, што менавіта ўмець. Калі ўмець карыстацца стандартнай кампутарнай праграмай апрацоўкі статыстычных зьвестак, можна на «выдатна» здаць унівэрсытэцкі іспыт. Для таго, каб дасягнуць нечага большага, трэба і ўмець крыху іншае – напрыклад, разумець сэнс ужываных мэтадаў.

Цікава, што ў сваім артыкуле спадар Кацук сам жа і прадэманстраваў, што з апошнім мае пэўныя праблемы. Каб паказаць сваю перавагу над недасьведчанымі «чыстымі» гуманітарыямі, ён прывёў хрэстаматыйны прыклад «ілжывай карэляцыі» (spurious correlation): пры вялікай колькасьці пажарных пажар робіць большую шкоду. Насамрэч прычына такой абсурднай сувязі палягае ў тым, што шмат пажарных выкарыстоўваецца на вялікіх пажарах, якія, зразумела ж, робяць большыя разбурэньні.

Паўшчуваўшы такім чынам прафанаў, Мікола Кацук вяртаецца да разгляду праблемы з даверам да прэзыдэнта і піша: «Уплыў полу на галасаваньне ажыцьцяўляецца апасродкавана». Вось – расьпісаўся і пячатку паставіў.

Рэч у тым, што наш паважаны апанэнт, павучаючы іншых пра

парадак прычынных сувязяў, сам жа ў ім і заблытаўся. У прыкладзе пра пажары трэці фактар – маштаб пажару – абумоўлівае адначасна і маштабы разбурэньняў, і колькасьць пажарных, якая выкарыстоўваецца для барацьбы са стыхіяй. Трэці, дадатковы чыньнік абумоўлівае абодва першапачатковыя (anteceding case). У той жа час сытуацыя з полам і даверам да прэзыдэнта зусім іншая. Мікола Кацук – дастаткова дарослы мужчына, і мог бы ўжо ведаць, што пол – характарыстыка, не абумоўленая ні адукацыяй, ні ўзростам, ні месцам жыхарства. У ягонай мадэлі кірунак прычыннай сувязі паміж полам, даверам да прэзыдэнта і іншымі ўжыванымі пераменнымі пасьлядоўны: ад полу на гэтых пераменных і да даверу (intervening case). Фактар полу выяўляецца зьвязаным з даверам праз узрост. Але ж менавіта зьвязаным. І сам аўтар гэта, здаецца, выдатна разумее – і тады, калі піша пра «апасродкаваную сувязь», і тады, калі заўважае, што «сярод людзей сталага веку жанчыны пераважаюць».

Дарэчы, цытаваная Міколам Кацуком Альміра Ўсманава, тэзу якой ён спрабуе абвергнуць, таксама прыводзіць фактар-пасярэднік, празь які, на яе думку, пол зьвязаны з даверам да прэзыдэнта, калі піша: «Чаму жанчыны галасуюць за Лукашэнку? Яны галасуюць ня столькі за яго, колькі за ідэю сацыяльнай дзяржавы і за ўласную стабільнасьць і спакой». Калі перавесьці тлумачэньне спадарыні Ўсманавай на больш фармалізаваную мову, існуе характарыстыка-пасярэднік: «імкненьне да ўласнай стабільнасьці і спакою», якая ў сярэднім уласьцівая жанчынам больш, чым моцнаму полу. А паколькі гэтае імкненьне спараджае і большы давер да прэзыдэнта, то атрымліваецца, што жанчыны больш давяраюць Аляксандру Лукашэнку. А які ж вынік даюць матэматычныя цуды, яўленыя спадаром Кацуком? Існуе набор характарыстык-пасярэднікаў, напрыклад, узрост, празь якія пол зьвязаны з даверам да прэзыдэнта. Вось і ўся розьніца.

Калі б Мікола Кацук абмежаваўся сьціплым апісаньнем мэханізму сувязі, ягоныя высілкі можна было б толькі ўхваліць. У любым разе ня варта было стамляць чытача раскручваньнем гэтага лягічнага ланцужка. Але гэта патрэбна, каб паказаць усю недарэчнасьць высновы, якую з такім імпэтам абвяшчае наш

майстра дыскрымінацыйнага аналізу: «сувязь паміж полам і даверам да прэзыдэнта – гэта міт». Які ж міт, калі сам выкрывальнік даказвае яе наяўнасьць, прычым разважаючы дакладна гэтаксама, як і ягоны апанэнт, меркаваньне якога ён нібыта абвяргае.

Тут, хутчэй, не выкрыцьцё міту, а стварэньне новага – пра веліч новай зоркі айчыннай сацыялёгіі. Калі вельмі карціць заняць пэўнае месца ў гэтым жыцьці, а за плячыма адно вывучаны падручнік матстатыстыкі, то варта карыстацца хоць ім, каб, расьпіхваючы іншых, гэтае месца заняць, балазе мала хто той падручнік чытаў. На няшчасьце зоркі, некаторыя чыталі.

Але куды больш красамоўным выглядае ня тое, што ў артыкуле Міколы Кацука ёсьць, а тое, чаго ў ім няма. Крытыкуючы НІСЭПД і *The Gallup-organization/Baltic Surveys*, ён прыводзіць лічбавыя вынікі дасьледаваньняў гэтых цэнтраў, узятыя з адкрытага друку. Але, распавядаючы пра сваю мадэль дыскрымінантнага аналізу даверу да прэзыдэнта, Мікола Кацук кажа пра каэфіцыенты кананічнай дыскрымінантнай функцыі, пра адсотак правільнасьці паўторнай клясыфікацыі, пра многія іншыя тонкасьці, зразумелыя адно адмыслоўцам, ня кажа толькі пра вельмі простую рэч, зразумелую і, упэўнены, значна больш цікавую чытачам «ARCHE», чым уся матэматычная эзатэрыя – а які ж, паводле зьвестак спадара Кацука, гэты самы давер да Аляксандра Лукашэнкі?

Гэта тым больш цікава, што, у адрозьненьне ад зьвестак НІСЭПД і *The Gallup organization/Baltic Surveys*, гэтых дадзеных Інстытуту сацыялёгіі НАН РБ ня знойдзеш у газэтах ці часопісах. Дык чаму б не прывесьці іх, чаму б, дарэчы, пры іх дапамозе канчаткова ня выкрыць міты няправільных сацыёлягаў?

Не дае адказу наш паважаны апанэнт. Дакладней, дае, калі разважае пра неабходнасьць аддзяленьня поля навукі ад поля палітыкі. Аднак акенцы акадэмічнай «вежы са слановай косткі», празь якія Мікола Кацук накіроўвае свае крытычныя стрэлы, разьмешчаныя неяк аднабакова.

Какетнічаць матэматычнымі фокусамі – справа бясьпечная, а

вось паведаміць, наколькі ж беларусы давяраюць Аляксандру Лукашэнку, параўнаць свае зьвесткі зь пераможнымі рэляцыямі дзяржаўнай прапаганды – за гэта і па галаве можна атрымаць. Дарэчы, тыя, хто на гэта асьмельваецца, па галаве якраз і атрымліваюць. Ад улады. А тут ёй і Кацук на дапамогу.

Між тым тое, што «вострыя» вынікі апытаньняў Інстытуту сацыялёгіі НАН РБ і са сьвечкаю не знайсьці, не выклікае ў нашага паважанага апанэнта, які там працуе, аніякай крытыкі – пра гэта ж аўтары падручнікаў па матстатыстыцы і нават улюбёны спадаром Кацуком П'ер Бурд'ё нічога не пісалі, а іншых кніг ён, відаць, не чытаў праз адсутнасьць патрэбы. Хаця, калі начальства нечага не дазваляе, дык таленавіты чалавек і без Бурд'ё ўсё разумее. Гэта нават не ў папрок, як той казаў, ня мы такія – жыцьцё такое, але ў падобнай сытуацыі варта, відаць, выконваць ролю прапаведніка і ўзору высокіх каштоўнасьцяў менш натхнёна.

«Аб'ектываваць суб'екта, які аб'ектывуе», да чаго сьледам за Бурд'ё заклікае Мікола Кацук, місія сапраўды надзвычай важная. Аднак разам з гэтай задачай была б, магчыма, карыснай і справа куды больш простая: датрымліваць прафэсійную і грамадзянскую годнасьць.

Але гэта, перафразуючы апошні сказ з артыкулу Міколы Кацука, калі мець.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/24
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image] *[image]*2005

"да Зтыкатук"

ацалітыка • крытыка • **палеміка** • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

МІКОЛА КАЦУК (нар. у 1977 г. у Менску) – сацыёляг, навуковы супрацоўнік Інстытуту сацыялёгіі НАН Беларусі. Працуе над тэмай «Сацыякультурныя стратэгіі дзеяння: базавыя каштоўнасьці, сацыяльна значныя рэсурсы, ідэнтычнасьці».

Мікола Кацук «...Калі ж ён злачынца, дык насамперш трэба крычаць: «Ратуйце!»

І калі ў мяне ўзнікне жаданне забіць майго суперніка – а гэта надараецца нават з сацыёлагамі – я мушу «забіць» яго, аргументуючы адпаведным чынам (сацыялагічнымі аргументамі для сацыёлагаў). Гэта – просты паказчык ступені аўтаноміі той ці іншай дысцыпліны.

П’ер Бурд’ё

Калі я пісаў свой артыкул, я кіраваўся заклікам Алега Манаева да дыялога і звяртаўся менавіта да яго.

«Ва ўмовах пераходнага грамадства, у якім усе гэтыя рэальнасці не толькі «перамяшаныя», але і «пераменлівыя», «барацьба за рэальнасць» становіцца выключна складаным, часам няўдзячным і нават небяспечным заданнем.

Але нехта мусіць гэта рабіць. Мы спадзяёмся, што выданне гэтай кнігі паслужыць пачаткам сур'ёзнай размове, што сацыяльныя навукі ў нашай краіне рана ці позна будуць іграць такую ж важную ролю ў прафесійным і грамадскім жыцці, якую яны іграюць у цывілізаваным свеце»[1].

Таму адказ спадара Дракахруста быў для мяне нечаканы. Яшчэ болей мяне ўразіла стылістыка ягонага адказу, нібыта пазычаная з тых часоў, калі амаль кожная газета мела рубрыку «фельетон». У тыя часы я толькі вучыўся чытаць, але ж успаміны з дзяцінства засталіся.

Адметнай рысай тых фельетонаў, як падаецца, было тое, што ад сапраўдных учынкаў «фігуранта справы» ўвогуле нічога не залежала, у той жа час аўтары фельетонаў лічылі сябе адмыслоўцамі ў самых разнастайных галінах.

Таму ў мяне ўзнікла праблема, як на ўсё гэта рэагаваць. Зразумела, што не «апраўдвацца». Яшчэ раз тлумачыць сутнасць ужытага метаду і пераказваць згаданы падручнік? Але ж гэта лепей рабіць на лекцыях і семінарах, тым больш што немагчыма перакласці мову дыскрымінантнага аналізу на мову табліц перакрыжаванага размеркаваньня. Ужыццё прафесійнай тэрміналогіі таксама не дасягне мэты. Веды пра тое, што панятак «карэляцыі» не мае дачынення да прычынных сувязяў і што яго нельга выкарыстоўваць для апісання сувязі паміж пераменнымі ў намінальных шкалах, – неабходныя толькі сацыёлагам[2].

Але адказваць трэба, бо «мае месца прымус хаця і ўскосны, але не менш дзейсны».

Паспрабую разгледзець гэтую сітуацыю з сацыялагічнага пункту гледжання і прадэманстраваць іншыя магчымасці выкарыстання свайго артыкула.

Перадусім, гэтая сітуацыя, выбачайце за Бурд'ё, ёсць сітуацыяй сімвалічнай барацьбы[3], якая адбываецца адразу ў трох вымярэннях – прасторы часопіса «ARCHE», прасторы сацыялогіі і прасторы беларускага грамадства.

Тое і было напісана ў маім артыкуле: «...стратэгічна практыкі саміх сацыёлагаў накіраваны на павелічэнне альбо нават агрэгаванне розных тыпаў капіталаў; кожнае дзеянне накіравана на іх пераразмеркаванне, а значыць і трансфармацыю структуры поля; у канчатковым выніку барацьба вядзецца за права легітымна выступаць адзінай беларускай сацыялогіі». У гэтым выпадку – перад чытачом часопіса, сацыёлагамі і грамадствам.

У адрозненне ад выключна навуковай дыскусіі, дзе кожны крок агента абмежаваны толькі логікай навуковай вытворчасці, тут маюць месца абмежаванні і поля СМІ – «для таго, каб быць апублікаваным, ён павінен адпавядаць рэдакцыі, быць сумяшчальным з ідэалогіяй і г. д.»[3] Такім чынам, сацыёлаг, які хоча быць надрабязна пачутым, вымушаны неяк прыстасавацца да гэтых патрабаванняў – я гэта раблю за кошт самацытавання; спадар Дракахруст, на маю думку, выкарыстоўваючы свае журналісцкія здольнасці.

Рэдакцыя, вядома ж, зацікаўлена ў тым, каб зрабіць тэму спрэчку як мага больш напружанай і працяглай, як пішуць «трывае ўжо з год»[4] У дыскусіях такога кшталту цяжка прытрымлівацца выключна навуковых аргументаў, бо яны робяць палеміку маруднай і нецікавай, і таму спадзявацца на тое, што па яе выніках адбудзецца пераразмеркаванне навуковага сімвалічнага капіталу – прызнання калегаў – не мае сэнсу. Колькі сацыёлагаў чытае «ARCHE»?

З іншага боку, на прасторы Беларусі амаль не засталося месцаў, дзе гэта можна рабіць. Поле веды хутка сціскаецца. Калісьці, на пачатку 1990-х, адбыўся выбух сімвалічнай вытворчасці, узніклі новыя магчымасці і лакуны, якія трэба было напоўніць, каб адказаць на заклікі часу – трэба было, літаральна, стаць «су-часным». А савецкая сістэма адукацыі, прынамсі ў сферы гуманітарыстыкі, рыхтавала зусім для іншага.

Можна правесці наступную аналогію. Калі ўзнікаюць рынкавыя адносіны, а эканамічная адукацыя ім не адпавядае, то

1 Независимые исследования в независимой Беларуси: в поисках реальность. - Новосибирск, 2004.

2 Гл. Терашкевіч, О. В. Корпаратызм і сацыялогія: Эмпірычны аналіз. - Мінск, 2003.

3 Бусыгина, И. М. Социальная структура и политическая власть // Вопросы теории и практики. - Москва, 1994.

4 Юрку Пацюпа. Ваяу ці вынаходніцтва? // ARCHE. - 2005. - № 5 (39).

бізнесоўцамі становяцца не тыя, каго да гэтага рыхтавалі, а тыя, хто наўпрост здольны ў іхных варунках выжыць, кіруючыся нейкім практычным пачуццём. Больш за тое, у гэтых умовах зарабіць мільёны было значна прасцей, чым, напрыклад, на Захадзе, дзе поле ўсталявана і існуе вялікая канкурэнцыя.

Гэтак адбылося і ў сацыяльных навуках. Галоўнымі капіталамі, з якіх пачынаюць будавацца новыя правілы (номас) прадукавання веды, становяцца веданне замежных моваў (што дае магчымасць чытаць у арыгінале найноўшыя публікацыі, іх перакладаць, робячы сябе больш прасунутым у вачах калегаў, і ўвогуле ведаць, куды дзьме вецер) і палітычная актыўнасць (што таксама дазваляе трымаць руку на пульсе часу і мець карысныя знаёмствы). Калі да гэтага дадаецца навуковая ступень, нават калі яна не мае ніякага дачынення да новай сферы інтарэсаў, – усё, капітал створаны, пазіцыі дамінацыі ў полі занятыя.

Потым, са з'яўленнем замежных фондаў, навуковыя капіталы ўзмацняюцца адміністрацыйнымі, і як грыбы пасля дажджу ўзнікаюць усялякія цэнтры, праекты, інстытуты. Яшчэ некалькі гадоў, і можна б было весці размову аб стварэнні навуковай традыцыі, навуковых школаў і г. д. Але гэтага не адбылося, і вядома чаму – іншая ўлада мае патрэбу ў іншых сродках прадукавання веды. Трансфармацыі, якія ўжо адбыліся ў эканоміцы, толькі цяпер – апошнія пяць гадоў – пачалі адбывацца ў сімвалічным полі. Мэтанакіравана ствараецца норма «сацыяльна арыентаванай сімвалічнай вытворчасці» – хай кожны будзе заняты, хай кожны робіць усё, што заўгодна, абы не было вайны.

Сітуацыя ўскладняецца тым, што тэрмін пятнаццаці гадоў – гэта тэрмін актыўнай дзейнасці адной генерацыі; пасля на актыўныя пазіцыі выходзіць іншая. Дарэчы, усё гэта ў выглядзе «ўнутраных адрозненняў» таксама было пазначана ў маім тэксце.

Толькі, калі ласка, зразумейце мяне дакладна. Я не сцвярджаю, што сацыялогіяй павінен займацца толькі той, хто атрымаў сацыялагічную адукацыю. Не, і трэба выказаць падзяку, што сацыялогія ў сучасных умовах увогуле існуе – спадару

Дракахрусту таксама, бо ў гэтым ёсць і ягоны ўнёсак.

Тады аб чым гаворка? А гаворка аб тым, якое ўяўленне пра сацыялогію складаецца ў грамадстве. Сацыялогія – гэта тое, што робіцца сацыёлагамі. А рабіць сацыялогію можна па-рознаму. З майго пункту гледжання, «самастойнага значэння лічбы рэйтынгу не маюць», з пункту гледжання спадара Дракахруста – наадварот, галоўнае «параўнаць свае дадзеныя з пераможнымі рэляцыямі дзяржаўнай прапаганды». Я лічу, што ў гэтым выпадку, сацыялогія ператвараецца ў тэхналогію агітацыі і абмяжоўваецца абслугоўваннем вонкавых запатрабаванняў.

На мой погляд, справа вельмі небяспечная. У гэтай сацыялогіі ў мяне няма месца. Бо пытанне «ты за каго?» – гэта пытанне да грамадзяніна. Сацыёлаг павінен пытацца «як ты гэтыя дадзеныя атрымаў?», «як ты прыйшоў да гэтай высновы?». Натуральна, трэба мець і грамадзянскую годнасць (саматоеснасць грамадзяніна, грамадзянскую ідэнтычнасць), і прафесійную (паводле мяне – рабіць аўтаномную сацыялогію), але ж не трэба іх блытаць, бо інакш не будзе ні сацыялогіі, ні грамадзянскай супольнасці.

Пры гэтым аўтаномія сацыялогіі не ёсць яе зачыненасцю ў «вежы са слановай косткі», аўтаномія – гэта адзіная магчымасць захаваць яе саматоеснасць, што дазваляе ёй адказваць на заклікі часу сацыялагічна, кіруючыся сацыялагічнымі нормамі. Нормы, калі ласка, давайце абмяркоўваць.

Але ж менавіта нормы, а калі ў гуманітарных ведах паўстае аномія – што абмяркоўваць?

Каб давесці гэтую думку, звярну ўвагу на сітуацыю вакол паважанага гісторыка Андрэя Кіштымава. На мой погляд, яна пазначае вельмі небяспечную тэндэнцыю. Справа не столькі ў факце звальнення, колькі ў абвінавачаннях у «заалагічнай нянавісці да савецкай і сучаснай уладаў, суцэльным панегірыку прыватнай уласнасці, Захаду». Гэтыя абвінавачанні зроблены чалавекам, які лічыць сябе гісторыкам. А ці магчыма гэта абвергнуць? І хто павінен гэта абвяргаць – сацыёлаг, філосаф,

літаратар? Не – толькі гісторык. А да чаго апеляваць гісторыку, калі галоўным аргументам будзе тое, што я так бачу і што я таксама навуковец?

Калі б існавала аўтаномія гістарычнай навукі, навуковая супольнасць, незалежна ад палітычных поглядаў, абараняла б не столькі гісторыка, колькі гістарычную навуку.

Таму праблема аўтаноміі ёсць агульнай праблемай. Кожная сацыяльна-гуманітарная веда, каб застацца ведай, павінна мець уласныя крытэры развіцця. Калі ў яе трапляе вонкавая міфалогія, дык усялякія намаганні навукоўцаў па «выкрыцці міфаў» ці «барацьбе за рэчаіснасць» – увогуле па ўплыве на грамадства – робяцца бессэнсоўнымі і безгрунтоўнымі, як вынік – нулявымі.

Між тым я не лічу сваёй памылкай размяшчэнне ў тэксце артыкула звестак дыскрымінантнага аналізу. Але ж пры гэтым выдатна разумею, што ўсё абмеркаванне зместу было зведзена да пытання, ці насамрэч жанчыны галасуюць *за*, ці не.

Але ж гэта ўсё роўна – міф, які ў Ралана Барта толькі «прэтэндуе на трансфармацыю ў сістэму фактаў», а ў сітуацыі Беларусі ўжо з'яўляецца фактам. Які відавочны, але ж «міф нічога не хавае; яго функцыя палягае ў дэфармаванні, але не ў прытойваньні»[5]. Які атаесамляе ўяўленні і рэчаіснасць, ператварае гісторыю ў прыроду: ці існуюць жанчыны, якія галасуюць за Лукашэнку? Ну, натуральна ж, існуюць.

Як усё дакладна: «У міфе рэчы страчваюць памяць аб свайм прадукаванні» (Барт).

Небяспечнасць міфа ў тым, што«ён пераўтварае сэнс у форму, іншымі словамі, выкрадае мову. Вобраз афрыканскага жайнера, бела-карычневая басконская хатка, сезоннае зніжэнне цэнаў на садавіну і гародніну выкрадаюцца міфам не для таго, каб выкарыстаць іх у якасці прыкладаў ці сімвалаў, а для таго, каб з іх дапамогай натуралізаваць Французскую імперыю, захапленне ўсім басконскім, Урад» (Барт).

Яшчэ дадам – і мысленне, і асэнсаваную дзейнасць.

[5] Барт Р. Избранные работы: Семиотика. Поэтика, Москва, 1989. с. 86.

Што можна зрабіць з тым, што жанчыны галасуюць *за*? Напэўна, агітаваць жанчын галасаваць *супраць* ці шукаць палітыка сэкс-сімвала. Што выдатна і робіцца апошнія гады.

Што будзе, калі скласці рэйтынгі асобных палітыкаў? Праект «Адзіны кандыдат».

А што рабіць з тым, што людзі ў Беларусі хочуць перамен? Напэўна, трэба ўзначаліць рух прыхільнікаў перамен. Толькі рэч у тым, што большасць гэтых прыхільнікаў аднолькава кепска ставяцца і да прэзідэнта, і да апазіцыі. У выніку маецца тыповай сітуацыя кшталту:

– Галасуй за мяне!

– З якой нагоды?

– Я прыхільнік перамен.

– Ну...

– Я за дэмакратыю.

– Ну...

– Я за лепшае жыццё.

– Слухай, я ж таксама за ўсё гэта, ты мне толькі патлумач, з якой нагоды я павінен галасаваць за цябе?

– Ты – дурань, нічога не разумееш.

У сучасных умовах застаецца толькі адзіны рэсурс, які можа ўраўнаважыць рэсурсы ўлады. Гэта веды. Не тыя веды, што друкуюцца ў падручніках, бо яны састарэлі яшчэ да таго, як гэты падручнік надрукуюць. І не тыя, што ўзніклі ва ўласным досведзе: маўляў, я езджу па рэгіёнах, я ведаю свой народ.

Але тыя, што атрыманы па метадзе і тычацца таго, як. Гэта і ёсць know-how – веда пра тое, як рабіць і як мысліць.

Да прыкладу, мадэлі, якія, падкрэсліваю, «не прызначаліся для

вычарпальнага апісання рэчаіснасці» і таму могуць быць ужытыя толькі ў якасці ўзору, былі адабраныя пераменныя «рэгіён», «узрост», «адукацыя» і дзве альтэрнатыўныя крыніцы інфармацыі: «Інтэрнэт» і «тэлебачанне».

З гэтага вынікае, што, каб атрымаць высокі давер, варта займацца вёскай; дамовіўшыся з састарэлымі, рэсурсы накіраваць на моладзь, якая пакуль супраць; сапсаваць вышэйшую адукацыю, а неадукаваных зрабіць кіраўнікамі; абмежаваць Інтэрнэт і захапіць тэлевізію.

Спадарства, так ён жа гэта і робіць! Выснова нават банальная.

Толькі адкажыце мне на пытанне: хто здзяйсняе адваротную, люстэркавую стратэгію?

* * *

Напрыканцы трэба засяродзіць увагу на тым, што тычыцца не толькі майго артыкула. Спадар Дракахруст піша:

«...у адрозненне ад дадзеных НІСЭПД і The Gallup organization/ Baltic Surveys, гэтых дадзеных Інстытуту сацыялогіі НАН РБ не знойдзеш у газетах ці часопісах».

Гэта хлусня.

Але ж пачынаў я з закліка Алега Манаева. Мне карцела, каб ён адказаў мне публічна. Гэтага пакуль не адбылося, ды на сайце НІСЭПД з'явілася прафесійнае і карэктнае апісанне дадзеных па вераснёўскім апытанні. І гэта таксама адказ, у якім – мне прыемна так лічыць – ёсць і мой маленькі ўнёсак.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/24

[image]

Фрагмэнты абмеркаваньня аналізу Міколы Кацука «Міты беларускай сацыялёгіі» (ARCHE 5/2005) на сайце www.belintellectuals.com[1]

01.10.2005
*10:44**
Мікола
Кацук

Цікавая сытуацыя. Справа ў тым, што я насамрэч дакладна ня ведаю назвы свайго артыкулу. Напачатку ён быў названы «Сацыёляг у барацьбе за сацыялёгію: паміж аўтарытарнасьцю дзяржавы і гераізмам змагароў за дэмакратыю». Потым спадар Валер Булгакаў даслаў яго з назвай «Міты беларускай сацыялёгіі». А ў зробленым «Нашай Нівай» анонсе новага нумару «ARCHE » ён завецца «Нявінныя фокусы незалежнай сацыялёгіі».
Таму папярэджваю, гэта ня тры розныя артыкулы, а адзін з абагульняльнай назвай «Нешта, што мае дачыненьне да сацыялёгіі».

*03.10.2005 15:35**

Павал Баркоўскі

Артыкул атрымаўся добры, нягледзячы на пэўную інтанацыйную незавершанасьць, але тым самым ён дае месца для цяжарнага роздумам шматкроп'я. Насамрэч назоў «міты» падаецца найбольш удалым праз тое, што адрозныя аспэкты праблемаў сучаснай сацыялёгіі ён паядноўвае адзінствам мітатворчасьці. Неўзабаве варта дэмістыкаваць і міт пра «незалежную сацыялёгію», і міты пра грамадзкую думку і палавую адзнаку, – усё тое, што злучае разам панятак доксы, зразумеласьці для ўсіх паспалітых людзей.

Але ж міты мітамі, а паняткі панятками. Варта даверу меркаваньне П. Бурд'ё пра тое, што сацыялёгія можа стацца незалежнай, адно калі здабудзе прадметную самастойнасьць – зусім натуральнае жаданьне, як тое даводзілі яшчэ постпазытывісты кшталту Куна ці Фаерабэнда, для кожнай навукі пазбавіцца ад вонкавых чыньнікаў яе разьвіцьця, у тым ліку філязофіі як ідэалёгіі. Іншая справа – да чаго можа прыйсьці сацыёляг, калі спрычыняецца да факту ўласнай залежнасьці: ад наймальніка, ад навязанага матэрыялу, ад уласных пераваг ды сацыяльных чыньнікаў... Калі зноў-такі зьвярнуцца да нашай гаворкі наконт адносінаў філязофіі і сацыялёгіі, дык сацыялягічная прасякнутасьць філязофіяй не складае пытаньня, прынамсі, калі сацыялёгія мяркуе заставацца «разумельнай» і захоўваць рэфлексіўны момант. Ня трэба скардзіцца на філязофію, што, маўляў, яна ўсоўваецца не ў свае справы, калі бярэцца вырашаць пытаньне пра сацыялягічны прадмет, бо гэта можа зрабіць адно сам сацыёляг. Так, сам сацыёляг, але ж не безь філязафічнага падмурку, бо калі ён будзе і надалей шукаць свой прадмет выключна эмпірычна, не раўнуючы як шуфлем перасоўваючы пласты пяску да таго моманту, покуль шуфель ня зломіцца, ён заўжды будзе заставацца ахвярай тэарэтыка, які скажа: «Кідай сваю пясочніцу, у цябе ж цэлы кар'ер пяску яшчэ неўзараны!» Каб здабыць уласны інтарэс што да сацыялягічных праблемаў, трэба ня толькі пачысьціць «сьвятое» месца, і гэта тэкст удала робіць, але трэба таксама спарадзіць поле магчымых інтэрпрэтацыяў, наўпрост спарадзіць новыя аб'екты, а тут без здумленьня і рэфлексіі – мэтамовы для сацыялёгіі – не абысьціся, і таму, хутчэй, гаворка будзе ісьці пра філёзафа ў

тваёй скуры, пра пакуты роздуму.
*04.10.2005 13:59**
Мікола Кацук
Дзякуй вялікі, спадар Павал. Але: «…яна [сацыялёгія] ня вырачана заставацца галіной агульнай філязофіі, што яна здольна шчыльна судакранацца з канкрэтнымі фактамі і не ператварацца пры гэтым у проста практыкаваньне з галіны эрудыцыі»: Дюркгейм Э. Социология. Ее предмет, метод, предназначение / Пер. с фр., сост., послесловие и примечания А. Б. Гофмана. – Москва: Канон, 1995. – 352 с.
05.10.2005 17:19
Ігар Чарняеў
Самы галоўны міт – пра тое, што сацыялёгія можа быць самастойнай ад поля палітыкі і эканомікі. Марыць, як кажуць, ня шкодна. Альбо пытаньне – а што будзе есьці сацыёляг? Бо акрамя сымбалічнага капіталу ён анічога ня мае. Калі ня будзе пакупніка, гатовага выкласьці несымбалічны капітал за спэцыфічныя паслугі, якія прадстаўляе сацыёляг – сымбалічны капітал плаўна пяройдзе ў сымбалічную ежу і сымбалічную вопратку... Па-за палямі эканомікі і палітыкі яна ня мае аніякага практычнага сэнсу. Сацыялёгія, як і мэдыцына, – прадукт агульных тэндэнцыяў, што мелі месца на Захадзе (апісана ў Фуко) – разьвіцьцё сыстэмы ўлады-веды. Ведаць, каб кіраваць. І нічога болей.
У Беларусі ўжо была партыя, якая «*казала праўду людзям*». Апагеем гэтай праўды стаў артыкул у «НН» пра беларускі плебс на вуліцах Менску. Не зьдзіўлюся, калі іх пачнуць біць зусім не амонаўцы...
Ад вашых стогнаў пра «засільле філёзафаў» нічога ня зьменіцца. Будзем шчырымі – паспрабуйце прадаць вашы думкі па-за межы Беларусі. Аднаму PATH DEPENDANCY вам не пераламіць.
Рэфлексія сацыёляга над уласнымі пазыцыямі ў розных палёх магчыма толькі ў выпадку, калі ягоныя палі знаходзяцца дзесьці на іншай тэрыторыі, ён забясьпечаны замовамі іншых, вонкавых адносна вывучанай тэрыторыі інстытутаў...
Другі міт – «пра тое, што сацыялёгія ня вырачана заставацца галіной агульнай філязофіі...».
На прыкладзе зь НІСЭПД і «Экаам» вы паказалі, якая бедная статыстыка сама па сабе, як можна лёгка і бесклапотна

маніпуляваць лічбамі і пытаньнямі.
Без выразных і яўных крытэраў вылучэньня гіпотэзаў, іх інтэрпрэтацыі, арганізацыі выбаркі, кантролю за добранадзейнасьцю тых, хто апытвае, усе Хі-квадраты, рэгрэсіі ўяўляюць толькі набор лічбаў, табліцаў, ліній. У кожным разе SPSS пакажа якую-небудзь залежнасьць, напрыклад, сувязь росту спажываньня марозіва і росту згвалтаваньняў... Абедзьве праблемы – сацыяльныя!
А выразныя крытэры арганізацыі дасьледаваньня – гэта палітыка, філязофія, эканоміка. Таму чысты матэматык так і будзе пакутаваць ад дыктатуры філёзафаў у гэтай сфэры. Амінь!
Міт трэці – пра тое, што гендэр зьяўляецца нейкай ізаляванай пераменнай, якая асобна існуе ад узросту, адукацыі, напрыклад.
Гендэрная тэорыя і так разглядае пол, адукацыю і іншыя пераменныя ў шчыльнай узаемасувязі. А вы проста штучна вылучылі ПОЛ як ізаляваную пераменную і спрабуеце давесьці, што ў яго маленькія каэфіцыенты ўплыву на выбары.
Але тое, што адсотак жанчын «за Луку» вышэйшы, вамі не адмаўляецца. Статыстыка ў гэтым выпадку ня можа адказаць на пытаньне «чаму?».
Дарэчы, якая ўзаемасувязь адукацыі і полу?
*05.10.2005 18:02**
Павал Баркоўскі
Коля, зь Дзюркгаймам нават спрачацца ня буду, але ж, падаецца, мы зноў пра розныя рэчы гаворым: дзякуй Богу, што сацыялёгія не філязофія і наадварот! Але мне досыць дзіўна, што ты як сацыёляг не адчуваеш розьніцы між рознымі ўстаноўкамі, ці, калі хочаш, ролямі. Калі табе настойліва прапануюць жыць паводле законаў фізыкі і не скакаць зь пятага паверху, бо Ньютанаў закон абавязкова пакарае, дык гэта ня тое самае, калі цябе змушаюць зрабіцца фізыкам. Калі ты займаесься сацыялягічнымі дасьледаваньнямі, ты працуеш як сацыёляг, а вось дома на канапе ці падчас роздуму над уласным станам як сацыёляга ты ўжо хтосьці іншы – абывацель або філёзаф (рэфлексун, як колісь вызначыў Акудовіч). Падаецца, рэч банальная, ці я памыляюся? Альбо ты чалавек адной ідэі і іншыя ўстаноўкі не прызнаеш (то бок сацыёляг усе 28 гадзінаў на працягу дня): тады мне варта забраць свае словы

назад! Інакш я ня бачу рацыі сацыёлягу займацца праблемай вызначэньня ўласнага прадмета для працы, нібыта ў яго мала працы па наўпростай рабоце – сацыялягічным дасьледаваньні. Калі ж ты жадаеш адразу рабіць праверку на валіднасьць для сацыялёгіі тых прапанаваных варыянтаў пашырэньня яе прадмету, дык тады сам працуй на філязафічным узроўні і тады ўжо паспрабуй не абрынуцца ў дагматызм ці скептыцызм, бо на ўзроўні мэтарэфлексіі ты ўжо ня будзеш сацыёлягам, а абывацелем ці філёзафам, як пашанцуе... Калі ж я цябе ня так зразумеў, удакладні!

*06.10.2005 04:57**

Мікола Кацук

Шаноўны Павал! Ты зразумеў усё дакладна. Я табе разумную рэч скажу, толькі ты не крыўдуй. Ты зразумеў усё дакладна, але ж – як філёзаф. Патрабаваць чагосьці іншага – немагчыма. Так ёсьць, і гэта ня мае аніякага дачыненьня да перавагі філязофіі над сацыялёгіяй ці наадварот. Увогуле, людзі разумеюць, выкарыстоўваючы свае рамкі, сваю ўласную гісторыю. Зараз я чытаю вельмі цікавую працу Ўладзімера Лефеўра «Альгебра сумленьня», і гэта дае мне магчымасьць разгледзець нашую спрэчку фармальна-рэфлексіўна. Глядзі. У кожнага з нас ёсьць пэўныя вобразы сябе і суразмоўцы. Пазначым філязофію як Ф, а сацыялёгію як с. Тады твая мапа будзе наступная – Ф і Ф (С), а мая – С і С (Ф). Такім чынам, ёсьць філязофія і філязофскія ўяўленьні аб сацыялёгіі і сацыялёгія і сацыялягічныя ўяўленьні аб філязофіі. Паколькі прапанаваная структура фармальная, таму ў ёй ня толькі немагчыма вырашыць, што большае: Ф і Ф (С), ці С і С (Ф), а нават і пакласьці іх як раўнаважныя. Таму, каб перамагчы ў спрэчцы, кожны з нас намагаецца перавесьці яе ў сваё поле ведаў. І тады С: Ф і Ф (С) меншая за С і С (Ф), а Ф: Ф і Ф (С) большая за С і С (Ф). Але, па-чалавечы кажучы, усё найлепшае ў сацыялёгіі філязафічна і ўсё найлепшае ў філязофіі сацыялягічна. Можна пагуляцца і расчыніць дужкі. Напрыклад, самавызначэньне сацыёляга С (С) і ягонае рэфлексіўнае стаўленьне да філязофіі большае за сацыялёгію філязофіі і філёзафаў таму, што рэфлексіўна здымае іх. (Дарэчы, ёсьць кніга Р. Колінза «Сацыялёгія філязофіяў».) І наадварот. Але ў гэтых выпадках мы сутыкаемся з самазамкнёнымі, самарэфэрэнцыйнымі структурамі, якія маюць тэндэнцыю да

бясконцасьці. Таму гэтая спрэчка невырашальная. Каб спалучыць структуры, неабходны нейкі канфігуратар. Памятаеш, У. Фурс прапанаваў фармулёўку «актыўная філязофія й думаючая сацыялёгія». Яна мне, натуральна, не падабаецца, бо яна занадта эмацыйная – у нашай культуры актыўны дурань горшы за пасіўнага мысьляра. Напэўна, такім канфігуратарам можа быць сумеснае мысьленьне нейкай праблемы. Таму – да сустрэчы на сэмінары.

06.10.2005 15:06

Мікола Кацук

Ігар Чарняеў, прадэманстраваўшы свае веды ў сацыялёгіі, папрасіў мяне прывесьці карэляцыі. Прыводжу: каэфіцыент рангавай карэляцыі Сьпірмэна для пераменных полу і адукацыі роўны -0,012 пры ўзроўні значэннасьці 0,596 (двухбаковая) і 0,298 (аднабаковая). Вам, дарэчы, які? (Каэфіцыент Кендала не прыводжу, паколькі, як вы разумееце, ён ніжэйшы за Сьпірмэна.) Але зьвяртаю ўвагу ўсіх зацікаўленых статыстычнымі мэтадамі. У сваім артыкуле я пісаў:

Дыскрымінантны аналіз прызначаны для вырашэньня дзьвюх клясаў задачаў. Па-першае, ён дазваляе на падставе наяўных дадзеных клясыфікаваць рэспандэнтаў, для якіх зь нейкіх прычынаў невядомая прыналежнасьць для групы. Напрыклад, як у выпадку з галасаваньнем аднесьці да прыхільнікаў ці праціўнікаў тых, хто адмовіўся галасаваць ці ня вызначыўся? Па-другое, вызначыць пераменныя, кожная зь якіх аказвае максымальны і самастойны ўплыў на адрозьненьне, якім мы зацікавіліся.

Тут варта зьвярнуць увагу на апошні «сказ і слова» САМАСТОЙНЫ. То бок, ТАК ацэньвае ўплыў пераменных у іх узаемасувязі адна з адной і адбірае з набору ўзаемазьвязаных пераменных найбольш важныя. Больш падрабязна: сутнасьць мэтаду і ягоныя абмежаваньні.

На падставе наяўных дадзеных (то бок «навучальнай выбаркі» – сукупнасьці рэспандэнтаў, для якіх вядомая іх прыналежнасьць да групы) і сукупнасьці незалежных пераменных разьлічваюцца так званыя дыскрымінантныя функцыі, якія дазваляюць максымальна адрозьніць наяўныя групы. Для дзьвюх групаў патрэбна адна дыскрымінантная функцыя.

Лічыцца, што пераменная адрозьнівае дзьве групы, калі яе сярэдняе значэньне ў гэтых групах статыстычна значэнна адрозьніваецца. Статыстычная значнасьць вызначаецца паводле

F-крытэру, у выпадку, калі існуе вялікая колькасьць незалежных пераменных, параўноўваюцца шматмерныя матрыцы ўнутрыгрупавых і міжгрупавой (то бок аб'яднанай групавой) каварыяцыі. Чым большыя гэтыя адносіны, тым істотнейшая розьніца паміж цікавымі для нас групамі. Пры гэтым аказваецца мажлівым з большага набору незалежных пераменных адабраць акурат тыя, якія робяць найбольшы ўнёсак у адрозьненьне паміж групамі.
Лінійная камбінацыя незалежных пераменных з адпаведнымі каэфіцыентамі (b) і называецца дыскрымінантнай функцыяй. На яе аснове і прадказваецца прыналежнасьць аб'ектаў – як неклясыфікаваных, так і тых, для якіх раней была вядомая прыналежнасьць да групы.
Y = a + b1*X1 + b2*X2 + ... + bp*Xp,
дзе a – канстанта;
b – каэфіцыент кананічнай дыскрымінантнай функцыі;
X – незалежная пераменная.
Найбольш важнымі паказьнікамі якасьці дыскрымінантнага аналізу ёсьць: характарыстыкі дыскрымінантнай функцыі (уласнае значэньне, доля патлумачанай дыспэрсіі, каэфіцыент кананічнай карэляцыі); значнасьць дыскрымінантнай функцыі – статыстыка Ўілкса; паказьнік правільнасьці клясыфікацыі – працэнтныя адносіны рэальнай і прадказанай прыналежнасьці да групаў.
Асобна інтэрпрэтуюцца:
– самі адабраныя пераменныя;
– паказьнікі талерантнасьці (талерантнасьць пераменнай вызначаецца як 1 – R2, дзе R – каэфіцыент множнай карэляцыі пераменнай з усімі астатнімі незалежнымі пераменнымі, якія ўваходзяць у раўнаньне. Чым вышэйшая талерантнасьць, чым больш унікальны ўнёсак гэтай пераменнай, тым у большай ступені гэты ўнёсак апасродкаваны іншымі пераменнымі);
– стандартызаваныя каэфіцыенты кананічнай дыскрымінантнай функцыі, якія дазваляюць вызначыць унёсак кожнай незалежнай пераменнай у дыскрымінацыю;
– структурная матрыца – каэфіцыенты сувязі паміж дыскрымінантнай функцыяй і пераменнымі. Гэтыя каэфіцыенты інтэрпрэтуюцца як фактарныя нагрузкі ў фактарным аналізе і дазваляюць вызначыць «сэнс» дыскрымінантнай функцыі.
Тут важна зьвярнуць увагу на паказьнік ТАЛЕРАНТНАСЬЦІ.

Ігар Чарняеў, калі ласка, больш ня ганьбіце сябе, тут вам ня гендэрныя студыі.
09.10.2005 14:03
reggedieh
І гэта адказ на пытаньне Чарняева? Чарговы раз вы прадэманстравалі свой mauvais ton, «адказваючы» на пытаньне абвінавачваньнем у тым, чаго несацыёляг ведаць не абавязаны. Я, напрыклад, наагул нічога не зразумеў: гэта вашая праца, і рабіць яе зразумелай іншым – ваш абавязак, як мінімум, на гэтым форуме.
09.10.2005 13:37
Мікола Кацук
Мне непрыемна размаўляць з ананімамі на гэтым форуме. Яшчэ больш непрыемна – з тымі, хто ня ўмее чытаць. Тым ня менш. У рэпліцы Ігара Чарняева пытаньняў было ўсяго два. Першае: «што будзе есьці сацыёляг», – я палічыў яго рытарычна пустым. І другое: «якая ўзаемасувязь адукацыі і полу?».
У маёй рэпліцы быў адказ на другое пытаньне. І заўважце, не было аніякіх абвінавачваньняў. Больш за тое, я зрабіў неабходныя тлумачэньні, паколькі думаю, што гэты форум будуць праглядаць і студэнты-сацыёлягі, якім трэба пашыраць кругагляд і здаваць іспыты. Што вам яшчэ трэба? Каб я навучыў вас матстатыстыцы? Сваю работу я раблю, свае абавязкі выконваю. І паверце мне, вы будзеце апошнім, каму я буду даваць справаздачу. А тое, што вы «наагул нічога не зразумелі», азначае толькі адно: гэты тэкст не для вас.
10. 10. 2005 1:42
Ігар Чарняеў
Дзякуй! Але ў мяне таксама дома ляжыць падручнік па статыстыцы...
Можаце проста даваць выходныя зьвесткі, а ня флудзіць на 2 старонкі, загінаючы пальцы.
Я апошні раз кажу – матстатыстыка ёсьць усяго толькі адным з мэтадаў сацыялёгіі. Ёсьць яшчэ якасныя мэтады, урэшце.
10.10.2005 05:10
Мікола Кацук
Проста цудоўна! Ігар Чарняеў працягвае мяне зьдзіўляць. Аказваецца, ягоная кампэтэнтнасьць у сацыялёгіі пацьвярджаецца наяўнасьцю (у доме) падручніка па матстатыстыцы. (І гэта пры тым, што мая рэпліка пра

матстатыстыку была адрасаваная нейкаму «reggedieh»!)
Магчыма, таму апісаньне мэтаду ТАК ён назваў «флудам» і «загінаньнем пальцаў». Але найбольш мяне зачаравала ягонае выказваньне пра тое, што я магу «проста даваць выходныя зьвесткі».
Наагул выходныя зьвесткі ў сацыялёгіі выдаюцца ў наступных выпадках. 1. На патрабаваньне замоўцы, калі хтосьці мае інтарэс і аплачвае працу сацыёляга, а ў якасьці справаздачы патрабуе выходныя зьвесткі. 2. Калі сацыёляг-выкладчык у рамках навучальнага курсу фармуе неабходныя навыкі навучэнцаў. 3. У рамках прафэсійнай камунікацыі для вырашэньня якой-небудзь праблемы ідзе абмен зьвесткамі з калегамі. 4. На этапе абароны дысэртацыі на запатрабаваньне больш кампэтэнтных асобаў (рады па абароне) зьвесткі таксама могуць быць пададзеныя. 5. Нарэшце, апошняе, гэта проста сяброўская паслуга.
Вось цяпер я думаю, да якой зь пералічаных катэгорыяў залічвае сябе Ігар Чарняеў? Можа, хто-небудзь падкажа?
Але ёсьць і сьмяшнейшыя абставіны. Выходныя зьвесткі могуць быць пададзеныя ў самых розных формах. У іх лік трапляе і каэфіцыент карэляцыі.
І апошняе. Ігар Чарняеў, чамусьці ў апошні раз (цікава, што будзе потым?) паведамляе мне – сацыёлягу – дзіўнае адкрыцьцё. Аказваецца, што «матстатыстыка зьяўляецца ўсяго толькі адным з мэтадаў сацыялёгіі» і што «ёсьць яшчэ якасныя мэтады». Хто мог бы падумаць!
10.10.2005 19:53
Ігар Чарняеў
Вы проста прапануеце чытаць мне тэкст з канца ці нават зь сярэдзіны.
Вы неарыгінальныя ў гэтым. Заходзячы на сайты розных сацыялягічных канцораў, я бачу нейкія табліцы – канцавы вынік вялікай працы... Я не магу правяраць увесь ланцужок дасьледаваньня ад мэтаў і задачаў да інтэрпрэтацыі асноўных паняткаў... Я вымушаны верыць у аўтарытэт гэтых арганізацыяў...
Але вас я ня ведаю наагул, хаця вы тут сабраліся выконваць запаветы Дзюркгайма і кагосьці мачыць...
Я прасіў вас патлумачыць мне, хто, калі і дзеля чаго праводзіў дасьледаваньні, якія вас натхнілі на сьцьверджаньне таго, што

пераменная ПОЛ на выбары практычна не ўплывае...
Дзеля мяне аднаго, відаць, ня варта вывешваць увесь масіў дасьледаваньня, але, паўтаруся... Я не зьбіраўся гнаць філёзафаў у шыю з сацыялёгіі... Так што можна вэб-сайт які-небудзь арганізаваць. Так, у мяне дома ёсьць падручнікі па статыстыцы, я гэтага не саромеюся, і я пачаў зь ёй знаёміцца зусім нядаўна.
У мяне хопіць гонару параіцца з кім-небудзь больш кампэтэнтным у гэтай галіне – проста ваш кавалак сорамна камусьці паказваць. Ня трэба ўсіх дурнямі лічыць.
Такім шляхам вы ніколі ня выберацеся з НАН РБ.
11.10.2005 7:28
Тацяна Вадалаская
Ігар, скажыце калі ласка, каго менавіта вы лічыце «больш кампэтэнтным у гэтай галіне» і каму вам было «проста сорамна паказаць гэты кавалак». Давайце да яго і зьвернемся па ацэнку гэтага тэксту.
І яшчэ, можа, вы пакажаце, дзе ў тэксьце ёсьць «сьцьверджаньне таго, што пераменная ПОЛ на выбары практычна не ўплывае».
Асабіста я прачытала там наступнае:
Зразумела, што існуе статыстычна значэнная сувязь паміж галасаваньнем і полам... Але гэтай сувязі ня варта надаваць значэньня... Істотна іншае – сацыяльная рэальнасьць не вычэрпваецца толькі прыхільнікамі і праціўнікамі, мужчынамі і жанчынамі. Узаемадзеяньне гэтых паказьнікаў апасродкуецца мноствам іншых.... У гэтым сэнсе выпадак полу – не вынятак. Ягоны ўплыў на галасаваньне ажыцьцяўляецца апасродкавана. Давесьці гэта можна, выкарыстоўваючы больш складаныя мадэлі, якія ўлічваюць шматвымернасьць сацыяльнай рэальнасьці. Напрыклад, пры дапамозе мэтаду дыскрымінантнага аналізу.
Не ўплывае і ўплывае апасродкавана – гэта розныя рэчы.
11.10.2005 7:32
Мікола Кацук
Таксама сьмешна.
Аднекуль узялася «мая» прапанова чытаць тэкст з «канца альбо нават(!!!) зь сярэдзіны». І я штосьці вінен там Ігару Чарняеву толькі таму, што гэта Ігар Чарняеў.
Ігар Чарняеў, а я вось УСІХ дурнямі не лічу. Проста ёсьць цудоўнае лацінскае выслоўе – sapienti sat.

Яшчэ раз: «На падставе дасьледаваньня, праведзенага Інстытутам сацыялёгіі НАН Беларусі ў траўні–чэрвені 2005 году (аб'ём выбаркі 1958 чалавек, памылка рэпрэзэнтацыйнасьці склала менш за 0,03)».
Таму пачытайце падручнік, разьбярыцеся, парайцеся «з кім-небудзь больш кампэтэнтным у гэтай галіне» – дарэчы, падказка: вядомымі спэцыялістамі ў галіне матмэтадаў зьяўляюцца О. В. Цярэшчанка, с. В. Сівуха, Е. М. Барадачова і Н. Н. Лявонаў – а потым прыходзьце пагутарыць.
Можа быць, тады я і паклапачуся, каб вас узялі ў Акадэмію навук – анкеты ўбіваць.
*12.10.2005 19:29**
Ігар Бабкоў
Ігар Чарняеў
Але вас я ня ведаю наагул, хаця вы тут сабраліся выконваць запаветы Дзюркгайма і кагосьці мачыць...
І я вас зусім ня ведаю. Вы хто – філёляг, філёзаф, эльф, журналіст?
12.10.2005 21:14
Ігар Чарняеў
2 Бабкоў
Я вас ведаю. Але гэта не істотна ў прынцыпе. Так можна сысьці ад тэмы і перайсьці на асобы... А гэта ўжо на Хартыю.
«Тэма дня» такая: сацыёляг Мікалай Кацук сабраўся давесьці, што некаторыя палажэньні гендэрных дасьледаваньняў можна зьняпраўдзіць пры дапамозе чыста матэматычных мэтадаў. Я папрасіў давесьці...
Але акрамя набору каэфіцыентаў у канцы артыкулу Мікалай анічога не паказаў.
Паколькі я маю некаторыя адносіны да сацыялёгіі, я ведаю, на падставе чаго можна меркаваць пра дасьледаваньне ў цэлым. Сам жа Кацук паказаў, што лічбы можна інтэрпрэтаваць парознаму. Гэта бывае...
Таму калі я чытаю такія гучныя заявы, што нейкая пераменная ёсьць «фуфлом», то прашу гэта падмацаваць аргумэнтамі. І ня болей.
Што тычыцца мяне, то мая вузкая спэцыялізацыя ня мае аніякага значэньня для дыскусіі. Я грамадзянін альбо эльф (як каму падабаецца), які цікавіцца гуманітарнымі навукамі...
13.10.2005 14:54

Аляксей Бабайцаў

Спрэчка Мікалая і Ігара вельмі цікавая, паколькі адлюстроўвае стан крытычных дыскусіяў у протаінтэлектуальнай супольнасьці.

Давайце зьвернемся да зыходных фактаў і пратакольных выказваньняў.

Мікола ў артыкуле прыводзіць два выказваньні. Адно належыць спадарыні Ўсманавай, другое – спадарыні Гапавай.

Сутнасьць тэзы спадарыні Ўсманавай такая: матывацыя электаральных паводзінаў жанчын зьвязана ня столькі з асобай Лукашэнкі як такой, а з сацыяльна арыентаванай палітыкай. А таксама з матывамі захаваньня стабільнасьці і спакою.

Спадарыня Ўсманава (непасрэдна ў гэтай цытаце) не спасылаецца ні на якія сацыялягічныя дадзеныя. На чым заснаваная выказаная ёю гіпотэза, з інтэрвію не зразумела. Магчыма, мы проста ня ведаем усіх фактаў дасьледаваньня.

Ці мае гэтае выказваньне адносіны да «мітаў сацыялёгіі»? На мой погляд, не. Прынамсі, пакуль мы ня высьветлім падставаў гэтай тэзы. Ці магчыма праверыць (напрыклад, зьняпраўдзіць) гэтую гіпотэзу сацыялягічнымі мэтадамі? Чаму не? Магчыма.

Ці спрастоўваецца гэтая гіпотэза дадзенымі, якія падае Мікола ў сваім артыкуле? Не, не спрастоўваецца, бо дадзеныя Мікалая анічога ня кажуць пра матывацыю электаральных паводзінаў жанчыны, хутчэй, яны гавораць пра такія чыньнікі, як адукацыя, месца жыхарства, выкарыстаньне крыніцаў інфармацыі ды іншае.

Навошта ж Мікола падае гэтае выказваньне? Ня ведаю. Магчыма, дзеля таго, што выказваньне спадарыні Ўсманавай – гэта адказ на наступнае пытаньне «Нашай Нівы»: «*Статыстыка сьведчыць, што жанчыны – электарат Лукашэнкі… Яны яго падтрымліваюць*».

То бок спадарыня Ўсманава, адказваючы на гэтае пытаньне, няяўна прымае гэтую тэзу як слушную. Прынамсі, яна яе не адкідае.

Пойдзем далей. Ці спрастоўвае Мікола гэтую тэзу?

На мой погляд, ён не спрачаецца непасрэдна з гэтым выказваньнем. Сапраўды, сярод жанчын зарэгістраваны апытаньнямі ўзровень падтрымкі Лукашэнкі высокі. Пытаньне ў іншым: ці гэты ўзровень больш высокі, чым, напрыклад, сярод рыжых? Ці аказвае фактар полу, як

незалежны фактар, значны ўплыў на выказваньне падтрымкі прэзыдэнту?
Мікола, абапіраючыся на даступныя яму дадзеныя дасьледаваньняў, паказвае, што ўплыў гэтага чыньніка невялікі, у параўнаньні з такімі, напрыклад, чыньнікамі, як адукацыя, узрост, рэгіён пражываньня (альбо тып пасяленьня?) і выкарыстаньне такіх крыніцаў інфармацыі, як Інтэрнэт і тэлебачаньне.
Карэктная выснова адсюль, наагул кажучы, такая: калі жанчыны і падтрымліваюць Лукашэнку, то гэта не таму, што яны жанчыны, – прычыны гэтай зьявы варта шукаць у іншых сацыяльных фактарах. Сфармуляваная ў такім выглядзе выснова робіцца амаль банальнай. І наўрад ці гэтая выснова супярэчыць таму, што сьцьвярджала спадарыня Ўсманава. Можна выснову сфармуляваць і так: фактар полу, як незалежны фактар, ня чыніць значнага ўплыву на падтрымку Лукашэнкі. Ці будуць аспрэчваць гэтую выснову прадстаўнікі гендэрных дасьледаваньняў? Ня ведаю. Мяркую, не, але гэта толькі меркаваньне.
Цяпер наконт выказваньняў спадарыні Гапавай. Тут яшчэ прасьцей. Яна проста спасылаецца на даступныя ёй зьвесткі, прычым даволі старыя – але яна і не сацыёляг! І на аснове даступных ёй зьвестак робіць выснову пра тое, што жанчыны падтрымліваюць Лукашэнку болей, чым мужчыны. Ці карэктная яе выснова? Ня ведаю, але гэта лёгка праверыць, маючы доступ да дадзеных апытаньняў. Пытаньне ў іншым. Калі б Мікола спрабаваў спраставаць акурат гэтую гіпотэзу, то шлях праверкі павінен быў быць крыху іншы, я б сказаў, больш прымітыўны (фактычна праверыць статыстычную значэннасьць адрозьненьняў, устойлівасьць дадзеных адносна розных дасьледаваньняў ды замераў і інш.).
Але робіць іншае: паказвае, што сам па сабе фактар полу, як незалежны чыньнік, ня чыніць значнага ўплыву на падтрымку Лукашэнкі. Але ж гэта іншае пытаньне!!!
Падвядзём вынікі: 1) выказваньне пра тое, што жанчыны падтрымліваюць Лукашэнку болей, чым мужчыны, не спраставанае; 2) выказваньне пра матывацыю такога стаўленьня жанчын не пацьверджана і не спраставана.
Замест гэтага прыведзеныя довады на карысьць таго, што сам па сабе фактар полу, як незалежны фактар, ня чыніць значнага

ўплыву на падтрымку Лукашэнкі.
Жанчыны падтрымліваюць Лукашэнку не таму, што яны жанчыны, а таму што яны ...? Дык у чым жа міт сацыялёгіі? Запрашаю да працягу дыскусіі. Толькі не гарачыцца і не сьпяшацца пераходзіць на «а ты хто такі?».
Што тычыцца спрэчкі Міколы і Ігара, то тут сытуацыя іншая: пазыцыя Ігара ў спрэчцы наагул незразумелая. Незразумела, што ён абараняе альбо адстойвае. І, вядома, узровень ягонай аргумэнтацыі нельга прызнаць высокім. Мікола, прыводзячы сваю аргумэнтацыю, таксама крыху захапіўся «трамбаваньнем» апанэнта паводле кваліфікацыйных падставаў. У прынцыпе, Ігар свае амбіцыі праводзіць легітымна: з прафэсійнага сацыялягічнага пункту гледжаньня ён меркаваньні і не пацьвярджаў. Ён жа зразумела сказаў, што тут ён, хутчэй, «цікаўны». Але ж Мікола і не пісаў артыкул толькі для прафэсіяналаў-сацыёлягаў. Таму чым «ціснуць» апанэнта ўзроўнем прафэсійнай падрыхтоўкі, ці ня лепш паспрабаваць патлумачыць сутнасьць справы «для цікаўных», ці то яны філёзафы, ці то іншыя гуманітары?
Яшчэ раз падкрэсьлю: дыскусія цікавая як імітацыйная мадэль міжпрафэсійнай камунікацыі ў протаінтэлектуальнай супольнасьці Беларусі.
*13.10.2005 20:43**
Ігар Бабкоў
«Тэма дня» такая: сацыёляг Мікалай Кацук сабраўся давесьці, што некаторыя палажэньні гендэрных дасьледаваньняў можна зьняпраўдзіць пры дапамозе чыста матэматычных мэтадаў. Я папрасіў давесьці...
Кацук прапанаваў схему (разам з Бурд'ё), празь якую можна чытаць, аналізаваць, дэканструктаваць і г. д. ляндшафт беларускай сацыялёгіі. Гэта надзвычай сур'ёзны і мужны крок. У выніку якога і ў нас стаецца магчымым «аб'ектываваць суб'екта, які аб'ектывуе» (Манаева, напрыклад).
А вы чапляецеся за неістотнае.
14.10.2005 6:36
Аляксей Бабайцаў
Згодны. Вядома, прыклад з гендэрнымі дасьледаваньнямі «прахадны» з гледзішча зьместу артыкулу і аніяк не ўплывае на ягоную асноўную выснову. Артыкул прынцыповы. Калі дзейныя фігуранты сацыялёгіі ня выкажуцца і замоўчаць артыкул – будзе кепска, жудасна кепска.

Але таксама як і прадстаўнікі іншых прафэсійных палёў: калі будуць лічыць сацыялёгію прастытуткай і адпаведныя экспэктацыі фармаваць – нармальным прафэсійным сацыёлягам будзе вельмі кепска.

14.10.2005 7:40

Мікола Кацук

Лёша, дзякуй за ўважлівае прачытаньне. Паколькі я ведаю, «хто ты такі», то і пытаць цябе ня буду, а проста рэканструюю тваю пазыцыю – з тваёй жа дапамогай. Ты кажаш з пазыцыі мэтадалёгіі навукі, калі выкарыстоўваеш тэрміналёгію пратакольных выказваньняў.

Для сябе матыў тваіх словаў я вызначыў як «не ў інтарэсах ісьціны, але ў інтарэсах праўды».

Адзіная твая хіба ў чытаньні – тое значэньне, якое ты надаў прыведзеным цытатам. Чытаем:

Яшчэ адным эфэктам, выкабленым сацыялягічным дасьледаваньнем, які выходзіць далёка па-за межы пазнавальнай функцыі сацыялёгіі, стала вытворчасьць мітаў. Адным зь іх ёсьць шырока распаўсюджаная думка аб тым, што «жанчыны галасуюць за Лукашэнку». Не кранаючы дэталяў ягонага функцыянаваньня, адзначу, што на сёньня гэты міт тэарэтычна легітымізаваны прадстаўнікамі/прадстаўніцамі гендэрных дасьледаваньняў.

То бок я сьцьвярджаю, што міт быў легітымізаваны прадстаўніцамі гендэрных дасьледаваньняў, а каб ня быць галаслоўным – прыводжу цытаты. Па-мойму, цытаты даводзяць легітымізацыю (паспрачаемся?). А я даводжу, што гэта міт. Наагул, я хацеў бы працягнуць дыскусію наконт больш прынцыповых пытаньнях. Пытаньне ж пра галасаваньне я разгледзеў проста як прыклад недаінтэрпрэтацыі. Паводле аналёгіі з сыстэмай грамадзкага харчаваньня ёсьць Макдоналдзы і ёсьць рэстарацыі з добрай кухняй. Адпаведна, існуе і сацыялягічны фаст-фуд – хуткія лічбы. Дык вось, я не жадаў бы, каб да ацэнкі нармальнай кухарскай працы падыходзілі зь меркамі бігмака.

Гэта базавая мэтафара.

Далей. Выказваньне «жанчыны галасуюць за Лукашэнку» можна паказаць як імплікацыю А значыць Б, што, у прынцыпе, пакуецца на сацыялягічныя дыскурсы, якія дасьледуюць дзеяньні людзей. Цяпер у якасьці экспэрымэнту напоўнім гэтую

фармальную структуру іншым зьместам: «лысыя ядуць яблыкі». Скажы, Лёша, ці мяняецца стаўленьне да выказваньня? Мяняецца, хаця гэта – таксама пратакольнае выказваньне. А мяняецца галоўным чынам дзеля прагматыкі. Адсюль галоўнае пярэчаньне тваёй ацэнцы. Ацэнка выказваньняў як пратакольных наперад абмежаваная, паколькі ня ўлічвае іх сацыяльнай значэннасьці (тут я насьледую правілам сацыялягічнай дысцыпліны). У шырэйшым сэнсе, стаўленьне да выказваньня павінна ўлічваць і іншыя выказваньні, і іншыя кантэксты.

А такіх кантэкстаў шмат.

1. Самы наіўны, спэцыяльна для лёгікаў. Гаворка ідзе пра квантары агульнасьці і існаваньня.

2. Палітычны. У апошні час я ў большай ступені, чым ты, уцягнуты ў палітыку – манітору, аналізую, маю досьвед непасрэднай гаворкі. Ты мяркуеш, палітыкі думаюць? Дык не, яны шукаюць сэкс-сымбаль для вырашэньня ўсіх праблемаў. Іншых праблемаў яны проста ня бачаць.

3. Сацыялягічны. У гэтым выпадку шматмерная сацыялягічная рэальнасьць рэдукуецца нават не да дзьвюх шкалаў, а да дзьвюх пазыцыяў на шкалах.

4. Рэфлексіўны. Альміра Ўсманава ў інтэрвію «Маўчаньне жанчын» ускрывае матывацыю галасаваньня: «*Чаму жанчыны галасуюць за Лукашэнку? Яны галасуюць ня столькі за яго, колькі за ідэю сацыяльнай дзяржавы і за ўласную стабільнасьць і спакой. Яны галасуюць за сукупнасьць прынцыпаў, якія гэты рэжым уголас абвяшчае*». Пытаньне, хто гэта кажа, і як галасуе Альміра Ўсманава?

5. Мабыць, самы істотны і асноўны. Я сьцьвярджаю, што гэтае выказваньне ёсьць мітам. Для пачатку цытаты з энцыкляпэдыяў:

Міт – першая форма рацыянальнага спасьціжэньня сьвету, яго вобразна-сымбалічнага адтварэньня і тлумачэньня, што выліваюцца ў прадпісаньне дзеяньняў. Міт ператварае хаос у космас, стварае магчымасьць спасьціжэньня сьвету як нейкага арганізаванага цэлага, выражае яго ў простай і даступнай схеме, якая магла ператварацца ў магічнае дзеяньне як сродак скарэньня неспасьцігальнага. Інтэрпрэтацыя ўнівэрсуму міту антрапаморфная: ён надзяляецца тымі якасьцямі, якія афарбоўваюць быцьцё індывіда ў ягонай узаемасувязі зь іншымі

людзьмі. Адсутнасьць суб'ект-аб'ектнай апазыцыі, адпачатная нерасколатасьць сьвету таксама спэцыфічныя для міталёгіі. Міталягічныя вобразы надзяляюцца субстанцыяльнасьцю, разумеюцца як рэальна існуючыя. Сымбалічнае ўяўленьне прадукуе вобразы, якія ўспрымаюцца як частка рэчаіснасьці: Губман Б. Л. Миф и религия. Культурология, XX век. Энциклопедия. Т. 2. Санкт-Петербург: Университетская книга; ООО «Алетейя», 1998.

МІТ – форма цэласнага масавага перажываньня і тлумачэньня рэчаіснасьці пры дапамозе пачуцьцёва-навочных вобразаў, што лічацца самастойнымі зьявамі рэальнасьці. Міталягічная сьвядомасьць адрозьніваецца сынкрэтызмам, успрыняцьцем карцін, народжаных творчым уяўленьнем чалавека, у якасьці «неабвержных фактаў быцьця» (Лосеў). Для міту не існуе грані натуральнага і звышнатуральнага, аб'ектыўнага і суб'ектыўнага; прычынна-выніковыя сувязі падмяняюцца сувязьзю паводле аналёгіі і дзіўнымі асацыяцыямі. Сьвет міту гарманічны, строга ўпарадкаваны і не падуладны лёгіцы практычнага досьведу. Гістарычна міт узьнікае як спроба пабудовы на інтуіцыйна-вобразным узроўні цэласнай карціны сьветабудовы, здольнай абагульніць эмпірычны досьвед і дапоўніць (з дапамогай абстрактных спэкуляцыяў) яго абмежаванасьць: Жбанкоў М. Р. Новейший философский словарь. – Минск: Интерпрессервис, Книжный Дом, 2001.

А вось гэта з Барта, перапрашаю за шырокае цытаваньне:

Міт – гэта не любое выказваньне; толькі ў асаблівых умовах моўны твор можа стаць мітам; у далейшым мы ўстановім, якія гэтыя ўмовы. Але з самага пачатку неабходна цьвёрда засвоіць, што міт – гэта камунікацыйная сыстэма, паведамленьне. Як вынік, міт ня можа быць рэччу, канцэптам альбо ідэяй; ён уяўляе сабой адзін са спосабаў азначэньня; міт – гэта форма.

У міце мы знаходзім тую ж трохэлемэнтную сыстэму… азначальнае, азначанае і знак. Але міт уяўляе сабой асаблівую сыстэму, і асаблівасьць гэтая палягае ў тым, што ён ствараецца на падставе пэўнай пасьлядоўнасьці знакаў, якая існуе да яго; міт ёсьць другаснай сэміялягічнай сыстэмай. Знак (то бок вынік асацыяцыі канцэпту і акустычнага вобразу) першай сыстэмы робіцца толькі азначальным у другой сыстэме. Варта нагадаць яшчэ раз, што матэрыяльныя носьбіты мітычнага паведамленьня (уласна мова, фатаграфія, жывапіс, рэкляма,

рытуал, нейкія прадметы і г. д.), якімі б рознымі яны ні былі самі па сабе, як толькі яны робяцца часткай міту, зводзяцца да функцыі азначэньня; усе яны ўяўляюць сабой толькі зыходны матэрыял для пабудовы міту.

Возьмем другі прыклад. Уявім, я сяджу ў цырульні, мне працягваюць нумар часопісу «Пары Мач». На вокладцы малады мурын у французкай вайсковай форме: беручы пад казырок, ён глядзіць уверх, верагодна, на французкі сьцяг, які лунае. Такі сэнс выявы. Але якім бы наіўным я ні быў, я цудоўна разумею, што хоча сказаць мне гэтая выява: яна значыць, што Францыя – гэта вялікая Імпэрыя, што ўсе яе сыны, незалежна ад колеру скуры, верна служаць пад яе сьцягамі і што няма лепшага адказу крытыкам так званай каляніяльнай сыстэмы, чым імпэт, зь якім гэты малады мурын служыць сваім так званым прыгнятальнікам. І ў гэтым выпадку перада мной маецца надбудаваная сэміялягічная сыстэма; тут ёсьць азначальнае, якое само ўяўляе сабой першасную сэміялягічную сыстэму (афрыканскі салдат выказвае пашану, як гэта прынята ў французскім войску); ёсьць азначанае (у гэтым выпадку гэта наўмыснае зьмяшэньне прыналежнасьці да французскай нацыі з вайсковым абавязкам); нарэшце, ёсьць рэпрэзэнтацыя азначанага пры дапамозе азначальнага.

Заўсёдная гульня ў хованкі паміж сэнсам і формай складае саму сутнасьць міту. Форма міту – ня сымбаль; афрыканскі салдат, які выказвае пашану, ня ёсьць сымбалем Французскай імпэрыі. Ён занадта рэальны для гэтага, яго вобраз паўстае перад намі ўва ўсім сваім багацьці, жыцьцёвасьці, непасрэднасьці, прастадушнасьці, неаспрэчнасьці. І ў той жа час гэтая рэальнасьць несамастойная, адсунутая на другі плян, як бы празрыстая; крыху адступіўшы, яна ўступае ў змову з канцэптам «французская імпэрыя», які прыйшоў да яе ў поўным узбраеньні; рэальнасьць робіцца запазычанай.

Як гэта ні парадаксальна, але міт анічога не хавае; ягоная функцыя палягае ў дэфармаваньні, але не ўва ўтойваньні.

Я не жадаю загадзя ацэньваць маральныя наступствы такога мэханізму, але думаю, што ня выйду па-за межы аб'ектыўнага аналізу, калі заўважу, што ўсюдыіснасьць азначальнага ў міце вельмі дакладна адтварае фізычную структуру алібі (вядома, што гэта прасторавы тэрмін): панятак алібі таксама мае на ўвазе наяўнасьць запоўненага і пустога месца, якія зьвязаныя

стасункам адмоўнай ідэнтычнасьці («я не знаходжуся там, дзе вы думаеце, што я знаходжуся»; «я знаходжуся там, дзе вы думаеце, што мяне няма»). Але звычайнае алібі (напрыклад, у крымінальнай справе) мае свой канец; у пэўны момант рэальнасьць спыняе кручэньне турнікета. Міт жа яўляе сабой значэннасьць і ня можа разглядацца з пункту гледжаньня ісьціны; нішто не замінае яму захоўваць вечнае алібі. Наяўнасьць двух бакоў у азначальнага заўсёды дазваляе яму быць у іншым месцы, сэнс заўсёды тут, каб маніфэставаць форму; форма заўсёды тут, каб засланіць сэнс. Выходзіць так, што паміж сэнсам і формай ніколі не ўзьнікае супярэчнасьці, канфлікту; яны ніколі не сутыкаюцца адзін з адным, таму што ніколі не апынаюцца ў адной і той самай кропцы.
Канец шырокага цытаваньня. Так што, Лёша, ты даводзіш толькі наяўнасьць структуры алібі ў функцыянаваньні гэтага выказваньня. Сапраўды, ёсьць жанчыны, якія галасуюць за Лукашэнку, і сапраўды, чым болей пажарных высылаць, тым большыя страты ад пажару.
Колькі словаў з нагоды прафэсійнай камунікацыі. Разумееш, я мяркую, што для прафэсійнай камунікацыі павінны быць прафэсіяналы. А калі хтосьці цікавіцца, то ён павінен пытаць, а ня цьвердзіць нейкае глупства. Прынамсі, за гэтымі словамі я бачу акурат гэтыя сэнсы. Ці ў нас ужо рэформу мовы зьдзейсьнілі, і цяпер у нас навамоўе?
*14.10.2005 8:31**
Мікола Кацук
Ігар, таксама дзякуй. Я толькі ўдакладню: паводле прапанаванай схемы магчыма аналізаваць ня толькі практыкі Манаева, але і мае. Галоўнай мэтай напісаньня гэтага тэксту была аб'ектывацыя Кацука як суб'екта, які аб'ектывуе – г. зн. маё самавызначэньне як сацыёляга.
14.10.2005 0:11
Аляксей Бабайцаў
Коля, цудоўны адказ! З утрыманьнем пазыцыі і, больш за тое, з падключэньнем сур'ёзнага мэтадалягічнага пляну.
Я думаю, што ён зрушвае дыскусію на некалькі парадкаў!
Колькі камэнтароў з нагоды:
1. ...«не ў інтарэсах ісьціны, але ў інтарэсах праўды». :-) Калі ты памятаеш, то мяне цікавіць такая рэч, як крытычная (аргумэнтацыйная) функцыя мовы. Матываў у мяне было два:

1) паказаць, што рацыянальная рэканструкцыя на ўзроўні, блізкім да пратакольнага, – гэта простая, але вельмі карысная мэтодыка, якая дазваляе выявіць «пустоты» і «разрывы», не запоўненыя крытычнай аргумэнтацыяй. Канечне ж, мэтодыка пратакольных выказваньняў ня ўлічвае сацыяльнай значэннасьці і кантэкстаў. Але ў гэтам якраз і моцны бок гэтай працэдуры.
Я ж не сьцьвярджаў, што ты ня маеш рацыі ў сваёй крытыцы Ўсманавай і Гапавай – я паказаў на неабходнасьць дадатковай аргумэнтацыі, прычым ня толькі з твайго боку. І ты гэты прабел у сваім адказе, на маю думку, запоўніў;
2) мне было цікава, ці зможаш ты абараніць сваю пазыцыю, не выкарыстоўваючы аргумэнтаў па-за межамі поля, аўтаномнасьць якога ты адстойваеш. Мне здаецца, што твой адказ ня ў меншай ступені мэтадалягічны, чым сацыялягічны. І гэта дастаткова паказальны і вельмі цікавы факт!
Я думаю, што крытычная функцыя мовы толькі выйграла: аргумэнтацыя выйшла на новы ўзровень і фактычна зрушыла зыходную пастаноўку праблемы.
Па-першае, ТАК – недаінтэрпрэтацыя, якая спрыяе зьяўленьню міту.
Адпаведна, праблема ня ў тым, што лічбы некарэктна былі выкарыстаныя, а ў тым, што не было іх поўнай інтэрпрэтацыі, якая дазваляла б неяк аб'ектываваць гэтыя лічбы. Адсюль двухсэнсоўнасьць альбо «алібі», як ты кажаш.
Па-другое, вельмі цікава, як ты праводзіш крытыку выказваньня спадарыні Ўсманавай – тут жа сапраўды дыскрымінантны аналіз не дапаможа – яна ж на сацыялягічныя дадзеныя і не спасылаецца. Зь іншага боку, ты нічога ня кажаш і пра матывацыйныя дасьледаваньні, якія маглі б спраставаць яе выказваньне. Ты робіш нешта іншае – уводзіш панятак «міту» і выснуеш, што выказваньне Ўсманавай, зробленае ў такой форме і ў такіх моўных варунках, адпавядае гэтаму панятку.
Згодны! Навошта бяздоказным сьцьверджаньням надаваць статус навуковых альбо прафэсійных?
14.10.2005 14:40
Мікола Кацук
Добра, Аляксей.
Хачу толькі ўдакладніць, у фразе

Па-першае, ТАК – недаінтэрпрэтацыя, якая спрыяе зьяўленьню міту.
ТАК азначае згоду альбо скарачэньне ад дыскрымінантнага аналізу?
І пытаньне
Навошта бяздоказным сьцьверджаньням надаваць статус навуковых альбо прафэсійных?
– гэта пытаньне рытарычнае альбо зьмястоўнае, адрасаванае мне? Мяркуючы, што ўсё-ткі мне, адкажу. Я не надаю гэтым меркаваньням гэтага статусу. Рэч у тым, што ў наяўных умовах цыркуляцыі ведаў такія выказваньні надзяляюцца сэнсам «навуковых альбо прафэсійных» па-за залежнасьцю ад маіх уласных уяўленьняў пра іх. Паколькі адна справа, калі цётка Аўдоцьця кажа, што жанчыны галасуюць за Лукашэнку, і зусім іншая справа, калі гэта кажа Ўсманава.
Аўтар, як вядома, – функцыя маскаваньня сэнсаў.
Бадай, давай скончым з дробнымі пытаньнямі і зьвернемся да больш сур'ёзных. У цябе ёсьць што сказаць наконт зьместу?
14. 10. 2005 19:05
Тацяна Вадалаская
Мікола, твой артыкул закранае вельмі шмат праблем, але дзьве зь іх мне здаюцца найбольш цікавымі і сур'ёзнымі.
Першая, праблема структураваньня поля сацыялёгіі, дакладней, унутраных крытэраў яго дыфэрэнцыяцыі. З прычыны навізны і «пункцірнасьці» падыходу ўзьнікаюць пытаньні. Ці зьяўляюцца гэтыя крытэры ўнівэрсальнымі для любога поля сацыялёгіі альбо яны ўнікальныя і адлюстроўваюць непасрэдна беларускую сацыялёгію? Мне ўяўляецца, што кантэкст задае толькі спэцыфіку непасрэдна зьмястоўнага напаўненьня кожнага з вылучаных крытэраў і, галоўнае, герархію іх значнасьці. Апісаньне «вобразу» агента поля патрабуе ня толькі ўліку ягонай пазыцыі па кожным з крытэраў, але і велічыні ўнёску рознага тыпу капіталаў у барацьбе за права легітымна выступаць ад імя беларускай сацыялёгіі. І ў зьвязку з гэтым важным ёсьць пытаньне пра ўласна магчымасьці альбо мэтад выяўленьня гэтых крытэраў (герархію іх значнасьці), а як вынік, іх рэпрэзэнтацыйнасьці беларускай сытуацыі. Што можа выступаць крыніцай для такога аналізу? Прасьцей кажучы, як магчыма апэрацыяналізаваць крытэры і іх герархію?
Другая праблема тычыцца парушэньня аўтаноміі поля. Ты,

разглядаючы сучасную сытуацыю, кажаш пра такое парушэньне з боку поля палітычнага, якое ёсьць сымптомам зьнікненьня поля сацыялёгіі ў прынцыпе. Як можна пазначыць мяжу паміж існаваньнем поля (няхай і ў значнай ступені неаўтаномнага) і ягоным зьнікненьнем (распусканьнем у іншым ці іншых палёх)? І ці можна казаць пра аднароднасьць поля, ці неабходна вылучаць ягоны аўтаномны і гетэраномны полюсы, абумоўленыя тым, наяўнасьць якога капіталу (спэцыфічнага ці іншага, напрыклад, палітычнага) задае дамінаваньне. Верагодна, наяўнасьць аўтаномнага полюсу (сацыялёгіі, што вырашае сацыялягічныя задачы) і дазваляе казаць пра захаваньне поля. Акрамя таго, гэты артыкул, на мой погляд, ёсьць дзеяньнем, накіраваным на тое, каб «выгарадзіць» пляцоўку для такога аўтаномнага полюсу.

16.10.2005 7:26

Мікола Кацук

Дзякуй, Таня.

Сапраўды, лініі дыфэрэнцыяцыі накіданы пункцірна і маюць зьмястоўныя адносіны толькі да поля беларускай сацыялёгіі. Аднак істотны прынцып, а зьмястоўнае напаўненьне можна знайсьці: напрыклад, у полі беларускай філязофіі функцыянуюць падобныя адрозьненьні; у полі амэрыканскай сацыялёгіі таксама існуе адрозьненьне тэорыя/эмпірыя; расейская і беларуская сацыялёгіі падобныя аднолькавай траекторыяй адасабленьня ад філязофіі і г. д.

У прынцыпе, можна рэканструяваць (ці задаць тыпалёгію) фактараў, што вызначаюць зьмястоўнае напаўненьне палёў: соцыякультурны (гісторыя краіны), дысцыплінарны і спэцыфічны ўнутраны, уласьцівы акурат для гэтага поля. Аднак у любым разе вылучаныя адрозьненьні ня вынік дасьледаваньня, а яго падмурак, так бы мовіць папярэдняе апісаньне аб'екту дасьледаваньня. У той жа час, самі па сабе яны не зьяўляюцца капіталамі. У гэтай сувязі можна абапірацца на досьвед Качанава і Маркавай (Качанов Ю. Л., Маркова Ю. В. Методологические проблемы исследования смысловой и социальной структур социологического дискурса; Качанов Ю. Л., Маркова Ю. В. Структурный изоморфизм социологического дискурса.

Гаворка пра тое, каб з сукупнасьці актыўных уласьцівасьцяў агентаў поля (то бок пэўных характарыстык-пераменных, якія

адрозніваюць агентаў, таму і называюцца актыўнымі) сканструяваць поле. Гэта магчыма сродкамі шматмернага шкаляваньня альбо фактарнага аналізу. І тады атрыманыя восі і будуць капіталамі, што задаюць N-мернае поле сацыялягічнай вытворчасьці. А ў ім, у сваю чаргу, можна знаходзіць пазыцыі агентаў і/альбо сацыялягічныя адрозьненьні, накшталт камунізм/дэмакратыя.

На жаль, дасьледаваньне ўпіраецца ў час і ў праблему пошуку дадзеных. Скажам, важна, у каго і колькі абароненых асьпірантаў. А як атрымаць гэтыя зьвесткі? Проста прыйсьці ў ВАК і сказаць «дайце»?

Зь іншага боку, у Беларусі з сацыялёгіяй унікальная сытуацыя, паколькі амаль адначасова выйшлі дзьве сацыялягічныя энцыкляпэдыі і значную частку дадзеных можна браць адтуль, і, прынамсі, можна выявіць энцыкляпэдычную структуру беларускай сацыялёгіі ўзору 2003 году.

Акрамя таго, асаблівы інтарэс мае лінія пакаленьняў. У маім тэксьце яна аб'ядноўвае сымбалічны, адміністрацыйны, навуковы, эканамічны, сацыяльны капіталы – тут тэрмін да месца, але без дасьледаваньня ён застаецца эмпірычна пусты. Пакаленьні важныя тым, што дазваляюць адтварыць – дакладней, упершыню напісаць – сацыялягічную мікрагісторыю беларускай сацыялёгіі.

Такім чынам, першы ход арыентаваны на структурнае, сынхранічнае дасьледаваньне, другі – на гістарычнае, дыяхранічнае.

Тваё другое пытаньне – больш складанае. Пакуль думаю.

17.10.2005 5:49

Аляксей Бабайцаў

Коля, наконт артыкулу… Я думаю, што артыкул правільны ў сваёй прагматыцы. Я б гэты тэкст абавязаў вывучаць студэнтаў на сацыялягічным аддзяленьні. Бяз жартаў! У гэтым тэксьце беларуская сацыялёгія як бы ўпершыню набывае пачаткі самарэфлексіі ў публічнай прасторы. І нават калі «зубры» ня выкажуцца, для неабстралянай моладзі гэта добры прыклад. Калі зусім груба, то гэта пытаньне аднаўленьня нармальных прафэсійных крытэраў і пазбаўленьня ад сэрвільнай залежнасьці ад улады і палітычнай ангажаванасьці. Канечне, прафэсійныя крытэры ў нашай сацыялёгіі існуюць, толькі разумеюцца вузка.

Думаю, ты пагодзісься, што прафэсіяналізм сацыёляга – гэта ня проста прафэсіяналізм тэхніка, які асвоіў пэўны тып вымярэньняў («спэца»), гэта асаблівая рэфлексіўная рамка суб'екта («агента») унутры пэўнай навуковай традыцыі, здольнага рэфлектаваць асновы сваёй дзейнасьці, сваёй інстытуцыі, асновы сваёй дысцыпліны. Ці шмат у нас такіх сацыёлягаў?

Тэза Бурд'ё пра аўтаномнасьць поля сацыялягічнай вытворчасьці мне вядомая і зразумелая. Відавочна і тое, што аўтаномія парушаная (дакладней, яшчэ не заваяваная). Таму нармальным прафэсійным сацыёлягам (прынамсі, гэтага пакаленьня) давядзецца жыць і змагацца ўва ўмовах гэтых парушэньняў аўтаноміі поля і залежнасьці ад палітыкі, рынку, мас-мэдыяў, масавай сьвядомасьці і іншай *трасцы*. Гэта трэба разумець. Асабліва маладым. І каваць адпаведную зброю супраць спробаў выкарыстаць сацыялёгію ўва ўсялякай фігні. Сумна чытаць, калі маладыя хлопцы накшталт Ігара Чарняева пішуць пра тое, што незалежны сацыёляг памрэ з голаду, калі не пабяжыць абслугоўваць чарговага гаспадара. Заваёва аўтаноміі – гэта доўгі і цяжкі працэс, ён магчымы толькі празь зьмену пакаленьняў сацыёлягаў, і, магчыма, не адну. Гэты працэс можа быць больш ці менш пасьпяховы. Але ён дакладна ня будзе пасьпяховым, калі ў ім ня зьявяцца тыя, каму гэтая аўтаномія патрэбная, тыя, хто гатовы за яе змагацца.

У незалежнасьці сацыёляга, як ты вельмі слушна заўважыў, Коля, ёсьць і яшчэ адна вельмі важная крыніца: самарэфлексія. Здольнасьць аб'ектываваць сваю ўласную пазыцыю, выяўляючы сацыяльную абумоўленасьць уласных практычных схемаў, сваёй традыцыі і дысцыпліны. У беларускай сацыялёгіі мне невядомыя прэцэдэнты, каб хтосьці гэта зрабіў праз тэкст. Гэта – магутны мэханізм. Большасьць тэзаў твайго артыкулу я, які напісаў у свой час «Інтэлектуальную экалёгію», канечне, падзяляю. Пры гэтым лічу, што ты, сканцэнтраваўшыся на аўтаноміі поля, выпусьціў з вачэй цэлы шэраг іншых важных крытэраў. Сама па сабе аўтаномія поля не гарантуе таго, што ў полі будзе вырабляцца нешта талковае. Пазбавіўшыся ад сэрвільнасьці, поле можа падпасьці пад дзеяньне міталёгіі, уласных догмаў, руціны, пустой словатворчасьці, модных павеваў, памылак і інш. Заўваж – і гэта адбываецца. (Пры гэтым, калі інтарэс навукоўца будзе абмяжоўвацца толькі тым

самым «сацыялягічным інтарэсам», пра які ты пішаш, то атрымаем мы «нармальную навуку», дакладна паводле спадара Куна.) Таму больш важным для мяне ўяўляецца попэраўская тэза пра аўтаномнасьць трэцяга сьвету.
Але ўсё гэта як бы ня зьмест – я думаю, што і ты гэта разумееш. Гэта прагматычны складнік, адсюль вынікаюць хутчэй ацэнкавыя і нарматыўныя наступствы. Накшталт: вось гэта – кепска, а вось так варта зрабіць.
Канечне, многім артыкул спадабаецца і запомніцца толькі таму, што ён як бы супраць ангажаванай сацыялёгіі зачыненага цяпер НІСЭПД. Паколькі дагэтуль падобныя рэчы замоўчваліся, не былі публічнымі. Мала хто зьверне ўвагу на твой адказ Ігару Бабкову, а менавіта тое, што ты пазначыў у гэтым артыкуле свой інтарэс у гэтай гульні. Інтарэс зразумелы. І зразумела, што ў гэтым ёсьць выклік. Ці прыме яго хто-небудзь зь фігур, які ты закрануў? Ня ўпэўнены. Але паглядзім – ня будзем варажыць.
І яшчэ. Адчуваньне, аднак, такое, што замер у цябе быў наагул большы – Бурд'ё, Дзюркгайм і іншая цяжкая артылерыя, толькі ўсё засталося неразгорнутым. Таму калі пакінуць убаку асноўны патас артыкулу, які я, канечне, падзяляю, то ёсьць што абмеркаваць і ў зьмесьце. А вось тут суцэльныя нездаўменьні і пытаньні. А першае ж: а што ты сам лічыш у гэтым артыкуле зьместам, то бок праблемай, вартай далейшага разгортваньня і абмеркаваньня?
17.10.2005 12:32
Мікола Кацук
Лёша, сьпярша адкамэнтую тваю рэпліку. Мне яна дарагая тым, што ты зразумеў артыкул адэкватна. А значыць, мой артыкул можна адэкватна зразумець у прынцыпе.
Наагул артыкул задумваўся як свайго кшталту *інтэнцыя прыма*, мне неабходна было пакласьці сацыялёгію. Адсюль і пункцірнасьць. Наагул, ужо пасьля выхаду артыкулу ў мяне зьявіўся намер напісаць падручнік аб сацыялёгіі пад агульнай ідэяй «як робіцца сацыялёгія».
У цэлым, гэты артыкул – праект, пралёг і праграма сацыялёгіі Беларусі – разумеючы гэта праз анталягічную і аргдзейнасную дошкі. Натуральна, артыкул дысцыплінарны і праз гэта мае перакос у арганізацыю дзейнасьці. Але я перакананы – і гэта эфэкт самавызначэньня – што без нармальнай сацыялёгіі

Беларусь будзе няпоўнай. Датычна

ты, сканцэнтраваўшыся на аўтаноміі поля, выпусьціў з вачэй цэлы шэраг іншых важных крытэраў. Сама па сабе аўтаномія поля не гарантуе таго, што ў полі будзе вырабляцца нешта талковае. Слушна, ня варта забываць і пра «высокую тэорыю» і «паўзучы эмпірызм». Нагадаю: …яна [сацыялёгія] ня вырачана заставацца галіной агульнай філязофіі, што яна здольна шчыльна судакранацца з канкрэтнымі фактамі і не ператварацца пры гэтым у проста практыкаваньне з галіны эрудыцыі.

Сацыялёгія, як я яе разумею, павінна адказваць на выклікі, але адказваць сацыялягічна. У гэтым сэнсе аўтаномія не азначае закрытасьць, наадварот – рэфлексіўнае пазыцыянаваньне адносна іншых пазыцыяў у мысьленьні, камунікацыі і дзейнасьці.

Прасьцей кажучы, матэматык, разьвязаўшы матэматычную праблему, прыносіць эфэкт і нематэматыкам, мяняючы іх практыкі.

Што ж тычыцца зьместу – складанае пытаньне, асабліва для аўтара. Мне прасьцей адказаць, які зьмест для мяне менш каштоўны: «Парушэньні аўтаноміі», «Грамадзкая думка як артэфакт: выпадак НІСЭПД», «Міталёгія полу». Яны носяць больш выражаны функцыянальны характар. У астатнім – трэба разьбірацца як мага больш жорстка.

Мяне цяпер вельмі хвалюе ўзьнятая Тацянай праблема аўтаноміі. Акурат тут – у яе канцэптуалізацыі, – мне думаецца, і варта шукаць адказы. Можна паставіць гэтую праблему больш жорстка: як можна быць аўтаномным у Беларусі і пры гэтым заставацца ў гэтай рэальнай нявыдуманай Беларусі?

Больш інструмэнтальна. У артыкуле закладзеныя асновы рэканструкцыі гісторыі і магчымасьці беларускай сацыялёгіі, рэабілітацыі (альбо нават санацыі шляку інтэрпрэтацый) тэкстаў – таго ж Дзюркгайма, дасьледаваньня палёў сымбалічнай вытворчасьці. Працы шмат, і я ведаю, што адзін не адолею.

23.10.2005 14:14

Алена Гапава

Прагледзеўшы (вельмі бегла) гэтае абмеркаваньне, хачу заўважыць адну рэч. Некаторыя ўдзельнікі дыскусіі займаюцца «клеймаваньнем ГД» (гендэрных дасьледаваньняў), ня ведаючы, што такое ГД (разумеючы пад гэтым тое, што ім чамусьці здаецца) і як там вызначаецца пол. Няведаньне гэтае відавочнае многім наведнікам сайту (мне пішуць студэнты і

калегі: «Алена Ільлінічна, паглядзіце, што яны там пра гендэр кажуць») і выглядае ня вельмі прыгожа. Звычайна людзям ня ўсё адно, у якім абліччы яны паўстаюць перад іншымі, таму, каб спыніць гэты «звальны грэх» (звальваньне сябе ў яму, у якой наўрад ці нехта хоча апынуцца), хачу даць некаторыя тлумачэньні.

У гендэрнай тэорыі пол НЕ разглядаецца ні як біялягічная сутнасьць, ні як набор псыхалягічных характарыстык (маўляў, жанчыны ад прыроды такія, а мужчыны іншыя), ні як нешта сталае (то бок што нібыта існуе па-за альбо да сацыяльнай структуры): інакш кажучы, як тое, што аўтар тэксту і некаторыя ягоныя калегі называюць «пол сам па сабе». Полу «самога па сабе» не бывае – ён не існуе да ўзьнікненьня сацыяльнай структуры, якая гэты пол «прыдумляе» (стварае ўяўленьне пра пол, каб сказаць, што вось гэтыя два чалавекі рознага полу, трэба было пол «вынайсьці», то бок узяць акурат гэтае біялягічнае адрозьненьне асновай для клясыфікацыі, хаця – тэарэтычна – людзей можна клясыфікаваць і паводле росту, і паводле колеру вачэй і г. д.), канструюе, нібыта «аб'ектыўную навуку», нібыта нэўтральнае права, іншыя ідэалягічныя сыстэмы, якія ўсе разам гэты пол «натуралізуюць» у нашых галовах (робяць яго «натуральнай катэгорыяй» – як у сярэднявеччы адны былі «высакароднымі» ад прыроды, а іншыя ад прыроды амаральнымі), і затым выбудоўвае сацыяльныя інстытуты (школу, дзяржаву, катэгорыю грамадзянства, мужчынскага і жаночага, «працу», сям'ю, функцыянаваньне тэхналёгіяў і г. д., больш за ўсё мову як інструмэнт для катэгарызацыі досьведу), у аснове якіх ляжыць гэты падзел. Таму «0,29 %», якія складае «ўласна пол» у тэксьце «Міты беларускае сацыялёгіі», для мяне загадка – мне невядомы «фізычны сэнс» гэтага «ўласна полу». (Гэта што такое – палавы орган? Альбо нешта іншае?)

У гендэрнай тэорыі (як сацыяльнай тэорыі) пол разглядаецца як (найбольш элемэнтарная) катэгорыя сацыяльнага падзелу, як сацыяльная арганізацыя палавога адрозьненьня, як нейкая арганізоўная структура: грамадзтва – каб быць грамадзтвам, то бок структурай – павінна мець некаторыя прынцыпы, у адпаведнасьці зь якімі яно «будуецца ў шэрагі». Пол зьяўляецца адным з такіх прынцыпаў (ён адначасова ў нас у галаве і ў арганізацыі сацыяльных інстытутаў), відавочна, найбольш

элемэнтарным, але не адзіным. Ён заўсёды існуе ў перакрыжаваньні з «клясай» (альбо статусам), узростам, расай (дзе яна склалася як інстытут) – а далей з усімі астатнімі сацыяльнымі падзеламі: адукацыяй, прафэсіяй, месцам прапіскі (я думаю, што, як жанчына зь менскай прапіскай, я знаходжуся ў больш прывілеяваным становішчы, чым мужчына зь сельскай, бо на сяле менш магчымасьцяў добра зарабляць, чым у сталічным горадзе, але і гэта неадназначна). То бок, пол заўсёды ёсьць нейкай кропкай перакрыжаваньня розных сацыяльных характарыстык і ў гэтым сэнсе зьяўляецца «клястэрам» альбо «структурай рэсурсаў» (да якіх, акрамя вышэйпазначанага, адносяцца і наяўнасьць вольнага часу, наяўнасьць альбо адсутнасьць малых дзяцей ці старых бацькоў, якіх трэба даглядаць і г. д.). Але паколькі валоданьне нейкімі рэсурсамі (альбо адсутнасьць іх) у цэлым не індывідуальнае, а сыстэмнае, пол зьяўляецца і сыстэмай азначэньня адносінаў улады. Калі вельмі проста сказаць: я ведаю, які пол часьцей мые посуд. Бо посуд мыюць не палавымі органамі (якія ў мужчынаў і жанчын розныя), а рукамі (якія ўва ўсіх аднолькавыя), але мые пераважна адзін пол, гэта адбываецца з сацыяльных прычынаў: мые той пол, які «ня можа адмовіцца» (у сацыялягічным сэнсе), маючы «менш улады» (я ўсё бяру ў двукосьсе, бо ўсё патрабуе тлумачэньня, напрыклад, указаньні, што ўва ўсіх сыстэмах «брудная праца» заўсёды дэлегуецца групе зь ніжэйшым статусам. Кажучы пра палавы падзел як сацыяльную няроўнасьць, звычайна маюць на ўвазе два складнікі: эканоміку і сэксуальнасьць (у яе сувязі з рэпрадукцыяй).

Мне вядома, што ёсьць выкладчыкі (у тым ліку на філязофска-эканамічным факультэце БДУ), якія «дасьледуюць» і выкладаюць пол «як сутнасьць» (альбо як «аб'ектыўнае адрозьненьне»). На жаль, гэта яны прыдумалі «зь сябе» (альбо ўзялі з традыцыйнай веды, якая такім чынам пол натуралізавала): у гендэрных дасьледаваньнях гэтага няма. Мне вельмі шкада, што так адбываецца (нейкі час існаваў сайт «Гендэрны фронт», дзе абмеркаваньне праблематыкі полу адбывалася ў гэтай пэрспэктыве, якая ня мае адносінаў да гендэрных дасьледаваньняў – а тэрмінам жа можа любы карыстацца). Мне таксама вядома, што ёсьць выкладчыкі (іх большасьць), якія «пол» аніяк не выкладаюць і не дасьледуюць,

не ўлучаючы яго наагул у сацыяльную структуру (у арганізацыю веды, у філязофскія сыстэмы – як калі б былі нэўтральныя ў адносінах да полу). І «гэтага» шкада, таму што «негендэрных» сацыяльных сытуацыяў не бывае (проста іх можна разглядаць у розных пэрспэктывах – выразна кажучы пра пол альбо ня кажучы пра яго наагул, ад чаго ён анікуды не дзяецца: гаворка ў такім разе проста ідзе пра іншае). Той факт, што сацыяльны дасьледнік у 2005 г. пачынае пра пол толькі «здагадвацца» і спрабаваць падаць яго як «утварэньне» (то бок бярэ «наўздагад» адну лінію з усёй структуры рэсурсу, прычым у гэтым выпадку менш значную) і, не валодаючы катэгорыямі для апісаньня гэтай сацыяльнай зьявы, кажа, што пол дзейнічае «апасродкавана», канечне ж, вельмі сумна. Вядома, апасродкавана – зьяўляючыся пэўнай канфігурацыяй сацыяльных адносінаў. Немагчыма ўявіць заходняга сацыёляга, які б «не здагадваўся» пра гендэр як сацыяльную катэгорыю (хаця яўна можа ніколі гэтым не займацца, але будзе ўяўляць, што гэтая катэгорыя заўсёды ёсьць). З чаго не вынікае, што на Захадзе «ўсё лепш, чым у нас», канечне ж.

Далей ня сьмею ўмешвацца ў абмеркаваньне тэксту – я хацела ўказаць толькі на відавочнае (бачнае вачам, калі ісьці за этымалёгіяй слова): клеймаваньне гендэрных дасьледаваньняў мае сваім аб'ектам тое, чаго гендэрныя дасьледаваньні ніколі не казалі, а таму выстаўляе актораў, якія кляймуюць, у ня вельмі выгадным сьвятле. Магчыма, ня ўсе жадаюць у ім апынуцца.

23.10.2005 15:29

Мікола Кацук

Алена Гапава ізноў убачыла тое, што жадала ўбачыць. Па-першае, я не прыгадваю, каб калі-небудзь на гэтым сайце абмяркоўвалася гендэрная тэорыя і гендэр, і тым больш не было «клеймаваньня гендэрных дасьледаваньняў» – калі штосьці і было заклеймаванае, то толькі непрафэсіяналізм і некампэтэнтнасьць. Па-другое, хацелася б, каб абмеркаваньне праглядалася «ня бегла», а ўважліва. А ўжо артыкул – тым больш. Іначай не зьявілася б сумнеўная фраза: «Таму «0,29 %», якія складае «ўласна пол» у тэксьце «Міты беларускае сацыялёгіі», для мяне загадка …». Рэч у тым, што ў артыкуле няма аніякіх 0,29 % пра ўласна пол. НЯМА! Магчыма, аднак, што гаворка ідзе пра мой адказ Ігару Чарняеву, калі, ідучы

насустрач ягоным пажаданьням, я прывёў «Каэфіцыент рангавай карэляцыі Сьпірмэна для пераменных полу і адукацыі», які роўны -0,012 пры ўзроўні значэннасьці 0,596 (двухбаковая) і 0,298 (аднабаковая).
Таму неабходна патлумачыць, але пачну здалёк. Неяк яшчэ ў 1895 годзе Эміль Дзюркгайм у «Мэтадзе сацыялёгіі» сфармуляваў прынцып – «сацыяльнае жыцьцё цалкам складаецца з уяўленьняў». Сьвежа, ці ня так?
Такім чынам, у падмурку мэтаду сацыялягічнага пазнаньня ляжыць прынцыповае адрозьненьне паміж Культурай і Прыродай. Катэгорыя культуры (літаральна «апрацаванае», «уробленае») задаецца праз супрацьстаўленьне катэгорыі Прыроды: культура – гэта другая прырода. Усе спробы даць зьмястоўныя вызначэньні культуры ў канцавым выніку выяўляюцца безвыніковымі. Аднак зь першапачатковага супрацьстаўленьня вынікае, што ўсе зьявы культуры валодаюць наступнымі характарыстыкамі:
1. Штучнасьць, робленасьць, створанасьць.
2. Празьмернасьць.
3. Умоўнасьць.
4. Адвольнасьць.
Адпаведна, культура мае носьбіта і творцу – чалавека. Іншымі словамі: «людзі робяць». З гэтага вынікаюць два наступствы:
А. Усё, што робяць людзі (менавіта «людзі», а не біялягічныя арганізмы віду гома сапіенс) празьмерна, умоўна, адвольна і г. д. у дачыненьні да Прыроды. У агульным выглядзе выяўляецца, што актыўнасьць (напрыклад, спаталеньне голаду) можа быць натуральная і культурная. У першым выпадку ў суб'екта адзіная мадэль паводзінаў (калі, канечне, наагул да такога кшталту актыўнасьці можна ўжываць паняткі суб'екту і мадэль паводзінаў); у другім – іх бясконцае мноства. Такім чынам, можна казаць пра энтрапію і хаатычнасьць чалавечай актыўнасьці датычна Прыроды. Сам сабой стан голаду не прадвызначае, якую мадэль актыўнасьці абярэ чалавек.
Б. У той жа час мы можам назіраць, што большасьць чалавечых дзеяньняў нейкім чынам упадаркаваная, неадвольная. Кожны раз мы не сустракаем сьвет абсалютна новым. Існуе шмат паўторных дзеяньняў і падзеяў.
Такім чынам, у чалавечай дзейнасьці пераважае адтварэньне над тварэньнем. Адсюль пытаньне, пакладзенае ў падмурак

сацыялягічнай дысцыпліны: «ЯК МАГЧЫМАЕ ГРАМАДЗТВА?»
Тым самым сацыялёгія арыентаваная на выяўленьне ўмоваў, якія вызначаюць (уплываюць, афармляюць, абмяжоўваюць і г. д.) сумесную дзейнасьць людзей. Сам чалавек апісваецца цэлым ансамблем актыўных уласьцівасьцяў – актыўных у тым сэнсе, што яны так ці іначай уплываюць на ягоную дзейнасьць. Тым самым, у сацыялёгіі Сацыяльнае разумеецца як актуалізаванае Культурнае.
У эмпірычнай сацыялёгіі гэтыя актыўныя ўласьцівасьці ўяўляюцца ў выглядзе пераменных. (Дадам яшчэ раз, уласьцівасьці – вынайдзеныя, і зьмяшчаюцца ў рамцы культуры, а не прыроды.)
У агульным выглядзе, пераменная – гэта лічбавая характарыстыка пэўнай актыўнай уласьцівасьці нейкай множнасьці аб'ектаў, у якой хаця б адзін аб'ект адрозьніваецца паводле гэтай уласьцівасьці. Спосабы азначэньня – прыпісваньне лічбы ўласьцівасьці – могуць быць розныя і называюцца шкаламі. Пол як пераменная рэгіструецца ў намінальнай дыхатамічнай.
Каб высьветліць, што значыць у Беларусі быць, скажам, «мужчынам», неабходна адну множнасьць, абазначаную адзінкай, адрозьніць ад іншай, абазначанай двойкай. Гэта робіцца пры дапамозе іншых множнасьцяў пераменных, якія максымальна паказваюць адрозьненьні паміж дзьвюма множнасьцямі. Існуюць спэцыяльныя статыстычныя крытэры для таго, каб ацаніць ступень узьдзеяньня. Калі раптам выявіцца, што няма аніякіх адрозьнівальных пераменных, то гэта будзе гаварыць пра тое, што ў сацыяльным сэнсе мужчыны і жанчыны ў грамадзтве неадрозныя, то бок тоесныя. У прынцыпе, наагул няма аніякай розьніцы, зь якімі менавіта множнасьцямі працаваць – гэта могуць быць прыхільнікі і праціўнікі, мужчыны і жанчыны, пакупнікі чыпсаў «Лэйс» альбо «Анега». Важна іншае: якія менавіта пераменныя максымальна адрозьніваюць групы. У гэтым выпадку (у артыкуле) аказваецца, што пол як пераменная ня мае ролі.
Папросту кажучы, мыцьцё посуду (таксама намінальная дыхатамічная пераменная – мые / ня мые) адрозьнівае мужчынаў і жанчын (і не адрозьнівае сельскіх і гарадзкіх жыхароў), а пол як пераменная не адрозьнівае прыхільнікаў і праціўнікаў.

Таму ня трэба гаварыць, што «факты беларускага жыцьця» – гэта ня факты, а міты.
А міты трэба не легітымізаваць і распаўсюджваць, а выкрываць.
Патлумачу і сэнс гэтых 0,29 %. Паміж рознымі пераменнымі можна выявіць ня толькі іх сувязь, але і яе сілу і кірунак. Для выпадку адукацыі і полу можна выкарыстаць рангавую карэляцыю Сьпірмэна.
Яе значэньне -0,012 указвае на вельмі слабую сувязь (фактычна яе адсутнасьць, моцнай лічыцца больш за 0,8) і адваротны напрамак сувязі. Гэта значыць, адукацыя жанчын толькі нязначна ніжэйшая за адукацыю мужчын. Але ёсьць яшчэ і ўзровень значэннасьці. Калі ён роўны 0,01 альбо 1 %, то верыць каэфіцыенту можна на 99 %, а ня верыць на 1 %. Адпаведна, наяўнасьць слабой сувязі паміж полам і ўзростам пацьвярджаецца на 70,2 % і не пацьвярджаецца на 29,8 %. Адсюль агульная выснова – залежнасьці паміж полам і адукацыяй няма.
Завяршаючы, адзначу наступнае. Трэба не расказваць байкі пра гендэрныя дасьледаваньні, а дасьледаваць. Ня хлусіць пра тое, што «сацыяльны дасьледнік у 2005 пачынае пра пол толькі «здагадвацца» і робіць спробу падаць яго як «утварэньне» (то бок бярэ «наўздагад» адну лінію з усёй структуры рэсурсу, прычым у гэтым выпадку менш значную) і, не валодаючы катэгорыямі для апісаньня гэтай сацыяльнай зьявы, кажа, што пол «дзейнічае «апасродкавана», канечне ж, вельмі сумна», – а пайсьці і павучыцца. Напрыклад, будаваць мадэлькі складанейшыя, чым аднамерныя верагоднасныя імплікацыі накшталт А значыць Б.
І ўлічыце, ветлівасьці ў мяне амаль не засталася.
P. S. Асобны дзякуй за двайную згадку пра палавыя органы. Памятаецца, я яшчэ студэнтам, у 96–97 гг. чуў ад вас гэты маляўнічы прыклад пра мыцьцё посуду бязь іх дапамогі. Усё ж добра, што хоць штосьці ў сьвеце застаецца стабільнае.
24.10.2005 03:24
Вольга Шпарага
Коля, як толькі будзеш няветлівым, выдалім цябе! Ня дай агню выйсьці з-пад кантролю і спаліць абмеркаваньне! Сказанае тычыцца, між іншым, і ўсіх астатніх удзельнікаў абмеркаваньня.
24.10.2005 06:46

Мікола Кацук
24.10.2005 7:51
Вольга Шпарага
Коля, я ні ў якім разе не жадаю цябе пакрыўдзіць, але ў мяне ўзнікае сумнеў, што акурат дзякуючы твайму артыкулу новае дасьледаваньне НІСЭПД стала карэктнае. На падставе чаго ты прыйшоў да высновы, што «дзякуючы табе»? З гэтага ж, акрамя ўсяго іншага, вынікае, што наладжваецца інтэлектуальная камунікацыя, якая і ёсьць мэтай дадзенага сайту.
Ну што ж, Вольга, патлумачу. Сьпярша жартам.
Герцаг моўчкі падышоў да акна і паглядзеў на неба:
– Як на ліха, сёньня чыстае неба.
– Так, – хуценька пагадзіўся бурмістар, які стаў побач. – Зранку сапраўды быў туман, але потым ён зьнік.
– Вы хочаце сказаць, спадару бурмістар, што гэта ягоная заслуга? – выгукнула баранэса.
– Я нічога не хачу сказаць, баранэса, – паціснуў плячыма бурмістар. – Я проста адзначаю, што сёньня цудоўны дзень, хаця зранку быў туман. У нас няма аніякіх падставаў сьцьвярджаць, што ён яго разагнаў, але і казаць, што ён не разганяў туману, значыць супярэчыць таму, што бачыш.
Цяпер больш сур'ёзна. Падставы ў мяне наступныя:
1. Доўгі час на сайце НІСЭПД выстаўляліся матэрыялы вельмі нізкай якасьці (у мяне ёсьць архіў, на якім гэтую тэндэнцыю можна зафіксаваць).
2. Адсюль, дзеля таго, каб зьмяніць гэтую традыцыю-звычку, павінны быць: а) рэсурсы, б) разуменьне неабходнасьці яе зьменаў, в) сур'ёзная нагода.
3. Мне прыемна лічыць, што гэта выклікана маім артыкулам. У сваю чаргу, падставамі для гэтага зьяўляюцца:
3.1. Выхад часопісу і ягонае масавае распаўсюджваньне на Кангрэсе дэмакратычных сілаў. Дынько, паводле ягоных словаў, распрадаў большую частку накладу, рэклямуючы менавіта нумар з маім артыкулам. Уся валтузьня з адзіным кандыдатам была пабудавана на дадзеных НІСЭПД. А паколькі немагчыма ўявіць больш кампактнага збору мэтавай аўдыторыі спажыўцоў сацыялёгіі, чым на Кангрэсе, удар дасягнуў мэты. НІСЭПД быў вымушаны павысіць узровень аналітычнай працы, іначай ён быў бы выцесьнены з поля.
3.2. Ускосным доказам ёсьць адказ Дракахруста, дзе ў дакор

мне ставіцца непрафэсіяналізм (маўляў, хлапчук прачытаў адзін падручнік) і адсутнасьць «грамадзянскай годнасьці». Разьбіраць падрабязна прафэсійныя закіды ня мае сэнсу, паколькі ўзровень аргумэнтацыі ніжэйшы за плінтус. А гістэрыка – ізноў жа доказ сур'ёзнасьці нагоды. (Адзначу, Дракахруст шчыльна зьвязаны з Манаевым і адзін час быў намесьнікам дырэктара НІСЭПД.)
3.3. Спасылку на тэкст артыкулу я асабіста даслаў на скрыню НІСЭПД.
3.4. У прафэсійным асяродзьдзі (калі не лічыць тых, хто ў танку) артыкул ацэньваецца як варты ўвагі.
Адсюль, калі і існуе наладжваньне прафэсійнай камунікацыі, то гэта не зьяўляецца заслугай гэтага сайту, таксама як і сэрвэра, на якім разьмешчаны сайт. Гэта мая заслуга. Сайт толькі разьмясьціў гэты артыкул, таксама як і ЖЖ. Дарэчы, зроблена гэта было больш карэктна, чым тут, табліцы ня плылі, на пачатку і ў канцы не было ўставак ад «ARCHE», спасылкі працуюць.
24.10.2005 09:48
Вольга Шпарага
Коля, наконт «і гэтага сайту» мелася на ўвазе іншае: калі ў цябе атрымалася ажыцьцявіць сваю інтэлектуальную працу дзе б ні было (зразумела, што ў гэтым выпадку ўвогуле не пры дапамозе гэтага сайту), ацаніць гэта было б карысна і для гэтага сайту. Так што твае заслугі ў цябе ніхто не адымае, не ўяўляю нават, як гэта магчыма. Пытаньне пра ўплыў усё-ткі застаецца: хацелася б мець зваротную сувязь у больш непасрэдным выглядзе. Гэта тычыцца, канечне, і працы ўсіх нас. Коля: НІСЭПД было вымушана павысіць узровень аналітычнай працы, іначай яно было б выцесьненае з поля.
Я: А ці ёсьць у сацыёлягаў Беларусі адзінае поле?
25.10.2005 11:01
Мікола Кацук
Зразумела.
1. Ход маіх разваг быў наступны. Разуменьне праблемы (з сацыялёгіяй робіцца нешта нядобрае), вызначэньне мэты, аналіз рэсурсаў, выбар спосабу ўзьдзеяньня – рэалізацыя, маніторынг эфэктыўнасьці.
2. Не зусім карэктна выказаўся. НІСЭПД пазыцыянуецца тым, што дае інфу для палітычнай апазыцыі. То бок яны маглі

проста перастаць спажываць інфармацыю, як вынік, уплыў – нуль. Што ж тычыцца існаваньня поля сацыялёгіі, то яно ёсьць, усе адно аднаго ведаюць, але практычна (у дзейнасьці) адно на аднаго не рэагуюць. Кожны сам сабе сацыёляг. У параўнаньні зь філязофіяй сытуацыя ўсё-ткі выглядае крыху лепш, бо існуе пэўны тэхналягізм у працы.

25.10.2005 22:10

Алена Гапава

Праблема зь ветлівасьцю, якая пагражае скончыцца, нават не пачаўшыся, палягае ў тым, што чужы гонар нельга скрасьці – трэба свой мець. І малюючы партрэт іншага чалавека, мы насамрэч малюем свой.

А наагул, час казаць па справе, бо гаворка пра сур'ёзныя рэчы. З тэксту «Міты беларускае сацыялёгіі» выразна тырчаць рожкі «інтарэсу»: ён надзвычай ідэалягічны, а ідэалёгія выпрацоўвае тое, чаму дазволена лічыцца рэальнасьцю. У чым гэты інтарэс – то бок навошта аўтару спатрэбілася, каб рэальнасьцю лічылася акурат гэта і якім чынам ён гэтага дасягае, я паспрабую паказаць. Як пісаў Славой Жыжак, ласкава запрашаем у пустэльню рэальнасьці.

Калі коратка выкласьці тую частку «Мітаў беларускае сацыялёгіі», што тычыцца полу: за А. Л., «паводле сьцьверджаньня гендэрных дасьледнікаў» (падаецца цытата з адсоткамі з майго тэксту), «галасуюць жанчыны». Гэта міт – пол тут ні пры чым:

Пераменная пол аказваецца незначэннай, паколькі дзеля натуральных дэмаграфічных працэсаў працягласьць жыцьця сярод жанчын большая, чым у мужчын; і сярод людзей сталага веку жанчыны пераважаюць.

Істотна іншае:

Найбольш важным фактарам зьяўляецца наяўнасьць адукацыйнага капіталу, які дазваляе, па-першае, крытычна інтэрпрэтаваць інфармацыю, і па-другое, адкрывае доступ да іншых крыніцаў. У сацыяльнай прасторы Беларусі гэтыя крыніцы разьмеркаваныя нераўнамерна, і чым большы населены пункт, тым болей гэтых крыніцаў. У сельскай мясцовасьці дамінуе тэлебачаньне з абмежаванай колькасьцю праўрадавых каналаў. Адсутнасьць у мадэлі пераменнай месца жыхарства можна лёгка вытлумачыць, бо пераменная «рэгіён» улучае яе ў сябе і мае болей градацыяў, а значыць, і большую адрозьнівальную

здольнасьць. Зь іншага боку, адукацыя зьвязаная з узростам, паколькі людзі старэйшага пакаленьня мелі меней магчымасьцяў для яе атрыманьня.

То бок узровень адукацыі не дазваляе жанчынам зразумець і годна ацаніць перавагі тых каштоўнасьцяў, якія прапануе апазыцыя. Празь цемнату і неадукаванасьць яны галасуюць так, як галасуюць.

Я пастаралася выкласьці сутнасьць справы коратка (і шчыра не жадала нічога перакруціць), хаця там шмат смачных дэталяў, якія можна было б разьбіраць, але больш важна наступнае. Першае. Стратыфікацыйная катэгорыя, якую канструюе аўтар, не называецца «полам». Яна называецца «ўзрост». Вядома, узросту бяз полу не бывае (як і полу без узросту) – любая катэгорыя існуе ў скрыжаваньні зь іншымі, але ўсё-ткі за аснову бярэцца нейкая адна лінія. «Пол» выбудоўвае вакол лініі рэпрадукцыі (розны ўдзел у ёй мужчынаў і жанчын, на падставе чаго яны адносяцца да розных полаў), а людзі, якія даўно выйшлі з рэпрадукцыйнага ўзросту, трапляюць у катэгорыю «людзі сталага веку» альбо «пэнсіянэры». Бо па-за рэпрадукцыяй – а для іх гэта ўжо ў мінулым – розьніцы паміж імі «няма» (гэта значыць, ніхто ня будзе адмаўляць бабулі ў прыёме на працу, баючыся, што яна сыдзе ў дэкрэтны адпачынак – няма для яе цяпер адрозьненьня ад дзядулі, але ж яны і так збольшага не працуюць). То бок высновы аўтара насамрэч тычацца групы людзей сталага веку, а не жанчын і мужчынаў: нельга на гэтай падставе казаць пра тое, як галасуюць жанчыны.

Другое. Для таго, каб разглядаць мужчынаў і жанчын (адрозьненьне паміж імі ў галасаваньні), трэба браць іншую ўзроставую групу – якая знаходзіцца ў рэпрадукцыйным узросьце (звычайна гэта ад 18 да 55 гадоў). Дык вось, у гэтай катэгорыі адукацыя жанчын вышэйшая (а не ніжэйшая, як яшчэ раз сьцьвярджае аўтар у дадатковым звароце на гэтым форуме: («адукацыя жанчын толькі нязначна ніжэйшая за адукацыю мужчынаў»). Паводле зьвестак Міністэрства статыстыкі, жанчыны складаюць 58,4 % сярод людзей з вышэйшай адукацыяй і 65,8 % – сярэдняй спэцыяльнай (тлумачэньне з нагоды: высокі адсотак жанчын сярод людзей з вышэйшай адукацыяй – тэндэнцыя ўзьнікла пры сацыялізьме – азначае, што адукацыя перастала служыць прыступкамі да вялікіх

даходаў; калі для жанчын нешта даступна ў большай ступені, чым для мужчынаў, гэта значыць, што яно – прафэсія, напрыклад – стала непрэстыжнае). З чаго вынікае, што не з прычыны адсутнасьці *«адукацыйнага капіталу, які дазваляе, па-першае, крытычна інтэрпрэтаваць інфармацыю»*, жанчыны галасуюць за А. Л. у большай ступені, чым мужчыны. То бок пададзенае ў тэксьце «Міты беларускае сацыялёгіі» тлумачэньне не працуе.

Далей – у наступным паведамленьні.

26.10.2005 8:58

Мікола Кацук

ПРАБАЧЦЕ, я вымушаны гэта рабіць

Я працягваю лічыць рэплікі спадарыні Гапавай ГЛУМАМ. Яна НЕКАМПЭТЭНТНАЯ.

Разумееш, Вольга? Магчыма, у цябе калісьці падчас прыёму іспыту была такая сытуацыя. Табе кажуць, што Плятон быў сярэднявечным філёзафам і напісаў «Горад Сонца». Ты кажаш – гэта няправільна. Табе ў адказ – вы нічога не разумееце і г. д. Ты за падручнік, а табе – вы самі такое казалі на лекцыі. Ты за канспэкт – а ў канспэкце такога няма. І гэта нібыта даводзіць правату студыёза-недавучкі. Сацыялёгія – гэта не плявузганьне. Ёсьць матэматычная мадэль, якая спрастоўвае міт. Прапаноўваецца інтэрпрэтацыя мадэлі – «*Тэарэтычная інтэрпрэтацыя атрыманай мадэлі можа быць наступная*». Скажэце, ці ёсьць розьніца ў выказваньнях: а) можа быць наступная, б) ёсьць наступнай?

Тое, што спадарыня Гапава зьвяртаецца да дадзеных статыстыкі, канечне, пахвальна. «Паводле зьвестак Міністэрства статыстыкі, жанчыны складаюць 58,4 % сярод людзей з вышэйшай адукацыяй і 65,8 % – сярэдняй спэцыяльнай».

Толькі вось на першым курсе ў інстытуце праходзяць такі жарт: працэнт алькаголікаў сярод рабочых зусім ня тое самае, што працэнт рабочых сярод алькаголікаў.

То бок варта было і паглядзець, колькі сярод жанчын людзей з вышэйшай адукацыяй.

І яшчэ вось што цікава, сярод людзей з пачатковай адукацыяй жанчыны складаюць больш за 70 %. І пры ўзрастаньні рангаў (узроўняў адукацыі) пачатковая адукацыя нівэлюе вышэйшую. Пытаньне. Адкуль спадарыня Гапава дастала рэпрадукцыйную функцыю? Якія яна – не спадарыня Гапава, а рэпрадукцыйная

функцыя – мае адносіны да палітыкі і галасаваньня? Няўжо палавыя органы ёй і там мірсьцяцца?
А вось гэта і наагул шэдэўр думкі спадарыні Гапавай:
Для таго, каб разглядаць мужчынаў і жанчын (адрозьненьне паміж імі ў галасаваньні), трэба браць іншую ўзроставую групу – якая знаходзіцца ў рэпрадукцыйным узросьце (звычайна гэта ад 18 да 55 гадоў).
Яшчэ раз: ...ЯКАЯ ЗНАХОДЗІЦЦА Ў РЭПРАДУКЦЫЙНЫМ УЗРОСЬЦЕ
Людзі, АУ! Учытайцеся! У нас што, людзі старэйшыя за 55 не галасуюць?
І хто яна пасьля гэтага?
26.10.2005 20:34
Алена Гапава
У працяг учорашняга паведамленьня.
Такім чынам, прыведзенае аўтарам тлумачэньне не працуе, і тут узьнікае прынцыповае пытаньне пра тыя сувязі, якія нібыта паказвае статыстычнае дасьледаваньне (хаця ў гэтым выпадку не паказвае, бо НЕ прыведзены дакладныя зьвесткі аб узроўні жаночай адукацыі). Ігар Чарняеў цалкам меў рацыю, калі напісаў падчас летняга абмеркаваньня, што статыстыка заўсёды вызначаецца тымі гіпотэзамі, якія пры яе дапамозе правяраюцца: аніякія «хі= квадраты» самі па сабе нічога ня значаць. То бок у пэўным сэнсе яна паказвае толькі тое, што ў яе закладзенае. Напрыклад, статыстычна можна вылічыць верагоднасьць таго, куды я пайду пасьля працы. Для гэтага трэба закласьці пэўны веер магчымасьцяў: дадому, у кіно, у госьці, у краму (верагоднасьць «дадому» будзе вышэйшая, чым «у кіно», на падставе вядомай частотнасьці гэтай падзеі). Але ж я магу сесьці на электрычку і паехаць у лес – але калі гэтую магчымасьць не закласьці (забыцца, палічыць нязначнай, падумаць, што жанчыны адны ў лес ня езьдзяць), статыстыка яе не пакажа. Альбо пакажа «выпадковыя сувязі». Напрыклад, паміж узроўнем адукацыі і мыцьцём посуду. То бок колькасьць жанчын з вышэйшай адукацыяй большая, чым мужчынаў, але яны ўсё адно посуд мыюць часьцей. Можна зрабіць выснову, што гэта адбываецца з прычыны іх высокага адукацыйнага ўзроўню. То бок яны лепш разумеюць, што трэба змагацца зь мікробамі, іначай можна захварэць жыватом і іншымі часткамі цела. А «мужыкі», адпаведна, з прычыны меншай адукаванасьці думаюць, што якраз наадварот – бруд мікробаў забівае – таму

іх радзей можна засьпець за прыбіраньнем кватэры і мыцьцём шкарпэтак. Адсюль парады: для таго, каб мужчыны прымалі больш дзейсны ўдзел у хатняй працы, трэба павышаць іх адукацыйны ўзровень (вадзіць у тэатры і музэі, чытаць на ноч кніжкі і правяраць, ці мылі яны рукі перад тым, як селі есьці). Відавочна, каб статыстыка сапраўды нешта паказвала, трэба мець пэўнае папярэдняе ўяўленьне пра тое, што менавіта ў сувязі з чым варта вылічваць, то бок уяўляць структуру грамадзтва: якая ягоная стратыфікацыя (прынцып, паводле якога адбываецца падзел на групы) і што ў грамадзтве здараецца зь «неабходнасьцю». Стратыфікацыя (то бок няроўнасьць) – гэта падмурак грамадзтва, тое, што, структуруючы, робіць мноства індывідаў грамадзтвам (і няма грамадзтваў безь няроўнасьці). Таму (кажу я студэнтам) стратыфікацыя – адна з галоўных праблемаў сацыялёгіі (у час летняга абмеркаваньня «аўтар» пісаў, што стратыфікацыя – гэта драбяза, падобная таксанаміі прафэсіяў у табліцах міністэрства працы; у сусьветнай сацыялёгіі гэта ня так).
Гендэр – адна з такіх лініяў структураваньня (не адзіная, але найбольш элемэнтарная) – вызначае, у пэўным сэнсе, што быць «можа», а што – не. Калі ў рамках праекту папярэджаньня трафіку наркотыкаў супрацоўніца пытае: прыкладам, жанчына – наркадылер, у яе ёсьць сто кіляграмаў гераіну – і што з таго? – я кажу: стоп. Такога быць ня можа. Сто кіляў гераіну – гэта вялізная «каштоўнасьць», і ў жанчыны такой колькасьці ня будзе, таму што яна ня можа стаяць так высока ў наркагерархіі. Прычыны гэтага – не ў яе асобе, а ў гендэры, то бок у тым, як наркабізнэс (як інстытут) структураваны адносна полу (хаця, у прынцыпе, магчымая нейкая незвычайная жанчына, якая праб'е ўсе перашкоды, але для гэтага павінны скласьціся ўсе варункі). Гэта прыблізна тое, што аўтар спрабуе патлумачыць, калі кажа, што пол дзейнічае «ня сам па сабе», а «апасродкавана». Такой тэрміналёгіі ў сацыялёгіі няма: можна сказаць, што праяўляецца нейкая з убудаваных у сыстэму залежнасьцяў (статыстыка яе выяўляе), то бок нешта, што існуе не ў чалавеку (бо пол – гэта ня сутнасьць і не ўласьцівасьці), а па-за ім – у арганізацыі інстытутаў. Калі дасьледуюць пол і тое, як ён зьвязаны з арганізацыяй інстытутаў і структурай грамадзтва (а галасаваньне ў пэўным сэнсе адлюстроўвае структуру грамадзтва), у разгляд найперш уключаюць рэчы, так ці іначай

зьвязаныя з рэпрадукцыяй, бо пол выбудоўваецца вакол яе. Пра тое, як галасуюць жанчыны і чаму – у наступным паведамленьні.

*26.10.2005 21:47**

Ігар Бабкоў

Яшчэ раз перачытаў артыкул Гапавай, каб сфармуляваць сваю пазыцыю.

На маю думку, гэта ўсё ж такі прыклад інтэлектуальнага прадукту тыпу «папса», выраблёнага на Захадзе і для Захаду пра «ўсходніх» інтэлектуалаў. Штосьці кшталту рэтраспэктыўнай «паўарыенталізацыі» ў духу Лары Вульфа, зробленай выхадцам з «Усходу».

Гэта вынікае з наступнага:

А. У тэксьце няма аніводнай спасылкі на тэксты беларускіх інтэлектуалаў, не названа аніводнага прозьвішча, і што больш істотна, не абазначана аніводная інтэлектуальная пазыцыя. Беларускія інтэлектуалы паводле Гапавай – гэта шэрая маса, адзіным індыкатарам адрозьненьня якой выступае легендарная бабка Аўдоцьця, зь якой тыя не супадаюць. Каб зразумець, што так ня робяць, можна зьвярнуцца да кнігі Волі Гнацюк «Разьвітаньне з імпэрыяй» (пра ўкраінскіх інтэлектуалаў). Гэта больш як паўтысячастаронкавая праца, у якой вычарпальна задакумэнталізаваны і прааналізаваны адпаведны (украінскі) матэрыял. Воля Гнацюк, прынамсі, ня блытае пазыцыі Рабчука і Грыцака і не спрабуе з вышыні сваёй Варшаўска-Гарвардзкай пазыцыі зрабіць іх маленькімі-маленькімі.

Б. У тэксьце няма спасылак на тэксты людзей, якія гэтымі праблемамі займаюцца прафэсійна, альбо аналізу гэтых тэкстаў. Спасылка на Саіда абсалютна левая і ня ўводзіць посткаляніяльны кантэкст. Як можна казаць пра эканоміку і вызваленьне клясы без Станішкіс і камп.? Тэкст сапраўды некампэтэнтны.

В. Тэкст напісаны абсалютна абразьлівым тонам. Пры гэтым аўтар, рэдукуючы ўсіх да эканамічных інтарэсаў, чамусьці забывае зрабіць гэта ў дачыненьні да ўласнай сытуацыі. Аўтар зьяўляецца адным з самых вялікіх грантаатрымальнікаў у беларускай акадэмічнай сфэры. Якім чынам гэта адбілася на лёсе гендэрных дасьледаваньняў?

Падсумоўваючы: для мяне гэта прыклад асабіста матываванага, глыбока няшчырага «аналізу», які імкнецца схаваць свае

асабістыя інтарэсы за «дэканструкцыяй» сваіх калегаў.
Па сутнасьці, гэта інтэлектуальны «данос», скіраваны на Захад, – «вы не сябруйце з гэтымі інтэлектуаламі, яны прадажныя і несамастойныя». З кім жа тады нам варта сябраваць? – пытаюцца крыху зьдзіўленыя нашыя калегі. Я думаю, адказ навідавоку. З спадарыняй Гапавай і з тымі, каго яна парэкамэндуе.
Я думаю, гэта і ёсьць праўдзівы мэсыдж нашага тэксту.
26.10.2005 22:48
Алена Гапава
Паводле «Мітаў беларускай сацыялёгіі», адзін зь мітаў, створаны гендэрнымі дасьледаваньнямі, і палягае ў тым, што за А. Л. галасуюць жанчыны. Далей ідзе фраза з газэтнага інвэрвію Альміры Ўсманавай і наступная цытата з майго тэксту:
Паводле статыстыкі, жанчыны ставяцца да А. Лукашэнкі лепш за мужчынаў і складаюць большасьць яго выбарцаў. Паводле апытаньняў НІСЭПД канца 1990-х, сярод прыхільнікаў прэзыдэнта жанчыны складалі 58,3 %, а мужчыны – 41,7 %, паводле зьвестак агенцыі БелаПАН, падчас выбарчай кампаніі 2001 г. 63 % жанчын былі гатовыя прагаласаваць за А. Лукашэнку. Некалькі адсоткаў агульнай тэндэнцыі не мяняюць: яна відавочная і ў шырокіх публічных колах прынятая за адзін з фактаў беларускага жыцьця.
Цытата ўзятая з надрукаванага ў «ARCHE» тэксту «Як галасуюць жанчыны, альбо Пра мужчынскае палітычнае несьвядомае», які нечакана для мяне выйшаў пад назвай «Што такое «бацька» і яго бацькоўскі клопат». Відавочна, рэдактар меркаваў, што так «сэксуальней» (хаця ён і так трапіць у пекла – як любы рэдактар; магчыма, і мне там быць). Тэкст пра тое, што ПРЭСА СТВАРЫЛА МІТ, што за Л. галасуюць жанчыны (прыводзяцца цытаты са спасылкамі, большай часткай з апазыцыйных выданьняў), і ідзе інтэрпрэтацыя – «навошта» (навошта ў сэнсе палітычнага несьвядомага – у адпаведнасьці з назвай) спатрэбіліся гэтыя фантазіі. Выбудоўваецца схема – як «з жанчын, якія галасуюць», што галасуюць за А. Л., бо нібыта ня могуць перад ім «устаяць» (усё з цытатамі) – у апазыцыі атрымліваецца фантазія «авалодваньня жанчынай» – у сэнсе краінай альбо нацыяй: «Аляксандар Лукашэнка – прыхільнік сілавых мэтадаў кіраваньня краінай. Аляксандар Ярашук

лічыць, што краінай трэба кіраваць пяшчотна і ласкава. Але цьвёрда і настойліва» (Народная воля. 2001. 19 ліпеня). Далей тлумачэньне сэксуальных (яны ж нацыянальныя) фантазіяў апазыцыі «паводле Лакана», а потым пераход да ўласна аналітычнай часткі: «Я марксістка, і мушу шукаць матэрыяльнай прычыны палітычнаму выбару, што робяць жанчыны. Таму хопіць Лакана. Даеш Маркса!»
Сутнасьць тлумачэньня наступная:
Незалежны інстытут сацыяльна-палітычных і эканамічных дасьледаваньняў рэгулярна ладзіць апытаньне, каб даведацца пра матэрыяльнае становішча, эканамічныя, палітычныя і грамадзянскія погляды тых, хто галасуе за і супраць прэзыдэнта. Удзельнікаў спачатку пытаюць: ці галасавалі б вы за Лукашэнку заўтра? Потым дзьве групы (тыя, хто адказалі «так», і тыя, хто «не») адказваюць на больш канкрэтныя пытанні (ці хапае ім грошай на ежу? на адзежу і абутак? працуюць яны ў прыватным сэктары ці дзяржаўным? і г. д.). Такім чынам атрымліваецца партрэт апанэнтаў і прыхільнікаў прэзыдэнта. Дасьледаваньне выявіла, што пэнсіянэры падтрымліваюць А. Л. больш, чым моладзь, жыхары вёскі больш, чым гараджане, жанчыны больш, чым мужчыны, тыя, хто пражывае на ўсходзе краіны, больш, чым заходнікі. Працаўнікі дзяржпрадпрыемстваў больш, чым удзельнікі рынку. Бедныя больш, чым заможныя (і розьніца складае ня два ці тры, а 30, а то і 40 адсоткаў).
Ідэя ў тым, што за А. Л. галасуе ня пол, ня ўзрост, ня месца жыхарства: за яго галасуе КЛЯСА – усе тыя, каму «нявыгадны» рынак (а А. Л. абяцае сацыялістычную сыстэму разьмеркаваньня, пры якой бабулі ня рыліся ў сьметніцах), бо структура рэсурсаў гэтых людзей (узрост, навыкі, сувязі, наяўнасьць стартавага капіталу альбо магчымасьць «прысваеньня» ў працэсе прыватызацыі дзяржаўнай уласнасьці (менавіта такую магчымасьць давала дырэктарам ваўчарная прыватызацыя), наяўнасьць маленькіх дзяцей альбо хворых бацькоў, пражываньне ў сельскай мясцовасьці, дзе няма магчымасьці будаваць фінансавыя піраміды і г. д.) значна зьніжае шанцы іх пасьпяховасьці ўва ўмовах рынку.
Рынак разьлічаны на аўтаномных актыўных суб'ектаў, але якасьці гэтыя не ўнівэрсальныя: яны ёсьць апісаньнем пэўнага досьведу, і калі казаць пра пол, то:

Рынкавая канкурэнцыя і лібэральная дэмакратыя пабудаваны на ўяўленьні пра свабодных, незалежных, аўтаномных агентаў, і лібэралізм доўга лічыў такія якасьці «ўнівэрсальнымі». Але яны паўстаюць з пэўнага досьведу і магчымасьцяў: у жыцьці жанчыны амаль ніколі не бываюць такімі ж аўтаномнымі, як мужчыны; яны не свабодныя для канкурэнцыі і рызыкі ў такой жа ступені. Праз сваю (сацыяльна сканструяваную) ролю ў фізычным і культурным адтварэньні, г. зн. працы, безь якой чалавецтва існаваць ня можа, праз сваю адказнасьць за дзяцей і догляд старых, жанчыны ня маюць той самай «свабоды» для ўдзелу ў рынку, што і мужчыны. Бяз гэтай бясплатнай працы дзяржаўны бюджэт выглядаў бы зусім інакш.

Усюды, дзе існуюць сыстэмы сацыяльнай бясьпекі, жанчыны залежаць ад іх больш, чым мужчыны: яны зьяўляюцца асноўнымі іх спажыўцамі, супрацоўнікамі (гэта дзяржаўны сэктар эканомікі, дзе маленькія заробкі, але ёсьць пэўныя гарантыі), а таксама адказнымі за ўзаемадзеяньне сям'і з гэтай сыстэмай. Калі не адвесьці дзіця да доктара, мэдыцынская сыстэма ня можа працаваць, а калі вядзеш да доктара – адсутнічаеш на працы. Рынку такі працаўнік ня выгадны, бо галоўная рынкавая мэта – атрыманьне як мага вышэйшага прыбытку. Калі пасьля 1991 г. сыстэма сацыяльнай бясьпекі пачала разбурацца, сустрэўшыся з праблемамі, дзеля вырашэньня якіх яна не была прадугледжана, жанчыны і старыя – тыя, хто ад гэтай сыстэмы залежаў у найбольшай ступені – імгненна зрабіліся «беднымі».

Далей гаворка ідзе пра тое, што чалавецтва ў прынцыпе ня ведае, што рабіць з гэтай праблемай: рынак і дэмакратыя разьлічаныя на аўтаномных актараў, аўтаномія выбудоўваецца на глебе актыўнасьці і пасьпяховасьці ўва ўзаемадзеяньні зь іншымі, гэтае ўзаемадзеяньне значыць удзел у публічнай сфэры (да якой адносіцца палітыка і эканоміка) і свабоднай канкурэнцыі, тыя, хто заняты рэпрадукцыяй (безь якой чалавецтва жыць ня можа) не свабодны для гэтай сфэры (а песьні пра сьвятасьць мацярынства і сацыяльныя «льготы» ўсяляк спрабуюць іх з гэтай сфэры выштурхнуць у прыватную), а без удзелу ў гэтай сфэры нельга стаць аўтаномным актарам і г. д. Калі ж уводзіць сыстэмы сацыяльнага забесьпячэньня, то залежныя ад яго таксама не зьяўляюцца аўтаномнымі і незалежнымі: яны проста залежаць ад дзяржавы (пра гэта

багата пішуць палітолягі, разглядаючы фармаваньне катэгорыі жаночага і мужчынскага грамадзянства, пачынаючы ад Русо, а таксама дэбаты вакол сутнасьці сацыяльнага забесьпячэньня, як гэта зьвязана з полам). Навуковы тэкст на гэтую тэму з сур'ёзнай аргумэнтацыяй выходзіць у мяне хутка па-ангельску, калі хтосьці цікавіцца гэтым пытаньнем; тэкст ёсьць у «ARCHE», у адпаведнасьці са «статусам» часопісу – цалкам «папулярны» прадукт.

Я даволі падрабязна выклала сутнасьць тэксту, каб паказаць, што аўтар «Мітаў беларускай сацыялёгіі» прыпісаў тое, чаго ў маім тэксьце не напісана (што гэты тэкст стварыў міт, згодна зь якім за А. Л. «галасуюць жанчыны»), і не апавёў пра тое, што ў тэксьце сапраўды сказана. Ёсьць прычына, дзеля якой яму гэта спатрэбілася, і ёсьць прычына, дзеля якой ён сканструяваў менавіта тое тлумачэньне жаночых электаральных паводзінаў, якое сканструяваў – і гэта зьвязана з тым «інтарэсам», які я абяцала патлумачыць. На жаль, у наступным (і апошнім) паведамленьні – заўтра.

27.10.2005 6:07

А. Адамянц

Дарагі Ігар.

Мяне даўно займае пытаньне, чаму ЭГУ ў пэўных колах беларускіх інтэлектуалаў лічыцца «маскальскім праектам». Я маю да яго адносіны з 1996 году, і мне давялося пабыць і ў ролі студэнта, і ў ролі асьпіранта, і ў ролі выкладчыка. Я ведаю ЭГУ знутры і звонку. Усё гэта дазваляе скласьці даволі ёмістае ўяўленьне. Аднак чуючы падобныя ацэнкі, я ня мог знайсьці ім тлумачэньня, зыходзячы з таго досьведу, які маю.

Адзіны аргумэнт, які прыходзіць да галавы – пытаньне мовы. Ці можна прыняць гэты аргумэнт? Мне ён падаецца даволі сумнеўным. На ангельскай мове гавораць ня толькі ў Англіі, але і ў Ірляндыі, у ЗША, Канадзе, Аўстраліі, Новай Зэляндыі. Аднак было б дзіўна сьцьвярджаць, што ЗША – гэта ангельскі праект (хаця такія меркаваньні час ад часу і зьяўляюцца. У адным артыкуле на ИНОСМИ.ru сьцьвярджалася, што цэнтар «сусьветнага імпэрыялізму» знаходзіцца зусім не ў ЗША, а ў Ангельшчыне (!), альбо што ангельскамоўны Джойс не ірляндзкі, а ангельскі пісьменьнік).

Ці ня ёсьць мова проста прыкрыцьцём, покрывам Маі, за якім схаванае нешта зусім іншае. Натуральна, спрэчка пра мову

можа ўяўляцца «глупствам», як гэта заўважыў Мацкевіч. Але яна выглядае такой, калі прымаць яе за чыстую манэту і ня бачыць падасновы.
ЭГУ быў дзіўнай установай. Ён быў месцам, дзе насуперак усім «законам» зьбіраліся людзі, для якіх слова «гонар» – ня проста страсеньне паветра, але нешта сапраўднае. Я кажу, канечне, не пра ўсіх запар, а пра тую крытычную масу, якая вызначае атмасфэру, альбо, як сказаў бы «Богападобны Людвіг», – форму жыцьця. Ці не за гэта любяць ЭГУ? Алена Гапава – адна з гэтых людзей. Ці не за тое, што яна мае сьмеласьць зірнуць праўдзе ў вочы і не баіцца адкрыта яе выказаць, яна выклікае такое шаленства? Цяжка ўявіць, што тэарэтычныя пытаньні сацыялёгіі могуць спараджаць столькі эмоцыяў. А калі яна памыляецца, што з таго? Супраць памылковага меркаваньня найлепшы сродак – меркаваньне праўдзівае, але яно не патрабуе эмацыйнай падтрымкі, бо кажа само за сябе. Адкуль жа ідзе гэтая нецярпімасьць, недарэчная ў навуковай дыскусіі? Напэўна, справа далёка не ў тэорыі, але ў тым, што нешта закранае «за жывое», у тым, што нешта мае адносіны да глыбінных экзыстэнцыйных пытаньняў. Падзел адбываецца ня там, дзе бачыць яго павярхоўны погляд. Рэч не ў «маскалёх» і ня ў «мове». Лінія разлому праходзіць па тым, што пазначаецца словам «гонар». Сэнс гэтага слова акрамя звыклага ягонага значэньня мае ў сабе найважнейшую праблему эўрапейскай культуры – пытаньне аб самаспасьціжэньні. Нарожны камень эўрапейскай культуры і гісторыі ляжыць у надпісе на сьцяне Дэльфійскага храму: «Спасьцігні самога сябе». Уся эўрапейская філязофія – пра гэта. Праблема самаспасьціжэньня вызначае драматызм як гісторыі, так і існаваньня індывіда.
Для самаспасьціжэньня неабходныя такія якасьці, як гонар і мужнасьць. Калі хтосьці валодае гэтым рэдкім спалучэньнем і пачынае прамаўляць, гэта ня можа застацца для яго без наступстваў. У Старажытнай Грэцыі быў панятак «парэзіі», што значыла «казаць праўду», прычым з рызыкай для жыцьця. (Гл. цудоўныя лекцыі Фуко «Дыскурс і праўда: праблематызыцыя парэзіі».) Прамаўленьне праўды заўсёды было рызыкоўным заняткам і працягвае заставацца небясьпечным і цяпер.
Мне прыгадваецца ў зьвязку з гэтым той памятны круглы стол, дзе Алене моцна «даставалася». Сутнасьць канфлікту тады мне была яшчэ не зразумелая, але цяпер сэнс многіх фразаў стаў

значна больш акрэсьлены.

*27.10.2005 10:05**

Ігар Бабкоў

Я, канечне, разумею, што вам, верагодна, складана ўявіць, што на сьвеце ёсьць людзі, якія робяць нейкую справу не таму, што ім за гэта плацяць, а таму, што яны адчуваюць асабістую адказнасьць за ўласнае жыцьцё і жыцьцё таго грамадзтва, у якім жывуць. Вам, напэўна, цяжка ўявіць, што існуюць людзі, у якіх ёсьць ідэалы, і што ў гэтым сьвеце ня ўсё можна купіць за грошы. Можа быць, вам не вядома, што існуе такая рэч, як свабода, і ёсьць свабодныя людзі і свабодныя ўчынкі, але запэўніваю вас, яны ёсьць. Калі б гэтага не было, чалавечы род да гэтага часу быў бы ў барбарскім стане і ня меў бы гісторыі. Мэраб Мамардашвілі казаў: «Гісторыя – гэта драма свабоды». Стане Беларусь «суб'ектам гісторыі» ці не – залежыць ад таго, ці знойдзецца тут дастатковая колькасьць свабодных людзей, здольных супрацьстаяць сацыяльнай і духоўнай энтрапіі.

Даражэнькі Аляксандар. Я з радасьцю падпішуся пад вашымі словамі. Толькі адрасую іх Алене Гапавай.

Натуральна, спрэчка пра мову можа ўяўляцца «глупствам», як гэта заўважыў Мацкевіч. Але яна выглядае такой, калі прымаць яе за чыстую манэту і ня бачыць падасновы.

Я далучаюся да Мацкевіча. Уся спрэчка аб мове з нагоды «Нямецкай хвалі» – чыстая піяр-акцыя на пустым месцы. Інтэлектуальна было пацьверджаньне ўжо вядомых пазыцыяў. Нічога новага.

Дарагі Ігар, як я разумею, гэтая цытата – ваша. Ці не маглі б Вы патлумачыць мне і наведнікам сайту гэтыя вашыя словы пра «Фонд Сьцяпана Батуры». Якое я і сайт маем да Фонду дачыненьне?

Вяртаюся да свайго сказу.

Даражэнькі Аляксандар. Калі Вы з Вольгай тлумачылі ў Фондзе Сьцяпана Батуры ідэю і канцэпцыю сайту, велічыня паўнамоцтваў, якія вы на сябе бралі, была значна меншая... Калі ў вас запыталіся, чым ваш праект будзе адрозьнівацца ад ужо існых альбо былых, такіх як «Фрагмэнты» альбо «ARCHE», вы сказалі пра значна большы плюралізм і ўлучанасьць самых розных асяродкаў. Нават патэнцыйна канфліктных.

Божа. Ды вы самі мне пра гэта расказвалі. Я яшчэ кансультаваў Вольгу перад сустрэчай.

27.10.2005 10:45

Тацяна Вадалаская

Самае цікавае, што А. Гапавай удалося чыста зламаць тое сур'ёзнае абмеркаваньне сапраўды важных праблемаў, якое нарэшце тут пачалося. І гэта пасьля некалькіх дзясяткаў постаў на тую тэму, якая так блізкая Алене, але не зьяўляецца

цэнтральнай (і пра гэта разоў 5 казалася – ну хто ж будзе чытаць) у артыкуле Кацука. Усё гэта было б сьмешна, калі б не было так сумна...

27.10.2005 11:11

А. Адамянц

Ігару Бабкову

Відаць, мае аргумэнты ў Фондзе падаліся непераканаўчымі, хаця там вельмі прыемныя людзі, яны так прыгожа пасьміхаліся і ківалі галовамі, калі слухалі мае блытаныя тлумачэньні. Але, можа, ім хтосьці патлумачыў, што праект часопісу, пра які заяўлена на сайце (гл. справа вылучаную спасылку «Архіпэляг Беларусь»), ня важны і не патрэбны Беларусі.

Па-другое, ня блытайце плюралізм і элемэнтарнае няўменьне і нежаданьне паводзіць сябе прыстойна. Плюралізм магчымы толькі тады, калі паважаецца права суразмоўцы выказваць сваё меркаваньне, у тым ліку і ягонае права памыляцца. Дыялёг паміж рознымі групамі магчымы толькі пры выкананьні гэтых мінімальных патрабаваньняў. Этычныя нормы ёсьць тым нэўтральным асяродзьдзем, дзе можна ўзаемадзейнічаць адзін з адным. І наадварот, хамства і нявыхаванасьць – асяродзьдзе агрэсіўнае, яно разбурае ўсялякія адносіны. Мы ня можам памяркоўна ставіцца да тых, хто не падзяляе прынцыпу памяркоўнасьці. Прынцып памяркоўнасьці абавязковы для ўсіх. А цяпер паспрабуйце прыгадаць, хто менавіта любіць «выганяць» сваіх апанэнтаў з сайту. Няўжо вы заўважылі такую схільнасьць у мяне?

Што тычыцца Гапавай, то яе паводзіны і на форуме, і пры асабістых кантактах заўсёды карэктныя, яна не апускаецца да ганебных «абвінавачваньняў» на чужы адрас. Я таксама ня ведаю за ёй нейкіх непрыгожых учынкаў. Гэта выклікае да яе павагу ў той жа ступені, у якой выклікае абурэньне, якое да яе дэманструюць яе апанэнты.

У сваіх ацэнках таго, што адбываецца на сайце, я абапіраюся ня толькі на ўласны пункт гледжаньня, які можа падацца самадурствам. Гэта было б самадурствам, калі б я кіраваўся выключна ўласнымі ўяўленьнямі аб этыцы. Але мой пункт гледжаньня падзяляюць мае сябры і калегі. У той супольнасьці, да якой я сябе адношу, прынятыя пэўныя правілы і нормы паводзінаў. Менавіта іх я абараняю. Гэтыя правілы неабходныя

дзеля таго, каб адасобіць сябе ад іншых формаў і тыпаў супольнасьцяў, дзе дапушчальная іншая лексыка і іншы тон. Калі мы жадаем быць культурнымі людзьмі, трэба прытрымліваецца пэўных нормаў. Культура – гэта найперш форма, культура – гэта тое, што пазьбягае скрайнасьцяў і абірае сярэдзінны шлях (прынцып «залатой сярэдзіны», меры). Культурны чалавек адрозьніваецца тым, што ўмее трымаць сябе ў руках і не дае праяўляцца на людзях сваім пачуцьцям. Культура – рэч вельмі крохкая, яна вельмі хутка можа быць адстаўленая ўбок, і ведаючы гэта, трэба быць асабліва асьцярожным, паколькі ў нас усіх існуе схільнасьць пераступіць культурныя рамкі.
Канечне, канфлікты непазьбежныя, але культурны чалавек пераборлівы ў сродках. Каб вырашыць канфлікт, неабходныя сама меней дзьве ўмовы. Добрая воля як імкненьне сапраўды знайсьці выйсьце з канфліктнай сытуацыі і павага да супрацьлеглага боку.
27.10.2005 13:36
Мікола Кацук
«Што тычыцца Гапавай, то яе паводзіны і на форуме, і пры асабістых кантактах заўсёды карэктныя, яна не апускаецца да ганебных «абвінавачваньняў» на чужы адрас»:
01.07.2005 19:19
Алена Гапава
Францу Корзуну.
А чаго гэта пан так нэрвуецца? Так моцна, што, здаецца, чытаць развучыўся.
19.08.2005 6:53
Алена Гапава
Першая – хамства і невуцтва Міколы Кацука, які анічога пра гендэр ня ведае, не знаёмы з тэкстамі і тэорыяй (а тэорыя гэта вялікая і зь «сябе» яе не прыдумаеш) і ня тое што не разумее – нават не здагадваецца, пра што я кажу (падобна, што ў сучасных ведах пра нацыю і інтэлектуалаў у яго таксама значныя лакуны). Гэта будзе ўжо «любоў» М. К. з самім сабой.
28.10.2005 21:54
Алена Гапава
Пра прыватны інтарэс аўтара і яшчэ адзін больш агульны. Веданьне ад меркаваньня (рэгулярнае пытаньне на форуме і ў тэксьце) адрозьніваецца адным: становішчам таго, хто

гаворыць на полі сымбалічнай вытворчасьці. Той, хто мае ўладу і таму можа кантраляваць паводзіны іншых на полі (пазбаўляць іх слова, выдаляць ці не дапускаць да выказваньня, кваліфікаваць выказваньне як праўду, хлусьню альбо дурноту, «пресекать глупость дел человеческих»), такім чынам валодае «веданьнем»: бо ён вызначае, што праўда (альбо навуковая ісьціна), а што – не. У гэтым прыватны інтарэс «аўтара», які спрабуе выгнаць з сайту альбо «заткнуць» тых, хто для яго незразумелы (зыходзіць зь невядомых яму падставаў) альбо супярэчыць (у гэтым сутнасьць ягонага супрацьстаяньня з мадэратарам). Сутнасьцю заўсёднага пытаньня аб «ветлівасьці» насамрэч ёсьць улада: яго «сарамацяць», а ён «ня можа зьмяніцца» – і сапраўды ня можа, бо калі перастане рабіць так, што іншыя сыходзяць, то атрымае апанэнтаў, зь якімі інтэлектуальна яму ня даць рады. Толькі «захапіўшы ўладу» і кантралюючы поле, то бок вызначаючы, хто і што можа казаць і хто можа прысутнічаць, ён здольны «давесьці» ўяўлены статус «найлепшага сацыёляга».

Аднак статус «найлепшага сацыёляга» фармальна нічым не пацьверджаны (існуе ўва ўяўленьні аўатра і, магчыма, нейкай групы) – ні працамі, ні фармальна выяўленым прызнаньем значных аўтараў – і, такім чынам, узьнікае супярэчнасьць паміж уяўленым і рэальным: пустэльня ўсё-ткі існуе. Усьведамленьне гэтай супярэчнасьці (хаця наўрад ці «ўсьведамленьне» – хутчэй за ўсё, пастаянны неспакой) прыводзіць да таго, што ў псыхааналізе называюць траўмай: «Траўма, фізычная альбо псыхічная, стварае ў абарончым пакрыцьці прарыў такой моцы, што зь ім ня могуць справіцца звычайныя мэханізмы, з дапамогай якіх мы перажываем боль альбо страту» (Juliet Mitchell). Траўма – рэч «рэальная» і вельмі балючая для таго, хто атрымаў яе – адсюль гістэрычныя посты «сыходзьце адсюль», «выдаліце мае посты», «я буду Манаева мачыць» і г. д.

Тэкст «Міты беларускай сацыялёгіі» – гэта «рацыянальная» спроба пацьвердзіць уяўлены статус, стварыўшы «найлепшы» прадукт. Аднак спроба гэтая – у той частцы, што тычыцца полу, сьцьвярджае тое, што не напісана ў чужым тэксьце і ня кажа таго, што там напісана – аўтару нявыгадна прыводзіць іншыя меркаваньні альбо спрачацца з рэальна існуючымі аргумэнтамі. Аднак значна важней для разуменьня схаваных інтарэсаў тое,

якія менавіта тлумачэньні жаночых электаральных паводзінаў ён канструюе:
Найбольш важным фактарам зьяўляецца наяўнасьць адукацыйнага капіталу, які дазваляе, па-першае, крытычна інтэрпрэтаваць інфармацыю, і па-другое, адкрывае доступ да іншых крыніцаў. У сацыяльнай прасторы Беларусі гэтыя крыніцы разьмеркаваныя нераўнамерна, і чым большы населены пункт, тым болей гэтых крыніцаў. У сельскай мясцовасьці дамінуе тэлебачаньне з абмежаванай колькасьцю праўрадавых каналаў…
Я спадзяюся, што там, дзе цяпер знаходзіцца Бурд'ё, не чытаюць працытаванага тэксту, бо гэта зьдзек «з памяці памерлага». Капіталам у сацыялёгіі лічыцца тое, што можна абмяняць – прадаць – на нешта іншае, бо капітал мае вартасьць. Адукацыя ў гэтым сэнсе ёсьць капіталам, бо яе можна «абмяняць» на статус, высокі заробак альбо ўладу. З гэтага вынікае тэорыя чалавечага капіталу: адукацыя дае чалавеку новыя ўменьні, гэтыя ўменьні каштуюць на рынку дорага, адпаведна заробкі вышэйшыя ў людзей з вышэйшай адукацыяй. Аднак старыя людзі, пра якіх піша аўтар, ужо нічога не прадаюць на рынку працы – аніякіх уменьняў – адпаведна іх адукацыйны ўзровень ня ёсьць капіталам наагул. І аўтар не заікаецца ні пра які абмен: ягоная думка ў тым, што тыя, хто недастаткова адукаваны, «не разумеюць», ня могуць адрозьніць добрае ці кепскае альбо крытычна інтэрпрэтаваць інфармацыю.
Праблем з гэтым некалькі.
Праблема сацыялягічная: тыя, хто маюць доступ у інтэрнэт, валодаюць ня толькі лепшымі крыніцамі інфармацыі, але і рэсурсамі: адукацыяй, узроўнем даходаў, уменьнямі ў сфэры новых тэхналёгіяў, жывуць у больш «прэстыжным» месцы (у горадзе, а ня ў вёсцы), а гэта ўжо зусім іншая рэч (то бок гаворка пра тое, якія парамэтры ўключаць у статыстычнае дасьледаваньне). Яны галасуюць «за рынак» не таму, што болей ведаюць, а таму, што лепей жывуць. У іх іншыя інтарэсы.
Праблема лягічная: выходзіць, што ёсьць нейкая «вышэйшая веда», дасяжная «абраным» (толькі яны могуць яе распазнаць), беспамылкова і «аб'ектыўна добрая» (іначай няўменьне яе распазнаць не было б недахопам). Рэч нават ня ў тым, што такой веды не бывае – а ў тым, што такім чынам «найразумнейшымі» зьяўляюцца тыя, хто найбольш адукаваны

– інтэлектуалы. Па сутнасьці, аўтар спрабуе давесьці, што ведаюць ТОЛЬКІ ЯНЫ і што яны сапраўды ВЕДАЮЦЬ.
Вось тут узьнікае тая «інтымная сувязь», пра якую пісаў Фуко, паміж уладай і ведай. Гэта адзінае, што можа быць капіталам інтэлектуалаў, але каб абмяняць веду на рэсурсы (альбо ўладу), яны павінны захаваць манаполію на яе, пераканаўшы астатніх, што толькі яны насамрэч «ведаюць». У гэтым палягае інтарэс інтэлектуалаў як актараў, якім больш няма чаго прадаць на ўзьніклым пасьля сацыялізму рынку (то бок уладальнікамі эканамічнага капіталу робяцца не яны). «Чэсны» сацыёляг, спрабуючы стварыць «непадкупны» сацыялягічны прадукт, «прагаварыўся» пра тыя сапраўдныя інтарэсы, якія стаяць за вытворчасьцю ведаў.
Кароткая рэпліка ФІЛЁЗАФУ Ігару Бабкову пра ГРОШЫ. Сувязь паміж вытворчасьцю сымбалічных прадуктаў і рэсурсамі ёсьць заўсёды: калі б Бізантыя не заплаціла тым манахам, каб ішлі ў Кіеў прапаведаваць Хрысьціянства – невядома, як бы склалася гісторыя ў нашай частцы сьвету. Сувязь гэтая ні ў якім разе ня простая, як вам здаецца: заплацілі – і пайшло. Гэта значна больш складаны працэс, які, тым ня менш, адбываецца хаця б таму, што мы зьяўляемся ўдзельнікамі нейкай сацыяльнай сытуацыі, ня можам зь яе выйсьці, яна існуе па-за намі і не залежыць ад таго, што мы пра яе думаем і ці наагул усьведамляем у ёй сваю прысутнасьць. Бо звычайна мы перакананыя, што кажам шчыра – і гэта спраўды так. Але бяз грантаў трэба было б закрыць «Фрагмэнты», «ARCHE», Беларускі калегіюм, гэты сайт (ён існуе энтузіязмам ягонага стваральніка, але пачатковая невялічкая падтрымка была), праект па памежжы і часопіс «Перекрестки», ЭГУ, перастаць езьдзіць на канфэрэнцыі і выдаваць кнігі ўсіх «іншых франтоў» беларускай літаратуры і філязофіі. Таму важна ня толькі тое, што мы пішам, але і як мы галасуем. І мы з вамі – на заходніх грантах – галасуем аднолькава (прынамсі, я так думаю – вы ж на мінулых выбарах былі супраць, ці ня так?), а вось бабця з калгасу галасуе іначай. Бо яна ўсьведамляе свае інтарэсы – таксама як і мы з вамі. Яна ж не дурнейшая за нас з вамі? Ці ўсё-ткі дурнейшая? Якім здаецца філёзафу «народ»? Дэканструкцыя сябе – рэч балючая, але неабходная, якая адрозьнівае інтэлектуала ад Васісуалія Лаханкіна.
28.10.2005 15:22

Аляксей Бабайцаў
Алене Гапавай
Алена, а ці можна вас папрасіць адказаць на пытаньне:
Вы калі пішаце свае постынгі на гэтым форуме, вы што робіце?
1) помсьціце за абразу;
2) даводзіце, што іншыя ня лепшыя;
3) дамагаецеся прызнаньня інтэлектуальнай перавагі над Кацуком сярод удзельнікаў форуму;
4) зьдзекуецеся;
5) насьміхаецеся;
6) ня ведаю/цяжка сказаць;
альбо ўсё-ткі вы спрабуеце сфармуляваць нейкія рацыянальныя абгрунтаваньні на карысьць таго, каб лічыць вашыя інвэктывы і эскапады чымсьці большым за камунальнае дзеяньне?
І яшчэ.
Ці лічыце вы камунальнае дзеяньне «інтэлектуальнай» формы этычна больш прываблівым ці, прынамсі, менш агідным, чым камунальнае дзеяньне ў хамскай форме, з мацюкамі ці без?
І апошняе пытаньне.
Ці можаце вы сказаць штосьці наконт ЗЬМЕСТУ абмяркоўванага артыкулу?
31.10.2005 3:00
Алена Гапава
Аляксей, не зьбіралася болей пісаць («усё сказала»), але на зьвернутае да мяне пытаньне павінна адказаць.
Прычына не зьвязаная са «стаўленьнем да аўтара» – у яго няма імя, я аніразу яго не назвала, а думкі ж існуюць толькі для таго, для чаго ёсьць слова. Дык як можна думаць пра тое, што не названае? Гэтага проста няма.
Але ёсьць тэкст – пра тэкст можна думаць – і ён прапанаваны для абмеркаваньня. І выявіў – у той частцы, што пра гендэр – безьліч правалаў. І мне неяк падалося, што я кажу пра зьмест: нават пакінуўшы ўбаку той факт, што тэкст пачынаецца зь няпраўды (прыпісваньня чужым тэкстам таго, чаго ў іх няма), там няправільна сканструяваная катэгорыя стратыфікацыі (дакладней, аніяк), а тлумачэньне (чаму жанчыны так галасуюць) проста выдуманае, бо ў полі статыстычнага дасьледаваньня наагул ня ўключаныя значэнныя парамэтры. Для таго, каб высьветліць, як галасуюць тыя, хто глядзіць тэлевізар і хто заходзіць у інтэрнэт, ня трэба марнаваць

дзяржаўныя грошы на апытаньне (гэта пра сувязь рэсурсаў з вытворчасьцю веданьня, ізноў жа): гэта на ўзроўні «пабытовай сьвядомасьці» зразумела. Але не тэлевізар vs. Інтэрнэт стварае «адрозьненьне ў паводзінах»: доступ да іх – толькі частка больш агульнай сытуацыі, у якую зьмешчаныя актары і ў якой іх інтарэсы могуць быць розныя. Галасаваньне паказвае рознасьць інтарэсаў, а ня «хто болей чытаў». У гэтым сутнасьць партыйнай сыстэмы ў палітыцы (дзе яна ёсьць): партыі выказваюць інтарэсы, а ня «тлумяць галаву» піярам (хаця, канечне, тлумяць); у гэтым сэнс дэмакратыі ў прынцыпе (сутыкненьне інтарэсаў). Бо калі іначай – у прыгнечаных «ілжывая сьвядомасьць», і іх трэба абудзіць – гэта такі клясычны марксізм, да якога больш позьнія тэорыі сацыяльных рухаў маюць мноства прэтэнзіяў.

Калі казаць канкрэтна пра поле, з тэксту вынікае, што пол – гэта «сутнасьць» (розныя – да пэўнай ступені – характарыстыкі) мужчынаў і жанчын (то бок падыход, прыняты да ўзьнікненьня гендэрных дасьледаваньняў). А гэта ня сутнасьць – гэта структура грамадзтва (якая «па-за намі» альбо над намі), якая расстаўляе людзей па розных пазыцыях (дае прынцып, паводле якога трэба шыхтавацца), і зь іх мы ўжо ўдзельнічаем у палітычным працэсе, маючы розныя інтарэсы і рэсурсы. Мы не сядзім і спэцыяльна пра гэта ня думаем: мы гэта «па-рознаму» ведаем.

Акрамя таго, тэкст ёсьць проста клясычным прыкладам інтарэсу інтэлектуалаў: інтэлектуалам трэба давесьці, што яны – якія больш за ўсіх чыталі – «лепш ведаюць», таму што пры рынку ім больш няма чаго прадаваць, акрамя гэтага міту («манаполіі на веду»). Гэта з тэорыі «новае клясы», але не ў джыласаўскім сэнсе (ён пісаў пра камуністычную бюракратыю), а ў сэнсе інтэлектуалаў як новае клясы (пра гэта працаў багата). І сьмешна глядзець, як у выніку гаворка вядзецца пра зьмену палітычнай улады, а нейкая група (якая гэтай зьменай непакоіцца) абвяшчае, што ў яе няма інтарэсаў. Якім чынам можна гэтую групу вывесьці з сацыяльнай сытуацыі – незразумела. На падставе цьвёрдай перакананасьці ўва ўласнай шчырасьці? А макрасацыялёгіі ўсё адно, што акурат мы (кожны з нас) думаем, калі масава робім адно і тое ж.

На мае аргумэнты не было адказаў з аргумэнтамі (паводле пэўных рэплік, не было зразумета нават тое, што я ўказваю на

канкрэтныя праблемы тэксту): было абмеркаваньне мяне (памятаеце, як гаспадыня Ваньку Жукаву «давай селядцовай мордай у рыла тыцкаць»?). Магчыма, незразумелыя мае падставы – альбо крытэры – нарматыўнасьці і навуковасьці тэксту.

І апошняе. Я даўно не заходзіла на гэты сайт і цяпер адразу прачытала мноства дыскусіяў. Мадэратару даводзіцца ў кровапралітнай барацьбе адстойваць неабходнасьць правілаў, пры гэтым яго абвінавачваюць у здушэньні свабоды. «Победоносцев над Россией простер совиные крыла», так бы мовіць. Аднак Англія (напрыклад) – «свабодная краіна», але калі там камусьці зажадаецца мачыцца на вуліцы, яму гэтага не дазволяць. Свабоды не бывае без закону, пакуль чалавек недасканалы. Мадэратар спрабуе стварыць Гайд-парк, хтосьці – зону, дзе гаспадараць уркі.

УДЗЕЛЬНІКІ ДЫСКУСІІ

Аляксандар Адамянц *– галоўны рэдактар сайту «інтэлектуальнай супольнасьці Беларусі», выпускнік філязофскага факультэту ЭГУ. У ягоныя навуковыя інтарэсы ўваходзіць фэнамэналёгія, палітычная філязофія. Нарадзіўся ў 1973 г. у Армэніі, з 1988 г. жыве ў Беларусі.*

Аляксей Бабайцаў – мэтадоляг. Нар. у 1973 у Менску. У 1995 скончыў мэхмат БДУ, у 1998 – асьпірантуру БДУ з спэцыяльнасьці «матэматычная кібэрнэтыка». Выкладаў у БДУ. У 1997–2002 працаваў у сацыялягічнай лябараторыі «НОВАК». Галоўны кансультант кампаніі «Интелл-Консалт». У сфэру яго навуковых інтарэсаў уваходзіць мэтадалёгія, культурная палітыка, гуманітарная адукацыя, інтэлектуальная экалёгія.

Ігар Бабкоў – філёзаф, супрацоўнік Інстытуту філязофіі НАН Беларусі. Апошняя публікацыя ў «ARCHE» – досьлед «Генэалёгія беларускай ідэі».

Павал Баркоўскі – філёзаф, выкладчык Беларускага калегіюму.

Тацяна Вадалаская – сацыёляг, супрацоўніца Інстытуту сацыялёгіі НАН Беларусі.

Алена Гапава – дырэктарка Цэнтру гендэрных дасьледаваньняў Эўрапейскага гуманітарнага ўнівэрсытэту.

Мікола Кацук – сацыёляг, супрацоўнік Інстытуту сацыялёгіі

НАН Беларусі.
Ігар Чарняеў – выпускнік магістарскай праграмы Цэнтру гендэрных дасьледаваньняў ЭГУ (тэма дысэртацыі: «Слабы пол і сілавыя структуры: жанчыны ў крымінальнай міліцыі Беларусі», кіраўнік – Алена Гапава).
Вольга Шпарага – *гл. тэкст-урэзку пад тэкстам «Ад супольнасьці беларускай мовы да супольнасьцяў беларускамоўнага ўзаемадзеяньня».*
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/02/24**
[image]

[image]
A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
[image]
палеміка [image]2005
"да Зітыкату"
ана Зітыка • крытыка • **палеміка** • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі
[image] [image] [image]
Вярнуцца з вайны

Па новых даных разведкі
Мы ваявалі самі з сабой…

Б. Грабеншчыкоў

Як не згадзіцца з Ігарам Бабковым: «…калі постсавецкія інтэлектуалы спадзяваліся пабачыць унівэрсальны і адзіны сьвет, яны знайшлі няспынную культурную вайну ўсіх супроць усіх» (ARCHE. 2004. № 5). Я б дадаў: не толькі знайшлі, але і ахвотна ў яе ўключыліся, закідваючы апанентаў лозунгамі, перакручваючы іхныя думкі і вешаючы ярлыкі на ўсіх, хто не належыць да «сваёй» групы. Прычым рэакцыя на чужыя выказванні часцяком абсалютна асіметрычная: ты апаненту слова, ён табе – дзесяць разоў па дзесяць. Або – ты яму пра абразы, ён табе пра гарбузы, a la guerre comme a la guerre. Так, запытаўшыся ў работнікаў аднаго з беларускіх пасольстваў, ці ўваходзіць хлусня ў іх службовыя абавязкі, нядаўна атрымаў кангеніяльны адказ: «Не дачакаецеся вы ні аранжавай, ні яшчэ якой каляровай рэвалюцыі!».

У пятым нумары «ARCHE» за 2005 г. мяне ўразілі дзве публікацыі: «Мой шлях да Беларусі» Сержука Няхамеса ды «Сакральная гісторыя найноўшага часу» Андрэя Ягорава. Яны з’яўляюцца рэакцыямі на, адпаведна, артыкул Сяргея Носава

«Ты памятаеш, як усё пачыналася…» і кнігу Паўла Севярынца «Пакаленьне Маладога Фронту». Мне зусім не карціць доўжыць дыскусію з аўтарамі адносна вартасцяў твораў с. Носава і П. Севярынца. Адзначу толькі два сумнеўныя прыёмы крытыкаў, тыповыя, на жаль, для беларускай гуманістыкі.

I. Знявага апанента. Часцей за ўсё, яна набывае форму славутага argumentum ad homini, замяшанага на патэрналізме – асноватворным элеменце ўладнага дыскурсу. У рэчышчы патэрналісцкага дыскурсу супернік – стварэнне перадусім наіўнае, якое мала што разумее ў гэтым свеце. У с. Няхамеса ў ролі «пажыццёва недаробленых» выступаюць Леў Крывіцкі, Дзмітры Зільбер, Сяргей Носаў. Для А. Ягорава «вечным дзіцем», хворым, адпаведна, на «дзіцячую хваробу круцізны», аказаўся Павел Севярынец. Характэрна, што абодва аўтары не прэтэндуюць на першынство ў вынаходжанні ярлыкоў, а спасылаюцца на «аўтарытэты»: с. Няхамес – на былога талакоўца Вадзіма Александровіча, А. Ягораў – на філосафа Валянціна Акудовіча. Гэта, мусіць, павінна надаць аб'ектыўнасці адвольным выказванням: «не я кажу, людзі кажуць». Калісьці аналагічны трук ужываўся на прэзідэнцкіх выбарах супраць Шушкевіча (перадрук «кампрамату» з міфічнай галандскай газеты ў 1994 г.), ён да сёння займае пачэснае месца ў арсенале «Беларуси сегодня». Не хацелася б, каб часопіс «ARCHE» ішоў слізкім шляхам жоўтай прэсы.

II. Бяздоказныя, лагічна не абгрунтаваныя высновы. З тэкстам с. Няхамеса ўсё проста. Названыя асобы – плюс Сямён Букчын – некалі сказалі або напісалі нешта «не тое», і гэтага досыць: «усе яны зрабіліся таемнымі або яўнымі ворагамі беларускага нацыянальнага руху». У Прыбалтыцы ў канцы 1980-х гг. канкурэнцыю Народным Фронтам складалі «Інтэрфронты»: паводле аўтара, раз Леў Крывіцкі меў адрознае ад пазнякоўскага ўяўленне пра будучыню «нацыянальнага руху», то рыхтаваўся ўладамі на ролю актывіста беларускага «Інтэрфронту». Пакідаю чытачу падлічыць, колькі лагічных звенняў тут прапушчана, і як паліванне брудам сваіх знаёмцаў па клубе «Сучаснік» суадносіцца з аўтарскай дэкларацыяй на пачатку артыкула: *«Няхай нашыя нашчадкі самі ставяць нам адзнакі ды разьбіраюць нашыя посьпехі і паразы. Я проста*

паспрабую апавесьці аб уласным шляху да Беларусі».

Што ж А. Ягораў, аспірант БДУ і спецыяліст Агенцыі гуманітарных тэхналогій? Ён апелюе да «кожнага разумнага чалавека» – і адразу прыпадабняецца да рэкламістаў з іх слоганамі накшталт «нават вожыку зразумела». Магчыма, аўтар нават не ўсведамляе, як недарэчна выглядаюць яго высновы пра беларускіх палітыкаў, падмацаваныя адно тэзісамі асобна ўзятай кнігі і рэакцыяй членаў АГП на злом іхнага сайту ўлетку 2005 г.: «Вы калі-небудзь бачылі палітыка ў беларускай апазіцыі, які б прызнаў сваю паразу? Гэта вечныя пераможцы». Але ж у абмаляваную карціну ўсеагульнай безадказнасці («Падаецца, яны жывуць у прасторы без часу… Пытанне пра эфектыўнасць ігнаруецца») зусім не ўпісваюцца ні гаркавыя рэфлексіі Андрэя Клімава, Аляксандра Фядуты, Васіля Лявонава, чыя кніга мае красамоўную назву «Работа над памылкамі», ні, урэшце, і кніга П. Севярынца, дзе знайшлося месца і самакрытыцы. Хоць бы ў фрагменце пра 2001 г.: «… жыццё і становішча ў краіне аказаліся значна цяжэйшымі за тэорыю і тэхналагічныя штампы. Дзесьці не хапіла досведу, дзесьці – грошай, дзесьці – проста сілаў».

* * *

Адмовіцца ад раздачы цэтлікаў, навучыцца не прыпісваць іншадумцам зламысных інтэнцый і разважаць без лагічных памылак (або прынамсі з іх мінімальнай колькасцю) – гэтыя задачы ўсё яшчэ актуальныя для беларускіх гуманітарыяў і палітыкаў. Дый хіба толькі беларускіх?

Вольф Рубінчык, 30.10.2005

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/25
[image]

[image] [image] [image]
Крытычныя інтэлектуалы: сымбалічная барацьба і структурнае процістаяньне. Круглы стол

Удзельнікі: **Альміра Ўсманава, Андрэй Горных і Вольга Шпарага** (часопіс «Топос»), **Андрэй Казакевіч** («Палітычная сфера»), **Валер Булгакаў** («ARCHE»), **Ігар Бабкоў** («Перекрестки»), а таксама **Аляксандар Адамянц** (сайт Інтэлектуальнай супольнасьці Беларусі), **Сьвятлана Навумава** (сайт «Наша думка»), **Мікола Кацук** (Інстытут сацыялёгіі НАН РБ), **Алена Гапава** (Цэнтар гендэрных дасьледаваньняў пры «EHU-International»)

Ігар Бабкоў:

Сёньня мы станем сьведкамі ўнікальнай падзеі – першай рэальнай сустрэчы трох вядучых выданьняў, якія прадстаўляюць беларускіх крытычных інтэлектуалаў. Гэта выданьні: часопіс «Топос», часопіс «Палітычная сфера» і часопіс «ARCHE». Хаця я сам зьяўляюся галоўным рэдактарам часопісу «Перекрестки», на гэтым круглым стале буду выконваць ролю мадэратара, а не прадстаўляць свой праект.

Такім чынам, я пачаў з таго, што гэта «першая рэальная сустрэча», паколькі віртуальна гэтыя часопісы палемізавалі

адзін з адным, выпрацоўвалі палітыку, улічваючы адзін аднаго, чым фармавалі сваю ўласную і супольную гістарычнасьць. Каталізатарам гэтай сустрэчы стаў спэцыяльны апошні выпуск часопісу «Топос», прысьвечаны Беларусі, а дакладней, праблеме «Акадэмія і ўлада» і ЭГУ. То бок «Топос», у прынцыпе, часопіс філязофскі зь вельмі жорсткай фэнамэналягічнай скіраванасьцю, раптам зьвярнуўся да Беларусі... Давайце пачнём зь сьціслай, канцэптуальнай характарыстыкі кожнага з выданьняў.

Вольга Шпарага:

Я хацела б пачаць з таго, што галоўны рэдактар часопісу «Топос» – Тацяна Шчытцова, якой, на жаль, цяпер няма ў Менску. Таму часопіс і будуць прадстаўляць сябры рэдкалегіі. Пачаць я хацела б са звароту да той фэнамэналягічнай традыцыі, зь якой, найперш, асацыюецца наш часопіс.

Часопіс выходзіць з 2000 году. За гэты час было выдадзена 10 нумароў. Выдаваліся яны на базе філязофска-культуралягічнага цэнтру «Топас» пры ЭГУ. І калі ўзяць першы нумар часопісу, то ў ім ад імя рэдкалегіі кажацца, што ў аснове ягонай канцэпцыі ляжаць тры асноўныя ідэі: ідэя аб *ісьціне ў гуманітарных навуках* (1), *дыялёг*, у якім ісьціна і мусіць нараджацца (2), і зварот да *філязофскай традыцыі* (3). Узаемадзеяньне гэтых трох вымярэньняў павінна было садзейнічаць *фармаваньню прафэсійнага філязофскага асяродзьдзя* ў Беларусі. І як сказаў Ігар, гэтая філязофская традыцыя ў часопісе ад пачатку задавалася *фэнамэналёгіяй* і *гермэнэўтыкай*.

Пра гэтую традыцыю я й хацела б сказаць колькі словаў, паколькі, на маю думку, зварот да яе быў ня нейкім чыста абстрактным актам, а быў прывязаны да сытуацыі тут і цяпер.

Пачынальнікам гэтай традыцыі ў Беларусі быў філёзаф і рэктар ЭГУ А. А. Міхайлаў, які ў свой час (1970-я – 1980-я) быў вучнем В. с. Сьцёпіна – цяпер дырэктара Інстытуту філязофіі РАН, а ў 1970-я – 1980-я – выкладчыка і загадчыка катэдрай філязофіі гуманітарных факультэтаў БДУ. Аднак у адрозьненьне ад

бальшыні вучняў В. с. Сьцёпіна, такіх як Л. Ф. Кузьняцова, А. І. Зелянкоў ды інш., А. А. Міхайлаў адмовіўся ад дасьледніцкай працы ў рамках *мэтадалёгіі прыродазнаўчых* навук дзеля распрацоўкі альтэрнатыўнага поля веды. Такім чынам, галіной ягоных дасьледаваньняў сталі гуманітарныя навукі і філязофія як падмурак гуманітарных навук. І невыпадкова ў гэтым кантэксьце зьявілася фэнамэналёгія, таму што ў свой час, на пачатку XX стагодзьдзя, менавіта фэнамэналёгія ў спрэчцы з нэакантыянствам і філязофіяй В. Дыльтэя задавалася пытаньнем ня проста пра гуманітарныя навукі, а пра тое пераўтварэньне, якое ў сувязі з пытаньнем пра гуманітарныя навукі павінна перажыць філязофія.

Фэнамэналёгія ў Беларусі ў асобе Міхайлава аказалася, як мне здаецца, спробай стварэньня нейкай альтэрнатыўнай савецкай мадэлі філязафаваньня прасторы. Савецкая мадэль філязафаваньня, на маю думку, характарызуецца найперш прыродазнаўчым і ідэалягічным рэдукцыянізмам, які вырашаў, з аднаго боку, задачу імітацыі філязофіі як крытычнага мысьленьня, што рабіла немагчымымі соцыягуманітарныя веды, з другога – абгрунтаваньня савецкай ідэалёгіі. Спроба мысьліць фэнамэналягічна ёсьць адной з магчымасьцяў стварыць нейкую альтэрнатыўную прастору філязофскай думкі, зьвернутай да чалавека, які самастойна і сумесна зь іншымі фармуе свой жыцьцёвы сьвет.

Аднак, як мне здаецца, выданьне апошняга нумару «Топоса», прысьвечанага праблеме «Акадэмія і ўлада» і ЭГУ, канчаткова паказала, што фэнамэналёгія і гермэнэўтыка як вызначальныя кірункі часопісу вычарпалі сябе. Тое, што было неабходна і магчыма на пачатку XX стагодзьдзя, а таксама ў сытуацыі канца савецкай эпохі, аказалася недастатковым для пачатку XXI стагодзьдзя: не стае фэнамэналёгіі, найперш крытычнага і антыўнівэрсалісцкага патасу сучасных сацыяльных і культурных дасьледаваньняў, якія дазваляюць казаць ня проста пра «жыцьцёвы сьвет», а пра тыя ці іншыя цалкам канкрэтныя фэномэны, напрыклад, пра Беларусь. Часткова гэта выявілася ў рубрыкацыі часопісу: у ім зьявілася і стала адыгрываць значную ролю рубрыка *дасьледаваньняў візуальнай культуры*, працай якой кіруюць Альміра Ўсманава і Андрэй Горных. У

выніку апошні, 10-ты, нумар «Топоса» ўжо не абапіраецца на фэнамэналёгію і гермэнэўтыку, аднак тое, што дазваляе бачыць у ім прыналежнасьць традыцыі гэтага выданьня, – гэта зварот да філязофскай традыцыі ці, дакладней, да мноства філязофскіх традыцыяў. У гэтым сэнсе, мне здаецца, наш часопіс ёсьць найбольш акадэмічным з усіх наяўных сёньня ў Беларусі часопісаў, паколькі ягоныя аўтары спрабуюць, пра што б яны ні казалі, спасылацца на тыя ці іншыя *чужыя* тэорыі і паняткі, якія дазваляюць ім быць у дыялёгу з тымі ці іншымі сучаснымі эўрапейскімі альбо амэрыканскімі дасьледнікамі, і ўсё-ткі абмяркоўваць і вырашаць *свае* праблемы. То бок абавязкова павінны прысутнічаць указаньні, на якія менавіта тэксты і паняткі мы абапіраемся. Іначай кажучы, у часопісе задаецца нейкая рамка, хаця сёньня ўзьнікае пытаньне аб тым, што такое наагул акадэмічны часопіс і ў прыватнасьці акадэмічны часопіс сучаснай гуманітарыстыкі. Ну вось, такія мае меркаваньні, мо нешта з нагоды апошняга «Топоса» альбо сваёй рубрыкі нешта дададуць Альміра ці Андрэй?

Альміра Ўсманава:

Я б хацела пачаць з згадак Вольгі Шпарагі пра тое, што часопіс выдаваўся пры філязофска-культуралягічным цэнтры «Топас». Наагул, як такі цэнтар «Топас» – гэта не інстытуцыянальнае падразьдзяленьне і не дасьледніцкі калектыў, а, хутчэй, віртуальны праект аднаго чалавека – Тацяны Шчытцовай, зь якога і разгарнуўся часопіс. Той «Топос», які мы ведаем, – гэта найперш вынік яе намаганьняў і падзьвіжніцтва. Аднак, з часам пад «дахам» гэтага часопісу сабраліся самыя розныя «цэнтры», розныя дасьледнікі, бальшыня зь якіх, канечне ж, працавала ў ЭГУ, хаця і неабавязкова. Гэта я да таго, што назва «філязофска-культуралягічны часопіс» дае магчымасьць аб'яднаць вельмі розныя тэмы, надаўшы ім нейкую, няхай і намінальную, еднасьць – найперш еднасьць «месца гаварэньня».

Цікавая гісторыя гэтага апошняга нумару, яна вельмі важная для нас саміх, таму што гэта быў нумар, які мы хацелі зрабіць усе разам. Здавалася б, ЭГУ зачыніўся летась, той сацыяльны і палітычны лад (хочацца сказаць, абсурдны лад), у якім мы

жывём, таксама зьявіўся ня сёньня, але тым ня менш, на тое, каб мы дасьпелі да выпуску такога нумару, відаць, павінен быў прайсьці пэўны час. Я заўважыла, дарэчы, што на працягу апошняга месяца, з таго часу, як гэты часопіс выйшаў, артыкулы сталі жыць сваім жыцьцём. Канечне, гэта адбылося таму, што сьпярша частка гэтых артыкулаў, а потым і ўсе артыкулы былі вывешаныя на сайце цэнтру «Топас», частка артыкулаў была прадстаўленая ў крыху зьмененым выглядзе на сайце «Наша думка», і па чарзе некалькі артыкулаў былі надрукаваныя на сайце Інтэлектуальнай супольнасьці Беларусі, які тут прадстаўляе Аляксандар Адамянц.

І мне здалося гэта вельмі цікавым фэномэнам, таму што ніколі да гэтага артыкулы з часопісу «Топос» не перадрукоўваліся, ці яны наагул не станавіліся прадметам інтэлектуальных дыскусіяў. Яны, можа, уяўлялі пэўную цікавасьць для філязофскай аўдыторыі ў Беларусі, але наагул яны шырака не абмяркоўваліся і тым больш не прыцягвалі да сябе цікавасьці на форумах. Я мяркую, што гэта добрая прыкмета, сымптом таго, што часопіс з крыху размытай ідэнтычнасьцю – асабліва «размытай» цяпер, пасьля таго, як зьявіўся гэты дзясяты нумар, – тым ня менш нарэшце займеў (ці пачынае гэта рабіць) сваю чытацкую нішу, тую аўдыторыю, якая, можа быць, для нас саміх доўгі час была пытаньнем.

Я мяркую, што некаторыя з прысутных, напэўна, гэты часопіс бачылі, таму я ня буду яго прадстаўляць ні па артыкулах, ні па аўтарах. Скажу толькі, што для публікацыі ў часопісе мы мабілізаваліся самі і запрасілі ўсіх тых нашых калегаў з ЭГУ, для каго і факт існаваньня, і акт закрыцьця ЭГУ сапраўды зьяўляюцца справай як асабістай, так і палітычнай. Зь іншага боку, мы прыцягнулі некаторых людзей зь іншых унівэрсытэтаў (у тым ліку і нашых заходніх калегаў), усіх тых, каму было б цікава ў гэтым нумары ўдзельнічаць. Але найперш, не стамлюся гэта паўтараць, я лічу, што гэты часопіс стаў формай калектыўнага выказваньня, нашай рэакцыяй на тое, што адбылося і з ЭГУ ў прыватнасьці, і, можа быць, на ўсё тое, што адбылося з інтэлектуальным асяродзьдзем у Беларусі ў цэлым за апошнія гады.

Валер Булгакаў:

Наша фокус-група – беларускамоўныя беларусы. Кіруючыся іх бягучымі культурнымі патрэбамі, мы спрабуем запоўніць незапаўняльнае. Напрыклад, у нашай краіне адсутнічае часопіс, прысьвечаны перакладам з замежных моваў на беларускую, і мы ў меру сваіх досыць невялікіх сілаў спрабуем гэтую нішу закрываць. Літаратурны працэс у беларускай мове часта прадукуе прымітыўныя тэксты, эстэтычна на ўзроўні XVIII–XIX стагодзьдзяў. У той жа час літаратурна-мастацкія выданьні адкідаюць арыгінальныя творы таленавітых аўтараў, таму мы ўважаем сваім абавязкам іх публікаваць. І разам з тым мы намагаемся быць у курсе інтэлектуальных працэсаў, якія разгортваюцца ў Эўропе і ў рэшце сьвету, і рабіць беларускую мову мовай сучаснай гуманітарнай навукі. Адсюль наш такі непазбыўны эклектызм, які, напэўна, будзе перасьледаваць нас датуль, дакуль ня зьявяцца адпаведныя спэцыялізаваныя выданьні на беларускай мове. А ці зьявяцца яны ў бліжэйшай будучыні – гэта вялікае пытаньне. Таму часопіс «ARCHE», які я тут прадстаўляю, практычна немагчыма ўявіць у кантэксьце паўнавартай культурнай традыцыі.

«ARCHE» ўзьнік у 1998 годзе. Яго істотная адрознасьць ад, напрыклад, «Топоса», была ў тым, што людзі, якія стаялі ля яго ўтварэньня, не маглі абаперціся на адукацыйную ці акадэмічную пляцоўку. Праца ў «ARCHE» выявілася несумяшчальнай з працай у дзяржаўнай сыстэме адукацыі, а прыватныя беларускамоўныя ВНУ, на жаль, дагэтуль ня створаныя.

«ARCHE» ўзьнік як прыватная ініцыятыва ўва ўмовах, калі ўлады пачыналі ажыцьцяўляць свой ідэалягічны дыктат і зачышчаць культурніцкую прастору, хоць да стварэньня холдынгу «Литература и Искусство» тады яшчэ не дайшло. Можна сказаць, «ARCHE» меў характар контракультурнай ініцыятывы.

На пачатку «ARCHE» арыентаваўся на літаратуру і інтэлектуальную «моду», цяпер – на інтэлектуальныя праблемы. Наша крытыка зазвычай абапіраецца на сур'ёзную эмпірычную базу і арыентуецца на важныя для культурнага і

інтэлектуальнага працэсу артэфакты. Літаратура ў «ARCHE» цяпер ня мае цэнтральнага значэньня. Некалькі гадоў таму назад зьявіўся незалежны часопіс «Дзеяслоў», які друкуе аўтараў, якія ня маюць магчымасьці публікавацца дзе-небудзь яшчэ.

За тое, што дэ-факта мы адмовіліся ад літаратурна-мастацкага профілю, летась мы атрымалі папярэджаньне ад Міністэрства інфармацыі. Кара за палітызацыю «ARCHE» была суровай: часопіс забаронены для распаўсюджаньня празь дзяржаўныя кнігарні і кіёскі і мае напаўпадпольны статус.

Андрэй Казакевіч:

Часопіс «Палітычная сфера» ўзьнік для таго, каб запоўніць нішу акадэмічнай паліталёгіі. Калі паглядзець на сучасны паліталягічны ляндшафт, то ён дзеліцца на апазыцыйную паліталёгію, дзяржаўную і акадэмічную. Апазыцыйная – гэта розныя прагнозы, бягучы «аналіз» сытуацыі, стратэгіі і г. д. Акадэмічная паліталёгія зьвязаная пераважна зь яе выкладаньнем у ВНУ. Дзяржаўная – працуе ў рэжыме, зьвязаным з палітычнымі падзеламі. Яна прадукуе аналітыку і, асабліва апошнім часам, ідэалёгію.

І ў нас узьнікла ідэя стварыць часопіс, які б займаўся ўласна палітычнымі дасьледаваньнямі, уключаючы ня толькі практычную палітыку, але і навуковую і тэарэтычную веду. Ідэя паўстала сярод людзей, якія так ці інакш былі зьвязаныя з катэдрай паліталёгіі БДУ. Галоўнай праблемай на працягу ўсяго існаваньня часопісу было абмеркаваньне ступені арыентаванасьці на практычную палітыку, асабліва прывязка да нейкіх палітычных кампаніяў, пошук нейкай нэўтральнае «інтэлектуальнае» пазыцыі, якая не была б зьвязаная непасрэдна з палітычнымі падзеламі, з палітычнымі інтарэсамі, і адначасова зь якой можна займацца дасьледаваньнем беларускага палітычнага поля. Дасьледаваньнем перш за ўсё міждысцыплінарным.

Наш часопіс выходзіць на дзьвюх мовах – і на беларускай і на расейскай – гэта залежыць ад таго, на якой мове піша аўтар.

Замежных аўтараў перакладаем на беларускую мову. Звычайны нумар часопісу мае падтэму, напрыклад, «паліталёгія паліталёгіі» ў трэцім нумары, які быў прысьвечаны самавызначэньню палітоляга ў беларускай сытуацыі.

Ігар Бабкоў:

Калі рэзюмаваць ўсе гэтыя прэзэнтацыі, то мы ўбачым некалькі праектаў. Праекты «Топоса», «Палітычнай сферы» і «Перекрестков» – гэта праекты акадэмічныя. Гэтыя часопісы выдаюцца ў колькасьці ад 300 да 500 асобнікаў і ў прынцыпе не рэгіструюцца (за выняткам «Топоса»). Яны прадаюцца ў аднымдвух месцах і пераважна разыходзяцца ў коле саміх інтэлектуалаў. Праект «ARCHE» іншы: ён прынцыпова зьвернуты да чытацкай публікі. Гэта спроба выйсьці па-за межы вузкага гета чытачоў, якое складаецца пераважна з саміх аўтараў і іх сяброў. І «ARCHE» ўдаецца рэалізаваць свой праект, колькасьць прададзеных часопісаў складае 1000–1500 асобнікаў. Адзінае, што б я дадаў, што звонку гэты часопіс ўсёткі не глядзіцца так эклектычна, як гэта падаецца знутры. То бок, я б назваў «ARCHE» часопісам антрапалягічным. Гэта часопіс па практычнай антрапалёгіі. Якім жа чынам можна пазначыць прадстаўленыя гэтымі часопісамі інтэлектуальныя пазыцыі? То бок пазыцыі, якія выводзяць часопісы па-за межы іх дысцыплянарнасьцяў, скажам так, у Беларусь. У такім разе другое пытаньне: чаму раптам прастора Беларусі праблематызавалася і як бы стала для нас усіх праблемай?

Андрэй Казакевіч:

Да гадоў 2000–2001 Беларусь увогуле не была аб'ектам сур'ёзных палітычных дасьледаваньняў. Калі паглядзець друкаваныя выданьні з артыкуламі па палітычнай праблематыцы, то на 90–95 % яны былі зьвязаныя альбо з тэорыяй, альбо дасьледаваньнямі кшталту «партыйная сыстэма Германіі, Францыі…» ці іншымі аб'ектамі, не зьвязанымі зь Беларусьсю. Па маім назіраньні, сапраўды Беларусь пачынае аналізавацца недзе на пераломе тысячагодзьдзяў, недзе з 2000–2001 гадоў сытуацыя становіцца цалкам іншай. Я думаю, што

гэта тычыцца ня толькі саміх палітолягаў, але і шмат каго з інтэлектуалаў увогуле.

Альміра Ўсманава:

У тым, што вы сказалі, Андрэй, прасочваецца такая думка, што, з аднаго боку, 10 гадоў – гэта быў той пэрыяд, за час якога павінна было проста высьпець як бы новае акадэмічнае асяродзьдзе, зьвязанае непасрэдна зь Беларусьсю, з этнасацыяльнай, культурнай прасторай, і зь іншага боку, прыкметная палітызацыя нашых часопісаў, ну, можа быць, гэта ня тычыцца, як гэта ні парадаксальна гучыць, «Палітычнай сферы», але, безумоўна, тычыцца «ARCHE» і «Топоса», адбылася нават не ў 2001 годзе (год прэзыдэнцкіх выбараў), а літаральна ў апошнія гады. Гэта азначае, што, з аднаго боку, ёсьць фэномэн Лукашэнкі і зьвязаных з гадамі ягонага ўладараньня палітычных, эканамічных і сацыяльных рэпрэсіяў, а з другога боку, ёсьць аб'ектыўны працэс нацыянальнага і культурнага высьпяваньня, зьвязаны зь незалежнасьцю дзяржавы, але які не вынікае непасрэдна з пэўнага палітычнага рэжыму. І гэта насамрэч цікава, як гэтыя два працэсы – то бок працэс паступовага пагаршэньня палітычнай сытуацыі (у тым ліку працэс маргіналізацыі і выцясьненьня розных неафіцыёзных культурных праектаў) і працэс высьпяваньня незалежнай беларускай супольнасьці («незалежнай» як асобнай і адрознай ад расейскай, асобнай і адрознай ад усходнеэўрапейскай) – як вось гэта ўсё наклалася адно на адно. І, паўтаруся, усё гэта адбылося (ці ўжо праявілася) літаральна ў апошнія два гады.

Валер Булгакаў:

Адбываецца якасная трансфармацыя беларускага гуманітарыя. Час, які прайшоў з моманту атрыманьня незалежнасьці, усё-такі не пайшоў на глум. Шмат людзей атрымалі больш-менш якасную заходнюю адукацыю. Напрыклад, да палавіны аўтараў кожнага нумару «ARCHE» маюць адукацыю, атрыманую ў заходніх унівэрсытэтах, альбо фізычна знаходзяцца ў заходніх акадэмічных асяродках. Гэты якасны рывок у беларускай гуманітарыстыцы, можна спадзявацца, створыць нармальную

інтэлектуальную дынаміку.

Зусім інакш было адразу пасьля атрыманьня незалежнасьці: працягвала існаваць савецкая традыцыя ператварэньня гуманітарнай навукі ў ідэалёгію альбо ў палітызаваную журналістыку.

Другая рэч, якая цешыць: Беларусь сапраўды становіцца прадметам рэфлексіяў міжнароднай інтэлектуальнай супольнасьці. Мы назіраем выбух зацікаўленьня да беларускай праблематыкі. У «ARCHE», між іншым, сёлета друкаваліся беларусазнаўчыя дасьледаваньні такіх буйных заходніх навукоўцаў, як брытанскі палітоляг Эндру Ўілсан, амэрыканскі гісторык Тэадор Уікс, які сядзіць цяпер у Вільні і піша кніжку, прысьвечаную інтэлектуальнай гісторыі гэтага гораду, японскі палітоляг Кімітака Мацузата, прафэсар Хакайдзкага ўнівэрсытэту.

І апошняе. Вось выйшаў нарэшце доўгачаканы другі том «Гісторыі Беларусі» Якава Трашчанка. І першае-лепшае, што прыйшло мне да галавы, – гэта прапанаваць напісаць на яго рэцэнзію славутаму ўкраінскаму гісторыку Яраславу Грыцаку. Ён кажа: не праблема, прысылай, буду пісаць. Наўрад ці гэта было магчыма яшчэ дзесяць гадоў таму назад, каб Ярослаў Грыцак, адзін з самых такіх таленавітых і ўплывовых украінскіх гісторыкаў, узяў і напісаў нешта на замову беларускага культурніцкага часопісу. Беларусь становіцца сваёй, больш прысвоенай краінай ня толькі для беларусаў.

Андрэй Горных:

Ствараецца такое адчуваньне, што нам усім ня будзе чаго рабіць пасьля Лукашэнкі, што Лукашэнка раскруціў Беларусь як брэнд і акурат таму цяпер гэтым усё больш цікава, актуальна займацца. А потым – за што змагаліся, на тое і напароліся: постлукашэнкаўская Беларусь рэінтэгруецца ў эўрапейскую сям'ю і мірна ў ёй растворыцца. А апазыцыйныя інтэлектуалы ператворацца ў ідэолягаў касмапалітычнага лібэралізму альбо пераквалiфікуюцца ў нешта кшталту фальклярыстаў, што зьбіраюць рэшткі народнай традыцыі, каб

майстраваць зь іх палатняныя лялькі незалежнасьці. Адсюль і пытаньне пра нашых крытычных інтэлектуалаў: яны крытычныя толькі да таго часу, пакуль раскручаны ня імі брэнд «Беларусь» дае столькі падставаў для вытанчанай і зьедлівай крытыкі, якую спачувальна прымаюць на ўсім сьвеце, альбо яны крытычныя незалежна ад гэтага брэнду.

На пачатку дыскусіі была спроба дэфініцыі крытычнага інтэлектуала. Гаворка вялася пра тое, што крытычны інтэлектуал гэта той, хто дыстанцуецца наагул ад любых палітычных плыняў, рухаў і гэтак далей. Вось сама гэтая дыстанцыя ад якога-любя ўдзелу ў барацьбе за ўладу, ад выразна выяўленай пазыцыі ў тым сэнсе стварае крытычных інтэлектуалаў? Я гэта пачуў. Правільна?

Андрэй Казакевіч:

Дасьледнік павінен выходзіць з палітычнага поля, калі ён займаецца выданьнем часопісу ці прадукаваньнем дасьледнага тэксту. Гэта ня значыць, што «інтэлектуал» павінен займацца толькі напісаньнем тэкстаў, ён можа некалькі разоў на тыдзень пераходзіць з аднаго поля ў іншае, але натуральна, калі ён займае дасьледную (рэфлексіўную) пазыцыю, дыстанцыя павінна захоўвацца.

Андрэй Горных:

Гэта, хутчэй, сытуацыя таталітарнага грамадзтва, калі сам акт незалежнай «чыстай» думкі зьяўляецца як бы непасрэдна контраідэалягічным актам. Калі контраідэалягічнай ёсьць любая дыстанцыя ў адносінах да прасякнутай ідэалёгіяй рэчаіснасьці. Але назваць таталітарнай сучасную Беларусь было б перабольшваньнем. А пасьля Лукашэнкі гэта дыстанцыяваньне і наагул ня будзе працаваць, трэба будзе займаць нейкую пазыцыю...

Я згодны, што задачай інтэлектуала ня ёсьць лабавая крытыка партыі ўлады альбо там партыі лібэральных дэмакратаў. Але калі крытычная пазыцыя ў адносінах да існуючага ладу

зьяўляецца неад'емнай характарыстыкай інтэлектуала, то што яму трэба крытыкаваць у такім разе, у адносінах да чаго, да якога крытычнага аб'екта павінен ён канструявацца як пэўны суб'ект грамадзкага жыцьця?

Сьвятлана Навумава:

Я згодная з тым, што сказаў Андрэй Горных. Лукашэнка, сапраўды, – гэта нейкі брэнд. Яго можна лічыць ледзь ня самым вядомым беларусам у сьвеце. Многія за мяжой наагул хаця б штосьці ведаюць пра Беларусь толькі таму, што чулі пра Лукашэнку. Але гэта так, да слова. Я хацела б падкрэсьліць іншае. На мой погляд, сёньня ідзе прыкметны працэс палітызацыі і, калі можна так сказаць, паліталягізацыі крытычных інтэлектуалаў. Калі мы зьвернемся да апошняга нумару «Топоса», то можам сказаць, што ў пэўным сэнсе гэта – палітычны маніфэст. Падобная палітызацыі і паліталягізацыя – непазьбежны працэс, таму што чым далей, тым больш адбываецца палітызацыя наагул усяго жыцьця Беларусі. Гэта можа выклікаць пярэчаньне, таму што часьцей мы гаворым, нібы «ўсім нам па барабану», «народ апатычны», «нікому нічога не цікава». Але гэта ня так. Насамрэч жыцьцё Беларусі крытычна палітызаванае. Крытычна. Яно палітызаванае ўжо таму, што якую б сфэру жыцьця мы ні ўзялі, мы адразу сутыкаемся з прысутнасьцю ў ёй улады. Мы ў літаральным сэнсе натыкаемся на ўладу. Нават у такіх, здавалася б, далёкіх ад палітыкі сфэрах, як спорт альбо рэкляма. Гэта ўсё стала палітыкай. Летась мы сутыкнуліся з гэтым, калі зачынялі ЭГУ. Дзяржава ў асобе яе чынавенства прыйшла і сказала: «Досыць, давайце зачынім». Пазьней гэта закранула і іншыя ўнівэрсытэты. І таму ўсе разважаньні пра Беларусь – гэта разважаньні пра палітыку. Даводзіцца «думаць Беларусь» найперш як палітычны праект. Як толькі вы назвалі свой часопіс «Палітычная сфера», вы сталі ня толькі палітолягамі, вы сталі палітыкамі. Мы цудоўна разумеем, Андрэй, калі мы называем сябе палітолягамі, то тым самым ужо займаемся палітыкай. Пагадзіцеся, што ў Беларусі пры адсутнасьці палітычнага рынку, палітычнай канкурэнцыі паліталёгія наагул не патрэбная. Строга кажучы, у нас няма і палітыкаў, каму

маглі б спатрэбіцца палітычныя кансультанты. Таму, калі вы кажаце: «Я – палітоляг», вы як бы абвяшчаеце сваю палітычную пазыцыю. Вы становіцеся прыхільнікам палітычнага рынку. Вы прэтэндуеце на тое, каб мяняць сытуацыю ў краіне.

Алена Гапава:

У мяня такое ўражаньне, што я чытаю палеміку Леніна з Каўцкім. Альбо пра «партыйнасьць у літаратуры». Калі мы – і я – таму што я працавала ў ЭГУ, я пісала ў «ARCHE», я пісала ў часопіс «Фрагмэнты», то бок я разам з усімі ў гэтай лодцы – вось мы сядзім тут, абвяшчаем сябе крытычнымі інтэлектуаламі і ўсялякія словы прыгожыя, напісаныя на нашых сайтах, – але вось гэтыя часопісы выдаюцца, натуральна, пры падтрымцы нейкіх фондаў гуманітарных, гэта таксама вядома, гэта рэальнасьць. Пры гэтым мы ведаем, як мы ўсе галасуем, але потым мы наагул адхрышчваемся ад якой-любя палітычнай пазыцыі і робім выгляд, што мы наагул і неангажаваныя, ніколі не былі ангажаваныя і наагул чыстыя інтэлектуалы. Ці можна паспрабаваць дэканструяваць сябе, паспрабаваць быць сумленнымі з сабой? – таму што зразумела, што веданьне, за якое нам плацяць і якое мы вырабляем і якое незапатрабаванае ў старой сыстэме адукацыі, ёсьць палітычным. Я, да прыкладу, не магу сабе ўявіць – нават перажыўшы закрыцьцё ЭГУ, як усе астатнія, як траўму – я не магу сабе ў Амэрыцы ўявіць унівэрсытэту, які б фінансавалі беларускія ці расейскія грошы (ну, беларускія, гэта ў прынцыпе немагчыма – няхай расейскія), дзе выкладалі б «расейскі» корпус тэкстаў, зьвязаны там зь нейкай расейскацэнтрычнай пазыцыяй і выпускнікі якога потым знаходзілі сабе месца з-за іх адсутнасьці ў Амэрыцы па-за яе межамі і там зараблялі б гэтай ведай... То бок мы сапраўды ў гэта ўцягнутыя. Наша пазыцыя была палітычная ад самага пачатку, і яна структурна палітычная, улічваючы тыя рэсурсы, якія ўсе мы выкарыстоўваем, і пры гэтым рабіць выгляд, што, ну, мы ня ведаем, за што зачынілі ЭГУ – немагчыма.

Ігар Бабкоў:

Мы падышлі, магчыма, да першай мадэлі разуменьня крытычнага інтэлектуала. Можна ўявіць Беларусь у выглядзе рамкі ці поля, у якім выяўляюць сябе самыя розныя выданьні і праекты. Часткай зь іх ёсьць *minority culture* – мінарытарная беларуская культура («ARCHE», «Фрагмэнты»); на памежжы гэтай культуры і акадэмічнага асяродзьдзя ўзьнікаюць «Палітычная сфера», за межамі гэтай культуры ўзьнікае і існуе «Топос». Аднак нечакана ўнутры гэтай прасторы адбываецца нешта такое, што як бы выцясьняе «Топос» і ЭГУ за рамку Беларусі, адначасова і на рамку мінарытарнай культуры адбываецца ціск, які сьціскае яе і імкнецца да яе захопу. І ў гэтай сытуацыі ўсе пералічаныя пазыцыі пачынаюць злучацца, скажам, узаемнай ацэнкай, узаемнай палемікай. Напрыклад, з пазыцыі «ARCHE» як часопісу па практычнай антрапалёгіі ўсё, што надрукавана пра Беларусь у «Топосе», – гэта такі круты, да таго ж часткова снабісцкі дылетантызм філёзафаў, якія лічаць, што яны могуць інтэрпрэтаваць тэксты, нічога ня ведаючы ні пра традыцыю, ні пра краіну, так што ў «Топосе» дзьве траціны любога тэксту – пра тое, што аўтар чытаў з заходніх кніг, і апошнія два абзацы нібы пра Беларусь... І наадварот: аўтары тэкстаў «Топоса» глядзяць на аўтараў «ARCHE» як на людзей, якія ня ўмеюць працаваць з мысьленьнем, ня ўмеюць працаваць з паняткамі, ім здаецца, што яны думаюць, а насамрэч мысьленьня не адбываецца. То бок раней аніяк не злучальныя праекты злучаюцца такімі ўзаемнымі ацэнкамі. Акрамя таго, можна ацаніць гэтую сытуацыю з пазыцыі Сьвятланы Навумавай, якая кажа, што ўсе мы ў роўнай ступені палітызаваныя, дарма што нібы мы розныя, дарма што мы ацэньваем адзін аднаго па-рознаму і што нават дарма што на нашых вачох крышталізуюцца клясычныя інтэлектуальныя пазыцыі: Альміра і Андрэй – гэта левыя інтэлектуалы, а Андрэй Казакевіч, напэўна, правы... Алена ж Гапава наагул кажа, што ўсе мы купленыя... Гэта значыць, што ўсё, што мы пра сябе думаем як левых, правых, зялёных і г. д. ня мае аніякага сэнсу, таму што вызначальнае тое, хто аплачвае нам працу. Што ставіць пад сумнеў усе нашыя пазыцыі і дасягненьні. У такім разе, у мяне ёсьць як мінімум дзьве вэрсіі таго, што адбываецца. Альбо мы ўсе гамагенізуемся, то бок палітызуемся, становімся прадажнымі інтэлектуаламі, якія існуюць на заходнія грошы і чамусьці думаюць пра сябе як пра белых і

пушыстых, ці сапраўды адбываецца здаровы працэс крышталізацыі пазыцыяў, і мы пачынаем падзяляцца на левых і правых, а ня толькі на беларускамоўных і расейскамоўных.

Алена Гапава:

Хачу патлумачыць сваю пазыцыю. Яна заключаецца ў наступным: тое, што адбываецца цяпер у Беларусі, на постсавецкай прасторы, хаця ў Беларусі гэты працэс найбольш відавочны, можна абазначыць як «клясавае» супрацьстаяньне. У Беларусі яно мае яскравую нацыянальную афарбоўку – і Лукашэнка таксама становіцца «нацыяналістам», яму «няма чаго рабіць» іначай. Гэта па сутнасьці «клясавае» супрацьстаяньне, таму што існуе паміж групамі з рознымі рэсурсамі. І адпаведна інтэлектуалы, якія з аднаго боку – гэта інтэлектуалы вось гэтай «клясы», празаходняй эліты, якія працуюць у новых універсытэтах, прасоўваюць іншую веду... Ува ўсіх часопісах, пра якія вядзецца гаворка, агромная частка – пераклад заходніх тэкстаў. А ўвядзеньне ўва ўжытак некаторых тэкстаў ёсьць прасоўваньнем пэўнай ідэалёгіі. Зь іншага боку, існуе прапрэзыдэнцкая прафэсура, якая абараняе тыя пазыцыі, той сацыяльны капітал, які яна атрымала ў старой сыстэме і які ў новай сыстэме наагул ня мае аніякай вагі. Гэта «савецкая» філязофія, літаратуразнаўства, гісторыя... У нас іншы сацыяльны капітал, выбудаваны на заходняй ведзе і доступе да заходніх рэсурсаў. З гледзішча ж палітыкі, з гледзішча «каму выгадна», мы ўсе выступаем за такія нібыта добрыя рэчы, як правы чалавека, свабода, свабода слова... Але пры гэтым аказваецца, што гэта ў філязофіі бываюць нейкія нэўтральныя гуманітарныя альбо ўнівэрсальныя каштоўнасьці. Як толькі мы пераходзім да сацыяльнай тэорыі, у сэнсе – да канкрэтнай групы, канкрэтных людзей на канкрэтнай прасторы, то аказваецца, што вось гэтая вось свабода слова і ўсе астатнія каштоўнасьці, яны *зьвязаны* акурат з пазыцыяй пэўнай клясы і пэўным клясавым ладам. Я магу патлумачыць, але не жадаю паўтараць, у мяне ў артыкуле, надрукаваным ў апошнім «Топосе» пра гэта напісана, чаму тая бабця, якая жыве ў калгасе «Новы шлях», і вось якая ад новага сацыяльнага ладу анічога не атрымала, чаму яна галасуе супраць «свабоды

слова». Ды яна супраць іншага зусім галасуе! Рухі рэзыстантныя ўзьнікаюць заўсёды сярод тых, каму ня вельмі кепска. А вось тыя, каму вельмі кепска, у іх няма голасу, вось яны там сядзяць, і аказваецца, што ад трох да пяці, васьмі гадоў, калі была свабода слова, і ўсё астатняе, гэта было поўнае жабрацтва, і рабаваньне, і разбурэньне жыцьця. А вось калі «свабоды» стала меней, дык выявілася, што ў яе пэнсія крыху вырасла, яшчэ нешта там такое. На жаль, гэта так. Гэта структурны падзел, ад якога мы анікуды ня можам падзецца. Пакуль яшчэ гісторыя чалавецтва ніколі ня ведала прыкладу дэмакратыі, калі яна б існавала па-за капіталізмам. Але пры капіталізьме бабці з калгасу «Новы шлях» становіцца вельмі кепска – у яе няма рэсурсаў, якія ў гэтай сыстэме канвэртаваліся б у капітал. І калі б гэтую бабцю вывесьці наагул з дыскурсу, ну, можна казаць, крытычныя інтэлектуалы могуць казаць праміж сабой пра ўсялякія цікавыя рэчы. Але я не магу адмовіцца ад гэтай бабці....

Альміра Ўсманава:

Я хацела б, хаця, можа быць, гэта не зусім аб тым, пра што цяпер Лена казала, вярнуцца да тэмы, якую прапаноўваў да таго Ігар, а заразом паспрабаваць адказаць на пытаньне, якое задаваў Андрэй Горных. Па-першае, у той мадэлі, якую ты, Ігар, тут прадставіў, ёсьць месца таму, пра што толькі што сказала Лена Гапава. Лена якраз выступае з пазыцыяй такога клясычнага марксізму, дзе «чалавек ёсьць тым, што ён есьць» (як казаў Фаербах). Чалавек, якому плацяць грошы, заўсёды, адпаведна, мусіць іх адпрацоўваць. Тым ня менш, у інтэлектуальным асяродзьдзі гэтыя адносіны не такія прымітыўныя, альбо, прынамсі, яны вымагаюць больш складаных схемаў. Як я пісала ў сваім артыкуле для «Топоса», інтэлектуалу плацяць за тое, каб ён выступаў «супраць», каб ён дазваляў сабе быць хаця б у нейкай ступені аўтаномным. Чалавек, які перабіваецца з хлеба на ваду, ня ў стане абстрагавацца ад умоваў уласнага жабрацкага існаваньня і паразважаць аб прычынах і мэханізмах сацыяльнага ўладкаваньня. Неабходна пэўная ступень матэрыяльнай незалежнасьці, каб мець магчымасьць бачыць далей і глыбей.

Ігар Бабкоў:

Я б з марксісцкай пэрспэктывай пагадзіўся, але насамрэч Алена Гапава выступае з пазыцыі вонкавага дамінантнага аўтарытэта, які імкнецца як бы панізіць інтэлектуальны капітал усіх нас. Так, я згодны, што ў нас адбываецца ўзьнікненьне – ну, ня клясаў, але новых слаёў. Так, мы займаем розныя інтэлектуальныя пазыцыі і рознае месца ў структуры вытворчасьці ведаў. Але хіба гэта гаворыць пра нашую татальную прадажнасьць?

Альміра Ўсманава:

Можна, я скончу тое, што я хацела сказаць? Вельмі коратка. Мне ўяўляецца, што сувязь паміж грашыма і думкай адназначна не такая простая і не такая адназначная: філязофія наагул не была б магчымай як такая, калі б гаворка ішла толькі пра тое, хто ў якой структурнай пазыцыі знаходзіцца. Але зь іншага боку, я падумала, што цяпер, вось напэўна ў дадзены момант дыскусіі, гэта даволі актуальнае адрозьненьне, таму што калі казаць пра крытычных інтэлектуалаў зь лібэральнымі поглядамі, то пасьля сыходу Лукашэнкі ў іх дакладна ўзьнікнуць праблемы з тым, што крытыкаваць далей. У левых інтэлектуалаў такой праблемы не ўзьнікае – проста таму, што капіталізм больш жывучы, чым Лукашэнка. І адпаведна пасьля сыходу Лукашэнкі наш аб'ект крытыкі захаваецца.

Андрэй Горных:

Андрэй Казакевіч разглядае беларускую паліталёгію як варты крытыкі аб'ект. Сьвятлана Навумава кажа пра тое, што аб'ектам крытыкі ёсьць палітыка наагул, у прыватнасьці Лукашэнка і ўсё, што з гэтым зьвязана. Але і гэта, мне здаецца, завужае аб'ект крытыкі, што да якога складваецца пазыцыя інтэлектуала. Трэба браць шырэй. Лена Гапава ў рамках постмарксісцкага праекту лічыць, што аб'ект гэты можа быць самым розным – самыя разнастайныя віды прыгнёту. Маркс крытыкаваў эксплюатацыю рабочых, а інтэлектуал часоў постмадэрну крытыкуе становішча жанчын, афра-амэрыканцаў,

сэксуальных мяншыняў, свойскіх жывёлаў, – ну, то бок усё што заўгодна (асабліва калі гэта знаходзіцца ў рамках палітыкі фондаў, што выдаткоўваюць грошы на дасьледаваньні). Здавалася б, куды шырэй. І тым ня менш, калі мы прыгадаем пра генэалёгію крытычнага інтэлектуала, мы павінны зьвярнуцца да марксізму, каб хаця б неяк акрэсьліць панятак. Галоўным і непаўторным аб'ектам для крытыкі ў гэтым выпадку зьяўляецца такая рэч, як таварна-грашовая форма, якая працуе на ўсіх узроўнях, ува ўсіх фэномэнах капіталістычнай культуры. І задача-мінімум крытычнага інтэлектуала – дэтэктаваць і даводзіць да сьвядомасьці большасьці, «сярэдняй клясы» тое, як працуе таварна-грашовая форма там, дзе абывацель і ня думаў яе сустрэць – на ўзроўні мастацтва, фантазіі, жаданьня, прасторава-часавага досьведу штодзённасьці. То бок у гэтым сэнсе, як мне здаецца, крытычная тэорыя, левая ідэя і марксізм – гэта абсалютна іманэнтныя заходняму грамадзтву зьявы. Пачынаючы з таго, што яны нарадзіліся, уласна кажучы, у нетрах Эўропы як спроба заходняга грамадзтва зразумець, што зь ім адбываецца. І як мінімум усьцерагчы сябе ад ідэалягічнага фанатызму, Адзінага Народу, аб'яднанага ідэяй, – нацыі, альбо вольнага спажываньня, альбо дэмакратыі, чым заўгодна. Вось тая філязофская рамка, якую павінен, на мой погляд, няхай «бакавым зрокам», але ўтрымліваць крытычны інтэлектуал, разглядаючы тую ці іншую канкрэтную падзею альбо фэномэн. Калі мы гэтых рамак не ўтрымаем, калі мы цалкам сыдзем у прыватнасьці, ці то становішча беларускага гуманітарыя альбо чорнай лесьбіянкі, гэта будзе недаравальнай рэдукцыяй крытычнага аб'екту.

Мікола Кацук:

Я б хацеў выказаць некаторыя свае меркаваньні з нагоды прапанаванай схемы і гэтай сытуацыі. Мне ўяўляецца, што зварот інтэлектуалаў альбо, скажам так, зьяўленьне інтэлектуалаў як відавочных (для саміх сябе) у Беларусі зьвязана ня толькі з працэсамі, што адбываюцца непасрэдна ў Беларусі, але і наагул з сусьветнымі тэндэнцыямі. Умоўна я гэта пазначыў бы як дэінтэлектуалізацыя культуры. У

прынцыпе, гэтую гіпотэзу лёгка праверыць, можна паглядзець колькасьць выступаў інтэлектуалаў у 1990-я гады і ўсплёск, які, як мне здаецца, прыпаў на час пасьля 2000 году. У нас адбываецца дэінтэлектуалізацыя, дэпрафэсіяналізацыя практычна ўва ўсіх сфэрах жыцьця, ці ж ня так? Аказваецца, што банкамі можа кіраваць заслужаны будаўнік і, у прынцыпе, нармальна кіраваць. Адукацыя дэвальваваная. Зь іншага боку, на Захадзе, відавочна, што ўсемагчымыя палітычныя кампаніі: «Ірак», «выратуем Амэрыку ад тэрарызму» – усё гэта адбываецца без усялякага інтэлектуальнага абгрунтаваньня. «Кажы больш эмацыйна, і людзі табе павераць». І ў гэтым сэнсе, мне здаецца, зьяўленьне інтэлектуалаў выклікана тым, што яны сталі баяцца акурат за свой капітал – сацыяльны капітал і палітычны. Яны сталі разумець, што надыходзіць сьвет, у якім мазгі ня цэняцца. Інтэлектуальнасьць увогуле заўсёды будзе запатрабавана, але ў якой якасьці? І гэты зварот, хуткая пераквалiфікацыя сябе ў інтэлектуалы, мне здаецца, зьвязаная акурат з гэтым працэсам. І ён ідзе ня толькі ў Беларусі, але і наагул на ўсім сьвеце.

Што ж тычыцца дыскусіі аб крытычных інтэлектуалах. Мне здаецца, што найперш тут зьмешваюцца два падыходы: крытыка як гаварэньне таго, што я супраць, і адпаведна пісаньне ідэалягічных артыкулаў для «Народнай волі», толькі на больш кваліфікаванай мове і са спасылкамі на тых ці іншых заходніх альбо мясцовых прадстаўнікоў. І крытыка ў сэнсе Канта, то бок ускрыцьцё ўмоваў магчымасьці чаго-небудзь. І ўмоваў магчымасьці паліталёгіі, і ўмоваў магчымасьці рэжыму. І ў гэтым сэнсе здымаецца тая праблема, як можна дыстанцыявацца. Гэта, найперш, рэфлексіўная практыка, рэфлексіўны занятак.

Яшчэ колькі словаў з нагоды «Топоса» і, скажам так, купленасьці альбо прадажнасьці інтэлектуалаў. Калі мы кажам пра тое, што ўсе інтэлектуалы купленыя і абгрунтоўваем гэта нейкімі схемамі, то незразумела, адкуль выказваньне гэта вымаўляецца. «Хто праплаціў за тое, каб сказаць, што ўсе інтэлектуалы купленыя?» То бок гэта пэрфарматыўная супярэчнасьць.

Што ж тычыцца палітызацыі, мне ўяўляецца – прынамсі, я абапіраюся на дадзеныя сацыялягічных дасьледаваньняў, – што на самай справе ёсьць абсалютная дэпалітызацыя... То бок палітыка ў Беларусі зьнікла, – калі разумець палітыку як вырашэньне супольных праблемаў – зьнікла, і практычна ўсе сфэры жыцьцядзейнасьці грамадзтва сталі кіраванымі. То бок палітыка замянілася на адміністраваньне. Куды ня пніся – чыноўнік. Але чыноўнік ня сам прымае рашэньні.

І адносна «Топоса» і артыкулу Фурса. (...)

Артыкул крыху празьмерны. Калі пачытаць літаратурныя крыніцы, дасьледаваньні, то, у прынцыпе, усё ў нас робіцца паводле Гёбэльса. Гэта працавала і ў 1930-я гады. Але, тым ня менш, у канцы свайго артыкулу ён робіць вельмі важную выснову, важную канстатацыю: асноўная праблема палягае ў тым, што ўвесь інтэлектуальны дыскурс і ўся Беларусь сканцэнтраваны на асобе Лукашэнкі. Адпаведна, тым самым робіцца адрозьненьне. Адныя інтэлектуалы, што выступаюць «за» ці «супраць», узнаўляюць гэтую самую фігуру. І другія, што спрабуюць проста знайсьці нейкія іншыя падставы для таго, каб апісаць тое, што адбываецца ў Беларусі. Таму што выступаючы супраць, я ўсё адно надаю значэньне, я надаю статус таму, супраць чаго я выступаю. Мне здаецца, што адна з задачаў крытычных інтэлектуалаў – паказаць, што Беларусь ня тоесная гэтай асобе.

Андрэй Казакевіч:

Тут было сказана пра ўплыў «інтэлектуалаў» на палітыку (у тым ліку і праз выданьне часопісаў). Але я, напрыклад, ня бачу сэнсу прапаноўваць палітыкам акадэмічны часопіс, каб яны яго чыталі. Гэта трошкі іншы жанр, для іншае аўдыторыі, тут мы кажам пра вытворчасьць веды. Я збольшага добра ведаю, якім павінен быць часопіс, каб яго чыталі лідэры партыяў ці іх намесьнікі, але гэты іншы жанр. Прынамсі, будуць чытаць функцыянэры ды аналітыкі каля іх, нешта будуць абмяркоўваць, будзе адбывацца камунікацыя. Але гэта зусім іншае. Калі выдаецца прадукт «акадэмічнага» жанру, ён ня можа выдавацца там па 10–11 тысяч экзэмпляраў і прадавацца

ў кожным шапіку. Гэта немагчыма, тысяча – тысяча дзьвесьце – максымум. І такое выданьне накіравана на прадукаваньне веды, а не на зьмену палітычнага ляндшафту ці актывізацыю палітычнае камунікацыі. Потым гэта веда можа трансьлявацца праз сыстэму адукацыі, праз дыскусіі, іншым чынам уплываць на сьвядомасьць, але ад пачатку такая задача ня ставіцца. Для гэтага ёсьць іншыя структуры, іншыя выданьні, іншыя інтэлектуальныя практыкі. Той самы інтэлектуал, скажам, чалавек, які займаецца выданьнем такога часопісу, можа жыць за кошт нейкіх іншых справаў – грамадзкіх, дзяржаўных, палітычных і гэтак далей.

Сьвятлана Навумава:

Я хацела зьвярнуць вашую ўвагу: у таго кола людзей, якія лічаць сябе інтэлектуаламі, усё-ткі ёсьць патрэба выйсьці з «інтэлектуальнага гета», як кажа Ігар. Я прывяду ў прыклад многім тут добра вядомую гісторыю з сайту «Наше мнение», які ўвогуле зьявіўся з ініцыятывы аднаго чалавека, дакладней – невялічкай купкі людзей. Я мела непасрэднае дачыненьне да ягонага стварэньня. Ён задумваўся як сайт палітычнай аналітыкі, дзе можна было б знайсьці непасрэдную рэакцыю на палітычныя падзеі. Але праз пэўны час на гэтым сайце сталі зьяўляцца артыкулы тых, каго я нават не чакала там убачыць. Дарэчы, многія з тут прысутных прапаноўвалі свае артыкулы. Можна казаць пра тое, што яны захацелі выйсьці за межы вузкага кола і трапіць у кола шырэйшае. Канечне, публікацыя на сайце таксама не гарантуе масавай аўдыторыі, але ўсё-ткі аўдыторыя больш шырокая. Пры гэтым я лічу, што такія спробы трэба вітаць. Мне здаецца недарэчным інтэлектуальны снабізм. Гэта ня значыць, што трэба ў літаральным сэнсе «ісьці ў народ», але, у прыцыпе, нейкая частка інтэлектуалаў натуральна павінна займацца папулярызацыяй сваіх пазыцыяў.

Андрэй Казакевіч:

Я толькі яшчэ раз адзначу, што трэба адчуваць розьніцу жанраў. Ёсьць практыкі вытворчасьці «аналітычнае» палітычнае веды кшталту сайту «Наше мнение», ёсьць прастора чыстае

палітычнае камунікацыі: «Народная воля» і г. д. Задача нашага часопісу – самаапісаньне беларускай палітычнай сыстэмы на адносна «нармальным» канцэптуальным і крытычным узроўні, усё. Гэта – ідэальная мадэль. Далей вынікі дасьледаваньняў, натуральна, могуць распаўсюджвацца праз сыстэму адукацыі, сэмінары і г. д. Прычым гэта могуць рабіць тыя самыя людзі, якія робяць выданьне. Але большасьць тэкстаў з нашага часопісу немагчыма зьмясьціць на сайце «Наше мнение» ці ў «Весьніку БДУ». Напрыклад, добры тэарэтычны тэкст пра выбары ў якім-небудзь, ня ведаю, Воранаўскім раёне з аналізам на 20 старонак, думаю, немагчыма разьмясьціць ні на сайце «НМ», ні ў «Весьніку БДУ», ні тым больш у «Народнай Волі».

Вольга Шпарага:

Мне ўсё-ткі здаецца, што мы гаворым цяпер і пра крытычных інтэлектуалаў, і не. То бок і тая пазыцыя, якую адстойвае Андрэй Казакевіч, і тая пазыцыя, якую займаў «Топос» да дзясятага нумару, – гэта пазыцыя прафэсійнага часопісу, то бок часопісу, які працуе ў сваёй спэцыяльнай галіне ведаў. І, на маю думку, аўтар інтэлектуальнага часопісу альбо тэкст у такім часопісе займае пазыцыю крытычнага інтэлектуала ў тым выпадку, калі гэты тэкст сапраўды набывае голас у нейкай іншай прасторы і пачынае, можна сказаць, кіраваць гэтай прасторай ці нейкай часткай гэтай прасторы, то бок пачынае ўплываць на ўладу, весьці за сабой пэўныя групы. Інтэлектуал, альбо крытычны інтэлектуал, гэта той, хто ўплывае на ўладу. Гэта не папрок у бок прафэсійнага часопісу, які неабходны. Але быць прафэсіяналам у сваёй галіне ведаў ня значыць аўтаматычна быць крытычным інтэлектуалам. Я лічу, магчыма, нашыя часопісы як прафэсійныя займаюцца структураваньнем беларускай культурнай прасторы, структураваньнем прасторы ведаў. Але «Топос» апошні, дзясяты, зрабіў спробу заняць пазыцыю крытычнага інтэлектуала, паколькі ягонай прадметнасьцю – прафэсійнай прадметнасьцю – стала Беларусь, якая не ўмясьцілася ў рамкі філязофскай рэфлексіі. Гэта значыць, што мы прапанавалі свае развагі тым, каму нашыя развагі цікавыя і былі раней зусім не даступныя, паколькі мы працавалі з такімі прадметнасьцямі, зь якімі

працуюць толькі філёзафы. А цяпер мы зьвярнуліся да такой прадметнасьці, так, але з сваёй філязофскай пэрспэктывы, якая вось як бы запатрабаваная, пра якую ў гэтай пэрспэктыве пішуць, якую аналізуюць і ў іншых галінах. Магчыма, я цяпер думаю, што, па сутнасьці, любая тэма можа быць філязофска, паліталягічна асэнсаваная так, што яна будзе даступная і важная і ў іншых галінах. Магчыма, гэта яшчэ адно вымярэньне інтэлектуалізму і крытычнага інтэлектуала, датычнае і пытаньня стандартаў акадэмізму: каб філёзаф мог напісаць так, каб гэта было цікава і важна ня толькі яму. Але ўсё-ткі ў маім разуменьні крытычны інтэлектуал – гэта той, хто ўплывае на ўладу. І наагул трэба прызнаць, што мы, і «Топос» у прыватнасьці, аніяк не ўплываем на сытуацыю ў Беларусі. Наша аўдыторыя – гэта тры чалавекі, якія займаюцца самавызначэньнем, часопіс дапамагае ім самавызначыцца, падтрымлівае ўзровень іх ведаў, ну а цяпер, з апошнім «Топосом», мы прыадкрылі вочы на тое, што мы як філёзафы можам аналізаваць Беларусь і нейкія яе праблемы. Аднак гэта толькі першы крок, які сьведчыць аб тым, што крытычных інтэлектуалаў у Беларусі пакуль яшчэ няма. У такім разе што мы абмяркоўваем? Магчыма, нам варта задацца пытаньнем, як у цяперашніх умовах усё-ткі падтрымліваць узровень прафэсійных ведаў?

Мікола Кацук:

Я хацеў бы зрабіць адно даволі істотнае ўдакладненьне. У штаб-кватэры БНФ на цяперашнім праспэкце Машэрава ёсьць кніжная выстаўка, і там ляжыць часопіс «Палітычная сфера». Там ён ляжыць, і палітыкі яго чытаюць. Так што, мне здаецца, ня трэба загадзя прыбядняцца. Іншая справа, што так ці іначай інтэлектуальны тэкст, як камень у вадзе, разносіць нейкія хвалі. І так ці іначай палітыкі вымушаны рэагаваць на гэта. І мне здаецца, што пазыцыя, калі мы кажам пра пазыцыю рэдактара часопісу, складаецца ў тым, каб была ўнутраная палітыка выданьня, каб плянаваць выхады. Бо на самым пачатку ангажаванасьць узьнікае не з-за таго, што хтосьці там за кімсьці стаіць, а таму, што інтэлектуал ці дасьледнік ангажаваны найперш выбарам тэмы. То бок можна выбраць

такую тэму, пад якую хтосьці дасьць грошы, а можна зыходзіць з свайго інтарэсу. І ў гэтым сэнсе часопіс «Палітычная сфера», што б там Андрэй Казакевіч ні гаварыў, так ці іначай мяняе калі нават ня ўладу, то тыя ж палітычныя партыі, тых людзей, якія знаходзяцца ў апазыцыі. І ў гэтым неабходна, мне здаецца, проста прадумваць скіраванасьць гэтага ўзьдзеяньня. Таму што яны ўсё адно... Яны ўжо чытаюць гэты часопіс. Так, я думаю, тое самае з «Топосом» і «ARCHE», і так ці іначай усё гэта разносіцца.

Аляксандар Адамянц:

Я б хацеў выказацца з нагоды таго прадмета, які мы абмяркоўваем на гэтай сустрэчы. Можна да бясконцасьці спрачацца, хто з нас левы інтэлектуал, а хто правы. Можна разважаць пра тое, хто і за што плаціць і хто не, і гэтак далей. Канечне, гэта важныя пытаньні, пра іх можна і трэба спрачацца. Але тут у мяне ўзьнікае пытаньне пра дарэчнасьць гэтай спрэчкі, якая адбываецца ў гэты момант. Ці варта абмяркоўваць на гэтай сустрэчы пытаньні *тэарэтычныя*? Мне здаецца, што для гэтага ёсьць безьліч іншых, больш прыдатных магчымасьцяў. Для гэтага інтэлектуальная традыцыя (найперш заходняя) выпрацавала спэцыяльныя формы. Ёсьць навуковыя часопісы, канфэрэнцыі, сэмінары і г. д. Цяпер важнейшай праблемай ёсьць праблема *практычная*. Праблема, якая вызначае агульную культурную сытуацыю ў Беларусі, у прыватнасьці тую сытуацыю, якая датычыцца сфэры інтэлектуальнай дзейнасьці, сфэры соцыягуманітарнай веды. Гэтую культурную сытуацыю вельмі добра вызначыў беларускі філёзаф Валянцін Акудовіч. Ён назваў гэтую сытуацыю *«архіпэлягам Беларусь»*. Што азначае гэтая мэтафара? Акудовіч выкарыстаў гэтую мэтафару найперш да беларускай мовы і самасьвядомасьці. Існуе мноства розных групаў людзей, лякальных супольнасьцяў, асобных людзей, якія гавораць па-беларуску, культывуюць беларускую мову, спрабуюць яе папулярызаваць і разьвіваць. Але гэтыя цэнтры існуюць асобна адзін ад аднаго, яны амаль не зьвязаныя адзін з адным. Сытуацыя беларускай мовы нагадвае архіпэляг сярод «мора расейскай мовы». Мэтафара архіпэлягу вельмі дакладна

характарызуе і сытуацыю інтэлектуальнай прасторы Беларусі. Напрыклад, калі б я асабіста ня быў знаёмы з Андрэем Казакевічам, я б і ня ведаў, што існуе такі часопіс, як «Палітычная сфера». Пры тым, што мы жывём у адным горадзе. Што ж казаць пра чалавека з правінцыі, чалавека, які жыве ў іншым горадзе ці там памаўляецца зь іншымі людзьмі? Асноўная праблема палягае ў тым, што ў Беларусі не існуе публічнай прасторы, супольнай прасторы, дзе можа ажыццяўляцца вольны абмен інфармацыяй. У нас парушаныя камунікацыі. Дакладней, не парушаныя, а яшчэ ня створаныя, іх ад пачатку не было. Панятак «камунікацыя» мае тэхнічнае сэнсавае адценьне. Тэхніка – справа спэцыяліста, які можа прыйсьці і ліквідаваць непаладкі. Але тут праблема значна глыбейшая. Для яе вызначэньня я панятак «камунікацыі» памяняю на панятак «дыялёг». Асноўная культурная праблема – гэта праблема дыялёгу, грамадзкага дыялёгу. Мы жывём у сытуацыі адсутнасьці супольнага інфармацыйнага і інтэлектуальнага поля. Нам неабходны нейкі грамадзкі форум, спэцыяльная прастора, дзе магчымыя сустрэчы розных людзей. Наша сёньняшняя сустрэча – гэта адна з магчымасьцяў, дзе камунікацыя і дыялёг могуць адбыцца. Адна сустрэча, канечне, ня створыць супольнага поля, публічнай прасторы. Падобныя сустрэчы павінны адбывацца часьцей. Але павінны існаваць і іншыя формы.

На заканчэньне мне хацелася б сказаць, што ў стварэньні супольнай публічнай прасторы агромністая роля належыць часопісам. І гэта павінна быць зразумела. У часопісаў ёсьць для гэтага сродкі, ёсьць патэнцыял ужо дзеля самой формы. Часопіс – гэта элемэнт публічнасьці. Але ў нашых складаных умовах, у нашай палітычнай сытуацыі роля і адказнасьць часопісаў несувымерна вышэйшая, чым у адносна больш багатых вольных краінах Захаду. Для гэтага рэдакцыямі павінна ажыццяўляцца спэцыяльная палітыка, прыкладацца дадатковыя намаганьні, каб садзейнічаць узьнікненьню супольнага інтэлектуальнага поля.

(...)

Валер Булгакаў:

Мне здаецца, мы адыходзім ад заяўленай тэмы круглага стала – «Крытычныя інтэлектуалы: сымбалічная барацьба і структурнае процістаяньне». У нас, з аднаго боку, усё зводзіцца да самабічаваньня (маўляў, сувязь з чытачамі парушаная, а Лукашэнка зьяўляецца інтэграцыйным цэнтрам, які яднае, структуруе і абуджае інтэлектуальную прастору), і з другога – да саладжавасьці і самазаспакоенасьці (не хапае ўсяго трошку посьпехаў і славы). Я хацеў бы наэлектрызаваць нашу сёньняшнюю дыскусію абгаворваньнем момантаў, якія не да канца былі агучаныя.

Ігар Бабкоў спрабаваў намацаць узаемныя стэрэатыпы аўтараў «ARCHE» і «Топоса». Ён закрануў вельмі сур'ёзную праблему ўзаемаадштурхоўваньняў у нашым інтэлектуальным асяродзьдзі. Мы ня ведаем адзін аднаго, прэзэнтуем розныя ідэалёгіі і кіруемся рознымі каштоўнасьцямі. Ідэалёгія беларускамоўных вельмі часта ўспрымаецца як аўтарытарная і дэструкцыйная. Зь іншага боку, актывізацыя творчасьці на расейскай мове ў Беларусі ў пэўных колах беларускай інтэлігенцыі бачыцца як яшчэ адна праява расейскага культурнага гегеманізму.

Таму неабходна абмяркоўваць узаемны нэгатыў. Сапраўды, для многіх аўтараў «ARCHE» часопіс «Топос» і асяродзьдзе, якое стаіць за ім, дагэтуль успрымаецца часткай правінцыйнага, абласнога расейскага інтэлектуальнага працэсу, зьвязанага зь Беларусьсю толькі геаграфічна, а не культурна. Адпаведна, толькі капрызам гісторыі тлумачыцца той факт, што ён зьявіўся ў Менску, а не ў Варонежы ці ў Екацерынбургу, калі гэта фармуляваць агрэсіўна. А зь іншага боку, часопіс «ARCHE» і агулам інтэлектуальны рух на нацыянальнай мове часта асацыюецца ня толькі з слабой філязофскай культурай, але і з ваяўнічым нацыяналізмам і антычалавечнасьцю.

І яшчэ вельмі важная тэма, якая не прагучала тут, гэта тэма візіі будучыні Беларусі. Гэтае пытаньне таксама расколвае нашу гуманітарную прастору. Стратэгічная мэта асяродзьдзя, якое я прадстаўляю, – гэта тварэньне нацыі па эўрапейскай культурнай мадэлі, куды больш пасьпяхова рэалізаванае сёньня ўва Ўкраіне. Гэта шлях пабудовы нацыі, якая цэмэнтуецца

нацыянальнай культурай, валодае нацыянальнай ідэнтычнасьцю, існуе пераважна ў нацыянальнай інфармацыйнай прасторы і тым самым нарэшце пазбаўляе кіроўны аўтарытарны рэжым культурнай і палітычнай легітымнасьці, прыводзячы да дэмакратыі. З гэтага пункту гледжаньня пераход да дэмакратыі немагчымы без пабудовы такога мэтафізычнага канструкту, якім зьяўляецца культурная нацыя. Для рэдакцыі «Топоса» ці для ўсяго асяродзьдзя ЭГУ гэта, бадай, ня факт. Яго прадстаўнікі існуюць у сваёй прасторы, для іх гэтая ідэя не зьяўляецца асновасяжнай і фундамэнтальнай. Нас разьдзяляюць ідэі і каштоўнасьці, яны будуць разьдзяляць нас і выклікаць канфлікты, скрытыя ці яўныя супрацьстаяньні незалежна ад таго, хто цяпер пры ўладзе.

Наконт Лукашэнкі. Было сказана, што Лукашэнка атрымлівае дадатковую культурную і палітычную легітымацыю з боку сваіх крытыкаў. На самай справе, фэномэн Лукашэнкі прадукуе масу элемэнтарна несумленных трактовак і тлумачэньняў, калі браць дыскурс папулярных незалежных СМІ. Ці мае права крытычны інтэлектуал, калі ён ёсьць такім, пасіўна ўспрымаць гэтую хвалю маны? Уся гэтая хлусьня з часам атрымлівае правы грамадзянства ў мэдыйнай прасторы і ўваходзіць у сьвядомасьць беларускіх грамадзянаў, калі яе ня нішчыць пры дапамозе крытыкі.

Да таго ж лукашэнкаўскі рэжым палітычнымі мэтадамі хавае існаваньне ў грамадзтве сур'ёзных, калі не сказаць цывілізацыйных разломаў. Гледзячы штодня беларускае тэлебачаньне, можна і не здагадвацца, што наша грамадзтва разьдзіраецца знутра глыбокімі супярэчнасьцямі. Рэжым папросту стварае нам тэлевізійную карцінку, у якой даяркі дояць, трактары аруць, беларусы ўсе як адзін гавораць па-расейску і падтрымліваюць прэзыдэнта. Калі гэты рэжым заўтра заваліцца, пастаянныя гледачы беларускага тэлебачаньня пазаўтра сутыкнуцца з зусім іншай рэальнасьцю, у якой на месца аднаго старога Зянона Пазьняка прыйдуць сто новых Зянонаў Пазьнякоў. Канструюючы тэлекарцінку, лукашэнкаўцы нівэлююць беларускае грамадзтва: яны выводзяць за кадар нашы культурныя адрознасьці. У прынцыпе,

гэта выбуханебясьпечна.

Маё заключэньне будзе правакацыйным. У цяперашняй сытуацыі крытычныя інтэлектуалы супрацьстаяць перадусім самім сабе, а ня ўладам.

Андрэй Горных:

Мне здаецца, няма болей падставаў жывіць ілюзіі наконт супольнага камунікацыйнага поля і ўнівэрсалізавальнай функцыі філёзафа на ім. Мы ўсе тут прадстаўляем цалкам маргінальныя дыскурсы. Філязофская грамада стала яшчэ адной субкультурай – побач з панкамі ці талкіеністамі. Больш за тое, усё больш складанай зьяўляецца камунікацыя паміж рознымі супольнасьцямі ўнутры філязофіі. Вылучаюцца субкультуры фэнамэнолягаў, постструктуралістаў ды іншых. У нас адбываецца той самы працэс паступальнай фрагмэнталізацыі і самазамыканьня моваў і сацыяльных групаў, які ўласьцівы для агульнай лёгікі капіталу. Мы думаем, што гэта наш унікальны досьвед. Але няма нічога новага пад месяцам. І казаць у першую чаргу трэба пра агульныя працэсы мадэрнізацыі і постмадэрнізацыі. Зь «яскравымі», але зусім не рэвалюцыйнымі беларускімі адхіленьнямі. Трэба паказаць, што цяперашняя Беларусь мае мала супольнага зь левай ідэяй, што яна прадстаўляе сабой спэцыфічны дробнабуржуазны нарост на целе капіталізму, грымасу, так бы мовіць, мадэрнізацыі. Што лепш мець «нармальны» капіталізм, але акурат у якасьці крытычнага аб'екта, ачышчанага ад больш архаічных вясковых напластаваньняў. Трэба аналізаваць незьлічоныя эфэкты глыбіннай лёгікі таварнага фэтышызму, ад якой у часы глябальнага кансьюмэрызму і «багатыя таксама плачуць». І каб зрабіць гэта хаця б крыху эфэктыўна, даводзіцца шукаць спосабы быць «папулярнымі» і па-за ўнівэрсытэцкімі аўдыторыямі, быць бачнымі ў публічнай сфэры. Баюся, у нас мала шанцаў пазьбегнуць спробаў быць «моднымі», «прадавальнымі», згуляць на полі мас-мэдыяў, каб не ператварыцца ў купку дашчэнту маргіналізаваных дзівакоў, цікавых толькі самім сабе.

Алена Гапава:

Я хачу падхапіць вось тое, што кажа Андрэй, і потым дадаць свае нейкія асабістыя рэчы. Безумоўна, вось тут існуе інтэлектуальны рынак як пэўнай краіны, так постсавецкая прастора, цэнтральная Эўропа і глябальны рынак. І, канечне, інтэлектуалы вырабляюць прадукт, які яны прадаюць на тых рынках, на якіх могуць. Вось нейкі прадукт можна прадаць празь беларускую мову, нават ня столькі тым, хто яго чытае, колькі пазыцыянаваць сябе людзямі, якія прадстаўляюць вось гэты новы беларускі дыскурс постмадэрнісцкі, то бок маніфэставаць сябе праз мову. Нейкі прадукт можна прадаць на расейскі рынак, але з расейскай мовай прыходзячы на расейскі рынак, ты ўсё адно вось гэты самы вясковы сваяк, які ніколі ня ўмее правільна нож класьці. І нават калі мы не прагаворваем гэтыя рэчы, мы насамрэч іх вельмі добра ведаем, ну калі мы сумленныя самі з сабою, калі ў нас ёсьць пэўны ўзровень асэнсаваньня, рэфлексіі сябе і навакольнай прасторы. І ўвогуле, тое, што мы цяпер абмяркоўваем, вось як мы насамрэч можам прадаць гэты праект пад назвай «Беларусь». Акурат таму мы цяпер разам, што стала зразумела, што аніякія іншыя прадукты з гэтай прасторы так вось прадаваць нельга, можна напэўна гэты вось прадукт. Магчымыя нейкія выключэньні, відавочна...

Але я хацела б адказаць Ігару на простыя выпады, «вы вось, вы, вы прыніжаеце, насьміхаецеся і г. д.»). Калі я пісала гэты тэкст у «Топос», я пісала яго ня тут, і мне здавалася немагчымым сказаць нейкія рэчы, будучы звонку. Я вырашыла, што я напішу пра клясу і нацыю, і што інтэлектуалы выражаюць інтарэсы нейкай клясы і далей нічога казаць ня буду. Я не магу сказаць людзям, якія тут і якія, можа быць, у небясьпецы, у вельмі складанай сытуацыі, што вось гэта гульня інтарэсаў, гульня элітаў, рэсурсы і гэтак далей – усё гэта проста мне здавалася немагчымым. У той жа час, жывучы на двух кантынэнтах, я ўвесь час чакала, калі настане той момант, калі за тое, што я жыву ня тут, мне пачнуць даваць па мордзе. Сёньня гэты вось дзень настаў, калі мне далі за тое, што я жыву ня тут. Акурат за гэта, ні за што іншае. І цяпер вось той другі тэкст, які быў дзесьці знутры, але які не напісаўся, таму што было

немагчыма, нельга нейкія рэчы сказаць да канца – дык вось цяпер я, напэўна, яго напішу. Не пра тое, што інтэлектуалы купленыя, а што яны ўцягнутыя ў працэс, якога яны ня могуць пазьбегнуць...

Ігар Бабкоў:

Я думаю, што на гэтай вельмі аптымістычнай ноце можна скончыць нашу дыскусію.

Менск, 12 ліпеня 2005

Ад рэдакцыі: прамовы ўсіх удзельнікаў круглага стала, за выняткам Валера Булгакава і Андрэя Казакевіча, перакладзеныя з расейскай мовы.

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2006/02/25**
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]

[image]

*[image]*2005

"ад Зтыкату"

аналітыка • крытыка • палеміка • **гісторыя** • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Псіхалогія здрады: беларускі нацыянальны рух вачыма канфідэнта II аддзела польскага Генеральнага штаба

…Цаніць і шанаваць Вас будуць не за словы, а за зробленую працу, каторая адна ніколі не прападзе, калі з яе пачнуць людзі карыстаць…

Р. Зямкевіч

«Нашыя веды паглыбляюць наш смутак». Шмат хто з даследчыкаў беларускаганацыянальнага руху падпісаўся б пад гэтымі крылатымі словамі, выходзячы пасля дзённых разбораў папяровых завалаў на прыступкі архіваў у Менску, Варшаве, Вільні, Кіеве, Маскве, Нью-Ёрку ці Бог ведае ў якім яшчэ кутку свету. Жыццёвыя пакуты папярэднікаў, якія адкрываюць нам прашытыя, пранумараваныя і пажаўцелыя лісты ў архіўнай тэчцы, не даюць супакою. Часам нават ужо па-за сценамі

архіўных сховішчаў гісторыкаў перасследуюць разбуджаныя імі ж самімі вобразы мінулага, увасабляючыся ў постацях і падзеях сённяшняга дня. Пры гэтым чым больш чалавечых, жывых рысаў набываюць гістарычныя постаці, тым больш відавочнымі робяцца іхныя слабасці, тым больш выяўляецца фактаў ды факцікаў, якія не вельмі пасуюць да сфармаваных вобразаў. Пры гэтым дыяпазон «грахоў» можа быць вельмі разнастайны. Гэтая «брудная бялізна», што на мове паліттэхнолагаў называецца «кампраматам», некага з гісторыкаў спакушае сваёю сенсацыйнасцю ці нават камерцыйнасцю – бо прадаецца, а іншага прымушае схаваць яе ды забыцца ў імя вышэйшых інтарэсаў. Мы ж перакананыя, што існуе яшчэ адзін шлях – стрыманая, узважаная інтэрпрэтацыя мінулага, дзеля таго, каб паспрабаваць усё ж зразумець тую складаную з'яву, якой быў і ёсць беларускі нацыянальны рух. Шыла ж у мяху ў любым разе ўтаіць цяжка, калі наагул магчыма.

[image] Імя Рамуальда Зямкевіча часта сустракаецца на старонках беларускіх энцыклапедыяў і даведнікаў як імя аднаго з энтузіястаў і піянераў беларускага культурнага адраджэння першай паловы XX ст. Бібліяфіл, бібліёграф, публіцыст, гісторык беларускай літаратуры, краязнаўца, перакладчык – ён зрабіў даволі шмат дзеля папулярызацыі ідэі беларускасці і фармавання падстаў для развіцця беларускай культуры. Паводле прафесіі Р. Зямкевіч – інжынер-механік, нарадзіўся 7 лютага 1881 года ў Варшаве ў сям'і ўраджэнца Случчыны. Вучыўся ў Кіеве і Пецярбурзе, аднак большую частку свайго жыцця правёў у Варшаве. У 1920-я гады займаў кіраўнічую пасаду ў польскай Вышэйшай кантрольнай палаце. Рабіў частыя экспедыцыі з мэтай збірання калекцыйных матэрыялаў, у выніку чаго сабраў унікальную бібліятэку беларускіх выданняў. У ягонай жонкі, Л. Дунін-Баркоўскай, захоўваўся архіў Беларускай сацыялістычнай грамады. Быў сябрам шматлікіх беларускіх асветніцкіх арганізацый. Адзін з выкладчыкаў першых беларускіх настаўніцкіх курсаў у Менску ў канцы 1918 года. Пачынаючы з 1909 года друкаваў літаратуразнаўчыя артыкулы ў «Нашай Ніве», у тым ліку апублікаваў невядомыя рукапісы М. Багдановіча, К. Каганца, Я. Лучыны. Аўтар навуковых працаў «Адам Ганоры Кіркор (біяграфічна-бібліяграфічны нарыс у 25-летнюю гадавіну

смерці)» і «Ян Баршчэўскі, першы беларускі пісьменнік XIX сталецця» (абедзве выйшлі ў 1911 годзе асобнымі брашурамі). Друкаваў тэксты на асветніцкія тэмы ў газетах «Вольная Беларусь», «Беларуская думка», «Беларусь», «Новае жыццё», часопісах «Родныя гоні», «Калоссе», зборніку «Заходняя Беларусь». У 1942–1943 гадах выступаў з сатырычнымі вершамі на старонках беластоцкай газеты «Новая дарога». У пачатку 1920-х гадоў працаваў над кнігай па гісторыі «Зялёнага дуба» (паводле Н. І. Стужынскай, Р. Зямкевіч і сам быў сябрам гэтай арганізацыі) і арміі генерала с. Булак-Балаховіча. Адзначыўся Р. Зямкевіч і як палітычны дзеяч – у 1917 годзе ён удзельнічаў у з'ездзе беларускіх нацыянальных арганізацыяў і І Усебеларускім з'ездзе ў Менску. Ужо ў міжваеннай Польшчы імя Р. Зямкевіча прагучала падчас «працэсу 45-ці» ў Беластоку ў 1923 годзе, калі ён выступаў у якасці сведкі абароны на баку беларускага пасла с. Якавюка, які абвінавачваўся ў антыдзяржаўнай дзейнасці. Цяпер, пасля азнаямлення з некаторымі матэрыяламі польскіх архіваў, зусім упэўнена можна сцвярджаць, што акрамя ўсяго гэтага Рамуальд Зямкевіч быў яшчэ і агентам II аддзела Генеральнага штаба Польскага войска – сумна славутай дэфензівы.

Нельга сказаць, што адшуканыя дакументы сталі чымсьці зусім нечаканым. Чуткі аб сувязях Р. Зямкевіча з II аддзелам мелі даволі глыбокія карані, аднак раней гэта можна было ў пэўнай ступені звязаць з ягоным рэнамэ «паланафіла», якое ў вачах сучаснікаў амаль атаясамлялася з працай канфідэнта – платнага інфарматара польскіх спецслужбаў. Пададзеныя ніжэй у перакладзе з польскай мовы ўласнаручныя рапарты Р. Зямкевіча, рукапісы якіх захоўваюцца ў фондзе II аддзела Генеральнага штабу Польскага войска Цэнтральнага вайсковага архіва ў Рэмбертаве, бясспрэчна сведчаць пра ягоную працу ў якасці агента дэфензівы прынамсі на працягу 1922–1925 гадоў. Вельмі верагодна, што гэтае супрацоўніцтва працягвалася і надалей. Большасць рапартаў звычайна падпісваліся ім уласным прозвішчам, некаторыя – псеўданімамі Шэршань і Дземяновіч.

Цяжка высветліць дакладна, калі Р. Зямкевіч быў завербаваны дэфензівай. Першы з вядомых нам рапартаў адносіцца да 24

лістапада 1922 года, аднак з ягонага зместу складаецца ўражанне, што сапраўды першым ён не быў. Затое вядома, што яшчэ ў 1919–1920 гадах, жывучы ў Менску і Горадні, Р. Зямкевіч меў кантакты з Польскай вайсковай арганізацыяй і Стражай крэсовай. Падчас парламенцкіх выбараў у 1922 годзе ён браў актыўны ўдзел у выбарчай кампаніі паланафільскага Аб'яднання беларускіх беспартыйных актывістаў і «Зялёнага дуба» і супрацоўнічаў з таксама паланафільскім Беларускім нацыянальным камітэтам у Варшаве, што, дарэчы, вельмі перашкаджала яму пазней як палітычнаму канфідэнту дэфензівы, бо падрывала давер з боку беларускіх дзеячаў. Напрыклад, Іван Цвікевіч у сваім лісце да Вацлава Ластоўскага ў студзені 1923 года пісаў: «Што да Зенкевіча (так у дакуменце. – **А. Ч., А. П.**), то з яго пісем чуецца штось склізкае […]. Звязь з ім парываць не трэба, бо праз яго магчыма дастаць патрэбныя дакументы і матэрыялы. […] Барані Божа толькі авансавацца перад ім! Ніякіх абяцанак, ніякіх асобых праў на выступленні перад грамадзянствам»[1].

Самі рапарты Зямкевіча, безумоўна, з'яўляюцца важнай крыніцай у гісторыі беларускага нацыянальнага руху ў Польшчы ў 1-й палове 1920-х гг. Аднак азнаямленне з імі адразу ж выклікае і многія пытанні. Першае з іх: чаму заслужаны нацыянальны дзеяч, як Рамуальд Зямкевіч, пайшоў на супрацоўніцтва з польскай выведкай у якасці платнога інфарматара? Цікавасць выклікаюць і іншыя, не менш важныя пытанні. Напрыклад, ці ўсё тое, што Р. Зямкевіч апісваў у сваіх справаздачах, адпавядала рэчаіснасці, ці нешта было плёнам фантазіі аўтара? Што магло быць апушчана з падрабязным пераказе сустрэч і размоў? Нарэшце, ці не самым істотным з'яўляецца тое, наколькі паўплывалі некалькі спісаных канфідэнтам аркушаў на лёс тых людзей, чые імёны туды патрапілі? Ды і наагул, у чым глыбінны, а не толькі знешні сэнс нацыянальнай здрады?

Спрабуючы адказаць на пытанне пра прычыны супрацоўніцтва Р. Зямкевіча з польскай дэфензівай, можна адразу вылучыць магчымыя версіі адказу: 1) дзеля грошай; 2) дзеля кар'еры; 3) праз крыўду на сваіх былых сяброў, якія недастаткова ацанілі яго здольнасці (з некаторымі мела месца адкрытае звядзенне

[1] Архівы Беларускай Народнай Рэспублікі. Т. 1, кн. 2. Вільня – Менск – Прага, 1998. С. 373.

рахункаў); 4) Зямкевіч быў тыповым *homo ludinas*, г. зн. «стуканне» на калегаў было для яго свайго кшталту гульнёй, і ён не бачыў нічога амаральнага ў такім учынку, а можа, нават рабіў сваю справу ў імя нейкіх ідэалаў. Кожная з версіяў мае права на існаванне і можа знайсці пэўнае пацверджанне вядомымі фактамі.

Наагул, пісанне даносаў звычайна бывае даволі прыбытковай формай літаратурнай дзейнасці, хаця ў нашым выпадку мы і не ведаем дакладных сумаў грошай, якія атрымліваў агент (а што ён іх атрымліваў – бясспрэчна). Аднак жа, мяркуючы па самім змесце рапартаў, праца канфідэнта забяспечвала толькі часовы заробак і не заўсёды была ў стане пакрыць выдаткі на здабыванне інфармацыі. У справаздачы за студзень 1923 года, на самым пачатку сваёй «кар'еры», Р. Зямкевіч наўпрост скардзіцца на тое, што выдаткі на выведку занадта адчувальныя для ягонай кішэні, і просіць грошай – або ў выглядзе платы за інфармацыю, або як нейкую матэрыяльную дапамогу. Скаргі такога характару паўтараюцца ў многіх рапартах. Зямкевіч асабліва падкрэслівае, што грошы патрэбны яму на тое, каб «можна было глыбей і дакладней вывучыць працу і махінацыі Менска на тэрыторыі Польшчы» і што візіты ў цукерні, рэстараны і г. д., дзе «лягчэй і зручней пацягнуць за язык», патрабуюць шмат выдаткаў, так што «ў Варшаву заўсёды вяртаюся без грошай».

Выглядае, што фінансавы бок супрацоўніцтва зусім не задавальняў Р. Зямкевіча, таму, магчыма, і не быў галоўнай прычынай паспяховай вярбоўкі. Аднак не менш верагоднай, чым наяўныя грошы з рук афіцэра Генеральнага штаба, выглядае магчымасць для інжынера Зямкевіча ўладкавацца на добрую працу ў Варшаве, у чым дапамога дэфензівы магла выявіцца вельмі значнай. Калі на пачатку 1923 года агент Р. Зямкевіч характарызаваў сваё становішча як «сяджу без пасады», то ўжо праз кароткі час ён выступае ў якасці дзяржаўнага чыноўніка, прычым з добрымі перспектывамі росту. «Жыву ціха і скромна, – чытаем мы ў лісце Зямкевіча ў Коўна да Вацлава Ластоўскага за красавік 1924 года. – Працую ў інстытуцыі Najwyższa Izba Kontroli Państwa ў інжынерным аддзеле чыгунак. Зарабляю ў месяц 540 мільёнаў марак, якія

ледзь хапаюць на жыццё. А маю на сваім утрыманні: дачку, сястру і двое яе дзетак»[2]. Праз год у лісце да таго ж Ластоўскага ён ужо быў не такі песімістычны: «Я, паршывы чыноўнік, зарабляю ў месяц 360 злотых і жыву сабе нішто, купляю кніжкі, рукапісы, памяткі старасвеччыны». Даволі цікавым і невыпадковым падаецца той факт, што новая пасада, атрыманая хутка пасля з'яўлення першых справаздач, дазваляла Р. Зямкевічу, які жыў у Варшаве, па-за межамі асноўнага, віленскага беларускага асяродка ў Польшчы, даволі часта наведваць «Усходнія крэсы» ў службовых мэтах. «Як працаўнік «чыгуначнага аддзелу» маю бясплатны білет I клясы на ўсе польскія чыгункі», – хваліўся Зямкевіч Ластоўскаму.

Аднак не менш важнай за матэрыяльныя выгоды магла быць і псіхалагічная матывацыя супрацоўніцтва Р. Зямкевіча з дэфензіваю, у першую чаргу яго высокая самаацэнка і цесна звязанае з гэтым пачуццё недаацэненасці іншымі. Канец 1922 года, якім датуюцца першыя вядомыя нам рапарты Зямкевіча – час, калі беларускі рух у міжваеннай Польшчы дасягнуў піку ўласнага развіцця ў сэнсе палітычнай легітымнасці. Послех на парламенцкіх выбарах даў беларусам не толькі найбольш шматлікае прадстаўніцтва ў вышэйшых органах улады польскай дзяржавы за ўвесь міжваенны перыяд (11 беларускай паслоў і 3 сенатары), але яшчэ і стварыў сітуацыю, калі «беларускасць» пачала прыносіць пэўныя грамадскія дывідэнды ў выглядзе дэпутацкіх мандатаў. Чалавеку, які стаяў ля вытокаў самой нацыянальнай ідэі, здавалася несправядлівым тое, што плёнам яго шматгадовай працы павінны быць скарыстацца людзі, на яго думку, далёкія ад беларускай справы і нават варожыя ёй, няздатныя да годнага прадстаўніцтва беларускай меншасці ў Польшчы. Паказальным у гэтым сэнсе выглядае сведчанне Зямкевіча, што нібыта ўжо ў сакавіку 1923 года беларускія дзеячы, «незадаволеныя выбарам такіх паслоў, кажуць, што мяне пакрыўдзілі, не выставіўшы маёй кандыдатуры, бо, ведаючы так добра варшаўскія адносіны і польскую мову, я мог бы прынесці іхнай справе вялікую карысць». Калі пры гэтым згадаць характарыстыкі саміх беларускіх паслоў аўтарства Р. Зямкевіча, пададзеныя ім у II аддзел[3], то адчуванне глыбокай пакрыўджанасці з яго боку толькі паглыбляецца. Дарэчы, тое самае можна сказаць і

[2] Тут і далей часты Р. Зямкевіча да Ластоўскага цытуюцца паводле выдання: Архівы беларускай народнай рэспублікі Т. 1. Кн. 2. Вільня–Мінск–Нью-Ёрк–Прага, 1998.

адносна іншых кірункаў дзейнасці гэтага чалавека. Калекцыянерства, літаратурная і грамадская праца, дзейнасць у якасці канфідэнта – паўсюль мы знаходзім праявы крыўды за недастатковае прызнанне ягоных заслуг з боку грамадства. У пэўны момант унутраная злосць Р. Зямкевіча выходзіла па-за «нацыянальныя» межы, калі ён, напрыклад, выказваў прапанову аб пераводзе на іншае месца працы свайго непасрэднага кіраўніка, дырэктара Віленскай чыгункі Ландсберга, ці крытыкаваў мясцовых афіцэраў II аддзела.

Асабістая крыўда і непрыхільнае стаўленне да пэўных дзеячаў знайшлі адлюстраванне і ў падаванай Зямкевічам урапартзе інфармацыі. Так, у рапартах, прысвечаных характарыстыцы беларускіх сеймавых паслоў В. Рагулі і с. Барана, мы сустракаем згадку пра тое, што пры разгоне I Усебеларускага з’езду «ўдар у шыю ад Рагулі атрымаў інжынер Р. Зямкевіч», пасол с. Баран «інжынера Зямкевіча пастаянна перасьледаваў і высмейваў за ягонае паланафільства». Пісанне пра сябе ў трэцяй асобе, якое, верагодна, мела на мэце надаць тэксту большай аб’ектыўнасці, у дадзеным выпадку дае хутчэй адваротны вынік. Няшчыра гучыць і «спачуванне» Р. Зямкевіча Л. Дубейкаўскаму ў рапарце ад 25 мая 1923 года ў сувязі з прызнаннем апошняга ў вачах грамадскай думкі агентам дэфензівы, бо ў лісце да В. Ластоўскага ад 27 снежня 1922 года той жа Зямкевіч сведчыў, што «з Дубейкаўскім я на нажах, бо ён на службе ў дэфензівы, што мне ўдалося раскрыць і даказаць». Трэба адзначыць, што Дубейкаўскі ў свой час высоўваў аналагічныя абвінавачванні супраць Р. Зямкевіча (і апошні пра гэта ведаў), аднак быў менш пераканаўчы.

Асаблівай увагі заслугоўваюць адносіны Рамуальда Зямкевіча з Антонам Луцкевічам і Аркадзем Смолічам. Луцкевіч як у рапартах, так і ў лістах Зямкевіча да Ластоўскага паўстае ў непрывабным святле: ён і «гад Антон», і важны «архібонза», і «кепскі наслядоўнік свайго брата ў галіне калекцыянерства», і «вельмі грозны, небяспечны і непрадказальны палітычны шкоднік». Вядома, трэба ўлічваць асобу адрасата Зямкевіча: Луцкевіч з Ластоўскім былі даўнімі зацятымі ворагамі. Аднак, на думку У. Ляхоўскага, яшчэ адной прычынай падобнай непрыязі магло стаць тое, што ў свой час Зямкевіч абвінавачваў братоў Луцкевічаў, у першую чаргу Івана, у прысвойванні

часткі ягонай калекцыі, што адбывалася пры недастаткова высветленых абставінах. У той жа самы час рапарты сведчаць, што стаўленне самога А. Луцкевіча да Р. Зямкевіча ў пачатку 1920-х гадоў было больш чым прыхільнае, і толькі дзякуючы яго падтрымцы кар'ера Зямкевіча ў якасці канфідэнта польскіх спецслужбаў доўжылася так доўга. Можна толькі здагадвацца пра прычыны, з якіх былы старшыня ўрада БНР узяў пад сваё заступніцтва такога чалавека, як Р. Зямкевіч. Пазней Луцкевіч, хутчэй за ўсё, змяніў сваё стаўленне да яго, ці то даведаўшыся пра працу на II аддзел, ці то з нейкіх невядомых нам асабістых прычын. Ва ўсялякім разе, калі ў пачатку 1930-х гадоў у Вільню прыйшла вестка з Варшавы, што Р. Зямкевіча затрымалі пры спробе скрасці з архіва нейкі каштоўны дакумент, «Беларускі звон» А. Луцкевіча неадкладна надрукаваў гэтую інфармацыю на сваіх старонках.

[image] У выпадку ж з А. Смолічам гаворка ўжо наагул ідзе пра непрыхаваную нянавісць Зямкевіча да апошняга, прытым моцную да такой ступені, што Зямкевіч нават абвінавачвае яго перад прыбылым у Вільню савецкім агентам у сувязях з II аддзелам польскага Генеральнага штаба. Магчымыя наступствы падобнага абвінавачвання для А. Смоліча, які ўжо знаходзіўся на той час у Менску, маглі быць нават трагічныя, аднак Р. Зямкевіча гэта не стрымала. Асабістая варожасць двух дзеячаў беларускага руху мела глыбокія карані, пра што сведчыць прыведзеная ніжэй вынятка з «Пратэсту інжынера Рамуальда Зямкевіча ў Народны сакратарыят БНР» ад 15 чэрвеня 1918 года. Гэты дакумент, адшуканы і ласкава прадастаўлены аўтарам сп. Уладзімірам Ляхоўскім, заслугоўвае амаль даслоўнага цытавання, бо сярод іншага добра паказвае эмацыйны ўзровень успрыняцця Зямкевічам крыўды з боку сваіх апанентаў:

Маю гонар давясці да Вашага ведама, – пісаў Зямкевіч, – *што я катэгарычна пратэстую проціў самадзяржаўных і самазваных паступкаў і кіравання ў так называемага Сакратара Беларускае Народнае Прасветы А. Смоліча – Беларускага Міністра Прасветы. Было надрукована ў газетах і з апавяданняў вядома, што* пампадурны А. Смоліч (вылучана намі. – **А. Ч., А. П.**)

паручыў пералажыць з расейскае мовы на беларускую школьныя кніжкі: арыфметыку, алгебру ды геаметрыю. Уважаючы, што ёсць у нас арыгінальныя педагагічныя сілы, каторыя трэба было б выкарыстаць і звярнуць нарэшце на шлях праўдзівай, культурнай, беларусам карыснай працы, мушу вельмі энергічна пратэставаць проціў гэткага самазванства, самадзяржаўя дамаслых нашых недавучак-бясштаннікаў. […] Мая крытыка і пратэст звернены проціў А. Смоліча, каторага я не шаную, а дзеля таго ніколі не прызнаваў, не прызнаю і не прызнаю за Сакратара прасветы і за грамадзянскага дзеяча. Для мяне і многіх ён грамадзянскі шкоднік, які аж з 1916 года разбіваў усе культурныя пачынанні: досыць успомніць Нацыянальны Камітэт, літаратурна-выдавецкую секцыю, каторая, дзякуючы яго інтрыгам, нічога не зрабіла, грошы (40 тысяч) былі прасвістаны і адзінай памяткай гэтай секцыі служыць толькі цяпер выдадзеная «Дзіцячая Чытанка» – твор не педагагічны, бяздарны, скандальны, які мог быць выдадзены толькі недавучкаю. Праца А. Смоліча як сацыяліста таксама ярка выказывае яго поўную, безнадзейную тупасць і бяздарнасць. Заслугі яго для беларускага сацыялізму абсалютна ніякія: што выдадзена арыгінальнага, што добрага пераложана з чужых моў? Нічога. У яго прафесійнай пісаніне адно дзяцінае мямленне ды воміты людскіх паняццяў. Мнагаслоўнае браханне – гэта яшчэ не права на розум. І вось гэткая знамянітасць – міністр, каторы будзе навучаць нас, цёмных. Праўдзівы рассаднік глупства і цемры. А шанаваць яго не можна яшчэ за тое, што ён, злодзей, у 1916 гаду абакраў мяне з кніжак і з музеальных рэчаў. І не рабіце яму закіду, што ён злодзей, ён гэта схавае ў кішэню, можаце яму плюнуць у вочы, а ён скажа, што гэта дожджык. І гэта факт, а не выдумка або злосць. Тры гады называю яго злодзеем, а ён і не думае апраўдывацца, бо ведае, што гэта немажліва і што пасля скандала прыйшлося б адказацца ад платнага мейсца. Вось дзеля чаго я і гляджу на яго з пагардай і праходжу міма з агідаю, як ад гада. І не мне ён крыўду зрабіў, а цэламу грамадзянству, бо я не для сябе збіраю і мучаюся, адказваючы сабе ва ўсім, да чаго я звык, абы толькі здабыць нешта для агульнай карысці і славы БЕЛАРУСІ. Я не лезу як кар'ерыста на першыя добра платныя мейсцы, як гэта робяць нейкія ідэйныя бясштаннікі, і не працую для Беларусі дзеля грошы. Вось гэта і дае мне права на крытыку. Канчаючы, заяўляю, што калі праца над школьнымі кніжкамі

будзе дадзена ў спецыяльныя рукі – сам вазьмуся за працу, за свае цяжка запрацаваныя грошы выдам кніжкі, а ў перадмовах немажліва скампраметую нашых дамаслых бясштаннікаў. Кампраметаваць беларускую інтэлігенцыю (праўдзівую, не хварбаваную) не пазволю, бо я БЕЛАРУС, а не кацап-выродак[4].

Як бачым, першапрычынай нянавісці Р. Зямкевіча да А. Смоліча, як і ў выпадку з братамі Луцкевічамі, стала абвінавачванне ў крадзяжы ягоных збораў. Мяркуючы з усяго, збіральніцтва было для Зямкевіча нечым значна большым, чым толькі назапашваннем старых рэчаў. Гэта была спроба збудаваць свой уласны сусвет, і кожны, хто рэальна ці ўяўна пагражаў яму, адразу залічваўся да ліку смяротных ворагаў. «Зямкевіча ведалі ўсе, як зацятага беларуса і збіральніка ўсяго беларускага, а перадусім кніжак пра Беларусь, – прыгадваў пазней у сваіх успамінах вядомы дзеяч Сяргей Сіняк-Хмара. – Калі ён пачуе, што недзе ёсць нешта такое, кідаў усё і ехаў нават у якую-небудзь глухую вёску, каб выпрасіць у абшарніка ці шляхеткі нейкі беларускі старадрук. Калі не ўдавалася, дык Зямкевіч пры нагодзе мог яго і ўкрасці. […] Гэта была ягоная хвароба»[5]. Сам Зямкевіч у красавіку 1925 года пісаў да В. Ластоўскага:

Каб забыцца і залячыць балючыя раны, я займаюся гісторыяй, літаратурай і працамі навукова-археалагічнымі. Я, як «вар'ят беларус», спатыкаюся, як і даўней, з недаверам, усмешкамі, бо я ж «вар'ят», які ўсё пастаянна гаворыць аб культуры, аб прыгажосці, аб ідэйнасці – рэчах зусім непатрэбных і некарысных, бо не даюць грошай. Гэта ўсё і маё праклятце, і адначасна маё сонца і радасць, і пах кветак для набалеўшае душы. Іншае мэты ў маім жыцці працы я ўжо аддацца не магу, у маіх летах гэта немагчыма. Перамена ідэі – гэта была б для мяне смерць, бо зрабіла б і ў плане будучага да работы – не было б сілы ў мяне кінуць, знішчожыць.

[image]

Аб тым, што Р. Зямкевіч быў у прынцыпе здольны да жорсткіх крокаў накшталт інтрыгі супраць А. Смоліча, сведчыць таксама выпадак з Зоськай Верас, які адбыўся прыкладна тады, калі

4 Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). Ф. 325. Воп. 1. Спр. 21. Арк. 215–217.

5 Хмара С. Партызанскімі сцежкамі // Слонімскі край. 2000. № 1. С. 39.

пісаўся і «Пратэст» – у сярэдзіне 1918 года. «Я мела выходзіць замуж за Ф. Шантыра, – згадвала Людвіка Сівіцкая (Зоська Верас) праз амаль пяцьдзесят гадоў. – Ён прасіў згоды маёй мамы, быў у ксяндза Гадлеўскага, каб даведацца, якія патрэбны дакументы і г. д. Але тут умяшаўся Р. Зямкевіч. Паехаў спецыяльна ў Бабруйск і нагаварыў, што я вяду сябе немаральна, маю каханкаў»[6]. У якой ступені гэты крок быў выкліканы жаданнем Р. Зямкевіча абараніць тыя прынцыпы і ідэалы, якія ён сам для сябе вызначаў як найбольш істотныя, а ў якой – унутранай жорсткасцю і інтрыганствам, адказаць даволі цяжка. Аднак у кантэксце сказанага вышэй важна адзначыць ягоную безумоўную схільнасць да выкарыстання прасталінейных і не заўсёды маральных, затое вельмі эфектыўных метадаў дзеля дасягнення ўласных мэтаў.

У ідэалагічных спрэчках са сваімі апанентамі Зямкевіч зрэдзь асабліва стараўся выбіраць выразы. Гэтая рыса характару Р. Зямкевіча, якую ён сам не без пэўнага самазачаравання назваў «ядавітым языком», выразна праяўляецца, прынамсі, у артыкуле, змешчаным у часопісе «Калоссе» за 1939 год, і датычыў пытання «беларускасці» Івана Саланевіча. «*Вернуйся*, – ацэньваў Р. Зямкевіч вядомага «западнорусса» і аўтара «России в концлагере», – гэты выдрадак не прачытаў аніводнага верша Купалы і не мае мінімальнага паняцця аб сучасным беларускім адраджэнскім руху. […] Наагул, выдрадкаў маем нямала, стагоддзі нацыянальнага заняпаду даюцца ў знакі, тым не менш такіх тыпаў, як Саланевіч, афішуючыхся стопрацэнтавай беларускасцю, трэба біць, прынамсі, па брудных лапах. Няхай не думаюць, што калі яны знаходзяцца далёка ад беларускіх цэнтраў, дык маюць магчымасць бяскарна ізрыгаць свае істінно-русскія блявоціны на беларускі народ»[7]. Нацыяналістычная рыторыка, тым больш такога ультрабуржанскі патрыятычнага характару, у вуснах канфідэнта дэфензівы гучыць настолькі натуральна, што вызначыцца з тым, якая ў самай справе былі ягоныя ідэйныя прынцыпы і ці быў ён наагул, даволі складана. Нават сам факт існавання Іванартаў – яшчэ не канчатковы доказ няшчырасці іх аўтара адносна ўласнай беларускасці, хаця і з'яўляецца сур'ёзным аргументам на карысць дадзенага сцверджання. Аднак жа пры ўважлівым аналізе зместу рапартаў заўважаецца, што Р. Зямкевіч

[6] Сцэль У. Фабіянін Фабіяна // Наша Ніва. 2005. № 18.

[7] Ружанскі А. [Р. Зямкевіч]. Іван Саланевіч // Скарыніяна. Нягаравыя-ваковы

відавочныя антыпатыі да многіх беларускіх палітыкаў, ён не менш, настойваў на правядзенні больш гнуткай дзяржаўнай палітыкі ў дачыненні да беларускага насельніцтва ўсходняй, у тым ліку і ў сферы нацыянальнай адукацыі. Пры гэтым ніводнага разу ў рапартах не ставіцца пад сумненне само існаванне беларускага народу. Наадварот, Зямкевіч сцвярджае, што «польскія дзеячы не ведаюць патэнцыйнай сілы і характару беларуса», а «характар беларуса… ніколі не дазволіць яму забыцца, што ён меў больш за 300 школаў, якія падабаліся дзецям і яму, бо былі на роднай мове».

Магчыма, што паралельнае існаванне Зямкевіча – «варшаўскага беларуса» і Зямкевіча-паляка (менавіта ад імя апошняга пішуцца ўсё рапарты) – гэта элемент своеасаблівай гульні з самім сабою, са сваім асяроддзем і нават з дзяржаваю, гульні, якая дапамагае ўціснуць свой унутраны сусвет у пракрустава ложа рэчаіснасці і дасягнуць больш-менш гарманічнага паміж імі суіснавання. Ужо тое, як часта Р. Зямкевіч перакладае абвінавачванні ў сувязях з II аддзелам на плечы іншых людзей, нібы перакідваючы на іх адначасова ўсю, у тым ліку і маральную, адказнасць, выдае характар гэтай гульні. На нашу думку, было б занадта спрошчаным лічыць, што мы маем справу ўсяго толькі з амаральным чалавекам. Прыклад Рамуальда Зямкевіча – проста адзін са скрайніх выпадкаў нацыянальнай раздвоенасці ва ўмовах знешняга ўціску, што, безумоўна, зусім не выключае ўплыву на сітуацыю і асабістых, не зусім пазітыўных чалавечых якасцяў.

З улікам гэтага вельмі асцярожна трэба ставіцца да самога зместу рапартаў, што, дарэчы, рабілі і «працадаўцы» Зямкевіча. Так, на старонках справаздачы ад 26 сакавіка 1923 года мы знаходзім заўвагу алоўкам, зробленую афіцэрам Галоўнага штаба: «Канфідэнт дрэнна інфармаваны. Ягоная роля ўжо заканчваецца». Невыпадкова, адчуваючы недавер да сваёй асобы, Р. Зямкевіч у адным з рапартаў падкрэслівае, што «ўсё, што я пішу і падаю, грунтую на фактах, а не на фантазіі. Кожная мая інфармацыя павінна знаходзіць пацверджанне з іншага боку, бо я аперую толькі праўдай». Акрамя таго, ён патрабуе «большага даверу да мяне, якога ніколі не падвяду, і больш інфармацыі, якая мне можа дапамагчы падчас выведкі».

У сувязі з гэтым варта прывесці яшчэ адзін цікавы момант. Ва ўспамінах с. Сіняка-Хмары ёсць наступны эпізод, які паводле зместу магчыма аднесці да сярэдзіны 1923 года – якраз таго перыяду, што найбольш падрабязна прадстаўлены ў справаздачах: «У Варшаве я павінен быў адшукаць Рамуля Зямкевіча і прасіць яго, каб ён звёў мяне з адным з паслоў-беларусаў польскага Сейму. Пры гэтым не гаварыць Зямкевічу, па якой справе. […] За Зямкевічам, чалавекам апалітычным, не сачылі. Я меў прадставіцца і прадставіўся Зямкевічу (знайшоў яго праз адрасны стол), сказаў, што шукаю паслоў па скарзе сялянаў аб сервітуце супраць пана Глябовіча з Рандзілаўшчыны. Зямкевіч звёў мяне з адным з паслоў». Цікавасць гэты фрагмент выклікае тым, што падобныя факты наагул адсутнічаюць у рапартах Р. Зямкевіча за 1923 год, як няма там і ніякай згадкі пра ліставанне апошняга з В. Ластоўскім на працягу 1922–1925 гадоў.

У агульнай тэчцы на агентаў дэфензівы У. Фёдарава, Якаўчука, Цяўлоўскага, Я. Шурпу, Я. Міткевіча, Р. Зямкевіча, Я. Мамоньку, і М. Шымбарэвіча ў фондзе II аддзела Генеральнага штаба польскага войска Цэнтральнага вайсковага архіва ў Рэмбертаве захоўваецца вельмі цікавы рапарт кіраўніка беларускага дэпартамента II аддзела Генеральнага штаба капітана г. Сухэнэка-Сухэцкага ад 20 красавіка 1925 года ў справе паланафільскага т. зв. Беларускага цэнтральнага камітэта:

У беларускіх справах на працягу некалькіх год, – чытаем мы ў ім, *– дзейнічае група людзей, якая ў залежнасці ад палітычнай сітуацыі ў краіне стварае нейкія камітэты, ці федэралісцкія, ці актывісцкія, а ў апошні час стварыла так званы Цэнтральны беларускі камітэт. Гэтая група складаецца выключна з шантажыстаў, якія зарабляюць на жыццё, інфармуючы «органы ўлады» пра беларускія справы. Найважнейшыя ролі ў гэтай групе адыгрываюць: Цяўлоўскі, У. Фёдараў, Я. Шурпа, Міткевіч,* Зямкевіч (тут і далей у цытаце вылучана намі. – **А. Ч., А. П.**). *На фінансавай глебе паміж вышэйназванымі часта ўзнікалі спрэчкі, у выніку якіх адныя абвінавачвалі іншых у антыдзяржаўнай дзейнасці супраць Польшчы або наагул у*

супрацоўніцтве з савецкай місіяй у Варшаве. Некаторыя асобы з дадзенай групы былі на паслугах II аддзела Генеральнага штаба ці Міністэрства ўнутраных спраўў […]. Так як, узначаліўшы беларускі дэпартамент, я пераканаўся, што большасць з іх не даюць каштоўнай інфармацыі або адначасова тую самую інфармацыю «прадаюць» у Міністэрства ўнутраных спраўў, як і ад імя гэтага ж міністэрства праводзяць нейкую беларускую палітыку (Цяўлоўскі ды Зямкевіч), *я перапыніў з імі ўсялякія кантакты. У атрыманых мною матэрыялах я знайшоў шмат недакладнасцяў і пэўныя памылкі*[8].

У сувязі са згаданым супрацьстаяннем паміж самімі канфідэнтамі II аддзела ў гэтай жа тэчцы знаходзіцца ліст Р. Зямкевіча, напісаны пры да канца не вядомых нам асабістых, з якога «канфідэнт Фёдараў» зняў копію для «канфідэнта Цяўлоўскага».

Паночку! – піша Р. Зямкевіч да невядомага нам адрасата, магчыма, да таго ж Фёдарава. – *Тэлефанаваў сёння ў справе білета. Было мне адмоўлена. Бачу нейкую гульню ў жмуркі. На маю шчырасць адказваюць няшчырасцю. Нікуды не хадзіць і не марочыць сабе галаву. Шкада проста часу. Рабіце самі, калі ўважаць будзеце, што з імі можна працаваць! Я ў гэта не веру. Адмаўляюся ад працы і годзе. Пры гэтым далучаю 50 злотых апошнія, якія маю свабоднымі. Рэшту аддам у панядзелак. Пастанова мая няўхільная. З павагаю. Р. З.*

Нявысветленым, аднак, застаецца пытанне, пра адмову далейшага супрацоўніцтва з кім гаворыцца ў лісце, напісаным недзе ў 1924–1925 гадах: з самім II аддзелам ці толькі з чарговай паланафільскай арганізацыяй, накшталт надбечы створанага Беларускага цэнтральнага камітэта.

Нам пакуль мала вядома пра дзейнасць Р. Зямкевіча, пачынаючы ад сярэдзіны 1920-х гадоў. Аднак сярод наяўных фактаў звяртае на сябе ўвагу яго канфлікт у пачатку 1928 года з былым «нашаніўцам», а ў канцы 1920-х гадоў паланафільскім дзеячам Францішкам Умястоўскім, супраць якога Зямкевіч выступіў у сваім звычайным «вострым» стылі на старонках

[8] Цэнтральны ваенны архіў (ЦВА) у Рэмбертаве (Польшча). II аддзел Генеральнага штаба. Спр. 1.303.4.2663. Існуюць таксама звесткі, што, акрамя згаданых асоб, у падобных дзеяннях абвінавачваўся і вядомы беларускі дзеяч Вячаслаў Адамовіч (Дварэцкі) (гл. Пашкевіч А. В.

выдаванай былымі радыкальнымі грамадоўцамі газетай «Думка працы»[9]. Што гэта было – працяг складанай гульні ці чыстая праява ўласнай пакрыўджанасці ды хваравітых амбіцый? Цяжка сказаць. Гэтак жа цяжка пакуль дакладна меркаваць пра глыбіню ўплыву супрацоўніцтва Рамуальда Зямкевіча з аддзелам польскага Генеральнага штаба на развіццё і лёс беларускага руху. Пытанняў у дадзеным выпадку больш, чым на жаль, больш, чым адказаў.

Чарнышэвіч А. Гандлёвая дзейнасць Рамуальда Зямкевіча ў Польшчы // Да гісторыі палітычнага авантурызму ў беларускім нацыянальным руху // Берасцейскі храназраф. Вып. 4. 2004. с. 314–334).

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 9 СНЕЖНЯ 1922 г.

У II аддзел Генеральнага штаба

Рапарт

[9] Саўка Барывой [Рамуальд Зямкевіч]. Воўчы білет самазваннаму рэдактару-выдаўцу «Нашае Долі» – яснавяльможнаму «пану графу» Францішку Умястоўскаму // Думка працы. 1928. № 9. 28 студзеня.

З размовы з беларусам-кааператарам Эдвардам Будзькам, які прыехаў у Варшаву па справах свайго кааператыва, я даведаўся, што Беларускі нацыянальны камітэт згорнуты, а замест яго ўтворана Нацыянальная рада ў Вільні.

[10] Будзько Эдвард (1882–1958) – беларускі грамадскі дзеяч, кааператар.

Ці легалізаваная ўжо гэта Нацыянальная рада, я нічога не ведаю. Калі не, то ёсць магчымасць яе незацвярджання.

Паводле словаў Эдварда Будзькі, Нацыянальная рада створана на ўзор такой самай латвійскай і, падобна на тое, у ёй Лігай нацый.

[11] Шарэйка Павел (1889–1939) – беларускі дзеяч, у 1922–1924 гг. настаўнік Віленскай беларускай гімназіі.

Эдвард Будзька запэўніў мяне, што гэту справу разам з Антонам Луцкевічам праводзіць яго сардэчны сябар палкоўнік Шарэйка, які [11] ажыццяўляе сувязь з кіраўніцтвам Саюза [12] і [13] Красінскі Мікалай (1891–1938) – беларускі дзеяч, у 1922–1924 гг. настаўнік Віленскай беларускай гімназіі.

[12] Саюз – Саюз узброенага змагання з бальшавікамі, створаны ў час паўстання 1920 г.

[13] Красінскі Мікалай (1891–1938) – беларускі дзеяч, у 1922–1924 гг. настаўнік Віленскай беларускай гімназіі.

Да Нацыянальнай рады, акрамя Луцкевіча, належаць Максім

Гарэцкі, Жаўрыд[12] і Красінскі[13].

Паводле майго глыбокага пераканання і ведання адносін, было б нядрэнна пад якой-небудзь зачэпкай выдаліць з межаў Рэспублікі Антона Луцкевіча, бо грамадзянства ён не мае, а з'яўляецца вельмі грозным, небяспечным і непрадказальным палітычным шкоднікам. Выдаленне яго спрасціла б усю справу, якая ўсё больш заблытваецца і ўскладняецца, а з-за макіявелісцкіх інтрыг Луцкевіча з палкоўнікам Шардзіньі можа прывесці да непажаданых ускладненняў з Лігай нацый.

Ва ўсялякім выпадку, больш грунтоўнае даследаванне мэты, сродкаў і метадаў навастворанай беларускай Нацыянальнай рады ў Вільні з'яўляецца проста неабходным, і не толькі ў Варшаве ў паноў паслоў, а непасрэдна на месцы, у Вільні.

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
9 снежня 1922 г.

Цэнтральны вайсковы архіў (ЦВА) у Рэмбертаве (Польшча). II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падтэчка 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 29 СНЕЖНЯ 1922 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

Паводле самых свежых навін з Вільні, якія я атрымаў ад кааператара Эдварда Будзькі, Нацыянальная беларуская рада ўжо выслала вялікую справаздачу палкоўніку Шардзіньі пра выбары, пра перашкоды з боку адміністрацыі дзеля падачы яе ў Лігу нацый і дзеля агітацыі ў прэсе. Фотакартка паслоў і сенатараў павінна быць рэпрадукаваная ў замежных выданнях.

Беларускі пратэст у Лігу нацый сваім вастрыём накіраваны супраць далучэння Віленшчыны, а за мэту пастаўлена імкненне да атрымання шырокай палітычнай аўтаноміі. Як доказы неабходнасці гэтага высоўваюцца факты, што Віленшчына, якая нібыта з'яўляецца карэннай польскай зямлёй, дала сенатара-

беларуса; наагул жа на Крэсах іх няпольскасць была яскрава пацверджаная, нягледзячы на польскую фальшывую статыстыку і этнаграфічныя мапы.

5–6 студзеня ў Вільні павінен патаемна адбыцца з’езд беларускіх дзеячаў, запрошаных для абмеркавання палітычных справаў.

Паводле звестак, якія мне пад сакрэтам паведаміў той самы Будзька, робяцца энергічныя захады, каб памірыць Ластоўскага з Луцкевічам, а яны – смяротныя ворагі, і дагэтуль адзін пра аднаго і слухаць не хацелі. Ад гэтай згоды і згуртавання любой цаной усіх разумных і свядомых беларускіх сілаў залежыць выдзяленне 5 мільярдаў польскіх марак на палітычны і культурны беларускі рух. Грошы дае Гуга Стынес (Тут і далей падкрэсленні ў тэксце зробленыя Рамуальдам Зямкевічам. – **А. Ч., А. П.**)[14]. Беларусам было заяўлена, што лёс незалежнай Беларусі цалкам залежыць ад Нямеччыны. Як толькі палітыка немцаў пераможа, а сёння Нямеччына можа і павінна перамагаць у палітыцы і агітацыі, то Беларусь мусіць стаць незалежнай і асобнай дзяржавай. Гэта можа залежаць толькі ад напружання працы і высілкаў саміх ідэйных беларусаў, у цесным і шчырым кантакце з Нямеччынай, якая, не мяжуючы з Беларуссю, тым больш смела і дакладна, бо ў сваіх інтарэсах, можа даць ажыццявіць сапраўдную незалежнасць.

Міткевіч Яўген[15] склікаў канферэнцыю беспартыйных беларусаў[16], прыхільнікаў легальнай працы ў Польшчы, на 3 студзеня, а 10 гадзіне раніцы (Горадня, гатэль Славянскі, № 7).

Ці робіць гэты Міткевіч у сувязі са з’ездам у Вільні – я не ведаю.

Такія апошнія звесткі, якія я сабраў.

[14] Стынес Гуга (1870–1924) – салон адзін з найбуйнейшых нямецкіх прамыслоўцаў.

[15] Міткевіч Яўген (1890–?) – беларускі дзеяч паланафільскага кірунку, старшыня Арганізацыі беларускіх беспартыйных актывістаў.

[16] Арганізацыя беларускіх беспартыйных актывістаў – паланафільская арганізацыя ў 1922–1924 гг.

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
29.XII.1922

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падтэчка 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 13 СТУДЗЕНЯ 1923 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

Рапарт

Пасля доўгага, больш чым тыднёвага знаходжання ў Вільні мне ўдалося даведацца шмат цікавых звестак пра беларуска-літоўскія адносіны. Нягледзячы на кошт і шмат патрачанага часу, мне падаецца, што вынікі выведкі даволі пэўныя.

Пацвярджаецца інфармацыя, што Берлін і Коўна патрабуюць кансалідацыі беларускіх сілаў, каб выкарыстаць іх ва ўласных інтарэсах. Яны ахвяруюць на «беларускія мэты» пяцьсот мільёнаў польскіх марак. Пра такую, а не іншую суму, згодна сцвярджаюць усе. Таму трэба прызнаць яе праўдзівай. Так як пасля ўваходу беларускіх паслоў у сейм і сенат беларускае пытанне ўвайшло на рэйкі краёвай палітыкі, а павінна стаць пытаннем і сусветнай палітыкі, то апекуноў і дарадцаў з боку літоўцаў і нават немцаў беларусы маюць так шмат, што адмахнуцца ад іх не могуць.

У Вільню інкогніта прыязджаў нямецкі шпіён, вядомы яшчэ з часоў акупацыі 1916–1918 гадоў – цэнзар і беларускі апякун Зуземіль[17]. Ён выдатна валодае як беларускай, так і польскай мовамі. Знаходзіўся ён тут паміж 30 снежня і 3 студзеня, пасля чаго нібыта выехаў у Горадню. Антон Луцкевіч яго не прыняў, таму ён дзейнічаў праз літоўцаў і праз іх уплываў на беларусаў. Гаворка ідзе ні больш ні менш як пра арганізацыю беларускага паўстання, усялякага роду хваляванняў і актаў тэрору і помсты польскім чыноўнікам, якія прымяняюць абмежаванні і біццё, а таксама вытанчаныя зверствы пры допытах у следча-паліцэйскіх установах. Акрамя гэтага, нібыта павінны ўзрывацца масты, псавацца чыгуначныя пуці, шашы і да т. п. рэчы.

Я старанна намагаўся даследаваць верагоднасць гэтага ўземіль
магчымасць ажыццяўлення гэтага плана. Факт, што Адзінцоў
Луцкевіч безумоўна выступае супраць актаў тэрору і гвалтаванне.
Я размаўляў з ім асабіста. Цалкам пад сакрэтам ён мне сказаў:
«Адзін з паслоў кажа мне: што рабіць, калі нам палякі і немцы
дадуць ніякіх правоў – зробім паўстанне і адплацімся ім, яго за
гэта вылаяў, што, відаць, хоча згубы народу. Мы, беларусы,
бедныя і нічога не маем, каб паставіць на карту. Таму
паўстання мы рабіць не можам, бо гэта было б шалёнствам». Я
ўжо ведаў, пра каго ён кажа, і са свайго боку кажу: цяпер
заўсёды аднолькавы, дурнота і фантазіі заўсёды прыбіраюць
адсутнасць асцярожнасці і халоднай разважлівасці і могуць яго
і нас давядзе да непатрэбных скандалаў. Сапраўды, Луцкевіч у
сваіх размовах насамрэч па-дзіцячаму наіўны і неасцярожны.
Тады Луцкевіч сказаў мне, што ягоная тактыка – гэта
да Лігі нацый, да Еўропы, і што ён толькі ў гэтым напрамку і
працуе. Дадаў, што польскія фальшывыя статыстычныя
сабраныя з польскіх публікацый, а ім супрацьпастаўляюць
беларускія звесткі пра большасць, а не меншасць беларусаў на
крэсах, што яскрава даказваюць беларускія паслы ў сейм і
сенат. Фотакарткі паслоў, статыстычныя табліцы,
этнаграфічныя мапы, фотакарткі катаваных у польскіх следчых
установах беларусаў-сялянаў, спісы беларускіх інтэлігентаў,
якія гніюць у польскіх астрогах – усё гэта разам з пералікам
пазачыняных беларускіх школаў і кааператываў, на
патрабаванне сябра Беларусі палкоўніка Шардзіньі, ужо
выслана за мяжу і будзе там апублікавана, каб паказаць
фарысейства палякаў і высветліць іх лозунг: «вольныя з
вольнымі, роўныя з роўнымі». Такі матэрыял пастаянна
прыходзіць і будзе перасылацца за мяжу. Луцкевіч дадаў, што
нават самы наіўны беларус перастаў верыць палякам, бо яны
ніколі, як і Пілсудскі, не трымаюць дадзенага слова,
стараюцца яго змяльчыць, выкруціцца. Гэта людзі без гонару,
хоць так любяць спяваць пра ганаровыя паводзіны. Толькі
масавае кампраметаванне іх за мяжой у газетах з падачай
фотакартак і фактаў можа іх хоць трохі чамусьці навучыць. На
маё пытанне пра думку Луцкевіча наконт генерала
Сікорскага[19] ён адказаў, што блага ўжо тое, што Сікорскі –
галічанін, а галічане і ўсю сваю Польшчу, і тутэйшыя крэсы
запаскудзілі і ўрэшце загубяць Польшчу. Яны затруцілі

[17] Эдмунд Адамовіч (1881–1938).

[18] Цяпер Беларусь.

[19] Уладзіслаў Сікорскі (1881–1943).

адміністрацыю, войска і нават фінансы. Беларусы на прыгожыя слоўцы не паддадуцца, пра іхную вартасць у палякаў залішне добра даведаліся на ўласнай скуры і падтрымаць генерала Сікорскага могуць толькі тады, калі атрымаюць нешта рэальнае, што ім належыць.

Паўстанне, пра якое шмат гавораць як беларусы, так і [18], Вільні, вельмі асуджаецца больш разважлівымі і сур'ёзнымі асобамі. Аднак, нягледзячы на гэта, сярод беспрацоўных, пакрыўджаных польскімі ўладамі, а таксама сярод [19], рашуча варожа настроеных у дачыненні да Польшчы, шматлікіх прыхільнікаў. Шмат з іх спадзяюцца, што [20], больш значныя грашовыя дапамогі, што будуць адыгрываць вялікую ролю ў патаемных арганізацыях і што, можа быць, выплывуць на пасады пасля выгнання польскіх уладаў. А трэба добра памятаць, што агітацыя Блока нацыянальных меншасцяў, карыстаючыся свабодай падчас выбараў, пастварала шматлікія кампэты не толькі у гарадах, мястэчках і асадах, але і на вёсках. Палітычны кантакт быў завязаны ўжо тады, а сёння гэты кантакт з Вільняй і пасламі ў Варшаве не толькі не разарваўся ці паслабіўся, але наадварот, дзейнічае і поўным ходам працуе з-за робленых крыўдаў і створанай дзеля гэтага нянавісці. Луцкевіч выразна выказаўся, што, дзякуючы завязанню падчас выбараў адносін з вёскай, яны стаяць вельмі моцна і ніколі яшчэ так моцна не стаялі.

18 Браварчык Сяргей Уладзіміравіч (1897, – 1937?), беларускі палітычны дзеяч, у 1922–1927 гг. старшыня Беларускага пасольскага клуба ў Варшаве.

19 Сікорскі Уладзіслаў (1881–1943) – польскі генерал і палітык; у 1923 г. старшыня Рады міністраў Польшчы.

20 Маецца на ўвазе Прыязджаў з Менска ў Вільню ад беларускага каміс[illegible]

Шмат тут гаворыцца пра экразілавыя бомбы, дынаміт і да таго падобныя матэрыялы, галоўныя склады якіх, падобна на тое, павінны ўжо знаходзіцца на тэрыторыі Гарадзенскай зямлі. Пра падобныя склады на Віленшчыне мне нічога не ўдалося даведацца. Ёсць нараканні, што цяпер цяжка прадрацца з Віленшчыны ў Ковенскую Літву. Можа быць, тут гэтага і няма.

Асабіста з размоў у Вільні я перакананы, што калі не паўстанне, то хваляванні, акты тэрору на Віленшчыне вельмі магчымыя. Іх сіла і напружанне будуць, здаецца, залежаць ад Гарадзенскай зямлі, дзе, як выглядае, знаходзяцца галоўныя цэнтры.

Паводле аповедаў, кантакт з Менскам таксама існуе.

Чарвякова[21] нейкі Лашкевіч* (Тут і далей зорачкай пазначаны дзеячы і арганізацыі, пра якіх дадатковых звестак выяцьнаць ўдалося. – **А. Ч., А. П.**) (ніколі такога прозвішча сярод беларусаў у Менску не чуў), выпытваў пра Баранава, Рагулю, Грыба[22] і Мамоньку[23]. Ці бачыўся ён з Баранавым і Рагулем, мне, нягледзячы на ўсе намаганні, не ўдалося нічога даведацца. Ведаю толькі дакладна, што з Луцкевічам ён 8 студзеня меў 4-гадзінную размову. Прасіў адрасы Грыба і Мамонькі ў Празе Чэшскай і атрымаў іх у рэдакцыі выбараў у «Беларускага звона»[24]. Пра размову Луцкевіча з выбаранцам Менска нельга нічога даведацца. Тут хаваецца нейкая таямніца.

Беларускага з’езду ў дакладным значэнні гэтага слова не было. Не ўсе прыехалі. Размовы практычна былі толькі прыватныя.

Пасол (нібыта інжынер) Аўсяннік[25] ездзіў у Коўна з нейкім даручэннем і лістамі ад Луцкевіча. Аўсянніка мне не ўдалося пабачыць. Пагадненне Луцкевіча з Ластоўскім заключанае. Паразуменне па патрабаванні Берліна і Коўна дасягнуты. Значыць, грошы, хутчэй за ўсё, хутка будуць выдадзеныя. Справа толькі ў тым, ці сапраўды, як тут кажуць, паступленая ўмова працы ў напрамку выклікання паўстання, і калі гэта Луцкевіч не згаджаецца, то ці дойдзе справа да выдзяленняў грошай? Пра гэта пытанне гаворыцца адкрыта. Аднак мне падаецца, што калі паўстанне ці нешта падобнае да кваліфікацыі будзе выкліканае, то гэта адбудзецца на Гарадзеншчыне, бо там, наводле размоў, сілы арганізаваныя.

Сітуацыя напружаная і можа пагражаць не раз, адзін з лідэраў беларускіх эсэраў.

Тамо я лічу, што цяпер самы час даць беларусам тое, што прадбачыць Канстытуцыя. Гэта значыць школу, кааператывы. Друкаваны орган, які б гортаваў беларускія элементы, прыхільныя Польшчы, надзвычай неабходны.

Было б выдатным палітычным ходам даць беларусам школы, кааператывы, выдавецтва, бо гэта паслабіла б абвінавачанні паслоў у сейме, што Польшча ўсе іх культурныя здабыткі забрала і не дае беларусам жыць.

[21] Чарвякоў Аўксандр (1892–1937) – беларускі дзеяч, старшыня Цэнтральнага выканаўчага камітэта (ЦВК) БССР.

[22] Грыб Тамаш (1895–1938) – беларускі дзеяч, адзін з лідэраў беларускіх эсэраў.

[23] Мамонька Язэп (1889–1937) – беларускі дзеяч, адзін з лідэраў беларускіх эсэраў.

[24] «Беларускі звон» – беларуская газета, якая выходзіла ў Вільні ў 1921–1922 гг.

[25] Аўсяннік Антон (1888–1933?) – беларускі палітык, пасол польскага сейма (1922–1927).

Наколькі я ведаю беларусаў, дача ім магчымасці культурніцкай працы, а пры гэтым і кавалка хлеба, выдатна спрычынілася б да спакою ў краі і значна зменшыла б цяжкасці палітычнага характару.

Гэты крок трэба зрабіць як найхутчэй, бо час прыспешвае.

З другога ж боку, трэба зрабіць усё, каб такіх паслоў, як Баранаў, Рагуля[26] і Аўсяннік, зваліць любой цаной.

Некаторыя з паслоў пад уплывам украінскіх падшэнтаў будуць намагацца гаварыць у польскім сейме па-беларуску.

Што да Гарадзеншчыны, то трэба энергічна ўзяцца за выяўленне, дзе там знаходзяцца склады амуніцыі, перапраўленай з Літвы. На мастах ужо цяпер трэба паставіць варту.

Ластоўскі ў Коўне павінен кінуць сваю працу ў якасці прэм'ер-міністра і выехаць у Амерыку для арганізацыі там беларусаў. У Амерыцы ўжо знаходзіцца вядомы беларускі дзеяч Чарапук[27].

Старшынства ў Радзе беларускіх міністраў аддадзена Луцкевічу. Ён думае, ці прымаць яго, а калі прыме, ляціць у Коўна.

Наагул сітуацыя ў Вільні, якая з'яўляецца беларускім культурным асяродкам, настолькі пагражае непрадбачанымі наступствамі, што абавязкова трэба там часцей бываць і даследаваць на месцы настроі і намеры беларускіх дзеячаў.

Беларускія газеты «Наша будучына»[28], «Беларускі звон», «Kryniса»[29] выдаюцца за рэшткі блокавых грошай. Цяпер грошай ім не хапае, і яны будуць вымушаныя ўзяць іх у літоўцаў.

Літоўцы цяпер вельмі частыя госці ў беларусаў.

Больш падрабязнае даследаванне іх ролі, паўнамоцтваў і дзейнасці на шкоду дзяржаве вымагае безумоўнай увагі і пільнасці.

[26] Баранаў Васіль (1879–1955) – беларускі палітык, пасол польскага сейма (1922–1927), сенатар (1928–1930).

[27] Чарапук Янка (1896–1957) – беларускі дзеяч, адзін з лідэраў беларускай эміграцыі ў Амерыцы.

[28] «Наша будучына» – беларуская газета, орган

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
13 студзеня 1923

ЦВА. ІІ аддзел Генеральнага штаба. Сігн. І.303.4.2664. Падтэчка 1.

Беларускай партыі сацыялістаў-рэвалюцыянераў, выходзіла ў 1922 г.

[29] «Kryniса» – беларуская газета, орган Беларускай хрысціянскай дэмакратыі, выходзіла спачатку ў Петраградзе, а пасля ў Вільні ў 1917–1925 гг.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў ІІ АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 13 СТУДЗЕНЯ 1923 г.
У ІІ аддзел Генеральнага штаба

Выдаткі на маю апошнюю выведку ў Вільні, праз заблытаную і пагражальную сітуацыю, былі такія вялікія, што я не ў стане пакрыць іх з заробку. З-за шалёнай дарагоўлі гэта было б залішне вялікай стратай для маёй кішэні, бо, седзячы без пасады, пабочных прыбыткаў я не маю.

Кошт абедаў, вячэр і напояў за ўвесь тыдзень склаў 56 000 марак.

Аб іх вяртанні ці ў форме кошту выведкі, ці ў форме дапамогі прашу гэтым лістом.

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
13.І.1923

ЦВА. ІІ аддзел Генеральнага штаба. Сігн. І.303.4.2664. Падтэчка 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў ІІ АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 28 ЛЮТАГА 1923 г.
У ІІ аддзел Генеральнага штаба

інжынера Рамуальда Зямкевіча

Рапарт

Падчас майго знаходжання ў Львове (з 20.II да 26.II) я набыў шмат знаёмстваў сярод украінцаў. Мне дапамаглі добрае веданне ўкраінскай мовы і рэкамендацыі ад Бачэнкі Уладзіміра*, з якім я пазнаёміўся ў Вільні ў Луцкевіча. Ранейшыя мае стасункі і знаёмствы з украінцамі, як, напрыклад, з захавальнікам фондаў музея мітрапаліта Шаптыцкага[30], прафесарам Львоўскага універсітэта Ларывонам (Іларыёнам. – **Рэд.**) Свянціцкім[31] далі мне магчымасць больш глыбокага ўнікання ў палітычныя настроі.

Справа завязання адносін паміж беларусамі і ўкраінцамі выглядае наступным чынам:

1) цеснае і поўнае паразуменне паміж беларускімі і ўкраінскімі пасламі ў сейме і сенаце ўжо замацавана адмысловым супольна складзеным і падпісаным пагадненнем;

2) таксама ідзе гаворка пра завязванне культурных стасункаў, якія грунтуюцца на развіцці культуры, бліжэйшага знаёмства, заснаванні бібліятэк, абмене кніжкамі, газетамі і падтрыманні культурных таварыстваў праз супольнае запісванне ў іх сябры;

3) завязванне адносін у эканамічных справах, г. зн. у кааператывах і гаспадарчых таварыствах;

4) неабходнасць склікання беларуска-ўкраінскага з’езду з мэтай абмеркавання ўсіх справаў і стварэння Рады нацыянальнай думкі для ўплыву на дзейнасць паслоў у сейме і сенаце.

Аднагалосна вырашана дзеля шалёных рэпрэсіяў польскай адміністрацыі ў Львове склікаць такі з’езд у Варшаве пад апекай сеймавых паслоў.

Настрой украінскай інтэлігенцыі, які я вывучаў, у тых сферах, у якіх я круціўся, падаецца мне зусім не варожым да польскай дзяржаўнасці. Затое настрой народных масаў – безумоўна варожы. Я размаўляў з рабочымі, якія ўголас і публічна праклінаюць палякаў за пазбаўленне працы кожнага непаляка.

[30] Шаптыцкі Андрэй (1865–1944) – украінскі царкоўны дзеяч, у 1901–1944 грэка-каталіцкі мітрапаліт.

[31] Свянціцкі Ларывон (1876–1956) – украінскі лінгвіст, прафесар.

Злоўжыванні мясцовай адміністрацыі проста жудасныя. Тыя самыя зачыненні школаў, канфіскацыя ў сялянаў легальнай літаратуры на іх мове, беспрычынныя арышты – словам, карціна дакладна тая самая, як і на беларускіх ускраінах. Дзіўная легкадумнасць, нечувана пагражальная як цяпер, так і ў будучыні! Змена гэтай бяздумнай і блізарукай палітыкі, пазбыццё гакатызму[32], цесная апора на канстытуцыю – толькі гэта можа ўтрымаць гэтыя землі ў складзе Польшчы.

Цяпер, нягледзячы нават на непрыязь да камунізму і бязвыхаду, ёсць фактам, што ўскраінныя землі імкнуцца да Расіі.

Беларускі і ўкраінскі рух, смела магу гэта сцвярджаць, грунтоўна ведаю ўжо 20 гадоў; больш за тое, перад вайной як у адным, так і ў другім руху я браў актыўны ўдзел, маючы на мэце развал дэспатычнай царскай Расіі. Сёння я лічу (і хачу працаваць у гэтым напрамку), што ўся Беларусь і ўся Украіна да Чорнага мора павінны быць у межах Польскай Рэспублікі, не перадвызначаючы іх палітычную форму ў адносінах да яе.

На тое, што робіцца цяпер, я гляджу з асцярогай, бо глыбока перакананы, што пры такіх метадах дзеяння, адсутнасці плана і бяздумнай палітыцы Польская Рэспубліка страціць больш сваёй тэрыторыі, чым за часамі Хмяльніцкага.

Ад Перамышля да самага Львова ў цягніку адбываецца прагляд дакументаў пасажыраў паліцыянтам. Трэба было б гэта самае зрабіць на чыгуначных лініях, якія вядуць да Вільні, бо зашмат бальшавікоў і камуністаў курсуе на тым фронце.

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
28.II.1923

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падтэчка 1.

[32] Гакатызм – асіміляцыйная палітыка, находзіць ад назвы нямецкай шавіністычнай арганізацыі «Гаката», што дзейнічала ў канцы XIX – пачатку XX стст. і ставіла сабе за мэту германізацыю этнічна польскіх земляў у складзе кайзераўскай Нямеччыны.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ

ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 26 САКАВІКА 1923 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

інж. Рамуальда Зямкевіча

Рапарт

Я выехаў з Варшавы 16 сакавіка і быў у Вільні толькі раніцай 17 сакавіка. Выявілася, што я спазніўся на 1 дзень, бо 16 адбыўся шматлюдны сход у прысутнасці Брынкевіча* з Менска. З расповедаў я даведаўся, што сход меў вельмі бурлівы характар, і што дзякуючы вялікай колькасці сабраных прапанова аб узаемадзеянні з Менскам была ўспрынятая адкрыта варожа. Брынкевіч кідаўся як шалёны, заклінаў не губіць справы, пагражаў, што ў выпадку заняцця краю літоўцамі ці бальшавікамі ўсе тыя, хто супраціўляюцца прапанаванай актыўнай падрыхтоўцы да паўстання, апынуцца па-за законам як ворагі Беларусі і рэвалюцыі. Сход не даў ніякага выніку.

17 сакавіка вечарам я спаткаў Брынкевіча, які вельмі ўсцешыўся, пабачыўшы мяне. Дакараў мяне, што 16-га я не быў на сходзе, а каб быў, то прыдаўся б яму дзеля яго падтрымкі. Я ўзяў яго ў абарот у дачыненні палітычнага становішча. Дык вось, ён мне заявіў, што быў у Берліне і Коўне і што ў Нямеччыне цяпер пачынае перамагаць антысавецкая плынь, людзі з якой не хочуць верыць у сілу і моц савецкага войска. Брынкевіч сцвярджае, што асцерагацца трэба росту нацыяналізму і фашызму, каб Нямеччына не рабіла ў Расеі спробаў скідання Саветаў і замены іх манархістамі-нацыяналістамі. У паспяховасць такой спробы ён не верыць, але разбіццё сілаў і стварэнне замяшання, як бы там ні было, было б шкодным для перамогі рэвалюцыі. Далей Брынкевіч казаў, што, нягледзячы на палітычныя рознагалоссі немцаў, Расія пастаянна атрымлівае ўсё для сваёй арміі. Артылерыя, амуніцыя, танкі, газы, асабліва апошніх ёсць столькі, што хопіць на год вайны. Дадаў, што цяперашняе войска Саветаў – гэта не голая і босая армія 1920 г., але апранутая, сытая і выдатна ўзброеная. Расія з Польшчы смяецца і зусім з ёю не лічыцца. Далей ён казаў, што Польшча ідэальна і спраўна стварае сабе наўкола ворагаў, як немцы, літоўцы, Саветы і чэхі,

ды нават і ўнутры краіны напорыста працуе і сваімі чыста буржуазна-панскімі імперыялізмам і нецярпімасцю вымушае ўкраінцаў, беларусаў і літоўцаў варожа ставіцца да прагных да ўлады і матэрыяльных даброт паноў. «Гэтага нам і трэба!» – скончыў. Высвятляецца, што Менск пільна сочыць, што робіцца ў краіне, старанна занатоўвае ўсялякі ўціск з боку польскай адміністрацыі на Крэсах і разлічвае на тое, што гэта вельмі прыдасца ці да выклікання паўстання, ці да вынішчэння польскага элемента падчас заняцця тэрыторыі бальшавікамі. Брынкевіч сабраў цэлы стос газет, асабліва тых, якія сканфіскаваў аддзел прэсы. Усё гэта пойдзе ў Менск і ў Маскву.

Калі я запытаў пра меркаваны тэрмін вайны, ён адказаў, што, можа быць, цяпер гэта трохі адсунецца праз непрадбачаныя абставіны. Фактам ёсць і будзе тое, што Саветы мусяць абаперціся на незадавальненне насельніцтва ў Польшчы і энергічна ўмяшацца. Што да паўстання, то праз тое, што кіраўнічыя нацыянальна-буржуазныя беларускія сферы не хочуць пайсці разам, арганізацыйная праца будзе даверараная «падпольным ячэйкам». Банды такіх *«головорезов»*, як Муха[33], будуць узмоцненыя, але будуць нападаць толькі на адміністрацыю і паноў. «Такі Муха нам робіць вялікія паслугі, бо ўсюды мае арганізаваных людзей!» – зазначыў Брынкевіч. Што датычыць уласна Польшчы, то нашы таварышы ў адпаведны час выклікаюць там забастоўкі і беспарадкі. Гэта вельмі лёгка. Вайна мусіць быць яшчэ ў гэтым годзе. У выпадку нашай удачы Літва і Нямеччына, безумоўна, актыўна нам дапамогуць, – з вялікай упэўненасцю і задавальненнем дадаў Брынкевіч.

Газеты Брынкевічу даставіў Максім Гарэцкі. Мяне ж Брынкевіч настойліва прасіў збіраць для іх нумары сканфіскаваных газет. Я абяцаў, што па меры майго наведвання Вільні буду старацца гэта рабіць. Брынкевіч ездзіць з польскім пашпартам на імя Яна Залескага. Пашпарт разам з фотакарткай выдадзены ў Беластоку. Калі ён сапраўдны, то тут павінны быць нейкія подкуп чыноўнікаў, калі ж гэта фальсіфікат, то мушу прызнацца, што зроблены выдатна. Вечарам 17-га сакавіка Брынкевіч збіраўся выехаць у Менск.

[33] Міхаіл Гарбацэвіч (1892–1938) – удзельнік беларускага руху ў Заходняй

Напрыканцы маёй размовы я з націскам зазначыў, што Беларусі ў крытычна прыгледзеліся да працы Смоліча[34] з Менска, бо ёсць вялікая верагоднасць, што ён або правакатар, або высланы дэфензівай агент Варшавы. Брынкевіч зазначыў, што Смоліч яму даўно не падабаецца, што пра махінацыі Смоліча з варшаўскімі афіцэрамі дэфензівы ён чуў і ад іншых беларусаў у Вільні і правінцыі, і што гэта справа будзе разгледжаная ў Менску.

Настрой беларускага насельніцтва праз пастаянныя арышты, бясчынствы і дурноты паліцыянтаў робіцца ўсё больш варожы да Польшчы. Я размаўляў з некалькімі людзьмі, якія нехта з розных мясцінаў, і з адным чалавекам, які быў арыштаваны за тое, што меў у Валожынскім павеце нумар беларускай газеты. Ён быў этапам дастаўлены ў Вільню, абрабаваны паліцыянтамі, а затым з прычыны адсутнасці віны і складу злачынства быў выпушчаны на волю ў Вільні без грошай і магчымасці вярнуцца дахаты. Гэты факт збіраюцца выкарыстаць беларускія паслы ў сейме і за мяжой, бо была зробленая фотакартка гэтага чалавека, таму што відаць сінякі і сляды пабояў. Такіх непрыемных фактаў ёсць і болей. Дэпутацкая канцылярыя, у якую ў Вільні звяртаюцца вельмі шмат пацярпелых, вельмі скрупулёзна збірае матэрыялы.

Акрамя таго, канфіскацыі нумароў беларускіх газет такія бязглуздыя, што можна смела сумнявацца, ці панове з прэсавага аддзела пры памяці і не п’яныя, бо нумары, у якіх няма нічога благога, канфіскуюцца, затое тыя, якія крычаць пра гвалты і несправядлівасці польскіх паноў і адміністрацыі, выпускаюцца без аніякіх перашкод.

На другі дзень велікодных святаў мае быць з’езд і прыём у Вільні сенатараў, паслоў і запрошаных асоб. Запрашэнне мае і ніжэйпадпісаны. Павінны адбыцца цалкам патаемныя размовы і палітычныя нарады.

У нядзелю ўвечары 25 сакавіка беларусы святкавалі гадавіну абвяшчэння сваёй незалежнасці. На сходзе, нягледзячы на запрашэнне, я прысутнічаць не мог з той прычыны, што тэрмін білета канчаўся 25-га, а грошай – дзеля віленскай дарагоўлі і вялікіх выдаткаў на кватэру і выведку – амаль не засталося.

[34] Смоліч Аркадзь (1891–1938) – беларускі і савецкі палітычны дзеяч, у 1920 г. ён ездзіў у Беларускую Народную Рэспубліку (БНР), з 1922 г. у БССР, у 1938 г. расстраляны.

У падобных выпадках буду вельмі прасіць: альбо давайце білеты на даўжэйшы тэрмін, альбо паведамляйце мне, дзе ў падобным выпадку я мог бы білет атрымаць.

Што да выдаткаў, то, нягледзячы на ашчаднасць, нават на само пражыццё мне не хапае месячнага заробку, а выдаткі на выведку вельмі моцна падрываюць мой бюджэт. Мушу прасіць ці нейкай дапамогі, ці адлічэння пэўнай сумы.

інж. Рамуальд Зямкевіч

Варшава
26 сакавіка 1923 г.

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падтэчка 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 27 САКАВІКА 1923 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

інж. Рамуальда Зямкевіча

Рапарт

Акрамя Брынкевіча і віленскіх беларусаў, я шмат і падрабязна размаўляў пра наяўную сітуацыю і з пасламі. Трымаюся тактыкі ненавязвання нікому маёй асобы. Яны звяртаюцца да мяне самі. Мой артыкул у газеце «Новае жыцьцё»[35] вельмі спадабаўся, на мяне звярнулі ўвагу. Дагэтуль я размаўляў з тымі, якія самі хочуць завязаць са мной адносіны, гэта значыць з Тарашкевічам, Ракам-Міхайлоўскім і Якавюком. Перад выездам у Вільню я шмат часу прысвяціў ім у Варшаве. Тарашкевіч хоча мяне прыцягнуць да больш актыўнай дзейнасці, у размовах зусім шчыра і адкрыта апавядае пра сваё пагадненне з Ластоўскім. Пагадненне такое: рабіць як мага больш шуму, падаваць інтэрпеляцыі з любой нагоды, моцна падкрэсліваць сацыяльныя тэзы ў зямельным пытанні (эсэраўская тэорыя надзялення зямлёй задарма) і выкарыстоўваць усе магчымасці паразуменняў з сеймавымі

групамі, хоць бы нават з ідэйнымі супраціўнікамі, каб часова атрымаць вырашальны голас ці значэнне. Тактыка, высунутая Ластоўскім, цалкам адпавядае інструкцыям Менска, якія прывёз з Саўдэпіі Максім Гарэцкі. У першую і галоўную чаргу ідзе гаворка пра стварэнне такой сітуацыі, каб сілай фактаў гвалту і ўціску адміністрацыі і войска на Беларусі стварыць грунт для адпаведнага запыту Саветаў, Літвы і Нямеччыны на дыпламатычным форуме Еўропы. Гэта выразна і цвёрда асабіста мне і пары іншых асоб паведаміў пасол Тарашкевіч.

Цікавыя адносіны існуюць паміж «Вызваленнем»[36] і Беларускім клубам. Тарашкевіч наракаў, што пасол Панятоўскі[37], ідзе пра нягледзячы на пагадненне, выступае правакацыйна і шкодна ў дачыненні да беларусаў. Што гэта за пагадненне і на якой яно грунтуецца, да гэтага часу не меў магчымасці выявіць. Ведаю толькі, што нейкія асаблівыя «круцельствы» праводзіць беларус Ваявудскі, пра якога сам Тарашкевіч выказваецца, што ён «ідзе на двух крэслах.

Факт, што Максім Гарэцкі, паехаўшы ў Саўдэпію, меў на ўвазе перш за ўсё палітычныя мэты, прыкрываючыся дастаўкай беларускіх школьных кніжак. Падрабязнасці буду выяўляць паволі, бо не хачу яго настойліва распытваць, тым больш што Гарэцкі адзіны, хто глядзіць на мяне крыва і падазрона.

Вельмі каштоўную і добрую інфармацыю дае мне пасол Якавюк, мой колішні падначалены з Горадні. Я, аднак, знешне слухаю яго не вельмі ўважліва. Ён абураецца, што Клуб слухае нашэптванні Менска і што Тарашкевіч уключае ў свае прамовы балышавіцкія акцэнты, накінутыя Менскам. Аднак жа дзеля таго, што Якавюк слабы розумам, трымаю яго пакуль у рэзерве.

Тарашкевіч і Рак-Міхайлоўскі хочуць мяне бачыць дырэктарам беларускай настаўніцкай семінарыі. Я адказаў, што калі такая семінарыя будзе створаная ў Вільні, то, можа, і пагаджуся, у правінцыі ж, у малым мястэчку ніколі не рашуся асталявацца. Тлумачу гэта тым, што ў Вільні ёсць бібліятэкі, дзе магу працаваць, а ў правінцыі быў бы гэтага пазбаўлены.

Зазначаю, што пасол Якавюк, падкрэсліваючы сваю непрыязь да бальшавізму, робіць гэта шчыра, бо ў 1920 годзе ў Горадні быў

[36] Польская народная партыя (ПСЛ) «Вызваленне» дзейнічала ў 1915–1931 гг.; у пачатку 1920-х гг. мела вялікі уплыў на тэрыторыі Заходняй Беларусі.

[37] Панятоўскі Юліюш (1886–1975) – польскі палітык, пасол сейма у 1919–1927 гг. са спіса ПСЛ «Вызваленне».

[35] Гаворка ідзе пра артыкул Я. Зязюлі «Беларускі клуб», апублікаваны ў газеце «Новае жыццё» з сакавіка 1923 г. «Новае жыццё» – беларуская газета, выходзіла ў Вільні ад сакавіка да траўня 1923 г.

арыштаваны надзвычайкай. Уцякаючы з Горадні, яна пагнала арыштантаў пехатою, і Якавюк уцёк толькі па дарозе.

2 красавіка ў Вільні будзе вялікі з'езд паслоў, сенатараў і іншых дзеячаў. Будзе разглядацца тактыка і план паводзін на будучыню. Калі не самога 2-га, то ва ўсялякім разе 3-га красавіка мая прысутнасць там была б пажаданая.

Пытанне адносін да кабінета ген. Сікорскага выглядае наступным чынам.

Тарашкевіч сказаў мне так: «Абяцанне разгляду нашых крыўдаў і ўціску, зробленае галілеем ген. Сікорскім, мы прынялі як вэксаль з добрым подпісам і чакаем выканання слова. Што да выканання гэтага слова, то мы не маем ніякіх ілюзій; навучаныя досведам 1919 і 1920 гадоў, мы ведаем, чаго вартыя ўрачыстыя абяцанкі і даванне слова пілсудскімі, асмалоўскімі[38], рачкевічамі[39] і да іх падобнай бандай, мы да сёння адчуваем гэта на сваёй скуры. У выпадку невыканання слова мы пяройдзем у выбраны намі крытычны момант да безумоўнай абструкцыі і апазіцыі, і я ўпэўнены, што многія партыі прымуць гэта з разуменнем».

На загад Коўна літоўцы ў Вільні пачынаюць усё больш сардэчна збліжацца з беларусамі, чынячы ўзаемныя паслугі адны адным. Так, напрыклад, пасля ператрусу ў літоўскай кнігарні «Вікі Марціс» беларуская кнігарня неадкладна была паведамлена і перасцярожаная. Літоўцы спяваюць у беларускім хоры. Напрыклад, 25 сакавіка на ўрачыстым набажэнстве, прысвечаным гадавіне абвяшчэння незалежнасці Беларусі, выдатны хор, складзены з беларусаў і літоўцаў, адспяваў рэлігійныя песні ў касцёле св. Мікалая, усе па-беларуску. Гэта зрабіла добрае ўражанне нават на мяне. Казань, вядома, таксама была па-беларуску. Напрыканцы імшы быў праспяваны беларускі нацыянальны гімн.

Нацыянальная свядомасць вельмі расце. Сяляне, нават праваслаўныя, адзіграў (1885–1947) – польскі, беларускі і літоўскі палітычны дзеяч, у 1919–1920 гг. начальнік польскай ваеннай акругі. Ініцыятар і кіраўнік урадавых змоваў супраць беларускай незалежнасці!!!

[38] Адам Смаргоўскі. Вікі Марціс (1874 – пераход 1954) – польскі гарадскі, у 1919–1920 гг. камендант, кіраваны усходніх земляў.

Брынкевіч будзе ў Вільні ў другой палове красавіка.

Падчас святочных вакацый хто-небудзь з паслоў паедзе ў Коўна, Рыгу або Гданьск. Гэта будзе пасля з'езда 2 красавіка і пасля канферэнцыі.

Мушу зазначыць, што праз цяперашнюю дарагоўлю майго заробку не хапае мне нават на жыццё. Дзеля правядзення ж выведкі трачу столькі, што ў Варшаву заўсёды вяртаюся без грошай, бо пастаянна мушу зайсці ў кандытарскую ці ў рэстаран, дзе лягчэй і зручней пацягнуць некага за язык.

Дзеля гэтага прашу падумаць пра выдзяленне дапамогі.

інж. Рамуальд Зямкевіч

Варшава
27 сакавіка 1923 г.

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падтэчка 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 28 САКАВІКА 1923 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

інж. Рамуальда Зямкевіча

Рапарт

З нагоды вестак, якія да мяне дайшлі, і адчуванага незадаволення маёй дзейнасцю адчуваю сябе абавязаным напісаць некалькі словаў тлумачэння.

Калі на патаемны з'езд я не патрапіў, то нічога благога не зрабіў, бо гэта зрабіла ўражанне, што не імкнуся ўсюды быць і пра ўсё ведаць. Залішняя руплівасць з майго боку на пачатку, калі стараюся здабыць моцнае і трывалае ўгрунтаванне маёй пазіцыі, была б для мяне толькі шкоднаю. Адзначаю, што дзякуючы таму, што стараюся жыць добра і сардэчна з кожным

беларусам, ніводны патаемны з'езд ці нават дробнае пасяджэнне не застаецца па-за маёй увагай, бо пра ўсё, нават самае дробязнае, мне даносяць і апавядаюць пра ўсе падрабязнасці. Ужо цяпер незадаволеныя выбарам такіх паслоў, кажуць, што мяне пакрыўдзілі, не выставіўшы маёй кандыдатуры, бо, ведаючы так добра варшаўскія адносіны і польскую мову, я мог бы прынесці іхнай справе вялікую карысць. Сімпатыі да мяне я стараюся спрытна падтрымліваць.

Арыштоўваць Брынкевіча я не рэкамендаваў з некалькіх важных прычын. Па-першае, не хацеў псаваць сваёй працы, бо пасля Брынкевіча рабілі б справу разгортвання паўстання іншыя, што вымагала б пачатку працы наноў, пры гэтым звязанай з яшчэ большымі цяжкасцямі. Па-другое, ягоны арышт не даў бы нам у рукі сур'ёзных доказаў у выглядзе дакументаў, якія б неабвержна пацвярджалі ягоную дзейнасць. Што ён з папер і агітацыйнай літаратуры нічога пры сабе не меў, я ведаю з ягоных словаў, сказаных адвакату – беларусу Падбярэзскаму[40]: «Пытаецеся, чаму я з Коўна не прывёз нічога цікавага з друкаў, нават газеты «Беларускі партызан»[41]. Проста таму, што я не дурань, каб вазіць з сабою такія рэчы, каб пры вобыску мяне арыштавалі. Самі ведаеце, што арыштоўваюць за любы нумар беларускай газеты, нават выдадзенай легальна». Для мяне гэта было вызначальным, бо пасля арышту паліцыяй абвінаваціць Брынкевіча можна было б толькі ў злачынстве крымінальнага характару: валоданні фальшывым альбо чужым пашпартам. Гэта была б залішне нязначная справа, каб я яе заводзіў. Акрамя таго, я яшчэ вельмі хацеў, каб Брынкевіч пасля вяртання ў Менск апавядаў, што па Польшчы лёгка і без цяжкасцяў можна ездзіць, і хваліўся, што яму гэта так выдатна ўдаецца. Такія ўпэўненасць і асляпленне даюць добрыя вынікі. Акрамя таго, я надзвычай жадаў скампраметаваць у Менску Аркадзя Смоліча, гэтага ворага Польшчы, які там паклёпнічае на ўсіх і крычыць, як галоўны сябра Камітэта аб'яднання Беларусі*, што палякі дзяруць з Беларусі скуру, што трэба рабіць паўстанне і злучыць усе беларускія землі. Гэтая кампраметацыя цалкам мне ўдалася. Я засцярог Брынкевіча, што Смоліч у Варшаве круціўся сярод афіцэраў дэфензівы, што яго руплівасць і крыклівасць вельмі падазроныя, бо можа быць правакатарам або польскім агентам. Пры гэтым я дадаў, што

мы са Смолічам асабіста адзін аднаго ненавідзім, таму мая думка пра яго можа быць суб'ектыўная, і хай ён даведаецца думку і іншых беларусаў. Брынкевіч зрабіў гэта і пераканаўся, што як за мяжой, так і ў Вільні ніхто не выказаўся пра Смоліча прыхільна. За гэта ён мне вельмі дзякаваў, кажучы, што цэніць маю шчырасць і аб'ектыўнасць. Я дасягнуў сваёй мэты, бо Смоліч, як мой вораг, мог мне там зашкодзіць, цяпер жа ніякай боязі за сябе я не маю.

Што датычыць працы Генеральнага штаба і Другога аддзела, то залішне добра разумею яго спецыфічныя мэты і задачы, каб мог яго параўноўваць з паліцэйскім камісарыятам. Мэта штаба – гэта палітычная праца і палітычная бяспека Дзяржавы. Таму і метады, і спосаб паводзін мусяць быць вельмі дыпламатычныя і тонкія.

Мера, тактоўнасць і розум найвышэйшай формы мусяць кіраваць вельмі і вельмі адказнай працай.

Як «давераная асоба» выдатна разумею маральную адказнасць, якая ляжыць на мне як на паляку і як на супрацоўніку.

Не хачу рабіць і ніколі не зраблю такога глупства, як арышт без наяўнасці ў руках канкрэтных доказаў дзяржаўнай здрады. Усе падобныя факты арыштаў паліцыяй (а іх проста скандальна шмат), як таго селяніна за нумар легальнай беларускай газеты, які быў збіты, абрабаваны паліцыянтамі, прывезены ў Вільню, а затым вызвалены праз адсутнасць віны і выкінуты на брук, абуральна мяне да глыбіні душы, бо гэта дурная і ганебная работа на шкоду дзяржаве. Калі б я меў уладу, то за такія злоўжыванні пераследаваў бы і караў. Лічу, што трэба адрэагаваць на такія бясчынствы паліцыі, якая залішне расхвальвае ў прэсе сваю дзейнасць, нібыта вельмі карысную для дзяржавы.

Мая роля – вельмі цяжкая і патрабуе надзвычайнай асцярожнасці. Я пастаянна мушу думаць пра новыя, вельмі асцярожныя хады, бо тут справа датычыць і ўласнай скуры. У выпадку выкрыцця маёй ролі са мною хутка ўсё было б скончана.

40 Друкі-Падбярэзскі Баляслаў (1894–1940?), – беларускі дзеяч, літаратар, навагрудскі адвакат.

41 «Беларускі партызан» – нелегальная газета, выдаваная ў 1922 г. Галоўным штабам беларускіх партызанаў у Беластоцкай вушчыне.

Мая дакладная мэта такая: здабыць для штаба канкрэтныя, чорным па беламу, доказы атрымання беларусамі загадаў з Берліна і Масквы, каб гэтыя рэчавыя доказы ўрад Рэспублікі мог прадставіць у якасці актаў абвінавачвання сваіх ворагаў у інтрыгах як унутры Польшчы, так і на еўрапейскай арэне. Я напружваю ўсе свае розум і энергію, каб дасягнуць гэтай мэты.

Я сустракаю перашкоды на сваім шляху. Таму прашу пра іх ліквідацыю. Гаворка ідзе пра тое, што ў Вільні панове Жобель[42] і Абрамовіч* хацелі б карыстацца маёй інфармацыяй, каб яе падаваць у сваіх рапартах. Я ж лічу, што мае справы іх ніяк не тычацца, а ведаць іх саміх мне непатрэбна. Я залежу толькі ад штаба і размаўляю толькі са штабам. І пан Жобель, і пан Абрамовіч залішне ўжо скачуць вакол мяне і хочуць, каб я хадзіў да іх у Вільні. Не быў ні ў аднаго, ні ў другога і не пайду. У пляткарскай Вільні і сцены маюць вочы і вушы. Мне падаецца, што з боку пана Жобеля ўжо спрытна пушчаны пробны шарык маленькай правакацыі маёй асобы. А менавіта: данесена ў Варшаву, што я нібыта распавядаў у Вільні, што ў Варшаве пахне рэвалюцыяй, што маніфеставалі беспрацоўныя на пляцы Дамброўскага, што больш за дзесятак з іх забітыя, забітых насілі па Варшаве і да таго падобнае.

Гэта залішне вялікае глупства, каб я за яго апраўдваўся. Зазначаю, што ні ў якую балбатню я не ўступаю.

Усё, што я пішу і падаю, грунтую на фактах, а не на фантазіі. Кожная мая інфармацыя павінна знаходзіць пацвярджэнне з іншага боку, бо я аперую толькі праўдай.

Прызнаю сваю віну толькі ў тым выпадку, што, своечасова не выехаўшы, не паведаміў пра гэта.

Цяпер заўсёды буду намагацца ў выпадку неабходнасці такога кроку з майго боку паведамляць пра гэта ў штаб.

Усе зычліва выказаныя заўвагі заўсёды прыму з глыбокай удзячнасцю.

Цяпер я знаходжуся ў глыбокім роздуме, ехаць мне на з’езд 2 красавіка ў Вільні (запрашэнне маю) своечасова ці спазніцца.

[42] Жобель Казімір (1888 – пасля 1952) супрацоўнік II аддзелу III вайсковай акругі з сядзібай у Горадні.

Гаворка пра тое, каб ніхто не дзівіўся, што я не звяртаю ўвагі на святы і лячу з Варшавы ў Вільню. Мушу выключыць усялякую падазронасць да маёй асобы. Не магу, такім чынам, адмовіцца ад індывідуальнага трактавання справы.

інж. Рамуальд Зямкевіч

Варшава
28 сакавіка 1923 г.

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падтэчка 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 23 КРАСАВІКА 1923 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

інж. Рамуальда Зямкевіча

Рапарт

Навіны з беларускага палітычнага жыцця на Крэсах за час з 8 да 22 красавіка не вельмі багатыя.

Замяшанне і пярэпалах выклікалі навіны, агучаныя ў «Journal de Pologne»*, у польскіх газетах. Страх перадаўся ўсім, хто хоць бы нешта ведаў пра агентаў Саветаў і Літвы. Стаўленне да мяне адразу стала недаверлівае, падазронае. Толькі аналіз тэксту ў «Journal de Pologne» пераканаў Луцкевіча, што гэтыя навіны могуць паходзіць толькі з замежнай крыніцы, што французская палітычная выведка не мае сабе роўных у свеце, акрамя нямецкай, і гэта яна праз сваіх выведнікаў у Коўне і Берліне прыслала гэтыя весткі. Калі б не Луцкевіч, які адзін горача выступіў у маю абарону, то мая роля была б скончаная. Луцкевіч з націскам заявіў на патаемным пасяджэнні, што калі б Зямкевіч даваў падобную інфармацыю, то меў бы сто і адзін зручных выпадкаў, каб увесь сход з Брынкевічам на чале загадаць арыштаваць. Пры гэтым ён дадаў, што яго зусім не здзіўляе цікаўнасць Зямкевіча, які, як гісторык руху, павінен быць цікаўным і мусіць усё ведаць.

У любым разе мне падаецца відавочным, што абнародаванне выкрыцця ролі Брынкевіча было вялікай памылкай, як перадчаснае. Гэта папсавала мае планы і ўсю справу, бо пасля гэткага пярэпалаху ўсе сталі вельмі асцярожныя і стрыманыя, што вельмі ўскладняе справу, бо новыя эмісары Саветаў і Літвы могуць хавацца і акрамя 2–3 асоб не адкрывацца нікому.

Я не ведаю матываў рэдакцыі «Journal de Pologne», якімі яна кіравалася пры абнародаванні гэтай інфармацыі, аднак лічу, што яна павінна была ў гэтым разе паразумецца са Штабам, і тады, напэўна, яна б гэтага не друкавала.

Увесь мой план з Брынкевічам праваліўся. Цяпер ён дакладна не прыедзе, бо газеты як з Вільні, так і з Варшавы ў Менск і Маскву прыходзяць пастаянна.

Калі я з'яўляюся «канфідэнтам» II-га аддзела, то прашу і пра большы давер да мяне, якога ніколі не падвяду, і пра большую інфармацыю, якая мне можа дапамагчы падчас выведкі. У той жа час адбылося так, што я паехаў у Вільню, нічога не ведаючы, што пра ўсю справу ўжо надрукавана ў «Journal de Pologne», і гэта ледзьве не выключыла мяне з усёй справы. Я хацеў бы пазбегнуць такіх непрадбачаных абставін, бо горача імкнуся да мэты: здабычы пісьмовых звестак пра замежныя інтрыгі.

У Коўна былі пасланыя асцерагальныя лісты (гэта зрабіў Максім Гарэцкі), што Ластоўскі ў сваім коле мае здрадніка.

Паводле атрыманай адтуль інфармацыі, Ластоўскі падазрае Клаўдзія Душэўскага або Язэпа Варонку. Гэтым апошнім прыпісваюць кантакт з Польшчай, каб атрымаць дазвол на вяртанне дадому.

Настаўніцкі з'езд нічога цікавага не даў, акрамя рэзалюцый і абмеркавання прафесійных справаў.

З Літвы пастаянна дагэтуль чакаюцца два эмісары, літовец і беларус, для абмеркавання палітычных справаў.

З Менску прыязджаў Іван Некрашэвіч*, які заявіў, што ўся арганізацыя беларускага паўстання аддадзеная ў рукі

камуністычных «ячэек» па вёсках і мястэчках, за выключэннем буржуазнай Беларускай нацыянальнай рады. Сядзіба галоўнай управы павінна знаходзіцца ў Варшаве, кіруюць ёй Ратштэйн (Капыльскі)*, Карніцкі (Смаленскі)* і Завадскі (Кайрыкшта)*. Прозвішчы, пачутыя ад Некрашэвіча, падаю тут, бо яны павінны быць «мужамі даверу», якім трэба даваць інфармацыю і дапамогу ў начлезе. Некрашэвіч быў у Вільні 18 красавіка, на 19 прызначыў спатканне на кватэры ў Гарэцкага, але не прыйшоў на яго і знік.

Паводле старонніх вестак, Максім Гарэцкі атрымаў у красавіку вялікую колькасць агітацыйнай літаратуры з Менска, частку нявіннага зместу павінен мець у сябе, рэшту хавае на гарышчы ў тым самым доме.

Калі я яго прасіў, каб даў што-небудзь з выданняў мне, ён адмовіўся гэта зрабіць, сказаўшы, што нічога не мае.

Вельмі цікавым з’яўляецца ліст з Прагі Чэшскай да Луцкевіча ад Крамаржа[43].

Крамарж пытаецца пра звесткі аб польскім уціску беларусаў, просіць выслаць этнаграфічныя мапы, статыстычныя звесткі, падрабязны даклад пра беларускі рух, дзівіцца, чаму так мала выходзіць беларускіх газет, робіць прыпушчэнне, што гэта, мабыць, з прычыны ўціску. Урэшце, ён дае надзею на выдзяленне матэрыяльнай дапамогі на газеты і іншыя выданні, калі б хто прыехаў у Прагу для абмеркавання ўмоваў.

Гэты ліст (напісаны па-расейску) Луцкевіч даў мне пачытаць. Затым ён сказаў, што з Вільні ніхто паехаць не можа, бо не дадуць пашпарта, як не даюць і студэнтам, якія хочуць ехаць у Прагу. Адзінай асобай, якая магла б атрымаць пашпарт і паехаць, мог бы быць я.

Як доказ даверу да мяне Луцкевіч прапануе, каб я стараўся паехаць у Прагу, дзе зраблю ўсю справу найлепшым чынам, ува што Луцкевіч моцна верыць. Я на гэта адказаў, што ў прынцыпе не адмаўляюся, але і мне атрымаць пашпарт у Чэхію надзвычай цяжка, бо ў Варшаве ў Чэхію пашпарты даюць неахвотна, а акрамя таго ён вельмі шмат каштуе. Сказаў, што на гэта трэба

[43] Крамарж Карэл (1860–1937) — чэхаславацкі палітык, прэм’ер першага ўрада Чэхаславакіі.

мець найменш мільён. Луцкевіч адказаў, што, на жаль, справа стаіць так, што грошай ён не мае і даць не можа, на паслоў разлічваць нельга, бо яны ўжо наракаюць, што ён бярэ з іх завялікую даніну. Аднак ён вельмі мяне прасіў, каб грошай пазычыў і пастараўся паехаць. Казаў, што калі б яны атрымалі грошы з той ці іншай крыніцы, то, несумненна, выдаткі мне вярнулі б. Я адказаў, што ў фінансавым сэнсе адчуваю сябе вельмі дрэнна, не ведаю, ці ўдасца мне што пазычыць, а галоўнае, не ведаю, ці дадуць мне пашпарт. Пакуль жа Луцкевіч прасіў мяне паспрабаваць з пашпартам і даць яму пра гэта ведаць праз якога-небудзь пасла, які часта ездзіць у Вільню. Пакуль гэта справа стаіць, бо не ведаю, што рабіць.

Абурэнне на Дубейкаўскага[44], Ладнова[45] і Балаховіча[46] – велізарнае. Дубейкаўскі цалкам страціў крэдыт даверу ў беларусаў. Іх лісты[47] моцна страсянулі ўвесь беларускі лагер.

Ген. Сікорскага яны могуць падтрымаць толькі ў тым разе, калі Беларусь атрымае нейкія рэальныя саступкі, пакуль Дубейкаўскі ідзе галоўным чынам і адно толькі пра беларускую школу.

Пра вайну гавораць пастаянна. Некрашэвіч сцвярджае, што вайна павінна выбухнуць, у Расіі ўсё падрыхтавана, стрымлівае толькі Нямеччына сваёй палітыкай у дачыненні да Англіі. «Пабачым, – казаў Некрашэвіч, – як гэтыя ўсталяваныя і прызнаныя межы Польшчы лопнуць, а на Крэсах пачнуць ўладары ўзляцяць у паветра! Гэта будзе, бо мусіць быць!» Такія маюць быць перспектывы.

Варшава
23 красавіка 1923

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падтэчка 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 7 ТРАЎНЯ 1923 г.

[44] Дубейкаўскі (1867–1940) – беларускі дзеяч, старшыня беларускага камітэта ў Варшаве.

[45] Ладноў Яўген – беларускі палітык, у свой час старшыня беларускай дэлегацыі на Парыжскай мірнай канферэнцыі, агент польскай дэфензівы.

[46] Булак-Балаховіч Станіслаў (1883–1939) – генерал-маёр, камандуючы вайсковымі фармаваннямі пад беларускім сцягам падчас польска-савецкай вайны 1920 г.

[47] Гаворка ідзе пра змешчаную на старонках польскай прэсы дэкларацыю Л. Дубейкаўскага і Я. Ладнова з прыняццем факта прызнання Радай паслоў Лігі нацый усходніх межаў Польскай Рэспублікі.

У II аддзел Генеральнага штаба

інж. Рамуальда Зямкевіча

Рапарт

Выкрыцці ў беларускай справе пра камуніста Брынкевіча, агучаныя ў «Journal de Pologne» і паўтораныя прэсай, спачатку вельмі падарвалі давер да маёй асобы. Толькі дробязны аналіз гэтых вестак схіліў як Луцкевіча, так і іншых шукаць іх крыніцы за мяжой. Падазраюць у Коўне двух: Язэпа Варонку і Клаўдзія Душэўскага, што гэта яны інфармуюць французскія ўлады, каб пры іх дапамозе здабыць дазвол на вяртанне на радзіму. Адным словам, як у Вільні, так і ў Коўне ўзніклі сваркі, спрэчкі і лаянка на фоне ўзаемнай нянавісці, у выніку чаго Луцкевіч зусім парваў з Ластоўскім. З Коўнам цяпер падтрымліваюць кантакты толькі беларускія камуністы. Тарашкевіч шкадуе, што ўставіў у сваю прамову «з дымам пажараў»[48] , тлумачыць, што добра не ведаў, што гэта азначае і што гэта будзе мець такія наступствы, што яму польскія паслы не будуць падаваць рукі. Ксёндз Станкевіч[49] хоча ўсіх памірыць, каб падзелу больш не было, і з гэтай мэтай зандуе глебу ў Беларускім камітэце ў Варшаве[50]. Справа яшчэ будзе падвешаная, і высветліцца толькі пасля суда Якавюка, Баранава і кампаніі ў Беластоку.

Да гэтай пары абцяжарваў мне справу ў Вільні Дубейкаўскі, сістэматычна ачарняючы мяне ў вачах усіх, што рабіла эфект і шкодзіла мне. Цяпер як ён, так і Ладноў, які штосьці да мяне адчувае, робяць мне проста неацэнныя паслугі ў павелічэнні даверу да мяне і ўмацаванні майго становішча.

Справа наконт магчымасці вайны выглядае так, што бальшавікі яе прагнуць, але самі выступаць не хацелі б, таму чакаюць сігналу немцаў. Яны незадаволеныя Нямеччынай, што тая доўга не наважваецца. З маёй размовы з Некрашэвічам выцягнуў толькі тое, што момантаў для пачатку вайны было ўжо некалькі, што ўжо хацелі ў Маскве арыштаваць прадстаўнікоў польскіх уладаў (да рээвакуацыі маёмасці і людзей), каб мець іх у якасці закладнікаў, і толькі *«сабачка хвостом»* (так у арыгінале. – **А. Ч., А. П.**) немцаў перашкодзіла гэтаму. Але гэта нічога, хоць бы і ў час жніва, але вайны будзе.

[48] Ідзе пра прамову Тарашкевіча 28 кастрычніка 1923 г. у Сейме.

Ураджай Саветам добра прыдасца, а буржуазію таксама добра будзе *«потрепать»*, бо залішне ўзбагацілася і абраслася тыдзе. Гэта ўсё найбольш характэрнае, выцягнутае мною з ніякай размовы.

Затым вельмі пагрозліва выглядае справа ў галіне бяспекі. Таму як у Вільні беларускія арганізацыі не хочуць нават і слухаць пра ніякія паўстанні, «ячэйкам» загадана арганізоўваць банды і выступаць супраць «паноў», г. зн. адміністрацыі і грамадзянаў.

Абавязкова на чыгуначныя масты трэба паставіць вайсковую варту, бо плануюцца замахі на іх.

Пакуль жа ідзе гаворка пра правакацыю насельніцтва, каб магчы крычаць за мяжой, што народ сам паўстае ў выніку ўціску.

Літоўцам паабяцана, што яны атрымаюць Вільню і вялікую частку Віленшчыны і Гарадзеншчыны. Здаецца, пагадненне падпісана, на мапе межы дакладна азначаныя, з правам праходу Чырвонай арміі праз усю тэрыторыю Літвы.

У Вільні, як я даведаўся, падрабязныя звесткі пра «польскі ўціск» штотыдзень высылае ў Менск Максім Гарэцкі. У яго павінна знаходзіцца ўсялякая літаратура з Коўна, Берліна і Менска, якую ён нібыта трымае на гарышчы дома, у якім жыве. Варта было б гэтыя зборы ператрэсці.

Вось усё самае важнае, што было чуваць у апошнія дні.

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
7 траўня 1923

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падтэчка 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ

[49] Станкевіч Адам (1892–1949) – беларускі палітык, каталіцкі ксёндз, пасол польскага сейма (1922–1927).

[50] Беларускі камітэт у Варшаве – дзейнічаў у 1919–1927 гг., у значнай ступені знаходзіўся пад уплывам II аддзела Генеральнага штаба.

заявіў, што сарыйдзе некалі такая ноч, у якую ўсе асадніцкія калоніі могуць пайсці з дымам пажараў і пылам братняй крыві».

ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 9 ТРАЎНЯ 1923 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

інж. Рамуальда Зямкевіча

Рапарт

З траўня а 9-й гадзіне вечара ў Вільні сярод беларусаў ужо было вядома, што Беларускі камітэт у Варшаве ўдзельнічаў у шэсці з беларускім сцягам, на якім замест Пагоні быў толькі польскі арол. Цікава і незразумела, як так хутка і якім шляхам гэтая навіна дайшла да Вільні.

Учора, 8 траўня, я даведаўся ад кааператара Гапановіча[51], што прыехаў з Вільні, што ўрад Ластоўскага распушчаны, нібыта на патрабаванне Берліна. Калі гэта праўда, то я схільны меркаваць, што да гэтага магла спрычыніцца мая прыватная размова з агентам Літвы Петрунэлісам* у сакавіку гэтага года. У гэтай размове я біў на тое, што Ластоўскі вельмі наіўны і неасцярожны ў падборы людзей, што акцыя выклікання беларускага паўстання ў Польшчы была праведзена скандальна няўмела, непрафесійнымі вайскоўцамі. Петрунэліс слухаў гэта надзвычай уважліва. Да маёй крытыкі дзейнасці Ластоўскага я дадаў, што вынікам няўдалых спробаў паўстання будзе працэс, які дрэнна скончыцца, бо, падобна на тое, польскія ўлады маюць у руках неаспрэчныя доказы датычнасці самога літоўскага ўрада. Яшчэ я дадаў, што такой кампраметацыі літоўскаму ўраду можна было б пазбегнуць, калі б ён даверыў сродкі і план выканання ў надзейныя і прафесійныя рукі. Петрунэліс цалкам са мною пагадзіўся і вельмі мне дзякаваў за шчырасць.

Інфармацыю трэба яшчэ праверыць, і крытычна разгледзеўшы яе, магчымыя вынікі. Яна мае вялікую верагоднасць. Праверу вывучу на месцы ў Вільні.

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
9 траўня 1923

[51] Гапановіч Язэп – беларускі кааператар, адзін з вядучых беларускіх нацыянальных дзеячаў у

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падвечка 1.

Варшава

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 25 ТРАЎНЯ 1923 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

інж. Рамуальда Зямкевіча

Рапарт

Атрымаўшы позву Акруговага суда ў Беластоку для яўкі ў якасці сведкі ў справе беларускага пасла Якавюка, я выехаў з Варшавы 13 траўня. Судовае разбіральніцтва пачалося 14 траўня а 10 гадзіне раніцы.

Даведаўшыся, што, як сведку абароны, мяне будуць дапытваць няхутка, я пачаў асвойвацца ў сітуацыі, пазнаёміўся з актам абвінавачання, копію якога атрымаў ад карэспандэнта з Вільні пана Самойлы[52]. Затым, даведаўшыся, што сярод сведкаў на волі знаходзіцца жонка галоўнага атамана Скамароха (Шыманюка)[53], я пазнаёміўся з ёй, каб даведацца пра цікавыя для мяне, як гісторыка руху, падрабязнасці з жыцця змоўцаў у Белавежскай пушчы. Я не падмануўся, бо Шыманюкова даволі падрабязна распавяла мне пра свой сямітыднёвы побыт разам з мужам у пушчы. Жонка Скамароха Шыманюкова – вельмі прыгожая асоба, апранутая ў элегантны попельнага колеру англійскі касцюм, у чырвонай квяцістай хустцы, па-мастацку завязанай на галаве – звяртала на сябе ўсеагульную ўвагу. Я яе пастаянна і неадлучна суправаджаў, што моцна раздражняла паліцыю і тайных выведнікаў.

З расповедаў Шыманюковай, у якіх апошняя не хавала сваёй нянавісці да Веры Маслоўскай[54], я зразумеў, што тут адзіную жаночая рэўнасць, бо Скамарох з Верай Маслоўскай ездзіў, не слухаў, а жонку пакідаў адну. Вынікам гэтага было – беларускі скандалы на гэтай глебе Шыманюкова пастаянна рабіла ў пушчы, а пасля выкрыцця банды і яе арышту пачала ўсіх выдаваць.

[52] Самойла Уладзімір (1878–1941) – беларускі публіцыст і філосаф, літаратурны

Чаму Шыманюкова застаецца вольная, чаму не сядзіць побач з іншымі асуджаных, хоць была ў пушчы і дзяліла са сваім мужам нараваную здабычу – я зразумею пазней, бачачы асаблівыя позіркі на Шыманюкову з боку пальцэйскіх уладаў і тайнай выведкі. Гэта яны яе вызвалялі ўзяты пад апеку.

З вялікаю цікавасцю (Мацей Бутэра (1896–1982) – беларускі дзеяч, адзін з арганізатараў беларускага нацыянальнага руху ў 1-й палове 1920-х гг. Ён быў сведкам гэтага суда, і ў сваіх успамінах ён пакінуў нам вельмі цікавае апісанне Чорта, што Чорт знаходзіцца тут, у судзейскім крэсле, мяне (Станкевіча Аляксандра – палітычны дзеяч, адзін з арганізатараў беларускага нацыянальнага руху ў 1-й палове 1920-х гг. Ён быў сведкам гэтага суда, і ў сваіх успамінах ён пакінуў нам вельмі цікавае апісанне Чорта, што Чорт знаходзіцца тут, у судзейскім крэсле, мяне (Міцкевіч Станіслаў (1881–?) – палітычны дзеяч, адвакат. Адвакатаю тут свае назіранні і ўражанні, аднак не раблю з гэтага нейкіх высноў (Ярэцкі Станіслаў (1892–1955) – палітычны дзеяч, кіраўнік II аддзела III вайсковай акругі з сядзібай у Горадні.

Беларускі нацыянальны палітычны канферэнцыя адбылася ў Празе ў верасні 1921 г.

Адвакат Урублеўскі рашуча супраціўляўся гэтаму, сцвярджаючы, што гэта было б яскравым выклікам і пашкодзіла б справе, а абарону абцяжарыла б. Праект запрашэння ўкраінцаў падаў Антон Луцкевіч.

Заганы ў працэсе былі велізарныя. Першаснае следства было праведзена надзвычай няўмела, сведкі як з боку абвінавачання, так і з боку абароны зусім не былі ізаляваныя. Супраць гэтага заяўляў пратэст мясцоваму беластоцкаму пракурору адвакат Ст. Міцкевіч[59] з Вільні, аднак у выніку просьбы адвакатаў і пракурора, а таксама суддзяў, ён адклікаў свой пратэст.

Са сведкаў, якія давалі паказанні ў гэтай справе, капітан Ярэцкі[60] з Горадні, нягледзячы на тактоўнасць, пераканальнасць і лагічнасць сваіх вельмі абцяжарвальных для падсудных паказанняў, можа быць, мімаволі засыпаў Дубейкаўскага. Капітан Ярэцкі выказаўся, што Дубейкаўскі ад польскага ўрада, а як іншыя зразумелі, на загад ці на

[53] Шыманюкова Лізавета — жонка Германа Шыманюка.

[54] Маскоўскае (Маскоўскі тэатр) — Беларускі дзяржаўны тэатр імя Янкі Купалы, адзін з найстарэйшых тэатраў Беларусі, заснаваны ў 1920 г. у Маскве.

[55] Чорт — дарэвалюцыйны мужчынскі прозвішча, якое ў маіх родных часцей сустракаецца ў Расіі.

[56] Буцэвіч Сымон (1883–1973) — беларускі дзеяч, адзін з арганізатараў Беларускага нацыянальнага руху ў 1-й палове 1920-х гг. Ён быў сведкам гэтага суда, і ў сваіх успамінах ён пакінуў нам вельмі цікавае апісанне Чорта, што Чорт знаходзіцца тут, у судзейскім крэсле, мяне (Станкевіча Аляксандра – палітычны дзеяч, адзін з арганізатараў беларускага нацыянальнага руху ў 1-й палове 1920-х гг. Ён быў сведкам гэтага суда, і ў сваіх успамінах ён пакінуў нам вельмі цікавае апісанне Чорта, што Чорт знаходзіцца тут, у судзейскім крэсле, мяне (Міцкевіч Станіслаў (1881–?) – палітычны дзеяч, адвакат. Адвакатаю тут свае назіранні і ўражанні, аднак не раблю з гэтага нейкіх высноў (Ярэцкі Станіслаў (1892–1955) – палітычны дзеяч, кіраўнік II аддзела III вайсковай акругі з сядзібай у Горадні.

[57] Станкевіч Аляксандр – палітычны дзеяч, адзін з арганізатараў беларускага нацыянальнага руху ў 1-й палове 1920-х гг. Ён быў сведкам гэтага суда, і ў сваіх успамінах ён пакінуў нам вельмі цікавае апісанне Чорта, што Чорт знаходзіцца тут, у судзейскім крэсле, мяне (Станкевіча Аляксандра – палітычны дзеяч, адзін з арганізатараў беларускага нацыянальнага руху ў 1-й палове 1920-х гг. Ён быў сведкам гэтага суда, і ў сваіх успамінах ён пакінуў нам вельмі цікавае апісанне Чорта, што Чорт знаходзіцца тут, у судзейскім крэсле, мяне (Міцкевіч Станіслаў (1881–?) – палітычны дзеяч, адвакат. Адвакатаю тут свае назіранні і ўражанні, аднак не раблю з гэтага нейкіх высноў (Ярэцкі Станіслаў (1892–1955) – палітычны дзеяч, кіраўнік II аддзела III вайсковай акругі з сядзібай у Горадні.

[58] Урублеўскі Тадэвуш (1858–1925) — польскі адвакат.

[59] Міцкевіч Станіслаў (1881–?) — палітычны дзеяч, адвакат.

[60] Ярэцкі Станіслаў (1892–1955) — палітычны дзеяч, кіраўнік II аддзела III вайсковай акругі з сядзібай у Горадні.

[61] Беларусы мелі намер, акрамя адваката Урублеўскага, запрасіць для абароны толькі адвакатаў-украінцаў са Львова.

даручэнне гэтага самага ўрада быў высланы на беларускі з'езд у Прагу Чэшскую[61]. Капітан Ярэцкі даваў паказанні ў якасці сведкі раней за мяне, у зале я тады быць не мог, аднак усе беларусы мне казалі, што Дубейкаўскага нарэшце выкрылі.

Гэта вельмі прыкрая гісторыя, але пасля таго, што здарылася, Дубейкаўскі ўжо выключаны з беларускіх справаў.

Падчас чакання часу свайго сведчання, сярод сведкаў я пазнаў асобу, якая 4 сакавіка 1919 года ў Менску, калі я, арыштаваны, знаходзіўся ў надзвычайцы, зрабіў асабісты вобыск мяне, забраўшы ў мяне грошы, залаты гадзіннік і бякешу на футры. Цяпер я запытаўся ў Шыманюковай, як гэтага чалавека завуць, і даведаўся, што яго прозвішча – Эдвард Лянкевіч[62]. Лянкевіч таксама мяне пазнаў і адразу ж пачаў за мною сачыць. Баючыся арышту і ведаючы, што адбылося ў Беластоку і Горадні з Дубейкаўскім, калі ён быў незаконна арыштаваны, я стараўся не хадзіць адзін, а набіраў сабе кампанію з 3 ці 4 чалавек.

Як сведка, я даваў паказанні толькі на пяты дзень суда, у пятніцу 18 траўня. Запытаны пра Якавюка, я паведаміў, што ведаю яго з Горадні з 1920 года, калі ён быў сакратаром Беларускага нацыянальнага камітэта ў Горадні. Сказаў, што ён быў маім падначаленым на чыгунцы ў 1920 годзе пры бальшавіках, працуючы як спецыяліст на тэлеграфе. У 1920 годзе не ставіўся варожа да польскай дзяржавы, не быў сябра Беларускага камітэта, ні як начальнік чыгуначнага тэлеграфа пры бальшавіках, а пацвердзіць гэта я магу таму, што ён ведаў, што ў мяне на дыстанцыі працуюць два польскія афіцэры і пара жаўнераў, і не толькі нікога не выдаў у Горадні ў бальшавікам, але змест усіх тэлеграм, якія прыходзілі ў адзіным дзейным чыгуначным тэлеграфе, паведамляў мне. Потым я гэта перадаваў афіцэрам, а тым самым і арганізацыі ПАВ[63]. Дадаў, што Якавюк быў і ёсць беспартыйным, пры паляках на чыгунцы як праваслаўны служыць не мог, а сродкі на жыццё здабываў гандлем і дробнай спекуляцыяй. Такога Якавюка, як лаяльнага грамадзяніна Польскай Рэспублікі, я ведаў да 1921 года, бо пазней, выехаўшы з Горадні, я яго ўжо не бачыў і пра пазнейшую яго дзейнасць нічога не ведаю.

62 Эдвард Лянкевіч (1891–1925) – беларускі дзеяч, адзін з арганізатараў Беларускага нацыянальнага камітэта ў Горадні ў 1920 годзе. Пасля вайны працаваў на чыгунцы, у 1923 г. пераехаў у Вільню, дзе і памёр у 1925 г.

Пасля гэтага пракурор запытаўся мяне пра Беларускі камітэт у Горадні. Я даваў адказ пра дзве пракламацыі, выдадзеныя з дазволу вайсковай цэнзуры.

Затым пракурор дзівіцца, што я, паляк, мог належаць да Беларускага камітэта, і спытаўся, ці, калі б тут існаваў Кітайскі камітэт, то я таксама належаў бы да яго? Я адказаў, што пытанне лічу вельмі несувымерным і далёкім геаграфічна, дадаўшы, што, як асоба з вольнай і незвязанай індывідуальнасцю, не бачу прычын, калі б я, напрыклад, ведаў кітайскую мову, быў прыняты ў такі камітэт і мяне гэта з нейкіх прычын цікавіла б, чаму да Кітайскага камітэта не мог бы належаць.

Тут адвакат Урублеўскі запытвае, ці выдаў я перад вайной дзве гістарычна-бібліяграфічныя працы на беларускай мове[64]. Я адказваю, што гэта сапраўды так, адна мая праца – пра Кіркора, а другая – пра Баршчэўскага. Адвакат Урублеўскі пытаецца мяне, ці ведаю я, што па маіх працах ужо знакаміты польскі бібліёграф Эстрайхер[65] рабіў даклады на навуковым пасяджэнні Акадэміі навук у Кракаве, і, нарэшце, ці паляка на беларускай мове, ацаніў іх вельмі прыхільна? Я адказаў, што даведаўся пра гэта толькі праз год ці два ад той самай Акадэміі, беларускага этнографа пана Міхала Федароўскага з Варшавы.

Пасля адваката Урублеўскага мяне запытвае генерал Бабянскі[66], ці існуюць беларускія школьныя падручнікі для сярэдняй школы, а менавіта, напрыклад, падручнікі фізікі або матэматыкі. Я адказваю, што такія падручнікі існуюць: фізіка інжынера Трэпкі[67] ўжо выйшла з друку, матэматыка гатовая; трыганаметрыя інжынера Душэўскага друкуецца ў Кароляўцы, іншыя шматлікія падручнікі, падрыхтаваныя да друку, чакаюць

[63] ПАВ (Польская арганізацыя вайсковая) – тайная польская вайсковая арганізацыя, якая дзейнічала з 1914 г. пад кіраўніцтвам Ю. Пілсудскага ў Каралеўстве Польскім, Галіцыі, ва Украіне, Беларусі і Расіі.

[64] Аб кнігах Я. Карловіча пісаў Янка Купала ў артыкуле «Адзін з нашых кірункоў у беларускай бібліяграфічна-бібліятэчнай справе» (1925).

[65] Эстрайхер Кароль (1827–1908) – польскі гісторык, бібліёграф, аўтар 25-тамовай гадаўшчыны «Бібліяграфія польскіх пісьменнікаў XIX

у рукапісе сваіх выдаўцоў.

Тут адвакат Міцкевіч з Вільні пытаецца ў мяне, ці ведаю я Эдварда Лянкевіча.

Адказваю, што гэта прозвішча я пачуў толькі тут. У асобе ж Лянкевіча я пазнаю таго, хто служыў у сакавіку 1919 года ў Менску ў надзвычайцы, асабіста мяне абшукаў і забраў грошы, 65 латы гадзіннік і бяскошука футры. Такі характэрны твар, як у Лянкевіча, вельмі лёгка запомніць, асабліва ў такіх абставінах, як у надзвычайцы, дзе дрыжыш за сваё жыццё і тожны твар ката, як фотакартка, назаўсёды застаецца ў памяці. Пракурор, пазнаўшы свайго пераследавальнення, пытаецца ў мяне, ці праўды, што 4 гады я пастаянна Лянкевіча як тую самую асобу з надзвычайкі. Выкліканы з залы Лянкевіч, пад якім згінаюцца ногі, выходзіць на трыбуну залы для поўнай стаўкі. На пытанне пракурора адказваю: «У Лянкевічу я, безумоўна, пазнаю таго самага, які абрабаваў мяне ў надзвычайцы, рашуча гэта сцвярджаю і зазначаю, што бяру на сябе ўсю адказнасць за праўдзівасць маіх словаў. Мушу дадаць, што гэты самы Лянкевіч ужо пару дзён пастаянна за мною сочыць, ходзіць за мною з нейкімі дзвюма асобамі, ні на адзін момант не спускаючы з мяне вока».

Тут Лянкевіч, парыруючы маё абвінавачанне, прызнаўся, што ходзіць за мною, бо даведаўся, што я хаджу ў гатэль, дзе жыве Баранаў, а гатэльная служба яму сказала, што я з Баранавым бачыўся. Толькі пасля гэтага ён аспрэчыў, што служыў у надзвычайцы ў Менску, сцвярджаючы, што тады ён быў не ў Менску, а ў Гомелі.

Пракурор перарывае яго паказанні, кажа яму ісці на месца, а мне паказвае пашпарт Баранава і пытаецца, ці бачыў я такія беларускія пашпарты і ці ведаю, хто іх выдае. Пасля прагляду пашпарта я заяўляю, што такія самыя пашпарты ў Варшаве, у Беларускім камітэце, выдаваў у 1920 і 1921 гадах Дубейкаўскі. Пракурор дзівіцца і рашуча сцвярджае, што гэта падман, бо гэта быў бы ўрад ва ўрадзе, што абсалютна не можа прымацца, бо з'яўляецца нелагічным. Я адказваю, што, не ўваходзячы ў разбор лагічнасці ці нелагічнасці, я сам бачыў, як Дубейкаўскі выдаваў у Варшаве такія пашпарты і што іх было выдадзена

сталецця: успаміны ў 60-ю гадаўшчыну смерці» выйшлі ў 1911 г.

* Эстрайхер (Эстрэйхер) Караль Юзаф Тэафіл (1827–1908) – польскі бібліограф, дырэктар Ягелонскай бібліятэкі ў Кракаве.

Дзеля таго што ён памёр яшчэ да выдання кнігі Зямкевіча, пазнаёмленне з ім адбылося толькі праз яго сына Станіслава (1867–1939), таксама бібліографа.

** Пяюнскі Аляксандр (1853–1931), польскі драматычны дзеяч, адвакат.

*** Трэпка Пеканда Антон (1871–1942) – беларускі дзеяч, дырэктар Віленскай беларускай гімназіі.

каля 15 000. Пракурор пытаецца, ці бачыў я на іх польскую візу? Адказваю, што не, бо мяне гэта не цікавіла, аднак ведаю, што амерыканскія, французскія, англійскія і нават, вядома, нямецкія, даваліся, таму і польская павінна была быць. Пра Баранава я сказаў, што ў Празе ён, мабыць, быў без польскага пашпарта, таму яму далі там гэты пашпарт, каб меў хоць бы якое пасведчанне асобы. Тут ідуць тлумачэнні, з якіх вынікае, што Баранаў без пашпарта перайшоў так званую зялёную мяжу. На гэтым мае паказанні скончыліся.

Пракурор Камінскі*, дапытваючы сведкаў з заўзятасцю і нянавісцю да левых партый і няпольскіх нацыянальнасцяў, паказаў сябе перш за ўсё як зацяты эндэк[68]. Так яго ўсе без выключэння ў зале называлі. Суддзі таксама ўсе падтрымліваюць прынцыпы гэтай партыі. Незадаволенасць мною была велізарная, што я пад прысягаю пасмеў сказаць праўду, якая ім не падабалася. Усе карэспандэнты былі толькі з эндэцкіх газет, у выніку чаго оргія маны і паклёпаў, якая не мела нічога супольнага з праўдай, разлілася па прэсе. Адваката Урублеўскага зрабілі рэнегатам, генерала Бабянскага – маскаляфілам, а мне прыпісалі ўдзел у бандзе паўстанцаў.

Абурэнне гэтай маной у польскай эндэцкай прэсе ўзрушыла ўвесь Беласток і паўздзейнічала нават на суддзяў, якія вынеслі даволі мяккі прысуд. Дабівацца перагляду будуць упершыню Веры Маслоўскай.

Вера Маслоўская паводзіла сябе выключна добра і годна. На пытанні заўсёды адказвала на выдатнай, чыстай, нават вытанчанай беларускай мове. Заўсёды ўсмешлівая, спакойная, бесклапотная, без ценю робленай штучнасці, яна здабыла сімпатыі і зычлівасць не толькі публікі, але і суддзяў. Акрамя, вядома, пракурора. Бо той пастаянна выводзіўся ёю і адвакатамі з раўнавагі. На абвінавачанне пракурора, што Маслоўская ў бандзе Шыманюка брала ўдзел у п'янстве і оргіях, падсудная з абурэннем кляймуе нізасць пракурора, які адзіны з усіх намагаецца прынізіць чалавечую годнасць абвінавачаных, прыпісваючы ім брудныя матывы і мэты, і засведчвае, што пан пракурор штодзень папівае гарэлачку ці лікёры, а яны, беднякі, ледзьве раз на год маюць такое свята.

[68] Эндэкі – члены Польскай нацыянальна-дэмакратычнай партыі.

Калі пракурор дамагаўся кары бестэрміновай цяжкай турмы для Маслоўскай, падсудная засмяялася яму ў вочы.

Маёй задачай падчас гэтага працэсу быў уплыў на беларусаў, як паслоў, так і сенатараў, якія пастаянна па некалькі чалавек прысутнічалі на працэсе, каб не раздзьмухваць гэты працэс да вялікіх памераў і не рабіць з яго рэкламы.

Я лічыў, што для польскай справы так было б лепей. Адвакаты – генерал Бабянскі, Урублеўскі і Міцкевіч – пагадзіліся са мною і з усіх сілаў уплывалі на падсудных, каб паводзілі сябе з годнасцю, прыстойна і без эксцэсаў. Падсудныя хацелі пасля прысуду, пра вынясенне якога не сумняваліся ані трохі, спяваць рэвалюцыйныя беларускія песні: «Адвеку мы спалі» і «Не нам, беларусам, не нам маскалям ці ляхам служыць». Як толькі я даведаўся пра гэта, то прасіў генерала Бабянскага, каб любой цаной адгаварыў падсудных ад гэтага. Яму гэта зрабіць удалося. Наступныя мае намаганні, каб значэнне гэтага руху зменшыць, асмяшыць яго, што баба была галоўнай арганізатаркай, таксама выдатна правёў генерал Бабянскі. Ён сказаў, што рух хацеў выклікаць Скамарох, што значыць блазен, што такі рух не мог разлічваць на поспех, а сам Скамарох быў ашуканцам, які браў грошы за сапраўдных асоб, але якія нават не ведалі, што запісаныя ў банду. Гэта былі «мёртвыя душы» новага тыпу, бо літоўская кантрольная камісія з Коўна на месцы правярала існаванне асоб, запісаных у банду. Як высветлілася на працэсе, шмат асоб не мелі ніякіх кантактаў з бандай Скамароха, а іх прозвішчы былі знойдзеныя ў спісе, які Скамарох пасылаў у Мерач і Коўна, а таксама ў копіі з ягонага архіва, захопленага ў Белавежскай пушчы. За гэтых асоб Скамарох узяў грошы і падзяліў іх са сваімі падначаленымі.

Удзел Коўна ў выкліканні беларускага паўстання быў на працэсе відавочна даказаны.

Адвакатаў генерала Бабянскага і Урублеўскага я вельмі прасіў, каб не ставілі пад сумненне паказанні сведкі Лянкевіча. Я сцвярджаў, што хаця ён служыў у надзвычайцы, а паказанні, інспіраваныя паліцыяй і ўправай сакрэтнай выведкі, прачытаў на памяць у судзе, як вучань, ён, аднак, сказаў шмат праўды, з

якой трэба лічыцца. Таму ні Урублеўскі, ні Бабянскі пры абароне падсудных зусім не абапіраліся на мае паказанні, падыходзячы да справы з іншага боку, а менавіта супярэчнасці паказанняў Лянкевіча з паказаннямі сведкаў абвінавачання.

Якавюк у выніку маіх паказанняў і разбіцця абвінавачанняў абаронай быў апраўданы.

Паслы і сенатары перад маімі паказаннямі самі горача жадалі, каб на пытанне, якой я нацыянальнасці, я адказаў, што польскай. Яны мяне лічаць беларусам, аднак такія паказанні лічылі ў гэтым выпадку адзіна карыснымі для справы. Я пагадзіўся на гэта без цяжкасцяў.

Удзячнасць мне беларусы пасля апраўдання Якавюка выказалі аднагалосна. Адразу ж мяне памірылі з Баранавым, з якім я з 1920 года быў у дрэнных адносінах. Грамілі Дубейкаўскага, які так злоўжыў іх даверам. Рак-Міхайлоўскі разам з ксяндзом Станкевічам сказалі мне, што яшчэ ў снежні мінулага года Дубейкаўскі казаў ім, што Зямкевіч служыць у дэфензіве. Яны, аднак, гэтаму не верылі.

Сёння маю ў беларусаў такі давер, якога яшчэ ніколі не меў.

Генерал Бабянскі вельмі зацікавіўся маёй асобай і маімі палітычнымі поглядамі. Хоча працаваць са мною ў палітыцы.

З боку пракурора Камінскага і суддзяў была спроба прасіць умяшання ў працэс маршала Пілсудскага. Гэта звёў на нішто адвакат Урублеўскі, зазначыўшы, што да справы гэта не мае дачынення і не трэба яе заблытваць.

Ксёндз Станкевіч стаў старшынём Беларускага клуба ў сейме. Ён прадстаўляе памяркоўны і шчыры напрамак. Хоча прымірыць беларускія інтарэсы і памкненні з польскімі і імкнецца да аб'яднання і паразумення з Беларускім камітэтам у Варшаве. Пытаў мяне, якую думку маю пра Ладнова. Я даў пра Ладнова меркаванне як мага больш прыхільнае, раячы пачаць з ім перамовы.

Хутчэй за ўсё, беларусы будуць патрабаваць толькі выдалення

Дубейкаўскага.

Падчас працэсу ў Беластоку жонка Скамароха Шыманюкова абвінаваціла адваката Міцкевіча, што ён ёй нібыта пагражаў, што за яе паказанні ёй будзе блага. Пракурор Камінскі падае скаргу на Міцкевіча ў адвакацкую раду, дамагаючыся выдалення яго з адвакатуры. Як чалавек, які пастаянна суправаджаў Шыманюкову, я быў сведкам словаў Міцкевіча і, даючы паказанні суду, аспрэчыў яе словы. Тут выявілася правакатарская штучка, інспіраваная паліцыяй праз Шыманюкову.

Баранаў у апеляцыйным судзе будзе, безумоўна, апраўданы, бо доказаў яго віны чорным па белым няма.

Беларускі клуб у сейме будзе галасаваць за кабінет Сікорскага. Разам са сваімі ворагамі – эндэкамі ён пайсці не можа.

Таму як мае пазіцыі і значэнне ў беларусаў незвычайна ўзмацніліся і з маім словам і асобай пачалі вельмі лічыцца (у гэтым асабліва дапамаглі Бабянскі, Міцкевіч і Урублеўскі), буду прасіць інструкцыяў, наколькі і ці наагул павінен я працаваць з мэтай збліжэння з Ладновым і Камітэтам у Варшаве ўсяго клуба.

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
25 траўня 1923

P. S. Адзін з асуджаных на працэсе, літоўскі падпаручнік Казімір Вайткевіч[69], які быў апраўданы судом, павінен быць аддадзены ў распараджэнне ваяводскіх уладаў. З расповедаў адваката Урублеўскага выяўляецца, што віленскія літоўцы хацелі абараняць Вайткевіча і Мацея Грыгаса[70] і абарону даручалі Урублеўскаму. Аднак з Коўна прыйшоў загад, каб на гэтую справу не давалі ні пфеніга, бо падпаручнік Вайткевіч з'яўляецца вайсковым дэзерцірам і прайграў у карты 60 тысячаў літаў дзяржаўных літоўскіх грошай, а Мацей Грыгас – кантрабандыст, які за свае справы, спекуляцыю і кантрабанду мае крымінальныя справы ў Літве. Абодва падсудныя мелі

дзяржаўных абаронцаў і былі апраўданыя польскім судом. Цяпер узнікае пытанне, што рабіць з замежным грамадзянінам Вайткевічам, які лічыць сябе палякам і мае сваякоў у Варшаве?

ЦВА. ІІ аддзел Генеральнага штаба. Сігн. І.303.4.2664. Арыгінал. Машынапіс 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў ІІ АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 25 ТРАЎНЯ 1923 г.
Асабіста Таемна

У ІІ аддзел Генеральнага штаба

Паводзіны кіраўніцтва паліцыі і таемнай паліцэйскай дэфензівы на працэсе ў Беластоку быў залішне яскравым і кідаліся ў вочы. Я не кажу пра недарэчны і грубы нагляд за маёй асобай, аднак такі самы нагляд за пасламі, сенатарамі і сведкамі з боку абароны выклікаў паўсюднае абурэнне ўсіх у Беластоку і, падобна на тое, выкліча інтэрпеляцыю ў сейме.

Адносіны сведкі варшаўскай дэфензівы Тустаноўскага[71] да жонкі Скамароха Шыманюковай, вячэра гэтай пары ў гатэлі на вачах сведкаў, паслоў і сенатараў і наступнае зацягванне Шыманюковай у нумар Тустаноўскага адбылося на вачах усіх, скіравала грамадскую думку супраць паліцыі і дэфензівы, наглядна паказаўшы, чаму жонка бандыта не сядзіць на лаве падсудных.

Паліцыя і дэфензіва цалкам здыскрэдытавалі сябе на гэтым працэсе.

На другі дзень у зале сведкаў узнік агульны смех, калі сваяк Шыманюка звярнуўся да Шыманюковай, якая вярталася з горада а 10-й гадзіне раніцы: *«Гдзе ты, халера, бадзялася цэлую ноч, гдзе спала?»*

Гэта адзін факт. Факты ж публічнага мацання ў судзе Шыманюковай функцыянерам паліцыі – кур'ерам суда, звярталі на сябе ўсеагульную ўвагу.

[69] Вайткевіч Казімір – паручнік літоўскай арміі, паляк паводле нацыянальнасці, абвінавачаны ў шпіянажы.

[70] Грыгас Мацей – селянін, жыхар Троцкага павету Віленшчыны, літовец паводле нацыянальнасці, абвінавачаны ў перавозе партызанаў праз мяжу і захоўванні агітацыйнай літаратуры.

[71] Тустаноўскі Мечыслаў – агент варшаўскай таемнай паліцыі, які выкарыстоўваўся для падсаджвання

Адвакат Урублеўскі, напрыклад, распавядаў, што ён уласныя вочы бачыў, як Шыманюкова сядзела на падваконніку, а не яе абдымаў і цалаваў.

Я лічу, што не шкодзіла б звярнуць увагу адказных асоб на недапушчальнасць такіх паводзін урадавых функцыянераў, якія зніжаюць аўтарытэт урада.

Таксама не зашкодзіла б звярнуць увагу і расследаваць, з прычыны чаго жонка Скамароха не сядзела на лаве падсудных, а была залічаная да ліку прывілеяваных сведкаў, што было абразай для сумленных жанчын, якія былі выкліканыя для дачы праўдзівых паказанняў.

Гэтыя заўвагі асмельваюся далучыць да рапарта.

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
25 траўня 1923

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падтэчка 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 1 ЧЭРВЕНЯ 1923 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

інж. Рамуальда Зямкевіча

Рапарт

У Беларускім клубе цяпер запанавалі спрэчкі і рознагалоссі. Ідзе гаворка пра ўладу старшыні клуба. Тарашкевіч ад старшынства пасля ягонай прамовы «З дымам пажараў» адхілены, а выбраны ксёндз Адам Станкевіч. Ксёндз Станкевіч пасля арганізацыі абароны ў беластоцкім працэсе, а гэта ён правёў добра, залішне памяркоўны, згодніцкі, што вельмі не падабаецца праваслаўным паслам, такім, як Кахановіч[72], Каліноўскі[73], Баранаў, Аўсяннік і Ярэміч[74]. Яны хочуць яго

у ўласныя, Зямкевіч мэтаю атрымання інфармацыі ад асоб, якія знаходзіліся пад следствам.

скінуць.

Ксёндз Станкевіч вырашыў і рэкамендаваў галасаваць за кандыдатуру Сікорскага, аднак на галасаванне праз хваробу не прыехаў, і тады Тарашкевіч і кампанія ў паразуменні з украінцамі самавольна вырашылі галасаваць супраць урада.

Пасол Аўсяннік атрымаў ад украінцаў на працэс і апеляцыю беластоцкага прысуду 10 мільёнаў марак. Беларускія паслы і сенатары гэты працэс праводзілі за кошт сваіх пасольскіх пенсій, і цяпер, як кажуць, згалелыя. Грошай на выдаткі гэтага і апеляцыю яны не маюць. Украінцы абяцалі дапамагчы. Адкуль паходзяць гэтыя грошы (украінцы ў 1403 г. былі ў такім жа нысце, што і беларусы), пазбаўлены мандата з прычыны адсутнасці грамадзянства.

72 Кахановіч Міхаіл (1882–1934) – беларускі палітык, пасол польскага сейма (1922–1925).

73 Кавяжын Уладзімір (1889–1940) – беларускі палітык, пасол польскага сейма (1922–1923).

77 Ярэміч Фабіян (1891–1938) – беларускі палітык, пасол польскага сейма (1922–1935).

Працэсам пастой Браварава і Якавюка вельмі зацікавіліся Менск і Масква. Антон Луцкевіч атрымаў ліст з Менска ад Цішкі Гартнага (Змітра Жылуновіча), беларускага камуніста, у якім пішацца, што выкрыты былы агент надзвычайкі Эдвард Лянкевіч (партыйная мянушка Сцяпан Маклак), цяперашні агент паліцэйскай дэфензівы ў Беластоку, знаходзіцца ў спісе збеглых і вышукваных злачынцаў савецкай улады. У лісце Жылуновіч просіць пра перадачу ніжэйпадпісанаму паклонаў і прывітання. На беластоцкім працэсе былі два прадстаўнікі ад савецкай Беларусі, якія знаходзіліся ў зале для публікі, што пускалася па білетах. Так піша Жылуновіч да Луцкевіча.

Луцкевіч атрымаў новы ліст ад Крамаржа. Ён дамагаецца завязання пастаяннага кантакту з беларусамі, абяцае фінансавую дапамогу для руху, асветніцкую дапамогу ў гімназіях і чэшскім універсітэце для беларускай моладзі, якую перасле дуюць і не прымаюць у польскія навучальныя ўстановы. Акрамя таго, Крамарж просіць, каб нехта прыехаў у Прагу для абмеркавання палітычных спраў і ўзгаднення дзеянняў.

На Луцкевіча віленская дэфензіва павінна звярнуць большую ўвагу. Здабыча такіх лістоў была б каштоўным доказам для польскага ўрада пры дэманстрацыі Еўропе махінацыяў ворагаў. Толькі адзін ці два раптоўныя, неспадзяваныя вобыскі ў адпаведны час у Антона Луцкевіча ў Вільні маглі б даць у рукі гэты фактычны corpus delicti. Калі ідзе гаворка пра карысць

дзяржавы, не павінна быць слабасці і маруднасці. Іншага спосабу здабычы такіх дакументаў я не бачу.

У найбліжэйшы час я павінен паехаць у Вільню, каб здабыць з крыніц больш падрабязныя навіны, бо тыя, што я падаю, паходзяць з другіх рук (ад Тарашкевіча і Рак-Міхайлоўскага).

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
1 чэрвеня 1923[75]
ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падпісанкі 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 26 ЧЭРВЕНЯ 1923 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

Пасол сейма Якавюк у размове са мною адзначыў, што сярод беларускіх паслоў пэўная група (Тарашкевіч, Ярэміч, Кахановіч, Аўсяннік, пазбаўлены мандата Каліноўскі, Рагуля) мае нейкія свае сакрэтныя нарады, на якія не дапускаюць беспартыйных. Яны сцвярджаюць, што на партыйным патаемным сходзе Якавюк як беспартыйны быць не можа. Ксёндз Станкевіч у размове са мною пацвердзіў гэтую інфармацыю.

Якавюк паведаміў мне, што ён падслухаў размову Ярэміча з Кахановічам, з якой даведаўся, што адтуль былі атрыманыя дзесяць тысяч долараў. Ксёндз Станкевіч казаў мне, што яны атрымалі вялікую суму (сумы не акрэсліў) долараў з Амерыкі. Улічваючы, што праца сярод беларусаў у Амерыцы толькі пачатая Чарапуком і адтуль пакуль ідуць толькі сумы на 1–2 долары, словы Якавюка трэба лічыць верагоднымі.

Якавюк радуецца свайму вызваленню і хацеў бы неяк задакументаваць сваю лаяльнасць да польскай дзяржавы.

Асабіста я цалкам веру Якавюку.

Я яму сказаў, што наймацней і найлепей было б, каб ён

[75] На рэпарт накладзена рэзалюцыя: «Да п. маёра Чарноцкага. Далучаю з просьбай пра інструкцыю: ці рабіць з гэтага рапарта высновы і пачынаць судовую справу?» Чарноцкі Віктар (1886–1925) – кіраўнік нацыянальнага сектара II аддзела Генеральнага штаба.

прадэманстраваў свае пачуцці або ўступленнем у клуб Ількава[76], або ў «Вызваленне», або стварэннем асобнай беларускай групы, напрыклад, з паслом Мятлой[77], які не пагаджаецца з працай Тарашкевіча, Ярэміча і Кахановіча[78].

Прашу інструкцыяў, у якім напрамку працаваць: пакінуць Якавюка сабе як каштоўнага інфарматара ці з яго дапамогай унесці расклад у Беларускі клуб?

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
26.VI.1923

P. S. Неабходная мая паездка ў Вільню дзеля выведкі пра адносіны з Менскам і атрыманыя грошы. Але сам я сяджу без ніводнай маркі, бо цяпер канец месяца, ды і хвароба вычарпала мае сродкі. Таму прашу авансу, які пасля будзе вылічаны.

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Паштэчка 1.

[76] Ількіў Міхаіл (1890–1940) – украінскі палітык паланафільскага напрамку, у 1922–1927 старшыня Украінскага сялянскага клуба (т. зв. Хлебаробаў) у польскім сейме.

[77] Мятла Пятро (1890–1936) – беларускі палітык, пасол польскага сейма (1922–1927).

[78] Урэшце Якавюк вырашыў засведчыць свае пачуцці падачай заявы на залічэнне сваёй асобы як былога афіцэра расійскай арміі ў рэзерв польскага войска. Пасля разгляду яго заявы спецыяльны афіцэрскі трыбунал на сваім пасяджэнні 27 ліпеня 1923 г. прыняў рашэнне, што «былы афіцэр расійскай арміі Якавюк Сымон не можа быць афіцэрам Польскага Войска ў запасе», бо «з'яўляецца рашучым ворагам польскай дзяржавы, які, карыстаючыся пасольскай недатыкальнасцю, прамаўляў на сходах, кляймуючы ўсё польскае».

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 5 ЛІПЕНЯ 1923 г.

У II аддзел Генеральнага штаба
інжынера Рамуальда Зямкевіча
Рапарт

За апошні перыяд амаль усе беларускія дзеячы зрабілі паварот налева, гэта значыць, сталі прыхільнікамі Бальшавіі. У Бальшавіі беларускі нацыянальны рух зусім не перасьледуецца, наадварот, яго старанна гадуюць, даюць школы, дзяржаўныя грошы на выданне кніжак і газет. Акрамя таго, бальшавікі звярнулі больш увагі на «польскі забор», дзе, субсідуючы элементы нават выключна нацыянальныя, без дамешку сацыялізму, яны ўбіваюць клін у польскую дзяржаўнасць, каб яе насельніцтва не мела прыхільнікаў Польшчы. Што гэта мэта

дасягаецца, відаць ужо цяпер.

У апошні час з вялікіх сумаў, атрыманых на выдавецкую справу, з Менска былі прысланыя 10 000 долараў. З трох газет, якія выдаюцца беларусамі, толькі адна, «Krynica», газета хрысціянска-дэмакратычнага напрамку, выдаецца беларускім і літоўскім клірам і ніякай сувязі з Саветамі не мае. Такія ж газеты, як «Нашае жыцьцё»[79] і «Наш сьцяг»[80] выходзяць за бальшавіцкія грошы, прытым «Наш сьцяг» з'яўляецца замаскаваным органам беларускіх камуністаў на тэрыторыі Польшчы. Першыя спробы Менска выдаваць на тэрыторыі Польшчы газеты камуністычнага характару датуюцца часам выбараў у сейм і сенат у мінулым, 1922 годзе. Першая беларуская камуністычная газета «Вясковы пралетары»[81] была выдадзена 29 кастрычніка ў Горадні пад рэдакцыяй Сакалоўскага[82]. Ці была яна канфіскаваная – не ведаю, але нумары падчас выбараў раздаваліся адкрыта. 2-гі нумар гэтай газеты выйшаў у Вільні. Другой беларускай камуністычнай газетай была выдадзеная ў Вільні 18 красавіка 1923 г. «Саха», адразу ж канфіскаваная і зачыненая.

Усе гэтыя сканфіскаваныя нумары павінны быць у штабе як важны матэрыял.

Беларуская вёска цяпер цалкам знаходзіцца ў руках беларускіх партый і польскага «Вызвалення». На дзейнасць «Вызвалення» варта звярнуць больш пільную ўвагу. Пан Ваявудскі[83], самы галоўны і самы спрытны дзеяч гэтай партыі, знаходзіцца ў надзвычай цесным кантакце з беларусамі ўсіх адценняў, нават з камуністамі. Антон Луцкевіч, беларускі палітычны правадыр, і пан пасол Ваявудскі – самыя сардэчныя сябры.

Антон Луцкевіч у доўгай пяцігадзіннай размове з ніжэйпадпісаным катэгарычна заявіў, што ўжо на будучых выбарах беларусы будуць ісці разам з «Вызваленнем». Луцкевіч таксама выразна і зразумела расказваў пра менскіх дзеячаў і іх вялікую дапамогу беларусам у Польшчы. Ён цешыўся, што ворагі Ластоўскі адхілены і прызнаўся, што і ён да гэтага спрыяніўся.

[79] «Нашае жыцьцё» – беларуская газета, якая выходзіла ў Вільні з траўня да чэрвеня 1923 г.

[80] «Наш сьцяг» – беларуская газета, якая выходзіла ў Вільні з чэрвеня да жніўня 1923 г., орган Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (БРА).

[81] «Вясковы пралетары» – орган Беластоцкага камітэту Камуністычнай партыі Польшчы, які выдаваўся ў Горадні ў 1922 г.

[82] Сакалоўскі Арлоўскі Эдвард (1878–1932) – камуністычны дзеяч, журналіст, рэдактар шэрагу газет левага напрамку.

[83] Ваявудскі Сільвестр (1892–1933) – польскі палітык, у 1922–

1927 таку, сейма прыехаў, што жадаў бы, каб гэта быў не
Незалежнай рэчаўскай ладзіны.
Беласток, а Барановіч, Нягледзячы на гэта, Луцкевіч заявіў мне, што пасля таго, што я зрабіў для іх, ён мне цяпер безумоўна верыць, спадзяецца на цеснае супрацоўніцтва са мною і больш ніколі не будзе слухаць плётак пра маю асобу.

Дубейкаўскі цалкам страціў давер усіх. Усе абураныя, што на працэс ён не прыехаў, і ўголас кажуць, што гэта польскія ўлады забаранілі яму выступаць.

Для супрацьдзеяння сімпатыям і прыцягненню да Бальшавіі неабходным з'яўляецца выданне беларускай памяркоўнай і прыхільнай Польшчы газеты і дазвол на адкрыццё хоць бы некалькіх народных вясковых беларускіх школаў. Без такіх дробных саступак ніякая акцыя, якая мела б на ўвазе адарванне незадаволеных ад сімпатыяў да Бальшавіі, не ўдасца.

Газета павінна выдавацца ў Вільні і без перашкод разыходзіцца па ўсім краі.

Усялякі цяперашні адміністрацыйны ўціск на вёсцы не дасягае мэты і наўпрост спрыяе беларускай «ірыдэнце» ў Польшчы.

Гэта пытанне надзвычай важнае і вымагае больш шырокага абмеркавання і выпрацоўкі раз і назаўсёды разумнага плана дзеянняў.

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
5 ліпеня 1923

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падтэчка 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 31 ЛІПЕНЯ 1923 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

інжынера Рамуальда Зямкевіча

Рапарт

У дадатак да папярэдняга рапарту я магу дадаць даволі цікавую вестку, што ў Гданьск да прадстаўніка беларусаў габрэя Лур'е[84] была высланая пані Лола Мэнке[85] (немка з Вільні). Мэтай яе выслання ёсць завязанне кантактаў з урадам Цвікевіча ў Берліне. Пані Лола Мэнке завезла лісты, павінна чакаць у Гданьску адказу, і будзе вяртацца з паперамі ў Вільню недзе 6–10 жніўня.

У паслоў нічога новага. Ходзяць толькі чуткі, што Ярэмуч нібыта павінен выбрацца ў Прагу Чэшскую, каб паразмаўляць з Крамаржам. Іншыя паслы інтэнсіўна працуюць па вёсках, куды адразу ж паедуць з Варшавы пасля заканчэння дэбатаў у сейме.

Арыентацыя на ўсход (на Менск) і цяга насельніцтва да Савецкай Расіі – гэта той здабытак, якога дасягнула крэсовая адміністрацыя.

Супрацьдзеяння гэтаму з дапамогай газет або брашур няма, а таксама няма і ніякай палітычнай партыі, якая магла б супрацьстаяць маскаляфілам і германафілам. Выступленні аднаго Ладнова ні на групы, ні на масы не робяць аніякага ўплыву.

Палітычная кан'юнктура для Польшчы ўсё горшае, а таму як нічога не робіцца, каб раскалоць варожы Польшчы лагер, то хутка можа настаць час, калі ўжо нічога не дапаможа і нічога не ўдасца зрабіць, бо будзе запозна.

Турмы, працэсы, хоць і масавыя, мэты не дасягаюць і толькі зніжаюць аўтарытэт Рэспублікі.

Тут патрэбна моцная мужчынская энергія, канчатковае рашэнне пра выданне газеты і моцная падтрымка беларускіх актывістаў.

Можа, на гэта няма грошай, але трэба быць перакананым, што гэтая акцыя будзе каштаваць менш, чым цэлая армія таемных паліцэйскіх агентаў на крэсах, якія, рэкрутуючыся з сацыяльных нізоў (сярод іх ёсць і былыя «чэкісты»), каштуюць

[84] Лур'е Ісак (1890 – ёсць, 1933) – беларускі габрэйскі дзеяч, прадстаўнік урада БНР у Гданьску.

[85] Мэнке Лола (1896–1939) – беларуская дзяячка нямецкага паходжання.

мільёны, а нічога, акрамя дробных арыштаў часам невінаватых людзей, не даюць, а банды Мухі-Міхальскага злавіць дагэтуль не могуць.

Адзначаючы тут абавязковасць і тэрміновасць выдання газеты і згуртавання прыхільных да Польшчы беларусаў у шэрагах адной палітычнай партыі, лічу, што гэтую справу трэба падтрымаць як мага хутчэй і неадкладна пачаць яе рэалізацыю.

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
31 ліпеня 1923

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падтэчка 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 22 ЖНІЎНЯ 1923 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

інжынера Рамуальда Зямкевіча

Рапарт

У беларускім палітычным жыцці цяпер адбываецца вялікі ўнутраны крызіс. Палітыка менскіх камуністаў па абвяшчэнні амністыі, згода на беларусізацыю Беларусі, урадавае выданне карысных і патрэбных у справе беларускага школьніцтва выданняў здабывае ўсё больш прыхільнікаў сярод беларускіх інтэлігентаў – польскіх грамадзян. Пра просты народ няма чаго і казаць: ён прагне зямлі і таму цягнецца да Саветаў, тым больш, што, паводле чутак, жыццё ў Расіі пачынае паляпшацца.

Адносіны нашых беларусаў з Менскам цяпер вельмі абцяжараныя: апошнія вялікія арышты сярод тых гандляроў (камуністаў-габрэяў), якія ездзілі з Вільні ў Менск і назад, перарвалі добра завязаную нітку стасункаў, асабліва дастаўку літаратуры і агітацыйнага матэрыялу. Сярод гэтых арыштаваных ёсць буйныя рыбіны, іх агітацыю і шпіёнскую

выведку лёгка даказаць, пра што, урэшце, адкрыта гавораць і самі беларусы.

Цяпер яны вельмі хочуць склікаць беларускі з'езд з Заходняй Беларусі. Гэта пытанне адкрыта падняла ў сканфіскаваным 17 нумары газета «Наш сьцяг», ужо зачыненая ўладамі. Калі ўлады не дадуць дазволу на правядзенне з'езду, ён адбудзецца нелегальна, і нават плануецца ўдзел прадстаўнікоў Менска і Коўна. Супраць з'езду выказваецца Антон Луцкевіч, правадыр руху, відавочна, баючыся страты ўплываў і пазбаўлення той дыктатарскай улады, якую ён мае цяпер. Менскія камуністы будуць катэгарычна патрабаваць калегіі накшталт савета-рады ці рэўкаму. Луцкевіч мае шмат супраціўнікаў як сярод паслоў у сейме, так і на тэрыторыі Вільні, таму ў выпадку склікання з'езду безумоўна будзе скінуты. Менск вельмі жыва і пільна адсочвае беларускі рух у Польшчы, абапірае на яго свае планы на будучыню і сцвярджае, што безумоўна забярэ Крэсы ў Польшчы. Менск імкнецца цяпер да поўнага панавання над беларусамі ў Польшчы, выклікання непрыязі да яе і міжнародных канфліктаў. Такім чынам, усялякія парушэнні правоў, прызнаных для беларусаў Канстытуцыяй, вельмі для іх дарэчныя. Значныя матэрыяльныя субсідыі будуць давацца асобным людзям, калі адбудзецца цеснае паразуменне і будзе выпрацаваная супольная платформа. Ідзе гаворка пра атрыманне для планаў Саветаў усёй заходнебеларускай інтэлігенцыі, нават без увагі на яе партыйнасць. Габрэі, варожыя Польшчы, абавязаліся падтрымліваць беларускі рух. Пра тое, што і міжнароднае габрэйства сёння цікавіцца беларускай справай, сведчаць артыкулы ў замежных газетах, як на жаргоне[86], так і на іншых мовах. Патрэбна было б артыкулы пра беларусаў у жаргонамоўных габрэйскіх газетах перакладаць і збіраць у габрэйскім аддзеле. Гэта праліло б святло на планы габрэяў выкарыстаць у сваіх мэтах беларускую праблему. Падчас выбараў у сейм габрэі, дзякуючы блоку ў 16-цы[87] з беларусамі, выкарысталі апошніх належным чынам. Безумоўна, на будучыя выбары яны разлічваюць, што залежны ад іх фінансава беларускі рух яны выкарыстаюць у сваіх мэтах яшчэ лепей. 18 і 19 жніўня Антон Луцкевіч быў у Варшаве, наведаў разам са сваёй жонкай-габрэйкай варшаўскіх габрэйскіх дзеячаў і атрымаў ад іх значныя сумы на выдавецкі

рух. Вынікам гэтага было тое, што 21 жніўня ўсім беларускім працаўнікам з Вільні, як з газет, так і са Школьнай рады, гімназіі і іншых інстытуцый былі выплачаныя ўсе запазычаныя заробкі разам з кампенсацыяй за інфляцыю.

Кантакт з украінцамі вельмі цесны. Усе ўкраінскія газеты[86] пастаянна высылаюць свае выданні беларусам. Дзякуючы чытанню свядомасць і радыкалізм беларусаў вельмі развіваюцца. Украінскую мову кожны беларус вельмі добра разумее. Літоўцы ў апошні час зусім перасталі субсідаваць беларусаў у Вільні.

[86] Пад украінскай мае на ўвазе яўрэйская мова ідыш.

[87] Ужо ў 1922 г. беларускія палітычныя актывісты ў Вільні пачалі выкарыстоўваць назву Заходняя Беларусь, якую Рамуальд Зямкевіч пазней шматразова пісаў у сваіх рапартах.

Праз 56 і менш за 24 гадзіны неабходна выбраць[87] Ніжнюю і Верхнюю палаты Сейма. Гэта фінальная кампанія, у якой мы будзем удзельнічаць. Цяпер жа дзеля ўсё большага росту небяспекі для Польшчы я падкрэсліваю гэтую неабходнасць яшчэ мацней, бо лічу, што можа надысці такі момант, калі ўжо нічога не дапаможа, і ніякае друкаванне газеты рабіць уплыву не будзе.

Зараз распаўсюджана меркаванне, што цяперашні сейм не ўтрымаецца і будзе распушчаны. Беларускія паслы энергічна працуюць па вёсках, склікаюць мітынгі і, здаецца, гавораць прамовы антыдзяржаўнага характару (асабліва гэта робяць Ярэміч, Кахановіч, Аўсяннік і Рагуля). Шмат прыдумляюць пра пасла Якавюка, які, напалоханы беластоцкім працэсам, зачыніў у Горадні сваю дэпутацкую канцылярыю, не хоча ездзіць па вёсках, агітацыю перапыніў і, апроч вядзення дробнай спекуляцыі (куплі і продажу), нічым іншым займацца не хоча.

Дзеля цікавага крытычнага моманту ў Менску мне, асабліва цяпер, абавязкова трэба знаходзіцца ў Вільні, каб можна было глыбей і дакладней вывучыць працу і махінацыі Менска на тэрыторыі Польшчы. Я буду вымушаны прасіць з прычыны велізарнай дарагоўлі ў Вільні (сціплы абед каштуе 20 тысяч) пра якую-небудзь аднаразовую дапамогу, без якой я не буду ў стане праводзіць плённай працы, якую праводзіць вельмі хачу і якая вельмі патрэбна.

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава

22 жніўня 1923

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падтэчка 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА ад 22 жніўня 1923 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

Падчас маёй апошняй выведкі ў Вільні 17–21 жніўня я быў змушаны да непрадбачаных выдаткаў, частуючы абедам асоб, з якімі размаўляў пра працу камуністаў з Менска сярод беларусаў.

Я на гэта ўсё аддаў агульную суму 240 000 марак, пра вяртанне якой прашу.

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
22 жніўня 1923

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падтэчка 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 25 ВЕРАСНЯ 1923 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

інжынера Рамуальда Зямкевіча

Рапарт

Настроі сярод шырокіх масаў на беларускіх і літоўскіх крэсах робяцца ўсё больш варожыя польскай дзяржаве. Дарагоўляй незадаволеныя нават габрэі, якія публічна лаюць урад і смяюцца з польскай маркі і дзяржаўных эмблем (арла, партрэтаў), пра што пісаліся паліцэйскія пратаколы, –

спрычыняецца да гэтага ў значнай ступені і адміністрацыя, якую пачало ненавідзець нават польскае насельніцтва. Гэта тыя факты, якіх панове, што сядзяць ва ўстановах, не бачаць ці не хочуць бачыць. Асабліва яскрава пазначаецца тэрытарыяльная нянавісць і непрыязь: караняжы[88] і галічане – ненавісныя. Вынік гэтага такі, што каталіцкая дробная засцянковая шляхта, якая жыве ў так званых ваколіцах, пачынае ўсё больш хінуцца да беларускасці і нават бальшавізму. Раней жа гэтая шляхта, дарма што паміж сабой у штодзённых размовах ужывае беларускую мову, была аплотам польскасці і каталіцтва. Цяпер, як гэта з радасцю сцвярджаюць ксяндзы-беларусы, засцянковая шляхта зусім не выступае супраць беларускіх казаняў у касцёле. А яшчэ ў 1919 годзе, падчас і адразу пасля заняцця заходнебеларускіх земляў, беларускія казані былі немагчымыя ў касцёле. Лаяць палякаў як хуліганаў увайшло цяпер сярод іх у моду. Такія культурныя здабыткі мясцовай адміністрацыі. Непрыязь у адносінах да польскіх жаўнераў праяўляецца на кожным кроку. Трэба зазначыць, што вайсковых асаднікаў ненавідзіць не толькі беларускае насельніцтва, але і польскае. Акрамя розніцы характараў, рэзкасці і сквапнасці асаднікаў уплывае тут і зайздрасць з прычыны атрымання зямлі прыблудамі. Бо ніхто з жаўнераў-добраахвотнікаў былой арміі Халера[89], Доўбар-Мусніцкага, беларуска-літоўскай дывізіі генерала Шаптыцкага[90], якія паходзілі з Крэсаў, зямлі не атрымаў. У выніку бяспланавасці і бездапаможнасці польскай палітыкі на Крэсах, бо польская адміністрацыя вельмі слаба стаіць на лініі абароны (але разумнай абароны) польскасці, там страшна пашыраецца бальшавіцкая ідэя. Фактам, які трэба прызнаць, ёсць тое, што бальшавізм не ўяўляе і не можа ўяўляць нічога страшнага для беззямельнага і малазямельнага. Сёння гэта ўжо гучна гавораць сярод дробнай шляхты ў засценках.

У панаванне Польшчы на Крэсах ніхто ў масах не верыць. Гэта трэба сабе выразна ўсвядоміць. Усе летам гэтага, 1923 года чакалі вайны. Гэтым можна растлумачыць выразна пастаянную зычлівасць засцянковай шляхты да беларусаў, якія, на чэрнак нашай статыстыцы і мапам, колькасна пераважаюць. Хады крэсовыя чыноўнікі вельмі здзівіліся б, калі б пераканаліся, што прыхільныя да бальшавікоў беларускія газеты чытаюцца

[88] Караняжы – Гэта прастамоўнае насмешнае выхадцы з Кавалеўства

засцянковай шляхтай і ёй распаўсюджваюцца сярод беларускага народу.

Польскага ў складзе Расійскай імперыі.

Літоўская мяжа адчыненая, кантакт з Літвою завязаны, газеты, брашуры і кніжкі з Літвы цяпер прыходзяць вельмі рэгулярна. Пакуль Юзэф Унеджэйскі (1878–1960) – былы кіраўнік ваеннай арганізацыі, а цяпер – начальнік штаба польскага Усходняга легіёну.

[89] Хоць Юзэф Унеджэйскі (1878–1960) – былы кіраўнік ваеннай арганізацыі, а цяпер – начальнік штаба польскага Усходняга легіёну.

Шантыцкі Станіслаў (1867–1950) – польскі генерал, у 1920 г. камандаваў 1-й арміяй, а таксама Літоўска-беларускім фронтам.

Па лініі мяжа расчынена ўвесь шырэй, агенты шчыруюць па ўсім краі. Дастаткова было б зрабіць агульную адміністрацыйную аблаву, напрыклад, у Вільні, каб пераканацца, колькі людзей без пашпартоў, пропускаў і наагул без ніякіх дакументаў знаходзяцца ў Польшчы. У Вільні быў бальшавіцкі камісар з Менска Чарвякоў, пакінуў значныя сумы ў марках і доларах, а паліцыя шукала яго падчас ягонага знаходжання ў Вільні, і, вядома, не знайшла. Агенты з 5ff[91] нічога не робяць акрамя правакацыі. Гэтую інстытуцыю трэба было б або разагнаць, або рэфармаваць, бо карысці з яе няма ніякай, а кошт – каласальны. Ці не маглі б яны, напрыклад, хоць бы на чыгунках правяраць дакументы пасажыраў? З гэтага была б карысць.

Беларускі рух выразна кіруецца пад бальшавіцка-камуністычным сцягам. Яго скіравала ў гэты бок пасля адсутнасць палітыкі польскіх кіроўных колаў. Пазбаўленыя ўсялякіх культурных правоў праз закрыццё школаў і кааператываў, беларускія інтэлігенты, замест разбітай і немагчымай культурніцкай працы, кінуліся ўсе без выключэння да працы палітычнай. Сёння лідэр беларускага руху, Антон Луцкевіч, хоць і непрыхільны да Польшчы, аднак жа і вораг бальшавізму, страціў падтрымку інтэлігенцыі, якая ідзе цяпер на ланцужку Беларускага бальшавіцкага савета*, што складаецца з пасла Ярэміча, паслоў Какановіча, Рагулі, Аўсянніка, сенатара Багдановіча[92], настаўніка Красінскага. Пра тое, што гэтыя панове цяпер прыхільнікі Менска і Масквы, адкуль атрымліваюць загады, прызнаўся ў прыватнай размове з ніжэйпадпісаным Антон Луцкевіч. Што гэта павінна быць праўдай, можна меркаваць з аднагалоснай думкі пра іх сярод беларусаў.

Ідзе барацьба за ўладу. Беларусы хочуць склікаць з'езд, каб разбурыць гегемонію адзінаўладдзя А. Луцкевіча. Вядома, ён

[91] 5ff – ідзецца або аб дэфензіве ці пра нейкія іншыя дзеянні.

[92] Багдановіч

з’ездзе пройдзе Савет у вышэйзгаданым складзе.

Можа, найлепей было б дазволіць з’езд, каб потым, карыстаючыся яго ўхваламі, разбіць гэтую банду.

Непрыязь да Луцкевіча зазначылася на пленарным пасяджэнні Беларускага нацыянальнага камітэта ў Вільні 23 верасня г. г., у нядзелю. Старшынём быў абраны Ярэміч. З вялікай цяжкасцю прысутныя пры дапамозе ніжэйпадпісанага, які агітаваў за Луцкевіча, выбралі віцэ-старшынём Луцкевіча (непрысутнага), скарбнікам Кахановіча, а сакратаром – рэдактара газеты «Вольны сьцяг»[93] Лагіновіча[94]. Тут надзвычай яскрава праявілася бальшавіцкая агітацыя.

Ярэміч хоча любой цаной зваліць Луцкевіча. Ён мае поўны давер Менска. Ярэміч за савецкія грошы выдае «Вольны сьцяг», у якім аплёўваюцца польскія парадкі, затое хваляцца беларускія парадкі і свабода. Ярэміч цяпер у беларускім руху – самая небяспечная гадзіна.

Беларускія паслы даюць грошы толькі на падтрыманне школаў. Я быў сведкам, як пасол Тарашкевіч даваў 6 мільёнаў для пасылкі ў Наваградак для беларускай гімназіі.

Беларускія бальшавікі на патаемнай нарадзе вырашылі пастарацца і ўвапхнуць у польскія ўстановы, асабліва сакрэтныя (гэта значыць грамадскай бяспекі), сваіх агентаў, каб ведаць, што робяць улады і паралізаваць контрвыведку. Гэта знамянальны факт.

Міткевіч мне апавядаў, што пасол Ярэміч у Беластоку пераконваў ваяводу Папялеўскага[95], што ён [Ярэміч] паляк-каталік, а не беларус. Адзначаю гэты факт і прашу праверыць яго верагоднасць.

Настаўнік Красінскі зняў сваю кандыдатуру на выбарах у Беларускі нацыянальны камітэт 23 верасня. Пасол Ракі Міхайлоўскі засцярог ніжэйпадпісанага, каб быў з Красінскім асцярожны і шчыра з ім не размаўляў, бо, паводле чутак, Красінскі звязаны з паліцыяй, і, напэўна, з’яўляецца нейкім агентам. Прашу расследаваць гэты факт, ці праўда – гэта?

Вячаслаў (1878–1941?) – беларускі палітык, у 1922–1930 гг. сенатар Польскай Рэспублікі.

[93] «Вольны сьцяг», беларуская газета, якая выходзіла з жніўня да кастрычніка 1923 г., орган Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі.

[94] Лагіновіч Язэп (1891–1939) – беларускі дзеяч, адзін з лідэраў Беларускай рэвалюцыйнай арганізацыі (БРА), пазней – Камуністычнай партыі Заходняй Беларусі (КПЗБ).

[95] Пакі Папялеўскі (Папялеўскі) Стэфан (1880–1934) – беластоцкі

Асабліва каштоўнай інфармацыяй я лічу выяўленне факта, што ў Вільні існуе беларускі савет з 6-ці асоб. Гэты савет у выпадку вайны ўзяў бы кіраванне краем у свае рукі.

Мая прысутнасць у Вільні на наступным пасяджэнні Беларускага нацыянальнага камітэта ў нядзелю – абавязковая.

Адзначаю, што Камітэт статута не мае, не быў зарэгістраваны, а быў адноўлены і існуе без аніякага права.

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
25 верасня 1923

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падтэчка 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 28 ВЕРАСНЯ 1923 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

інжынера Рамуальда Зямкевіча

Рапарт

Пленарнае пасяджэнне Беларускага нацыянальнага камітэта ў Вільні 23 верасня пачалося новымі выбарамі ў прэзідыум, з прычыны адмовы ад старшынства пасла ксяндза Станкевіча. Старшынём быў абраны пасол Ярэміч, віцэ-старшынём – Антон Луцкевіч, скарбнікам – пасол Кахановіч, сакратаром – Лагіновіч, рэдактар газеты «Вольны сьцяг».

Пасяджэнне не вычарпала ўсіх пунктаў, адзначаных у яго праграме, з прычыны дакладу аб беларускай гімназіі яе дырэктара, інжынера Трэпкі. З дакладу вынікае, што польскія ўлады любымі спосабамі імкнуцца зачыніць беларускую гімназію. Прыдзіркі пры атрыманні пасведчання аб грамадзянстве асоб, народжаных і тых, што пастаянна жывуць тут, толькі за тое, што яны – беларусы, адмова ў фінансавай

дапамозе, незацвярджэнне настаўнікаў на іх пасадах – гэта звычайныя прычэпкі функцыянераў урада галічанаў. Нядаўна Праваслаўная духоўная семінарыя (аплот русіфікацыі і нянавісці да Польшчы) выкінула гімназію з яе памяшкання, выламаўшы замкі. Цяпер вучні мусяць знаходзіцца ў цесным памяшканні і праводзіць заняткі вечарамі. Атака Праваслаўнай духоўнай семінарыі была нібыта выкліканая ціскам польскай улады, якая, кіруючыся прынцыпам divide et impera, хоча іх пасварыць, каб потым выкінуць усіх з муроў кляштара св. Тройцы, а будынкі пазабіраць. Беларусы пры гэтым заяўляюць, што іх акцыя па беларусізацыі семінарыі, якая праводзілася з 1919 года, правалілася, бо польскія ўлады ўсюды, дзе толькі можна, падтрымліваюць русіфікацыю, калі ідзе гаворка пра беларусаў ці ўкраінцаў. Цяперашняе святарства ў Вільні, якое ад праваслаўнага біскупа да простых папоў складаецца з адных маскалёў, пераследуе беларусаў, сілай навязваючы ім расійскую мову, якую беларусы паступова выдаляюць са сваіх гімназіяў.

У выніку спрэчак, якія ўзніклі на фоне высвятлення, хто тут вінаваты – толькі праваслаўныя маскалі ці толькі польскі ўрад, – было вырашана пратэставаць у праваслаўнага мітрапаліта ў Варшаве, у сейме і ва ўрадзе. Адпаведныя тэксты пратэстаў павінны быць прадстаўленыя на пленарнае пасяджэнне Камітэта, якое збярэцца 30 верасня ў нядзелю, каб завяршыць усю справу.

Тон выступленняў прамоўцаў быў вельмі востры і выключна антыпольскі, бальшавіцка-камуністычная нота яскрава ў іх дамінавала, асабліва ў прамовах пасла Ярэміча, настаўніка Красінскага і Валэйшы[96].

Валэйшу лічаць агентам паліцыі, ягоныя вельмі праваслаўныя выступы («збіць семінарыстаў і выкінуць з занятых ім памяшканняў») былі прынятыя са шматзначнымі ўсмешкамі. Калі Валэйша сапраўды агент паліцыі, то трэба зазначыць, што ён нам ніякай вартасці і нават шкодны.

[96] Вацлаў Іванавіч Сівіцкі – беларускі дзеяч, старшыня Беларускага грамадзянскага

Беларускі нацыянальны камітэт не быў зарэгістраваны, статута не мае, доўгі час зусім не збіраўся і наагул не працаваў. Цяпер раптам ажыў і пачынае сваю дзейнасць. Што да пытання яго

закрыцця, то тут трэба добра падумаць, бо павінен сходу. бкоць высланы пратэст у Лігу нацый з нагоды беларускай гімназіі і разбуральнай ролі польскага ўрада. Гэты пратэст будзе падпісаны сеймавымі пасламі і ўсімі без выключэння дзеячамі.

Паводле сакрэтнай інфармацыі, аднаўленне дзейнасці Беларускага нацыянальнага камітэта адбылося на загад Менска. Бальшавікі ведаюць, што пасля вострых і палкіх выступаў польскія ўлады камітэт зачыняць. Саветам вельмі патрэбныя незадаволенасць, хваляванні і пратэсты, на гэтым яны будуюць сваю ўпэўненасць, што адбяруць усю тэрыторыю Заходняй Беларусі ад Польшчы. Вельмі шматлікія камуністычныя ячэйкі, арганізаваныя ў мястэчках, павінны быць забяспечаныя зброяй, каб пасля атрымання загаду выклікаць паўстанне, папсаваць дарогі, паўзрываць масты і ўрадавыя будынкі. Камуністы выхваляюцца, што ва ўсіх установах маюць сваіх людзей, і блізкі той дзень, калі панаванне над краем бязмозглых паноў рухне. Банды Мухі павінны пастаянна непакоіць паліцыю, грамадзянаў і мястэчкі. Банды даручана арганізаваць Муху-Міхальскаму.

Сур’ёзныя людзі ў Вільні сцвярджаюць, што праказа бальшавізму і камунізму ўжо цяпер раз’ядае польскае грамадства, нават сярод высокіх дзяржаўных чыноўнікаў. У выпадку якога-небудзь паўстання ўсё гэта пойдзе разам з камунізмам. Гэта відаць вельмі выразна, асабліва сярод чыгуначнікаў на Крэсах. Віленская чыгуначная дырэкцыя на чале з панам Ландсбергам[97] надалей церпіць і падтрымлівае няпольскія элементы на чыгунцы. А чыгункі на Крэсах маюць вельмі шмат праваслаўных маскалёў, якія ў выпадку прыходу бальшавікоў безумоўна пяройдуць на іх бок, а ў Польшчу ў любым разе эвакуявацца не будуць. Пан дырэктар чыгункі Ландсберг нікога з прыстойных людзей на чыгунку не бярэ, а маскалёў не звальняе і нават не стараецца пераводзіць іх углыб Польшчы. На палітыку гэтага пана Ландсберга даўно ўжо трэба звярнуць пільную ўвагу і паралізаваць ягоную дзейнасць, шкодную для дзяржавы.

Гэтыя няшчасныя Крэсы – цяпер адзін вялікі вулкан,[97] і супакоіць яго можа толькі цвёрдая, але справядлівая рука. Ландсберг

Цяпер на Крэсах ужо самі палякі не вераць, што яны засталіся ў Польшчы. (А ў Саветах, нібыта, жыццё добрае!)

Нам патрэбна грунтоўная змена, тым больш што мясцовыя кіроўныя колы ў сваім дробязным асляпленні не разумеюць, і ў усіх справаў, і небяспекі з боку 1200-кіламетровай адкрытай мяжы ўмудраюцца не бачыць.

Эмістануцца (1880–1952) – старшыня тымуначнай дырэкцыі ў Вільні у 1920–1924 гг.

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
28 верасня 1923

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падтэчка 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 6 КАСТРЫЧНІКА 1923 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

інжынера Рамуальда Зямкевіча

Рапарт

30 верасня, у нядзелю, адбылося пасяджэнне Беларускага нацыянальнага камітэта. Прысутнічалі 39 асоб, з якіх 30 прадстаўлялі розныя арганізацыі ў краі. Прысутнічаў, хоць вельмі спазніўся, і новаабраны віцэ-старшыня Антон Луцкевіч. Старшынём быў пасол Ярэміч. Увесь час заняла справаздача з дзейнасці Беларускага клуба, зробленая паслом Тарашкевічам. Справаздача была напоўненая непрыхаванай непрыяззю да Польшчы, факты перабольшваліся, а іх інтэрпрэтацыя была дэмагагічная. Пасля шэрагу пытанняў, на якія Тарашкевіч падрабязна адказаў, сход пастанавіў сваёй рэзалюцыяй падзякаваць Беларускаму клубу ў сейме і прасіць, каб ён не сыходзіў з абранай дарогі. Тут здарыўся інцыдэнт. Адзін з прысутных вясковых настаўнікаў проста з крыкам, у якім чуўся адчай, запратэставаў супраць рэзалюцыі: «Беларускі клуб у сейме ідзе няправільнай дарогай, а нам зачыняюць школы,

асуджаючы нас на галодную смерць!!!» Пратэст зрабіў гнятлівае ўздзеянне на прысутных, старшыня Ярэміч мякка тлумачыў пратэстоўцу немагчымасць змены пазіцыі, пакуль польскі ўрад праводзіць паланізацыйную палітыку. Рэзалюцыя была прынятая ўсімі галасамі супраць чатырох. Пасля вынясення рэзалюцыі з прычыны позняга часу наступнае пасяджэнне камітэта было прызначана на нядзелю, 7 кастрычніка 1923 года, з мэтай разгляду ўсіх астатніх пунктаў, якія былі ўнесеныя ў праграму пасяджэння.

Камуністы вельмі моцна ўгняздзіліся ў Вільні, маюць сваіх людзей усюды, нават у дзяржаўных установах, а найболей – на чыгунцы ў пана Ландсберга. Праца па ўсведамленні кіпіць, яны думаюць пра страйкі і, вядома, пра будучую рэвалюцыю.

Супрацьдзеянне гэтаму павінна ісці ў напрамку пераводу ў цэнтральную Польшчу ўсіх чыгуначнікаў, якія былі ў Расіі або нядаўна адтуль вярнуліся, асабліва і ў першую чаргу трэба было б выдаліць праваслаўных. Асабліва трэба звярнуць увагу на тэхнічна-інжынерную службу, з якой рэкрутуюцца найбольш небяспечныя бальшавіцкія дзеячы. Дырэктар Ландсберг у інтарэсах службы павінен быць пераведзены. Яму і толькі яму трэба прыпісаць пратэкцыю для чужых і варожых Польшчы элементаў. Найбольш пагрозліва выглядае справа з чыгуначнікамі. Затым трэба звярнуць пільную ўвагу на дэфензівы, асабліва паліцэйскія, дзе служыць шмат цёмных і вельмі падазроных асоб, якія маскуюць свае мэты і памкненні. Сярод іх відавочна ёсць бальшавіцкія агенты.

Што да саступак беларусам, то трэба іх зрабіць, але ні ў якім разе не пад ціскам паслоў у сейме, а толькі на месцах. Калі б беларускім вясковым настаўнікам даць занятак, то варожая агітацыя вельмі паменшылася б. Такія палёгкі трэба даваць непасрэдна на месцы, дыскрэдытуючы па меры магчымасці паслоў. Тут ідзе гаворка пра новыя выбары ў сейм, пра якія трэба думаць загадзя, каб болей правесці польскіх паслоў. Адмова ад такой палітыкі і працы ў гэтым напрамку можа спрычыніцца да ў сто разоў больш балючай паразы палякаў на выбарах, чым у 1922 годзе. Могуць на новых выбарах прайсці адны беларусы, бо ўціскам іх абудзілі і настроілі варожа ў

адносінах да паноў, а такім для беларусаў з’яўляецца любы паляк. Гэта нечувана важнае пытанне.

А зараз pro domo sua.

Пазіцыі ніжэйпадпісанага добрыя і моцныя. Антон Луцкевіч, нягледзячы на непрыязь Ярэміча да ніжэйпадпісанага, верыць яму і давярае сакрэты. Што тут няма выпрабаванняў і хітрыкаў з яго боку, даказвае пасяджэнне Нацыянальнага камітэта, якое, мабыць, не магло быць інспіравана Луцкевічам, і на якім ён, нягледзячы на агульную непрыязь да яго, быў выбраны, дзякуючы агітацыі ніжэйпадпісанага, большасцю ў адзін голас. Гэта было залішне яскрава, каб выклікаць недавер. Ніжэйпадпісаны просіць маральнай дапамогі і падтрымкі для сваёй працы, выключна цяжкой і адказнай, асабліва ў цяперашні момант, такі пагражальны наступствамі ў блізкай будучыні. Перашкаджае тут Дубейкаўскі.

Л. Дубейкаўскі казаў старому Адамовічу[98], што Зямкевіч служыць у II аддзеле і займаецца Варшавай і Вільняй, а Міткевіч – Горадняй і Баранавічамі. Пра гэта стары Адамовіч казаў як ніжэйпадпісанаму, так і Міткевічу. І ніжэйпадпісаны і Міткевіч катэгарычна запярэчылі, што служылі ў II аддзеле, бо пра гэта Адамовіч ведаць не павінен. Пачалі нават пагражаць на другі аддзел, што нічога ім не дае, каб можна было выпрамку, што мусяць займацца спекуляцыяй канцэсіі ў Белавежы, каб хоць бы неяк пражыць. Дубейкаўскі гэтую інфармацыю мае ад Ладнова. Дзеля таго, што Луцкевіч таксама нешта пра гэта чуў і сказаў ніжэйпадпісанаму, што ў гэта не верыць, бо Зямкевіч, на яго думку, як гарачы і смелы чалавек, не пайшоў бы на мунштуку дэфензівы, а калі б нават у яе і ўлез, то абавязкова папярэдзіў бы пра гэта беларусаў. Беластоцкі працэс цалкам бароніць З. ад такіх закідаў, што ён заслужыў сваёй абаронай хоць бы і малакаштоўнага Якавюка і вельмі спрычыніўся да меншага прысуду.

Дзеля вышэйпададзеных адкрыццяў ніжэйпадпісаны мусіць адсунуць і абясшкодзіць Дубейкаўскага. Ён ужо пачаў з ім барацьбу.

Дубейкаўскі мае намер энергічна бараніць Баранава, што яго

[98] Адамовіч Вячаслаў (1864–1939) – беларускі адзеч, рускі ліцэнзіяльнага жыцця, так

скампраметуе і даб’е, а рэабілітаваць не здолее.

інжынер Рамуальд Зямкевіч

Варшава
6 кастрычніка 1923

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2664. Падтэчка 1.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА [ЛІПЕНЬ 1924 г.]

Маё знаходжанне ў Вільні, акрамя размоваў, нічога новага не прынесла. З’езд на Сёмуху сокалаў, юрыстаў і журналістаў зрабіў вялікае ўражанне як на літоўцаў, так і на беларусаў. Я хадзіў па вуліцах з літоўцам доктарам Альсэйкам[99], які дзівіўся нацыянальнай свядомасці і патрыятызму палякаў. Я размаўляў з ім пра палітыку і даводзіў, што яны праз залішне легкадумнае ўспрыманне беларускага руху шмат страцілі, бо і сёння ўжо ніхто з беларусаў пра аддачу часткі сваёй этнаграфічнай тэрыторыі Літве і слухаць не хоча, а пагадненні з Літвой Ластоўскага аб перадачы Вільні і земляў у трохкутніку Вільня–Горадня–Ліда ніхто не прызнае.

Акрамя таго, мяне цікавіла праблема прызнання моўных і школьных правоў беларусаў[100]. Безумоўна, негатыўнае стаўленне паслоў і інтэлігенцыі ў Вільні мяне вельмі зацікавіла. Добра вядома, што ўплывы беларускіх дзеячаў з Менска адыгрываюць тут вялікую ролю. Яны прысылаюць грошы на выданне газеты прасавецкага напрамку і давалі інструкцыі і дырэктывы наконт дзеянняў. Пакуль гэта перарвалася арышту на Крэсах купцоў, якія пасярэднічалі не толькі ў сувязі з Менскам, але і ў палітыцы. Гэта яны дастаўлялі грошы на выданні. Цяпер, пасля перарвання гэтага шляху, гэтыя справы вырашае савецкая амбасада ў Варшаве. За савецкія грошы выходзіць цяпер беларуская газета «Сын беларуса».

[99] Адольф Пашкевіч Дэлюліюс (1881–1936) — літоўскі дзеяч, у 1922–1927 гг. старшыня Літоўскага сойма, кіраўнік літоўскай дэлегацыі ў Лізе Нацый.

[100] Маецца на ўвазе прынятае польскім сеймам 9–10 ліпеня 1924 г. так званых «моўных законаў», якія фармальна дазвалялі выкарыстанне беларускай мовы ў школах і ўстановах, але на практыцы

Акрамя таго, мяне цікавіла праблема прызнання моўных і школьных правоў беларусаў[100]. Безумоўна, негатыўнае стаўленне паслоў і інтэлігенцыі ў Вільні мяне вельмі зацікавіла. Добра вядома, што ўплывы беларускіх дзеячаў з Менска адыгрываюць тут вялікую ролю. Яны прысылаюць грошы на выданне газеты прасавецкага напрамку і давалі інструкцыі і дырэктывы наконт дзеянняў. Пакуль гэта перарвалася арышту на Крэсах купцоў, якія пасярэднічалі не толькі ў сувязі з Менскам, але і ў палітыцы. Гэта яны дастаўлялі грошы на выданні. Цяпер, пасля перарвання гэтага шляху, гэтыя справы вырашае савецкая амбасада ў Варшаве. За савецкія грошы выходзіць цяпер беларуская газета «Сын беларуса».

[100] Маецца на ўвазе прынятае польскім сеймам 9–10 ліпеня 1924 г. так званых «моўных законаў», якія фармальна дазвалялі выкарыстанне беларускай мовы ў школах і ўстановах, але на практыцы

адміністрацыі.

[101] «Сын беларуса» – беларуская газета, якая выдавалася ў Вільні з траўня да верасня 1924 г., неафіцыйны орган Беларускага пасольскага клуба.

[102] Людэндорф Эрых (1865–1937) – нямецкі генерал, падчас І сусветнай вайны камандуючы нямецкімі войскамі на ўсходнім фронце.

[103] Скірмунт Раман Марыя (1868–1939) – польска-беларускі дзеяч, пінскі памешчык, старшыня Народнага сакратарыят БНР у 1918 г.

[104] «Беларускі шлях» – штодзённая беларуская газета, якая выходзіла з сакавіка да жніўня 1918 г. у акупаваным немцамі Менску.

[105] «Беларусь» – штодзённая беларуская газета, якая выдавалася з кастрычніка 1919 да ліпеня 1920 г. у Менску.

[106] Блонскі-Лпе Станіслаў (1890–1939) – у 1920-я гг. адзін з кіраўнікоў II аддзела польскага Генеральнага штаба.

Зайшоўшы ў пятніцу, 4 ліпеня на кватэру да пасла Тарашкевіча на Новасенатарскую, я неспадзявана заспеў у яго майго старога знаёмага з 1918 года, вядомага беларускага дзеяча, хоць з паходжання і немца, пана Зуземіля. Нагадваю, што гэты Зуземіль (правая рука Людэндорфа[102], родам з Парэчча каля Пінска (меў зямлю ў суседстве з маёнткам Скірмунта[103]), падчас еўрапейскай вайны дапамагаў у выданні беларускай віленскай газеты «Гоман». Пасля заняцця Менска ён пастаянна круціўся сярод беларусаў, і хоць быў вайскоўцам найніжэйшага рангу – сяржантам, пан доктар Зуземіль літаральна ўсюды меў доступ да ўладаў. Рабіў беларусам дробныя паслугі, даваў грошы на выданне газет, такіх як «Беларускі шлях»[104], «Гоман», «Беларусь»[105], «Русский Вестник»*. Адным словам, самі беларусы называлі яго: гэта наш прымак, г. зн. прыняты ў сям'ю, усыноўлены. Хоць Зуземіль хадайнічаў перад нямецкімі ўладамі пра прызнанне Беларусі ў якасці незалежнай адзінкі, аднак нямецкія ўлады ў 1918 годзе, складзеныя з баварцаў, супраціўляліся гэтай ідэі, паводле іх – бессэнсоўнай. На Раду Беларускай Рэспублікі, якая збіралася адкрыта, немцы глядзелі скрозь пальцы.

Зазначаю, што з цяперашніх беларускіх паслоў Зуземіля добра ведае толькі Аўсяннік, бо яму Зуземіль плаціў за звесткі пра войска Доўбар-Мусніцкага, калі Аўсяннік жыў у Бабруйску. Аўсяннік польскімі вайсковымі ўладамі павінен быў быць у Бабруйску арыштаваны, але ўцёк. Справу Аўсяннік–Доўбар-Мусніцкі я неаднаразова дакладваў паручніку Блонскаму[106]. Ці высветлілі гэтую справу па дакументах архіва Доўбара – не ведаю. Я лічу за памылку, калі гэта не было зроблена.

Зуземіль, пабачыўшы мяне, вельмі здзівіўся, сардэчна прывітаў, запытаўся, як мае справы, і здзіўляўся, чаму такі дзеяч, як я, не з'яўляецца беларускім паслом у сейме. Прыгадваў Менск, маю палітычную працу сярод беларусаў і іншыя падобныя факты з мінулага. Затым, калі мы перайшлі да агульнай размовы, Тарашкевіч з націскам падкрэсліў Зуземілю, што з панам З. можна размаўляць адкрыта, бо ён ад мяне таямніц не мае. Тады Зуземіль жартаўліва зазначыў, што трэба было б мяне

пабойвацца, бо маю адносіны з афіцэрам дэфензівы Блонскім. Здзіўлены гэтымі навінамі, я сказаў Зуземілю, каб ён быў асцярожны, бо і я, і Тарашкевіч, і ўсе хадзілі рабіць палітыку ў II аддзел штаба, калі праводзілася такая агульная праца. Тарашкевіч гэта пацвердзіў, з усмешкай дадаўшы, што ўсе так апякліся на гэтым, што ніхто ў той бок без агіды не глядзіць, а наконт мяне сказаў, што ўдзелу ў Беластоцкім працэсе штаб мне ніколі не даруе.

Тады Зуземіль, на маё вялікае здзіўленне, сказаў, што паводле некаторых звестак, якімі ён валодае, не было нічога лягчэйшага, як падкупіць Блонскага, што гэта было толькі пытанне грошай і велічыні сумы. Я зразумеў, што тут Зуземіль гаворыць як выведнік, а думка пра Блонскага прымусіла мяне задумацца, хоць у праўду гэтага паверыць не магу. Блонскі, хоць трохі і легкадумны, але паляк добры, здрады б ён не дапусціў і немцам бы не служыў. Аднак жа занатоўваю гэта меркаванне як вельмі характэрнае, бо падазраю тут нямецкую выведку.

Зуземіль едзе ў Вільню. Хоча пазнаёміцца са станам беларускага руху. Хоча купіць усе гадавікі газет мінулых часоў. Запрапанаваў мне купіць маю калекцыю за высокую цану. Я не пагадзіўся. Яму хочацца ведаць дынаміку руху. Прапануе матэрыяльную дапамогу ў выданні газет, класікаў беларускай літаратуры, навуковых і школьных працаў.

Што да палітыкі, то ён раіць несаступнасць, пратэсты, нават скандалы і эксцэсы, што ў найбліжэйшай будучыні багата аплаціцца. Выданне друкавалася б у Берліне або Лейпцыгу. Ластоўскі мне яго рэкамендуе як ідэальнага літаратурнага кіраўніка выданняў.

Гэта ўсё пра Тарашкевіча.

Увечары 4 ліпеня я быў з Зуземілем на вячэры. Ён цягнуў мяне за язык, і я яго. Ён пытаўся маю думку пра Тарашкевіча, з якім раней не быў знаёмы, бо Тарашкевіч у 1918 і 1919 гадах быў у Пецярбурзе. Прасіў мяне дапамагчы ў фармаванні думкі пра неабходнасць паразумення з Літвой і літоўцамі. Я сказаў, што гэта цяжка, асабліва цяпер, калі нацыянальныя супярэчнасці і

нетактоўнасць літоўскіх палітыкаў выклікалі пагаршэнне адносін. Ён прызнаўся, што прыехаў, каб самому даследаваць адносіны на месцы. Матэрыяльная дапамога для ўзмацнення руху і планы на будучыню будуць вызначаныя толькі пасля даследавання ўсёй справы.

Пра паўстанне, узброены рух і меркаваную вайну ён не ўспамінаў ані словам. Здзіўляўся толькі, што я, расійскі вайсковец у званні палкоўніка, не ўступіў у польскае войска. Я адказаў, што гэта – не кар'ера, цяжкія ўмовы, ды, зрэшты, хацеў бы служыць толькі ў беларускім войску. Ён запісаў сабе мой адрас. Я яго прасіў, ці не мог бы я праз яго дастаць беларускія выданні, якія друкаваліся ў Коўне і Берліне, а ў нас забароненыя цэнзурай. Ён паспешліва паабяцаў, што ўсё мне прышле праз нямецкую амбасаду.

Пры аплаце вячэры я не хацеў, каб ён за мяне плаціў, пасля спрэчкі заплацілі па-нямецку, напалам. Я пры развітанні абяцаў яму дапамогу і сказаў, што ў суботу, 5 ліпеня, еду на пару дзён у Вільню. Ён сказаў, што і ён там будзе, і мы спаткаемся ў Луцкевіча.

Шэршань

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2475. Падтэчка 21. Арк. 28–31.

РАПАРТ РАМУАЛЬДА ЗЯМКЕВІЧА Ў II АДДЗЕЛ ГЕНЕРАЛЬНАГА ШТАБА АД 8 КРАСАВІКА 1925 г.
У II аддзел Генеральнага штаба

Рапарт

Літоўцы. Літоўскі камітэт у Вільні[107] атрымаў даручэнне з Коўна любой цаной наладзіць адносіны з беларусамі, але толькі з тымі, якія настроеныя рэвалюцыйна. Таму старшыня камітэта доктар Альсэйка разам з сябрамі камітэта Шлапелісам[108] і адвакатам Каразія[109] звярнуліся да паслаўнічы Ярэміча, які ахвотна гэта правёў. Сход адбыўся 22 сакавіка. 25

[107] Літоўскі камітэт у Вільні – галоўны апарат літоўскі камітэт у Вільні – галоўны апарат

сакавіка, у дзень 400-годдзя беларускага друку ў Вільні. У гадавіны абвяшчэння незалежнасці Беларусі, многія з іх ужо прыехалі на з’езд, а доктар Альсэйка сказаў прамову па-польшчы, беларуску. З запрошаных палякаў з польскіх урадавых колаў ніхто на ўрачыстасць не прыйшоў, калі не лічыць таямных агентаў камісара ўрада, якія на вачах усіх запісвалі прамовы гасцей. Літоўцы і беларусы заявілі, што ніколі больш на свае культурныя ўрачыстасці запрашаць палякаў не будуць. Пасол прэм’ер сказаў, што беларусы прымуць дапамогу літоўскіх шаўлістаў[108] з мэтай вызвалення краю ад польскіх акупантаў, а што тычыцца прыналежнасці Вільні адзінаму ці другому боку, то гэта будзе вырашаць скліканы дзеля гэтай мэты сейм у Вільні. Беларусы ўстрымаліся ад галасавання, бо ім не было ніякай справы да літоўскіх спраў. Урадавы польскі друк назваў гэта – вялікім поспехам польскага ўрада, здрадніцкай дзейнасцю беларускіх палітыкаў і ўдзячнасцю краёвых колаў[109] да ўрада. Не дакажуць гэтага, беларусы прыкладуць усіх намаганняў, каб пашырыць сваю дзейнасць[110] і ў далейшым. Габрэйская інтэлігенцыя ў Вільні незвычайна зычліва ставіцца да беларускага[111] руху і ахвотна ідзе нам на сустрэчу[112]. Шабад[113] (1864–1934) – габрэйскі дзеяч у Вільні, адвакат. У 1919–1937 гг. – дырэктар віленскай літоўскай гімназіі. У 1925 г. – міністр унутраных спраў Літвы. У 1926–1934 гг. – старшыня Цэнтральнага камітэта сіянісцкіх арганізацый Літвы. У 1934 г. – старшыня Сусветнага сіянісцкага камітэта.

[108] Шаляціс Юргіс (1876–1941) – літоўскі дзеяч з Вільні, рэдактар шэрагу літоўскіх газет.

[109] Караніс Павілас (1887–1955) – літоўскі дзеяч з Вільні, у 1921–1932 гг. дырэктар віленскай літоўскай гімназіі.

[110] Шаўлісты – сябры літоўскай вайсізавацкай арганізацыі Шаўлію саюнга (Šaulių sąjunga) – Саюз стралкоў, якая існавала ў Літве ў 1919–1940 гг.

[111] Тумаш Сабаліс (1878–1941) – літоўскі палітычны і дзяржаўны дзеяч, у 1925 г. – міністр унутраных спраў Літвы.

[112] Кажоны хамут – тонкі, але трывалы ланцуг.

[113] Шабад Ніцах (1864–1934) – габрэйскі дзеяч у Вільні, адвакат.

няма, маральную падтрымку ў замежнай прэсе, як і матэрыяльную ў выпадку палітычных працэсаў паабяцаў доктар Шабад[113], габрэйскі дзеяч. На юбілеі 25 сакавіка габрэі казалі вельмі сардэчныя прамовы. Польскім урадавым дзеячам, як, напрыклад, віленскаму старасту Грабоўскаму*, падаецца, што калі б беларускім сялянам толькі даць зямлі, то ўвесь беларускі рух страціў бы грунт, і тады школаў і моўных правоў не патрэбна было б уводзіць. Гэта ілюзія. Ні ён, ні польскія дзеячы не ведаюць патэнцыйнай сілы і характару беларуса. Патэнцыйная сіла ўсё больш расце, а характар беларуса, ціхі, але ўпарты, ніколі не дазволіць яму забыцца, што ён меў больш за 300 школаў, якія падабаліся дзецям і яму, бо былі на роднай мове. Упартасць, заўзятасць і помста за крыўды, няважна, за сапраўдныя ці выдуманыя, заўсёды праяўляюцца ў беларуса пры першай магчымасці.

У апошні час зноў былі зачыненыя прыватныя беларускія школы ў Слонімскім і Пружанскім паветах. Гэта школы ў Чамярах, Прудах, Лядзіне, Азарычах, Угрыні і Злоцееве. У

дачыненні да настаўніц гэтых школаў былі ўжытыя разнастайныя рэпрэсіі.

Калі прыгадаць, што 20 красавіка г. г. у Горадні павінна слухацца справа 72 беларусаў, абвінавачаных у імкненні адарваць Гарадзеншчыну ад Польшчы, і што там выступае як галоўны сведка правакатар Лянкевіч, вядомы з працэсу ў Беластоку, то можна зразумець, што беларусы не маюць ніякай веры ў добрыя пачынанні пана міністра Тугута і ў рэальнасць гэтага і ў карысць для сябе не вераць. Даводзіцца чуць галасы, што калі прыйдуць літоўцы і бальшавікі, то ўсе схопяцца за схаваную зброю і пойдуць у літоўскую ці бальшавіцкую арміі як добраахвотнікі. У размовах усё гучней пра гэта чуваць. Беларуская інтэлігенцыя галадае. А голад – кепскі дарадца.

Схаванай зброі на тэрыторыі Крэсаў ёсць вельмі шмат. Ператрусы, праведзеныя ў апошні час, даюць добрыя вынікі.

У суботу, 4 красавіка, аб 11-й гадзіне раніцы, на кватэры ў пасла Тарашкевіча я пазнаёміўся са службоўцам англійскай амбасады панам Рычардам Кімэнсам[114]. Ён прыйшоў да Тарашкевіча, каб папрасіць яго ўдакладніць пададзены раней мемарыял, датычны беларускай справы. Канкрэтна яму патрабуюцца больш дакладныя статыстычныя звесткі пра працэнтныя суадносіны літоўцаў на Віленшчыне. Звесткі павінны апрацаваць сенатар Уласаў[115] і пасол Тарашкевіч.

На святы павінныя быць некалькі пасяджэнняў у Вільні. Гаворка пойдзе пра Бэнэша[116], які, маючы шмат магчымасцяў у беларускай справе, паводле апошніх звестак, не хоча выступіць у Лізе нацый. У Вільні ёсць праект, каб упаўнаважыць Ластоўскага з Коўна і Крачэўскага[117] з Прагі выступіць у Лізе нацый. Здаецца, ковенскі ўрад пакажа актыўную падтрымку і асігнуе на гэтае выступленне вялікую суму. Адозва беларускіх паслоў і сенатараў у Лігу нацый павінна абмяркоўвацца на святочных сходах.

[114] Рычард Кімэнс – англійскі дыпламат, у 1922–1925 г. кансул Вялікабрытаніі ў Вільні.

[115] Уласаў Аляксандр (1874–1941) – беларускі дзеяч, у 1922–1927 гг. сенатар Польскай Рэспублікі.

[116] Бэнэш Эдвард (1884–1948) – чэхаславацкі палітычны дзеяч, у 1918–1935 гг. міністр замежных спраў Чэхаславакіі, з 1935 г. прэзідэнт краіны.

[117] Крачэўскі Пётра (1879–1928) – беларускі дзеяч, старшыня

Радыёвяжу» 1919 «*Чырвоны сьцяг*»[119], раскідаюцца ўсюды. Паводле слоніка нашага эпохі ЦК КПЗБ, які ўтрымліваў сведчанні 1924 да 1936 г. пра беларускіх камуністаў, «*Выпрасьніцтва – пашыраны ў 1920–1938 гг. спосаб пазбавіцца ад небяспечных для ўлады людзей, якія не маюць віны. Найчасьцей выпрасьніцтва ўжывалі ў адносінах да членаў КПЗБ, якіх выдалялі з краіны, не прад'яўляючы ім абвінавачаньняў*»[120]. Быў ужыты і да беларускіх камуністаў, якіх выслалі ў Савецкую Беларусь у 1925 г.

Я вельмі хацеў бы, каб неідэйныя прыкідваліся камуністамі, не верылі ў рускую ідэю, а беларускія абавязкова выходзілі б з беларускай партыі. Тады будзе дапамога рэвалюцыі і імкненне да той мэты, каб выгнаць польскіх прыгнятальнікаў і злодзеяў.

Цяпер, вясною, было б добра, каб я часцей мог бываць у Вільні, бо нарады і пасяджэнні будуць часцейшыя. Цікава, што ў рэдакцыю «Беларускай долі»[120] прыходзяць на размовы розныя бліжэй мне не вядомыя, але цікавыя людзі. Пераважаюць габрэі, а іх камуністычныя тэндэнцыі адчуваюцца адразу з размовы.

Чыгуначныя масты цяпер вартуюцца слаба. Двое паліцыянтаў, з аднога і другога боку моста на рэчцы Вацы каля Ландварава спалі, замест таго каб пільнаваць. Гэта было ноччу з 5 на 6 красавіка. Варту мастоў трэба было б узмацніць вайсковымі пастамі, бо крэсовая паліцыя нічога не вартая.

Шэршань

Варшава

8 красавіка 1925 г.[121]

ЦВА. II аддзел Генеральнага штаба. Сігн. I.303.4.2680. Пачатэчка 37.

*Прадмова, пераклад і падрыхтоўка да друку Андрэя Чарнякевіча і Алеся Пашкевіча**

* **Андрэй Чарнякевіч** (нар. у 1974) – кандыдат гістарычных навук, выкладчык Гарадзенскага дзяржаўнага ўніверсытэту імя Я. Купалы.

Алесь Пашкевіч (нар. у 1978) – асьпірант Інстытуту гісторыі НАН Беларусі.

Іх апошняя сумесная публікацыя ў «ARCHE» мела назву «Штары

[118] Гл. слоўнік.

[119] «Выпрасьніцтва – пашыраны ў 1920–1938 гг. спосаб пазбавіцца ад небяспечных для ўлады людзей, якія не маюць віны. Найчасьцей выпрасьніцтва ўжывалі ў адносінах да членаў КПЗБ, якіх выдалялі з краіны, не прад'яўляючы ім абвінавачаньняў». Цыт. па: ЦК КПЗБ – КПБ у дакументах і лічбах. Кн. 1. Мн., 1994. С. 35.

[120] Беларуская легальная газета, якая выходзіла ў Вільні ў 1925 г.

[121] На рапарт накладзена рэзалюцыя: «Капітану О. Увесь рапарт без подпісу і тое, што прызначана, пераслаць да ведама ДОК II».

нямецкі агент» ці «Бацька радзіміцкага народу»?» (4/2005) мэтай яго ацэнкі. Б.».

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне [mk]. Абнаўленьне [czyk].
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image] [image]2005

ад Зьмітук

ацалітыка • крытыка • палеміка • **гісторыя** • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

ЗЬМІЦЕР СЕРАБРАКОЎ

Зьміцер Серабракоў Дванаццаты год Лукашэнкіяны З мазаічна-псыхапатычнага пано складваецца цэльная карціна

філёзаф. Выпускнік факультэту філязофіі Люблінскага Каталіцкага ўнівэрсытэту. Літаратурны аглядальнік газэтаў «Згода» і «Навінкі». Жыве і працуе ў Бабруйску.

Дзесяцігодзьдзе знаходжаньня ва ўладзе прэзыдэнта Аляксандра Лукашэнкі ў справе памнажэньня багацьця беларускай літаратуры новымі жанрамі і новымі творамі плённасьцю і разнастайнасьцю няма з чым параўнаць. У савецкія гады ў Беларусі амаль не было такой распаўсюджанай у дысыдэнцкіх колах практыкі антыўрадавага самвыдаву. Лукашэнкаўскае кіраваньне дало беларускай інтэлігенцыі шанец «дагнаць страчаны час» – прайсьці ўсе этапы фармаваньня дысыдэнта як спажыўца палітычнай сатыры. За гэтыя гады выйшла больш за паўтара дзясятка кніг, мноства часопісных і газэтных публікацыяў, распаўсюдзілася інтэрнэт-літаратура, зьява, якая і ня сьнілася тым вальнадумцам, якія псавалі вочы над блядымі ксэра- і нават гектаграфічнымі копіямі «Архіпэлягу ГУЛАГу».

Зьмяніліся жанр і стыль «твораў на зададзеную тэму», якія

зрабіліся глебай для цікавых, амаль літаратуразнаўчых досьледаў. У адным з нумароў «БДГ» у артыкуле «Герой нашага часу» (9/2002) была дадзеная спроба тыпалягізацыі антылукашэнкаўскага самвыдаву. Пераломным як для прэзыдэнта, які з казачным адрывам ад канкурэнтаў выйграў свае другія выбары, так і для апазыцыі і яе стратэгіі палітычнай і ідэалягічнай барацьбы ва ўсім сьвеце стаў «год блізьнятаў».

Пачатак 1990-х гадоў і пачатак кіраваньня прэзыдэнта Лукашэнкі праходзіў усё яшчэ ў рэчышчы наіўнай кабалістыкі і веры ў моц друкаванага слова. Савецкія дысыдэнты 1980-х усур'ёз лічылі, што саўдэпіі прынёс сьмерць ксэракс, то бок мэханізмы для свабоднага распаўсюджваньня і множаньня інфармацыі. У 1990-я разам з крушэньнем бэрлінскага муру парушылася манаполія ўлады на інфармацыю. Абрынулася цэлая сыстэма каардынатаў, а паводле правілаў лёгікі – з супярэчных выказваньняў можа быць выведзенае любое, якое заўгодна выказваньне, «усё магчыма», anything go.

«САШКА» І «ЛУКА МУДЗІШЧАЎ»

Першыя крокі Аляксандар Лукашэнка зрабіў не на эканамічным, матэрыяльным полі, а ў сфэры ідэяў – адмяніў прынятыя папярэднікамі дзяржаўныя сымбалі і ўтрываліў у сваіх правох паноўную мову Савецкага Саюзу. Таму і першасная рэакцыя супраціўнікаў прэзыдэнта адбылася на полі філялёгіі і наіўнай літаратурнай варажбы – фэльетон Анатоля Стрэлянага «Сашка» і ананімная паэма «Лука Мудзішчаў» закляймілі выскачку «агнём сатыры», як калісьці мастакі-карыкатурысты ў савецкіх выданьнях кшталту «Крокодила» або «Вожыка». Паколькі першасная рэакцыя заўсёды найбольш шчырая і амаль пазбаўленая палітычнай і спажывецкай каньюнктуры, гэтыя творы, бадай, найлепшыя, прынамсі ў мастацкім сэнсе. У паэме прасочваюцца традыцыі ананімнай народнай паэзіі, бурлеску, хрэстаматыйных «Тараса» і «Энэіды». Фэльетон Анатоля Стрэлянага, журналіста расейскай службы радыё «Свабода», знаходзіцца ў рэчышчы брэхтаўскай «кар'еры Артура Ўі» («першая думка, якую, прачнуўшыся прэзыдэнтам, адчуў Сашка, гэта тое, што нікога больш над ім ня будзе…»), кар'еры маленькага чалавечка, на якога зьнянацку

звaліўся вялікі кавалак нічым не абмежаванай улады. Збольшага гэткая карнавалізацыя была працягам перабудовачнай свабоды слова, калі здавалася немагчымым, каб ідал дзяржаўнай улады, дэсакралізаванай на пачатку 1990-х гадоў, пачаў узыходжаньне на паганскі Алімп.

[image] Значэньне твора Славаміра Адамовіча «Забі прэзыдэнта» ўжо на першы погляд знаходзіцца зь іншага боку літаратуры і мастацтва: верш больш правакацыйны, палітызаваны. Групе літаратурных экспэртаў на судзе лёгка ўдалося давесьці, што зь літаратурнага гледзішча верш ня мае асаблівай вартасьці, акрамя таго, у ім няма згадак пра канкрэтную асобу, зьнявага якой вартая пазбаўленьня волі. Тым ня менш, усё атрымалася так, як, здаецца, паэт і плянаваў: правакацыя выклікала рэпрэсію, рэпрэсія выклікала цікавасьць адпаведных колаў да асобы паэта-бунтара... У выніку паэт апынуўся ў эміграцыі, што азначае ізаляцыю і адарванасьць ад глебы большую, чым зьняволеньне на нарах Валадаркі. «Забі прэзыдэнта» – анархічны тэкст пра ўладу ўвогуле. «Прэзыдэнт» увасабляе пэрсаніфікаваны прынцып легітымізаванага гвалту падпарадкаваньня Майстру, Гаспадару, Генсеку, Фараону і г. д. Валянцін Акудовіч пазначыў гэты твор як удалае спалучэньне «эстэтыкі пластыкавай бомбы» і адраджэнскай ахвярнасьці («Разбурыць Парыж»). Бомба, скажам, такая ж папяровая, як і тая, якой сам Акудовіч зьбіраўся бамбардаваць Элізэйскія палі, інакш тэрарыста Адамовіча не пусьцілі б на эміграцыю ў Нарвэгію – там такіх «эстэтаў» ня дужа шануюць.

ВАСІЛЬ БЫКАЎ, «ПАХАДЖАНЕ»; УЛАДЗІМЕР ПАДГОЛ, «КУЛЯ ДЛЯ ПРЭЗЫДЭНТА»; ІВАН СТАТЫСЯЧНЫ, «ВІЗА Ў 21 ВЕК»
Гэтыя аўтары спрабавалі разглядаць беларускую праблему празь містычна-мэтафізычныя акуляры, мода на якія таксама пачалася задоўга да перабудовачных часоў. Выбух мас-мэдыяў і дазвол на тое, што раней было забаронена, непазьбежна выклікаў цікавасьць да біблейскіх (як у Быкава) і эзатэрычных сюжэтаў, зьвязаных зь пераменамі ў сьветапоглядзе.

Мэтафара выбранага народу, якога выводзяць зь няволі ў зямлю абяцаную, часта гучала ў дачыненьні да

посттаталітарнага грамадзтва, якому, на думку аналітыкаў, патрэбная была зьмена пакаленьняў, каб пражыць заганны мэнталітэт, замест якога павінен быў прыйсьці аптымістычны рай рынкавай эканомікі і адкрытага грамадзтва. Вінаваты ва ўсім, канечне, той, хто стаіць на шляху да «прагрэсу», «росквіту», «мадэрну» ці нават «постмадэрну» і іншых зьвязаных зь «люстпрынцыпам» канатацыяў. Кайфалом, які не дае як трэба пазабаўляцца, трапіць у нірвану сьветлай будучыні. Трэба ўсё ж дадаць, што на наркотык прыўкраснага заўтра падсаджвалі ўсё ж бальшавікі. Чаму так прагне атрымаць «візу ў XXI век» аўтар кнігі, які самастойна авалодаў мудрасьцямі эзатэрычных навук таварыства Рэрыхаў і Блавацкай і прагне падзяліцца з чытачамі?

Из некоторых источников, от людей, знающих куда более, чем автор, есть информация, что дело мы имеем с воплощенной в человеческое тело Лукашенко монадой Гитлера… специфика рождения, председатель колхоза – ефрейтор, стремительный вход во власть, референдумы и прочие методы действий...

(Іван Статысячны, «Віза ў 21 век»)

Зь іншага боку, ёсьць паведамленьне пра пэўнае эзатэрычнае таварыства, якое запрашала прэзыдэнта РБ ачоліць рух духоўнага аднаўленьня ўсёй плянэты, пачаўшы зь Беларусі (Ізяслаў Адліванкін, «Нашэсьце. У атачэньні сэктаў і акультызму»). Пошукі мэтафізычных абгрунтаваньняў апрыёры заганнага стану рэчаў атрымліваюцца пошукамі канфуцыянскага чорнага ката ў чорным пакоі. Абвясьціць дзейнага прэзыдэнта манадай Чынгісхана, ці заявіць пра сакрэтную амбуляторную карту псыхічна хворага, ці запусьціць журналісцкую качку пра таямнічага цыгана ў радаводзе «шклоўскага бастарда» – рэчы з арсэналу махляроў-барзапісцаў, якія разьлічваюць на посьпех кічу.

[image] Падголаўская «Куля для прэзыдэнта» – своеасаблівы раман-калямбур, назва якога ўгрунтаваная ў гульню сэнсаў-сымбаляў слова куля: куля – гэта і назва кія для кульгавых інвалідаў, і геамэтрычная фігура, да якой падобная наша

плянэта, ну і ўласна куля, якую прагне паслаць у вантробы дыктатара-Цэзара гіпатэтычны Брут. Казачны сюжэт, натхнёны літаратурнымі алюзіямі з караткевічаўскай «Ладзьдзі роспачы», пазытыўны пэрсанаж сымбалізуе віталістычна-гуманістычныя ідэалы, нэгатыў абрысаваны ў эстэтыцы сьмерці і распаду. Маніхейскі дуалізм, між тым, як відаць няўзброеным вокам, карэніцца ў савецка-мадэрновым прагрэсізьме і веры ў сьветлую будучыню, казачны рай, шлях да якога перагарадзіла агідная пачвара.

УЛАДА ЭРАСА: УЛАДЗІМЕР НЯКЛЯЕЎ, «ЛАБУХ»; МАРТА ПІНЬСКА, «БЕЛАРУСКА»

У рызыкоўным творы вядомага паэта-песеньніка Ўладзімера Някляева – гісторыя душы рэстараннага музыканта, «лабуха». Узыходжаньне ад паўнаты матэрыяльнага быцьця ў плерому абсалюту разгортваеца на тле знаёмых дэкарацыяў беларускага аўтарытарнага рэжыму. Містычны падтэкст прачытваеца лёгка, ключавое слова «дао» і развагі пра кітайскую філязофію дазваляюць не засяроджвацца на адцягваючых увагу добрасумленна прапісаных парнаграфічных эпізодах раману, а выстройваць ланцужкі паняткаў: сэкс = гвалт; улада = сэкс. Прэзыдэнт зьяўляецца першарухавіком у працэсе пасьлядоўнага траху, вяршыняй піраміды, ля падножжа якой знаходзяцца самыя прыніжаныя і зьнядоленыя. Па-за гэтым сьветам – «нішто», дао, ня-дзеяньне і ўвадначас творчая аснова сусьвету. Дзеяньне бязь дзеяньняў, калі ў двух словах. Найвышэйшы і наймудрэйшы стан усяго існага і няіснага. Чалавек трымаецца зямлі, зямля трымаецца неба, неба трымаецца дао, а дао – самога сябе. Дао настолькі ўва ўсім прысутнічае, што і адсутнічае ўва ўсім.

Слова «раманчык» тут мае некалькі значэньняў: па-першае, так зваць галоўнага героя «Лабуха» – Раман Канстанцінавіч, далей – гэта літаратурны жанр і назва лёгкай амурнай прыгоды без асаблівых абавязкаў, нарэшце, «раманчыкам» герой называе свайго скуранога сяброка, безь якога, зразумела, ніякія раманчыкі ўвогуле немагчымыя.

Пра што гэтая кніга? Скандальны літаратурны твор, у якім на

першых ста пяцідзесяці старонках падрабязна апісваюцца: палавы акт з маладой дзяўчынай, палавы акт са здаравеннай жанчынай (прафэсаркай) з рубэнсаўскімі формамі, успаміны пра вясковага прыдурка-заафіла, згадкі пра гомасэксуалістаў, жанчына, муж якой філёзаф-кітаіст – імпатэнт, таму яна займаецца сэксам з догам, палавы акт з пажылой жанчынай, успаміны пра сэкс у самалёце, сэкс на могілках з удзелам прывіда Амэліі, фантазіі на тэму сэксу з гераіняй карціны нямецкага мастака эпохі барока «Шакалядніца»... і шмат, шмат іншага, не хапае хіба толькі гумовай лялькі, але і яна зьяўляецца – і ўрэшце ў чытача ёсьць шанец дайсьці да палітычнай інтрыгі. Лабуха зьбіраюцца выкарыстаць улады. Шантажуюць забойствам, якога той не зьдзяйсьняў, каб Раманчык выступіў спачатку супраць кандыдата ад улады, пайшоў у апазыцыю, а пасьля выйшаў з апазыцыі і выступіў па тэлевізіі з сэнсацыйнымі выкрываньнямі апазыцыйных махінацыяў. Але ўсё канчаецца хэпі-эндам ува ўсходнім стылі. Хэпі-энд для героя-амараліста – гэта стан нірваны, атрыманьне дао, боскага прынцыпу, які ня мае формы і зьместу. Гэнры Мілер лічыў, што ўсё чалавецтва павінна прайсьці праз Тропік Рака – містычную кропку поўнага надзіру, пасьля якой павінна пачацца ўзыходжаньне чалавецтва да нечага лепшага. У рамане Някляева таксама прысутнічае пэўны «тропік рака», так з дапамогай непрыстойнай сэксуальнай мэтафары аўтар сымбалізуе гвалтоўны характар улады ўвогуле і лякальнай у прыватнасьці:

Я трахаў Лі-Лі, паставіўшы ракам, мяне ў задніцу драў Патапейка, Патапейку – сябра ягоны Пятро Зіноўевіч, Пятра Зіноўевіча – Красевіч, Красевіча – падпалкоўнік Панок, падпалкоўніка Панка – Шыгуцкі... і ў гэтым трахальным карагодзе, стоячы адзін за адным, дралі адзін аднаго яшчэ сотні і сотні, тысячы і тысячы людзей... брат-міліцыянт і Росьцік, бамжы і Амед, палатны доктар Іосіф Данілавіч і нябожчык Адам Захаравіч, Поль і Алік, Максім Аркадзевіч і прафэсар Румас, Фэлікс і хто там яшчэ – не пазнаць, і колькі яшчэ – не зьлічыць... і ўсіх скрозь усіх, і мяне скрозь задніцы Шыгуцкага, Панка, Красевіча, Патапейкі, і Лі-Лі скрозь мяне трахаў прэзыдэнт – гэткі ў яго быў ялдак! Мы ўсе былі нанізаныя на ім, як на

шампуры, апошняя круцілася на канцы ягоным Лі-Лі, і невыносна патыхала сырым мясам з экскрэмэнтамі, і дзеці Амеда бегалі, пасыпаючы ўсіх прыправамі: «Спэцый, спэцый трэба не шкадаваць!..»

«А ты думаў сасьлізнуць!.. – вочы закочваючы і бліскаючы бялкамі, крычаў прэзыдэнт Фэліксу. – Давай пасыпай яго, татарва! А то сьмярдзіць па-амэрыканску!..»

Ён так кайфаваў, што мае ўсіх праз кожнага ў адну дзірку – у яго рот перакошваўся, і сьліні цяклі ад кайфу...

Фэлікс быццам сон мой бачыў... «І ведаеш, што ён адказаў?.. Што ў яго канец такі здаровы?..» – «Не... Што ён прэзыдэнт, а таму можа трахаць каго хоча і як хоча... І, калі дамовімся, я таксама трахаць буду, каго захачу... Апроч Яго».

Такім чынам, сацыяльная роля першай асобы краіны зьліваецца з сэксуальнай, быццам гаворка ідзе не пра дзяржаўную асобу і дзяржаву, а пра статак шымпанзэ. Шукальнікі «кампраматаў» таксам недалёка адышлі ад дамаслых парнографаў. «Беларуска» мітычнай Марты Піньскай – гэта не гісторыя жыцьця прэзыдэнта, а хутчэй гісторыя пра жыцьцё пры прэзыдэнту. «Беларуска» ўвасабляе «здаровыя» сэксуальныя сілы краіны, якія зьдзяйсьняюць нейкі незразумелы нэафітам сэксуальны рытуал, глыбінны сэнс якога можна лепш растлумачыць на прыкладзе ўзгаданага калектыву шымпанзэ.

НОВАЯ ХВАЛЯ КАМПРАМАТУ: У. МАЦІКЕВІЧ, «НАШЭСЬЦЕ»; СЬВЯТЛАНА КАЛІНКІНА, ПАВАЛ ШАРАМЕТ, «ВЫПАДКОВЫ ПРЭЗЫДЭНТ»

Працягвае тэму «беларускага Казановы» кніга, пазначаная прозьвішчам, якое нагадвае пра апальнага шэфа дзяржаўнай бясьпекі. Тут ужо ня толькі журналісцкае расьсьледаваньне – тут кампрамат з «архіваў сакрэтнай паліцыі», што, безумоўна, павінна выклікаць пачуцьцё баязьлівай павагі ў легкаверных чытачоў. «Сакрэтная амбуляторная карта» шклоўскага маньяка дэманструе публіцы сапраўднага маральнага і псыхічнага

монстра зь неўраўнаважанай псыхікай, пазбаўленага маральных прынцыпаў, схільнага да дробнай хлусьні і крадзяжу.

Из показаний горничной гостиницы «Октябрьская»:

Я женщина одинокая, ребенка одна ращу. А тут народный депутат, обходительный такой, простой наш мужик. Обещал картошки привезти, помочь деньгами… После всего, что было – противно говорить. Поимел и бросил, как у нас девки говорят. Ни картошки, ни денег. Сволочь, извращенец. Белье мое спрятал. Говорит, на память.

(«Нашэсьце»)

Зрэшты тэма «права на шчасьце» намэнклятурнага работніка абмяркоўвалася ў той самай знакамітай савецкай кінастужцы «Любоў зямная», дзе задужа шчадралюбны старшыня калгасу заблытаўся ў сваіх амурах. Чаму, аднак, прэзыдэнту не дазволена тое, што дазваляюць сабе супрацоўніцы беларускай службы радыё «Свабода» ў рамане «Беларуска», немагчыма растлумачыць ніякай лёгікай. Відавочная падвойная бухгальтэрыя: калі ў адных пэўнае дзеяньне разглядаецца як жыцьцёвы парыў сэксуальнага рэвалюцыянэра ў змаганьні з дыктатурай шэрасьці, то ў другім выпадку блудлівыя прыгоды маюць прычынай нэгатыўны ўплыў нячыстых генаў расава непаўнацэннага прэзыдэнта. Міт пра «цыганскае паходжаньне» палітычнага апанэнта, безумоўна, не ўпрыгожвае «чорных піяршчыкаў», бо ён не зьяўляецца паліткарэктным, а само такое паходжаньне ніколі не было злачынствам. Любоўныя авантуры маладога дэпутата, якія бляднеюць на тле скандалаў заакіянскіх калегаў, ды фінансавыя махінацыі прэзыдэнцкай каманды, апісаныя ў «Нашэсьці», выглядаюць непераканаўча. «Выпадковы прэзыдэнт» Калінкінай і Шарамета – безумоўны скок у бок большай аб'ектыўнасьці: «этыка журналістаў» (калі яна яшчэ існуе) не дазваляе абсмоктваць акалічнасьці «таямніцы паходжаньня» кіраўніка дзяржавы, тым больш акцэнтаваць нібыта сэміцкія карані прэзыдэнта. Замест незвычайных сэксуальных здольнасьцяў, якія ў традыцыйных дзікіх плямёнах і ў архетыпах масавай сьвядомасьці

зьяўляюцца неабходным атрыбутам правадыра статку, аўтары «Выпадковага прэзыдэнта» прыпісалі лідэру нацыі іншы містычны сымбаль улады і магутнасьці – грошы. Дзесяць мільярдаў даляраў на сакрэтных рахунках у швайцарскіх банках, што перавышае даходы расейскіх алігархаў. У нашай невялікай краіне алігарх можа быць толькі адзін. Адзін з удалых эпізодаў кніжкі – гісторыя эканамічнага генія дэпутата Лукашэнкі, які раіў Гарбачову не прымаць праграмы «500 дзён». Дакумэнтальныя кадры паказваюць чалавечка з чырвоным тварам за эсэсэсэраўскай трыбунай, які, мітусьліва ўсьміхаючыся, нешта гаворыць прэзыдэнту СССР… Прэзыдэнцкае славаблудзьдзе таксама на сёньня не загана – дзе, скажэце, цяпер Гарбачоў, а дзе Ён?

ТУРЭМНЫЯ МЭМУАРЫ: ВАСІЛЬ ЛЯВОНАЎ, «РАБОТА НАД ПАМЫЛКАМІ»; АНДРЭЙ КЛІМАЎ, «ПЛОШЧА НЕЗАЛЕЖНАСЬЦІ»

Андрэй Клімаў адбыў шасьцігадовы тэрмін пакараньня за эканамічныя злачынствы, так бы мовіць, «ні за што». Тут дарэчы будзе згадаць показку сталінскіх часоў «ні за што дзесяць гадоў даюць». Зь месцаў зьняволеньня былы пажарны, дэпутат, банкір, газэтны алігарх і г. д. выйшаў поўны аптымізму і веры ва ўласную будучыню: ён правёў некалькі прэс-канфэрэнцыяў, выдаў некалькі кніжак, засьвяціўся ў бамондзе, словам, зрабіў усё неабходнае, каб стаць вялікім палітыкам *там, дзе яму трэба*. Там, але ня тут. «Тутэйшае» тэлебачаньне альбо цалкам праігнаравала апазыцыйнага палітыка, альбо паказала ў абсалютна непрыдатным для грамадзкага дзеяча кантэксьце: фільм «Дарога ў нікуды» зрабіў зь вязьня замку на Валадарцы поўнага ідыёта з маніяй велічы, які разважае пра лёс айчыны то з Напалеонам, то з Альфрэдам Нобэлем… Насамрэч, увесь час знаходзіцца ў пэрманэнтным маналёгу з самім сабой, а журналіст Яўген Агурцоў толькі фіксуе палёт думкі былога майстра тушэньня пажараў. Куды цікавейшы апошні твор Андрэя Клімава – «Паўстаньне 2005», дзе Клімаў абвясьціў дзень 25 сакавіка пачаткам рэвалюцыі, пасьля якой павінны пачацца сапраўдныя перамены. Перамены, дарэчы, адбыліся, але толькі ў лёсе аўтара бэстсэлеру, які зноў

трапіў за краты – неблагі вынік, якім улады прызналі адносную псыхічную прытомнасьць літаратурнага экстрэмала.

Славамір Адамовіч і Павал Севярынец таксама вылучыліся публікацыяй «турэмных дзёньнікаў», чым унесьлі свой творчы даробак у літаратуру турэмных мэмуараў, а Адамовіч цяпер яшчэ працуе ў жанры «лістоў з выгнаньня».

ПРЭЗЫДЭНЦКІ ПРЭФЭРАНС: КАРТЫ АПАЗЫЦЫІ

Карты і картачныя гульні заўсёды зьвязваліся зь містыкай і таямніцай. «Пікавая дама», «Клюб самагубцаў», «Аліса» і «Новыя прыгоды ката ў ботах»… У свой час картачныя столікі нават былі месцам містычнага пераразьмеркаваньня вялікіх грашовых сумаў і нерухомасьці. У дваццатым стагодзьдзі карты сталі фішкай у палітычных гульнях. Матронкі і карты з тварамі палітыкаў – гэта даўно ўжо не біном Ньютана. Апошняя творчая акцыя – вядомая калода картаў, надрукаваных для амэрыканскага экспэдыцыйнага корпусу ў Іраку, каб джы-ай маглі апазнаць ворага дэмакратыі (варта адзначыць, што карты са здымкамі адміністрацыі амэрыканскіх прэзыдэнтаў таксама час ад часу друкуюцца). Нарэшце зазірнула сонца і ў наша аконца. Добразычлівыя жартаўнікі выпусьцілі цэлую прэфэрансавую калоду на 54 карты з джокерамі. Галоўны Джокер Рэспублікі – вядомы нам лыжнік з Карла Маркса, 38. Рэшта – прэзыдэнцкая каманда. Іншыя вядомыя і невядомыя палітыкі. Нас цікавіць, аднак, крытэр адбору – чаму гэты, а ня іншы? Партнэрам галоўнага Джокера краіны стаў прем’ер краіны Анатоль Тозік, генэралы, міністры, судзьдзі – каралямі, валетамі і іншай драбязой, тэлепіскуны Зімоўскі, Шынкар і Новікаў – вядома ж, шасьцёркі. Ярмошына і Ермакова – дамы. А вось і дама пік Тамара Віньнікава. Але ў калодзе яна чырвовая дама! Чаму? Такая яркая брунэтка… Яе прыналежнасьць да клану ўлады несумнеўная – былая старшыня Нацбанку, якая на ўсялякі выпадак уцякла за мяжу, што дало прэзыдэнту падставу гаварыць, што, маўляў, астатнія зьніклыя палітыкі таксама недзе ўсплывуць. Вось што піша пра Віньнікаву Андрэй Клімаў («Плошча Незалежнасьці»): «Яна мне падабалася – прыгожая, разумная, але – сьцерва! Баба, што ні кажы, з мазгамі і абаяньнем. Небясьпечная мешаніна. Загубіла яе тое, што і яна

хацела выкарыстоўваць Аляксандра Рыгоравіча...» Дарэчы, акрамя таго, што дзейны прэзыдэнт краіны любіць коўзацца на лыжах і зьбіраецца кіраваць да канца жыцьця, нічога больш не сказана. Затое пра больш дробных пэрсанажаў Вялікай гульні коратка і безапэляцыйна: «Прыстасаванец!» Гэта Чыкін. Старшыня райвыканкаму Клімавіцкага раёну Канавалаў злоўлены на спробе вывезьці з тэрыторыі флягману лікёра-гарэлачнай вытворчасьці пяць скрыняў гарэлкі… Як гэта разумець у сьвятле славутай дырэктывы № 1? Калі п'е, а ня летам у хакей на лыжах гуляе – дык, можа, ён апазыцыянэр? «Тормаз ува ўсіх сэнсах гэтага слова» – Анатоль Малафееў. І шмат, шмат (54, як мы казалі) іншых. Але дзе ж... Урал Рамдракавіч? Дзе Латыпаў?! А рэдактар «Саўбелкі» Павал Якубовіч! Забыліся (хоць журналістку флягману ўрадавай прэсы Людмілу Масьлюкову намалявалі званковай дамай за тое, што яна пакінула шчыльныя рады змагароў за дэмакратыю і ўцякла ў лягер праціўніка)! А Філарэт! Таксама ўлада! Што за неахайнасьць! І яго няма! Судзьдзя Вера Тупік, якая, дарэчы, асудзіла таго ж Клімава на шэсьць гадоў за фінансавыя махінацыі, ня трапіла ў дамы – ёй дасталася жалудовая дзявятка. І гэта адзіная жанчына, якой не хапіла статусу дамы. А Ніна Чайка дзе? Радыёпраграмы «Размова па сутнасьці» не саступаюць і па сутнасьці вячэрнім разважаньням Шынкара і Зімоўскага, пра якога, дарэчы, напісалі, што ягоныя «тэлепэрлы» каштавалі краіне 2000 даляраў штомесяц. Кампазытар Эдуард Ханок з гармонікам. Ён напісаў песьню «Таварыш прэзыдэнт». А дзе пісьменьнікі, дзе паэты? Ёсьць рэжысэр Азаронак. Але ці ён адзін такі? Якой этыкай, якой сыстэмай каардынат карысталіся складальнікі калоды? Незразумела. Але, зь іншага боку, мэта аўтараў дасягнутая. Сумныя, трэба сказаць, вынікі, спадары гусары. Такіх картаў можна было б намаляваць і сто, і тысячу. У чэхаўскіх чыноўнікаў, прынамсі, была сыстэма – картачную масьць чыноўнікаў аднаго дэпартамэнту немагчыма зблытаць зь іншай. А тут – нават дэмакратычны дэпутат У. Навасяд (бо ўжо не такі дэмакратычны) трапіў у калоду пад знакам 7 чырваў. Усе там будуць. Шкада толькі, што карты гэтыя немагчыма выкарыстаць паводле прызначэньня – кароткія занатоўкі аўтары здагадаліся зьмясьціць на адваротным баку, там, дзе павінна быць аднолькавая для ўсіх кашуля. Увесь сэнс любой

гульні губляецца. Ну які можа быць кінг, якая тысяча, які віст, калі ўсе ведаюць прыкуп? А шкада – уявіце сабе, што можна было б пачуць: «А, ты зь Янчэўскага пайшоў! А мы яго Гайдукевічам! А на табе казырную Ярмошыну!..»

Такім чынам, крытыка палітычнай апазыцыі зрабіла вялікі эвалюцыйны крок ад нападаў на асобу палітычнага лідэра да крытыкі і аналізу цэлай сыстэмы. Чыя віна ў тым, што ў нас так, а не інакш, чаму Беларусь пасоўваецца наперад не такімі хуткімі тэмпамі, як краіны Балтыі?

КАЛОДА АНДРЭЯ КЛІМАВА («ПАЎСТАНЬНЕ 2005»)
У дадатку да невялічкай зьместам і аб'ёмам кніжачкі зьмешчаныя сьпісы «прыхвасьняў Лукашэнкі» і «беларускай эліты». Гульня ў «раздачу слоноў» дужа нагадвала б славуты «Саюз мяча і арала» – аўтар рэвалюцыйнага бэстсэлеру сумленна перапісаў сьпісы «пяцёркі плюс» і сваім знаёмым раздаў крэслы міністраў, а малазнаёмым кандыдатам за тое, што яны добрыя людзі, проста месцы ў палаце прадстаўнікоў. У сьпіс патрапіў і зьняважаны ў згаданай вышэй калодзе Навасяд, і іншыя кандыдаты ад апазыцыі, якія пра аўтара дагэтуль толькі чулі… Акцыю, між тым, можна лічыць удалай: ня толькі заўважылі, але нават зноў пасадзілі. У размовах з шэксьпірамі і казановамі Клімаў відавочна засвоіў, што адзіны бясьпечны спосаб казаць, што думаеш, у краіне, дзе няма свабоды слова – гэта прыкінуцца клінічным блазнам, як прынц Гамлет, дэкан Сўіфт і многія іншыя культурныя героі.

АЛЯКСАНДАР ФЯДУТА, «А. ЛУКАШЭНКА: ПАЛІТЫЧНАЯ БІЯГРАФІЯ»
Сам Фядута прызнаецца, што кніга была напісаная пасьля таго, як яму прыпісалі аўтарства «Нашэсьця», зь якім ён катэгарычна нязгодны. Нядзіўна: кніга, якую напісаў Фядута, павінна рэабілітаваць ня столькі збэшчанага чорнымі піяршчыкамі прэзыдэнта, колькі самога аўтара, каб зьняць падазрэньні ў неляяльнасьці. Калі «Нашэсьце» – твор ананімны, то ў Фядуты, як, зрэшты, і ў Андрэя Клімава, ярка выражанае ўласнае «Я»: Я і Лукашэнка. Ужо на першых старонках аўтар з замілаваньнем

згадвае першую сустрэчу з кандыдатам у прэзыдэнты: «Саша» – прадставіўся кандыдат. «Не, гэта я Саша! А вы – Аляксандар Рыгоравіч, наш будучы прэзыдэнт», – запратэставаў камсамольскі важак. А празь дзьве старонкі апісваецца эпізод з жыцьця дырэктара саўгасу, які па дарозе ў Маскву бегаў па гарбатку для свайго «куратара», а пасьля славутых кансультацыяў з Гарбачовым («Правільна я гавару, Міхаіл Сяргеевіч?» «Так, так», – ківаў Гарбачоў») адчуў цудадзейную сілу ўлады і сам пачаў карыстацца паслугамі падхалімаў і шасьцёрак, якім нядаўна быў і аўтар яго «палітычнай біяграфіі», «кішэнны апазыцыянэр», як той пэрсанаж зь фільму «Случай з пацаном», якому сіплы барытон загадаў перад выбарамі «бацьку крыцікаваць».

«СЛУЧАЙ З ПАЦАНОМ»

«Случай з пацаном» быў зьняты з нагоды прэзыдэнцкіх выбараў 2001 году. Паводле сцэнара павінна было здарыцца менавіта тое, што здарылася. За гэта многія змагары за дэмакратычныя ідэалы папракалі стваральнікаў фільму ў дэкадэнцтве, пэсымізьме і нават у нейкім вычварна зразуметым калябарацыянізьме. Тым ня менш фільм атрымаў высокія ацэнкі крытыкаў, якія хвалілі яго за страчаны за апошнія дзесяць гадоў патас, волю да супраціву і палітычнага дзеяньня. «Рок на барыкадах» 1991 году выклікае настальгію толькі ў страчанага пакаленьня 1980-х. Моладзь XXI стагодзьдзя, якая пабачыла ўзьлёт і заняпад Аранжавай рэвалюцыі, ставіцца да яго зь вялікай доляй скептыцызму. Тым ня менш у незрэалізаванасьці нашых памкненьняў прысутнічае нейкая «пакуль-яшчэ-непрададзенасьць», і пакуль Беларусь яшчэ не зрабіла свой крок да «свабоды», свабода парадаксальным чынам яшчэ жыве ў якасьці ідэалу. Песьні «Ляпіса», «Нэўра Дзюбэля», «N.R.M.», «Deviation» пакуль яшчэ знаходзяцца ў полі забароненага, а таму і цікавыя і жывыя.

СМІ, ІНТЭРНЭТ, СМС…

Час, безумоўна, зрабіў свае карэктывы ў галіне – у павуціньні Інтэрнэту можна знайсьці тое, што і ня сьнілася шэксьпіраўскім мудрацам. Пра існаваньне анімацыйных флэшак, дзе галоўным героем выступае дзейны прэзыдэнт краіны, многія грамадзяне

Беларусі даведаліся са старонак дзяржаўнай газэты, дзе пісалася пра тое, як зачынілі крамольныя сайты. А ёсьць яшчэ безьліч рэсурсаў, дзе можна знайсьці самыя разнастайныя матэрыялы на зададзеную тэму ад вышэйзгаданых літаратурных твораў (на поўнае асьвятленьне якіх сёньня ня можа прэтэндаваць ніводны сумленны дасьледчык) да анэкдотаў, карыкатураў і г. д. Карцінку з Лукашэнкам-тэрмінатарам можна згрузіць для свайго мабільнага тэлефона, таксама як і прамоўленыя знаёмым сіплым голасам словы «ідзіот самы настаяшчы». Але, відавочна, усе гэтыя элемэнты маскульту бяскрыўдныя і малаэфэктыўныя, як асьліныя вушы ў спробе засланіць сонечнае сьвятло.

…AUDIVIT ALTERA PARS…

Улада не сьпяшаецца на кожную культурную атаку апазыцыянэраў адказваць на тым самым культурным полі – выпрабаваныя паліцэйскія сродкі ўціску і прыгнёту замяняюць артэфакты буйных жанраў – кіно, літаратуры і тэатру. Газэты і тэлебачаньне, аднак, знаходзячыся ў руках ураду, паводзяць сябе, як тое анэкдатычнае армянскае радыё, якое на пытаньне амэрыканскага «Колькі зарабляе савецкі інжынэр?» адказала: «А ў вас нэграў лінчуюць». Зусім нядаўна (13 верасьня 2005 году) у праграме «Правы чалавека» вялікі сябра таго самага Чалавека, чые правы бароніць, Яўген Новікаў супрацьпаставіў «прафэсійных удоў апазыцыянэраў» страшылкам зь лёнданскага дна, дзе адэпты людажэрскіх сэктаў сотнямі крадуць чарнаскурых хлопчыкаў для драпежных рытуалаў (што само па сабе зьяўляецца знакавым – ці не жадае параўнаць тэлевядучы Лукашэнку з Бакасам раённага маштабу?). Не адрозьніваецца ад банальных наездаў вузкалобых камэнтатараў «Міжнароднай панарамы» часоў халоднай вайны нядаўняе надта недыпляматычнае выступленьне прэзыдэнта ў ААН. Антыглябалісты, аднак, могуць у ладкі папляскаць: у адрозьненьне ад зласьлівага НТВ, на дзяржаўным расейскім канале РТР Лукашэнка выказаў тое, што кожны з прысутных употайкі марыў пачуць ад іншых. Выступленьне беларускага лідэра было нават аздоблена рэдзенькімі аплядысмэнтамі, якія, зразумела, не ідуць ні ў якое параўнаньне з авацыямі, якія зрываў «вэрмонцкі пустэльнік» Салжаніцын (а ён выступаў

амаль з тымі ж прэтэнзіямі да ЗША), альбо парыскі прафэсар Жан Бадрыяр, які штогод чытае амэрыканцам лекцыі пра тое, якія яны дрэнныя. Як казалі старажытныя, quod licet Jovi…

А кажуць яшчэ, што наша прапаганда кіруецца прынцыпам Гёбэльса «чым пачварнейшая хлусьня, тым ахвотней у яе вераць». Няпраўда, яна навучылася хлусіць больш сьціпла. Гёбэльса, аднак, можна згадаць зь іншай нагоды – 29 сакавіка на РТР ішоў фільм «Кукрыніксы супраць Гёбэльса». На пачатку былі кадры з прапагандысцкіх фільмаў Трэцяга Райху пра «вялікага сябра расейскага народу Адольфа Гітлера» і пра тое, як «нямецкі салдат абяцае ўкраінскім сялянам, што, вызваленыя з-пад прыгнёту жыдоўскіх камісараў, яны зажывуць, як нямецкія баўэры». Пасьля «Гёбэльса» быў сюрпрыз – праграма «Экспэрт», незаяўленая ў праграме. «Экспэрт» – гэта прапагандысцкі ролік беларускага тэлебачаньня, які нашыя байцы ідэалягічнага фронту падсоўваюць замест сумнеўнай якасьці прадукцыі расейскіх калегаў. У «Экспэрце» чыталі «Советскую Россию», пра тое, як нам тут на РБ жыць добра. Кожнае паасобку інфармацыйнае пасланьне ня выклікала б столькі радасьці, душэўнага ўздыму і пачуцьця гонару (вось толькі пытаньне – за каго?), чым спалучаныя разам фільмы пра добрага Гітлера і з цытатамі з «Саўрасіі». Правакацыя гэта ці, можа, дурасьць? Няважна. Кемлівы аналітык заўсёды патрапіць скласьці цэльную карціну з мазаічна-псыхапатычнага пано.

ЛЁС РЭЗЫДЭНТА

Найважнейшым з мастацтваў, вядома ж, зьяўляецца кіно, таму ў актыве ідэалягічных апанэнтаў разрозьненай апазыцыі кіно «пра апазыцыю» перажыло істотныя перамены: калі ў «Дзецях ілжы» рэжысэра Азаронка партрэт дэмакрата Статкевіча паказаны побач з кадрамі пра паліцаяў, а ў «Шляху ў нікуды» міксуюцца кадры зь фільму «Супрацьстаяньне» пра здрадніка Кротава, то ў новым шэдэўры беларускіх кінэматаграфістаў «Памылка рэзыдэнта» ўжо яўныя алюзіі на часы пасьляваенныя – пэрыяд халоднай вайны, а значыць, мірнага часу. І апазыцыянэраў не параўноўваюць з прыхвасьнямі-паліцаямі, а абзываюць «служкамі дзярждэпартамэнту ЗША». А гэта ўжо нешта, вам скажу. Тут ёсьць некалькі момантаў. Па-першае,

дыктары сказалі, што ў нас няма глебы для існаваньня апазыцыі. Бо «ўзровень жыцьця расьце», зарплата, пэнсія, стыпэндыі асьпіранцкія і студэнцкія… і г. д. І тут паказваюць «карцінку» – печыва на апазыцыйных сэмінарах, мілыя сэрцу любога апазыцыянэра «хэрбатнічкі». Відавочна, аўтары фільму вучыліся ў Эйзэнштэйна, аўтара славутых кадраў з «Браняносца Пацёмкіна», дзе гнілое мяса ядуць злыя чарвякі, а сярдзітыя матросы круцяць галовы сытым «благародзіям». Кадры пра апазыцыйны сэмінар павінны таксама закружыць галаву галодным і раздражнёным гледачам. Але дазвольце, з тым узроўнем жыцьця, які нам абяцаюць відэаказачнікі, кожны беларус можа сам сабе купіць пернік і не ўладкоўвацца ў сумнеўны дэпартамэнт ЗША… А зь іншага боку, хай нашы апазыцыянэры дояць амэрыканскую карову, ня нашу ж родную рагулю ім даіць! Хай абажруць капіталістаў – нам жа патрэбная апазыцыя, як прэзыдэнту патрэбны праціўнік, каб гуляць у хакей. Не ў сваю ж браму яму кідаць шайбу! Ня бегаць жа яму ўвесь час на лыжах, трэба ж, каб было цікава нашаму прэзыдэнту, каб нехта варушыўся пад ім… але канструктыўна! А ня так, як некаторыя… Адным словам, паціху кіно пра апазыцыю эвалюцыянуе да «Чырвонай сьпякоты»: прыяжджае, скажам, Шварц зь Нью-Ёрку ў Менск, каб з нашымі кадэбістамі разам апазыцыянэраў мачыць, а яны яму кажуць: мы на заданьні, мы працуем апазыцыянэрамі, каб у прэзыдэнта міжнародны прэстыж падтрымаць…

АГЕНТ 007 НА СЛУЖБЕ ЯГАМОСЬЦЯ ПРЭЗЫДЭНТА

…но развитие республики шло
медленнее,
чем планировал Батька…

Дзьмітры Чаркасаў, «Беларускі набат»

Расейскі палітычны дэтэктыў ня мог абмінуць Беларусь: сфэру стратэгічных эканамічных і ідэалягічных інтарэсаў, імпэрскай настальгіі і каляніяльнага гонару вялікаросаў. Шматмільённая армія чытачоў «Саўраскі» зь ліку падманутых укладчыкаў гатовая верыць, падобна героям горкаўскага бамжатніку, што ёсьць яшчэ на зямлі месца, незакранутае буржуйскімі

рэформамі, дзе можна вярнуцца ў савецкае дзяцінства і зьесьці піражок за пяць капеек, а кіруе краінай мудры і кемлівы гаспадар ад сахі і ад касы. Казка для дарослых! Безумоўна, зьдзейсьніць сваіх грандыёзных плянаў ён ня можа, бо знаходзіцца ў варожым атачэньні, ён можа адно толькі перашкодзіць людажэрскім і драпежніцкім плянам супастатаў. Знаёмая паранаідальная лёгіка сталінізму павінна была знайсьці сваё ўвасабленьне ў літаратуры жанру шпіёнскага раману, дзе ідэалягічна вытрыманы Супэрмэн з інтэлектуальнай сілай Штырліца, ліцэнзіяй на забойства Бонда і шармам паручніка Ржэўскага разблытвае такі гадзючы клубок, як «беларускае пытаньне». У Расеі пісаньне дэтэктываў даўно ўжо пастаўлена на канвэер. У аўтара, які падпісвае свае творы як Аляксандар Бушкоў, Беларусі прысьвечаны другі раман з пэнталёгіі «На тое і ваўкі». «Дзьмітры Чаркасаў», «аўтар» двух дзясяткаў кніг самага рознага жанру, ад камэнтароў да Крымінальна-працэсуальнага кодэксу РСФСР да раманаў-баевікоў і перакладаў японскай самурайскай лірыкі, на беларускую тэму стварыў цэлы сэрыял: некалькі выпускаў пад назвай «Апошні салдат прэзыдэнта» і найбольш цікавы «Беларускі набат». Калі Бушкоў яшчэ трымаецца ў рамках жанру савецкай літаратуры са сваімі эстэтычнымі і этычнымі табу і абмежаваньнямі, то брэнд «Чаркасаў» дэманструе абсалютную адсутнасьць тармазоў, творачы гібрыд баявікоў Джэймза Бонда і дэмбэльскага альбому.

Сюжэт просты: у Беларусь зьніадкуль з шэфскай дапамогай прыяжджае супэрчалавек, шукальнік прыгодаў і карны меч правасудзьдзя, каб перашкодзіць ворагам зьдзейсьніць замах на супэрпрэзыдэнта. У Бушкова снайпэра дастаткова проста абясшкодзяць, Чаркасаў прапануе інтрыгу крыху больш складаную. Розьніца, аднак, палягае на іншым: паранаідальнасьць «Набату» можа даць адказ на некаторыя пытаньні, датычныя фэномэну ўлады.

Супэргерой дзейнічае ў абсалютнай адзіноце сярод варожага атачэньня.

Куда ж я влез? – огорчился Рокотов. – Какое-то осиное гнездо. Каждый норовит сделать Луке какую-нибудь пакость. То

ракеты, то дерьмом в газетах обливают, то травануть собираются… Да-а, повезло ему с республикой, ничего не скажешь…

Нават памочнікі прэзыдэнта выконваюць ролю адмоўных пэрсанажаў – дробных паскуднікаў, чый бруд стварае станоўчы кантраст, каб адцяніць бездакорную бель мундура гаспадара краіны.

Глава Администрации… Миша Требухович был и оставался подонком. …С аппаратом, мягко говоря, Батьке не повезло. Подлец Требухович, педрила-комсомольчик Жучок, засевший на должности пресс-секретаря, замглавы Администрации Пушкевич, баптист и скрытый педофил, премьер Снегирь, распихавший на хлебные должности в министерствах своих родственников и знакомых. И сотни таких же чиновников помельче. В этом болоте вязли любые распоряжения Первого Лица. Лишь благодаря крутому нраву Президента и его бешеной работоспособности ситуация не выходила из-под контроля.

Калі гэта адміністрацыя прэзыдэнта, то што можна сказаць пра ягоных ворагаў? Кніжка можа зацікавіць клінічных псыхапатолягаў. Калі б ня пэўныя брудныя інсынуацыі, зробленыя для кампрамэтацыі палітычных апанэнтаў рэжыму, якія злачынна ня дбаюць пра свой імідж і ўвогуле занядбалі ўсе правілы піяру, апошнія маглі б нават выказаць удзячнасьць аўтару, які згадаў іх імя ў жоўтай бульварнай макулятуры:

Очкарик сделал шаг вперед и гордо заявил:

– Я – Вячорка! И я требую…

– Да хоть ночнушка! – отмахнулся невежливый биолог, который совершенно не разбирался в запутанной иерархии оппозиционного движения, да и недосуг ему было вести пустые разговоры. – Дайте пройти, и я вас не трону.

Замах ня ўдаўся. Пляны ворагаў правaліліся. У фінале сустракаюцца прэзыдэнт і Ягоны салдат – і зьліваюцца ў экстазе.

Взгляд Батьки зацепился за маленькую, выбивающуюся из общей картины фигурку. Человек неподвижно стоял на углу дальнего переулочка и спокойно созерцал поле брани. Лицо с такого расстояния было не разобрать, но Президент вдруг каким-то шестым чувством ощутил, что этот человек имеет самое прямое отношение к произошедшему.

Глава Государства приоткрыл рот, хотел что-то сказать, но передумал. Неизвестный не был врагом. Скорее наоборот – солдатом, которому не нужны награды и который по каким-то собственным соображениям старается держаться в тени.

Салдат і прэзыдэнт – два ў адным, сымбаль і істота мадэрновай міталягемы «татальнай мабілізацыі» (паводле Э. Юнгера). Ваяўнічаму прэзыдэнту, аточанаму з усіх бакоў ворагамі (у «Беларускім набаце» нават Расея забруджана глябальнай карупцыяй капіталізму), як найлепш адпавядае вобраз рэйнджара бяз страху і папроку, вобраз, даўно ўжо выкарыстаны і перапарадыраваны галівудзкай фабрыкай мрояў, прадуктам злоўжываньня якой сталі рэальныя прэзыдэнты, якія паводзяць сябе ў рэальным сьвеце, як падпітыя каўбоі, толькі з ракетамі замест рэвальвэраў.

«ЛУКАШЫЗМЫ» VS «БУШЫЗМЫ»: ЧЫЙ ПРЭЗЫДЭНТ ДУРНЕЙШЫ?

Прэзыдэнцтва Аляксандра Лукашэнкі пачалося ў эпоху вялікіх скандалаў у Белым доме і буйных узрушэньняў у Амэрыцы – і тое, і другое цягнецца да нашых дзён. Скандалы з Монікай Левінскі і вайна ў затоцы перакрываюць маштабамі нараканьні пакаёўкі з гасьцініцы «Кастрычніцкая», а здарэньне «9.11» нават адцягнула ўвагу ўсяго сьвету ад махінацыяў на прэзыдэнцкіх выбарах 2001 году. Фільм Майка Мура «911 паводле Фарэнгейта» паказваюць па тэлевізіі, бліскучы мульцік зь

лялькамі Трэя Паркера «Каманда Амэрыка» вольна прадаецца ў шапіках, а «Случай з пацаном» і «Выпадковы прэзыдэнт» застаюцца галасамі тых, хто гукае ў пустэльні. Буша-юніёра неаднаразова адкрыта абвінавачвалі ў дэбілізьме, а «дапаможнік падарожнікаў па Англіі», дзе прэзыдэнт супэрдзяржавы выстаўлены поўным ідыётам, перадрукоўваўся ў жоўтых газэтах ува ўсім сьвеце. Містычная «амбуляторная карта мазаічнага псыхапата», пра якую ўпотайкі чытаюць зласьлівыя апазыцыянэры, не выглядае ўжо так пераканаўча.

Аднак тое, што ў адным выпадку выглядае як сьведчаньне маральнай няўстойлівасьці палітычнага лідэра, у другім – дэманструе высокі ўзровень свабоды слова і дэмакратычных каштоўнасьцяў, пра якія ў нашых краёх зноў увайшло ў моду пісаць у двукосьсі. І ня толькі ў нашых – заходнія інтэлектуалы абмяркоўваюць пытаньне «ці вартая дэмакратыя таго, каб яе бараніць» (Крыстофэр Лэш), а псыхааналітыкі амаль легітымізавалі «фалічнага прэзыдэнта» (Лёйд Дэмоз) як праекцыю масавай падсьвядомасьці на «ідэалёгію як аб'ект жаданьня» (Славой Жыжак). У «цудоўным новым сьвеце», які як ніколі нагадвае Рымскую імпэрыю пары заняпаду (Жан Бадрыяр), ужываньне кампрамату на калігулу ці якога барбарскага князька апісваецца ў разьдзеле сьвецкай хронікі.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]

[image]2005

ад Літаратуры

ўдалітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

ЮРАСЬ ПАЦЮПА

Юрась Пацюпа Элегіі

паэт, мовазнаўца. Сталы аўтар «ARCHE».

---

* * *

Дзікія хмары рыкаюць з голаду,
шукаюць пашы ў палёх разьежджаных,
месяць нагамі гліну з травой,
што ўся прагоркла і пачарнела.

Няма дзе воку ў імглістай далечы
спачыць, лагоды досыць напіўшыся.
Душа зайшлася ад болю ўшчэрць,
бо не знайшла ўжо гнязда у сэрцы.

Пайду за хмарай з жабрацкай торбаю,
мо’ дзе спаткаю, цябе, каханую,
за сінім лесам, дзе сьпіць мой дом
з патэльняй звонкай, гаркавым дымам.

Спрытна і лёгка засланкай бразгаеш,
бліноў духмяных складаеш горачку
і верашчаку на стол нясеш,
сьцеліш абрусы, пацёркі мовіш.

Злыя барэі, чакай, мо’ сьцішацца,
нашто ім марна енчыць за сьценамі,
калі каханьня агонь гарыць
і асьвятляе мае пэнаты.

9.01.2005 г.

* * *

Ціха лісты мігцяць золатам пад вадой,
быццам бы зоры там дом нарэшце знайшлі.
Толькі дому нідзе я не знаходжу сам,
гнаны ветрам, нібы восенныя лісты.

Моўчкі прыйдуць зубры з рук маіх зьлізваць соль
сьлёз нявыплаканых – мора наскай бяды.
Струнамі дрэў вятры правяць хаўтурны сьпеў
пад акампанэмэнт жудаснае дуды.

Спрэс нявіднае зло вылілася ў прасьцяг,
сочаць тут кожны крок сьлюзлым вокам смаўжы,
а па зямлі наўсьцяж радасна цівуны,
поўнячы дзікі бзік, дрэвы сякуць, сякуць...

Тут можна добра ўрваць... Бізнэс? Гандлюй душой!
Краю мой, гэта твой сымбаль апошніх дзён.
Моды апошні крык... Жалю астатні енк...
Гэй, Эўропа, сьпяшай – ёсьцека што звучыць!

...Жадныя дні сьвятла. Лямпы падкруцім кнот –
кожны запаліць свой, дзедаў ’шчэ, каганец,
сядзем урэшце ўсе за свой калядны стол
так, як было даўней, так, як і будзе век.

9.01.2005 г.

ЯК ПЕРАДАВАЦЬ АНТЫЧНЫЯ ЛЯГАЭДЫ?

1. У беларускай паэзіі традыцыя імітацыі антычных лягаэдаў

параўнальна невялікая. Да гэтае пары мы ня маем арыгінальных узораў страфы Алькея, Алькмана. Праўда, страфу Сапфо імітаваў яшчэ Сімяон Полацкі, яе можна спаткаць у Ўладзімера Дубоўкі, Андрэя Хадановіча, а ўзоры вершу Асклепіяда — у Максіма Багдановіча і, зноў жа, у Хадановіча. Усе пералічаныя аўтары, апрача Сімяона Полацкага, у той ці іншай меры абапіраліся на расейскую традыцыю і яе багаты досьвед трансфармацыі антычнасьці. Аднак прынятыя ў расейскай літаратуры спосабы моцна прасякнутыя літаралізмам. Я б сказаў, такія вершы *не для слыху*, і нават — *не для вока*.

У рытмалягічным трактаце «Страла Зэнона» я выказаўся рэзка адмоўна наконт плённасьці лягаэдаў, асабліва ступовых, маўляў, гэта штучная і нікому не патрэбная празаізацыя вершаў. Асноўны аргумэнт супраць лягаэдаў такі:

Парушэньні рытмавага працэсу ў абсягах рытмэмы нельга кампэнсаваць рэгулярным паўтарэньнем гэтага парушэньня.

Рэзкія зьмены рытмавых чаканьняў прыводзяць да празаізацыі вершаў. Ці, у лепшым разе, лягаэды вымагаюць такой напружанай рэцытацыі, якая разбурае цэласнасьць эстэтычнага ўспрыняцьця. Аднак сылябічныя памеры, асабліва няцотныя, адзінаццаціскладовік, трынаццаціскладовік, якраз становяць нешта сярэдняе паміж лягаэдам і дольнікам. Яны задаюць нязмушаную пульсацыю рытму, дзе дактыль абяртаецца ямбам, пэон першы — амфібрахам, а манатонія нібы ўвесь час адкладваецца «на потым».

Думаю, што ў будучыні сылябіка дазволіць рабіць перайманьні з антычнага больш вольныя, гнуткія, якія будуць сьледаваць духу, а ня літары першаўзораў. Вышэй я прапанаваў дзьве элегіі, у першай зь іх імітуецца страфа Алькея, а ў другой — памер Асклепіяда. Аднак, перш чым прасачыць лёгіку трансфармацыі, пункцірна пакажам, выходзячы з пэўных пастулятаў, традыцыі беларускага страфаваньня.

Пастуляты: Рытм вершу вынікае з раўнамернага чаргаваньня націсьненых ды ненацісьненых складоў і вымяраецца мэтрам. Від мэтру задае інварыянт рытму, адхіленьні ад мэтру даюць

варыянты рытму. Націсненыя склады, якія задаюць рытм, называюцца іктамі. Ікты, якія адпавядаюць інварыянту (ці расьпеву), складаюць кантрольны шэраг. Адхіленьне іктаў ад кантрольнага шэрагу стварае пульсацыю рытму. Інварыянтавы парадак іктаў у радку ці паўрадку становіць рытмэму. Рытмэмы разьдзяляюцца цэзурамі і міжрадковымі паўзамі. Радок зь некалькіх рытмэмаў становіць супрарытмэму. Спалучэньне рытмэмаў паводле законаў сымэтрыі ўтварае страфэму. Страфэма становіць сабою інварыянт страфы. (Вершавы абзац, які яднаецца вылучна адною сэмантыкай, а ня рытмавай сымэтрыяй, называецца страфоідам.)

Эксплікацыя: Кожная літара абазначае склад. Малая літара (о) — ненацісьнены склад, вялікая літара (О) — слаба націсьнены ікт, вялікая тоўстая літара (**О**) — моцна націсьнены апорны ікт. Парадкавыя тоўстыя літары абазначаюць ікты з рымамі (**А**; **Б**; **В**). Месца пульсацыі іктаў перадаецца курсівам (***ОО***). Дзьве касыя рысачкі (//) абазначаюць цэзуру, адна касая рысачка (/) — слабую або імаверную цэзуру, роўная рысачка (|) разьдзяляе ступы (толькі ў антычных вершах). Роўны шэраг літараў перадае інварыянты: рытмэму (Оо**О**о) або супрарытмэму (Оо**О**о//Оо**О**о).

2. Уяўленьні аб прыродзе страфы да гэтае пары досыць цьмяныя і супярэчлівыя. Пашыраная думка, маўляў, асноўным будаўнічым матэрыялам строфаў служаць рымы (Гаспараў), дзей радкі ў страфе яднае супольная думка (Квяткоўскі), і вельмі рэдка ўспамінаецца пра тое, што «асноўнае ў страфе — гэта рытмічная цэласнасьць» (Рагойша). Насамрэч сэмантычная завершанасьць страфы — зьява спадарожная, страфа вершу адпавядае абзацу прозы не нашмат больш, чым радок адпавядае сказу. Гістарычна страфа разьвівалася разам з рытмам. Тым часам рымы толькі адцянялі рытмавыя хады. Расейская паэзія пераняла строфы з эўрапейскіх літаратур ужо ў завершаным выглядзе і таму не дае матэрыялу для паўнавартае карціны. Сыляба-танічная страфа бляклая і нецікавая. Запраўдны росквіт страфаваньня можна назіраць у сылябіцы.

Найстарэйшы беларускі памер — чатырнаццаціскладовік. Яго

мы спаткаем яшчэ ў Францішка Скарыны, калі слушна запішам ведамыя хрэстаматыйныя радкі:

Богу ў тр**о**йцы ядын*а*му // ка чц**і** і ка сл**а**ве,

М**а**цер*ы* яго прач**ы**стай // М*а*р**ы**і к пахв**а**ле...

Ён складаецца з васьмі- і шасьціскладовых паўрадкоў. У выніку дыхатаміі чатырнаццаціскладовы двуверш разьвіўся ў чатырохрадкоўе каламыйкавага вершу, які, сваім парадкам, перажываў разнастайныя мадыфікацыі. Асноўны мэханізм разьвіцьця строфаў — гэта дзяленьне і складваньне рытмэмаў, а дадатковыя — вар'яваньне кляўзулаў і гульня рымаў. Асабліва багатая на строфы літаратура барока. Усяго некалькі вершаў Дамініка Рудніцкага, цудам захаваных, даюць матэрыялу часамі больш, чым цэлыя літаратурныя эпохі. Ніжэй разгледзім арыгінальныя страфэмы Дамініка Рудніцкага, Яна Баршчэўскага ды Каруся Каганца, узьніклыя на базе чатырнаццаціскладовіка.

Таксама разгледзім некалькі страфэмаў, утвораных на базе г. зв. «кальцоўскага» вершу. Лічыцца, быццам гэты верш заўжды белы, але гэта ня так. Асноўная ж адметнасьць «кальцоўскага» вершу ў тым, што яго канстанта прыпадае не на канец, а на сярэдзіну радка. Сам жа верш можа прачытвацца як анапэст і харэй. Задоўга да Кальцова яго тарнаваў расейскі паэт Мікалай Львоў. Беларускі паэт Адам Гурыновіч зарымаваў «кальцоўскі» верш і ўвёў такое чаргаваньне канчароў, што дало *нутраны альтэрнанс*. Адам Бабарэка прылучыў да агульнае схемы два радкі чыстага анапэсту, утварыўшы тым самым унікальную страфу-лягаэд, дзе не парушаецца расьпеў.

Страфэма чатырнаццаціскладовага двувершу:

Оо**О**о/Оо**О**о//**О**оОо**О**о

Оо**О**о/Оо**О**о//**О**оОо**О**о

Страфэма каламыйкавага чатырохрадкоўя:

Оо/**О**о//Оо/**О**о

ОоО**о**О**о**

О**о**/**О**о//О**о**/**О**о

ОоО**о**О**о**

Мадыфікацыя страфэмы каламыйкавага чатырохрадкоўя:

О**о**О//О**о**О

ОоО**о**О**о**

О**о**О//О**о**О

ОоО**о**О**о**

Страфэма Каганца:

О**о**А//О**о**А

ОоО**о**Б**о**

О**о**В//О**о**В

ОоО**о**Б**о**

Страфэма Гурыновіча:

О**о**А**о**о

О**о**Б**о**о

О**о**А**о**о

О**о**Б**о**о

Страфэма Бабарэкі:

О**о**А**о**о

О**о**Б**о**о

О**о**А**о**о

ООБоо

ооООооВ

ооООооВ

Страфэма Рудніцкага першая:

ООАо/ООАо//ООоООБо

ООВо/ООВо//ООоООБо

ООООоООО//ООоООГо

ООООоООО//ООоООГо

Страфэма Рудніцкага другая (варыянт А):

ООООоООО//ООоООАо

ООООоООО//ООоООАо

ООООоООБ//ООООоООБ

ООоООВо//ООоООВо

Страфэма Рудніцкага другая (варыянт В):

ООООоООО//ООоООАо

ООООоООО//ООоООАо

ООООоООБ

ООООоООБ

ООоООВо

ООоООВо

Страфэма Баршчэўскага:

ООООоООоо//ООоООА

Оо**О**оОо**О**оо//**О**оОо**А**

Оо**О**оОо**Б**

Оо**О**оОо**Б**

ОоОо**О**о

Правілы канструяваньня строфаў:

1. У абсягах рытмэмы нельга парушаць *расьпеву*.

2. У страфе можна вар'яваць ня больш як дзьве рытмэмы.

3. Пры вар'яваньні рытмэмаў не дапушчаецца *альтэрнанс*.

4. Пры вар'яваньні рытмэмаў нельга зьмяняць *канчара цэзуры*.

3. Сыляба-танічныя лягаэды розьняцца ад сваіх прататыпаў тым, што наагул не ствараюць паэтычнага рытму. Гэта, як у дзіцячай гульні, чарапок умоўна называецца талеркаю, камячок гліны — піражком, трэска — лыжкаю, крывы сучок — тэлефоннай трубкаю. Хоць насамрэч усе ведаюць, што чарапок застаецца чарапком, гліна — глінаю, трэска — трэскаю, а сучок — сучком. Каб імітаваць лягаэды, як ні дзіўна, трэба адмовіцца ад іх самых і замяніць іх адэкватнымі тутэйшымі памерамі з мадыфікацыямі. Такую замену некалі зрабілі сылябісты, абярнуўшы страфу Сапфо сылябічным адзінаццаціскладовікам з абсечанаю ў канцы рытмэмаю. Балазе, інварыянт першага паўрадка супаў з апошнім кароткім радком Сапфо. Вось адзін з такіх узораў, які належыць нейкаму *Н.* і быў надрукаваны ў заходнебеларускім часопісе «Да злучэньня»:

Сьвяты Ігн**а**цы, // **О**йча даражэнькі,

*А*дважны р**ы**цар // пр*ы* войску Хрыст**о**вым,

М**ы** твае дз**е**ці, // сл*а*быя, мал**е**нькі —

П*а*д сьцягам н**о**вым!

Страфа Сапфо (антычны варыянт):

Oo**OOO**||o**O**o**O**O

Oo**OOO**||o**O**o**O**O

Oo**OOO**||o**O**o**O**O

Oo**O**O

Страфэма Сапфо (у сылябіцы):

Oo**O**o//**O**o**O**o**O**o

Oo**O**o//**O**o**O**o**O**o

Oo**O**o//**O**o**O**o**O**o

Oo**O**o

Страфа Сапфо (сылябічны варыянт):

O*O*o**O**o//***O****OO*o**O**o

O*O*o**O**o//***O****OO*o**O**o

O*O*o**O**o//***O****OO*o**O**o

O*O*o**O**o

Такую самую апэрацыю можна зрабіць з страфою Алькея. Амаль усе радкі страфы маюць дзесяць і больш складоў (першы і другі — 11, трэці — 9 і чацьверты — 10), значыць — верш мусіць мець цэзуру. Праз увесь верш яе трэба правесьці так, каб не парушыць адзінства рытмавага працэсу. Балазе, першыя два радкі антычнага варыянту цэзуру маюць. Далей трэба трапна скасаваць лішнія ікты. Пры скасаваньні лішніх іктаў варта помніць, што два ікты, хочам мы таго ці ня хочам, усё роўна ня могуць стаяць упрытык — адзін зь іх будзе замінаць другому. У выніку трансфармацыі Алькеева страфа набывае выгляд белага сылябічнага дзесяціскладовіка з рознымі кляўзуламі: сьлізкаю (1; 2); тупою (3) і простаю (4). Ад расейскіх імітацыяў яна розьніцца перш-наперш трэцім радком, які не парушае

расьпеву, а таксама нязмушанаю пульсацыяй іктаў.

Страфа

Алькея (антычны варыянт):

O**O**|o**O**O||**O**oo|**O**oO

O**O**|o**O**O||**O**oo|**O**oO

O**O**|o**O**|O**O**|o**O**|O

Ooo|**O**oo|**O**o|**O**O

Трансфармацыя страфы Алькея (прамежкавы варыянт):

O**O**o**O**O//**O**oo**O**oO

O**O**o**O**O//**O**oo**O**oO

O**O**o**O**O//**O**o**O**O

Ooo**O**o//o**O**o**O**O

Страфэма Алькея (у сылябіцы):

Ooo**O**o//**O**oo**O**oo

Ooo**O**o//**O**oo**O**oo

Ooo**O**o//**O**oo**O**

Ooo**O**o//**O**oo**O**o

Страфа Алькея (сылябічны варыянт):

O*O*o**O**o//***O****O*o**O**oo

O*O*o**O**o//***O****O*o**O**oo

O*O*o**O**o//***O****O*o**O**

O*O*o**O**o//***O****O*o**O**o

Верш Асклепіяда ў нашай мове сам сабою, незалежна ад нашага жаданьня, утварае дзьве рытмэмы пэнтону, разьдзеленыя цэзураю. Сярэдні націск у паўрадку можа быць, а можа й ня быць, бо не становіць сабою ікту. Калі ж ён ёсьць, дык для рытму малаістотна, куды ён бліжэй зьмяшчаецца, управа ці ўлева. Дарэчы, паэты, відаць, адчуваюць гэта інтуіцыйна, бо, як прызнаўся мне ў вуснай гутарцы Андрэй Хадановіч, ён, пішучы Асклепіядавым вершам, менш за ўсё зважаў на сярэдні націск. Затое вельмі важныя першы і апошні націскі ў кожным паўрадку, яны зьяўляюць ікты пэнтону. А зь іх найважнейшы — апошні, які, як ведама, становіць сабою канстанту.

Вэрс Асклепіяда (антычны варыянт):

Оо|**О**оо|**О**||**О**оо|**О**о|**О**

Супрарытмэма Асклепіяда (у сылябіцы):

Ооооо**О**//**О**оооо**О**

Вэрс Асклепіяда (сылябічны варыянт):

Оо*ОО*о**О**//**О**о*ОО*о**О**

У выніку ў мяне выйшла пяць рэалізацыяў рытмэмы: 1) *в**о**сенныя лісты*; 2) *м**о**ўчкі пр**ы**йдуць зубр**ы***; 3) *ц**і**ха лісты мігц**я**ць*; 4) *пад акампанэмэнт*; 5) *сьлёз нявыплаканых*. Калі першая зь іх ісьніць сылябічны інварыянт, другая і трэцяя сьледуюць антычнаму канону і не супярэчаць сылябічнаму, чацьвертая парушае антычны канон, але не супярэчыць сылябіцы і сыляба-тоніцы, дык пятая для мяне самога сталася нечаканасьцю. Канстанта ў пятай рытмэме захоўваецца за кошт рытмавае інэрцыі і дыясталы, якая тут узьнікае. Падобныя варыянты цікава разнастаяць верш, але зь імі трэба быць асабліва пільным, каб не разбурыць рытмавага цэлага.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/25
[image]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к

№ 6 (40) - 2005

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]

[image]2005

аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Наша літаратура ўсё яшчэ застаецца сфэраю апалягетыкі. Гутарка зь пісьменьнікам Францам Сіўком.

ФРАНЦ СІЎКО (нар. у 1953 г. у вёсцы Вята на Мёршчыне) – празаік, публіцыст. У 2003 г. у Віцебску выйшла яго кніга прыпавесьцяў «Ягня ахвярнае». Піша таксама казкі для дзяцей.

– Наколькі для Вас вашая малая радзіма, Мёршчына, паэтызаваная і міталягізаваная? Пытаюся так, бо часам чую ад знаёмых, пасьля вяртаньня з чарговай паездкі па мясьцінах дзяцінства, розныя непрыгожыя гісторыі. Для іх цяперашняе сацыяльнае дамінуе над уласным мітам малой радзімы.

– Паэтызаваная – у той ступені, у якой можа быць паэтызаваным усё, што датычыць блізкіх нам і дарагіх рэчаў. І, канечне, ня толькі празь непасрэдна паэзію ці нейкія народныя сьпевы або показкі (хоць і гэты элемэнт, вядома, прысутнічае). Але, як і ў кожнага з нас, найперш праз асаблівасьці майго асабістага ўспрыманьня малой радзімы. Праз усьвядомленае, а дзесьці і падсьвядомае адчуваньне таго рэгіёну як цэнтру свайго духоўнага сусьвету. Для мяне маё Міжрэчча, вёска, што ўтварылася на месцы былое панскае сядзібы, – гэта месца, дзе і дасюль воля сьвішча для мяне з усіх шчэлак, а кожная

зьвязаная зь ёю, нават самая нязначная, падзея абуджае ў душы цэлую плойму пачуццяў. Мясьціна, прамінулае жыцьцё якой засталося ў памяці такім шматколерным, што праявамі сваімі і самую буйную фантазію перасягне. Ужо чаго-чаго, а паэзіі там хапала. Адны толькі арэхавыя ды ліпавыя, шыпшынавыя ды бэзавыя алеі, зарасьнікі ружаў, язьміну, а то і зусім нейкіх экзатычных хмызьнякоў ды кветак чаго былі вартыя. Такая вось паэзія чыстае красы. Для нас у дзяцінстве фарбы ці водар тых кветак былі больш звыклыя за колер ці пах бульбяных суквецьцяў.

Так, сёньня вёска ня тая, яна вымірае. Але ж паэзія ня зьнікла. Зьніклі, паўцякалі ў гарады мы, а гэта, як ні круці, – зь іншае опэры. Паэзія набыла новую – бяз нас – якасьць. Гэта ўжо не паэзія прыўкраснага, маладога, гэта паэзія трагічнага – дажыванья, старасьці, сыходу тых, што засталіся. Мы яе не заўважаем, таму што не жадаем уявіць штосьці бяз нашага ўдзелу. Таму што такая паэзія ня ўкладваецца ў звыклыя межы нашага яе разуменьня. Нашае адносна камфортнае гарадзкое існаваньне аддаліла нас ад яе, зрабіла чужымі ёй. Мы яе баімся і часам пазьбягаем, бо бачым у ёй дакор нашай здрадзе, уласную наканаванасьць ня стаць дарэшты не-чужынцамі там, дзе мы ёсьць цяпер. Я ніколі раней ня думаў, што працэс адміраньня роднай мясьціны можа быць гэткім балючым. Ня менш балючым, як, напрыклад, страта блізкага чалавека. Балючым да такой ступені, што можа выклікаць адчужэньне. Сёлета мне ўпершыню не хацелася начаваць у пустой бацькоўскай хаце. І не з-за браку паэзіі, там яе дастаткова – у посьвісьце ветру па-над дахам, у енку масьнічын, у зорках над прысадамі ды ці мала ў чым яшчэ. У мясьцінах, якіх мы выракліся, месца паэзіі няма для нас, бо мы выпалі зь іх кантэксту. Для тых жа, хто там застаўся, яе ані не паменела, хоць яны нам пра тое і ня скажуць, бо ня ўмеюць. Што да кепскіх гісторыяў, то хіба раней іх было менш? Гэтыя жахлівыя праявы калгаснага прыгонства зь цяганьнем мяхоў з дустам ды рознымі ўгнаеньнямі, гэтыя ходкі па хлеб за шэсьць вёрст, раньнія нялюдзкія сьмерці з-за хранічнага недахопу хвіліны на ўчаснае лячэньне... Але ўсё гэта было натуральнаю часткаю нашага жыцьця, і мы ўспрымалі яго як належнае і нават знаходзілі ў ім... паэзію. Зь іншага боку, ці так ужо шмат

высокага ў тым жа нашым сёньняшнім гарадзкім жыцьці, каб яго паэтызаваць? Але ж паэтызуем, бо родным становіцца для нас, сапраўды, тое месца, дзе нам добра. Гэта нармальная зьява, іншая рэч, што забывацца на карані ня сьлед, як і пляваць на сваю мінуўшчыну, на сваю гісторыю.

Вы пытаецеся пра міталягізаванасьць маёй Мёршчыны. Дык вось гэтае нашае паэтызаванае ўспрыняцьце прамінулага, нам дарагога, – ці ня ёсьць таксама адным зь мітаў? З тых, што цешаць нашае самалюбства нашаю ж нібы адданасьцю чамусьці, таму, чаго выракацца сорамна, а разам з тым падвышаюць нас ува ўласных нашых вачах і вачах нашчадкаў. Міт-аблуда, як той, чуты вамі, напэўна, неаднойчы – пра суцэльную спольшчанасьць Мёршчыны ды прылеглых да яе раёнаў. Ён, напрыклад, па сёньняшні дзень ня дае спакою ўраджэнцам усходніх рэгіёнаў вобласьці, а тым часам абсалютна ня мае пад сабою аніякага грунту. Ужо зрусіфікаванасьць – так, але ж ня спольшчанасьць, гэта няўзброеным вокам бачна.

– Гісторыі, што адбываюцца ў аповесьці «Ўдог», – гэта пагружэньне ў няпросты пасьляваенны сьвет дзяцінства?

– Не зусім так. Справа ў тым, што само азначэньне – пасьляваеннае (у звыклым сэнсе гэтага слова) – наўрад карэктнае для мясьцінаў, дзе прайшло маё дзяцінства. Мясцовасьць, дзе я нарадзіўся, – глухі кут паміж Друяй і Лявонпалем, беларуска-польска-расейска-латыскае (паводле падзелаў розных пэрыядаў, вядома) памежжа з адпаведнаю рознасьцю поглядаў як на вайну, так і на тое, чым сталіся для тамтэйшых жыхароў яе вынікі. Не зманю, калі скажу, што сьлядоў вайны мы ў дзяцінстве наагул не адчувалі, бо ў нас не было падчас вайны вялікіх бамбёжак, разбурэньняў і г. д. У вёсцы былі ўдзельнікі вайны, але не было тых, хто быў мабілізаваны ў войска менавіта зь яе, бо ўтварылася яна ўжо пасьля вайны. Адзіным, што нагадвала пра падзеі ваеннага часу, былі, памятаю, аповеды старэйшых людзей пра зарыва па-над Дзьвіною падчас трагедыі ў Асьвеі ды вялікая колькасьць калек і жабракоў на дзядзінцы перад касьцёлам. Нам не тлумачылі, хто гэтыя нябогі, адкуль яны ўзяліся, таму мы ня

зьвязвалі іх нашэсьце з вайною. А вось згадкі пра тое, як забівалі, ужо пры саветах, ксяндзоў ці як раскулачвалі заможных сялянаў, мы чулі штодня. Так што правільней будзе менаваць згаданы вамі пэрыяд датычна малой радзімы як пасьляваенны пэрыяд разбурэньня своеасаблівага, вельмі адметнага ўкладу жыцьця. Я засьпеў дзіцем той уклад і быў сьведкам яго руйнаваньня. Пра моцныя нацыяналістычныя асяродкі, што існавалі ў рэгіёне перад вайною (пра іх дзейнасьць піша ў сваіх успамінах Язэп Малецкі), ніхто ў нас, як і паўсюль у Беларусі, у той час ня згадваў. Затое заставаліся некранутыя матэрыяльныя сьведчаньні мінуўшчыны: панскія пакоі – помнік сядзібнай архітэктуры міжваеннай Польшчы – у маім Міжрэччы, комплекс кардоннае фабрыкі ва Устшэжы, што давала працу шмат каму з аўтахтонаў, гарадзішча XII стагодзьдзя ў Прудніках, капліцы, касьцёлы. Урэшце – проста найцікавейшыя сялянскія гаспадарчыя пабудовы з стосамі выданьняў суполкі «Загляне сонца і ў наша ваконца» ды маляванкамі Драздовіча на паддашках. Усё гэта разбуралася, гублялася, чэзла пад ціскам новых рэаліяў. Цэгла ды кахлі расьцягваліся, дзіўныя амэрыканскія таполі пілаваліся на «падушачкі» для калёсаў, экзатычныя дрэвы і хмызьнякі высякаліся, а люд масава ўцякаў ад тых рэаліяў у суседнюю Латвію або ў Польшчу. Дарэчы, мае бацькі таксама мелі намер зьехаць і рыхтавалі ўжо адпаведныя дакумэнты, але штосьці не атрымалася. Мяняліся варункі – мяняліся людзі. Спаквяля прыходзіла схільнасьць да п'янства, аднаасобніцкая рупнасьць саступіла месца калектыўнай абыякавасьці. Адна з галоўных гераіняў «Удогу», Стася, – рэальная асоба, якая хадзіла зь сякеркаю за поясам і нішчыла ўсё, што трапляла пад руку. І такіх Стасяў было шмат. У выніку мая вёска зь яе дзіўнымі сымэтрычнымі алеямі колішняга панскага двара ўжо на пачатку 1970-х нагадвала пустэльню. А наагул праіснавала яна крыху больш за паўстагодзьдзя і засталася ў скрыжалях гісторыі як месца прытулку аднаго пакаленьня. Цяпер там жывуць два чалавекі – і гэта ў мясьціне, дзе колісь усё віравала, дзе сама прырода хараством сваім кліча на сталае жыцьцё. І не вайна ўсё тое зрабіла. Вось пра што я пісаў.

– Як літаратуразнаўцы і чытачы ўспрынялі гэты няпросты

для разуменьня твор?

– Гэта быў першы мой твор, на які адгукнулася даволі шмат людзей. Былі тэлефанаваньні ад незнаёмцаў, ад знаёмых. Тыя, каму не спадабалася, не адзываліся, але я ведаю, што іх таксама нямала. Але ж я добра ўсьведамляў, што раблю. Як ведаў і тое, што ўспрыняцьце такога твору залежыць ад пазыцыі чалавека, яго погляду на рэаліі, мастацкага густу і г. д. Што да літаратуразнаўцаў, то ня будзем забывацца: наша літаратура ўсё яшчэ застаецца сфэраю апалягетыкі «ружовага». Усе гэтыя размовы, уся гэтая лухта пра задачы маральнага выхаваньня празь літаратуру, пра меру дапушчальнасьці адлюстраваньня вычварнага, нязвыклага, цёмнага ў чалавеку... Такое ўражаньне, што літаратура ў нас робіцца калектыўна, прычым усё гэта – на тле крайняга эгацэнтрызму, кланавай заангажаванасьці, кругавой парукі. Я сумняваюся ў пэрспэктыўнасьці літаратуры, дзе адзін паэт прылюдна папікае другога нетрадыцыйнаю сэксуальнаю арыентацыяй і дзе пры фармаваньні сьпісу чытва для школьнікаў улічваюцца найперш палітычныя погляды аўтараў. «Удог» ня мог быць прыняты спавядальнікамі імпэрскага мысьленьня, і гэтаксама ня мог ён быць прыняты экзальтаванаю часткаю чытача, скіраванага на нацыянальную ідэю. Гэта, зноў-такі, нашае спэцыфічнае ўспрыняцьце твору: шукаць у ім сябе любага, ды яшчэ каб як мага больш сымпатычнага. Я адно ведаю дакладна: я зрабіў тое, у чым хацеў і мог раскрыцца як найпаўней, і зрабіў гэта няблага.

– У кнізе Васіля Гадулькі «Голас» ягоны і ваш сябар Васіль Сахарчук спасылаецца на словы Васіля Быкава, маўляў, ува ўмовах правінцыі ў творцы ёсьць тры шляхі: вырвацца зь яе атмасфэры і рэалізавацца ў сталіцы альбо зьмірыцца з роляй серадняка і публікацыямі ў рэспубліканскім друку час ад часу напамінаць пра сябе ці проста паддацца цячэньню і сьпіцца, што ў літаратурным жыцьці нярэдка здараецца. Ці згодныя Вы?

– У меркаваньні Быкава ёсьць праўда, але ці ўся? Што значыць – рэалізавацца ў сталіцы? Заняць пасаду ў Менску, дзе наўкола цябе будуць круціцца Бог ведае хто і сьпяваць табе гасанны, ці

ўсё-ткі напісаць варты твор у правінцыі? Што лепш – надрукаваць, карыстаючыся прывілеяй доступу да выданьня, усё, што ні натрызьнілася, ці, апёкшыся аб няўдачу, можа, нават чыюсьці прадузятасьць, сесьці за стол і зрабіць, насуперак усяму, тое вартае? Дарэчы, «Удог» я пісаў, узлаваны на рэдакцыю «Полымя», якое згубіла мой папярэдні рукапіс, а пасьля, калі я яго ўзнавіў па памяці, адшукала згубленае і вярнула з выракам «надрукавана ня будзе». Дык і дзякуй ім!

Сьпіцца? Як я магу сьпіцца, калі Бог ня даў мне схільнасьці да зялёнага зьмея? Вось і Аркуш жа ня сьпіўся, і Сом не сьпілася, і Гарановіч ды Жарнасек надта ня п'юць, а толькі прыгубліваюць. І хіба ў сталіцы не сьпіваюцца?

Жыцьцё ў сталіцы мае перавагу ў пляне імітацыі літпрацэсу, і далёка не заўжды – у пляне яго выніковасьці. Ці тады, калі цябе папікнуць, напрыклад, нейкім тваім грахом, а да гэткага ж граху таго, хто побач, у адным «катле», якому, у адрозьненьне ад цябе, аказваецца, «сям'ю трэба карміць», паставяцца (і ты бачыш гэта, бо не сьляпы) згодна з выслоўем «варона вароне вока ня выдзеўбе». Дарэчы, адносна апошняга сёньняшняя сытуацыя здаецца мне больш непрыемнаю, як нават у савецкія часы. Але ж яна таксама ні пра што ня сьведчыць, як толькі пра ўзровень прыстойнасьці канкрэтных людзей.

Канечне, шанцаў для самарэалізацыі ў сталіцы больш, ды гэта, зноў жа, – рэч адносная. Быкаву пераезд у Менск у гэтым сэнсе паспрыяў, бо было што рэалізаваць. А колькі тых, што па пераезьдзе ня толькі не рэалізаваліся, а наадварот, канчаткова здэградавалі?

Думаю, ёсьць і чацьвёрты шлях – проста «вырвацца», без усялякіх «і»... Ня ведаю, як так сталася, але я не адчуваю сябе правінцыялам ні ў Менску, ні ў Кракаве, ні ў Рыме. Запрасеце мяне ў Парыж, і я правяду вам экскурсію ня горшую за тую, якую мог бы правесьці ў сваім правінцыйным Віцебску.

– Ну тады пагаворым пра Віцебск. Што сабой уяўляе сёньняшняе літаратурнае жыцьцё ў горадзе, у якім Вы жывяце?

– Віруе! Хто піша-друкуецца, хто займаецца соткамі, хто дзяцей-унукаў гадуе – усё як у людзей. Раз у чатыры гады выдаём альманах, выдалі даведнік «Пісьменьнікі Віцебшчыны». Шмат, ажно, можа, занадта, ладзім мерапрыемстваў рэпрэзэнтацыйнага кшталту. Працуем у пляне асьветніцтва – праз кантакты зь ліцэямі, студэнцкай моладзьдзю, бібліятэкамі. У нас добрыя стасункі зь мясцоваю прэсаю, тэлевізіяй, якія, у адрозьненьне ад прэсы сталічнай, падаюць падзеі з нашым удзелам больш-менш ахвотна. Яшчэ – плёткі пра сябе слухаем, самі пляцём... Напрыклад, адна з апошніх, у зьвязку з маім супрацоўніцтвам з каталіцкімі выданьнямі, – што Папа Рымскі плаціць мне ў месяц тысячу даляраў.

Людзей, якія пішуць, у горадзе і вобласьці нямала, адпаведна – і выдадзеных ды падрыхтаваных да друку кніжак шмат. Канечне, рознага гатунку ўся гэтая прадукцыя, рознага ўзроўню. З графаманамі ваюем, хоць гэта і вельмі няпростая справа: як добра нікому пісаць не загадаеш, так і кепска не забароніш. Агулам жа, у Віцебску ўсё някепска, як казала колісь, пацьвельваючыся з аматараў уставіць у размове польскае слова, адна з маіх суседак-вясковак, – поўны porządek.

...Віцебск ня родны мой горад, упершыню я пабачыў яго ўжо па вучобе ўва ўнівэрсытэце. Не магу сказаць, што вельмі яго люблю. Горад, дзе адно тваё зьнямечанае праз грамацейку-сельсаветчыцу імя здольнае выклікаць у незнаёмага суразмоўцы лёгкае неўразуменьне. Да таго ж я ўсё-ткі заходнік, і мэнталітэт вытыркаецца, дае аб сабе знаць. Прызвычаіўся, тым больш што рэльефам Віцебск вельмі нагадвае Міжрэчча. Усё тут узгорыста, высока, шырока, а галоўнае – вольна. Навучыўся бачыць пэрспэктыву вуліцаў, а праз гэта ўсьведамляць сябе ў прасторы – гэта важна для пісьменьніка, як і ўяўляць сябе ў часе. У Менску я вучыўся, але роднасьці зь ім ужо таксама не адчуваю. Таму, напэўна, і не спакусіўся пэрспэктываю пераезду. Віцебск і тым для мяне добры, што гэта месца, дзе я, адмалку чужы ўсялякаму спаборніцтву, магу як найменей марнаваць сілаў і энэргіі на адхіленьне прапановаў аб ім, захоўваючы іх на змаганьне з самім сабой. Што ў Менску зь яго больш высокай шчыльнасьцю літаратараў на адзін мэтар квадратны, пэўна ж, было б рабіць нашмат

цяжэй.

– А як Вам удаецца ў «нярodным» Віцебску самому выдаваць свае кнігі?

– Калі як. Найчасьцей – дзякуючы падтрымцы добрых людзей. А то і ўласным коштам выдаю. Напрыклад, сто асобнікаў апошняй, «Асымэтрыі», каштавалі мне значных у сувымярэньні з маім заробкам грошай, буду цяпер вяртаць іх праз продаж. У 2003-м Беллітфонд, выдаўшы «Ўдог», «нагрэў» мяне на ўсю суму, што паступіла на яго рахунак па рэалізацыі часткі накладу. Апошнім падарункам, які я меў ад дзяржаўнай «Мастацкай літаратуры», было выданьне дзіцячай кніжкі ў 2003 годзе.

Наагул, выданьне кніжкі – гэта пакута. Кожны, хто хоць аднойчы гэтым займаўся, ведае: лягчэй кніжку напісаць, чым выдаць.

– Што сёньня ўяўляе сабой пасада старшыні абласнога аддзяленьня СПБ, якую Вы займаеце з канца 1990-х? Ці прыслухоўваюцца да Вашай думкі абласныя ўлады?

– «Пасада» без заробку і з масаю абавязкаў. У дзяржавы няма грошай, каб аплаціць сумленную (даруйце за нясьціпласьць) працу пяцярых старшыняў абласных пісьменьніцкіх суполак. І гэта пад бясконцы акампанэмэнт размоваў наконт клопату пра сваё, беларускае.

Што да ўладных пэрсаналіяў, то мы існуем, так бы мовіць, паралельна. Яны ведаюць, што ёсьць я, я ў курсе, што дзесьці ёсьць яны. Такія стасункі – найлепшы варыянт, бо ён дазваляе проста ня ведаць, наколькі з табою ня лічацца. Звычкі хадзіць па кабінэтах ня маю, таму кантакты зьведзеныя да мінімуму. Але добрыя кантакты маю з упраўленьнем культуры, якое шмат дапамагае нам у справе ажыцьцяўленьня выдавецкіх ды іншых праектаў. Людзей, якія зычліва ставяцца да нацыянальнага, у тым ліку да беларускай кніжкі, ня так і мала. Іншая рэч – нашая, так характэрная для грамадзтва татальнае асьцярогі

згубіць і тое малое, што маеш, звычка «падсьцілаць», *apriori* рабіць так, як можа спадабацца камусьці, ці, наадварот, нешта не рабіць, калі, барані Бог, яно камусьці будзе недаспадобы.

– Хто зь беларускіх пісьменьнікаў Вам блізкі эстэтычна? У каго Вы вучыліся?

– У пляне блізкасьці, а дакладней, сымпатычнасьці мастацка-эстэтычнай – напэўна, назаву Мудрова, Наварыча – у паасобных аповедах. Гэта з гледзішча прафэсійнага. Для чытаньня – можа быць і нешта іншае. Быкава шаную, безумоўна, хоць якраз эстэтычная канцэпцыя яго апошніх твораў мне чужаватая. А як шараговы чытач аддаю перавагу паэзіі. Чытаю ўсё без разбору, незалежна ад таго, якога гатунку і дзе надрукавана. Чытаю Барадуліна, Сільнову, іншых аўтараў. Акутагава пісаў пра паэзію як пра адзіны чыста мастацкі літаратурны жанр, я гэткай жа думкі, адсюль і прыхільнасьць да паэзіі. Люблю верш разкаваты, безь сюсюканьня. Гэткі, да прыкладу, як Хадановічаў.

З настаўнікаў канкрэтна нікога не магу назваць. Ды і скуль ім было ўзяцца, калі зь першым літаратарам (апроч універсытэцкіх выкладчыкаў ды тых, з кім давялося жыць разам у інтэрнаце) візуальна пазнаёміўся амаль што ў 30-гадовым узросьце? А вось людзі, якія падтрымлівалі, – былі. Марчук, напрыклад, напачатку, які ніколі не павучаў, а толькі падбадзёрваў, заахвочваў добрым словам. Быў, дарэчы, днямі непрыемна ўражаны, пачуўшы зь ягоных вуснаў у нейкім інтэрвію па тэлевізіі маналёг на расейскай мове. І гэта, калі не памыляюся, у сюжэце зь беларускамоўным камэнтаром! Нішто сабе прыклад для паспалітага люду! Дамашэвіча і Далідовіча не магу не згадаць з удзячнасьцю, Варановіча.

– Калі нам чакаць Вашую новую кнігу?

– Працую паралельна над дзьвюма аповесьцямі. Калі скончу – ня ведаю. Нагодаю для пачатку працы над адною зь іх сталася нядаўняе наведаньне Даўгаўпілсу – вельмі супярэчлівыя, неадназначныя ўражаньні. Сьпяшацца ня буду, такі ўзрост –

вымагае грунтоўнасьці і адказнасьці за зробленае. Тым больш што на зьмену творчаму імпэту, дакладна ведаю, прыйдзе адчужэньне, і тады ўжо кусаць локці ды пасыпаць голаў попелам будзе позна. Ня ўдасца зрабіць належным чынам, – перажыву, я ня з тых дзядзькоў, што могуць зарабіць нэўрастэнію праз творчую няўдачу. Калі чакаць кніжку? Як напішу і зраблю ўсё астатняе, што спадарожнічае такому цягамотліваму, нэрвоваму «акту». Можна і раней – як ахвяруеце грошы.

Гутарыў Алесь Аркуш

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

[image]

[image]2005

ад Зьмітук

ацалітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • **літаратура** • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

Вальжына Морт

ВАЛЬЖЫНА МОРТ (Мартынава) нарадзілася ў Менску ў 1981 годзе. Паэтка, аўтарка кніжкі «Я тоненькая, як твае вейкі» (2005). Атрымала міжнародную літаратурную ўзнагароду «Крышталь Віленіцы» (Славенія, 2004). Перакладае з ангельскай і польскай моваў.

МУЗЫКА САРАНЧЫ

Чаго б я хацела?
Быць маленькай вяснушкай на носе ветру
Ехаць у машыне з адчыненым верхам
Побач з мужчынам у сталым веку
А хай і падлеткам

І быццам усё што было дагэтуль
Толькі мытня за якою гэтае лета
Закінуў Бог у мяне сэрца нібыта ў раку манэту
І загадаў жаданьне
І зьнік у паветры

І засталося ўсё акрамя веры
Выстаў мой багаж за дзьверы
Выкінь мой квіток з акна
Выкінь мой сумнеў і боль
У іх няма патрэбы больш
Бо мы сёньня будзем разам да відна

І горы прыселі як бегуны на старце
І вецер уздымае іх зялёныя майкі
А потым горы гіганцкія чарапахі
А потым ён прапануе мне разьвітацца

І быццам колер ягонае скуры гэта
Дакладны колер сонца падчас зьмярканьня
І дарога выскоквае з-пад колаў
Як зграя саранчы і нясецца ўдалеч

І быццам вейкі з божых вачэй
Падаюць зоркі – ярчэй, яшчэ!
І Бог не пасьпявае з жаданьнем
А Богу трэба – хутчэй, хутчэй!
І немагчыма заснуць з тым мужчынам

Зь ім цела становіцца ўначы
Музыкай саранчы

* * *

ці гэта згублены табою волас
пусьціў карэньне
пасьля таго як на пустыню прасьціны
упалі
дажджом доўгачаканым целы
ці гэта гбды
абуджаныя ў пячорах коўдры
свае агнявыя
высунулі языкі
альбо фантанам крыві
сканала паветра
задыхнулася
паміж двух целаў
у сярэдзіне
белая пена – вось чым стала прасьціна
і хвалі коўдры вынесьлі на падлогу
дзьве рыбіны што раты вываročваюць няўмела
і што гэта там вісіць
ці не чырвоны месяц
ці гэта бог узьняў свой голас
і кінуў уніз
і ён упаў на дом мой громам
і нерухомай маланкай

на маім ложку
стаіць тульпан

* * *

Рафалу Ваячку

перад вачыма
лезе ў рот
над вухам
брыдкаю мухай
лётае сьмерць
перашкаджае
глядзець
есьці
слухаць
нарэшце здолеў яе ўхапіць
сьціснуць
у кулаку
і ў выніку
больш нічога ня трэба
адарваў ёй крылцы
галаву
адпусьціў яе мітусіцца
на падлогу
і назіраеш падоўгу
дакладней вечна

* * *

мая бабуля
ня ведае болю
яна думае што
голад гэта ежа
галота гэта багацьце
смага гэта вада
яе цела як вінаград абвілася вакол палкі
яе валасы як пчаліныя крылцы
яна глытае сонечныя зайчыкі таблетак

называе інтэрнэт тэлефонам ў амэрыку
яе сэрца стала ружаю – яго толькі і можна
што нюхаць
прыціскаючыся да яе грудзей
больш ад яго ніякага толку
толькі кветка
яе рукі як ногі бусла
чырвоныя палачкі
і я сяджу на кукішках
і выю ваўком
на белую поўню тваёй галавы
бабуля
я кажу табе гэта ня боль
гэта так моцна цябе абдымае бог
цалуе і коле сваёй няголенай шчакою

БЕЛАРУСКАЯ МОВА

I
за тваімі межамі, мая краіна,
пачынаецца вялізны дзіцячы дом.
і ты вядзеш нас туды, беларусь.
можа, нарадзіліся мы бяз ног,
можа, ня тым багам молімся,
можа, табе ад нас гора,
можа, мы невылечна хворыя.
можа, няма табе чым нас карміць,
але ці ж ня ўмеем мы жабраваць
можа, ты й ніколі не хацела нас,
але ж і мы на пачатку
ня ўмелі цябе любіць.

твая мова такая маленькая,
што яшчэ й размаўляць ня ўмее.
а ты, беларусь, у гістэрыцы,
табе ўсё здаецца,

што акушэркі пераблыталі скруткі.
што ж табе зараз карміць чужое дзіця,
сваім малаком паіць мову чужую?
мову, што ляжыць сіняя на падваконьні,
ці мова гэта, ці шэрань леташняя,
ці шэрань гэта, ці толькі ад укрыжаваньня цень,
ці цень гэта, ці проста нічога.

гэта ня мова,
бо няма ў ёй ніякай сыстэмы.
яна, як сьмерць, раптоўная й неразборлівая,
як сьмерць, ад якой немагчыма памерці,
як сьмерць, ад якой мерцьвякі ажываюць.

мова, дзеля якой дзяцей кладуць на патэльні,
мова, дзеля якой брат забівае брата,
мова, ад якое нікому не ўратавацца,
мова, што нараджае ўродаў-мужчынаў,
нараджае жанчын-жабрачак,
нараджае безгаловых жывёлаў,
нараджае жабаў з чалавечымі галасамі.

гэтай мовы не існуе,
яна нават ня мае сыстэмы.
зь ёй размаўляць немагчыма,
яна адразу б'е ў морду,
нават на сьвяты.
гэтую мову па горадзе не разьвесіш,
яе ўжо не ўпрыгожаць ні фаервэркі,
ані нэон.

я а клала на тую сыстэму
свой
А К А Р Д Э О Н.

а мой акардэон –
ён як расьцягне мяхі –
як горныя вярхі –
такі мой акардэон.
ён ежу бярэ з рукі,

ён ліжа і, як дзіця,
ня злазіць з маіх калень.
але, калі трэба, ён
пакажа свой траляля!

II

Нават нашыя маці ня знаюць як мы зьявіліся ў сьвет
Як мы самі рассунуўшы іхныя ногі вылезьлі вонкі
Так вылазяць пасьля бамбардаваньня з руінаў
Мы ня ведалі хто з нас хлопец а хто дзяўчына
І жэрлі зямлю і думалі што жарэм хлеб
А нашая будучыня гімнастачка на тонкай
Нітачцы далягляду што там яна толькі
Ні вырабляла
Бля

і мы расьлі ў краіне дзе
спачатку крэйдай крэсьляць дзьверы
і ўночы прыяжджаюць дзьве-тры машыны
і звозяць нас але
ў тых машынах былі не мужчыны
з аўтаматамі
і не жанчына з касою
але так да нас прыяжджала каханьне
і забірала з сабою

Толькі ў грамадзкіх туалетах мы адчувалі свабоду
Дзе за дзьвесьце рублёў ніхто не пытаў што мы там робім
Мы былі супраць сьпёкі летам супраць сьнегу зімой
А калі аказалася што мы былі нашай мовай
І нам вырвалі языкі мы пачалі размаўляць вачыма
А калі нам выбралі вочы мы пачалі размаўляць рукамі
Калі нам адсяклі рукі мы размаўлялі пальцамі на нагах
Калі нам прастрэлілі ногі мы ківалі галавою на «так»
І хіталі галавою на «не». І калі нашыя галовы зьелі жыўцом
Мы залезлі назад у чэравы нашых сьпячых маці
Як у бамбасховішчы
Каб нарадзіцца зноў

А там на далягляд зе гімнастачка нашай будучыні
Скакала праз агнявы абруч
Сонца
Пі...ец

[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

рэцэнзіі

[image]-[image]2005

"да Зьмітук"

аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • **рэцэнзіі**

[image] [image] [image]

АНДРЭЙ КАТЛЯРЧУК

Андрэй Катлярчук Вікінгі, Русь і загадкавая адсутнасьць Полацку

гісторык. Апошняя кніжка – «Швэды ў гісторыі і культуры Беларусі» (Менск, 2002). 5 кастрычніка сёлета выступіў на навуковай канфэрэнцыі Гронінскага ўнівэрсытэту з спавешчаньнем «Народзіны Украіны: дыпляматычныя адносіны паміж Швэцыяй і Казацкай дзяржавай у 1648–1660 гадох».

Duczko Wiadysiaw. *Viking Rus. Studies on the Presence of Scandinavians in Eastern Europe.* – Leiden-Boston: Brill, 2004. – 290 p.

У 2004 г. у прэстыжнай сэрыі «Паўночная Эўропа і Балтыка каля 400–1700 гг. Народы, эканомікі і культуры» выйшла кніга швэдзкага археоляга польскага паходжаньня Ўладзіслава Дучка. У 1986 г. ён абараніў доктарскую дысэртацыю ўва ўнівэрсытэце Ўпсолы і з таго часу працуе то ў Швэцыі, то ў Польшчы. Мэту сваёй доўгагадовай працы аўтар вызначыў як падсумаваньне і аналіз вядомай на сёньня спадчыны вікінгаў на Русі. Задача слушная, бо падобнага сынтэзу па-ангельску яшчэ не было.

Але зацікаўленага беларускага чытача чакае расчараваньне. Скандынаўскія аспэкты гісторыі краіны, што захавала ў сваёй назьве той самы корань «Русь», не атрымалі належнага разгляду. Тым ня менш, уважліва паставіцца да зьместу кнігі варта зь дзьвюх прычынаў. Па-першае, праца, на маю думку, адлюстроўвае тыповыя межы ведаў заходняга дасьледчыка пра старажытную Беларусь. Па-другое, кошт кнігі (165 даляраў)

дазваляе меркаваць, што гэтае выданьне ня дойдзе да паліцаў Нацыянальнай бібліятэкі РБ ды застанецца недаступным шырокаму колу беларускіх навукоўцаў і студэнтаў.

Аўтар адназначна залічае сябе да прыхільнікаў нарманскай тэорыі скандынаўскага паходжаньня старажытных русаў ды заўважае, што антынарманская тэорыя мела за царскім ды савецкім часам ідэалягічны, а не навуковы грунт. У СССР нарманіст-дасьледчык пачуваўся дысыдэнтам. Не ў апошнюю чаргу таму, што апантаным аматарам нарманізму быў Адольф Гітлер, які прысьвяціў варагам адну з сваіх прамоваў. Дучка піша, што першым, хто асьмеліўся ў СССР пісаць пра варагаў праўду, быў ленінградзкі археоляг Леў Клейн. На жаль, імя каляжанкі Клейна Фрыды Гурэвіч – нястомнай дасьледчыцы старажытнага Панямоньня – у кнізе няма. Між тым, яшчэ за савецкім часам Гурэвіч заўсёды сьмела вызначала скандынаўскае паходжаньне знойдзеных ёй артэфактаў. Яна ж надрукавала ў 1990 г. у эстонскім «Скандинавском сборнике» клясычны артыкул «Скандинавские находки на территории Белоруссии» з мапай знаходак скандынаўскіх артэфактаў у Беларусі. Дзіва, але ў бібліяграфіі аўтара гэты шырока вядомы артыкул адсутнічае.

Немагчыма пераказаць зьмест кнігі, якая разглядае ўсю рукапісную і археалягічную спадчыну вікінгаў на абшарах Расеі (Ладага, Гнёздава, Паволжа), Украіны (Кіеў, Чарнігаў і Прыдняпроўе), былой Бізантыі (Маравіі і Славакіі) і мусульманскага Ўсходу. Шэраг фрагмэнтаў малавядомы беларускім вучоным. Напрыклад, аўтар паведамляе пра знойдзены ў 1890-х гг. у сынагозе Каіру ліст XI ст. ад юдэяў-хазараў Кіева, дзе гэтае места называецца па-хазарску «Sambatas». Малавядомай старонцы – экспансіі русаў-варагаў у бок Касьпію – прысьвечана трэцяя частка працы. Дучка падкрэсьлівае, што скандынаўскае паходжаньне старажытных русаў было выдатна вядомае ўжо іх сучасьнікам. Пра гэта пісаў ісламскі аўтар Масудзі. А біскуп італьянскага гораду Крэмона Люіпранд, які ў сярэдзіне X ст. адведаў Царград, дзе спаткаўся з кіеўскімі русамі, у сваіх занатоўках зазначыў: «Гэтыя русы ёсьць насамрэч нарманамі, але з тых, што жывуць на Ўсходзе» (с. 122).

Адным з найбольш цікавых момантаў кнігі зьяўляецца аналіз вядомага паведамленьня «Берцінскіх аналаў» 839 г., як зь Бізантыі ад імпэратара «Ўсходу» Тэафіла да імпэратара Сьвятой Рымскай імпэрыі Людвіка прыбылі паслы невядомага народу «Русь», якія насамрэч, як высьветлілі германцы, былі этнічнымі швэдамі. Дучка – адзін зь першых, хто здолеў прааналізаваць гэтае кароткае паведамленьне ў шырокім кантэксьце (с. 10–19). А менавіта: што адбывалася на той час у Бізантыі? Што хацелі русы-швэды ад імпэратара «Захаду»?

Высьвятляецца, русы ехалі зь місіяй бізантыйскага кіраўніцтва да данаў – братоў па мове і культуры. На загад патрыкаса Тэадосіюса русы мусілі пераканаць данаў падпісаць саюз зь Бізантыяй і дапамагчы сваім флётам спыніць мусульманскую экспансію. Тры пячаткі зь лістоў патрыкаса Тэадосіюса знойдзены археолягамі ў Данії. Свайго князя русы называлі «каганам». Дучка заўважае, што гэты спэцыфічны неславянскі тытул, якім князя кіеўскага звалі таксама ў Царградзе і на мусульманскім Усходзе, быў добра вядомы ў Кіеве. Напрыклад, мітрапаліт Іларыён у «Слове аб законе і дабрадаці» называе князя Ўладзімера «вялікім каганам нашай зямлі». На сьцяне кіеўскай Сафіі нехта з русаў накрэмзаў: «Спасі Госпадзе кагана нашага».

Што важна: археалягічныя крыніцы старажытнай Русі параўноўваюцца ў кнізе Дучкі з малавядомымі ў Беларусі швэдзкімі і дацкімі артэфактамі. Напрыклад, на думку Дучкі (с. 179), знаходкі Гнёздава паказваюць, што ўладальнікамі рэчаў былі ня проста варагі, а прадстаўнікі паўночнай эліты. Аўтар даказвае, што варагі-русы жылі ў сваіх паселішчах сем'ямі з жонкамі і дзецьмі, што яны першымі прынялі хрысьціянства (факты, зрэшты, вядомыя навуцы). Аўтар адзначае таксама (с. 77–80) вялікую колькасьць скандынаўскіх знаходак ля Дунаю і слушна паказвае, што падобныя знаходкі добра пасуюць да вядомых зь летапісаў эканамічных і палітычных інтарэсаў вікінгаў у Бізантыі.

Беларусь згадваецца ў кнізе толькі два разы ў сувязі са Stender-Petersen A. Varangica. знаходкамі скандынаўскіх рэчаў, Тураў – аднойчы, Полацак – пяць разоў. На с. 113–114 коратка падкрэсьліваецца [1]

ў Полацку асобнай ад Рурыкавічаў дынастыі Рангвалодавічаў, Arada, На с. 126–127 тэза гэтая ўдакладняецца вядомымі цытатамі з «Аповесьці мінулых гадоў». Але аўтар сам сцвярджае, што яго думкі тым, што, маўляў, ня хоча займацца спэкуляцыямі, ён дзе не хапае крыніцаў. Дазвольце: але ўся вядомая нам гісторыя і гісторыя часу вікінгаў пабудавана на такіх вось суб'ектыўных спэкуляцыях дасьледчыкаў. Між іншым, паведамленьне летапісу ў параўнаньні зь іншымі – у тым ліку старажытнымі крыніцамі дазволіла, напрыклад, аўтару гэтай рэцэнзіі сьледам за дацкім вучоным Адольфам Стэндэр-Пэтэрсенам устанавіць, што ў 985 г. сьвятланосец Торвальд прыязджае праз Ерусалім у Царград. Тут ён сустракаецца з імпэратарам Васілём II на мяжы Забойца Баўгараў і ўпрыгожвае Міхаілаўскі манастыр. На просьбу Торвальда імпэратар выдае грамату, паводле якой Торвальд прызначаецца «намесьнікам Бізантыі ў рускіх князёў» у Гардарыцы. З улікам таго, што альтэрнатыўны шлях з Швэцыі ў Бізантыю, згодна з сагай Гута, праляжа праз Полацак, згодна грамаце, мусіў выконваць парады Торвальда. Зазначу, што за часамі Васіля II Бізантыя пасягнула зэніту сваёй магутнасьці. Пад кантролем імпэрыі трапілі Балгарыя, Армэнія, Грузія, паўднёвая Італія і Кіеўская Русь. У 988 г. вялікі князь кіеўскі Ўладзімер прызнаў сябе васалам імпэратара, прыняў хрост, духоўную ўладу грэцкага мітрапаліта і ажаніўся зь сястрой Васіля II. Такім чынам, выдача Торвальду граматы да князя Полацкага, які ў 986 г. пасварыўся з Кіевам, была цалкам лягічным крокам.

Аднак, 78 шляхецкіх радаводаў Полаччыны, Віцебшчыны і Магілёўшчыны, апублікаваныя ў Пецярбургу ў 1886 г., пачынаюцца ня з Рангвалода, а з Рагвалода. Гэтая акалічнасьць, а таксама тое, што ў Полацку ніколі не было ніякіх Рурыкавічаў, дазваляе выказаць здагадку, што Рагвалод і Рангвалод – адна і тая асоба.

Такое адрозьненьне ў імёнах можа быць вынікам памылак перапісчыкаў, якія ня ведалі, што Рангвалод – гэта Рагвалод, і «выправілі» яго імя на больш звыклае. Падобныя памылкі ў старажытных рукапісах – зусім не рэдкасьць. Так, у Іпацьеўскім летапісе імя Рагвалода напісана як Рогволод, а ў Лаўрэнцьеўскім – як Рогвольд. Ня выключана, што ў Полацку існавала ня толькі дынастычная, але і царкоўная традыцыя, якая ўшаноўвала Рагвалода як першага хрысьціянскага князя. Гэта можа тлумачыць, чаму ў полацкіх радаводах ён фігуруе як Рангвалод, а ня як Рурык.

Такім чынам, Рагвалод і Рангвалод – адна і тая асоба.

Рагвалод, Рангвалод, Рагвольд, Рогволод – усе гэтыя формы імя адносяцца да аднаго і таго ж чалавека. Розьніца ў напісаньні – вынік

Петербурга, 2000.

7. Vasmer R. Ein jüdisch-russischer Gelehrter aus Polotzk // Zeitschrift für Slawische Philologie. Heidelberg, 1929. Bd. 6. S. 45–53; Stender-Petersen A. Varangica. Aarhus; München, 1953; Fabricius P. Vikingarna. Stockholm, 1958; Palitzki-Jaworsky, Pawlowitsch. Polotzk // Encyclopedia Britannica. 14th ed. London, 1937. Vol. 18. P. 36–37; Fabricius P. Vägen till Ryssland. Stockholm, 1961; Jacobsen L., Moltesen E. Bibliotheca Arnamagnæana. Bd. 8. Kopenhagen, 1941; Palitzki-Jaworsky, Pawlowitsch. Polotzk // Encyclopedia Britannica. 14th ed. London, 1937. Vol. 18. P. 36–37.

Пра існаванне Дучкі, як і многіх іншых беларускіх гісторыкаў, вядома толькі з кароткіх артыкулаў у энцыклапедычных выданнях. Гэта Ю. Бохан, Ул. Конан, Ул. Ласіца, Ул. Пяткевіч, Я. Юхо, Ул. Ягамаскін, Ул. Пашкевіч, Г. Штыхаў, Ул. Хадарын, Ул. Чарнякевіч, Ул. Чарняўскі, Г. Шабуня, Ул. Шчарбакоў, Ул. Шчарбакоў, Ул. Шчарбакоў

Пасьля прачытаньня гэтага цікава напісанага дасьледаваньня нават апошні антынарманіст пяройдзе ў варожы лягер. Сумневу няма – цывілізацыя Русі была запачаткаваная паўночнымі ваярамі і купцамі. У высновах аўтар падкрэсьлівае, што пэрыяд актыўнасьці вікінгаў на землях Русі быў адносна кароткім гістарычным эпізодам, які, аднак, меў вялікія гістарычныя наступствы. Такім чынам, карысная для агульнай праблематыкі вараскага пытаньня кніга Ўладыслава Дучкі не дае нічога ў пытаньнях беларусістыкі.

Гэта падкрэсьлівае ўжо выказаную мною раней на старонках «ARCHE» думку: беларускім гісторыкам час самім ствараць якасныя працы і друкаваць іх на заходніх мовах. За вас, шаноўныя калегі, гэтага ніхто ня зробіць.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/25
[image]

Мінулыя (9’2000)

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

рэцэнзіі

[image]-[image]2005

"да Зьвяткаў"

аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • **рэцэнзіі**

[image] [image] [image]

Зінаіда Гімпелевіч Дзвесце гадоў імперскай фанабэрыі

ЗІНАІДА ГІМПЕЛЕВІЧ

прафэсарка катэдры славянскіх і германскіх дасьледаваньняў унівэрсытэту Ватэрлоо (Антарыё, Канада), намесьніца старшыні Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, сустаршыня Канадыйскай асацыяцыі славістаў. У сфэру яе навуковых зацікаўленьняў уваходзяць пасяджэнні беларуская мова, літаратуры і інтэлігенцыя. Аўтарка

Солженицын А. И. *Двести лет вместе (1795–1995)*. Ч. I. – Москва: Русский путь, 2001. – 509 с.; Ч. II. – Москва: Русский путь, 2002. – 552 с.

Не нами неправда сталась, не нами и кончится.

Солженицын А. Красное колесо: Узел Первый. Август 1914. Paris: YMCA Press, 1983. с. 532.

Бадай што, не знайсці іншага твора А. Салжаніцына, які б выклікаў такі шквал супрацьлеглых рэакцый, як яго фэрутэмны эпас «Дзвесце гадоў разам» – спроба напісаць эпічную хроніку складаных адносін паміж расійцамі і расійскімі габрэямі. У той час як пераважная большасць рэцэнзентаў выказвае ўваходзяць магутнаму інтэлекту пісьменніка, які хутка адзначыць 90 год з дня нараджэння, многія адзначаюць суб’ектыўнасць, дагматызм, недагаворкі, а часам і прадузятасць яго мовы. Адносіны крытыкаў можна падзяліць на тры групы: літаратуры і частка называе Салжаніцына юдафілам, большая адзначае розную ступень юдафобства, а іншыя бачаць у ім тыпу

расійскага нацыяналіста. Усе названыя і неназваныя грукы крытыкаў шырока прадстаўлены ў друку і ў Інтэрнэце. Неспалучальнасць іх супярэчлівых выказванняў працягвае хваляваць чытача. Відаць, што кожная з групаў мае сваю праўду, таму што ў паліфаніі двух тамоў чытач бачыць Салжаніцына ў розных іпастасях: які з даверам падае сёлетнім габрэям; які глядзіць недаверліва і нядобра, гатовы нарасці ў пакараць фізічна, то ўсенародна ды маральна, і нарэшце які не адрозніваецца ад тыповага вузкалобага расійскага нацыяналіста. Відаць, гэтыя формы ўспрыняцця звязаны з характарам апавядальніка, так і з характарам чытача. «Характер Солженицина – глубоко противоречив. Он стремится к объективности и в то же время страстно субъективен», – сцвярджае г. Памяранец на падставе і асабістых сустрэч і разважанняў.

Неаб’ектыўны Салжаніцын і ў адносінах да беларускай нацыі. Р. Пайпс у сваім аглядзе 1 часткі кнігі «Дзвесце гадоў разам» тлумачыць неаб’ектыўнасць Салжаніцына яго нацыяналістычнымі прыхільнасцямі:

Яму складана таму, што ён нацыяналіст; нацыяналізм увогуле, а расійскі нацыяналізм у прыватнасці, цяжка спалучаецца з цярпімасцю ў адносінах да габрэяў не ў апошнюю чаргу дзеля таго, што яны адмаўляюцца бясследна знікнуць у нацыянальнай супольнасці тых, сярод каго яны жывуць.

Адносіны Салжаніцына да іншых народаў, у прыватнасці да беларусаў, ненашмат адрозніваюцца ад яго пазіцыі да расійскіх габрэяў. Ён пачынае сваю гісторыю амаль што ў вакууме. У досыць павярхоўнай і схематычнай прадмове да першага тома ён прыводзіць некаторыя звесткі пра беларускіх габрэяў. Але яны падаюцца ў поўнай ізаляцыі ад беларусаў і іх традыцый, і ў той самы час не зважаючы на гістарычныя факты: першыя паселішчы габрэяў на беларускіх тэрыторыях узнікаюць з XI–XII стст., а беларусы з габрэямі масава жылі разам з XIV ст. (I, 36–43).

Беларусы, у параўнанні з іншымі славянскімі нацыямі, якія ў

Артыкул падрыхтаваны на аснове спавешчаньня, прачытанага ў чэрвені 2005 на IV Міжнародным кангрэсе беларусістаў.

розныя часы ўваходзілі ў расійскую або савецкую імперыю, маюць адметную гісторыю адносін з габрэямі. Гэта гісторыя захавала мала слядоў непрыязнасці, заснаванай на розным стылі жыцця. Салжаніцын, які вельмі неахвотна згадвае разам беларусаў з габрэямі, некалькі разоў адзначае антыпатыю і часам адкрытую непрымірымасць беларускага насельніцтва да дзеянняў нацыстаў у адносінах да габрэяў. У Беларусь часта даводзілася завозіць забойцаў з іншых тэрыторый: мясцовае насельніцтва наадрэз адмаўлялася прымаць удзел у фашысцкіх акцыях.

Вяртаючыся да нацыяналізму Салжаніцына, трэба адзначыць нацыяналістычныя настроі і пастулаты, якія вылучаюцца ў яго эсэ 1990 г. «Як нам уладкаваць Расію». Яны выклікалі абурэнне, а асабліва моцнымі былі галасы беларусаў і ўкраінцаў – адзіных дзвюх нацый, якія Салжаніцын, хай з некаторымі абмежаваннямі, бачыў у складзе сваёй «уладкаванай Расіі». Тая ж тэндэнцыя, што і ў эсэ, а менавіта змяшчаць Беларусь і Украіну ў склад расійскай дзяржавы, назіраецца ў «Дзвесце гадоў разам». Яшчэ ў эсэ ён звяртаецца да двух народаў:

Сам я – едва не наполовину украинец и в ранние годы рос при звуках украинской речи. А в скорбной Белоруссии я провел большую часть своих фронтовых лет и до пронзительности полюбил ее печальную скудность и ее кроткий народ. К тем и другим я обращаюсь не извне, а как свой.

Гэты сентыментальны ўступ (гістарычныя факты пацвярджаюць, што Беларусь стала «скорбной» і «печально-скудной» не без агрэсіі з боку Маскоўскага княства) працягваецца поўнай гістарычнай дэзінфармацыяй: «Да, народ наш разделялся на три ветви лишь по грозной беде монгольского нашествия и польской колонизации». Гэтыя радкі толькі ўмацоўваць расійскі імперскі міф і ў той жа самы час узнімаюць пытанні аб гістарычнай дасведчанасці аўтара. Напрыклад, ці чуў ён аб існаванні дванаццаці ўсходнеславянскіх плямён, іх розным паходжанні, розных звычаях і далёка не мірнай гісторыі, аб заняпадзе Вялікага Княства Літоўскага альбо падзеле Рэчы Паспалітай, якія

адбыліся з-за знясільваючых пастаянных войнаў з Масквой? І што Маскоўскае княства ўзбагацілася вялікімі матэрыяльнымі і культурнымі каштоўнасцямі, забранымі ў заможных беларускіх і габрэйскіх купцоў, рамеснікаў, дасведчаных рабочых і ўмелых земляробаў: лепшыя з іх былі ўзяты ў палон або знішчаны. Беларусь так і не змагла адысці ад гэтай непапраўнай страты, за якой распачаліся адразу новыя агрэсіі, а пасля і шматвекавая імперская каланізацыя. Факт, што палонныя прынеслі з сабой і ў сабе багатую культуру: літаратуру (беларускую, на іўрыце і перакладную), музычную, духоўную і вытворчую – пастаянна замоўчваўся і царскай, і савецкай гістарыяграфіяй. Гэта пацвярджаецца гістарычнай пазіцыяй, тыповай для расійскага нацыяналізму, так выяўна адлюстраванай Салжаніцынавым эсэ:

В Литве и Польше белорусы и малоросы сознавали себя русскими и боролись против ополяченья и окатоличенья. Возврат этих земель в Россию был всеми тогда осознаваем как Воссоединение (выдзелена Салжаніцыным. – **З. г.**).

Тую ж сентэнцыю знаходзім у Салжаніцына ў першым томе яго опуса. Як бачым, устаноўка пісьменніка да гісторыі Беларусі не змянілася за 12 гадоў. Толькі яго пагардлівае і недасведчанае стаўленне да Беларусі (тыповае для расійскага нацыяналіста) узмацніліся і замацаваліся ў «Дзвесце гадоў разам». Так, ён капіюе Гесэна, які паведамляе аб габрэйскай эміграцыі ў Польшчу ў XI ст., не ўпамінаючы пра такую ж, нават калі не больш значную, у Літву і ўвогуле проста ігнаруючы Беларусь такім жа чынам, як імперскія ідэолагі рабілі гэта на працягу стагоддзяў. У гэтых адносінах паказальная канцоўка яго эсэ, дзе ўвесь яго зварот «Да Украінцаў і Беларусаў» абмяжоўваецца ўкраінцамі, а беларусы чуюць толькі паспешнае: «*Все сказанное полностью относится и к Белоруссии, кроме того, что там не распаляли безоглядного сепаратизма*». Масціты пісьменнік у сваёй напаўлітаратурнай, напаўгістарычнай працы не толькі адмовіў беларусам у патрыятызме – любові да радзімы, але не заўважыў галоўнага: гісторыя іх адносін з габрэямі ў некалькі разоў і якасна, і колькасна перавышае габрэйска-расійскую.

Значная эміграцыя габрэяў на тэрыторыі, дзе жылі ліцвіны

(сучасныя беларусы), адзначаецца ўжо ў XI–XII стст. Яна дасягнула свайго першага піку ў XIV, а другога – у XVI ст. Беларусь, вядомая тады як Вялікае Княства Літоўскае, была ў тыя часы палітычна, эканамічна і культурна квітнеючай дзяржавай з развітай і вядомай у Еўропе пісьменнасцю на дзяржаўнай беларускай мове. Адна з прычын стабільнасці Вялікай Літвы палягала ў тым, што яе не кранула татара-мангольскае ярмо, якое загамавала развіццё Маскоўскага і саюзных яму княстваў (Растова-Суздальскага і інш.). Габрэі, якія пражывалі ў Вялікім Княстве Літоўскім, спакон вякоў вядомыя як літвакі. Інтэлектуальна-кніжныя ліцвінска-літвацкія (беларуска-габрэйскія) адносіны былі шматбаковымі і прадуктыўнымі. Так, Віленскія Кодэксы № 52 і № 262 (пераклад з іўрыта на старабеларускую мову) з'явіліся яшчэ ў першай палове XVI ст. Адна з першых публікацый Францішка Скарыны – гэта пераклад з іўрыта на беларускую мову кнігі Іова. Сымон Будны не толькі настойліва запрашаў габрэяў у Заслаўе, але і садзейнічаў іх уладкаванню, а самае галоўнае – умацоўваў узаемную цікавасць да граматы. Залатыя часы беларускай літаратуры – XV–XVII стст. – ішлі рука ў руку з развіццём ліцвінска-літвацкіх літаратурна-культурных адносін, што знайшло адлюстраванне і ў літаратуры на іўрыце, і ў беларускай мове. Пасля інкарпарацыі Беларусі ў Расійскую імперыю (цікава, што Салжаніцын, які адзначыў забарону ўкраінскай мовы, апусціў такую ж акцыю ў адносінах да польскай і беларускай моваў), беларускія габрэі, эканамічна, сацыяльна і палітычна бяспраўныя ў той жа ступені, што і беларусы хрысціянскіх і іншых веравызнанняў, працягвалі карыстацца іўрытам у рэлігійным абыходку і ідыш у быце. Іўрыт заставаўся выключна кніжнай мовай 1600 гадоў. Рабін Элізар Бэн Іегуда (1857–1922), які нарадзіўся ў Беларусі, удыхнуў у яго жыццё і ператварыў яго зноўку ў размоўную мову, тую, якой карыстаюцца цяпер у Ізраілі. Улічваючы наяўнасць беларускай фанетыкі ў сучасным іўрыце, няцяжка здагадацца і пра яго вытокі.

Дзеля гістарычных прычын, абумоўленых становішчам паміж дзвюма палітычна і культурна даміноўнымі з пачатку XVIII ст. сіламі (Расіяй і Польшчай), беларуская літаратура больш стагоддзя знаходзілася ў паўсне, прачнуўшыся толькі ў канцы

XIX ст. Яе развіццё ішло разам з росквітам габрэйскай літаратуры на ідыш і на беларускай мове (тут добрым прыкладам з'яўляюцца амаль братнія адносіны Максіма Багдановіча (1891–1917) і Змітрака Бядулі (Самуіл Плаўнік; 1886–1941). У той час, як з сярэдзіны 1870-х габрэйскія пісьменнікі з карэннай Расіі дарэмна імкнуліся «перакласці» сябе расійскаму чытачу, новаму пакаленню беларусаў і беларускіх габрэяў, якія нарадзіліся пасля 1880-х, не трэба было растлумачваць сябе беларускаму чытачу любога веравызнання: яны стагоддзямі жылі ў адной рэальнасці.

Васіль Быкаў, якога ў свеце глыбока паважаюць як узор высокай гуманнасці і маралі, ведаў габрэяў сваёй краіны з нараджэння. Ён жыў разам, вучыўся, дзяліў хлеб, радасці і беды. У яго творах сустракаецца столькі ж габрэйскіх імён, як і ў Салжаніцына. У Быкава, праўда, няма характэрнай для апошняга, асабліва ў яго эпапеі «Дзвесце гадоў разам», прадузятай тыпалагізацыі: ён з прыроджанай уважлівасцю не толькі таленавітага псіхолага, а патрыёта сваёй зямлі ніколі не ставіўся да беларускіх габрэяў як да чужаземцаў. Быкаў ведаў габрэяў сваёй краіны так, як сваю сям'ю: хадзіў у школу ў мястэчка, дзе 60 % вучняў складалі габрэйскія дзеці, пасля разам з імі, ужо дарослымі, ваяваў. Першым творам, які бацька даў прачытаць Быкаву па-беларуску, было апавяданне М. Лынькова «Гой». Салжаніцын, нягледзячы на яўнае імкненне да супрацьлеглага, падышоў да пытання аб расійскіх габрэях збольшага прадузята. Быкаў жа неаднаразова сцвярджаў, што калі б не нацыяналізм і расізм царызму, савецкай пары і гітлерызму, Беларусь працягвала б гуманістычную пазіцыю сваёй славутай культурнай мінуўшчыны што да нацыянальных меншасцяў.

З аднаго боку, Салжаніцын прыпісвае расійскую імперскую фанабэрыстасць і нацыяналізм толькі бальшавікам, тады як яго асновы безумоўна належаць царызму. З другога боку, Салжаніцын любіць паўтараць, што любіць беларусаў, але любоў гэтая на самай справе зводзіцца да запэўніванняў, што беларусы – гэта малодшыя браты расійцаў. Калі так нехта гаворыць, беларусы не павінны мець ніякіх ілюзій наконт таго, што ён наш сябар. Мы супраць таго, каб нашу гісторыю

перакладвалі на імперскі лад.

Нядаўна ў Канадзе была дзяўчынка з Беслана, якую спыталіся, ці мае якое пасланне да канадыйцаў. Яна казала: «Ніколі не дзяліце людзей на добрых і злых, старайцеся любіць, паважаць, а галоўнае – быць талерантнымі да ўсіх». Надзея 14-гадовай дзяўчынкі была ў тым, што нягледзячы на пачатак прыказкі, якой карыстаецца Салжаніцын, «Не нами неправда сталась, не нами и кончится» людзі змогуць пакласці канец няпраўдзе. І не будзе нічога дзіўнага, калі Расіі некалі давядзецца пераняць адпаведны досвед у Беларусі, у якой не 200, а больш за 700 гадоў пражывання разам з габрэямі.
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

рэцэнзіі

[image]-[image]2005

"да Зьмяны"

аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • **рэцэнзіі**

[image] [image] [image]

Уладзіслаў Белавусаў Старыя і новыя польскія песьні

УЛАДЗІСЛАЎ БЕЛАВУСАЎ

выпускнік факультэту міжнародных дачыненьняў БДУ, арганізатар інтэрнэт рэсурсу praunik.org. Летась у «ARCHE» была надрукаваная яго рэцэнзія «Троху пра зьмены ў Лукалэндзе».

Europa Wschodnia – dekada transformacji. Białoruś/Pod red. Bernarda J. Albina i Walentego Baluka. – Wrocław, 2004. – 411 s.

Зборнік выйшаў у сэрыі *«Ўсходняя Эўропа. Дзесяцігодзьдзе трансфармацыі»*, якая фінансуецца з сродкаў Інстытуту міжнародных дачыненьняў факультэту грамадзкіх навук Уроцлаўскага ўнівэрсытэту. Папярэднія зборнікі былі прысьвечаныя адпаведна Расеі й Украіне. Сёньня можна казаць, што ўва Ўроцлаве склаўся асяродак дасьледнікаў усходне-эўрапейскай праблематыкі. Яго душой і кіраўніком можна ўважаць дэкана факультэту грамадзкіх навук Бэрнарда Альбіна. Разам з Валентыем Балюкам – ад’юнктам Інстытуту міжнародных дасьледаваньняў Уроцлаўскага ўнівэрсытэту – яны зрэдагавалі зборнік, прысьвечаны Беларусі.

Асяродак займаецца дасьледаваньнем палітычных праблемаў і міжнародных стасункаў у краінах Усходняй Эўропы з акцэнтам на польскай замежнай палітыцы. Паказальна, што ён супрацоўнічае зь Львоўскім унівэрсытэтам імя Івана Франка ды з унівэрсытэтамі ў Кіеве ды Санкт-Пецярбурзе, але ня мае афіцыйных кантактаў зь беларускімі вну (прынамсі, кідаецца

адсутнасьць гэтага «Ўсходнеэўрапейскага зьвяна» ў апісаньні кантактаў аддзелу на сайце Ўроцлаўскага ўнівэрсытэту).

Распачынае зборнік прадмова рэдактараў, прысьвечаная структуры выданьня, сьцісламу гістарычнаму экскурсу ў праблематыку паўставаньня беларускай дзяржаўнасьці, дзе паміж іншага адзначаецца, што з улікам геапалітычнага знаходжаньня Беларусі наша краіна мае стратэгічнае значэньне для палітычных і гаспадарчых стасункаў на старым кантынэнце. А таму хада працэсаў дэмакратызацыі й трансфармацыі ў Беларусі надзвычай істотная для стабілізацыі ў Цэнтральна-Ўсходняй Эўропе.

Гаворачы пра фэномэн беларускай ідэнтычнасьці, аўтары мяркуюць, што, не зважаючы на тое, што бальшыня беларускіх элітаў была засмучаная фактам набыцьця незалежнасьці ў апошняй дэкадзе ХХ ст. ды пэўныя аб'ектыўныя і суб'ектыўныя чыньнікі, якія ўскладняюць заканчэньне працэсу кшталтаваньня беларускай нацыянальнай сьвядомасьці, «беларусам нельга адмовіць у праве быць нацыяй». Пытаньне, ці ёсьць беларусы нацыяй, на розных этапах гісторыі мела розныя адказы – працэс фармаваньня беларускай нацыянальнай сьвядомасьці ў ХХ ст. ішоў сынусаідальна, і беларусы станавіліся нацыяй патроху.

Структура зборніка падаецца даволі дзіўнай – яна складаецца з трох нібы адрозных частак: дасьледаваньні й артыкулы, матэрыялы ды дакумэнты, але другая частка (матэрыялы) зьмяшчае ўсяго адзін артыкул (дарэчы, адзіны няпольскамоўны) – кіраўніка Фонду імя Лява Сапегі Аляксандра Жучкова. Гэты расейскамоўны тэкст, па вялікім рахунку, нічым адметным не вылучаецца і ўяўляе кампіляцыю зь некалькіх беларускіх даведнікаў, прысьвечаных грамадзкім аб'яднаньням, у тым ліку палітычным партыям ды прафзьвязам. Цяжка зразумець, чым кіраваліся ўкладальнікі, вылучаючы гэта разьдзел ды прэзэнтуючы там артыкул статыстычна-даведкавага характару. Незразумела таксама, чаму ў якасьці адзінага «беларускага» тэксту падаецца расейскамоўны артыкул. Трэцяя частка складаецца з тэкстаў чатырох дакумэнтаў: «Новая ідэалягічная палітыка Беларусі» –

фрагмэнты выступу А. Лукашэнкі 27 сакавіка 2003 г.; Закон Рэспублікі Беларусі «Аб палітычных партыях» ад 5 кастрычніка 2004 г., Канцэпцыя нацыянальнай бясьпекі Рэспублікі Беларусі ад 17 ліпеня 2001 г., Вайсковая дактрына Рэспублікі Беларусі ад 2 студзеня 2002 г.

Найцікавейшы акурат першы найбуйнейшы разьдзел, які прадстаўлены дзесяцьма артыкуламі, аўтарства якіх збольшага належыць уроцлаўскім навукоўцам. Асобна аналізуюцца палітычна-адміністрацыйны лад Рэспублікі Беларусі, асабістыя й палітычныя правы й свабоды чалавека ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі; станаўленьне партыйнай сыстэмы; эканамічныя трансфармацыя; сацыяльная палітыка; эканамічная каапэрацыя Беларусі з Расеяй ды іншымі краінамі СНД; палітыка ў дачыненьні да меншасьцяў, польская нацыянальная мяншыня на фоне структуры й праўнага статусу нацыянальных мяншыняў Беларусі; мэдыйная палітыка; замежная палітыка й палітыка бясьпекі; абаронная палітыка. Усе зьвесткі прыводзяцца зь пярэдадня апошняга рэфэрэндуму, што відаць з зацема Валентыя Балюка ў артыкуле, прысьвечаным аналізу партыйнай сыстэмы: «…перад тым, як аддаць зборнік да друку, мы даведаліся пра афіцыйныя вынікі выбараў і рэфэрэндуму ў Беларусі (17.10.2004)» (прыводзяцца афіцыйныя лічбы вынікаў і дадзеныя Інстутыту Гелапа).

Варта спыніцца на аўтару двух артыкулаў («Палітычна-адміністрацыйны лад Рэспублікі Беларусі – нарыс праблематыкі» ды «Польская нацыянальная мяншыня ў Рэспубліцы Беларусі на фоне структуры й праўнага статусу нацыянальных мяншыняў у Беларусі») Зьдзіслава Віньніцкага. Гэтая асоба здаўна займаецца вывучэньнем праблематыкі польска-беларускіх стасункаў ды палітычнай беларусістыкі, а ў 2003 г. выпусьціла цэлую кнігу, прысьвечаную Беларусі[1]. Па шчырасьці, артыкулы гэтыя выклікаюць дыямэтральна розныя ўражаньні.

Што да першага зь іх, то тут нельга ні адзначыць сыстэмнасьці дэталёвага падыходу аўтара, які фактычна прэзэнтаваў польскаму чытачу кароткі курс з канстытуцыйнага права Беларусі – сьціслы, але грунтоўны й пасьлядоўны. (Дарэчы, і

[1] Winnicki Z. Współczesna Białoruś.

аўтар чытае курс міжнароднага публічнага права ў Ўроцлаўскім універсытэце.) Аўтар сьцьвярджае, што сучасныя беларускі лад можна акрэсьліць паняцьцем «рэспубліка аўтарытэту»[2] – канстытуцыйная сыстэма была зацьверджаная на рэфэрэндуме бальшынёй грамадзянаў. На думку Віньніцкага, гэта было немагчыма без шматвекавой усходнеславянскай прызвычаенасьці «паважаць» моцную выканаўчую ўладу. Гэтая прызвычаенасьць паходзіць ад бізантыйска-расейскай традыцыі, якая ў савецкія часы выражалася ў наўсюднай павазе да кожнага новаабранага генсека камуністычнай партыі. Выбар на карысьць якашэнкаўскай канстытуцыі апасродкавана ўвасобіў тую самую традыцыю ў цалкам адрознай палітычна-эканамічнай сытуацыі. Бальшыня грамадзянаў сёньняшняе беларускае дзяржавы вырасла ў савецкай сыстэме з усімі яе ідэйнымі ўстаноўкамі і ідэйна і псыхалягічна надалей жыве ў СССР. Дактрына гэтага грамадзтва фармулюецца праз ацэнку зьяваў – як гістарычных, так і сучасных – скрозь прызму савецкіх ідэалягічных паняткаў і «каштоўнасьцяў», прышчэпленых гэтаму грамадзтву ў школе, на працы, у войску, сацыяльных установах альбо праз прапагандысцкі апарат, да якога акрамя кінэматографу належала прэса й літаратура. Гэта мае свае наступствы й надалей (год 2004).

historiografia Białorusi (pierwsza połowa XX wieku) (1989). Warszawa – Wrocław, 2003.

2 Аўтар выкарыстоўвае тэрміналёгію Тэрэзы Яньшэвіч-Кавалеўскай, якая ў сваіх працах ужывае паняцьце «ўлада аўтарытэту» ў адрозьненьне ад «аўтарытарных уладаў».

Няўдалыя спробы інтэграцыі з Расеяй пры адначасовым утрыманьні ў палітычнай сьвядомасьці сягоньняшніх беларусаў факту існаваньня незалежнае дзяржавы – Рэспублікі Беларусі – спрыяюць яе павольнай грамадзянскай аб'ектывацыі і ў неакрэсьленай будучыні могуць прывесьці да зрухаў у кірунку дэмакратызацыі. Але пытаньне, ці ня пойдзе гэты працэс у кірунку, вядомым з практыкі дэмакратычнага Захаду, альбо згодна з блізкай і лепей знанай у Беларусі расейскай мадэллю, аўтар пакідае адкрытым. Адметна, што дасьледнік паўсюдна выкарыстоўвае назвы дзяржаўнага апарату ды канстытуцыйныя тэрміны Беларусі ў правільным беларускім лацінкавым напісаньні.

На жаль, другі артыкул гэткіх дадатных эмоцыяў не пакідае. Яму ўласьцівыя перабольшаныя ацэнкі польскае прысутнасьці ў Беларусі, а таксама пэўныя пастуляты ды ідэалягемы, да

крытыкі якіх мы яшчэ будзем вымушаныя вярнуцца пазьней пры аглядзе іншага тэксту, прысьвечанага той жа праблематыцы. У якасьці *le sentiment du déja vue* прывядзём толькі наступнае выказваньне:

На сёньняшні дзень у блізу дзесяцімільённай беларускай дзяржаве, Рэспубліцы Беларусі, акрамя беларусаў, расейцаў, украінцаў ды прадстаўнікоў мноства іншых народаў ды народнасьцяў жыве блізу 1 мільёна сьвядомых палякаў, а рыма-каталікоў, людзей, як там кажуць, польскай веры – амаль два мільёны. Палякі па сваёй колькасьці афіцыйна складаюць трэцюю нацыянальную групу, de facto будучы другой аўтахтоннай супольнасьцю – у адрозьненьне ад фармальна (паводле афіцыйных перапісаў) большай групы расейцаў. Яны жывуць на сваёй радзіме-бацькаўшчыне. Пра сёньняшнюю Польшчу кажуць – Маці.

(Нагадаем, што паводле апошняга перапісу ў Беларусі не набралася й паўмільёна палякаў.)

Спэцыялістка з аховы правоў чалавека Ларыса Лешчанка прэзэнтуе даволі цікавы аналіз асабістых і палітычных правоў і свабодаў чалавека ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусі. Яго выснова ў тым, што Канстытуцыя Рэспублікі Беларусі зьяўляецца адно дэклярацыяй, а канстытуцыйныя гарантыі захаваньня асабістых і палітычных правоў ды свабодаў асобы, замацаваныя ў ёй, уяўляюць зь сябе ў вялікай ступені адно маніфэсты.

Асаблівую пікантнасьць выданьню надае тэкст чалавека, які на той час шчэ быў усеагульна прызнаным старшынём Саюзу палякаў Беларусі (сёньня пра яго «неафіцыйнае старшынства» польская прэса адгукаецца фразамі кшталту *«…Tadeusz Kruczkowski jest bardzo zajęty – wspólnie z KGB przygotowuje kolejny zjazd Związku Polaków na Białorusi»*[3]).

У сёньняшніх варунках, калі прапаганда празь дзяржаўныя мэдыі (перадусім тэлевізію) навязвае тэзу, нібы польскасьць мяншыня ў Беларусі цалкам абароненая ды жыве ў міры й

[3] Jan Maksymiuk. Cierpki

шчасьці, а памагатыя Кручкоўскага па СПБ расплываюцца ў інтэрвію пра прыўкрасныя ўмовы для разьвіцьця пальшчызны, створаныя мудрым беларускім кіраўніцтвам, – асабліва дасьціпна выглядаюць выказаныя Кручкоўскім думкі, якія мы й дазволім сабе працытаваць у перакладзе:

Культурна-асьветніцкая дзейнасьць СПБ, якая да 1998 г. хоць часткова фінансавалася ўладамі, у апошнія гады зусім фінансава не падтрымліваецца. Дзяржава ня толькі фінансава не дапамагае ўтрымліваць Дамы польскай культуры, але й вымагае аплаты камунальных паслуг па тарыфах, вышэйшых, чымся для дзяржаўных дамоў культуры. Газэта СПБ «Głos z-nad Niemna» ў 2001 г. у якасьці падтрымкі ад беларускай дзяржавы атрымала толькі тону паперы. СПБ атрымліваў адмову на будоўлю (за ўласны кошт) польскамоўнай школы ў Воранаўскім раёне, дзе нават афіцыйна палякі складаюць 83 % усяго насельніцтва. Цяжкая сытуацыя з падручнікамі для польскіх школаў: для старэйшых клясаў іх няма й не прадбачыцца ў бліжэйшым часе... А вяршыняй недарэчнасьці й выявай стаўленьня ўладаў была спроба абкласьці ў 2002 г. усю гуманітарную дапамогу, якую атрымлівае СПБ, падаткам у памеры 20 % з штрафнымі адсоткамі (310 %), хаця раней гэткай нормы не існавала.

…Ані грамадзкія арганізацыі, ані палітычныя партыі ня могуць прадстаўляць інтарэсы сваіх нацыянальных мяншыняў. Статуты грамадзкіх арганізацыяў павінны дэкляраваць разьвіцьцё айчыннай культуры, асьветы, народных традыцыяў.

…палякаў трымаюць у пэўнай дыстанцыі ад найвышэйшых пасадаў у грамадзка-палітычным жыцьці краіны. …Польскую мову ў розных формах вывучаюць сёньня 21 тыс. дзяцей… але для 400 тыс. палякаў гэта страшэнна мала. Для параўнаньня ў суседняй Летуве, дзе меней палякаў, дзейнічае 121 польская школа.

Тэкст гэты вылучаецца (1) *падменай паняткаў ды наўмыснымі лягічнымі абмыламі:*

Каталіцкі касьцёл, які заўжды быў тут апірышчам пальшчызны, служачы сваім вернікам Божым словам на польскай мове, бо гэтага ад яго чакалі, цяпер часткова пераходзіць на беларускую мову, якую бальшыня палякаў лепей разумее, чым польскую. Але ў штодзённым жыцьці, а не на набажэнстве ў касьцёле! Гэтая зьмена з часам прывядзе да сытуацыі, калі Касьцёл папросту страціць сваю традыцыйную базу – польскіх вернікаў. Беларусізацыя каталіцкага касьцёлу (падобная спроба была зьдзейсьненая царскімі ўладамі пасьля студзеньскага паўстаньня) з часам спросьціць русіфікацыю й палякаў, і беларусаў. А наагул, калі ўжо вядзецца пра мову, зразумелую для катэхізаваных дзяцей, то гэта расейская, а не беларуская. Сёньня беларускія дзеячы, якія націскаюць на касьцёл, каб ён ішоў у кірунку беларусізацыі (цалкам пакідаючы ў спакоі праваслаўную царкву, у якой пануе расейская мова), забываюцца на тое, што гэты касьцёл ды ягоныя вернікі палякі заўжды былі для іх абаронай ад русіфікацыі. А праваслаўная царква была й ёсьць у Беларусі аплотам палітыкі русіфікацыі.

– ад Касьцёла чакалі польскай мовы → а хто? Палякі? Беларусы? Ці гэтае сьцьверджаньне не патрабуе доказу, бо настолькі відавочнае, што сам пан Бог прадвызначыў касьцёлу быць польскім?

↓

– у штодзённым жыцьці бальшыня палякаў разумее лепш беларускую, чым польскую?

↓

– чаму, калі яны палякі?

↓

– чаму тады яны ўвесь час чакаюць, каб касьцёл быў апірышчам пальшчызны?

– спробы русіфікацыю касьцёлу па студзеньскім паўстаньні = беларусізацыя??? (Паралягізм ці банальная падмена паняткаў?)

– беларусізацыя = шлях да русіфікацыі??? (На выкшталцоны сафізм таксама ня цягне.)

– дзеці лепей разумеюць расейскую → а (1) русіфікацыя лепшая (натуральнейшая) за беларусізацыю → а (2) сп. Кручкоўскі супраць русіфікацыі? → а як ён сумяшчае дзьве гэтыя тэзы? (Ці правіла ўвядзеньня кан'юнкцыі паміж двума праўдзівымі выказваньнямі ў выпадку сп. Кручкоўскага не працуе?)

– гэты касьцёл ды ягоныя вернікі палякі заўжды былі для іх абаронай ад русіфікацыі > у які спосаб? > палянізацыя = ратаваньне ад русіфікацыі?

(2) *стварэньнем вобразу ворага зь незалежнай беларускай гістарыяграфіі ды пудзіла з нацыянальна арыентаванай часткі апазыцыі:*

…сярод беларускіх гісторыкаў нарастае іншая тэндэнцыя: спроба прадстаўленьня ВКЛ як беларускай дзяржавы, а палякаў на гэтых абшарах як спалянізаваных беларусаў… [Беларускія гісторыкі] кажуць, што [«беларускія палякі»] збольшага – беларускія каталікі альбо акаталічаныя беларусы… Адным словам, старыя (яшчэ царскія!) мэтады і аргумэнты. Паўтараецца сытуацыя, якая была яшчэ ў XIX ст., калі беларушчына расла коштам палякаў на абшарах сучаснае беларускае дзяржавы… Дайшло да таго, што Беларусь пад націскам БНФ падчас візыту міністра замежных справаў РП Скубішэўскага адмовілася ад падпісаньня міжнароднае дамовы на падставе таго, што паводле тагачаснага міністра замежных справаў Беларусі Краўчанкі пытаньне мяжы не было ўрэгулявана (справа прэтэнзіі на Беласточчыну)… Дзеячы БНФ выказвалі тэрытарыяльныя прэтэнзіі амаль да ўсіх суседзяў: да Літвы – Віленшчына, да Расеі – Смаленская вобласьць, да Польшчы – Падляшша. Акурат таму на пачатку 1990-х гг. былі затарможаныя спробы СПБ разьвіваць польскія школы. Інакш і быць не магло. А рашэньне аб іх будове было прынятае ўжо ў

сярэдзіне 1990-х дзякуючы ахвярным высілкам палякаў – бацькоў, дзеячаў СПБ у Горадні й Ваўкавыску, а таксама дамоваў на ўзроўні прэм'ераў Беларусі –Польшчы (на той час Чыгіра і Цімашэвіча). Пры агульнай стабілізацыі ў міжнародных стасунках як пэўныя маргіналіі грамадзкага жыцьця існуюць, аднак, экстрэмісцкія групы, варожа настроеныя ў дачыненьні да іншых нацыянальнасьцяў: беларускі «Зубр», філія расейскага РНЕ; здараюцца выпадкі ўгнюшаньня польскіх могілак (Ваўкавыск, Горадня), антыпольскіх надпісаў на сядзібе СПБ у Горадні… таксама рэгіструюцца шматлікія выпадкі вандалізму на жыдоўскіх могілках у Барысаве, Гомелі, Віцебску, Менску, Рэчыцы ды інш.

От жа, у мысьленьні сп. Кручкоўскага «Зубр» ды РНЕ – гэта блізкія па сутнасьці фашыстоўскія арганізацыі. Ці Лукашэнка яго прывучыў так думаць?

(3) навязваньнем міту пра абсалютную тоеснасьць пальшчызны й каталіцтва ў Беларусі як сродак дыскрэдытацыі працэсаў беларусізацыі касьцёлу:

Вера падзяляла два сьветы: заходні (каталіцкі) ды ўсходні (бізантыйскі). Такі ўжо быў лёс альбо капрыз гісторыі, што продкі сучасных беларусаў прынялі праваслаўе й апынуліся ў іншай цывілізацыйнай сфэры. Гэты падзел прайшоў цераз абшар сёньняшнай Беларусі й захаваўся ў мэнтальнасьці народу, які падзяляе веру на польскую (каталіцкую) і рускую (праваслаўную).

У 1991 г. лідэр БНФ З. Пазьняк напісаў ліст Папу з просьбай аб накіраваньні ў Беларусь ксяндзоў зь любых іншых краінаў за выняткам Польшчы. У тым самым годзе адбыўся ўстаноўчы зьезд Беларускай каталіцкай грамады, галоўнай мэтай якой сталася беларусізацыя касьцёлу. Адначасова посткамуністычныя ўлады, па сутнасьці сваёй атэісты і, як правіла, непрыхільныя да адраджэньня беларускасьці, публічна падтрымлівалі ўвядзеньне беларускае мовы ў каталіцкім касьцёле, бо бачылі ў гэтым «меншае ліха» ў параўнаньні з пашырэньнем пальшчызны.

…праявамі гэтага канфлікту стаўся байкот некаторых ксяндзоў вернікамі ды націск цераз Саюз палякаў Беларусі на некаторых польскіх палітыкаў і на Польскі япіскапат з мэтай ажыццяўляць адбор прысыланых у Беларусь сьвятароў з гледзішча іхнай адданасьці патрэбам польскага народу. У 1998 г.е СПБ высунуў заклік да каталіцкага касьцёлу ў Беларусі, каб той «застаўся польскім».

Нядаўна кіраўнік Гарадзенскага абласнога аддзелу камітэту па справах рэлігіі й нацыянальнасьцяў Ігар Папоў заявіў, што перавага польскай мовы ў касьцёлах Гарадзеншчыны зьяўляецца неабгрунтаванай. Дзяржаўную мову пачынаюць ужываць у Каталіцкай духоўнай сэмінарыі ў Горадні – а гэта ўжо рэч недаравальная…

І замест эпілёгу, які цудоўна характарызуе агульны стыль, скіраванасьць тэксту дый, з улікам апошніх падзеяў, партрэт аўтара:

…палітыка беларускіх уладаў дагэтуль ніколі напоўніцу не адпавядала эўрапейскім стандартам у дачыненьні да нацыянальных мяншыняў, хаця на пачатку 1990-х гг. былі зроблены вялізарныя крокі ў параўнаньні з савецкімі рэаліямі. І такіх праяваў стаўленьня афіцыйных уладаў да палякаў можна пералічыць вялікую колькасьць: афіцыйнае сьвяткаваньне 17 верасьня 1939 г., фальшаваньні падчас перапісу насельніцтва ў 1999 г.; адмова будоўлі школаў для нацыянальных мяншыняў; абмежаваньне магчывасьці атрыманьня гуманітарнай дапамогі; адсутнасьць фінансавай падтрымкі арганізацыяў нацыянальных мяншыняў з боку ўлады і г. д. Апрача гэтага варта дадаць нацыяналістычную пазыцыю часткі беларускай апазыцыі.

Галоўнае – не забыцца зганіць нацыяналістычную пазыцыю часткі апазыцыі!

Агульнае ўражаньне ад зборніка дваістае. Так, ён асьвятляе праблемы беларускага жыцьця. Зь іншага боку, нават калі заплюшчыць вочы на адыёзныя артыкулы, прысьвечаныя

«палітыцы ў дачыненьні нацыянальных мяншыняў» ды адсутнасьці добрага аналізу сучаснай ідэнтычнасьці беларусаў, выданьне праігнаравала цэлыя аспэкты сучаснай беларускай палітычнай рэальнасьці – напрыклад, палітычную міталёгію рэжыму Лукашэнкі. У ім таксама адсутнічаюць прагнозы разьвіцьця беларускае сытуацыі. Апошняя не пазбаўлена дынамікі, і таму ўжо сёлета выданьне выглядае састарэлым. Для беларускага чытача яно наагул не ўяўляе ніякага інтарэсу. Пераважная бальшыня артыкулаў – дабротная кампіляцыя вядомых фактаў ды лічбаў. Але толькі ў самой Беларусі за апошнія гады выйшла некалькі падобных кніжак, у тым ліку й у перакладзе на ангельскую мову.

Хаця хто ведае – мо інтарэс ды сур'ёзны падыход да факталягічнага матэрыялу з боку «ўроцлаўскага кола» і створыць некалі палітычную беларусістыку ў Польшчы.
[image]
[image]

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/25
[image]

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 6 (40) - 2005**

[image]

[image]

Пачатак Цалкам

[image]

рэцэнзіі

[image]-[image]2005

аналітыка • крытыка • палеміка • гісторыя • літаратура • **рэцэнзіі**

[image] [image] [image]

Павал Абрамовіч Колер падарожжа

ПАВАЛ АБРАМОВІЧ крытык літаратуры. Выкладае ў БДУ. Яго апошняя публікацыя ў «ARCHE» мела назву «Быць жывым і бачыць сонца».

Глобус Адам. *Сшыткі*. – Менск: Харвест, 2003.

Колер Лёндану – чырвоны.

Пітэр Акройд. «Лёндан. Біяграфія»

У кожнай краіны – свой колер. У кожнага падарожжа – свая фарба. Гэта пацьвердзіць вандроўнік, які ўмее назіраць. Шкада толькі, што зь цягам часу фарбы, у тым ліку фарбы ўспамінаў аб нашых падарожжах, блякнуць. «Краскі, сьвежыя калісьці...» – пісаў паэт. Каб гэтага ніколі ня здарылася, трэба ўвесь час праводзіць у вандроўках і заўсёды занатоўваць свае ўражаньні ад чужых краінаў і краявідаў, як робіць гэта пісьменьнік і мастак Адам Глёбус. Ягоную кнігу падарожнай прозы «Сшыткі» будзе цікава прачытаць кожнаму, хто жадае навучыцца бачыць колер падарожжа, атрымліваць асалоду ад вандроўкі.

Калі мэханічна падлічыць у 480-старонкавых «Сшытках» словы, якія азначаюць той ці іншы колер, атрымаецца, што найбольш сустракаюцца: «чорны» (99 разоў), «чырвоны» (95), «белы» (84), «ружовы» (51), «залаты» (50), «сіні» (48), «зялёны» (45), «жоўты» (42), «блакітны» (33), «шары» (29). Іншыя словы-колеры

сустракацца радзей, так, «памаранчавы» ўжыты 16 разоў, «фіялетавы» – 11, руды – 8. Тут трэба зрабіць важнае ўдакладненьне: для мастака (і пісьменьніка таксама) не бывае чорнага альбо чырвонага, сіняга ці зялёнага колераў. Ён бачыць дзясяткі іх адценьняў[1]. Таму Глёбус звычайна кажа ня «жоўты», а «пяшчотна-жоўты», ці «жоўта-лякавы», ці «ліхтарна-жоўты» альбо «жоўта-блакітны», не «ружовы», а «ружова-бурштынавы», ня «белы», а «цукрова-белы» ці «імгліста-белы», «крыштальна-белы», не «зялёны», а «хімічна-зялёны», не «чырвоны», а «трывожна-чырвоны», ня «чорны», а «вугальна-чорны», не «памаранчавы», а «лімонна-памаранчавы» ці «шаўкавіста-памаранчавы» альбо «шурпата-памаранчавы».

Палітра Глёбуса надзвычай багатая – не ў апошнюю чаргу дзякучы таму, што ён наведваў экзатычныя ўсходнія краіны. У «Сшытках» згадваецца брунатны колер, аліўкавы, смарагдавы, папяловы, іржавы, руды, лілёвы, маркоўны, малінавы, салатны, колер марской хвалі і колер конскай мачы, бурштынавы і цёмна-вішнёвы, вогненна-васковы і бірузовы. Усіх не пералічыш. Да таго ж пісьменьнік, апісваючы ў часе падарожжа колер чагосьці, часта ўжывае мэтафары: «зялёнае, што жабіна ікра», «чырвоны, як горкі перац», «ружовы, як парасячы лыч» альбо «ружовы, як мяса кансэрваванага кальмара».

КРАІНА. ГОРАД. КРАЯВІДЫ

«Сшыткі» складаюцца з 40 нарысаў. Аўтар падарожнічаў у Літву, Латвію, Украіну, Расею, Абхазію, Польшчу, Чэхію, Аўстрыю, Францыю, Італію, Гішпанію, Англію, Эгіпет, Індыю, Тайлянд. У 4 нарысах аповед вядзецца пра Беларусь, а дакладней пра Менск, Койданава, Ракаў.

Глёбус пабачыў краіны і гарады, колеры і фарбы якіх вельмі адрозніваюцца, утвараюць дзіўны кантраст. Так, пра Індыю ён кажа, што гэта «краіна чырвонага пылу», «край зялёнай вады, глухіх сьценаў і шэрых людзей»; Рым падарожнік называе «залатым горадам», Бадэн – «жоўтым»; колеры Каіру «вытанчаныя: срэбныя, залацістыя, блакітныя»; самая ж распаўсюджаная афарбоўка на паўвысьпе Крым, на ягонае перакананьне, – «колер марской хвалі з малаком».

[1] Паводле Ван Гога, калі ён пісаў «Начную кавярню», то «*…справабаў, сутыкнуўшы кантрасты пяшчотна-ружовага з крывава-чырвоным і вінна-чырвоным, пяшчотна-*

Вызначыўшы дамінуючы колер краіны, гораду пры *далёкага* назіраньняў, сваёй інтуіцыі мастака, Глёбус лепш сваранізае іх адметнасьць, прыгажосьць, іх патаемнае жыцьцё.

З гатэльнай высоткі ранішні, зацягнуты смугою шэры горад... Срэбна-шэры, зеленавата-шэры, маціцова-шэры, амаль белы, бясконца-шэры. Яны крохкія, парыскія краявіды, алюмінава-срэбна-блакітныя, нібыта зробленыя з лускі рыбы, яны поўныя паветра, вільгаці і суму.

(«Празрысты Парыж»)

зялёнага і варыцца з жоўта-зялёным і жорсткім сіне-зялёным, аднавіць атмасфэру пекла, колер бледнай серы, перадаць дэманічную моц шынка-пасткі».

У назвах нарысаў Глёбус знарок падкрэсьлівае індывідуальнасьць свайго досьведу пра тую ці іншую мясьціну: «Мой Рым», «Мая Вільня», «Свой Менск», «Сочы – горад падлеткаў», «Штурм Масквы». Сапраўды, кожнае падарожжа непаўторнае, кожны вандроўнік наноў адкрывае Рым ці Ракаў, «штурмуе» Барсэлёну ці Маскву. Да таго ж краіна, горад могуць, напрыклад, зьмяняцца (у тым ліку на досьвітку і золку), надзейна хаваць частку сябе, сваіх колераў ад вачэй надакучлівых падарожнікаў. І калі ваш сябра (альбо падарожнік, які напісаў кнігу) будзе апавядаць вам пра сваю вандроўку туды, дзе вы ўжо пабывалі, вы зможаце пераканацца, што вашыя зь ім уражаньні адрозьніваюцца, але ў нечым і супадаюць. Так і ў выпадку з аўтарам «Сшыткаў»: калі вы будзеце чытаць ягоныя «Каталёнскія ўражаньні», вы, хутэй, пагодзіцеся з Глёбусам у тым, што «Каталёнія, як мазаіка, выкладзена зь белых рэчаў». А патрапіўшы ў Дэлі, пабачыце, як і ён, «воблака фіялетавага смогу». Іншая рэч – ці здольныя вы бачыць у часе падарожжа ўсё багацьце спэктру, настолькі ж добра адрозьніваць дробныя адценьні і паўтоны, уважліва сачыць за зьменаю колераў, вызначаць іх *дарэчнасьць, гарманічнасьць*. Глёбус гэтай здольнасьцю валодае: «Вечаровае неба над залатымі слупамі каралеўскага палацу можа быць і чорнае, і белае, але сапраўдны ягоны колер – пурпуровы».

Ці вось такое назіраньне:

...калі зірнуць на гару Гедыміна, дык бачыцца незгарманізаванасьць літоўскага сьцяга – жоўты-зялёны-чырвоны. Вось у этыёпаў і тое больш правільна зроблена: зялёны-жоўты-чырвоны, як сьвятлафор перакулены. Затое, толькі ўяві, як бы цудоўна глядзеўся на вежы Гедыміна беларускі бел-чырвона-белы штандар!

(«Нататкі пра Вільню»)

Дарэчы, ланцужок «краіна – дзяржаўны сьцяг – колер» Глёбус куе на працягу ўсіх «Сшыткаў» і суправаджае яго цікавымі, слушнымі камэнтарамі. Так, паласаты памаранчава-чырвоны сьцяг Каталёніі ён трапна называе «сьпякотным», а сфатаграфаваўшы шыльду, на якой быў запэцканы ў чорнае гішпанскі сьцяг, робіць сумную філязофскую заўвагу: «Палітычная палітра ў майстроў графіці невялікая, але кантрасная, такія кантрасныя супольнасьці могуць пазабіваць адна адну».

ЖЫХАРЫ

Ня менш за гарады Глёбуса-падарожніка цікавяць іх насельнікі. Погляд ягоны фіксуе колеры і фарбы, якія абралі для сябе жыхары пэўнай краіны і якія дапамагаюць яму зазірнуць у душы і сэрцы апошніх: «У жылах каталёнцаў замест крыві цячэ ўрачыстая жалоба. Нават на карнавалах іх улюбёны колер – чорны».

Любы вандроўнік заўсёды адчувае мяжу паміж сабою і месьцічам і спрабуе зразумець, наколькі тая мяжа непераадольная. Колер дапамагае вызначыць гэта. У нарысе «Паветра Літвы» Глёбус адзначае:

Зь першымі кроплямі летняга дажджу Вільня робіцца вельмі каляровай – разгортваюцца і ўздымаюцца парасоны самай неверагоднай афарбоўкі: празрыста-блакітныя, сьпела-чырвоныя, шчыльна-жоўтыя. (...) Яе вуліцы, вулкі, двары, дворыкі запоўнены памаранчыкавымі і лімоннымі дзецьмі, сінімі

спадніцамі да пятаў, пятамі без шкарпэтак.

А вось якой бачыцца яму ў «Менскіх падарожжах» сталіца Беларусі:

Менчукі любяць, а можа, і ня любяць, але апранаюць шэрае і чорнае. (...) А калі ўбачыш на менскім праспэкце постаць у ліхтарна-жоўтай пуховай куртцы, пачынаеш сумнявацца: ці мянчук гэта ідзе? Менск, безумоўна, – горад чорна-шэрых апранах.

Апошні нарыс напісаны ў 1992 г. З таго часу, як наша краіна набыла незалежнасьць, беларусы пакутліва, але пазбаўляюцца ад савецкай спадчыны – чорна-шэрай гамы ў адзеньні, нягледзячы на супраціў нацыянальнай лёгкай прамысловасьці. Аднак ці хутка пабачым мы – як аўтар «Сшыткаў» у Лёндане – на вуліцах нашых гарадоў шасьцідзесяцігадовых бабуль, якія адзяваюць «выдзерывока-зялёны роварны шалом, каб пракаціцца на ровары па цэнтральнай гарадзкой вуліцы»? Відаць, не. Багацьце колераў у адзежы сьведчыць пра ступень унутранай свабоды асобы, яе раскаванасьць, адкрытасьць. Беларусы гэтым пахваліцца ня могуць. «Немазьлівы» – гэта наш колер.

Але ж ёсьць яшчэ, так бы мовіць, прыродныя колеры. Даўшы партрэт міс Барсэлёны («У яе чорныя валасы, яна – каталёнка, і ў яе далікатна-смуглявая, залацістая, залатая скура»), Глёбус робіць выбар на карысьць беларусак: «А я займуся нашымі, белымі, блакітнавокімі, ружавашчокімі белабеларускамі». У гэтым сэнсе Глёбус-падарожнік – сапраўдны патрыёт[2].

РЭЧЫ

Падарожніка з усіх бакоў акаляюць рэчы. Ён разглядае іх, трымае ў руках, фатаграфуе, здымае на відэакамэру, набывае ў падарунак для сваякоў і сяброў. І абавязкова зьвяртае ўвагу на колер. «Іду праз пляц і ўпіраюся ў ангельскую краму, поўную ружовых анучак, падушак, сукенак. Набываю ружовы шаль. Ру-

[2] Але, як і сярэднестатыстычн турыст, аўтар «Сшыткаў» ня толькі разглядае,

жо-вы-ру-жо-вы».

Адам Глёбус у жыцьці надае належную ўвагу вопратцы. Ён заўсёды модна і прыгожа апранаецца. Для яго адзежа іншых – важная крыніца інфармацыі. Таму ня дзіўна, што ў сваіх вандроўках ён з асаблівай цікавасьцю разглядае ўбраньне мясцовых жыхароў, адзначае яго каляровую гаму.

Тоўсты сумнавокі вар'ят апрануўся па-сьвяточнаму. Звычайна на ім сінія зашмальцаваныя нагавіцы, блакітная кашуля і скураныя пантофлі, але дзеля карнавалу ён прыбраўся ў новы строй, на ім усё чыста-белае, толькі пас, шырокі і шаўковы, меў радыкальна-чорнае адценьне. (...) З мэрыі выходзіць карабінэр. Высокі, у зялёнай форме, у чорна-залатых акулярах...

(«Карнавал у Січазе»)

У «Сшытках» ёсьць нарыс, прысьвечаны падарожжу ў Тайлянд, у якім аўтар шмат разважае аб прадметах матэрыяльнай культуры – гэта «Каралеўства Буды». Адзначым, што дарэчы аўтар абраў форму, распрацаваную выдатнай прадстаўніцай японскай старажытнай літаратуры – Сэй Сёнагон. Свой раман «Нататкі ўва ўзгалоўі», створаны ў канцы X ст., пісьменьніца арганізавала ў даны (разьдзельчыкі) з красамоўнымі назвамі і асаблівай унутранай пабудовай: «Тое, ад чаго сьціскаецца сэрца», «Тое, чаму можна пазайздросьціць», «Тое, што мусіць быць вялікім», «Тое, што чалавек звычайна не заўважае», «Тое, што здаецца бясконцым», «Тое, што выглядае на карціне лепей, чым у жыцьці». Некаторыя з назваў данаў «Каралеўства Буды» наўпрост перагукаюцца з «Нататкамі ўва ўзгалоўі». Напрыклад, «Тое, што нагадвае пра мінулае, але канчаткова страціла каштоўнасьць...», «Тое, што ўначы выглядае лепей, чым удзень...», «Цяжка вымавіць...». Але ніводны дан раману Сэй Сёнагон ня ўтрымлівае назвы колеру. У «Каралеўстве Буды» большасьць разьдзельчыкаў мае «афарбоўку»: «Белае...», «Жоўтае і залатое...», «Памаранчавае...», «Чырвонае...», «Ружовае...», «Пурпуровае...», «Фіялетавае...», «Сіняе...», «Блакітнае...», «Зялёнае – зялёна-блакітнае», «Чорнае...», «Шарае...» – яшчэ адно сьведчаньне таго, што колер для аўтара

але і «каштуе» замежных жанчын. «Яго вялікасьць» Колер і тут мае не апошнюю ролю: «Гадзіну я пакатаюся на чорнай жанчыне. Заглыблюся, наколькі можна, у кальмарава-ў Тайлянд, нетрыя» («Барсы»).

«Сшыткаў» мае выключнае значэньне. Колер дазваляе Глёбусу пазнаць сутнасьць рэчаў, іх прыроду:«Кепска, калі фіялетавы колер замяняецца ярка-чырвоным», – адзначыў Канфуцый. Нельга не пагадзіцца. Настаўнік чырвоным атрамантам выпраўляе памылкі, зробленыя атрамантам сінім і фіялетавым».

У «Каралеўстве Буды» Глёбус апэлюе да нас найчасьцей як мастак: «Некалькі глазураваных плітак у ванным пакоі мусяць быць сінія. Усё можа мець белае, шарае, ружовае адценьне, але колькі плітак павінны зьзяць глыбока-сінім холадам».

Некаторыя ягоныя «каляровыя» ўражаньні ад вандроўкі ў Тайлянд, занатаваныя ў «Сшытках», нагадваюць хайку: «...на рудаваты лоб сланіхі сядзе залацісты матылёк». Такое назіраньне здольны зрабіць толькі падарожнік-паэт. І гэта дае падставы параўнаць кнігу Глёбуса таксама зь «Лірычным дзёньнікам» славутага японца Басё.

МАСТАЦТВА

За мяжой Глёбус наведвае музэі і мастацкія галерэі. Як і большасьць падарожнікаў. Але мастак глядзіць на карціны зусім па-іншаму, не як звычайны чалавек. Турыста-сноба і мастака-пачаткоўца турбуе праблема *колеру* на мастацкіх палотнах, сакрэт зьмяшэньня фарбаў вялікімі мастакамі. Яны жадаюць разгадаць гэтую таямніцу, наблізіць геніяў да сябе. Аднак тыя, хто займаецца выяўленчым мастацтвам доўгія гады, ужо адказалі на гэтае пытаньне – кожны па-свойму. Знайшоў словы для гэтага і Глёбус: «Леанарда цёмны, цьмяны... Мікеляндэлё нібыта пакрыты танюткім і празрыстым слоем золата...».

У нарысе «Барса» Глёбус на некалькіх старонках пералічвае сюжэты карцінаў, якія ён пабачыў у Музэі каталёнскага мастацтва, але зусім няшмат (два-тры слоўцы) кажа пра іх колеры, фарбы. Ён успрымае карціны на іншым узроўні. Хутчэй, *чытае*, чым *разглядае*. Нездарма ён кажа, што «готыка – гэта чырвоны трылер».

ЕЖА

Вандроўнік вымушаны сілкавацца. І таму да яго паслуг дзясяткі розных кавярняў і рэстарацыяў. Што тычыцца аўтара «Сшыткаў», то ён заўсёды прыдзірліва азірае інтэр'ер рэстарацыяў, уважліва аглядае іх наведнікаў і гаспадароў, перад тым як сесьці і нешта замовіць («Празрысты Парыж», «Варшаўскі дзёньнік»). Да таго ж Глёбус – гастраном, ён пераканаць, што сэрвіраваньне стала дапамагае працы страўніка, а ежа павінна ня толькі наталяць, але й радаваць вока: «Сапраўдна-жоўты амлет, прыгатаваны зь цёмных сялянскіх яек, асабліва апэтытна выглядае на сіняй шкляной шырокай талерцы. Менавіта такіх талерак бракуе ў Тайляндзе».

Як вядома, беларускі ўрад занепакоены сытуацыяй на рынку турыстычных паслуг (сёньня зь Беларусі выяжджае ў 17 разоў больш турыстаў, чым уяжджае) і таму паставіў сабе за мэту сьпешна разьвіць уязны турызм. Але разбэшчанаму паслугамі і прапановамі замежнаму турысту лепш ніколі не наведваць нашыя гарады і мястэчкі, такія як Ракаў, бо ён будзе шакаваны. Такой ежы, такіх гастранамічна-кулінарных колераў ня вытрымае ягоны далікатны страўнік: «О, кіслы дух местачковых крамаў! Не прадыхнуць. Водар іржавага селядца, духмянасьць гнілой заквашанай пяшчотна-шарай капусты... А трупы зялёных памідорных галовак у трохлітровіках?!»[3].

ПАЧУЦЬЦІ, СНЫ, УСПАМІНЫ

Аўтар «Сшыткаў» – падарожнік іранічны. Ён аглядае гарады і пазірае на іх жыхароў зь лёгкай усьмешкай на вуснах. Найлепшыя старонкі кнігі тыя, дзе іронія памножана на нечаканы эфэкт, які дапамагае ствараць колеры.

Іду, а мяне пераймае Моцарт. Самы натуральны, у зялёным камзоле, белых панчохах і срэбным парыку. На чаравіках стражкі золатам гараць. Запыняе мяне Амадэй і дае запрашэньне ў оперу на «Чароўную флейту». Бяру. Доранаму каню ў дупу не зазіраюць. А ў твар? Твар у Моцарта чорны, як праскія вежы. І хто гэта прыдумаў пераапранаць мурынаў у Моцартаў?

(«Праскі шэм і койданаўскі трэф»)

[3] У кнізе падарожнай прозы «Адкусі галаву вароне» іншага беларускага пісьменьніка, уладзімера Арлова, у нарысе, прысьвечаным падарожжу ў

Вандроўніка могуць чакаць ня толькі прыемныя ўражаньні, але і непрыемнасьці. Ён можа адчуваць радасьць, захапленьне, а можа – непакой, страх. Вядома ж, незнаёмы край! Вось нешта давялося перажыць Глёбусу ў часе наведваньня могілак у Карлавых Варах (эпізод вытрыманы пісьменнікам у стылі «horror»; зьвярніце ўвагу на тое, як колеры, асьвятленьне дапамагаюць аўтару ўвасабляць пачуцьцё трывогі, небясьпекі):

Караскаўся, поўз, сунуўся і нарэшце пабачыў брудна-шэрага анёла за плотам. Прайшоў уздоўж паркана, праз маленечкія весьніцы накіраваўся да чорных мармуравых пліт. Цямнела. У гарах цямнее хутка. Нейкі будынак зь цёмнымі вокнамі, што стаяў на самым беразе кладоў, прыцягнуў маю ўвагу. Я зазірнуў у запыленую шыбу...

(«Чэскія неспадзяванкі і спакусы»)

Падарожжы гэтак моцна адбіваюцца ў душы чалавека, што нават у снох, каляровых снох, бачацца і перажываюцца ім зноў. І адбываецца гэта яшчэ задоўга да вяртаньня на радзіму. Іншым разам, у задушнай каталёнскай сьпёцы, бачацца кашмары, афарбаваныя ў злавесныя колеры: «...мой дзед, нябожчык, пафарбаваў сівыя валасы ў вугальны колер і паступіў на першы курс унівэрсытэту разам з маёю ўнучкай».

У сваіх падарожжах Глёбус часта згадвае Беларусь – адпраўную кропку на мапе, прыгадвае сваё дзяцінства, калі так свабодна і лёгка думаецца пра ўвесь сьвет, мроіцца рэчы, якія існуюць недзе там, далёка-далёка. І што з таго, што пазьней, калі дзяцінства незваротна мінае, тыя рэчы выяўляюцца памылковымі, насамрэч маюць іншы колер? «У дзяцінстве я думаў, што бамбук заўсёды жоўта-касьцяны, як вудзільны ў краме «Рыбак-паляўнічы», а ён сапраўды блакітна-зялёны, як і сам горад Сочы».

Насамрэч аўтару «Сшыткаў» вельмі пашанцавала: у часе падарожжаў ён знайшоў тое, што гэтак любіў і цаніў у

Магілёў («Два дні у нязьдзейсьненай сталіцы»), чытаем: «...у бязьменнай сталіцы... цяпер ягоные сваёй утульнай аўтаю абвестка «Ждите отстоя пива»... ты зможаш паставіць талерку на залітую кіслым віном ліпучую клеёнку і пачуць, як ззаду, з кухні, прапануюць тарэлку пяці гатункаў і вінО «Гранат»...».

дзяцінстве. У нарысе «Чэскія неспадзяванкі і спакусы» Глёбус згадвае, як яго захаплялі ў маленстве «каляровыя шкельцы, аскепкі кафлі, бліскучыя каменьчыкі». Прайшлі гады, і ён пабачыў іх зноў... у Парыжы, у велічным саборы Нотр-Дам, у «недасяжных далячынях якога сьвяціліся каляровыя шкельцы».

Можа быць, у гэтым і палягае сэнс таго, што сам пісьменьнік называе «выпраўленьнем да хараства»: «А я выбраўся да хараства, каб яно адбілася ўва мне...» («Неналежная Прага»).
[image]
[image]
Пачатак Цалкам
№ 6 (40) - 2005
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Ліст у рэдакцыю. Майстраваньне **[mk]**. Абнаўленьне **[czyk]**.
Copyright © 1998-2006 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2006/02/25
[image]